Памяць

ГІСТОРЫКА-
ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ
ХРОНІКІ
ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ
БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ
ВЫДАННЕ
СТВАРАЕЦЦА
ПАВОДЛЕ
РАШЭННЯ
ЎРАДА
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ

ПАМЯЦЬ

БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЁН

У 2 кнігах

Кніга 2-я

МІНСК
БЕЛТА
2002

УДК 947.6
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.К.КІСЯЛЁЎ (галоўны рэдактар выдавецкага цэнтра БЕЛТА),
А.М.ГАЛІЦКІ, У.А.КОРСАК, І.А.ПРОЦКІН, У.Я.РАЙСКІ, Б.В.УЛЬЯНКА

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

А.М.ГАЛІЦКІ (старшыня камісіі), В.Т.БАБРАЎНІЧЫ, А.А.КУНДЗЕЛЕЎ,
Ф.Ф.МУХА, В.М.НОВІКАВА, Р.Ф.ПАСЬКО, У.Я.РАЙСКІ, І.П.ЧАРНЯК, М.А.ЧЭЧКА,
Л.У.ЯЖОВА, В.І.ЯНЧАНКА

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ:

Б.В.УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Укладальнік
У.Я.РАЙСКІ

Мастак
Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі
В.А.РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-6302-39-0

© БЕЛТА, 2002

Буда-Кашалёва. Курган Славы на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

29 лістапада 1943 г.	Буда-Кашалёўскія і Уваравіцкія РК КП(б)Б і райвыканкомы аднавілі сваю дзейнасць.
29 чэрвеня 1945 г.	Ураджэнец Буда-Кашалёўшчыны лётчык П.Я.Галавачоў стаў двойчы Героем Савецкага Саюза.
Верасень 1945 г.	Пачаліся заняткі ў Буда-Кашалёўскім лясным тэхнікуме.
Канец 1945 г.	Адноўлены ўсе даваенныя прадпрыемствы: Рагінскі спіртзавод, Наспенскі цагельны завод «Чырвоная зорка», абуткова-шавецкія арцелі «Новае жыццё», імя Сталіна, арцель «16 год Кастрычніка», смалакурная арцель імя Калініна, лесазавод.
1946 г.	Пры раённым аддзеле культуры створана бібліятэка.

Буда-Кашалёва. Помнік двойчы Герою Савецкага Саюза П.Я.Галавачову.

1947 г.	У Буда-Кашалёўскім лясным тэхнікуме адбыўся першы выпуск лесаводаў.
Пачатак 1950-х гадоў.	У Буда-Кашалёўскім раёне адноўлены даваенны эканамічны ўзровень.
1953 г.	Завершана электрыфікацыя калгаса імя Леніна.
1954 г.	Калгасы і саўгасы дасягнулі даваеннага ўзроўню пасяўных плошчаў і вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі. Калгасы імя Энгельса, імя Чапаева, «Інтэрнацыянал» і «Чырвоны Днепр» аб'ядналіся ў адну буйную гаспадарку — калгас імя Энгельса. На базе калгаса «Чырвоная Беларусь» створаны саўгас «Буда-Кашалёўскі».

Буда-Кашалёва. Будынак райвыканкома.

1956 г.	Здадзены ў эксплуатацыю новы будынак Камунараўскай сярэдняй школы.
1957 г.	На базе Рагінскай МТС створаны саўгас «Рагінь».
1959 г.	У г.п. Буда-Кашалёва 4,6 тыс. жыхароў.
Пачатак 1960-х гадоў.	У в. Гаўлі адкрыты першы ў раёне школьны музей.
Лістапад 1960 г.	На базе саўгаса «Уваравічы» заснавана эксперыментальная база «Уваравічы» — спецыялізаваная гаспадарка па вырошчванні элітнага насення збожжавых і бульбы.

Будынак Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа.

1962 г.	Скасаваны Уваравіцкі раён, асноўная частка яго тэрыторыі далучана да Буда-Кашалёўскага раёна. Буда-кашалёўская раённая газета «Ленінскі шлях» стала называцца «Авангард».
1962—1965 гг.	У Буда-Кашалёўскім раёне 313 населеных пунктаў і 3 гарадскія пасёлкі.
22 красавіка 1964 г.	Заснаваны музей у СШ № 1 г.п. Буда-Кашалёва.
1965 г.	У г.п. Буда-Кашалёва пачалі працаваць раённая бальніца, масласыразавод. У раёне налічваецца 13 саўгасаў і 14 калгасаў.

Палац культуры ў пасёлку Камунар.

1966 г. — У г.п. Буда-Кашалёва здадзены ў эксплуатацыю новы будынак СШ № 2.
У раёне 92 школы, з іх 15 сярэдніх, 30 васьмігадовых і 47 пачатковых. Працавала каля 950 настаўнікаў і вучылася больш за 14 тыс. вучняў.

1967 г. — У вёсках Патапаўка і Мікалаеўка завершана будаўніцтва школ на 540 вучнёўскіх месцаў кожная.
Адкрыты музей баявой і працоўнай славы ў СШ № 2 г.п. Буда-Кашалёва.

1969 г. — У г.п. Буда-Кашалёва 7,2 тыс. жыхароў.

1971 г. — На базе аддзялення саўгаса «Уваравічы» арганізавана эксперыментальная база «Пянчын».

Буда-Кашалёва. Свята-Мікалаеўская царква.

31 снежня 1971 г.	Гарадскі пасёлак Буда-Кашалёва пераўтвораны ў горад раённага падпарадкавання.
1973 г.	Будаўніцтва жывёлагадоўчага комплексу ў калгасе «Іскра» наведаў 1-ы сакратар ЦК КПБ П.М.Машэраў.
1974 г.	Чабатовіцкая сярэдняя школа адзначыла сваё 100-годдзе.
1975 г.	За дасягненні ў будаўніцтве і добраўпарадкаванні вёсак Буда-Кашалёўскі раён атрымаў пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ.

Вёска Дуравічы. Дамы перасяленцаў з раёнаў, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

1976 г.	У пасёлку Камунар пачалося будаўніцтва Гомельскай бройлернай птушкафабрыкі. У калгасе імя Леніна здадзены ў эксплуатацыю жывёлагадоўчы комплекс на 1200 галоў.
1978 г.	Створаны Буда-Кашалёўскі вучэбна-вытворчы камбінат працоўнай падрыхтоўкі і прафесійнай арыентацыі, які наведвалі 796 старшакласнікаў з 11 школ раёна.
1980 г.	Узведзены новы тыпавы будынак раённай паліклінікі.
3 чэрвеня 1981 г.	У Буда-Кашалёўскім аграрна-тэхнічным каледжы адкрыты музей баявой і працоўнай славы. 29.4.1987 г. яму прысвоена званне народнага.

У час святкавання 125-годдзя Буда-Кашалёва.

1983 г. Ва Уваравічах пабудаваны новы корпус раённай бальніцы.

1986 г. Пачалося будаўніцтва Узоўскага камбіната хлебапрадуктаў магутнасцю 190 тыс. тон камбікармоў у год. Буда-Кашалёўскі раён прыняў першых перасяленцаў з Брагінскага і Нараўлянскага раёнаў, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

1986—1989 гг. На тэрыторыі раёна для перасяленцаў пабудавана 19 пасёлкаў з аб'ектамі сацкультбыту.

Народны хор аграрна-тэхнічнага каледжа.

1988 г.	Хор Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа атрымаў званне народнага.
Красавік 1988 г.	Створаны Дзяржаўны біялагічны заказнік «Буда-Кашалёўскі».
1989—1991 гг.	Сталі вядомы вынікі Чарнобыльскай катастрофы для Буда-Кашалёўшчыны. На канец 1991 г. 23 населеныя пункты раёна з Акцябрскага, Забалоцкага і Шыpoкаўскага сельсаветаў трапілі ў зоны адсялення, 121 населены пункт апынуўся ў зоне з правам адсялення і 252 населеныя пункты — у зоне перыядычнага радыяцыйнага кантролю.

У этнаграфічным музеі Акцябрскай школы.

1993 г. Здадзены ў эксплуатацыю новы будынак раённага вузла сувязі. Званне народных атрымалі ансамблі «Крыніцы» Іванаўскага сельскага клуба і «Сінічкі» Івольскага сельскага Дома культуры.

1994 г. У г. Буда-Кашалёва пабудаваны новы універмаг. Створана адкрытае акцыянернае таварыства «АграпрамтэхПАК» (у 1997 г. пераўтворана ў сумеснае беларуска-галандскае прадпрыемства ААТ «АМІПАК»).

19 мая 1994 г. Епіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх асвяціў прастол Свята-Мікалаеўскай царквы ў г. Буда-Кашалёва.

Буда-кашалёўскія ручнікі з калекцыі, сабранай студэнтамі факультэта беларускай філалогіі і культуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка.

1995 г.	У Буда-Кашалёўскім раёне пражывала 46,5 тыс. жыхароў, у г. Буда-Кашалёва — 9,5 тыс., у г.п. Уваравічы — 3,3 тыс. жыхароў.
27 кастрычніка 1996 г.	У в. Глазаўка адкрылася Свята-Пакроўская царква.
19 снежня 1996 г.	У в. Івольск адкрылася Свята-Міхайлаўская царква.
1998 г.	Горад Буда-Кашалёва адзначыў сваё 125-годдзе.
Май 1999 г.	Жаночаму вакальнаму ансамблю «Калініца» Камунараўскага Дома культуры Гомельскай бройлернай птушкафабрыкі прысвоена званне народнага.

Рака Ліпа каля в. Андрэеўка.

Чэрвень 1999 г.	У раёне праведзены міжнародны пленэр па жывапісе, прысвечаны памяці народнага мастака СССР Я.Я.Майсеенкі.
2000 г.	У Буда-Кашалёўскім раёне пражывала 43,6 тыс. жыхароў.
2001 г.	У г.п. Уваравічы здадзены новы будынак сярэдняй школы на 834 вучнёўскія месцы. Выйшла з друку 1-я кніга гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Буда-Кашалёўскі раён».
Сакавік 2002 г.	У в. Івольск, на радзіме народнага артыста БССР П.С.Малчанава, прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю з дня яго нараджэння.

Да чытача

Другая кніга гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Буда-Кашалёўскі раён» ахоплівае перыяд гісторыі ад падзей Вялікай Айчыннай вайны да нашых дзён. У ёй расказваецца пра землякоў, што ваявалі і вызначыліся на франтах вайны і вярнуліся дамоў пераможцамі, прыводзяцца спісы воінаў-землякоў, якія загінулі ці прапалі без вестак.

Значная частка кнігі адведзена асвятленню перыяду гісторыі Буда-Кашалёўшчыны 1940—1990-х гадоў: пасляваеннаму адраджэнню народнай гаспадаркі, яе станаўленню і развіццю ў наступныя дзесяцігоддзі. Даюцца звесткі пра тых, хто вызначыўся ў працы: ардэнаносцаў, заслужаных работнікаў Беларусі і інш., пра вядомых землякоў (дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, вучоных, артыстаў, мастакоў, пісьменнікаў і т.п.) — усіх, хто праславіў свой край і пакінуў аб сабе добрую памяць. Расказваецца і пра наступствы чарнобыльскай трагедыі, якая зачапіла сваім крылом і гэты цудоўны край, і пра землякоў, што загінулі ў Афганістане ці пры выкананні службовых абавязкаў у арміі.

Асобны раздзел кнігі прысвечаны апісанню багатай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Буда-Кашалёўшчыны, гісторыі яе населеных пунктаў.

Пры напісанні кнігі выкарыстаны шматлікія архіўныя матэрыялы, публікацыі з кніг, часопісаў і газет, успаміны ўдзельнікаў і сведкаў падзей. Безумоўна, далёка не ўсё трапіла на старонкі гэтага двухтомніка: пэўныя падзеі і імёны згубіліся ў напластаваннях часу, нешта засталося па-за ўвагай па прычыне сваёй недаследаванасці і адсутнасці дастатковай інфармацыі. Але пошукавая работа не спыняецца з выхадам гэтай кнігі. Выданне хронікі, трэба спадзявацца, падштурхне новых краязнаўцаў-аматараў і спецыялістаў на далейшыя пошукі і даследаванні. А гэта значыць, што нас чакаюць новыя адкрыцці і, не выключана, новыя старонкі хронікі.

Раённая камісія па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Буда-Кашалёўскі раён» выказвае шчырую падзяку ўсім установам, арганізацыям і прыватным асобам, якія аказалі садзейнічанне ў пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для гэтай кнігі, а таксама яе выданні.

ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА



1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Землякі — Героі Савецкага Саюза

ГАЛАВАЧОЎ Павел Якаўлевіч. Нарадзіўся 15.12.1917 г. у в. Кашалёва. Двойчы Герой Савецкага Саюза (1943, 1945). Генерал-маёр авіяцыі (1957). З сялян. У 1933 – 1938 гг. працаваў токарам, фрэзероўшчыкам у Гомелі. Закончыў Адэскую школу пілотаў (1940), Ваенна-паветраную акадэмію (1951), Акадэмію Генштаба (1959). На фронце з чэрвеня 1941 г., камандзір звяна, камандзір эскадрыллі. Удзельнік баёў на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, 4-м Украінскім, 3-м і 1-м Беларускіх франтах. Удзельнічаў у абароне Адэсы, у Ізюм-Барвенкаўскай аперацыі каля Харкава, Сталінградскай бітве, у вызваленні Данбаса, Крыма, Адэсы, Маладзечна, у баях пад Кёнігсбергам, Франкфуртам-на-Одэры, Берлінам. Зрабіў 457 баявых вылетаў, у 125 паветраных баях збіў 30 варожых самалётаў, адзін з іх тараніў. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, 9 іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр 2.7.1972 г. Бюст Героя ўстаноўлены ў г. Буда-Кашалёва. Яго імем названы вуліцы ў Гомелі і Буда-Кашалёве, ГПТВ № 56 у Гомелі, дзе ён вучыўся.

* * *

...Два краснозвездных «лагга» барражировали у линии фронта. Головачев посмотрел на часы. Время вышло, пора домой. Только развернулись — четверка «МЕ-109». Идут пониже, немного впереди. Что ж, их вдвое больше, но медлить нельзя. В бой! Головачев ринулся на врага. Когда «МЕ-109» застыл в прицеле, гитлеровца прошила короткая очередь. Самолет тут же взорвался. Готов! А истребитель Головачева уже мчался ввысь, чтоб снова обрушиться на фашистов.

Вдруг острая боль обожгла правую руку. В кабину, как водопад, яростно хлестнул упругий воздух. Фонарь сшибло. Еще не сообразив, что случилось, Павел инстинктивно откинул голову к бронеспинке. И это его спасло, по приборной доске опять полоснула очередь... Машину удалось выровнять. Летчик послал сектор газа вперед. Но штурвал держать уже не мог: не повиновалась рука. Пришлось зажать штурвал коленями и так вести машину. А тут еще неприятности: после боя никак не удавалось сориентироваться. Бежали под крылом дороги и села.

Машину приземлил вроде нормально. Вылез из кабины. Шагнул навстречу техникам, что бежали сюда. Но и двух шагов ступить не смог: в воздухе не почувствовал, что и в ноги ранен. На «санитарке» отправили в госпиталь. Долго доставали

П.Я.Галавачоў.

осколки. Но рука потом сильно распухла и, как колода, поверх простыни лежала. Снова оперировали.

Воевал дерзко и отважно.

Очень тяжкие были бои у волжской твердыни. Однажды, после патрулирования над переправами на Калаче, вернулся Головачев на свой аэродром. Сел. Зарулил. К самолету подкатил топливозаправщик. Летчик открыл фонарь кабины, сдвинул шлемофон набок, как вдруг на горизонте замаячили темные точки. «Юнкерсы»!

Головачев немедленно запустил мотор и на последних каплях бензина ушел в бой. Сразил одного фашиста. Развернулся, чтоб ударить по второму. Но вражеский стрелок опередил: его очередь рубанула по лобовому стеклу. Вдребезги разлетелся хрупкий плексиглас, ошпарив осколками лицо. Трасса прошла над головой летчика. Неуправляемый самолет падал в Дон. Очнувшись, Головачев вывел раненную машину из штопора. Мотор заглох: иссяк бензин. А земля — вот она, рядом. Только б перетянуть через реку: свои на том берегу. Но тут, где чужие — берег пологий, наш — гористый. Опасно там будет садиться. Да ведь своя земля. И Павел тянул упрямо туда, собрав воедино волю, превозмогая боль, едва различая горизонт сквозь кровавый туман, застилавший глаза. Нет, самолет не сел: мало, слишком мало воздуха оставалось под ним! Он врезался в берег. Так, что хвост отломился и упал в воду. Но кабина осталась на берегу. На том, где были свои...

Сознание возвращалось с трудом.

Знаменитый окулист профессор Филатов сделал операцию. 13 швов пришлось наложить. За этот бой Павел Головачев был награжден первым орденом Красного Знамени. Ему присвоили звание лейтенанта и назначили командиром звена. Теперь он сам водил в атаку группы краснозвездных истребителей, еще беспощаднее разил врага. От метких сокрушительных ударов Павла Головачева чадными кострами летели вниз хваленые гитлеровские асы из 52-й эскадры «Удэт», той вороньей стаи, что начинала свой кровавый путь в Испании.

Когда сражения на Волге близились к победному финалу и фашистская группировка трехсоттысячной армии Паулюса была обречена, истребительный полк получил приказ перебазироваться под Ростов. Здесь — новые бои. В один из ясных мартовских дней 1943 года звено Головачева по сигналу ракеты поднялось в воздух. Здесь командование группой принял командир эскадрильи Амет-Хан Султан.

Шестерка истребителей круто шла с набором высоты. Внизу, со стороны Азовского моря, плыла синяя дымка. Набрана высота пять тысяч метров. И тут вдали на горизонте появились темные точки. «Галки. Как много их!» — подумал Павел. Но в следующее мгновение уже понял, что то были вражеские самолеты. Целая армада «хейнкелей», «юнкерсов», «мессершмиттов». Немцы, очевидно, намеревались бомбить Батайск. Там была разгрузочная станция фронта.

Ведущий решил атаковать в лоб. В сомкнутом боевом порядке советские истребители рванулись вперед. Меткой очередью Амет-Хан Султан сбил ведущего «хейнкеля». В этот момент на самолет Амет-Хана бросились 4 «МЕ-109». Наперерез им, защищая командира, устремился Головачев. От его меткой очереди вспыхнул один «мессер». Тут же еще 2 фашистские машины, сбитые нашими летчиками, рухнули на землю. Завязался ожесточенный бой. В схватку вступили новые группы наших истребителей. Их смелому натиску не смог противостоять враг. Армада гитлеровцев дрогнула и рассыпалась. В этом налете, как потом выяснилось, участвовало 160 фашистских самолетов. Более 40 из них уничтожили наши летчики.

В ноябре 1943 года П.Головачев был удостоен звания Героя Советского Союза. Весть о высокой награде прилетела и в отчий дом, в родные края, только что освобожденные Советской Армией. И вскоре на фронтовой аэродром под Мелитополем пришел треугольный конверт. Солдат-почтальон вручил его Головачеву, когда тот вернулся с боевого задания.

Первое письмо от родных! Что принесло оно с собой? Тут же, у крыла своего истребителя, Павел начал торопливо читать его. И карандашные строчки, легшие вкось на шершавую бумагу тех лет, запрыгали перед глазами...

Стиснув листок в руке, Павел уронил голову на консоль самолета. Боль, нестерпимая боль сдавила сердце. В эту минуту, позабыв обо всем, он вдруг увидел себя как бы со стороны, в той смутной дали време-

ни, мелькнувшей в сознании, когда был еще несмышленым подростком и когда, провинившись в чем-то, с повинной пришел к отцу, неловко ткнулся ему в грудь, а тот ничего не сказал, только положил ему натруженную руку на голову, провел по льняным волосам...

Теперь поблизости от самолета стояли боевые друзья. Они, конечно, догадались, что большое горе постигло их товарища, но не решались подойти к нему, понимали, что словами тут не поможешь. Понимал это и Федор Андреевич Бабий, парторг полка. Он, как обычно, первым встречал пилотов, прилетевших с задания. И сейчас, идя от самолета к самолету, еще издали увидев, что у одной из машин стоят молчаливые люди, поспешил к ним. А когда приблизился немного, его взгляд приковала склоненная у крыла фигура летчика. Заметил и то, что в сторонке, удрученный, стоял солдат-почтальон.

И Федору Бабию стало понятно все. Но он не остановился, даже, напротив, ускорил шаг. Подойдя к Головачеву, просто и дружески спросил:

— Что у тебя, Паша?

Тот, будто очнувшись, распрямился, провел рукавом по лицу, протянул листок. Федор Бабий молча взял его и стал читать. Письмо было от сестры. «... А еще, Павлик, сообщаю тебе, — писала она, — что остались мы сиротами. Нет у нас теперь отца. Его, как и других наших односельчан, всех стариков да женщин, супостаты-фашисты угоняли на земляные работы далеко за село. Знал бы ты, как настрадались тут наши люди: мучили их изверги, морили голодом. Когда отец шел домой, у него не достало сил. Он умер на дороге. Он не дошел до села две версты...»

Ровно через час взлетели истребители. Среди них был и Павел Головачев. Он нес на крыльях своего самолета беспощадную месть... Отважный сокол дрался с врагом, не щадя жизни. Он воевал уже над Восточной Пруссией, и об этом в «Правде» от 26 января 1945 года сообщалось: «В сражениях за Восточную Пруссию принимают активное участие летчики генерал-полковника авиации Хрюкина. Они наносят сокрушительные удары по врагу и показывают высокие образцы отваги и боевого мастерства. В один из последних дней шестерка «лавочкиных», возглавляемая гвардии майором Амет-Ханом Султаном, патрулировала на высоте 4 тысяч метров над территорией противника. Через некоторое время наши летчики заметили 20 «Фокке-Вульфов-190». Они шли на высоте 1,5 тысячи метров к линии фронта. Вражеские самолеты намеревались нанести бомбово-штурмовой удар по нашим войскам.

Немцы пытались уклониться от встречи и стали уходить назад к своему опорному пункту, рассчитывая силой огня зенитной артиллерии остановить наших истребителей. Но они просчитались. Несмотря на сильный зенитный огонь, «лавочкины» нагнали противника и устремились в атаку. Боевой порядок немецких самолетов сразу же был расстроен.

В последовавшей затем ожесточенной схватке наши истребители сбили 5 «фокке-вульфов»: 2 самолета сбил гвардии капитан Головачев, по одному Амет-Хан и гвардии старшие лейтенанты Маклаков и Мальков. Одержав эту победу, наши истребители без потерь возвратились на свой аэродром.

В тот же день 5 «лавочкиных» под командованием гвардии капитана Головачева перехватили на высоте 1700 метров 15 «Фокке-Вульфов-190». При первой же атаке Головачев с дистанции в 50 метров ударил по вражескому самолету. «Фокке-вульф» взорвался в воздухе. Остальные немецкие самолеты, беспорядочно сбросив бомбы, стали уходить. Но «лавочкины» настигли их, и ведущий на пикировании сбил еще одну вражескую машину. У него на счету уже 26 немецких самолетов.

...Свой 125-й воздушный бой летчик Головачев провел над Берлином. Там он сразил 30-й самолет врага. С радостью встретил светлый праздник Победы.

Друкуецца са скарачэннямі паводле кн.: Люди бессмертного подвига. М., 1965. С. 224—229.

ІСАЧАНКА Аляксандр Лаўрынавіч. Нарадзіўся 14.3.1919 г. у в. Хоўхла. Герой Савецкага Саюза (1944). Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Гомельскага камсамольска-маладзёжнага падполля і партызанскага руху на Гомельшчыне ў Вялікую Айчынную вайну. З сялян. Скончыў Рэчыцкае педвучылішча. Да вайны сакратар Гомельскага гаркома камсамола. Са жніўня 1941 г. у гомельскім партызанскім атрадзе «Бальшавік» — падрыўнік, разведчык, адначасова



А.Л.Ісачанка.

А.Ц.Краўцоў.

С.А.Панамароў.

А.Я.Андрэенка.

сакратар Гомельскіх падпольных абкома і гаркома ЛКСМБ, член Гомельскага падпольнага гаркома КП(б)Б.

Група падрыўнікоў, якую ўзначальваў А.Л.Ісачанка, пусціла пад адхон 58 варожых эшалонаў, знішчыла 87 аўтамашын, танкаў, браневікоў. Загінуў 7.10.1942 г. пры падрыхтоўцы да баявога задання. Пахаваны ў Гомелі. У в. Хоўхла яму пастаўлены помнік, яго імем названы вуліцы ў Гомелі, Буда-Кашалёве.

КРАЎЦОЎ Альгерд Ціханавіч. Нарадзіўся 19.7.1912 г. у в. Забалоцце. Герой Савецкага Саюза (1945). З сялян. Скончыў Ленінградскае ваенна-інжынернае вучылішча (1938), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1950). У Чырвонай арміі з 1936 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Данскім, Варонежскім і 1-м Украінскім франтах. Маёр, камандзір матарызаванага пантонна-маставога батальёна. Вызначыўся пры фарсіраванні Віслы каля г. Баранаў-Сандамерскі і ў баях за плацдарм. Ноччу 2.8.1944 г. пад варожым агнём арганізаваў пераправу танкаў і артылерыі цераз раку. 4.8.1944 г. сіламі батальёна адбіў варожыя контратакі і суткі да падыходу танкаў і пяхоты утрымліваў захоплены плацдарм. Да 1961 г. служыў у Савецкай арміі. Памёр 12.12.1993 г.

ПАНАМАРОЎ Сяргей Аляксеевіч. Нарадзіўся 31.12.1908 г. у в. Мікалаеўка. Герой Савецкага Саюза (1945). З сялян. З 1932 г. у НКУС. У Чырвонай арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. — на Заходнім, Паўночна-Заходнім, Бранскім, Беларускім, 1-м Украінскім, 3-м і 1-м Прыбалтыйскіх, 1-м Беларускім франтах. Капітан Панамароў вызначыўся ў баях у час прарыву варожай абароны ў Польшчы і ўступлення савецкіх войскаў на тэрыторыю Германіі. Да 1946 г. у Савецкай арміі, потым на гаспадарчай рабоце ў Рагачоўскім раёне. Памёр 17.10.1968 г.

Поўны кавалер ордэна Славы

Аляксандр Ягоравіч Андрэенка нарадзіўся 7.1.1923 г. у в. Радзеева. Працаваць пачаў у 1939 г. у калгасе імя Ф.Энгельса.

У час Вялікай Айчыннай вайны быў партызанскім сувязным, з лістапада 1943 г. на фронце. Сапёр, разведчык, радавы Аляксандр Андрэенка вызваляў Беларусь, Польшчу. Дайшоў да Германіі.

У ноч на 24 чэрвеня 1944 г. на бабруйскім напрамку атрымаў баявое хрышчэнне. Сапёры расчышчалі шлях для наступлення нашых войскаў да варожых умацаванняў. Андрэенка з таварышамі абясшкоджвалі міны і на іх месцы ставілі флажкі — шлях свабодны. Так ён дабраўся да першай траншэі фашыстаў, адкуль яго абстралялі з кулямёта. Давялося доўга ляжаць на сырой зямлі. Пасля артылерыйскай падрыхтоўкі разам з пяхотай у атаку кінуліся і сапёры. Радавы Андрэенка дапамог афіцэру-кулямётчыку адбіць атакі ворага, за што атрымаў першую падзяку. За мужнасць і адвагу пры штурме варожых умацаванняў у раёне Бабруйска і Мінска Аляксандр Андрэенка быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, а за подзвіг на р. Нараў — медалём «За адвагу». Праз

некаторы час радавы Андрэенка быў пераведзены ва ўзвод палкавой разведкі. Чарговы раз вызначыўся ён у баях пад Ломжай, што на Беласточчыне. З групай разведчыкаў захапіў варожы дот і 2 языкоў. Быў цяжка паранены асколкамі варожай гранаты. За гэтыя баі Андрэенка быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступені.

Вярнуўся салдат у полк, калі той ужо быў на нямецкай зямлі. 14.1.1945 г. пры прарыве абароны праціўніка на Віленскім плацдарме вывеў са строю варожую гармату, знішчыў 5 і захапіў у палон 12 гітлераўцаў. У лютым 1945 г. жорсткі бой завязаўся ў населеным пункце Фокільзан. Наша пяхота заняла адну вуліцу, немцы ўтрымлівалі другую. А на скрыжаванні іх знаходзіўся старадаўні будынак былой ратушы, з якога немцы зрабілі дот. Узяць яго было цяжка. Ён быў непрыступны. Туды можна было прабрацца толькі варожымі траншэямі, што і зрабіў ноччу Андрэенка. Разведчыка заўважылі гітлераўцы. Той кінуў некалькі гранат і ўварваўся ў дот. Дзейнічаў гранатамі, аўтаматам, кінжалам. Тут жа стралковая рота пайшла ў атаку. Адважны воін за гэты подзвіг быў узнагароджаны ордэнам Славы I ступені. Пабываў Аляксандр Андрэенка і ў Берліне, а вайну закончыў на Эльбе.

Пасля вайны А.Я.Андрэенка працаваў на чыгуначнай станцыі г. Гомеля, а з 1962 г. да 1979 г. — брыгадзірам паляводаў, рабочым будаўнічай брыгады эксперыментальнай базы «Уваравічы». Памёр у 1989 г.

І.П.Чарняк.

Віцэ-адмірал флоту

В.П.Дрозд.

ДРОЗД Валянцін Пятровіч, віцэ-адмірал (1941). Нарадзіўся 16.9.1906 г. у г. Буда-Кашалёва. Скончыў Ваенна-марское вучылішча імя М.В.Фрунзе (1928), курсы ўдасканалення каманднага саставу флоту (1931). Служыў на Балтыйскім флоце памочнікам вахтавага начальніка лінкора «Кастрычніцкая рэвалюцыя», лётчыкам-наглядальнікам гідраавіяатрада, штурманам і камандзірам эсмінца, старшым памочнікам камандзіра лінкора «Марат». У 1936 — 1937 гг. добраахвотна ўдзельнічаў у нацыянальна-рэвалюцыйнай вайне ў Іспаніі. За праяўленыя мужнасць і адвагу ўзнагароджаны ордэнамі Леніна і Чырвонага Сцяга. З лістапада 1937 г. камандзір брыгады эсмінцаў Балтыйскага флоту.

З мая 1938 г. камандуючы Паўночным флотам, удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939 — 1940 гг. З верасня 1940 г. начальнік Чарнаморскага вышэйшага ваенна-марскога вучылішча ў Севастопалі. З лютага 1941 г. камандзір атрада лёгкіх сіл Балтыйскага флоту. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны (жнівень 1941 г.) на чале атрада караблёў прарваўся з Таліна ў Кранштат. З верасня 1941 г. камандуючы эскадрай караблёў Балтыйскага флоту; удзельнік абароны Таліна і Маанзундскіх астравоў, Ленінграда. У канцы 1941 г. кіраваў пастаноўкай міннай загароды ў Ірбенскім праліве.

У лістападзе — снежні 1941 г. віцэ-адмірал В.П.Дрозд забяспечваў эвакуацыю асабовага складу і ваеннай тэхнікі з паўвострава Ханка. Загінуў у 1943 г. у час артылерыйскага абстрэлу на лядовай трасе пад Кранштатам. Узнагароджаны другі раз ордэнам Леніна і ордэнам Чырвонага Сцяга. Пахаваны ў Аляксандра-Неўскай лаўры ў Санкт-Пецярбургу. Яго імя ўвекавечана на мемарыяльнай дошцы ў памяць выхаванцаў Вышэйшага ваенна-марскога вучылішча імя М.В.Фрунзе. Імем В.П.Дразда названы баявы карабель, вуліца ў Буда-Кашалёве, на радзіме яму пастаўлены помнік.

З успамінаў Уладзіміра Піліпавіча Трыбуца, камандуючага Чырванасцяжным Балтыйскім флотам, адмірала флоту

...Мне часто удавалось в те дни (июль 1941 г. — *І.К.*) приезжать из Таллина в Рохукюла: хотелось знать, какое настроение у наших людей в Моонзунде. Должен сказать, что они не теряли бодрости духа, как бы туго им не приходилось. Несмотря на трудности, отряд В.П.Дрозда делал свое дело, и противник, хотя и имел превосходство, не показывался в Рижском заливе. Тут играл немалую роль опыт командира отряда. Валентин Петрович был в Испании и умел передать свою уверенность, настроение командирам кораблей.

Валентин Петрович рассказывал мне, что на первых порах, пока не была выработана тактика уклонения от пикирующих бомбардировщиков противника, отряд нес некоторые потери: часть кораблей страдала от осколков многочисленных бомб, повреждения получили эскадренные миноносцы «Энгельс» и «Суровый». Однако со временем командиры научились уходить от воздушных атак. Так, 17 июля эсминец «Сердитый» двенадцать раз подвергался атакам вражеских самолетов, на него было сброшено свыше 100 авиабомб, и все — с нулевым результатом...

— Больше неприятностей и потерь, — говорил Валентин Петрович, — приносят магнитные мины, широко применяемые врагом в узком маневренном пространстве, каким является рейд у Куйвастэ.

...Вместе со мной на борту крейсера «Киров» находился и командир отряда легких сил контр-адмирал В.П.Дрозд со своим штабом. Валентин Петрович за несколько дней до прорыва вернулся из Моонзунда. Мне было приятно чувствовать рядом локоть этого замечательного командира. В тяжелые дни боев за Моонзунд, когда почти ежедневно десятки вражеских самолетов сбрасывали бомбы на корабли, находившиеся под его командованием, он подавал подчиненным командирам пример рассудительности, ответственного отношения к делу. Таким оставался Валентин Петрович и в дни прорыва... Отразив все вражеские атаки, 112 кораблей и 21 транспортное и вспомогательное судно прибыли в Кронштадт. В ноябре—декабре 1941 г. вице-адмирал В.П.Дрозд обеспечивал эвакуацию личного состава и военной техники с полуострова Ханко (Финляндия). 31.10.1941 г. под его командованием отряд кораблей в составе эсминцев «Стойкий» и «Славный», минного заградителя «Марти», четырех базовых тральщиков и пяти сторожевых кораблей вышли из Кронштадта к острову Гогланд. 2 ноября отряд кораблей без потерь пришел на полуостров Ханко. Немедленно началась погрузка под непрерывным обстрелом артиллерией противника. Вечером отряд вышел в обратный путь. Преодолевая минные поля и под обстрелом артиллерии с мыса Юминда отряд кораблей 3 ноября пришел к Гогланду, а еще через день был в Кронштадте, доставив с Ханко 4230 бойцов и командиров с вооружением и боеприпасами, а также два дивизиона полевой артиллерии. От маяка Толбухин до Ленинграда корабли двигались во льдах толщиной до 10 сантиметров. Всего по 5 декабря было совершено на Ханко 11 боевых походов с участием 66 боевых кораблей, сторожевых и торпедных катеров, 22 вспомогательных судов, ледоколов, транспортов, буксиров. В тяжелейших условиях под руководством вице-адмирала В.П.Дрозда вывезено с Ханко в Ленинград 23 тыс. человек с оружием, легкой и зенитной артиллерией, боеприпасами, а также 1700 тонн продовольствия. Военный Совет Ленинградского фронта на специальном заседании обсудил итоги героической обороны военно-морской базы Ханко и эвакуации гарнизона отрядом кораблей под командованием вице-адмирала В.П.Дрозда. В приказе по войскам флота говорилось: «...Несмотря на упорное противодействие противника, сквозь минные поля, артиллерийский огонь, шторм и туман героический гарнизон полуострова доставлен на Родину моряками-балтийцами... За отличное выполнение поставленных задач личному составу кораблей КБФ объявляю благодарность».

Друкуецца па кн.: Трибуц В.Ф. Балтийцы сражаются. Военные мемуары. М., 1985. С. 133—134.

Падрыхтаваў І.Я.Краўцоў.

Незабыўныя старонкі жыцця

З успамінаў Ф.С.Драянкова

ДРАЯНКОЎ Фёдар Савельевіч. Нарадзіўся 15.3.1915 г. у в. Марозавічы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Гвардыі генерал-маёр, дацэнт. Скончыў Кіеўскае пяхотнае вучылішча (1937), паскораны курс Ваеннай акадэміі (1942), Ваенныя акадэміі імя Фрунзе і Генштаба (1954). Быў камандзірам узвода, роты, батальёна, стралковага палка, стралковай дывізіі, выкладчыкам і загадчыкам кафедры агульнавайсковай тактыкі Ваенна-палітычнай акадэміі імя У.І.Леніна. У 1963—1965 гг. знаходзіўся ў Дэмакратычнай Рэспубліцы В'етнам. У арміі праслужыў 36 гадоў. Меў цяжкія раненні. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга (двойчы), Аляксандра Неўскага, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Ф.С.Драянкоў.

Выдатную загартоўку атрымаў я ў 1930-я гады, калі камсамольцам змагаўся з бандытамі. Вучыўся ў Буда-Кашалёве. Потым працаваў загадчыкам пачатковай школы ў вёсцы Гаўлі, дзе вучыўся раней.

У Чырвоную армію ўступіў добраахвотна. Было гэта восенню 1935 г. Вялікая Айчынная вайна застала мяне пад Масквой. У той час я быў ужо старшым лейтэнантам, камандаваў ротай курсантаў Кіеўскага ваеннага вучылішча.

У лютым 1944 г. я быў прызначаны намеснікам камандзіра 174-га гвардзейскага палка, які ў складзе 57-й гвардзейскай дывізіі дзейнічаў ва Украіне.

Прыгадваю адзін з першых баёў. Гэта было ноччу. Мы павінны былі пераправіцца цераз даволі шырокую раку. А я не ўмеў плаваць. Хутка я знайшоў выйсце. На другі бераг я пераправіўся, трымаючыся за свайго каня. Потым мне даводзілася перапраўляцца цераз многія малыя і вялікія рэкі. Але так ніхто з падначаленых і не здагадаўся, што я не ўмеў плаваць.

Адным з самых жорсткіх баёў, у якім удзельнічаў наш полк, быў бой за плацдарм на рацэ Днестр пад Кішынёвам. Мы размясціліся ў шасці кіламетрах ад ракі. Праціўнік стварыў на супрацьлеглым беразе моцную абарону, выкарыстоўваючы існуючыя там вышыні. І усё ж у ноч на 11 мая 1944 г. нашы перадавыя падраздзяленні прасунуліся на тры кіламетры да ракі. Байцы пачалі акопвацца на новым рубяжы, рабілі пазіцыі для танкаў, артылерыі, мінамётаў, абсталёўвалі назіральныя пункты. Ранкам, а палове пятай, гітлераўцы пайшлі ў першую контратаку. За дзень мы адбілі 10 атак, надвячоркам яшчэ чатыры. Гітлераўцы рушылі ў чарговую атаку пад прыкрыццём танкаў. Магутнае «ўра!» узняло нашых салдат. Немцы не вытрымалі, не прынялі наш рукапашны бой і адышлі.

Больш за дваццаць сутак ішлі баі за гэты плацдарм. За ўдзел у іх я быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Потым баявыя дарогі прывялі мяне ў Польшчу. 1 жніўня 1944 г. выйшлі мы да ракі Віслы і пачалі яе фарсіраванне. Перад намі стаяла задача — замацавацца на

У момант франтавога зацішша. Ф.С.Драянкоў (справа) з братам. 1944 г.

супрацьлеглым беразе і забяспечыць паспяховае наступленне войскам 8-й гвардзейскай арміі.

...Немцы адчайна супраціўляліся. І ўсё ж пад моцным агнём праціўніка мы замацаваліся на неабходным плацдарме і ўступілі ў няроўны бой. Вораг імкнуўся скінуць нас у раку. Дванаццаць контратак праціўніка адбілі гвардзейцы і з задачай справіліся паспяхова, забяспечылі пераправу астатніх часцей дывізіі.

...Назаўжды ў маёй памяці застаўся дзень 28 студзеня 1945 г., калі гвардзейцы палка перайшлі граніцу з Германіяй. Вось адкуль фашызм пачынаў свой паход супраць чалавецтва з вар'яцкай надзеяй паставіць на калені ўвесь свет. Гэта адсюль гітлераўцы неслі ў нашы гарады і вёскі смерць і слёзы. У пачатку вайны яны былі вельмі самаўпэўненыя, не думалі аб расплаце. Але яна прыйшла. Яе прынеслі савецкія воіны.

Яшчэ мне добра запомніліся тры выпадкі, якія адбыліся ў 8-й гвардзейскай арміі, у складзе якой дзейнічала наша дывізія.

У час аднаго з баёў на прамежкавым пункце сувязі засталася толькі адна дзяўчына-сувязістка — Надзя Кліменка. Усе яе сяброўкі былі забіты або паранены. Мужная дзяўчына не пакінула баявы пост. Да апошняй хвіліны дакладвала на вузел сувязі аб усім, што адбываецца на полі бою. Яе апошнія словы былі: «Каля пункта з нашых нікога няма. Я засталася адна. Вакол ірвуцца снарады... Бачу справа ад мяне рухаюцца варожыя танкі. За імі пехацінцы...» На гэтым перадача спынілася. Пасля высветлілася, што Надзя змагалася да апошняга патрона.

Другі факт. Аднойчы ў нашу зямлянку зайшоў камандзір дывізіі і нечакана спытаў: «Хто з вас будзе Якаў Буднік?».

— Я, таварыш генерал, — адказаў баец.

— Прывёз вам падарунак ад жонкі. Добры падарунак, сямейны. Пойдзем, паглядзім, — сказаў генерал. І ўсе выйшлі з зямлянкі.

На агнявой пазіцыі стаяў новы мінамёт.

— Вось, — сказаў генерал, — прымайце падарунак. На меднай пласцінцы, прымацаванай да ствала, было ўсяго тры словы «Ад жонкі Ксеніі». «Сямейны» мінамет Буднікавых быў для нас сімвалам непарыўнай сувязі тылу і фронту.

Трэці факт. У час бою да камандзіра артылерыйскага разліку падышоў стары і гаворыць: «Таварыш камандзір, нацэльце сваю гармату вось на той дом. У ім нямецкі штаб размясціўся». «А можа там засталіся мясцовыя жыхары, савецкія людзі?» — засумняваўся баец. «Не, — адказаў стары, — гэта мой дом. Мы толькі ўдваіх з жонкай жылі. Яна таксама пакінула дом».

Вось такія незабыўныя старонкі майго франтавога жыцця.

Клятву выканаў

Доўгі час родныя і блізкія не ведалі пра абставіны гібелі Мікалая Піліпавіча Авяр'янава (нарадзіўся ў 1922 г. у в. Негаўка). Ведалі толькі, што загінуў ён на берагах Волгі, пад Сталінградам.

Удалося знайсці ўзнагародны ліст, у якім апісаны яго подзвіг: «Баец Авяр'янаў М.П. у начным наступальным баі 5 кастрычніка 1942 года... на поўдзень ад хутара Хаванскі Серафімовіцкага раёна Сталінградскай вобласці прабраўся да дзота праціўніка і закідаў яго гранатамі, знішчыў разлік кулямёта і сам кулямёт. Пры блакіроўцы другога дзота закрыў амбразуру сваім целам і загінуў смерцю храбрых. Рота ў гэтым баі захапіла тры дзоты праціўніка і знішчыла многа салдат і афіцэраў.

Тав. Авяр'янаў М.П. З кастрычніка 1942 года быў прыняты партбюро кандыдатам у члены ВКП(б), дзе даў клятву храбра змагацца з ворагам, і ў баі 5 кастрычніка 1942 года сваю клятву з гонарам выканаў...»

За подзвіг М.П.Авяр'янаў загадам камандуючага войскамі Данскога фронту К.К.Ракасоўскага ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга пасмяротна.

У в. Негаўка Буда-Кашалёўскага раёна ўшаноўваюць памяць свайго земляка, які адным з першых у гады Вялікай Айчыннай вайны закрыў сваім целам амбразуру варожага дзота. У г. Серафімовіч Валгаградскай вобласці імем героя названа вуліца.

Н.Лукоўскі.

Парторг Ласуноў

У майскую раніцу 1944 г. парторг роты звярнуўся да салдат:

— Наперадзе Крым! За Перакопам вораг! Ён бязлітасны. Клянёмся, што дойдзем да Севастопаля! Смерць фашыстам!

Воіны дружна падтрымалі свайго парторга. Яны добра яго ведалі як сябра, адважнага і мужнага воіна, выдатнага снайпера.

На рахунку Міхаіла Ласунова было больш за 70 гітлераўцаў.

Пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі пачаўся штурм фашысцкіх умацаванняў. Наперадзе ішоў парторг роты, кавалер ордэна Славы старшына Міхаіл Кузьміч Ласуноў. Вораг адкрыў ураганны агонь. Байцы залеглі, упаў паранены Ласуноў. Тым часам наша артылерыя ўзмацніла агонь па нямецкіх агнявых кропках. Перасільваючы боль, Ласуноў першым падняўся ва ўвесь рост і скамандаваў:

— За мной, за Радзіму!

Рота працягвала штурм. Уварваліся ў першую траншэю, затым у другую. Наперадзе паранены Ласуноў. Ва ўпор парторг застрэліў варожага салдата, але тут жа сам атрымаў другое раненне. Да Ласунова падбег яго сябар Асанбай Каламбердзіеў. Хутка перавязаў раны таварыша. Ласуноў ціха сказаў:

— Бывай, Асанбай! Бывайце, дарагія мае салдаты-сталінградцы! Паміраю...

Сабраўшы апошнія сілы, схапіў за руку Асанбая і ціха сказаў:

— Памятайце нашу клятву! Да Чорнага мора, да Севастопаля...

Так закончыў свой жыццёвы шлях ураджэнец в. Калініна Буда-Кашалёўскага раёна М.К.Ласуноў. У 1937 г. ён скончыў Рудзянецкую сямігадовую школу, працаваў у Гомелі на заводзе. З 1939 г. у Чырвонай арміі. З першых дзён вайны на фронце.

С.Ц.Пігулеўскі.

Браты Стрыгалёвы

У цэнтры вёскі — абеліск, помнік загінуўшым у барацьбе з ворагамі... Прыходзяць сюды людзі, з шанаваннем здымаюць шапкі перад тымі, хто аддаў жыццё за свабоду роднай зямлі... Самая вялікая і прыгожая вуліца вёскі Глазаўка названа ў гонар братоў Стрыгалёвых. Калісьці тут жыў былы батрак Трафім Сідаравіч Стрыгалёў, тут раслі яго сыны — Трафім, Раман, Аляксей і Фёдар.

Калі ў Глазаўцы стварыўся калгас, аднымі з першых вырашылі ўступіць у яго браты Стрыгалёвы. Толькі бацька яшчэ хістаўся: хто яго ведае, як будзе ў тым калгасе?

М.К.Ласуноў (злева) з баявым сябрам.

— Вось пабачыш, бацька, зажывём па-новаму, усім гуртам ды грамадой многае пасільна, — гаварылі сыны. Пераканалі ўсё ж старога. Працавітыя, хватныя ў працы былі хлопцы. За што ні возьмуцца — гарыць справа ў іх руках. Гарнулася да хлопцаў і моладзь. Бывала, вечарам выйдуць за аколіцу браты Стрыгалёвы з гармонікам. Аляксей мяхі расцягне, заспявае. Яму хлопцы і дзяўчаты падпяюць. Потым у пляс выходзяць Трафім і Раман...

Такімі запомнілі братоў іх равеснікі — маладымі, вясёлымі, прыгожымі. І яшчэ — вельмі адказнымі ў справах. Нездарма Трафіма старшынёй сельсавета выбралі. Фёдару і Раману брыгаду даверылі. А Аляксей стаў старшынёй суседняга калгаса.

Пачалася вайна, і ўсе чатыры браты пайшлі абараняць Радзіму. На розных франтах ваявалі маёр Аляксей і лейтэнанты Раман, Трафім і Фёдар Стрыгалёвы. Смела, адважна яны ішлі ў бой, здзейснілі нямала подзвігаў. Трыццаць ордэнаў і медалёў заслужылі браты сваёй ратнай працай, воінскай доблесцю. У цяжкіх паходах, у жорсткіх баях яны часта думалі аб будучых мірных днях, калі вернуцца ў родную вёску. Ужо і недалёка быў час перамогі...

Аднойчы ў дом Трафіма Стрыгалёва прыйшоў паштальён. Паглядзеў на старога вінавата, цяжка ўздыхнуў:

— Вось як яно, бацька... Даруй за нядобрую вестку, — і апусціў галаву.

А дзядуля стаяў пасярод хаты, і ў яго дрыжачай руцэ трапяталі тры пахавальныя. На Аляксея, Рамана, Фёдара. Праз месяцы два прыйшло пісьмо ад сына Трафіма. Ён пісаў, што жывы, але вось са здароўем...

Дэмабілізавалі Т.Т.Стрыгалёва з арміі як інваліда. Пабыў дома ўсяго з тыдзень і ў райком партыі прыйшоў на-конт работы.

Пазней яго старшынёй калгаса выбралі ў адной з вёсак. Шмат сіл аддаў нядаўні франтавік аднаўленню разбуранай гаспадаркі, не зважаючы на свае незажываючыя раны.

Прайшоў час. Не стала апошняга з братоў Стрыгалёвых. Але яны застаюцца сярод тых, хто быў і будзе прыкладам для землякоў.

У.Пернікаў.

Іду на таран!

Для малодшага лейтэнанта Сталярова, як і ўсіх экіпажаў яго танкавага ўзвода, удзел у контрнаступленні на Курскай дузе быў першым баявым хрышчэннем. Напярэдадні ўзвод атрымаў новенькія, толькі што з заводаў «трыццацьчацвёркі».

Раніцай 6 ліпеня 1943 г. танк малодшага лейтэнанта Сталярова, умела манеўруючы на полі бою, вёў баявую чацвёрку танкавага ўзвода ў першых радах наступаючых войскаў палка.

А.В.Сталяроў.

Задача патрабавала выйсці на ўскраіну вёскі і авалодаць чыгуначнай станцыяй, моцна ўмацаваным апорным пунктам абароны праціўніка. Вырваўшыся наперад, танк Сталярова на ўскраіне вёскі аказаўся пад абстрэлам некалькіх цяжкіх самаходных гармат «фердынанд». Не зніжаючы хуткасці, экіпаж умела выйшаў з-пад абстрэлу і на працягу некалькіх хвілін падбіў два «фердынанды». Імкнучыся наперад, Сталяроў заўважыў, што ў тыл «трыццацьчацвёркам» яго ўзвода ад узлесся накіроўваюцца чатыры фашысцкія танкі «тыгр».

Малады камандзір загадаў механіку сваёй машыны змяніць напрамак атакі і ўдарыць з фланга па «тыграх». Адлегласць да варожых машын хутка змяншалася. Фашысты таксама заўважылі манеўр нашага танка, але не чакалі такой дзёрзкай атакі. Ад трапных выстралаў «трыццацьчацвёркі» загарэліся дзве машыны ворага. Але і фашыстам удалося падпаліць танк Сталярова. Цяжка параніла членаў экіпажа, моцна аглушыла і Андрэя Сталя-

рова. Перасільваючы боль, ён дабраўся да рычагоў кіравання. Танк гарэў, але яшчэ мог рухацца. Полымя лізала ўжо фарбу баявой гарматы. Страляць было немагчыма, і ў эфір пайшла радыёграма: «...Экіпаж выйшаў са строю. Танк гарыць. Іду на таран...»

Палаючая машына рванулася наперад, пакідаючы за сабой шырокі шлейф дыму...

Раздаўся страшэнны грукат і выбух. Над сутыкнуўшыміся танкамі ўзняўся слуп агню і дыму.

Вёсачка і станцыя былі ўзяты. За свой подзвіг ураджэнец вёскі Акцябр Андрэй Васільевіч Сталяроў быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені.

З задання не вярнуліся

Даніла Савельевіч Шпак нарадзіўся ў 1910 г. у в. Рудзянец. У 1927 г. паступіў у Ленінградскую лётную школу. Перад вайной маёр Шпак узначаліў 155-ы знішчальны авіяполк. Яго лётчыкі ахоўвалі неба Ленінграда, затым Петразаводска. У канцы 1941 г. за баявыя дзеянні яго полк адным з першых быў пераўтвораны ў 3-і гвардзейскі знішчальны авіяполк. У лютым 1942 г. пасля перападрыхтоўкі на новыя самалёты полк быў перакінуты на Волхаўскі фронт, удзельнічаў у прарыве блакады Ленінграда. За час баёў на гэтым фронце лётчыкі палка зрабілі 1647 баявых вылетаў, правялі каля 100 паветраных баёў, збілі ў паветры і знішчылі на зямлі 63 самалёты ворага. Полк страціў 16 лётчыкаў.

Аб адным з эпізодаў успамінаў намеснік камандзіра палка, заслужаны лётчык-выпрабавальнік А.В.Дзееў:

— Полк атрымаў загад атакаваць варожы аэрадром каля горада Луга. Камандзір палка падпалкоўнік Д.С.Шпак адабраў самых вопытных лётчыкаў — дзве чацвёркі. Першую павёў сам. У яе ўваходзіў і я. Другую вёў штурман палка маёр Г.К.Сіднеў. У час распрацоўкі плана аперацыі высветлілася, што нам на зваротны шлях не хопіць паліва. Выхад быў знойдзены камандзірам. Ён ведаў, што каля лініі фронту ёсць узлётная пляцоўка, з якой па начах узляталі самалёты У-2. На гэтай пляцоўцы мы падзапраўіліся і ўзялі курс на Лугу. Улічваючы, што нямецкі аэрадром абараняў вялікі заслон зенітак, Д.С.Шпак вырашыў падысці да яго на самай малай вышыні і раптоўна атакаваць.

Нам удалося знішчыць нямецкія самалёты на зямлі і ў паветры і знікнуць таксама раптоўна. Потым зрабілі разварот і яшчэ раз атакавалі праціўніка.

Загарэліся склады з палівам і боепрыпасамі, была знішчана зенітная батарэя.

Праз дзень мы зноў штурмавалі варожы аэрадром. На гэты раз раніцай, якраз перад вылетам нямецкіх самалётаў на бамбёжку нашых аб'ектаў. У выніку двух налётаў лётчыкамі палка было знішчана 27 варожых самалётаў, зенітная батарэя і шмат гітлераўцаў. За гэтыя вылеты камандуючы паветранымі сіламі Волхаўскага фронту генерал І.П.Жураўлёў аб'явіў палку падзяку, а камандзіру палка гвардыі падпалкоўніку Д.С.Шпаку быў уручаны другі ордэн Леніна.

Наперадзе былі новыя баі. У час аднога з іх, калі полк знаходзіўся на Сцяпным фронце, з баявога задання не вярнуліся камандзір палка Д.С.Шпак і камандзір эскадрыллі капітан С.Т.Штанухін.

У в. Сіняўскае Няклінскага раёна Растоўскай вобласці на брацкай магіле стаіць абеліск. На мармуровай дошцы выбіта: «Абаронцам данскога неба, лётчыкам 3-га гвардзейскага Растоў-Данскога знішчальнага палка, 181-га і 239-га знішчальных авіяпалкоў 15-й гвардзейскай Сталінградскай знішчальнай авіядывізіі 8-й паветранай Арміі».

Сярод многіх імён на гэтым абеліску ёсць і імя гвардыі падпалкоўніка Д.С.Шпака.

Трыццаць пяць гадоў лічыўся без вестак прапаўшым другі наш зямляк **Сяргей Васільевіч Картавенка,** лётчык 291-га знішчальнага авіяпалка.

Гэта здарылася 29 красавіка 1943 г. Гітлераўскае камандаванне, каб затрымаць імклівае наступленне Чырвонай арміі, кінула ў раён станцыі Наберджыеўскай Краснадарскага краю вялікія сілы сваёй авіяцыі. Лётчыкі 291-га знішчальнага палка смела атакавалі ворага. Прыклад мужнасці і адвагі паказаў намеснік камандзіра авіяэскадрыллі лейтэнант С.В.Картавенка. Праследуючы варожы бамбардзіроўшчык «Юнкерс-88», ён

выкарыстаў увесь боекамплект. Можна было выйсці з бою і вярнуцца на свой аэрадром. Але ў гэтым выпадку «юнкерс» скінуў бы свой смяротны груз на пазіцыі савецкіх войскаў. Лётчык вырашыў пайсці на таран. Некалькі імгненняў абодва самалёты на вялікай хуткасці несліся насустрач адзін аднаму. У апошні момант нямецкі лётчык не вытрымаў, яго «юнкерс» свечкай узмыў у неба. Картавенка накіраваў свой самалёт услед. Удар вінтом прайшоўся па хвасце «юнкерса». Той клюнуў носам і ўпаў на зямлю. Але загінуў і наш лётчык.

С.В.Картавенка нарадзіўся ў чэрвені 1919 г. у в. Рудня-Кашалёўская. Скончыў авіявучылішча. Быў накіраваны на ахову паветраных межаў на Далёкім Усходзе, дзе і застала яго Вялікая Айчынная вайна. Пасля шматлікіх рапартаў яго накіравалі на фронт.

І.П.Чарняк.

У баях за Каўказ

З успамінаў Ф.Жандарава

У пачатку верасня 1942 г. наш 519-ы стралковы полк 176-й стралковай дывізіі заняў абарону ў раёне Малгабека. Наперадзе Маздок, ужо заняты немцамі, ззаду — горад Грозны з нафтавымі вышкамі. На пазіцыю прыйшлі а другой палове ночы.

Раніцай з узыходам сонца фашысты пайшлі ў атаку. Усё кукурузнае поле з боку Маздока кішэла нямецкай пяхотай, танкамі. Становішча наша станавілася крытычным. Але аб адступленні і думкі не было. І раптам... Злева з-за сопкі штосьці загуло, і на немцаў пачалі густа сыпацца нейкія дзіўныя снарады. Вораг прыйшоў у замяшанне, пачалася паніка. Гэта на дапамогу нам прыйшлі дзесяць «кацюш».

Баі ішлі жорсткія. Былі дні, калі мы адбівалі па некалькі атак. Сотні фашыстаў знайшлі сабе магілу ў Маздокскім стэпе. Ды і мы неслі вялікія страты. Цяжка было губляць баявых сяброў. Ніколі не забыць мне лейтэнанта Іванова, адважнага камандзіра ўзвода. Не адзін танк быў падбіты ім асабіста. Навучыў ён гэтай справе і сваіх байцоў.

Пад трапным кулямётным агнём Сашы Рубцова фашысты падалі як падкошаныя. Не магу без болю ў сэрцы ўспомніць Толю Стэпнога, сувязнога камандзіра роты. Яму не было і 16 гадоў. Бацькоў яго, жыхароў Краснадарскага краю, закатавалі фашысты. Юнаку цудам удалося выратавацца, і ён прыстаў да нашай часці. Быў ён адважным байцом і загінуў ад варожай кулі, выратоўваючы камандзіра роты.

Успамінаецца мне такі эпізод. Познім лістападаўскім вечарам у зямлянцы штаба батальёна ішоў партыйны сход. На ім прымалі байцоў у партыю. Мяне таксама прымалі ў кандыдаты. І вось у гэты час пачуўся гул снарада. За ім другі, трэці і ні адзін не ўзарваўся. Дарэчы, такая з'ява назіралася не аднойчы: відаць, хтосьці працаваў на нашу перамогу там, у тыле ворага.

Ноччу 1 студзеня 1943 г. нам на змену прыйшлі новыя падраздзяленні. А наш полк, як і ўся дывізія, быў зняты для адпраўкі пад Новарасійск. Да Туапсе ехалі цягніком. Там увечары пагрузіліся на катэры і баржы і ўсю ноч плылі па моры. На світанні выгрузіліся ў Геленджыку і пешшу па горнай дарозе дабіраліся пад Новарасійск. Нарэшце прыбылі да месца. Пазіцыю занялі ў горнай лясной мясцовасці недалёка ад горада.

Наш пярэдні край быў надта цяжкім участкам фронту. Гэтыя цяжкасці ўскладняліся тым, што не было дарог, нельга было падвезці ні боепрыпасаў, ні прадуктаў. Болей іх дастаўлялі на плячах, таму што коней таксама не было.

А баі ішлі цяжкія, жорсткія. Вораг знаходзіўся на больш выгадных пазіцыях і дапякаў нас мінамётным і кулямётным агнём, абстрэльваў з гармат. Фашысты лютавалі, чапляліся за Новарасійск, бо з-пад Маздока, Нальчыка, Мінеральных Водаў яны былі выбіты і хутка адкатваліся пад націскам нашых войскаў.

Увечары 5 лютага нам стала вядома, што на Малую зямлю высадзіўся наш дэсант. Гэтую важную вестку ў нашай роце слухалі ўсяго пяць чалавек: столькі нас засталося з усёй роты.

Раніцай 6 лютага я зноў быў цяжка паранены. На другі дзень нас наведаў незнаёмы палітрук і паведаміў, што наш полк і 176-я стралковая дывізія сталі гвардзейскімі.

Пад Сталінградам

З успамінаў Пятра Яфімавіча Мальцава, былога парторга батальёна

23 чэрвеня 1941 г. я быў прызваны ў Чырвоную армію. Абараняў Маскву, змагаўся пад Сталінградам. Быў камсоргам асобнага батальёна. У снежні 1942 г. немцы прарваліся да Волгі, адрэзалі дывізію генерала Люднікава. У дывізіі сапсавалася рацыя, не было сувязі са штабам фронту. Падбіралі добраахвотнікаў, каб высветліць становішча. Пяць чалавек: старшы лейтэнант Палякоў, я і яшчэ тры байцы-пантоншчыкі рушылі на лодцы цераз раку. Да берага мы дабраліся нармальна, знайшлі штаб дывізіі. Генерал нанёс на карту каардынаты дывізіі, і мы рушылі назад. Гітлераўцы прыкмецілі нас і адкрылі моцны агонь, але нам пашанцавала застацца жывымі, толькі мяне і двух байцоў лёгка параніла.

Дывізія ў той час знаходзілася ў цяжкім становішчы: не было боепрыпасаў, харчавання, шмат было параненых, а пераправіць іх на другі бераг было немагчыма. Праз тыдзень мы атрымалі ўсё неабходнае. Дывізія адбіла атакі праціўніка. Удзельнічалі мы ў баях на тэрыторыі завода «Кастрычнік». Вялі начны бой за цэх № 38. За баі ў Сталінградзе я быў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

У званні малодшага лейтэнанта як парторг батальёна ўдзельнічаў у баях на Курскай дузе.

Два з паловай гады на перадавой

Лёс распарадзіўся так, што пасля заканчэння фабрычна-заводскага вучылішча ў г. Сталіна (Данецк) Дзмітрыя Іванавіча Казлова і іншых выпускнікоў накіравалі ў г. Магнітагорск. У гэты час ішла вайна. Таму ім з самых першых дзён свайго працоўнага стажу прыйшлося працаваць на вайну, па 16 гадзін у суткі. Аднаўлялі ў асноўным эвакуіраваныя ваенныя заводы.

Ішоў 1942 г. Ваенныя шпіталі Магнітагорска напаўняліся параненымі. Усё гэта бачылі беларускія хлопцы, і яны рваліся на фронт адпомсціць фашыстам. 5 мая 1942 г. некалькі былых выпускнікоў ФЗН, у тым ліку і Дзмітрый Казлоў, прыйшлі з заявамі ў ваенкамат. Просьба добраахвотнікаў была задаволена. Пасля нядоўгай ваеннай падрыхтоўкі Казлоў пападае на Паўночны Каўказ.

Пачаў вайну артылерыстам. У разліку было шэсць чалавек. «Саракапятку» цягалі на лямках. Іншага выйсця не было — ніякая тэхніка па гарах не магла прайсці.

— Гармата біла трапна. Не пералічыць, колькі было адбіта атак. А калі ў лістападзе 1942 г. мы пайшлі ў наступленне, я быў цяжка паранены, — успамінаў Казлоў.

Паўгода вандраваў па ваенных шпіталях салдат. Інвалідам вайны трэцяй групы камісавалі.

— Куды ехаць? — задумаўся Казлоў. Радзіма яго, Беларусь, была акупіравана немцамі. Дарога ў родную Недайку пакуль была закрыта. Вырашыў ехаць на Урал, у знаёмыя мясціны.

Усяго тры месяцы інвалід вайны папрацаваў на ваенным заводзе ў Ніжняй Губе. Затым зноў, гэты раз на мыліцах, адправіўся ў ваенкамат. Пасля настойлівых і доўгіх просьбаў яго нарэшце прызвалі ў армію, накіравалі ў пяхотнае вучылішча.

І зноў фронт. Да канца вайны сяржант Казлоў — камандзір гарматы. Прайшоў Украіну, Польшчу, Румынію, Чэхаславакію.

Асабліва запомніўся баявымі дзеяннямі Сандамірскі плацдарм у Польшчы.

Па 7—8 атак за суткі прыходзілася рабіць, — расказаў Дзмітрый Іванавіч, — але узброены да зубоў вораг трымаўся моцна. На нашы атакі адказваў шквальным агнём. Мы неслі вялікія страты, байцы гінулі на вачах. Хавалі іх ноччу. Але ж выстаялі. Плацдарм аказаўся ў нашых руках. За ўзяцце гэтага плацдарма я ўзнагароджаны медалём «За адвагу», а пазней быў прадстаўлены да ордэна Айчыннай вайны.

Вайну Д.І.Казлоў закончыў у Празе. Але да дэмабілізацыі заставалася яшчэ доўга. Толькі ў сакавіку 1947 г. вярнуўся ў родную Недайку.

М.Чэчка.

Лёс салдата

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Уладзіміру Дзюбчанку споўнілася ўсяго 15 гадоў. Аднак ужо ў наступным годзе юнак далучыўся да партызанскага атрада, які потым перарос у 1-ю Гомельскую партызанскую брыгаду. На першым часе Валодзя дзейнічаў падпольна. У яго абавязкі ўваходзіла збіраць і перадаваць у атрад звесткі аб руху цягнікоў цераз станцыю Буда-Кашалёўская, аб перавозімых грузах. У 1943 г. партызаны ўзарвалі вадакачку, якая абслугоўвала чыгунку. Дзюбчанка таксама ўдзельнічаў у гэтай аперацыі. Вось яго апісанне той дыверсіі.

— Вадакачка мела двайную агароджу з адзінымі варотамі. Мне было даручана ўвайсці ў давер да мадзьяраў, якія неслі там ахову. Я пачаў часта хадзіць на вадакачку, прыносіў салдатам яйкі, хлеб. Хутка пасябраваў, многіх ведаў паймення. У той дзень мне далі заданне якім-небудзь чынам адкрыць вароты, каб партызаны змаглі лёгка пранікнуць на тэрыторыю вадакачкі. Я звярнуўся да салдата, які стаяў на варце, каб прапусціў да каменданта, буду, маўляў, прасіць каня, каб пасеяць жыта. Той узяўся мяне праводзіць, паспачуваўшы нават, што я лёгка апрануты ў такое надвор'е. А вароты засталіся прыадкрытымі. У гэты момант і наскочылі партызаны. Практычна без бою ўсіх забралі ў палон, а вадакачку ўзарвалі. Пасля гэтай дыверсіі на некалькі тыдняў рух на чыгунцы быў паралізаваны. Аднак і мне заставацца ў вёсцы далей было нельга. Пайшоў у атрад, стаў кулямётчыкам. А ў кастрычніку 1943 г. брыгада злучылася з войскамі дзеючай арміі.

З гэтага моманту У.І.Дзюбчанка пачаў адлік франтавых дарог. Слаўгарад, Карма, Доўск, Быхаў, Кіраўск, Мінск, Негарэлае, Беласток, Польшча, Усходняя Прусія. Уладзімір Іосіфавіч ужо камандзірам узвода, камсоргам асобнай зенітнай роты ва Усходняй Прусіі атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі за выратаванне начальніка штаба і праяўленую пры гэтым мужнасць. А першы раз быў прадстаўлены да ўзнагароды ордэнам Славы III ступені яшчэ за баі за Нарву. Аднак атрымаць гэты ордэн тады не давялося.

У.І.Дзюбчанка.

Ужо адчуваўся хуткі канец вайны. Уладзіміра Іосіфавіча накіравалі на вучобу ў Чаркаскае пяхотнае вучылішча. Трэба было ехаць у тыл. Але старшына папрасіўся ў камандавання пабыць апошнюю ноч са сваім узводам. А раніцай яго цяжка параніла. Замест вучобы пачаліся блуканні па шпіталях. У Каўнасе смерць была ад яго ў некалькіх кроках.

— Ноччу ў шпіталь прыйшлі «зялёныя браты» (літоўскія нацыяналісты), — успамінаў У.І.Дзюбчанка, — перарэзалі ўвесь медперсанал і хворых. Я ляжаў увесь у гіпсе. Яны паглядзелі на мяне і сказалі на чыстай рускай мове: «Этот сам подохнет». І я застаўся адзін. Трое сутак праляжаў сярод трупаў.

Калі прыйшлі савецкія воіны, ледзь распазналі, што я жывы. І зноў шпіталі.

Дадому Уладзімір Іосіфавіч вярнуўся з пакалечанай нагой. Закончыў тэхнікум. Ажаніўся. Стаў працаваць у Буда-Кашалёўскім лягасе.

В.Савельеў.

Незабыўны год

З успамінаў Р.Кавунова, жыхара пасёлка Уза

Мне і маім сябрам было тады па 18, і ваяваць давялося толькі адзін год. Мабілізавалі нас, аднагодак з Уваравіч, Глазаўскага, Гусявіцкага, Блюдніцкага, Калінінскага, Ліпскага, Марозавіцкага сельсаветаў вясной 1944 г. Як цяпер памятаю, са мною былі Алег Сяргееў, Павел Собаль, Уладзімір Прышчэпаў з Уваравіч, мой сябар Мікалай Трафімаў з калгаса «Новае жыццё», Міхаіл Міхалкін з Блюдніцы, Аляксандр Куркоў з Рудзянца і многія іншыя. На месцы прайшлі ваенную падрыхтоўку.

Вядома, кожны з нас ірваўся ў дзеючую армію. У Гомелі нас пагрузілі ў эшалоны і

павязлі на Маскву. Усе мы лічылі, што трэба ехаць на фронт, а тут вязуць у глыбокі тыл. Але хутка мы даведаліся, што едзем на абарону Ленінграда, блакада якога была прарвана ўжо. Паколькі дарога на Віцебск была яшчэ ў руках ворага, нам давялося дабірацца ў Ленінград абходным шляхам. З нашага эшалона ішло фарміраванне 128-й асобнай зенітна-артылерыйскай брыгады. Ставілася задача ахоўваць неба Ленінграда ад варожых паветраных налётаў. Мяне, Сяргеева, Собаля, Вінічэнку, Проніна і іншых, чалавек 25, накіравалі ва ўзводы ўпраўлення.

Праз два тыдні каранціну брыгаду накіравалі на фронт. Вывезлі нас да прыгарадных населеных пунктаў Ленінграда. У Пулкаве мяне прынялі ў камсамол.

Вядома, гэта не быў непасрэдна фронт. Але заданні нам давалі розныя, складаныя і рызыкоўныя. Перад сувязістамі стаяла задача навесці і забяспечыць работу тэлефоннай сувязі. Загад атрымалі. Але дзе ўзяць кабель? Сказалі, каб сабралі трафейны.

Пры выкананні гэтага загаду многія таварышы траплялі на варожыя міны. Мяне таксама лёгка параніла. Затым мы займаліся расшырэннем зямлянкі апаратыўнага штаба каманднага пункта. Будматэрыялы павінны былі ўзяць з нямецкіх зямлянак, бліндажоў, дотаў і дзотаў. Выкарыстоўвалі для гэтага толавыя шашкі. Пры выкананні такой работы з-за неасцярожнасці Алёшу Акулава забіла. Собаля, Крывашэева і Сяргеева кантузіла. Давялося даводзіць справу да канца з іншымі таварышамі.

Пад Ленінградам мы праслужылі да канца вайны. Ганарыліся тым, што ўнеслі і свой невялікі ўклад у разгром ворага.

Франтавыя дарогі шафёраў

З першага і да апошняга дня вайны прайшоў баявы шлях у складзе 21-й паветранай арміі вадзіцель Аляксандр Васкоўскі. Прымаў удзел у абароне Масквы, за што адзначаны медалём. За мужнасць, праяўленую ў баях на Курскай дузе, Аляксандр Аляксеевіч узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». І, нарэшце, 1-ы Беларускі фронт, вызваленне Гомеля і нашага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Потым былі Германія, Берлін, Дзень Перамогі і вяртанне да мірнай працы. Больш як трыццаць гадоў працаваў Аляксандр Аляксеевіч шафёрам у сельскай гаспадарцы.

Адзначыла Радзіма і працоўны подзвіг былога салдата. Аляксандр Аляксеевіч — кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.

П.Мінкоў.

* * *

21 чэрвеня 1941 г. Напярэдадні ва Уваравіцкай сярэдняй школе закончыліся экзамены на атэстат сталасці. Разам з адміністрацыяй вучні рыхтаваліся да выпускнога балю. Але ўсе планы перабытала вайна...

Разам з маці-настаўніцай былая выпускніца школы Ада Майсеенка эвакуіравалася на ўсход. У г. Улан-Удэ яна прыняла канчатковае рашэнне: як мага хутчэй адправіцца на фронт. У аблваенкамаце дзяўчыну накіравалі ў вучэбны аўтаполк г. Іркуцка. Пасведчанне вадзіцеля Майсеенка атрымала ў г. Паўлаве. На фронт трапіла ў канцы 1943 г. Ваявала ў складзе 4-га гвардзейскага мехкорпуса генерал-лейтэнанта Жданава. Баявое хрышчэнне Ада Паўлаўна атрымала пры вызваленні г. Нікалаева. Удзельнічала ў баях за Адэсу, Румынію, Балгарыю, Югаславію, Венгрыю. За ўдзел у разгроме Яска-Кішынёўскай групоўкі была ўзнагароджана медалём «За адвагу». Ёсць у яе і медаль «За вызваленне Бялграда». Асабліва жорсткімі былі баі каля возера Балатан у Венгрыі. Абарону тут трымалі адборныя часці фашыстаў. У ходзе баёў ёй даводзілася не толькі падвозіць снарады, але разам з байцамі адбіваць варожыя контратакі. За гэтыя баі жанчына-шафёр была ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі.

Дзень Перамогі Ада Паўлаўна сустрэла ў Будапешце. А 13 жніўня 1945 г. яна дэмабілізавалася. Працавала настаўніцай, у школьнай бібліятэцы ў в. Рудзянец.

Б.Барысаў.

Вёсны Соф'і Голухавай

Соф'я Васільеўна Голухава з в. Люшава — адна з чатырох медсясцёр Беларусі, удастоеных высокай міжнароднай узнагароды — медаля імя Флорэнс Найцінгейл. Адданасць Радзіме, бязмежная вера ў перамогу, мужнасць, вернасць воінскаму абавязку, гатоўнасць ахвяраваць сабой, любоў да медыцынскай прафесіі — вось рысы яе характару. За ратны подзвіг у Вялікай Айчыннай вайне Соф'я Васільеўна узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені, шматлікімі медалямі...

...На другі дзень вайны Соф'я Голухава з'явілася ў ваенкамат для адпраўкі на фронт. А яшчэ праз дзень ехала маладая медсястра ў пасажырскім вагоне на захад, у горад Картуз-Бяроза, у воінскую часць. Але да месца прызначэння не даехала. Недалёка ад Мінска эшалон разбамбілі. Тут Соня і прыняла сваё баявое хрышчэнне. Яна першая кінулася на дапамогу параненым. У Мінску даведалася, што яе воінская часць знаходзіцца ў Барысаве і ёй трэба туды дабірацца самастойна.

У пачатку ліпеня 1941 г. Соф'я Голухава была накіравана ваеннай медсястрой на санітарны параход «Клім Варашылаў», які развозіў цяжка параненых байцоў па шпіталях, размешчаных на берагах Волгі. Але дзяўчына імкнецца трапіць на фронт і піша рапарт з просьбай накіраваць яе ў дзеючую армію.

Яе накіроўваюць у 235-ы асобны медсанбат 134-й стралковай дывізіі. У лютым 1942 г., пасля перафарміравання дывізіі, Голухава накіравана на Калінінскі фронт. Тут пад горадам Тарапцом доўгі час ішлі ўпартыя баі. Медсанбат быў перагружаны паранепымі. Як аперацыйнай сястры Соф'і Васільеўне даводзілася працаваць амаль круглыя суткі.

1942 г. Ішлі жорсткія баі... Камандаванне дывізіі звярнулася з заклікам: «Патрэбны медработнікі на перадавую!». Першымі з медсанбата прыйшлі камсорг Тоня Панамарова і камуніст Соня Голухава.

Аднойчы за двое сутак бесперапыннага бою яна аказала першую медыцынскую дапамогу і вынесла з поля бою сорак параненых воінаў. У гэтым жа баі была цяжка паранена і сама. У выніку ранення ў Соф'і Васільеўны была ампутавана левая рука, выдалены локцевы сустаў правай рукі, значна пакарочана правая нага.

Два гады лепшыя ўрачы Масквы і Ташкента спачатку змагаліся за яе жыццё, потым — за яе здароўе, дапамагалі, вучылі. Усё прыходзілася пачынаць занава. Дзяўчына не ўпала духам, не разгубілася. Знаходзячыся ў шпіталях, здабыла дзве спецыяльнасці: стэнаграфісткі і бухгалтара. Але ўжо тады Соня цвёрда ведала, што працаваць не зможа нідзе, акрамя медыцыны. Урачы ж сказалі, што шлях туды для яе закрыты.

Дадому, у сваю вёску Люшаў, Соф'я Васільеўна вярнулася ў жніўні 1944 г. Родным не пісала аб выніках ранення, але не прыехаць не магла. Збалелася душа па любімай маці, па радзіме. Са станцыі дабіралася пешшу. Да роднай хаты прыйшла ноччу. Радасць сустрэчы была бязмернай. Доўга свяціліся ў тую ноч вокны ў доме Голухавых. А раніцай, прачнуўшыся, Соф'я ўбачыла каля свайго ложка маці, якая ціха плакала. Як ні цяжка было, Соф'я Васільеўна вярнулася да любімай прафесіі. Больш за 25 гадоў працавала яна загадчыцай Буда-Кашалёўскага фельчарска-акушэрскага пункта, потым старшай медсястрой у Любавінскай бальніцы.

П.Макараў.

С.В.Голухава.

Сустрэчы на Эльбе

Нічыпар Нічыпаравіч Кастуноў з Губіч на фронце з першых дзён вайны. Франтавыя дарогі яго праляглі па Беларусі, Польшчы, Германіі. Служыў у сапёрнамінным батальёне. І тут, у неймаверна цяжкіх умовах, праявіў свае лепшыя якасці: кемлівасць, майстэрства, самаадданасць.

У Польшчы за хуткую арганізацыю пераправы быў узнагароджаны медалём «За адвагу». Узводзіць яе давялося пад моцным агнём ворага. Быў паранены. Пасля шпіталя зноў на фронце.

Наперадзе быў Одэр. Не проста рака, а цэлая інжынерная камунікацыя абароны фашыстаў. Яе лічылі неадольнай. Складалася яна з трох ліній, якія аддзяляліся адна ад адной рачнымі глыбокімі рукавамі. Пяцярым добраахвотнікам, якіх узначаліў Нічыпар Нічыпаравіч, было даручана ноччу зрабіць пераправу. Гэта дазволіла нашым войскам замацавацца на вельмі важнай пазіцыі. За гэты подзвіг Кастуноў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Вайна падыходзіла да канца. На дварэ — красавік. Але наперадзе яшчэ шмат баёў. На навядзенне чарговай, надзвычай патрэбнай, пераправы Нічыпару Кастунову і яго трыццаці польскім сабратам спатрэбілася дзве гадзіны, па інжынерных жа падліках неабходна было дзесяць. І нічога дзіўнага тут няма. Поспех аперацыі часта вызначалі хвіліны, а салдацкі гераізм не ведае меж. За праяўленыя мужнасць і гераізм Кастуноў атрымаў на гэты раз ордэн Айчыннай вайны I ступені.

Апошняя пераправа ў салдата была на Эльбе. Пабудавалі яе сумесна з амерыканскімі салдатамі.

Дайшоў да Эльбы і жыхар в. Буда-Люшаўская **Міхаіл Мінавіч Церашкоў**, які да восені 1943 г. ваяваў у складзе Журавіцкай партызанскай брыгады. Быў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». У кастрычніку таго ж года, пад час злучэння партызан з наступаючай арміяй, Міхаіла Мінавіча накіравалі на курсы малодшых камандзіраў. Пасля іх заканчэння быў прызначаны камандзірам кулямётнага разліку. І павялі яго дарогі франтавыя. Рослаўль — Гомель — Добруш — Старое Сяло. Стаіць Старое Сяло на высокім беразе Сожа. Нялёгкім быў бой за яго. Упершыню давялося Церашкову прымаць удзел у фарсіраванні ракі. Вызваляў Буда-Кашалёва, Жлобін, Рагачоў, Бабруйск, Мінск, Гродна, Баранавічы, Варшаву, удзельнічаў у баях за Кёнігсберг. У час фарсіравання Одэра быў паранены, але працягваў бой. Аб узнагароджанні ордэнам Чырвонай Зоркі даведаўся ў шпіталі. Са шпіталя трапіў на штурм Берліна.

На Эльбе адбылася памятная сустрэча з амерыканскімі салдатамі.

П.Кавуноў.

Дайшлі да Берліна

Дваццацігадовы выпускнік Харкаўскага ваеннага вучылішча **лейтэнант Данцоў** толькі з'явіўся ў сваю часць для праходжання службы, як пачалася вайна. З першых яе дзён — упартыя абарончыя баі на Правабярэжнай Украіне, радасць першых перамог і горыч адступлення з баямі да Курска, першае цяжкае раненне ў канцы снежня 1941 г.

Пасля шпіталя яго накіравалі камандзірам роты ў суворaўскае вучылішча ў г. Астрахань. Але ён падаваў рапарт за рапартам аб накіраванні на фронт, і, нарэшце, яго просьбу задаволілі. Старшы лейтэнант Данцоў стаў камандзірам кулямётнай роты 220-га палка, які ў той час ваяваў ужо пад Жлобінам.

У сакавіку 1944 г. яго дывізія з-пад Буда-Кашалёва была перакінута ва Украіну, дзейнічала на ковельскім напрамку і хутка выйшла на граніцу з Польшчай. Вось тут у адным з баёў і праявіла сябе рота старшага лейтэнанта Данцова. Многія воіны яго роты атрымалі баявыя ўзнагароды, а камандзір свой першы ордэн — Айчыннай вайны II ступені. У хуткім часе на яго грудзях з'явіўся і другі ордэн — Айчыннай вайны I ступені. У баях на Кюстрынскім плацдарме, адкуль да Берліна заставалася ўсяго 60 кіламетраў, капітан Міхаіл Данцоў камандаваў ужо батальёнам. За праяўленыя мужнасць і гераізм ён быў узнагароджаны яшчэ адным ордэнам Айчыннай вайны I ступені і ордэнам Аляксандра Неўскага, які ўручыў яму камандуючы 69-й арміяй генерал У.Я.Калпакчы.

Вярнуўся франтавік у родную в. Кашалёў у кастрычніку 1945 г. Да баявых узнагарод Міхаіла Сямёнавіча дабавіліся медалі «За працоўную доблесць» і «Ветэран працы».

Б.Лебедзеў.

Пасля вызвалення раёна ад фашысцкіх захопнікаў **Васіль Данілавіч Баркоў** з в. Іванаўка быў прызваны ў Чырвоную армію. Закончыў курсы кулямётчыкаў, што размяшчаліся ў суседняй в. Патапаўка, і адразу ж на перадавую. Вызваляў родную Бе-

ларусь, Украіну. Атрымаў першую сваю баявую ўзнагароду — медаль «За адвагу». За фарсіраванне ракі Віслы кулямётчык В.Баркоў быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Ордэн Славы II ступені быў уручаны яму за фарсіраванне ракі Одэр. Цяжкае становішча склалася ў час баёў за Берлін. 2 мая 1945 г. стралковая рота, у якой служыў В.Баркоў, аказалася ў акружэнні гітлераўцаў. Быў забіты камандзір роты. Кулямётчыкі на момант разгубіліся. Камандаванне ротай узяў на сябе сяржант Васіль Баркоў. Чатыры гадзіны працягваўся няроўны бой. Нашы кулямётчыкі адбілі 7 атак праціўніка. Своечасова падышла дапамога — 9 танкаў і рота аўтаматчыкаў. За гэты бой сяржант В.Д.Баркоў быў узнагароджаны ордэнам Багдана Хмяльніцкага.

І.П.Чарняк.

З успамінаў П.Харламава, жыхара в. Крыўск

Пасля вызвалення маёй роднай в. Крыўск восенню 1943 г. (тады мне было толькі 17 гадоў) я пайшоў на фронт добраахвотнікам. Пасля кароткай ваеннай падрыхтоўкі хутка прыняў удзел у баявых аперацыях. Першымі з іх былі баі непадалёку ад Жлобіна.

Мне давялося служыць у рэзервовых войсках Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Нашу гвардзейскую артылерыйскую процітанкавую брыгаду часта кідалі туды, дзе цяжэй. Давялося вызваляць Бабруйск, граміць акружаных у мінскім «катле» гітлераўцаў, прайсці з баямі ўсю Беларусь.

Штурмавалі Варшаву, Познань, Шчэцін і іншыя гарады. За штурм умацаванняў Шчэціна я быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Маю і іншыя баявыя ўзнагароды.

У нас было правіла: за кожны падбіты варожы танк на гармаце малявалі чырвоную зорачку. На гармаце нашага разліку іх было 30.

Закончыў вайну ў Берліне. І вельмі крыўдна было, што ў Дзень Перамогі атрымаў цяжкае раненне.

Баявыя шляхі землякоў

Вайна застала хлопца з в. Саўгаснае **Васіля Дзегцярова** ў літоўскім г. Шаўляй, дзе ён праходзіў тэрміновую службу ў асобнай вучэбнай аўтароце. Спачатку чырвонаармейцы пачулі страляніну і выбухі. Ім гаварылі, што германскія войскі праводзяць вучэбныя заняткі. Аднак неўзабаве з'явіліся параненыя, пачалі ў спешным парадку выязджаць сем'і ваенных. Так яны даведаліся, што пачалася вайна.

Разам з часцямі Чырвонай арміі баец Дзегцяроў адступаў да Ленінграда. Потым ён быў ва ўзводзе разведкі. У адной з аперацый з дванаццаці разведчыкаў двое загінулі, чацвёра былі паранены, Васілю асколкамі перабіла абедзве нагі. Сем месяцаў праляжаў ён у шпіталі.

Пасля выздараўлення яго накіравалі ў запасныя часці на Урал, але Васіль Цярэнцьевіч прасіўся на фронт і дабіўся свайго. Ён быў накіраваны пад Сталінград у 126-ю двойчы Чырванасцяжную Горлаўскую стралковую дывізію. У гэты час варожая групоўка ўжо была акружана і разгромлена.

Прайшоў праз усю Украіну. Пры мініраванні дарогі атрымаў другое раненне. А потым былі Літва, Прусія, Германія. Вестка аб перамозе застала яго на подступах да Берліна.

Мужнасць і адвага салдата адзначаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Славы II і III ступеней, Айчыннай вайны I і II ступеней. У мірны час да франтавых узнагарод дабавіліся працоўныя.

І.П.Чарняк.

Іван Патапавіч Ганчароў з в. Дзербічы баявы шлях пачаў з г. Новая Ладага. За час вайны лётчык зрабіў 213 баявых вылетаў, з іх 160 разведвальных. На яго рахунку чатыры збітыя варожыя самалёты.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга (тройчы), Айчыннай вайны I ступені, сямю медалямі.

Баявое хрышчэнне **Яўгена Аляксеевіча Далецкага** адбылося ў Польшчы. Яно адзначана медалём «За вызваленне Варшавы».

У першай палавіне лютага фарсіравалі Одэр. Зачапіліся за маленькі плацдарм і ўтрымлівалі яго каля месяца. Было адбіта некалькі атак фашыстаў.

Далей шлях ляжаў да Берліна. Тройчы Далецкі з сябрамі хадзіў за «языком» у размяшчэнне ворага. За праяўленую мужнасць быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Пад Берлінам быў паранены.

Пасля вайны Яўген Далецкі працаваў настаўнікам, інспектарам аддзела адукацыі.

Баявая біяграфія **Аркадзія Фёдаравіча Чарнякова** пачалася ў партызанскім атрадзе імя Кутузава, у якім ён быў разведчыкам.

Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў А.Ф.Чарнякова прызвалі ў армію. А неўзабаве грудзі воіна ўпрыгожыў медаль, які ў адным з баёў выратаваў салдату жыццё, прыняўшы на сябе ўдар кулі. Гэта было ў канцы вайны, калі баі ішлі на тэрыторыі Германіі. Закончылася баявая біяграфія Аркадзія Фёдаравіча на Одэры, дзе ён быў цяжка паранены.

Р.Казлова.

Сяргей Васільевіч Шчарбакоў быў у гады вайны штурманам эскадрыллі ў 4-м гвардзейскім авіяцыйным Гомельскім корпусе, зрабіў каля трохсот баявых вылетаў. Не раз у 1943 г. быў маёр Шчарбакоў у начным небе нашага раёна. Над райцэнтрам і Узой, Шарыбаўкай і Недайкай раскідваў сотні лістовак, якія расказвалі праўду аб становішчы на франтах.

Мікалай Канстанцінавіч Кругляко̆ў родам з г. Буда-Кашалёва. Ваяваў на Ленінградскім, Заходнім франтах, вызваляў Беларусь, удзельнічаў у разгроме гітлераўскіх войскаў пад Кёнігсбергам. Закончыў вайну на Далёкім Усходзе.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі (тройчы), Айчыннай вайны I і II ступеней, многімі медалямі.

Міхаіл Ільіч Ганоў з в. Негаўка на фронце з верасня 1941 г. Ваяваў ва Украіне, у Крыме. Камандзір кавалерыйскага эскадрона, афіцэр сувязі штаба 56-й арміі, аддзела кадраў 5-га Данскога корпуса. Удзельнічаў у баях у Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеней, многімі медалямі.

Анатоль Данілавіч Глушко вайну пачаў на Паўднёвым фронце, працягваў на 3-м Беларускім і 1-м Прыбалтыйскім франтах. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, шматлікімі медалямі.

З успамінаў Уладзіміра Васільевіча Царыка

У Чырвонай арміі я з 1939 г. У першыя месяцы вайны — камандзір кулямётнага разліку і памочнік камандзіра ўзвода, абараняў паўвостраў Ханка. Пасля эвакуацыі гарнізона з паўвострава пад Ленінград служыў палітруком і камандзірам кулямётнай роты ў 86-й стралковай дывізіі.

10 верасня 1942 г. наша рота ўдзельнічала ў фарсіраванні ракі Нявы, падтрымлівала пераправу. Усе 12 станковых кулямётаў былі ўстаноўлены на брустверы і вялі агонь у глыбіню абароны немцаў. У хуткім часе атрымалі загад пераправіцца на левы бераг Нявы і мы. Падцягваючы да ракі лодкі, не заўважылі нямецкіх самалётаў. На нас сталі падаць бомбы. Пашчасціла ўсім астацца жывымі. Раніцай непрыметна пераправіліся цераз раку і занялі абарону. Мы адбівалі адну атаку за адной. Фашысты вырашылі знішчыць нас з паветра. Безперапынна наляталі нямецкія самалёты. Многа загінула тады нашых салдат, але сваю пазіцыю мы ўтрымалі. Потым абаранялі лядовую дарогу, устанавіўшы свае кулямёты на лёдзе Ладагі. Я там быў цяжка паранены.

З успамінаў Е.Ф.Шпака

У 398-ы гаўбічна-артылерыйскі полк я трапіў у 1939 г., калі быў прызваны ў Чырвоную армію. У складзе 102-га асобнага процітанкавага батальёна мяне накіравалі на Фінляндскі фронт. Быў наводчыкам гарматы. У Айчынную вайну ваяваў пад Ленінградам, на Калінінскім фронце. Вызваляў Клін, Калінін, Асташкава, Таржок, Вялікія Лукі, Ржэў. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У баях за горад Белы, што на Смаленшчыне, быў паранены. Пасля выздараўлення накіраваны ў запасны полк, затым у танкава-тэхнічнае вучылішча, якое закончыў у 1944 г. Працягваў ваяваць на 1-м Украінскім фронце. Вызваляў Польшчу, Чэхаславакію. Вайну закончыў у Германіі.

З успамінаў Івана Міхайлавіча Мурзаева, былога камандзіра кулямётнага ўзвода

Ішлі жорсткія баі пад Сталінградам. Наш полк размяшчаўся ў лагчыне Грачавая. Я, ка-

мандзір кулямётнага ўзвода, атрымаў загад авалодаць вышынёй. 9 студзеня пачалі рухацца да вышыні. Ішлі асцярожна, рабілі праходы ў мінным полі. Агонь мінамётнай батарэі дапамог нам блізка падысці да цэлі. З воклічам «ура!» кінуліся наперад, уварваліся ў дзот, знішчылі 10 нямецкіх салдат і афіцэраў, астатнія адступілі да саўгаса «Вопытнае поле». Праз дзень саўгас быў ачышчаны ад ворага.

З успамінаў падпалкоўніка ў адстаўцы Канстанціна Яўхімавіча Будзюхіна

У рады Чырвонай арміі я прыйшоў у 1937 г. па закліку камсамола. Праўда, адразу ж пасля заканчэння школы абраў спецыяльнасць педагога. Вучыўся ў Рэчыцкім педагагічным вучылішчы.

Вялікую Айчынную вайну сустрэў курсантам ваенна-палітычнага вучылішча. Пасля заканчэння яго быў накіраваны ў баявую часць.

Наша артылерыйская батарэя ўдзельнічала ў вызваленні горада Станіслава і іншых населеных пунктаў Заходняй Украіны. Потым былі баі на тэрыторыі Малдавіі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Пасля перамогі над фашысцкай Германіяй я знаходзіўся на розных камандных і палітычных пасадах у Савецкай арміі.

Пісьмы з фронту

Няма больш праўдзівых і больш хвалюючых дакументаў аб вайне, чым франтавыя пісьмы.

Вось вытрымкі з некаторых франтавых пісем, што захоўваюцца ў музеі сярэдняй школы № 1 г. Буда-Кашалёва.

У в. Наспа Губіцкага сельсавета ў пачатку мая 1944 г. на імя Нічыпара Мікалаевіча Разуванава прыйшоў ліст з г. Баку ад сына Мікалая:

«Здравствуйте, многоуважаемые родители!

С горячим гвардейским приветом к вам ваш сын Коля. В первых строках своего письма я хочу вам сообщить, что я пока жив и здоров и нахожусь на излечении в госпитале гор. Баку после ранения. Ранен в правую ногу с переломом кости. Это уже 6 ранение за время Отечественной войны. Послал вам два письма из г. Днепропетровска, и сейчас, когда меня эвакуировали в г. Баку, я решил написать еще одно письмо. В настоящее время живу хорошо. Здоровье отличное. Ранка моя скоро заживет и приблизительно 1 мая выпишусь из госпиталя. Дорогие родители, это письмо я пишу для того, чтобы вы знали, что ваш сын Коля жив и здоров и желает вам хорошей и счастливой жизни после освобождения от немецкого рабства. Дорогие родители, ответа мне прошу вас не давайте, потому что я его не получу, так как скоро выпишусь из госпиталя. Мне очень интересно было бы узнать, как вы живете, живы ли все и т.д. Вот пока все, что я хотел вам написать в своем маленьком письмеце. Передавайте привет близким и знакомым, родным. Может кто из братьев пишет письма, то передайте им мой братский гвардейский привет. До свидания, дорогие родители. С крепким поцелуем к вам ваш сын Николай.

До свидания.

С приветом Коля. 20.4.44».

У канцы лютага 1944 г. на ст. Буда-Кашалёўская прыйшло пісьмо Т.Л.Лісейчыкаву:

«Здравствуйте, дорогие родные!

Пишу письмо под градом пуль и грохотом снарядов фашистских извергов. Получил Ваше письмо, за которое большое спасибо. Здоровье мое хорошее, а как дальше будет, не знаю. Если буду жив, буду писать. Мы сейчас под Рогачевом.

Ваш сын Василий».

У сакавіку 1944 г. пад Рагачовам Васіль Лісейчыкаў загінуў.

1 чэрвеня 1944 г. бацькі атрымалі пісьмо ад салдата Фёдара Лахмакова, у якім ён расказаў аб сваім баявым жыцці, аб сваіх сябрах.

17 снежня гэтага ж года прыйшло пісьмо з воінскай часці, дзе служыў Фёдар:

«Уважаемая товарищ Лохмакова!

Вчера от Вас было получено письмо на имя нашего бойца, которое было передано мне для ответа Вам. Сообщаю, что Ваш брат старшина Федор Лохмаков был убит в августе под станцией Анна в Латвийской ССР.

Жаль его, он такой был жизнерадостный, веселый, молодой парень. Мы переживаем его утрату. Прошу Вас, поверьте мне как офицеру. За Федора мы отомстим и будем беспощадно истреблять зверей-фашистов.

С приветом к Вам старший лейтенант Лучинов Я.К.».

Канстанцін Георгіевіч Юрчанка да вайны працаваў у Буда-Кашалёўскай школе настаўнікам. У першыя дні 1944 г. яго дзяўчына Ганна атрымала вось такі ліст:

«С новым годом, с новым счастьем, Анка!

Милая Аннушка, письма твои с платочком и пупсиком до меня дошли и очень даже вовремя, за что сердечно тебе благодарен. Ты не представляешь, как я был счастлив на этот раз, встречая новый год уже третий раз на фронте, получив твои новогодние письма. Одновременно стыдно стало за себя перед тобой до корки волос, с этим стыдом сегодня и сел писать тебе письмо. Стыд этот от того, что я тебе ничего не придумал и не послал к новому году, не послал даже путного письма новогоднего. Правда, я предчувствовал, что могу и не успеть в силу фронтовой обстановки, а потому поспешил еще в ноябре послать хоть то, что мог, а именно — свой месячный заработок и боевой счет за несколько дней. О боевом счету ты знаешь, следовательно письмо получила, а деньги так и не знаю, получила ли. Вот потому-то и стыдно мне, что я просил, чтобы ты выпила под новый год и за меня, а у тебя возможно на это и денег не было.

С письмами в последнее время я тебя не посещал не без причин, но, конечно, не о них сейчас тебе говорить. Скажу только, что твоя болезнь посетила и меня, и я уже вот 10 дней чувствую ее присутствие. Ночью сегодня побежал получать задачу, там и встретил новый год, конечно не без водки, а вернулся к себе в блиндаж работать — и не мог, грипп прошел, а спина стала дубовой, никак не могу повернуться, как-будто только что сняли сто банок со спины.

Но ничего, Анка, бить фрицев сил пока хватает, вот и сейчас, прежде чем заняться письмом, я отстрелялся уже сегодня и не без результатов: разбил блиндаж с фрицами и уничтожил пулемет, таков мой счет уже за 1944 год. Вчера 1-й Украинский фронт занял Житомир, не отстанем от них и мы, сейчас следи и за нами, мы тоже сидеть не станем тогда, когда люди города берут. Брали и мы города и не малые, опытом богаты, силы тоже хватит, чтобы раз и навсегда покончить с фрицами паршивыми. Надеюсь, Анька, что в этом году мы с тобой встретимся, а это будет только после полной победы над фрицами.

Опять возвращаюсь к тебе после стрельбы, фриц еще огрызается в селе, пришлось подсыпать ему жару. Этим, пожалуй, придется и кончить письмо, потому что нужно будет следовать вперед. Ну, пока, Анька!

Идя вперед, разреши тебя крепко обнять и поцеловать, поцеловать любя, как это будет при нашей счастливой встрече.

Остаюсь твой Костя

Пиши, не обижайся за редкие письма, напиши о моем ноябре, получила ли.

1.1.1944 г.»

А ў раённай газеце за 28 студзеня 1944 г. быў змешчаны верш К.Юрчанкі:

Добры дзень, дарагая матуля.
Шлю прывет я з далёкіх палёў,
Дзе і бомбы, і міны, і кулі
Размаўляюць сурова, без слоў.
Радзіма ўручыла мне зброю —
Славу нашых савецкіх людзей.
І ў спёку, і ў сцюжу я з ёю
Фрыцаў б'ю з кожным днём усё мацней.
Не любіў я раней паляўнічыць,
Не глядзеў я без болю на кроў,
А цяпер паляўнічу на фрыцаў,
Самых ярых, драпежных звяроў.

Паляваў я ля сцен Сталінграда,
Паляваў на Данцу і Дняпру,
І заўсёды была са мной радам
Дарагая мая Беларусь.

Дык не плач, не гаруй, дарагая.
Не палі ты дарэмна свячу:
Я за раны шчаслівага краю
І за гора таваё адплачу.

Старшы лейтэнант К.Г.Юрчанка ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За абарону Сталінграда».



М.М.Вераб'ёў.

Майсей Мікітавіч Вераб'ёў нарадзіўся ў 1917 г. у в. Рагінь. Пасля заканчэння мясцовай школы (1933) працаваў слесарам, малатабойцам у саўгасе «Рагінь», загадчыкам хаты-чытальні, піянерважатым, быў на камсамольскай рабоце. З 1938 г. служыў на флоце. Удзельнічаў у абароне Адэсы і Севастопаля. Быў цяжка паранены і дэмабілізаваны інвалідам 2-й групы. Пасля вайны працаваў у Міністэрстве сацыяльнага забеспячэння БССР загадчыкам аддзела, на партыйнай рабоце. Потым пераведзены ў Кіеў, дзе працаваў да выхаду на пенсію (1987) на розных пасадах. У 1969 г. М.М.Вераб'ёў закончыў Львоўскі паліграфічны інстытут. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені (двойчы), «Знак Пашаны», медалямі.

Цеснае марское сяброўства звязала М.М.Вераб'ёва з украінцам Рыгорам Мазурам, з якім ён служыў на адным караблі на Каспіі і адкуль пайшлі на фронт. Пісьмы Вераб'ёва Мазуру сталі падставай карэспандэнту газеты «Красный флот» Б.Радчанку для напісання нарыса аб баявым чырванафлоцкім сяброўстве. Гэты нарыс быў апублікаваны ў адным з нумароў газеты за 1943 г.

Вось асобныя радкі з тых пісем М.М.Вераб'ёва, што былі змешчаны ў нарысе.

«...Попал я на самый ответственный участок — в разведку... Одновременно являюсь секретарем партийной организации. Каждый день приносит новую радость: пядь за пядью освобождается наша родная земля...

Коля Егоров и Жора Всеволодов были ранены. Коля возвратился из госпиталя и сейчас мы опять вместе. Что касается Жоры, то он эвакуирован. Теперь вместо трех нас двое...»

«Здравствуй, дорогой Гриша! Твое письмо — еще одна счастливая минута в моей фронтовой жизни... Читали вместе с Колькой... Вчера мы ходили к гансам и фрицам. Дали им хороший морской «концерт». Едва вернулись в землянку, лег отдохнуть и вдруг, толкают — письмо. Узнал твой почерк, и сон как рукой сняло. Запалил фитиль и с радостью начал читать. Вспомнил все: родной корабль и его дружную семью. Как приятно это! Фронтовую жизнь, с ее разнообразной «музыкой» я полюбил, но соскучился по морю. Обычно говорят: «Люблю море с берега». Но это не так. Тот, кто несколько лет пробыл в море и потом сделал перерыв, того вновь потянет в родную стихию... Вчерашняя ночка прошла удачно. Поработали неплохо... Забрались мы в расположение гитлеровцев. Когда нас обнаружили, произошел бой. Забросали врагов гранатами и, открыв огонь из автоматов, ворвались в его логово. Дали «духу» по «морскому» обычаю: только на смерть! Забрали трофеи: пулеметы, гранаты, автоматы и прочее... У нас потерь не было... Часто думаю о родных и всякий раз становлюсь еще злее к врагу. Погода стоит хорошая. Только бы жить, да сволочи мешают. Ничего, скоро будет конец фашистским собакам!»

Вярнуліся пераможцамі

На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанах змагаліся з ворагам некалькі тысяч нашых землякоў. Многія з іх склалі свае галовы ў барацьбе з ворагам. Іх прозвішчы прыводзяцца ў раздзеле «Ахвяры вайны». У працэсе работы над гэтай кнігай раённая камісія імкнулася сабраць звесткі і назваць на старонках хронікі імёны не толькі загінуўшых ці прапаўшых без вестак воінаў-землякоў, але і тых, хто вярнуўся ў родныя мясціны пераможцам. Спіс іх, падрыхтаваны паводле даных райваенкамата, прыводзіцца ніжэй. На жаль, занадта позна сталі ствараць гэтыя спісы. Пра іх паўнату і дакладнасць сёння гаварыць не даводзіцца: адны ветэраны памерлі ад ран і хвароб у першыя пасляваенныя і наступныя гады, іншыя выехалі з раёна, і далёка не ўсіх іх маглі ўспомніць,

калі збіраліся матэрыялы для гэтай кнігі. Тым не менш стваральнікі кнігі «Памяць» палічылі мэтазгодным змясціць на яе старонках тыя звесткі пра ўдзельнікаў вайны, якія ўдалося сабраць у працэсе падрыхтоўкі хронікі, і няхай выбачаюць нас ветэраны і іх родныя, калі яны не знойдуць у гэтым спісе знаёмых прозвішчаў.

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АКЦЯБР

ГОЛУБЕЎ Іван Ціліпавіч, сярж., медаль «За адвагу», ваяваў супраць мілітарысцкай Японіі.

ГОЛУБЕЎ Трафім Ціханавіч, рад., вызваляў Варшаву.

ДЗЕМІДОВІЧ Фёдар Мікалаевіч, мал. сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медалі.

КОЖУХАЎ Павел Ягоравіч, рад., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

КУДЗІНАЎ Адам Архіпавіч, гв. мал. сярж., ордэн Чырвонай Зоркі.

ПАСЁЛАК БАЯВЫ

СЕРДЗЮКОЎ Якаў Данілавіч, мал. сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

ПАСЁЛАК ГАРАДЗЕЦ

ЛАБАНАЎ Іван Нічыпаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

ПАСЁЛАК ГЕРОЙ

ПРАКАПЕНКА Іван Цімафеевіч, сярж., медаль «За баявыя заслугі».

ЯЖОЎ Павел Акімавіч, рад., медаль «За баявыя заслугі».

ПАСЁЛАК КРАСНЫ АКЦЯБР

АНДРЭЕЎ Аляксей Цімафеевіч, мал. сярж., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Берліна» і інш.

ДЗЯТЛАЎ Пётр Ігнацьевіч, мал. лейт., ордэн Чырвонай Зоркі.

ВЁСКА ЛІПА

АФАНАСЕНКАЎ Іван Іванавіч, старш., ордэн Айчыннай вайны І ступені, медаль «За адвагу».

ВІШАНКОЎ Герасім Цімафеевіч, ст. сярж., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі», вызваляў Варшаву.

ВІШАНКОЎ Уладзімір Іванавіч, яфр., медаль «За адвагу».

ВОЛКАЎ Ігнат Сцяпанавіч, падпалк., вызваляў Варшаву.

ВОЛКАЎ Іосіф Сцяпанавіч, старш., ордэн Чырвонай Зоркі, штурмаваў Берлін.



Ф.М.Дземідовіч.



А.Ц.Андрэеў.

ГАЕЎ Уладзімір Якаўлевіч, яфр., ордэны Чырвонай Зоркі, Славы ІІІ ступені, 2 медалі «За адвагу».

ДЗЕДАЎ Васіль Васільевіч, старш., ордэн Чырвонай Зоркі.

ЕЖАНКОЎ Іван Ульянавіч, сярж., ордэн Чырвонай Зоркі.

КАНАВАЛАЎ Даніл Мікітавіч, мал. сярж., медаль «За адвагу».

КУЗЬМЕНКА Сямён Яфімавіч, рад., медаль «За адвагу», штурмаваў Кёнігсберг.

МАЛІНОЎСКІ Аляксей Раманавіч, кап., ордэн Чырвонай Зоркі.

МЕЛЬНІКАЎ Павел Платонавіч, ст. сярж., медаль «За баявыя заслугі», штурмаваў Кёнігсберг.

СТАЛЯРОЎ Павел Нічыпаравіч, сярж., абараняў Сталінград.

ЮРКОЎ Аляксей Пятровіч, яфр., абараняў Маскву, вызваляў Варшаву.

ЮРКОЎ Рыгор Рыгоравіч, старш., медаль «За баявыя заслугі».

ЮРКОЎ Сямён Пятровіч, сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

ВЁСКА ЛУГІНІЧЫ

ДЗЯГЦЯРОЎ Назар Іванавіч, рад., штурмаваў Кёнігсберг.

ЮРКОЎ Ціхан Андрэевіч, мал. лейт., ордэны Чырвонай Зоркі (два), Айчыннай вайны І і ІІ ступеней, медаль «За адвагу».

ВЁСКА НОВАЯ ЛІПА

ХРАМЦОЎ Аляксей Гаўрылавіч, рад., медаль «За баявыя заслугі».

ЮРКОЎ Васіль Нічыпаравіч, рад., вызваляў Варшаву.

ВЁСКА ПЫЦЬКАЎКА

ГАЕЎ Іван Цітавіч, рад., ордэн Чырвонай Зоркі.

ГЕРАСІМАЎ Фёдар Гаўрылавіч, рад., медаль «За адвагу», вызваляў Варшаву.



В.Я.Багачоў.

КУЗЬМЯНКОЎ Трыфан Дзмітрыевіч, рад., ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу» (два), «За баявыя заслугі».

МАРЧАНКА Фёдар Мартынавіч, яфр., медаль «За баявыя заслугі», штурмаваў Кёнігсберг.

МАТОРЫН Тарас Ізотавіч, старш., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

ЦЕРАШКОЎ Пётр Піліпавіч, рад., медаль «За адвагу».

ЯГОРАЎ Мікалай Рыгоравіч, лейт., ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «За адвагу», удзельнік абароны Каўказа.

ЯГОРАЎ Павел Іванавіч, рад., медаль «За адвагу».

ВЁСКА СЕЛІШЧА

ЛАПІЦКІ Іван Васільевіч, сярж., медаль «За баявыя заслугі».

ПАСЁЛАК УЮТНЫ

ВІШАНКОЎ Якаў Паўлавіч, гв. старш., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу», вызваляў Варшаву, штурмаваў Берлін.

ВЁСКА ЧЭРАПАЎКА

ГАЙКОЎ Уладзімір Акімавіч, ст. сярж., штурмаваў Кёнігсберг і Берлін.

КУРГУЗАЎ Якаў Яўгеньевіч, гв. старш., медаль «За баявыя заслугі».

ПАЎЛЕНКА Мікалай Фёдаравіч, сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За баявыя заслугі», «За адвагу».

ПРАКАПЕНКА Іван Захаравіч, рад., медаль «За адвагу».

ГОРАД БУДА-КАШАЛЁВА

АЗАРУШКІН Цімафей Патапавіч, маёр, ордэн Чырвонай Зоркі, абараняў Маскву.

АНДРУШЧАНКА Міхаіл Апанасавіч, ст. лейт., ордэн Чырвонай Зоркі, абараняў Каўказ.

АНІШЧАНКА Іван Лявонавіч, рад., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу», штурмаваў Берлін, вызваляў Прагу.

АНОШКА Марк Іванавіч, старш., абараняў Каўказ, ваяваў супраць мілітарысцкай Японіі.

АНУФРЫЕЎ Міхаіл Макаравіч, старш., ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу», штурмаваў Кёнігсберг.

БАБАРЫКІН Іван Яўхімавіч, рад., абараняў Ленінград, ваяваў супраць мілітарысцкай Японіі.

БАБРОЎНІКАЎ Апанас Паўлавіч, старш., ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

БАБРОЎСКІ Віктар Ігнатавіч, сярж., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

БАГАЧОЎ Васіль Якаўлевіч, лейт., ордэн Чырвонай Зоркі, 2 медалі «За адвагу», абараняў Сталінград.

БАДЗІЛОЎСКІ Іван Савельевіч, кап., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

БАЗАРАЎ Сцяпан Аляксандравіч, сярж., ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медаль «За баявыя заслугі».

БАКУНОВІЧ Іван Пятровіч, рад., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «Партызану Айчыннай вайны» I ступені.

БАЛАХОНАЎ Васіль Сцяпанавіч, мал. сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

БАРАНАЎ Вікенцій Агеевіч, рад., вызваляў Варшаву.

БАРАНОЎСКІ Андрэй Сяргеевіч, яфр., ордэн Чырвонай Зоркі, вызваляў Варшаву, штурмаваў Берлін.

БАРКОЎ Мікалай Мікітавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «Партызану Айчыннай вайны» I ступені.

БАРСУКОЎ Мікалай Касьянавіч, мал. сярж., ордэн Чырвонай Зоркі.

БЭРЧАНКА Фёдар Фёдаравіч, сярж., ордэн Чырвонай Зоркі.

БРАЦКАЎ Міхаіл Міхайлавіч, старш., ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медаль «За адвагу», штурмаваў Кёнігсберг.

БЯЛАНАВА Еўдакія Паўлаўна, сярж., медаль «За адвагу».

ВЯТРЭНКА Іван Раманавіч, рад., медаль «За баявыя заслугі», абараняў Каўказ.

ГАНОЎ Міхаіл Ільіч, ст. лейт., 2 ордэны Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

ГЕРАСІМЕНКА Іван Дзмітрыевіч, сярж., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі», штурмаваў Берлін.

ГЕРАШОНАК Барыс Рыгоравіч, кап., ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі» і інш.

ГЛУШКО Анатоль Данілавіч, лейт., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі», удзельнік штурму Кёнігсберга.

ГЛУШКО Ганна Аляксееўна, старш., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

ГРЫБАКОЎ Сямён Уладзіміравіч, мал. сярж., медаль «За баявыя заслугі».

ГРЫБОЎСКІ Пётр Міхайлавіч, лейт., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу», удзельнік вызвалення Варшавы і штурму Берліна.

ГРЭЙНЕР Пётр Браніслававіч, сярж., медаль «За баявыя заслугі», абараняў Сталінград.

ГУМЕННІКАЎ Андрэй Тарасавіч, сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу», вызваляў Варшаву.

ДЗЕРВЯНКОЎ Іван Іванавіч, маёр, ордэны Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медаль «За баявыя заслугі», удзельнік абароны Масквы, вызвалення Варшавы.

ДРАЯНКОЎ Кірыла Карпавіч, ст. сярж., медаль «За баявыя заслугі», абараняў Маскву, вызваляў Варшаву.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Максім Іванавіч, мал. сярж., медаль «За адвагу».

ЖЭЎНЕРАЎ Цімафей Прохаравіч, кап., медаль «За баявыя заслугі», абараняў Сталінград.

ЖУКАВА Тамара Данілаўна, мал. лейт. мед. службы, медаль «За баявыя заслугі».

ІВАНОЎ Аркадзь Пятровіч, ст. лейт., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

ІВАНЧЫКАЎ Захар Антонавіч, старш., ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медаль «За баявыя заслугі», штурмаваў Кёнігсберг.

ІГНАТАЎ Мікалай Пятровіч, мал. сярж., медаль «За баявыя заслугі», штурмаваў Кёнігсберг.

ІЛЬЕЎ Іван Ульянавіч, старш., медаль «За баявыя заслугі».

ІНКАЎЦОЎ Якаў Кузьміч, рад., медаль «За баявыя заслугі».

КАВАЛЕНКА Сцяпан Якаўлевіч, сярж., медаль «За баявыя заслугі», штурмаваў Берлін.

КАЗАКОЎ Васіль Мацвеевіч, рад., абараняў Ленінград і Савецкае Запаляр'е.

КАЗАНЦАЎ Уладзімір Мацвеевіч, ст. сярж., ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу».

КАЗЛОЎ Дзмітрый Пятровіч, сярж., ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медаль «За адвагу».

КАЗЛОЎ Захар Карлавіч, яфр., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

КАЗЛОЎ Іосіф Сцяпанавіч, гв. кап., ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, удзельнік штурму Кёнігсберга.

КАЗЛОЎ Мікалай Кузьміч, рад., ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу».

КАТЛЯРОЎ Ціхан Клімавіч, рад., медаль «За адвагу».

КРУГЛЯКОЎ Мікалай Канстанцінавіч, ст. лейт., ордэны Чырвонай Зоркі (тры), Айчыннай вайны I ступені, удзельнік штурму Кёнігсберга.

КРУГЛЯКОЎ Сямён Фёдаравіч, сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу», вызваляў Варшаву.

КРУКОЎСКІ Сцяпан Іванавіч, рад., ваяваў супраць мілітарысцкай Японіі.

Г.А.Глушко.

І.І.Дзервянкоў.



М.К.Казлоў.

Ц.К.Катляроў.

КУЗЬМЯНКОЎ Канстанцін Данілавіч, сярж., ордэн Славы III ступені, вызваляў Варшаву, штурмаваў Берлін.

КУЗЬМЯНКОЎ Цімафей Ягоравіч, медаль «За адвагу», вызваляў Варшаву, штурмаваў Берлін.

КУЛІКОЎСКІ Рамуальд Самуілавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «Партызану Айчыннай вайны» I ступені.

КУНДАС Васіль Лаўрэнцьевіч, абараняў Маскву.

КУХАРЭНКА Соф'я Васільеўна, старш., ордэн Чырвонай Зоркі.

ЛАГВІНЕНКА Цімафей Свірыдавіч, рад., штурмаваў Кёнігсберг.

ЛАЗЕБНЫ Сідар Львовіч, лейт., ордэны Айчыннай вайны I і II ступеней, абараняў Маскву.

ЛАХМАКОВА Праскоўя Фамінічна, рад., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда» і інш.

ЛАХМАКОЎ Даніла Ісакавіч, рад., медаль «За баявыя заслугі», штурмаваў Берлін.

ЛІСЕЙЧЫКАЎ Кузьма Міронавіч, сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

ЛУЦЯНКОЎ Іван Раманавіч, штурмаваў Кёнігсберг, ваяваў супраць мілітарысцкай Японіі.



С.Л.Лазебны.



П.Я.Мальцаў.



Л.В.Рыжанаў.



І.С.Шпак.

ЛЬВОЎ Міхаіл Іванавіч, ст. сярж., абараняў Каўказ.

МАКАРАНКА Апанас Авяр'янавіч, медаль «За адвагу», вызваляў Варшаву.

МАКАРАНКА Якаў Авяр'янавіч, рад., ваяваў супраць мілітарысцкай Японіі.

МАКСІМОВІЧ Якаў Мінавіч, рад., медаль «За адвагу».

МАЛЬЦАВА Ганна Сцяпанаўна, старш., абараняла Сталінград, вызваляла Варшаву.

МАЛЬЦАЎ Пётр Яфімавіч, кап., ордэны Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі», абараняў Сталінград.

МЕЛЬНІКАЎ Анатоль Ігнацьевіч, старш., медаль «За адвагу».

МЯДЗВЕДЗЕЎ Цімафей Восіпавіч, рад., медаль «За адвагу».

НІКІЦЕНКА Сцяпан Дзянісавіч, сярж., ордэн Чырвонай Зоркі.

НІКІЦІН Міхаіл Пракоф'евіч, сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу», штурмаваў Будапешт.

НОВІКАЎ Іван Антонавіч, ст. сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі», абараняў Сталінград.

НОВІКАЎ Яўціхій Іванавіч, старш., 2 ордэны Чырвонай Зоркі, абараняў Сталінград.

ПАЛЯКОЎ Васіль Трафімавіч, старш., медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

ПАЛЯКОЎ Уладзімір Іванавіч, сярж., медаль «За адвагу», штурмаваў Кёнігсберг.

ПАСЬКО Рыгор Фёдаравіч, мічман, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За баявыя заслугі», Ушакова, абараняў Ленінград.

ПАЎЛАЎ Яўген Філімонавіч, лейт., ордэн Чырвонай Зоркі.

ПРАКАПЕНКА Любоў Конанаўна, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі».

ПРУСАЎ Пётр Ільіч, рад., ордэн Чырвонай Зоркі, 2 медалі «За адвагу», штурмаваў Кёнігсберг, Берлін.

РАЖКОЎ Васіль Якаўлевіч, рад., абараняў Савецкае Запаляр'е.

РЫЖАНАЎ Леанід Васільевіч, лейт., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

САЗОНАЎ Даніла Паўлавіч, рад., вызваляў Варшаву, штурмаваў Берлін.

СЕРАШТАНАЎ Пётр Аляксеевіч, рад., абараняў Каўказ, штурмаваў Кёнігсберг.

СІЛКОЎ Фёдар Сямёнавіч, лейт., медалі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені.

СУХАНАЎ Анатоль Іванавіч, сярж., удзельнік вайны супраць мілітарысцкай Японіі.

СЦЯГАЙЛА Сцяпан Рыгоравіч, мал. сярж., медаль «За адвагу».

ТУПКОЎ Даніла Лаўрэнцьевіч, рад., медаль «За адвагу», штурмаваў Кёнігсберг.

ФАЛЕЙЧЫК Уладзімір Самуілавіч, старш., медаль «За баявыя заслугі».

ФРЫДМАН Арон Моцелевіч, старш., медаль «За баявыя заслугі», абараняў Ленінград.

ХАЙКІН Леў Мееравіч, рад., абараняў Сталінград.

ХАРКЕВІЧ Арсеній Кузьміч, ст. лейт., ордэн Чырвонай Зоркі.

ХІЛЬКЕВІЧ Пётр Лук'янавіч, рад., медаль «За адвагу».

ЦАРЫК Уладзімір Васільевіч, лейт., ордэн Чырвонай Зоркі, абараняў Ленінград.

ЦЭХАН Восіп Уладзіміравіч, рад., медаль «За баявыя заслугі».

ШАПІРА Іосіф Міронавіч, лейт., ордэн Айчыннай вайны II ступені.

ШПАК Іван Савельевіч, рад., ордэн Чырвонай Зоркі.

ШЫНКАРОЎ Уладзімір Іванавіч, сярж., 2 медалі «За адвагу», штурмаваў Берлін.

ЯКАЎЛЕЎ Іван Дзмітрыевіч, рад., ордэны Чырвонай Зоркі (два), Славы III ступені.

ЯЎСТРАЦЕНКА Якаў Данілавіч, ст. сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, удзельнічаў у вайне з мілітарысцкай Японіяй.

БУДА-ЛЮШАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК АСІНАЎКА

ЛАГОЙКІН Аляксей Якаўлевіч, рад., штурмаваў Будапешт, Вену.

ВЁСКА БУДА-ЛЮШАЎСКАЯ

ВАРАНЦОЎ Даніла Ягоравіч, рад., абараняў Маскву і Ленінград.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Максім Іванавіч, рад., медаль «За адвагу», вызваляў Варшаву, штурмаваў Берлін.

КАЗЛОЎ Дзмітрый Трафімавіч, ст. сярж., медаль «За адвагу».

КРАСНАБАЕЎ Васіль Дзянісавіч, рад., медаль «За адвагу», штурмаваў Кёнігсберг.

КРАСНАБАЕЎ Уладзімір Іванавіч, мал. сярж., медаль «За адвагу».

КРАСНАБАЕЎ Фёдар Антонавіч, старш., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу», штурмаваў Берлін, вызваляў Прагу.

ЛАЎРЭНАЎ Малах Васільевіч, рад., медаль «За адвагу», штурмаваў Кёнігсберг.

НОВІКАЎ Васіль Ягоравіч, сярж., ордэн Чырвонай Зоркі.

САЎЧАНКА Міхаіл Паўлавіч, рад., ордэн Славы III ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі», вызваляў Варшаву.

СВІРЫДЗЕНКА Аляксей Міхайлавіч, мал. сярж., медаль «За адвагу».

СЦЕПАНЦОЎ Іван Архіпавіч, гв. ст. сярж., медаль «За адвагу».

ХОМЧАНКА Гаўрыла Мікалаевіч, рад., медаль «За баявыя заслугі», штурмаваў Кёнігсберг.

ЦЕРАШКОЎ Васіль Мінавіч, мал. сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, вызваляў Варшаву, штурмаваў Берлін.

ЦЕРАШКОЎ Міхаіл Мінавіч, ст. сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медалі, штурмаваў Кёнігсберг і Берлін.

ЧАРНЯЎСКІ Апанас Трыфанавіч, ст. сярж., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі», штурмаваў Кёнігсберг.

ЧАРНЯЎСКІ Рыгор Андрэевіч, рад., медаль «За баявыя заслугі».

ВЁСКА ЛЮБАВІН

КАЗЛОЎСКІ Савелій Іванавіч, рад., медаль «За адвагу».

МЯДЗВЕДСКІ Іван Уладзіміравіч, яфр., ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі», вызваляў Прагу.

ПУХІНСКІ Анатоль Васільевіч, рад., штурмаваў Кёнігсберг.



М.М.Церашкоў.

ЧАРНУШЭВІЧ Мікалай Пятровіч, ст. матрос, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы II і III ступеней, медаль Ушакова, абараняў Савецкае Запаляр'е.

ЯСІНСКІ Фелікс Ігнатавіч, старш., медаль «За баявыя заслугі», абараняў Сталінград.

ВЁСКА НОВЫ ЛЮБАВІН

КАЗЛОЎСКІ Анатоль Васільевіч, рад., медаль «За адвагу», вызваляў Прагу.

ПАСЁЛАК РОШЧА

АВЯР'ЯНАЎ Станіслаў Дзмітрыевіч, рад., медаль «За адвагу».

ВЁСКА СЛАБАДА-ЛЮШАЎСКАЯ

ГРЫЦКОЎ Аляксандр Мікалаевіч, старш., ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «Партызану Айчыннай вайны» I ступені.

ДЫХНЕ Міхаіл Аронавіч, н. у 1913, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., прапаў без вестак у студзені 1942.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Ананій Фёдаравіч, ст. лейт., загінуў 15.3.1945.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Аркадзь Андрэевіч, н. у 1924 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 28.11.1943, пахаваны ў в. Ніжняя Алба Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.

ЕРАШЭНКА Яўгенія ПІліпаўна, н. у 1924 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінула 28.4.1945, пас. Штэйнфурт, Германія.

ЕРМАКОЎ Аркадзь Кірылавіч, н. у 1926, рад., загінуў 6.2.1945 ва Усх. Прусіі.

ЕЎДАКІМАЎ Панцялей Піліпавіч, лейт., загінуў 15.1.1942.

ЖАЛЕЗНЯКОЎ Сямён Аксёнавіч, н. у 1915 ва Уваравіцкім р-не, кап., прапаў без вестак.

ЖАРКОЎ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1920, лейт., загінуў 29.11.1943.

ЖАЎНОЎ Сцяпан Васільевіч, н. у 1906, ст. лейт., прапаў без вестак у 1943.

ЖЛОБА Іван Пятровіч, н. у 1903 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак у чэрвені 1943.

ЖУКОЎСКІ Якаў Якаўлевіч.

ЖУРАЎ Трафім Іванавіч, н. ва Уваравіцкім р-не, сярж., памёр 9.9.1944 у г. Калуга.

ЗАБАЛОТНІКАЎ Анатоль Рыгоравіч, н. у 1916 ва Уваравіцкім р-не, рад., памёр у палоне 11.4.1942.

ЗАБАЛОЦКІ Фёдар Сямёнавіч, н. у 1906 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1944.

ЗАГДАЙ Леанід Аляксандравіч, н. у 1914, палітрук, прапаў без вестак у сакавіку 1942.

ЗАЙЦАЎ Марцін Яўціхіевіч, н. у 1901, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., загінуў 4.8.1943, пахаваны каля г. Петракрэпасць Ленінградскай вобл.

ЗАЙЦАЎ Мікалай Мікалаевіч, н. ва Уваравіцкім р-не, мал. лейт., прапаў без вестак у 1941.

ЗАХАРАНКА Антон Сцяпанавіч, палітрук, загінуў 31.7.1941.

ЗАХАРАЎ Васіль Міхайлавіч, н. у 1925 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 17.4.1945, пахаваны ў г. Альтухебана, Германія.

ЗАХАРАЎ Павел Іванавіч, н. у 1912 у Буда-Кашалёўскім р-не, мал. лейт., прапаў без вестак 13.7.1942.

ЗАХВАТАЎ Дзмітрый Іларыёнавіч, н. у 1921, рад., прапаў без вестак у лістападзе 1943.

ЗБАРАМІРСКІ Анатоль Аляксеевіч, н. ва Уваравіцкім р-не, ст. лейт., загінуў 2.8.1944.

ЗБАРАМІРСКІ Віктар Аляксандравіч (Аляксеевіч), ст. лейт., загінуў 25.7.1944.

ЗВЕРАЎ Пётр Аляксеевіч, н. у 1915 у Буда-Кашалёўскім р-не, лейт., прапаў без вестак у верасні 1941.

ЗЛОТНІКАЎ Навум Якаўлевіч, гв. мал. лейт., прапаў без вестак 18.8.1944.

ЗМІТРАЎЦОЎ Пётр, н. у 1922 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 9.2.1942, пахаваны ў в. Васількі Смаленскай вобл.

ЗЯЦІКАЎ Васіль Іванавіч, н. у 1908, мал. палітрук, прапаў без вестак у жніўні 1942.

ЗЯЦІКАЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1921, лейт., прапаў без вестак у 1942.

ІВАКА Якаў Максімавіч, н. у 1925, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., памёр ад ран 19.4.1945, пахаваны ў г. Верберг, Германія.

ІВАНКІН Раман Яўхімавіч, н. у 1913, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., прапаў без вестак у жніўні 1944.

ІВАНОЎ Васіль Мікалаевіч, лейт., прапаў без вестак 10.3.1942.

ІВАНОЎ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1901 ва Уваравіцкім р-не, прапаў без вестак.

ІВАНОЎСКІ Уладзімір Яўгенавіч, н. у 1925, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., загінуў 26.7.1944, пахаваны ў в. Чарамха Брэсцкай вобл.

ІВАШКЕВІЧ Серафім Васільевіч, н. у 1904 у Буда-Кашалёўскім р-не, загінуў 13.7.1944, пахаваны ў в. Цвярдынь Валынскай вобл.

ІГНАТКІН Мікалай Мікалаевіч, н. у 1913, лейт., прапаў без вестак у снежні 1941.

ІГНАЦЕНКА Іван Уласавіч, лейт., прапаў без вестак 28.8.1941.

ІГУМЕНАЎ Пётр Ягоравіч, н. у 1905 у Буда-Кашалёўскім р-не, ст. лейт., прапаў без вестак у 1943.

ІЛАРЫЁНАЎ Іван Паўлавіч, н. у 1908, прызываўся Уваравіцкім РВК, сярж., памёр ад ран 8.10.1942, пахаваны ў в. Буманіна Смаленскай вобл.

ІЛЬЕЎ Антон Спірыдонавіч, н. у 1909 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 30.6.1942.

ІЛЬІН Ягор Ільіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

ІРГАШАЎ Макхам, н. у 1920, прызываўся Уваравіцкім РВК, сярж., загінуў 16.10.1944, в. Воля

Смаляная Серацкага пав. Варшаўскага ваяв., Польшча.

ІСАЧАНКА Мікалай Іванавіч, н. у 1916 ва Уваравіцкім р-не, тэхнік-інтэндант 2-га рангу, прапаў без вестак у верасні 1941.

ІСРАНАЎ Іван Рыгоравіч, н. у 1920 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак 12.8.1941 у в. Парковішча Касцюковіцкага р-на.

КАВАЛЁЎ Максім Герасімавіч, н. у 1895, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

КАВАЛЁЎ Міхаіл Мікітавіч, н. у 1920 ва Уваравіцкім р-не, сярж., прапаў без вестак 13.7.1943 каля в. Вясёлая Навасільскага р-на Арлоўскай вобл.

КАВАЛЁЎ Нічыпар Яфрэмавіч, н. у 1916 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак у снежні 1943.

КАВУНОЎ Пётр Паўлавіч, н. у 1923, мал. лейт., загінуў 6.7.1943.

КАЖАМЯКІН Рыгор, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., прапаў без вестак 5.10.1941.

КАЖЫРОЎСКІ Карней Аўсеевіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, загінуў.

КАЗАКЕВІЧ Майсей А., н. у 1907, рад., прапаў без вестак у красавіку 1944.

КАЗЛОЎ Іван Мікалаевіч, н. у 1917 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., памёр ад ран 28.1.1944, пахаваны ў в. Пратасы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

КАЗЛОЎ Мікалай Барысавіч, н. у 1906 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак 23.1.1944.

КАЛЕСНІКАЎ Нічыпар Восіпавіч, н. у 1922, ст. сярж., загінуў 15.7.1943.

КАЛІТКА Мікалай Уладзіміравіч, н. у 1902, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., прапаў без вестак у студзені 1944.

КАЛКОЎ Леанід Юр'евіч, н. у 1925 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 13.2.1943, пахаваны ў в. Галодная Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.

КАЛПАКОЎ Аляксей Кірылавіч, н. у 1922 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 28.7.1943, пахаваны ў в. Красінкава Курскай вобл.

КАЛПЯНКОЎ Рыгор Фёдаравіч, н. у 1915 у Буда-Кашалёўскім р-не, ст. лейт., загінуў 26.2.1943.

КАМАРОЎ Рыгор А., н. у 1923, мал. лейт., загінуў 23.2.1943.

КАПАЧОЎ Іван Сямёнавіч, н. у 1921, прызываўся Уваравіцкім РВК, загінуў 17.2.1945 ва Усх. Прусіі.

КАПУСЦІН Барыс Захаравіч (Хаймавіч), н. у 1924 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 31.7.1941, пахаваны ў г. Арол.

КАРАБАНЕНКА Сяргей Ануфрыевіч, н. ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 12.4.1942, пахаваны ў в. Рамушава Старарускага р-на Наўгародскай вобл.

КАРАБАНЬКОЎ Пракоп Васільевіч, н. у 1915 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак 30.11.1944.

КАРНІЕНКА Навум Ільіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, лейт., загінуў.

КАСЦЮК Іван Фёдаравіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, лейт., прапаў без вестак у жніўні 1943.

КАСЦЯНКОЎ Васіль Піліпавіч, н. у 1915, мал. лейт., прапаў без вестак у 1941.

КАТАНЯХІН Міхай Ціханавіч, н. у 1923, сярж., загінуў 18.7.1942, пахаваны ў в. Ржавец Варонежскай вобл.

КАШЭРАЎ Георгій Арсеньевіч, н. у 1923, мал. лейт., загінуў 23.2.1943.

КІРЖАНАЎ Андрэй Віктаравіч, н. у 1902 ва Уваравіцкім р-не, рад., памёр ад ран 19.10.1944, фальв. Стэфані Варшаўскага ваяв., Польшча.

КІРЖАНАЎ Якаў Віктаравіч, н. у 1899 ва Уваравіцкім р-не, загінуў 15.7.1943, пахаваны ў в. Жалябург Арлоўскай вобл.

КІРЫЛЕНКА Ілья Сафронавіч, н. у 1922, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., прапаў без вестак 5.3.1942.

КІРЭЕЎ Ілья Аляксеевіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак у красавіку 1944.

КІСЯЛЁЎ Міхаіл Апанасавіч, мал. лейт., прапаў без вестак 5.8.1941.

КІСЯЛЁЎ Яўхім Дзянісавіч, н. у 1909 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак 28.6.1942.

КЛІМАЎ Анатоль Ігнатавіч, н. у 1922, мал. лейт., памёр ад ран 25.7.1942.

КОНЧЫЦ Аляксей Якаўлевіч, н. у 1911, кам. санбата, загінуў 31.8.1941.

КОРАНЕЎ Яўген Сямёнавіч, мал. палітрук, прапаў без вестак у верасні 1941.

КОРБУТ Барыс Германавіч, ст. лейт., прапаў без вестак у ліпені 1941.

КОТАЎ Дарафей Антонавіч, мал. ваентэхнік, прапаў без вестак у 1941.

КОФМАН Уладзімір Ісаевіч, н. у 1900, прапаў без вестак у верасні 1941.

КРАЖАЎ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1922 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў, пахаваны ў в. Мядушка Паддорскага р-на Наўгародскай вобл.

КРАСІЎ Васіль Трафімавіч, мал. лейт., загінуў 12.2.1943.

КРАЧЭНЦАЎ Дзмітрый Пятровіч, лейт., прапаў без вестак 26.7.1943.

КРУКАЎ Рыгор Канстанцінавіч, н. у 1906, прапаў без вестак у 1941.

КРУЦІКАЎ Дзмітрый Васільевіч, н. у 1926 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 19.1.1945, пахаваны ў в. Гзова Пултускага пав. Варшаўскага ваяв., Польшча.

КРЫВАШЭЕЎ Мікалай Авяр'янавіч, н. у 1919 у Буда-Кашалёўскім р-не, прапаў без вестак 1.7.1942.

КРЫВАШЭЕЎ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1926, рад., загінуў 6.8.1944, г. Сураж Беластоцкага ваяв., Польшча.

КРЭМАЎ Міхаіл Данілавіч, н. у 1924 у Буда-Кашалёўскім р-не, яфр., памёр ад ран 30.8.1944 у Стуў-Мазавецкім пав. Варшаўскага ваяв., Польшча.

КУБІЦКІ Фёдар Сцяпанавіч, мал. палітрук, загінуў 13.7.1942.

КУЗНЕЦ Мовій Яўхімавіч, н. у 1922, прызываўся Уваравіцкім РВК, памёр ад ран 18.9.1944 у ваенным гарадку ў Баранавічах.

КУЗНЯЦОЎ Ціхан Мацвеевіч, н. у 1924, ст. палітрук, прапаў без вестак у чэрвені 1941.

КУЗЬМЕНКА(ОЎ) Сяргей Ягоравіч, н. у 1920, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., загінуў, пахаваны ў в. Сінявіна Мгінскага р-на Ленінградскай вобл.

КУЗЬМЯНКОЎ Аляксей Фёдаравіч, ст. сярж., загінуў 12.2.1944.

КУЛАКОЎ Віктар Рыгоравіч, н. у 1922 ва Уваравіцкім р-не, мал. лейт., прапаў без вестак у верасні 1942.

КУЛЕМА Пётр Рыгоравіч, кам. узв., прапаў без вестак.

КУЛІК Аляксандр Паўлавіч, н. у 1907, лейт., загінуў 29.1.1945.

КУЛІЦКІ Фёдар Сцяпанавіч, мал. палітрук, прапаў без вестак 13.7.1942.

КУЛЯШОЎ Васіль Ільіч, н. у 1898 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак у 1941.

КУЛЯШОЎ Іван Васільевіч, н. у 1917, ст. лейт., памёр ад ран 25.7.1942.

КУНОЎСКІ Уладзімір Францавіч, н. у 1916, лейт., загінуў 22.3.1944.

КУРЫЛЕНКА Павел Рыгоравіч, н. у 1919, гв. мал. лейт., памёр ад ран у сакавіку 1945.

КУХАР(АЎ) Аляксандр Кузьміч, н. у 1907 у Буда-Кашалёўскім р-не, лейт., прапаў без вестак у верасні 1941.

КУХАРСКІ Уладзімір Андрэевіч, н. у 1924 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 26.2.1945.

КУХАРЭНКА Іван Трафімавіч, н. у 1923 ва Уваравіцкім р-не, рад., памёр ад ран 3.11.1944 у Польшчы.

КУХАРЭНКА Мікалай Ягоравіч, н. у 1913 у Буда-Кашалёўскім р-не, мал. лейт., прапаў без вестак 31.8.1941.

КУЦАНКОЎ Іван Яўхімавіч, загінуў 26.8.1943.

КУЧАРАЎ Рыгор Андрэевіч, н. у 1919, сярж., прапаў без вестак у сакавіку 1944.

КУЧУНЦАЎ (?) Хаім Алімавіч, н. у 1915 ва Уваравіцкім р-не, мал. лейт., прапаў без вестак 30.6.1943.

КУШКАЛАЎ Іван Піліпавіч, загінуў.

ЛАПІЦКІ Аляксей Антонавіч, палітрук, загінуў 10.8.1942.

ЛАПІЦКІ Мікалай Мітрафанавіч, мал. лейт., памёр ад ран 5.9.1943.

ЛАПІЦКІ Мікалай Пятровіч, н. у 1907, мал. палітрук, прапаў без вестак у верасні 1943.

ЛАПУШКОЎ Дзмітрый Якаўлевіч, н. у 1904 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак у 1941.

ЛАРКОЎ Ягор Ігнатавіч, н. у 1913 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 28.10.1943, пахаваны ў в. Аляксандраўка Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл.

ЛАШКЕВІЧ Апанас Уладзіміравіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 4.9.1944.

ЛАШКЕВІЧ Іван Фаміч, н. ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак у 1946.

ЛАШКЕВІЧ Рыгор Сцяпанавіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак у 1941.

ЛЕБЕДЗЕЎ Фёдар Міхайлавіч, загінуў.

ЛЕБЯДЗЕНКА Адам Лаўрэнцьевіч, н. у 1925 ва Уваравіцкім р-не, сярж., загінуў 16.3.1945, г. Свобніца Шчэцінскага ваяв., Польшча.

ЛЕВІН Уладзімір Якаўлевіч, н. у 1918, мал. лейт., загінуў 17.1.1945.

ЛЕЖАНКОЎ Цімафей Мацвеевіч, мал. лейт., загінуў 14.5.1942.

ЛІВАНЕЎСКІ Сцяпан Іванавіч, мал. лейт., прапаў без вестак у 1941.

ЛІМАНАТАЎ Пётр Іванавіч, загінуў.

ЛІПАТАЎ Мікалай Яўхімавіч, мал. лейт., прапаў без вестак у 1941.

ЛІПЧАНКА Павел Гаўрылавіч, н. у 1910, кап., прапаў без вестак у верасні 1941.

ЛІТВІНАЎ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1913, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., загінуў 1.1.1944, пахаваны ў в. Акцябр Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.

ЛІФМАН Вульф Зімавіч, н. у 1895, палітрук, прапаў без вестак у маі 1942.

ЛІХАВЕЦКІ Філімон Антонавіч, н. у 1918, рад., памёр ад ран 10.2.1945, в.Лясек Познаньскага ваяв., Польшча.

ЛОБАЎ Канстанцін Іванавіч, н. у 1915, лейт., загінуў 30.11.1942.

ЛОБАЎ Пётр Васільевіч, н. у 1908, мал. лейт., прапаў без вестак у 1941.

ЛОКЦЕЎ Цімафей Сцяпанавіч, н. у 1906, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., памёр ад ран 5.1.1942, пахаваны ў г. Калуга.

ЛОСЕЎ Анатоль Цімафеевіч, н. у 1916 у Буда-Кашалёўскім р-не, ст. лейт.

ЛУКАШОЎ Уладзімір Яўхімавіч, н. у 1917, прызываўся Уваравіцкім РВК, лейт., загінуў 29.3.1945, в. Варылен, Германія.

ЛУКІЕНКА Якаў Майсеевіч, н. у 1916, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., загінуў 12.1.1943, пахаваны на х. Міронаў Растоўскай вобл.

ЛУКОМСКІ Арцём Маркавіч, н. у 1904 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак у снежні 1944.

ЛУК'ЯНЦАЎ Ілья Фокавіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 21.11.1943.

ЛУПАН Давыд Апанасавіч, мал. палітрук, прапаў без вестак у чэрвені 1942.

ЛЯВОНЕНКА Фёдар Мікалаевіч, мал. лейт., прапаў без вестак у 1941.

ЛЯСЮК Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1925 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., памёр ад ран 22.3.1945, г. Бартэйнштэйн, Усх. Прусія.

МАЗАНЦАЎ Абрам Арцёмавіч, н. у 1899 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак 5.8.1941.

МАЗАНЧУК Мікіта Фёдаравіч, н. у 1898 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак 20.8.1941.

МАЙХАНАЎ Аляксандр Аляксеевіч, н. у 1926 ва Уваравіцкім р-не, мал. сярж., загінуў 1.4.1945, г. Кюстрын, Германія.

МАКАВЕЙСКІ Дзмітрый Мікалаевіч, н. у 1904, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, ваенветурач 3-га рангу, загінуў 18.8.1944, пахаваны ў в. Шэрпены, Малдова.

МАКАРАЎ Фёдар Трафімавіч, н. у 1902, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., загінуў 22.7.1943, пахаваны ў в. Парэчча Мгінскага р-на Ленінградскай вобл.

МАКЕЕЎ Цімафей Дзмітрыевіч, н. у 1905 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 19.3.1943, пахаваны ў в. Сабурава Курскай вобл.

МАКСІМАЎ Іван Максімавіч, н. у 1920 ва Уваравіцкім р-не, гв. лейт., загінуў 16.3.1945.

МАКСІМЦАЎ Аляксандр Сяргеевіч, інтэндант 3-га рангу, памёр ад ран 27.8.1942.

МАКЦЮК Барыс Шлёмавіч, лейт., памёр ад ран 3.1.1944.

МАЛАЖАЎСКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1911 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 10.6.1942, пахаваны ў в. Спас Полесць Чудаўскага р-на Ленінградскай вобл.

МАЛАЖАЎСКІ Пётр Паўлавіч, н. ва Уваравіцкім р-не, лейт., прапаў без вестак 31.8.1942.

МАЛІНЧУК Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1925 ва Уваравіцкім р-не рад., загінуў 26.1.1945, в. Мойдке, Усх. Прусія.

МАЛЫШАЎ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1920 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 27.11.1941, пахаваны ў пас. Неўская Дубраўка Ленінградскай вобл.

МАНГЕЕЎ (МАЙСЕЕЎ) Сцяпан Рыгоравіч, н. у 1899 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 14.1.1943, пахаваны ў в. Тоталава Мгінскага р-на Ленінградскай вобл.

МАРТЫНАЎ Аляксандр Елісеевіч, н. у 1916, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., загінуў 18.2.1944, пахаваны ў в. Чарняўка Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

МАРУСАЎ Мікалай Іванавіч, н. у 1906, ст. лейт., прапаў без вестак у 1941.

МАСЛЮК Іван Ціханавіч, лейт., загінуў 22.1.1943.

МАТОРКІН Пётр Апанасавіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., памёр ад ран 9.3.1944.

МАЦВЕЕНКА Алена Восіпаўна, н. у 1915 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапала без вестак 23.6.1941.

МАЦЫЕЎСКІ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1918, мал. лейт., загінуў 31.1.1945.

МЕЗЕНЦАЎ Іван Лаўрэнцьевіч, н. у 1919, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., загінуў 10.6.1942.

МЕЛЬНІКАЎ Іван Мікітавіч, н. у 1921 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак у снежні 1941.

МЕРВАН Рувім Іцкавіч, н. у 1919 у Буда-Кашалёўскім р-не, ст. лейт., загінуў 8.3.1943.

МІЛАЙНЕНКА Фама Абрамавіч, н. ва Уваравіцкім р-не, ст. сярж., загінуў 23.5.1942, пахаваны ў Смаленскай вобл.

МІЛАСЕРДАЎ Ягор Сямёнавіч, н. ва Уваравіцкім р-не, прапаў без вестак 17.1.1942.

МІНАЧКІН Павел Яўстафіевіч, лейт., загінуў.

МІСЯКОЎ Іван Цітавіч, н. у 1918, лейт., загінуў 27.6.1941.

МІХАЙЛАЎ Барыс Мікалаевіч, н. у 1922, мал. лейт., загінуў 20.3.1943.

МІХАЙЛАЎ Сямён Мікітавіч, н. у 1909 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

МІХАЛЕЎ Герасім Сямёнавіч, н. у 1914, ст. лейт., прапаў без вестак у жніўні 1941.

МІХАЛКІН Адам Андрэевіч, н. у 1905 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 13.1.1943, пахаваны ў в. Торталава Ленінградскай вобл.

МІХАЛКОЎ Барыс Мікалаевіч, н. у 1922, ст. лейт., загінуў 20.12.1943.

МІХЕДАЎ Іван Канстанцінавіч, н. у 1912, лейт., прапаў без вестак у 1941.

МОТАЎ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1923, рад., загінуў 21.2.1943, пахаваны ў в. Гаўрылаўка Дзергачоўскага р-на Харкаўскай вобл.

МУЗЫКІН Анатоль Іванавіч, н. у 1921 ва Уваравіцкім р-не, лейт., прапаў без вестак у снежні 1941.

МУЗЫЧЭНКА Аляксей Андрэевіч, н. у 1919 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 17.2.1942, пахаваны ў в. Фяцішчава Арсеннеўскага р-на Тульскай вобл.

МЯЖЭННІКАЎ Якаў Іванавіч, н. у 1923, ст. лейт., загінуў у студзені 1944.

МЯЛЕШЧАНКА Лука Яўхімавіч, н. у 1904 ва Уваравіцкім р-не, рад., памёр ад ран, пахаваны ў г. Познань, Польшча.

НАЛІВАЙКА Валянцін Віктаравіч, н. у 1917, кап., памёр ад ран 2.10.1944.

НАСЯНКОЎ Іван Ігнатавіч, н. у 1923 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак 28.8.1944.

НІКІЦЕНКА Іван Іванавіч, н. у 1922 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак у студзені 1944.

НІКІЦЕНКА Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1926 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 11.1.1945, в. Тублаўкен, Усх. Прусія.

НІЧЫПАРЭНКА Пімен Уладзіміравіч, н. у 1901 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак 25.10.1942 у в. Стары Двор Смаленскай вобл.

НІЧЫПАРЭНКА Фама Васільевіч, н. у 1902 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 28.7.1944, в. Добнын Душа Сядлецкага ваяв., Польшча.

НІЧЫПАРЭНКА Фама Уладзіміравіч, н. у 1902, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., загінуў 1.3.1944,

пахаваны ў в. Вялікі Бор Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

НОВІКАЎ Васіль Ягоравіч, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., прапаў без вестак 4.7.1942.

НОВІКАЎ Кандрат Харытонавіч, н. у 1917 у Буда-Кашалёўскім р-не, старш., прапаў без вестак у лютым 1944.

НОСАЎ Сяргей Іванавіч, мал. сярж., загінуў 28.10.1943.

НУДКОЎ Іван Мацвеевіч, н. у 1923, мал. лейт., загінуў 11.11.1943.

ПАЛЯКОЎ Васіль Васільевіч, лейт., прапаў без вестак у 1941.

ПАНАЕЎСКІ Ігнат Аляксеевіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у чэрвені 1944.

ПАНКОЎ Пётр Паўлавіч, н. у 1897, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., прапаў без вестак у 1944.

ПАПОЎ Іван Яўстафіевіч, загінуў 24.11.1943, пахаваны ў в. Чыстыя Лужы Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.

ПАТАПЕНКА Сямён Якаўлевіч, н. ва Уваравіцкім р-не, мал. палітрук, прапаў без вестак у 1943.

ПАЎЛОЎСКІ Аляксандр Васільевіч, лейт., прапаў без вестак у 1941.

ПАЎЛЮЧЭНКА Барыс Аляксандравіч, мал. лейт., прапаў без вестак у 1941.

ПАШЭНКА Фёдар Васільевіч, н. ва Уваравіцкім р-не, лейт., загінуў 12.3.1942.

ПЕРАЛЫГІН Віктар Мікалаевіч, н. у 1918, лейт., прапаў без вестак у 1941.

ПЕРАПІЧКА Арыён Цімафеевіч, н. у 1904, рад., памёр ад ран 6.2.1945.

ПЕРНІКАЎ Аляксей Арцёмавіч.

ПЕСІН Рыгор Сямёнавіч, н. у 1916, палітрук, прапаў без вестак у студзені 1943.

ПЛОТКІН Леў Юр'евіч, н. у 1914, мал. лейт., прапаў без вестак у 1941.

ПРАКАПЕНКА Нічыпар Іванавіч, н. у 1905 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак у снежні 1942.

ПРАКАПЕНКА Пётр Аляксандравіч, н. у 1906 у Буда-Кашалёўскім р-не, кам. роты, загінуў 2.2.1945.

ПРАКАПЕНКА Якаў Міхайлавіч, н. у 1920 у Буда-Кашалёўскім р-не.

ПРАКАПЦОЎ Васіль Архіпавіч, н. у 1924, рад., загінуў 24.2.1943.

ПРУСАЎ Яўфім Іванавіч, н. у 1908 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 21.2.1944, пахаваны ў в. Ягенін Лог Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

ПРЫХОДЗЬКА Ілья Цярэнцьевіч, н. у 1924, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., памёр ад ран 29.2.1944, пахаваны ў г. Рэчыца Гомельскай вобл.

ПРЫХОДЗЬКА Фёдар Савіч, н. у 1898, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., загінуў 6.3.1942, пахаваны ў в. Кашпураўка Харкаўскай вобл.

ПРЫШЧЭПА Сяргей Мартынавіч, н. у 1926, рад., загінуў 6.2.1944, пахаваны ў в. Пятровічы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ПЯНЬКОЎСКІ Аляксандр Яўсеевіч, мал. лейт., прапаў без вестак у 1941.

ПЯРЭСАЎ Анатоль Рыгоравіч, сярж., загінуў 17.9.1942.

ПЯТКОЎ Яфім Усанавіч, н. у 1921 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 8.10.1942, пахаваны на ст. Шарог Яраслаўскай чыгункі.

ПЯТРОЎСКІ Адам Тарасавіч, н. ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак у снежні 1944.

ПЯТРОЎСКІ Васіль Іванавіч, н. у 1912, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

РАВЯНКОЎ Іван Мітрафанавіч, н. у 1918 ва Уваравіцкім р-не, мал. палітрук, загінуў 26.3.1943.

РАВЯНКОЎ Фёдар Дзмітрыевіч, н. у 1914 ва Уваравіцкім р-не, яфр., памёр ад ран у 20.9.1943, пахаваны ў пас. Кірэеўка Смаленскай вобл.

РАДЗІВОНАЎ Сцяпан, н. у 1909 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак 24.12.1941.

РАДЗЬКОЎ Рыгор Піліпавіч, н. у 1924, сярж., загінуў 20.2.1945, г. Камін-Паморскі Кашалінскага ваяв., Польшча.

РАЖКОЎ Максім Акімавіч, ст. лейт., загінуў у жніўні 1942.

РАКАЎ Іван Савельевіч, н. у 1908, мал. лейт., загінуў у 1941.

РАМАНЕНКА Іван Міхайлавіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, ст. лейт., памёр ад ран 29.3.1943.

РАТНІКАЎ Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1909 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак у верасні 1941.

РУБАНАЎ Міхаіл Аляксеевіч, н. у 1921 ва Уваравіцкім р-не, лейт., прапаў без вестак у 1941.

РУБАНАЎ Павел Іванавіч, н. у 1919 ва Уваравіцкім р-не, кап., загінуў 27.3.1943, пахаваны ў Мгінскім р-не Ленінградскай вобл.

РУБАНАЎ Уладзімір Фёдаравіч, лейт., загінуў 18.8.1942.

РУДЗЯНКОЎ Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1924, лейт., прапаў без вестак 27.4.1945.

РУДЗЯНКОЎ Леанід Якаўлевіч, н. у 1925 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 25.8.1944, Папілеўская вол., Шаўляйскі пав., Літва.

РУДЗЯНКОЎ Мікалай Піліпавіч, н. у 1919, прызываўся Уваравіцкім РВК, сярж., загінуў 22.10.1943, пахаваны ў в. Трудалюбімаўка Такмакскага р-на Запарожскай вобл.

САДОВІК Іван Майсеевіч, н. у 1907, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., загінуў 25.2.1944, пахаваны ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл.

САДОЎСКІ Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1925, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., загінуў 16.10.1944, в. Залуксе Ружанскага пав. Варшаўскага ваяв., Польшча.

САЗОНАЎ Іван Максімавіч, н. у 1918 ва Уваравіцкім р-не, рад., памёр ад ран 26.2.1945, в. Задмінг Шчэцінскага ваяв., Польшча.

САЛАНЫ Васіль Мітрафанавіч, н. у 1923, пры-

зываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., прапаў без вестак у жніўні 1944.

САЛАЎЁЎ Якаў Мінавіч, н. у 1917 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 24.7.1944, г. Холм Люблінскага ваяв., Польшча.

САМОЙЛЕНКА Мікалай Сямёнавіч, н. у 1923 у Буда-Кашалёўскім р-не, сярж., загінуў 30.11.1942, пахаваны ў Цвярской вобл.

САМОЙЛЕНКА Уладзімір Цярэнцьевіч, н. у 1913, лейт., прапаў без вестак у 1941.

САМУСЕЎ Мікалай Мікітавіч, н. у 1920 ва Уваравіцкім р-не, ст. сярж., загінуў 2.8.1944.

САМЦОЎ Дзмітрый Кузьміч, н. у 1914 ва Уваравіцкім р-не, мал. лейт., прапаў без вестак 4.10.1942.

САМЦОЎ Пётр Іванавіч.

САРОКІН Восіп Аронавіч, н. у 1903, ваентэхнік 2-га рангу, прапаў без вестак у лютым 1944.

САЎЧАНКА Кірыла Іванавіч, н. у 1919, прызываўся Уваравіцкім РВК, мал. лейт., прапаў без вестак 16.5.1942.

САЎЧАНКА Цімафей Паўлавіч, н. у 1896, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., загінуў 22.2.1944, пахаваны ў в. Віша Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

СЕВЯРЫНАЎ Іван Пракопавіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 29.1.1945.

СЕЛІВАНАЎ Павел Іванавіч, н. у 1913, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., загінуў 27.7.1944, в. Зельна Беластоцкага р-на Беластоцкай вобл.

СЕМЧАНКА Ігнат Кірылавіч, н. у 1907 у Буда-Кашалёўскім р-не, сярж., загінуў 21.1.1944, пахаваны ў в. Перавоз Невельскага р-на Пскоўскай вобл.

СЕРАКОЎ Алег Іванавіч, н. у 1927 ва Уваравіцкім р-не, рад., памёр ад ран 25.2.1945 , пахаваны ў Літве.

СІВЯНКОЎ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1910 ва Уваравіцкім р-не, мал. сярж., прапаў без вестак 23.6.1944 на рацэ Друць.

СІДАРЭНКА Піліп Сямёнавіч, н. у 1920 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак 15.2.1943.

СІКАКІНАКІ Іван Іванавіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, яфр., загінуў 13.1.1942, пахаваны ў в. Ямна Чудаўскага р-на Наўгародскай вобл.

СІЛІН Іван Сямёнавіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, сярж., загінуў.

СІЛЬЧАНКА Іван Мікітавіч, н. у 1924 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 22.8.1944, в. Гжымка Замброўскага р-на Беластоцкай вобл.

СІЛЬЧАНКА Ягор Маркавіч, н. у 1922, лейт., прапаў без вестак у чэрвені 1941.

СІМКОЎ Дзмітрый Кузьміч, н. у 1914 у Буда-Кашалёўскім р-не, мал. лейт., прапаў без вестак 4.10.1942.

СЛАЎНЫ Дзмітрый Сямёнавіч, н. у 1913 у Буда-Кашалёўскім р-не, кап., загінуў 27.1.1945.

СЛЕСАРАЎ Уладзімір Васільевіч, н. у 1923 ва Уваравіцкім р-не, лейт., загінуў 11.3.1944.

СПЯВАК Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1908, сярж., загінуў 25.11.1942, пахаваны ў г. Валгаград.

СТАРАСЦЕНКА Арсеній Сямёнавіч, н. у 1914, мал. лейт., загінуў 2.7.1942.

СТАРАСЦЕНКА Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1910, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, ваентэхнік 2-га рангу, памёр ад ран 28.3.1944, пахаваны ў в. Абла751ы Ковельскага р-на Валынскай вобл.

СТАРЧАНКА Міхаіл Паўлавіч, н. у 1912, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, радавы, памёр ад ран 22.2.1944, пахаваны ў в. Вялікі Бор Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

СТАТКЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1925 ва Уваравіцкім р-не, сярж., загінуў 30.4.1944.

СУБОЦІН Аляксей Купрыянавіч, н. у 1924, мал. сярж., загінуў 22.3.1945, в. Вальтэрсдорф, Усх. Прусія.

СУСЛАЎ Фёдар Кірылавіч, н. у 1901, маёр, загінуў у 1941.

СЦІГАНАЎ Гаўрыла Сяргеевіч, сярж., памёр ад ран 9.8.1943.

СЦЯПАНАЎ Уладзімір Рыгоравіч, рад., памёр ад ран 6.8.1944, пахаваны ў г. Роўна.

СЫСОЕЎ Павел Васільевіч, н. у 1914, мал. палітрук, прапаў без вестак у маі 1942.

СЫТАЎ Іван Сямёнавіч, н. у 1906, лейт., прапаў без вестак у 1941.

СЫЧОЎ Пракоп Васільевіч, н. у 1903, кап., загінуў у 1941.

СЯМЁНАЎ Іван Фёдаравіч, н. у 1915, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, яфр., загінуў 1.3.1944, пахаваны ў пас. Гвардзейскі Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

ТАБОЛІН Пётр Фёдаравіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, авіятар, памёр ад ран.

ТКАЧЭНКА Мікалай Радзівонавіч, н. у 1919, прызываўся Уваравіцкім РВК, сярж., загінуў 6.2.1945, в. Хольксштайн, Усх. Прусія.

ТРЭЦЦЯКОЎ Пётр Мікалаевіч, н. у 1904, прызываўся Уваравіцкім РВК, мал. сярж., прапаў без вестак 1.3.1944.

ТУРАЎ Навум Абрамавіч, н. у 1921 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак 22.6.1941.

УДАВЕНКА Іван Трафімавіч, н. у 1913 у в. Затон Жлобінскага р-на Гомельскай вобл., прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, ст. сярж., прапаў без вестак у красавіку 1945.

УС Павел Пракопавіч, н. у 1899 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., памёр ад ран 20.1.1943, пахаваны ў пас. Красты Ленінградскай вобл.

УСЕЕЎ Іван Рыгоравіч, н. у 1918, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, ст. сярж., прапаў без вестак 26.8.1942 на х. Папоў Буерак Серафімовіцкага р-на Валгаградскай вобл.

УСОВІЧ Анатоль Адамавіч, н. у 1919, ст. лейт., памёр ад ран 30.3.1945.

ФАМЕНКА Уладзімір Кузьміч, н. у 1924 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў, пахаваны ў в. Улукаўе Гомельскага р-на Гомельскай вобл.

ФАМІН Рыгор Адамавіч, н. у 1901, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., прапаў без вестак 14.8.1942 у в. Дударава Арлоўскай вобл.

ФРАЛОЎ Даніла Міхайлавіч, н. ва Уваравіцкім р-не, загінуў 8.7.1944, пахаваны ў в. Пустошка Браслаўскага р-на Віцебскай вобл.

ХАЛЕЕЎ Віктар Захаравіч, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., загінуў.

ХВАСЦЯНКОЎ Андрэй Цімафеевіч, н. у 1905 ва Уваравіцкім р-не, кап. (нач. хімслужбы), прапаў без вестак.

ХІЛЬКЕВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1908 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак 22.5.1942.

ХОМЧАНКА Аляксандр Гаўрылавіч, н. у 1927 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 13.2.1945, в. Манце Вроцлаўскага ваяв., Польшча.

ХОМЧАНКА Іван Апанасавіч, лейт., памёр ад ран 22.2.1943.

ХОМЧАНКА Мікалай Сідаравіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, маёр, загінуў.

ЦАРАНКОЎ Іван Рыгоравіч, н. у 1920, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, прапаў без вестак 12.8.1941 у в. Царковічы Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл.

ЦАРАНКОЎ Іван Фаміч, н. у 1911, мал. лейт., прапаў без вестак у жніўні 1941.

ЦЕРАШКОЎ Аляксей Віктаравіч, н. у 1922 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак 26.5.1942.

ЦЕРАШКОЎ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1925 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., памёр ад ран 29.1.1945, в. Гросшэмандорф, Германія.

ЦІМАШЭНКА Васіль Марцінавіч, н. у 1917, ст. лейт., загінуў у снежні 1942.

ЦІТОЎ Ціт Паўлавіч, рад., загінуў 27.11.1942, пахаваны на х. Астахаў Бокаўскага р-на Растоўскай вобл.

ЦУКАРАЎ Канстанцін Міхайлавіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 21.12.1943.

ЦЫГАНКОЎ Даніла Маркавіч, н. у 1907 ва Уваравіцкім р-не, мал. лейт., прапаў без вестак у жніўні 1941.

ЦЫГАНКОЎ Сяргей Ануфрыевіч, н. ва Уваравіцкім р-не, лейт., загінуў 2.12.1943.

ЦЫКУНОЎ Пётр Савельевіч, н. у 1899 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 31.12.1941, пахаваны ў г. Колпіна Ленінградскай вобл.

ЦЯРЭШЧАНКА Дзяніс Пятровіч, н. у 1905 ва Уваравіцкім р-не, ваентэхнік 2-га рангу, прапаў без вестак у снежні 1941.

ЧУМАКОЎ Сяргей Сафронавіч, н. у 1922, прызываўся Уваравіцкім РВК, прапаў без вестак у чэрвені 1943.

ЧУЯШОЎ Міхаіл Восіпавіч, н. у 1923, прапаў без вестак 29.12.1943.

ЧЫЖОЎ Фёдар Анікеевіч, н. у 1907 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 23.8.1944, в. Гута Гуйна Чыжэўскага р-на Беластоцкай вобл.

ШАВЫРАЎ Піліп Васільевіч, н. у 1908, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., загінуў 21.2.1944, пахаваны ў в. Дубрава Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

Помнік загінуўшым воінам-землякам у в.Пянчын.

ШАКЛАНАЎ Васіль Васільевіч, н. у 1902 ва Уваравіцкім р-не, мал. лейт., прапаў без вестак 24.5.1942.

ШАМАЛАЎ Павел Фёдаравіч.

ШАПАВАЛАЎ Васіль Лявонавіч, н. у 1922, лейт., прапаў без вестак 19.1.1943.

ШАПКІН Піліп Ермалаевіч, н. у 1914 у Буда-Кашалёўскім р-не, сярж., памёр ад ран 24.8.1944, в. Дрыгенес Мадонскага р-на, Латвія.

ШАРАТНЕЎ Васіль Еўдакімавіч, прызываўся Уваравіцкім РВК, рад., прапаў без вестак 12.11.1941.

ШАСТАКОЎ Аляксей Данілавіч, н. у 1901 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак у снежні 1943.

ШАЎЦОЎ Аляксей Мікалаевіч, н. у 1907, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, інтэндант 3-га рангу, загінуў 18.8.1944, в. Шарпены, Малдова.

ШАЎЦОЎ Іван Міхайлавіч, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, сярж., прапаў без вестак 2.7.1942.

ШАЎЦОЎ Сцяпан Захаравіч, н. у 1919 ва Уваравіцкім р-не, сярж., загінуў 17.1.1942.

ШАЎЦОЎ Уладзімір Аляксеевіч, лейт., памёр ад ран 8.1.1943.

ШАЎЧЭНКА Міхаіл Сяргеевіч, н. у 1920, мал. лейт., загінуў 21.3.1945.

ШКРАБАВОДЗЬКА Іван Цімафеевіч, н. у 1925 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 31.3.1945, г. Сопат, Гданьскае ваяв., Польшча.

ШКРАБАЎ Апанас Нічыпаравіч, н. у 1907 ва Уваравіцкім р-не, рад., загінуў 26.8.1944, в. Надколе Варшаўскага ваяв., Польшча.

ШЧЭМЕЛЕЎ Сямён Купрыянавіч, н. у Буда-Кашалёўскім р-не, ст. лейт., прапаў без вестак у 1941.

ШЫМАНЕЎ Васіль Аляксеевіч, н. у 1914, ст. сярж., загінуў 3.2.1942, пахаваны ў в. Баршчавое Балаклейскага р-на Харкаўскай вобл.

ШЫНКАРОЎ Мікіта Мартынавіч, н. у 1905 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

ШЫНКАРОЎ Уладзімір Іванавіч, н. у 1908 ва Уваравіцкім р-не, сярж., прапаў без вестак 30.8.1942.

ШЭРШЫН Павел Цярэнцьевіч, н. у 1902, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., прапаў без вестак 25.8.1942.

ЮРЧАНКА Аляксандр Антонавіч, н. у 1918 ва Уваравіцкім р-не, ст. сярж., загінуў 21.2.1944, пахаваны ў в. Язвін Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ЮРЧАНКА Восіп Прохаравіч, н. у 1915, мал. лейт., загінуў 14.8.1945.

ЮРЧАНКА Юрый Іванавіч, н. у 1904 ва Уваравіцкім р-не, рад., прапаў без вестак 20.10.1941.

ЮСУПАЎ Шакір Юсупавіч, н. у 1911, прызываўся Буда-Кашалёўскім РВК, рад., прапаў без вестак 25.9.1942.

ЯРЫГІН Мірон Андрэевіч, загінуў 9.7.1944.

ЯЦ(Н)КОЎ Фёдар Андрэевіч, н. у 1907 у Буда-Кашалёўскім р-не, рад., загінуў 21.2.1945.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

Да пачатку 1950-х гадоў у Буда-Кашалёўскім раёне быў адноўлены даваенны эканамічны ўзровень. У аграрным сектары адрадзілася матэрыяльна-тэхнічная база, у 1954 г. калгасы і саўгасы дасягнулі даваеннага ўзроўню пасяўных плошчаў і вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі. Аднак даваенны ўзровень жыцця на сяле яшчэ не быў дасягнуты.

Марудна ішла электрыфікацыя. Да лістапада 1958 г. электрыфікаванымі былі толькі тры калгасы, саўгас «Рагінь», шэсць населеных пунктаў і тры жывёлагадоўчыя фермы. Заставалася неэлектрыфікаванай нават большасць вуліц раённага цэнтра.

Між тым сельскі раён — гэта не толькі тэрытарыяльна-адміністрацыйная адзінка, але і складаная эканамічная структура. Яе зладжаная дзейнасць у многім залежыць ад узгодненасці ў працы калгасаў і саўгасаў, абслугоўваючых іх прадпрыемстваў і арганізацый, умелага кіравання ўнутрыгаспадарчымі рэсурсамі, тэхнікай, іншымі сродкамі.

Сельскі раён — гэта яшчэ і сацыяльная сістэма, у якой шмат праблем вырашаецца толькі сумеснымі намаганнямі ўсяго гаспадарчага комплексу.

Пытанні эканамічнага і сацыяльна-культурнага развіцця сяла захоўвалі сваю вастрыню і заставаліся асноўнымі ў арганізацыйна-гаспадарчым, навукова-тэхнічным і культурным жыцці ва ўсе пасляваенныя гады.

У цэлым 1950-я гады для раёна — гэта перыяд складаных пераўтварэнняў. Партыйнымі і савецкімі органамі на месцах прымаліся меры, накіраваныя на павелічэнне выпуску прадукцыі, матэрыяльнай зацікаўленасці калгаснікаў, рабочых саўгасаў, спецыялістаў і арганізатараў вытворчасці. У гэтыя гады былі павялічаны закупачныя цэны на сельгаспрадукцыю, спісана запазычанасць з калгасаў, зменена сістэма падаткаабкладання, у тым ліку і асабістага землекарыстання вяскоўцаў. Калі ў 1952 г. сельгаспадатак з гаспадаркі калгасніка складаў 523 руб., то ў 1953 г. — 236 руб., а ў 1954 г. — 162 руб.

Новыя закупачныя цэны былі ў тры разы вышэй цэн 1952 г., а на малако і малочныя прадукты — у 4 разы, на жывёлу — у 11,5 раза. Такія цэны дазвалялі гаспадаркам не толькі пакрываць затраты, але і набываць сродкі для далейшага развіцця вытворчасці.

Станоўчыя вынікі дало ўзбуйненне калгасаў. Слабыя гаспадаркі былі аб'яднаны ў 14 буйных калектываў, якія сталі эканамічна мацнейшымі, шматгаліновымі, тэхнічна аснашчанымі. На

базе 10 маламоцных калгасаў былі створаны два саўгасы — «Рагінь» і «Буда-Кашалёўскі». Павялічыліся даходы новых гаспадарак, а з імі і перспектывы росту дабрабыту калгаснікаў.

Ураджайнасць збожжавых узрасла з 4—5 ц з гектара ў пачатку 1950-х гадоў да 21,1 ц у 1965 г., бульбы — з 17 ц у 1945 г. да 104 ц у 1965 г.

Асобнай крыніцай даходаў у гаспадарках стала вырошчванне лёну. Ужо ў 1954—1955 гг. толькі ад продажу дзяржаве льновалакна і льнонасення даходы льнаводчых гаспадарак раёна павялічыліся ў 3,4 раза ў параўнанні з 1948—1952 гг. А пасля павышэння закупачных цэн грашовыя даходы толькі за 1955 г. павялічыліся ў параўнанні з 1952 г. больш чым у 10—12 разоў. Гэта станоўча адбілася на развіцці вытворчасці, на грашовых даходах калгаснікаў.

Важную ролю ў далейшым развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці адыграла цесная сувязь гаспадарак з навукова-даследчымі цэнтрамі рэспублікі. Упор быў зроблены на падняцце культуры земляробства і павелічэнне на гэтай аснове ўраджайнасці палёў і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі.

Ва ўсіх без выключэння гаспадарках вучоныя даследавалі землі і далі рэкамендацыі па ўдасканальванні севазваротаў. Разам з тым ствараліся новыя і ўдасканальваліся існуючыя гатункі збожжавых і бульбы, іншых культур. А з 1961 г. пачала працаваць першая эксперыментальная база «Уваравічы», асноўным прызначэннем якой стала вырошчванне і пастаўка элітнага насення збожжавых і бульбы гаспадаркам раёна і вобласці.

Да канца 1950-х гадоў было дасягнута больш аптымальнае размяшчэнне і спецыялізацыя вытворчасці гаспадарак. Раён стаў адной з важных зон па вырошчванні бульбы, малочна-свінагадоўчага комплексу рэспублікі.

Сур'ёзную ўвагу ў раёне ўдзялялі праблемам матэрыяльнай зацікаўленасці працаўнікоў сяла ў росце вытворчасці. Уводзяцца розныя формы авансавання працы: грашовыя, натуральныя і інш. Па меры павелічэння грашовых даходаў у 1966 г. калгасы перайшлі да гарантаванай грашовай аплаты працы. Стала прымяняцца дадатковая аплата. У калгасах імя Леніна, «Чырвоны шлях» і шэрагу іншых гэта дазволіла ўзняць ураджайнасць збожжавых, бульбы, лёну, вытворчасць мяса.

Некаторыя гаспадаркі ў якасці дадатковай аплаты штомесячна сталі выдаваць даяркам па 1% і пастухам па 2% ад агульнай колькасці малака, надоенага ад замацаванай групы кароў. Такая форма матэрыяльнага заахвочвання апраўдала сябе. Палепшыўся догляд жывёлы, павысіўся сярэдні надой. Вытворчасць малака ў раёне за 1956 г. павялічылася ў 2,1 раза ў параўнанні з 1953 г. У шэрагу калгасаў надоі на адну карову перавысілі 2000 кілаграмаў, вытворчасць мяса ў 1957 г. (у жывой вазе) у параўнанні з 1953 г. павялічылася на 24%, а свініны — у 2,5 раза.

Значна павялічылася пагалоўе жывёлы. У выніку выхад жывёлагадоўчай прадукцыі калгасаў і саўгасаў за 1954—1958 гг. больш чым падвоіўся. Даход калгаснікаў у гэтыя гады павялічыўся ў 4,1 раза.

Склаўшаяся яшчэ на першым этапе калгаснага будаўніцтва форма тэхнічнага і аграномічнага абслугоўвання ўжо перастала адпавядаць узрослым магчымасцям гаспадарак. У 1958 г. МТС былі рэарганізаваны ў РТС (рамонтна-тэхнічныя станцыі), а тэхніка, якая ім належала, прададзена калгасам.

Значная частка сродкаў калгасаў на набыццё тэхнікі была кампенсавана дзяржавай, і з калгасаў спісвалася ўся запазычанасць мінулых гадоў за працу МТС. Аднак шэраг гаспадарак не мелі магчымасці выкупіць тэхніку. Менавіта такім гаспадаркам дзяржава

крэдытавала сродкі, уводзіла растэрміноўку плацяжоў.

У новых умовах па нарошчванні вытворчых магутнасцей сталі прыцягвацца непасрэдна сродкі гаспадарак. Павысілася адказнасць механізатарскіх кадраў за канчатковы вынік працы.

Пераход ад натуральнай да грашовай аплаты на працадзень, пашырэнне і ўдасканальванне гасразліку ў калгасах і перавод саўгасаў на поўную самаакупнасць вытворчасці значна павысілі зацікаўленасць у эфектыўнасці гаспадарання.

У пачатку 1960-х гадоў адбыліся змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле. У 1962 г. былі скасаваны Уваравіцкі і Чачэрскі раёны. Гарадскія пасёлкі Уваравічы і Чачэрск, а таксама сельсаветы скасаваных раёнаў былі далучаны да Буда-Кашалёўскага раёна. У 1962 – 1965 гг. у Буда-Кашалёўскім раёне 313 населеных пунктаў і 3 гарадскія пасёлкі. Больш за 10% населеных пунктаў мелі ад 10 да 30 двароў. Многія з іх было вырашана ссяляць у вялікія вёскі, пры гэтым даваць крэдыты для будаўніцтва і ўладкавання перасяленцаў на новых месцах. На будаўніцтве жылля працавалі брыгады спецыялістаў з міжкалгасбуда. У 1965 г. Чачэрск і большасць ягоных сельсаветаў увайшлі ў самастойны раён.

У сярэдзіне 1960-х гадоў у калгасах і саўгасах праводзілася атэстацыя зямлі, каб выявіць яе прадукцыйнасць. Малапрадукцыйныя землі выключаліся з севазвароту. У прыватнасці, ішла перабудова аграрнага сектара, разбуйняліся або аб'ядноўваліся калгасы, ствараліся новыя саўгасы.

Да 1965 г. у Буда-Кашалёўскім раёне было нанава арганізавана 19 гаспадарак, разбуйнены саўгасы «Буда-Кашалёўскі» і «Камунар», арганізавана эксперыментальная база «Уваравічы».

Яшчэ ў пачатку 1960-х гадоў шэраг калгасаў раёна пачаў укараняць элементы гасразліку. Адным з першых на гасразлік перайшоў калгас імя Леніна. За два гады работы па-новаму гэта гаспадарка ўдвая павялічыла прыбытак. У 1963 г. ён склаў 850 тыс. руб. (у 1961 г. — 438 тыс. руб.). Калгаснікі на працадзень атрымалі ў залежнасці ад асабістай выпрацоўкі ад 1,08 да 0,72 руб. грашыма і ад 1,08 да 0,75 кг збожжам, па 1,18 – 0,93 кг бульбы.

Вынікі 1963 г. паказалі, што для пераходу на поўны гасразлік калгасам неабходна мець значныя сродкі, добрую матэрыяльна-тэхнічную базу і інш. Аднаго працоўнага энтузіязму проста недастаткова. У сілу многіх прычын па ўсіх эканамічных паказчыках 1963 г. раён аказаўся на 14-м, перадапошнім месцы ў вобласці.

Да сярэдзіны 1960-х гадоў адной з вастрэйшых праблем стала стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы, аснашчэнне сельскай гаспадаркі тэхнікай. Але ў раёне амаль да пачатку 1970-х гадоў сярэдні памер малочна-таварнай фермы налічваў 150 кароў, свінафермы — 680 свіней, авечкафермы — 400 авечак. Гэта з'яўлялася тормазам для механізацыі працаёмкіх працэсаў і зніжэння сабекошту прадукцыі. Для вырашэння гэтых праблем неабходна было ўкласці нямала грашовых сродкаў.

За 1966 – 1985 гг. у развіццё сельскай гаспадаркі раёна было накіравана ў 4,4 раза больш сродкаў, чым за ўвесь перыяд ад пачатку калектывізацыі і да 1965 г. разам узятых. Да сярэдзіны 1980-х гадоў фондаўзброенасць працы ў гаспадарках узрасла ў 5,5 раза.

Аднавіўся і значна папоўніўся тэхнічны арсенал гаспадарак, што дазволіла комплексна механізаваць шмат тэхналагічных працэсаў у земляробстве і на жывёлагадоўчых фермах. Узраслі энергаўзброенасць працы і энергазабяспечанасць вытворчасці. Поўнасцю былі механізаваны апрацоўка глебы, сяўба збожжавых, тэхнічных, кармавых культур і пасадка бульбы, догляд за пасевамі, уборка, шэраг іншых

работ. У гаспадарках створаны буйныя трактарна-паляводчыя і механізаваныя брыгады з паточна-групавым метадам выкарыстання тэхнікі, у складзе якіх меліся спецыялізаваныя звенні.

На нарыхтоўцы кармоў, уборцы збожжавых, бульбы і іншых культур шырока выкарыстоўвалася атрадная форма арганізацыі працы. На двухзменны рэжым працы і двухцыклічны распарадак дня перайшлі жывёлагадоўчыя фермы, стала прымяняцца раздзельная цэхавая арганізацыя працы.

У гэтыя гады было шмат зроблена і для паляпшэння сацыяльна-эканамічных умоў жыцця на сяле.

Да сярэдзіны 1980-х гадоў у параўнанні з 1965 г. аплата працы рабочых і служачых саўгасаў узрасла ў 2,2 раза, а калгаснікаў — у 2,8 раза, палепшылася пенсіённае забеспячэнне.

У радзе калгасных цэнтраў выраслі сучасныя добраўпарадкаваныя гарадкі з клубамі, дамамі культуры, прадпрыемствамі гандлю і грамадскага харчавання.

У 1975 г. Буда-Кашалёўскі раён за дасягненні ў будаўніцтве і добраўпарадкаванні вёсак атрымаў пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ.

У 1980-я гады ў раёне была ажыццёўлена праграма далейшай спецыялізацыі і канцэнтрацыі вытворчасці на базе міжгаспадарчай кааперацыі.

Эканамічныя рэформы 1980-х гадоў далі пэўны штуршок для развіцця сельскай гаспадаркі. Былі часткова зняты абмежаванні на рэалізацыю прадукцыі.

Кіраўнікі гаспадарак атрымалі магчымасць па шматлікіх пытаннях вытворчасці прымаць самастойныя рашэнні, адыходзіць ад шэрагу прадпісанняў «зверху». Гаспадаркі атрымалі права мяняць арганізацыю і структуру вытворчасці ў адпаведнасці з эканамічным эфектам, што ўжо на першым этапе рэформ дало станоўчыя вынікі. У 1986—1990 гг. сярэднегадавая ўраджайнасць збожжа склала 27,9 ц, бульбы — 186 ц, ільноваламна — 6,6 ц.

Адной з важнейшых галін сельскагаспадарчай вытворчасці з'яўлялася жывёлагадоўля.

У 1966—1985 гг. у калгасах і саўгасах ажыццёўлены комплекс арганізацыйных і эканамічных мер па павелічэнні вытворчасці кармоў, паляпшэнні пародзістасці жывёлы, умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы жывёлагадоўлі. Пераход на спецыялізацыю і канцэнтрацыю вытворчасці ў жывёлагадоўлі даў станоўчыя вынікі. Былі пабудаваны спецыялізаваныя комплексы па вытворчасці малака,

Цэх па рамонце трактароў у раённым аб'яднанні «Сельгастэхніка». 1971 г.

ялавічыны, свініны, птушкі. Сярэдні памер малочна-таварных ферм павялічыўся ў 1,5 раза. Але не ва ўсіх гаспадарках была створана трывалая кармавая база, а гэта зніжала прадукцыйнасць жывёлагадоўлі. Напрыклад, прырост вытворчасці ялавічыны амаль на 60% дасягаўся за кошт павелічэння пагалоўя, а не за кошт яе вагі. Сярэднясутачнае прыбаўленне ў вазе буйной рагатай жывёлы не перавышала 400 грамаў. Нізкімі заставаліся і тэмпы вытворчасці свініны.

У 1985 г. сабекошт 1 кг прыбаўлення ў вазе буйной рагатай жывёлы аказаўся на 38% вышэй, чым у 1975 г.

І тым не менш да пачатку 1990-х гадоў раён займаў у Гомельскай вобласці другое месца па вытворчасці мяса, трэцяе — па збожжавых, чацвёртае — па вырошчванні бульбы і пятае — па надоях малака, вырабляў у вобласці 25% льноваланка. Узровень рэнтабельнасці сельскагаспадарчай прадукцыі складаў больш за 50%. Раён неаднаразова выходзіў пераможцам у рэспубліканскіх і абласных спаборніцтвах.

Чарнобыльская трагедыя 1986 г. рэзка ўскладніла эканоміку раёна і знізіла яе гаспадарчы патэнцыял. Да 1986 г. у раёне было 105 754 га сельгасугоддзяў, з якіх на 1 студзеня 1999 г. засталося 91 400 га. Колькасць працаўнікоў у сельскай гаспадарцы па стане на 1 студзеня 1986 г. складала 10 810, а на 1 студзеня 1999 г. засталося 6 746 чалавек. У тыя ж гады вытворчасць малака скарацілася ў 1,6 раза, мяса — у 1,9, зерня — у 1,2, бульбы — у 3, ільноваланка — у 2 разы. Але такія вынікі былі абумоўлены не толькі наступствамі аварыі на ЧАЭС. Былі і іншыя прычыны.

Перадавікі вытворчасці раёна пасля ўручэння ім дзяржаўных узнагарод у Буда-Кашалёўскім райвыканкоме. 1975 г.

Раён меў вялікую колькасць пагалоўя буйной рагатай жывёлы, свіней, моцную бройлерную фабрыку. Але ўласнай вытворчасці збожжавых для іх утрымання было недастаткова. Пасля распаду Савецкага Саюза пастаўка збожжавых з іншых рэгіёнаў спынілася. Буйныя жывёлагадоўчыя комплексы па вытворчасці ялавічыны, свініны, птушкі і яек засталіся без дастатковай колькасці камбікармоў, вымушаны былі рэзка скарачаць пагалоўе жывёлы, вытворчасць бройлераў і інш.

З пераходам да свабоднага цэнаўтварэння склаўся дыспарытэт цэн: кошт трактароў, аўтамабіляў, збожжа- і кормаўборачных камбайнаў, іншай тэхнікі ўзрос у сотні разоў, а цэны на прадукцыю сельскай гаспадаркі (збожжа, малако, мяса, агародніну і садавіну і інш.) аказаліся нізкімі.

Калгасы і саўгасы раёна апынуліся ў цяжкім становішчы.

Амаль спыніліся закупкі тэхнікі, пайшоў працэс хуткага старэння і зносу сельгасмашын і механізмаў. Абвастрыліся праблемы разлікаў за газ, паліва, электраэнергію, мінеральныя ўгнаенні, сродкі аховы раслін.

Непрыстасаваныя да працы ў рыначных умовах калгасы і саўгасы аказаліся ў глыбокім крызісе. Спроба актывізаваць гаспадарчую дзейнасць за кошт фермерскіх гаспадарак не ўдалася. Не было спецыялістаў, якія хацелі і маглі б весці фермерскую гаспадарку. Не хапала і фінансавых сродкаў. У 1991 г. у раёне было 8 фермерскіх гаспадарак. За 10 гадоў (1991 — 1999) іх колькасць узрасла да 28. У значнай большасці гэта маламоцныя гаспадаркі з агульнай плошчай раллі 738 га, у т.л. 583 га збожжавых, 39 га — бульбы. За 1998 г. тут валавы збор збожжа склаў 1067 т, бульбы — 357 т.

За пасляваенныя гады карэнным чынам змянілася сацыяльная інфраструктура сяла. Практычна ў кожнай гаспадарцы маюцца тыпавыя школы, дзіцячыя сады, фельчарска-акушэрскія пункты, магазіны.

З райцэнтра на цэнтральныя сядзібы гаспадарак пракладзены асфальтавыя дарогі. Перабудаваўся і райцэнтр. Ажыццёўлена вялікая праграма па будаўніцтве жылля, узведзены новы жылы мікрараён, сярэдняя школа, два дзіцячыя сады, універмаг, раённы вузел сувязі, шэраг адміністрацыйных пабудоў, бальнічны комплекс, цэнтральная гарадская кацельная, горад газіфікаваны.

Асноўнымі прадпрыемствамі раёна з'яўляюцца: адкрытыя акцыянерныя таварыствы (ААТ) «Буда-Кашалёўскія сыры», сумеснае беларуска-галандскае прадпрыемства «АМІПАК», «Буда-Кашалёўская сельгасхімія», «Буда-Кашалёўскі райаграснаб», будаўнічыя арганізацыі, ДРБУ-184, МПМК-92, прадпрыемствы меліярацыйных сістэм, Уваравіцкі льнозавод, Буда-Кашалёўскі лясгас, камбінат кааператыўнай прамысловасці і інш. Яны захавалі традыцыйны для раёна вытворчы профіль, нарошчваюць узровень вытворчасці, садзейнічаюць органам мясцовай улады ў вырашэнні сацыяльных праблем.

Народная адукацыя раёна — гэта 24 сярэднія, 14 базавых і 1 пачатковая школы, 2 музычныя школы. Працуе 714 настаўнікаў і выхавацеляў. У Буда-Кашалёўскім агратэхнічным каледжы займаюцца 882 юнакі і дзяўчыны.

У раёне ёсць 7 медыцынскіх устаноў, у тым ліку цэнтральная раённая бальніца на 215 ложкаў, Уваравіцкая раённая бальніца на 115, Рагінская, Камунарская, Чабатовіцкая сельскія ўчастковыя бальніцы на 25 ложкаў кожная. Медыцынскую дапамогу насельніцтву таксама аказваюць 33 фельчарска-акушэрскія пункты. У раёне 69 урачоў, 310 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу.

З устаноў культуры: раённы Дом культуры, Уваравіцкі пасялковы і 35 сельскіх дамоў культуры, раённая цэнтральная бібліятэка, 37 яе сельскіх

філіялаў і 3 дзіцячыя бібліятэкі. Створаны 263 самадзейныя калектывы.

Працуюць і адкрываюцца новыя цэрквы і малітоўныя дамы. Напрыклад, у в. Глазаўка ў 1930-я гады была закрыта царква, разбурана званіца і зняты званы. У нашы дні жыхары гэтай і іншых навакольных вёсак атрымалі магчымасць наведваць новую царкву, якой былі вернуты і іконы, і прадметы культу, што доўгія гады захоўвалі прыхаджане.

Вялікая ўвага ўдзяляецца спартыўнай рабоце. Дзейнічаюць 2 стадыёны, 28 спартзалаў агульнаадукацыйных школ, 6 — вытворчых прадпрыемстваў і ўстаноў, дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па веласпорце і дзіцяча-юнацкі клуб фізічнай падрыхтоўкі.

Спартсмены Буда-Кашалёўшчыны актыўна ўдзельнічаюць у абласных і рэспубліканскіх спартакіядах і спаборніцтвах па такіх відах спорту, як футбол, валейбол, настольны тэніс, шашкі, шахматы, армрэслінг, лёгкая атлетыка, веласпорт і інш. Лепшыя выхаванцы Камунараўскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы па веласпорце ўваходзяць у склад нацыянальнай зборнай каманды, удзельнічаюць у чэмпіянатах Еўропы і свету.

Буда-Кашалёўшчына дала дзяржаве шмат знакамітых і таленавітых людзей, герояў вайны і працы, вучоных, мастакоў і пісьменнікаў, дзеячаў культуры і розных галін вытворчасці.

Н.М.Мішур, У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

З ПАСЯДЖЭННЯ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

4 красавіка 1946 г.

...Утвержденный фонд муки по контингенту Буда-Кошелевского района на март 1946 г. — 37 086 кг, но учитывая, что облисполком окончательно утвердил и спустил фонд муки 30 800 кг, что не позволяет выдать полной нормы контингенту хлеба, исполком райсовета решил: утвердить норму выдачи хлеба на март 1946 г.: рабочим — 500 гр., служащим — 300 гр., иждивенцам — 100 гр., иждивенцам совпартактива — 200 гр...

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 782. Воп. 4. Спр. 13. Л. 90.

З ПАСТАНОВЫ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЙВЫКАНКОМА І РАЙКОМА КП(б)Б

13 сакавіка 1947 г.

...приняты меры по охране социалистической собственности и общественного порядка в районе. В каждом населенном пункте из числа местного населения организованы группы общественного порядка, установлено ночное дежурство, а во время полевых работ и дневные обходы. Установлено круглосуточное дежурство при сельских Советах.

Сторожей складов и амбаров обеспечили оружием и свистками. Производится проверка документов у приезжающих лиц и вызывающих сомнение.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл. Ф. 233. Воп. 2. Спр. 45. Л. 4.

СА СПРАВАЗДАЧЫ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РК КП(б)Б

1 кастрычніка 1947 г.

«...колхозами произведена выдача на трудодни из расчета за 8—9 месяцев:

зерновых культур:

а) от 150 до 500 гр — 61 колхоз

б) от 500 гр до 1 кг — 8 колхозов

в) от 1 до 2 кг —

г) от 2 до 3 кг —

д) ничего не выдано — 10 колхозов

картофеля:
до 1 кг — 24 колхоза
от 1 до 2 кг — 8 колхозов
от 2 до 3 кг — 1 колхоз
от 3 до 5 кг — 1 колхоз
от 5 до 8 кг — 1 колхоз
ничего не выдано — 49 колхозов
Выдали на трудодни овощи и фрукты — 15 колхозов

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл. Ф. 253. Воп. 2. Спр. 9. Л. 18.

СА СПРАВАЗДАЧЫ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

12 чэрвеня 1948 г.

...Исполком райсовета депутатов трудящихся отмечает, что решение исполкома № 794 от 24.12.1947 г. не выполнено. Из имеющихся в г.п. 525 коров по состоянию на 1.12.1948 г. зарегистрировано всего лишь 55 коров и собрано сбора 1100 руб.

Имеющиеся семь лошадей в личном пользовании по райцентру не зарегистрированы и сбор с владельцев не взыскан.

В 1946 г. райкоммунхозом было зарегистрировано 362 велосипеда. В 1947 г. — только 103, а в 1948 — только 8 велосипедов, тогда как наличие их у граждан значительно увеличилось...

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 782. Воп. 4. Спр. 26. Л. 10.

З ПАСЯДЖЭННЯ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

1948 г.

«...Исполком райсовета депутатов трудящихся отмечает, что на 11 546 человек трудоспособных колхозников не выработало установленного минимума трудодней по району за первый период сельскохозяйственных работ 1452 человека, или 12,6%. Из них мужчин — 17 человек, женщин — 1127 человек и не принимало совершенно участия в работе: мужчин — 4, женщин — 304 человека...

...Проверкой также установлено, что наибольшее количество колхозников, не выработавших установленного минимума трудодней без уважительных причин, падает на осеннелетний период, так как многие колхозники и колхозницы заняты в своем личном хозяйстве по обработке своих приусадебных участков. Правления колхозов и сельских Советов не ведут надлежащей борьбы за выполнение минимума трудодней каждым колхозником и укрепление трудовой дисциплины в колхозах.

Со стороны сельхозотдела, органов прокуратуры и народного суда не было уделено достаточного внимания в выполнении Указа Президиума Верховного Совета СССР от 15 апреля 1942 г. «Об ответственности колхозников за выработку обязательного минимума трудодней». Не привлекали к законной ответственности нарушителей трудовой дисциплины...

...Правлениями колхозов передан материал в нарсуд на 18 человек, нарушителей трудовой дисциплины — на 10 мужчин и 8 женщин...»

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 732. Воп. 4. Спр. 26. Л. 50.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БЮРО ГОМЕЛЬСКАГА АБКОМА КП(б)Б

24 мая 1950 г.

п. 5 Об объединении мелких колхозов в Уваровичском районе

ПОСТАНОВИЛИ: Принять предложение Уваровичского райисполкома и райкома КП(б)Б об объединении мелких колхозов:

1. Им. Ворошилова, «Ударник пятилетки» и «Чырвоны трудовик» Чеботовичского с/совета.
2. «Новая жизнь» и «Коммунар» Глазовского с/совета.
3. «Чангарской дивизии», им. Кагановича Калининского с/совета.

4. им. Энгельса, им. Молотова и «Чырвоная Завидовка» Лапичского с/совета.
5. «Чырвоны Шлях» Бацунского сельсовета и «Ленинский Шлях» Бервенковского с/совета.
6. «1 Мая» и им. Тельмана Тереничского с/совета.
7. «Коминтерн», им. Сталина, «Чырвоны колас» Липиничского с/совета.
8. «Чырвоная Площадь» и «Чырвоны Усход» Телешовского с/совета.
п. 7 Об объединении мелких колхозов в Буда-Кошелевском р-не
ПОСТАНОВИЛИ: Принять предложение Буда-Кошелевского райисполкома и райкома КП(б)Б об объединении колхозов:
1. «Чырвоны Кастрычник», «Парижская Коммуна», «1 Мая», им. Ленина Дуравичского с/совета.
2. «Агульная праца», «Новая волна», «2-я пятилетка» и «Тракторист» Недойского с/совета.
3. им. Сталина, «Родина», «Правда» и им. М.Горького Потаповского с/совета.
4. им. Сталина, «Память Ленина», «Новая жизнь», «Шлях Кастрычника» Приборского с/совета.
5. «Шлях да камунизму», «Коминтерн», им. Молотова Буда-Люшевского с/совета
6. им. Кагановича, «Победа», «Урожай», «Шлях социализма» Забабского с/совета.
7. «Ударник», «Новая зорька», им. Фрунзе Буда-Кошелевского с/совета.
8. им. Красина, им. Чапаева, «Чырвоны Днепр», им. Энгельса и «Интернационал» Губичского с/совета.
9. «Диктатура Пролетариата» Буда-Люшевского, «Большевик» Забабского с/совета.
10. «Чырвоны цягнік», «Новая жизнь», «Авангард», «Чырвоны Пахар» Липиничского и «Чырвоны городок» Кошелевского с/совета.
11. «Колас», «Коммунар», «Чырвоны Прибор», «Чырвоная Зорька», «Чырвоная Любань», «Пролетар», «Перамога» Приборского с/совета.
12. «Дружба», им. Сталина, «Рассвет», «Чырвоная Беларусь» Буда-Кошелевского с/совета.
13. «Новая Жизнь», им. Буденного, «Чырвоны партизан», «Передовик» и «Перемога» Липиничского с/совета.
14. им. Дзержинского, им. Куйбышева, «Шлях Ленина» Любавинского с/совета.
15. «Пролетарий», «Коммунар», им. Сталина, «3-я пятилетка», им. Ворошилова Кошелевского и «Завет Ленина» Потаповского с/совета.
16. им. Кирова Недойского и им. Ворошилова Губичского с/совета.
17. «16 лет Октября», «Вызваленне», «Васход», «Пролетарий» Рогинского с/совета.
18. «Власть Советов», «Чырвоны Сцяг», «Камунар» Рогинского с/совета.
19. «Селькор», «Сцяг Советов» и «Селянин» Забабского с/совета.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл. Ф. 144. Воп. 34. Спр. 20. Л. 157, 158, 159.

СА СПРАВАЗДАЧЫ БЮРО БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РК КП(б)Б

16 чэрвеня 1951 г.

В районе за последние годы проделана значительная работа среди взрослого населения по ликвидации неграмотности и малограмотности. Но эта работа еще не завершена. В районе все еще остаются неграмотных 633 человека и значительное число малограмотных. В Буда-Кошелевском сельсовете насчитывается 161 человек, в Дуравичском — 98 человек, в Кошелевском — 77 человек неграмотных...

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл. Ф. 253. Воп. 8. Спр. 26. Л. 156.

З ПАСТАНОВЫ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

15 жніўня 1952 г.

В связи с происшедшим укрупнением колхозов считать целесообразным произвести укрупнение сельских Советов района за счет упразднения четырех сельских Советов и образовать девять сельских Советов.

а) упразднить Дуравичский сельсовет и влить его в Кошелевский сельсовет со всеми населенными пунктами, а именно: деревнями Дуравичи, Дубовицы, Мачулище, Ленина, поселками Лосев, Броды, Залуневье, Болдуи, Бурлак;

б) упразднить Забабский сельсовет и влить его в Потаповский сельсовет со всеми населенными пунктами: деревнями Забабье, Гавли, поселками Победа, Демино, Качан, Дубровка, Миново, Лядо, Дедов Курган, Березина, Козиный Рог, Возрождение, Первомайский;

в) упразднить Любавинский сельский Совет и влить его в Буда-Люшевский со всеми населенными пунктами: деревнями Старый Любавин, Основка, Новый Любавин, поселками Заречье, Шутное, им. Сталина;

г) упразднить Заболотский сельсовет и влить его в Рогинский сельсовет со всеми населенными пунктами, а именно: деревнями Заболотье, Коромка, поселками Никольск, Кучинск, Восход, Новое Заболотье, Юго-Никольск.

2.Внести изменение в административно-территориальное деление следующих сельских Советов:

а) поселки Мигай и Березовка Недойского сельсовета отнести к Буда-Кошелевскому поселковому Совету;

б) деревню Еленец Губичского сельсовета отнести к Недойскому сельсовету;

в) поселок Чырвоны Городок Кошелевского сельсовета отнести к Липиничскому сельсовету;

г) д. Хмельное Забабского сельсовета отнести к Буда-Люшевскому сельсовету;

д) д. Моисеевка Приборского сельсовета отнести к Рогинскому сельсовету.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл. Ф. 782. Воп. 4. Спр. 104. Л. 68.

СА СПРАВАЗДАЧЫ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РК КП(б)Б

1954 г.

...колхозники самовольно и по незаконным справкам уходят из колхозов на работы на предприятия в райцентр, на торфопредприятия в г. Гомель и другие места. Их силой возвращают обратно в колхозы. Не берут на работу в другие организации...

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл. Ф. 253. Воп. 8. Спр. 8. Л. 1.

АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЕ ЎЛАДКАВАННЕ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА З 1954 г. ПА 1981 г.

16.7.1954 г. ликвидированы Заболотский, Любавинский сельсоветы, образован Морозовский сельсовет; 29.11.1961 г. ликвидирован Забабский сельсовет;

17.4.1962 г. к району присоединены г.п. Уваровичи и Бервеновский, Блюдницкий, Глазовский, Гусевицкий, Ивольский, Каменинский, Кривский, Липский, Смычковский, Октябрьский, Чеботовичский сельсоветы,

25.12.1962 г. — г.п. Чечерск и Беляевский, Залесский, Захарпольский, Ленинский, Меркуловичский, Науховичский, Нисимковичский, Полесский, Ровковичский, Рудня-Бартоломеевский, Холочский сельсоветы ликвидированного Чечерского района; 6.1.1965 г. г.п. Чечерск, Беляевский, Залесский, Захарпольский, Меркуловичский, Науховичский, Нисимковичский, Полесский, Ровковичский, Рудня-Бартоломеевский, Холочский, 8.1.1965 г. Ленинский сельсоветы переданы Чечерскому району; 8.1.1965 г. вновь образован Заболотский сельсовет, ликвидирован Смычковский сельсовет; 8.12.1966 г. Липский сельсовет переименован в Широковский; 31.12.1971 г. г.п. Буда-Кошелево преобразован в город районного подчинения; 28.6.1973 г. Блюдницкий сельсовет переименован в Коммунаровский, Приборский – в Николаевский.

На 1.1.1981 г. район включал г. Буда-Кошелево, г.п. Уваровичи и 21 сельсовет: Бервеновский, Буда-Люшевский, Глазовский, Губичский, Гусевицкий, Дуравичский, Заболотский, Ивольский, Калининский, Коммунаровский, Кошелевский, Кривский, Липиничский, Морозовичский, Недойский, Николаевский, Октябрьский, Потаповский, Рогинский, Чеботовичский, Широковский.

Друкуецца паводле кн.: Административно-территориальное устройство БССР. Мн., 1987. Т. 2. С. 67–68.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Па старонках раённай газеты «Сцяг Ільіча»*

3 чэрвеня 1945 г.

АДРАДЖЭННЕ САЎГАСА «УВАРАВІЧЫ»

З першых дзён вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў рабочы калектыў саўгаса «Уваравічы» з вялікім энтузіязмам узяўся за аднаўленне саўгаса. Цяжкасцей было многа. Не было сельскагаспадарчага інвентару, кароў, коней, трактараў, зерня, насення агародных культур. Спачатку былі пабудаваны крайне неабходныя пабудовы вытворчага значэння і зямлянкі для рабочых. Сіламі рабочых быў сабраны і адрамантаваны сельскагаспадарчы інвентар і 3 трактары. Будуецца ферма для буйной рагатай жывёлы на 220 галоў, конеферма на 80 галоў, свінаферма на 20 галоў, птушкаферма на 350 галоў.

Узоры самаадданай працы паказваюць даяркі Цуранкова Марыя, Альхова Ксенія, Старавойтава Акуліна. Яны ўзялі абавязак за 1946 г. надаіць ад кожнай замацаванай фуражнай каровы 2200—2000 літраў малака.

За пасляховую падрыхтоўку да вясенняй сяўбы і датэрміновае заканчэнне рамонту трактараў і сельгасмашын Міністэрства саўгасаў СССР прысудзіла саўгасу Пераходны Чырвоны Сцяг.

У гэтым годзе саўгас пасеяў 390 га збожжавых, 110 га бульбы. Сяўба праводзілася на высокім агратэхнічным узроўні, на добра апрацаванай глебе. Трактарыст Яўсеенка Раман на трактары «НАЦІ-3» узараў 425 га ў пераводзе на мяккае ворыва. Трактарыст Бандарэнка Іван на трактары «НАЦІ-5» узараў 189 га, а трактарыст Вайцюшэнка Рыгор на трактары ХТЗ — 198 гектараў. Імі сэканомлена шмат гаручага.

Ужо скончана праполка ўсіх збожжавых, зроблена першая распашка ўсёй бульбы, праводзіцца другая праполка агародніны. Саўгас першы ў раёне пачаў касьбу. Ужо скошана 300 гектараў сенажацей.

Будаўнічая брыгада, якой кіруе Цырульнікаў Мацвей, ужо пабудавала жывёльны двор на 200 галоў, тры канюшні, птушнік, прымітыўны цялятнік на 100 галоў, цагляныя трактарныя майстэрні і два двухкватэрныя дамы. Намячаецца будаўніцтва электрастанцыі. У 1946 г. рабочыя ўзялі на сябе абавязацельствы дабіцца ўраджаю збожжавых 10 цэнтнераў з гектара, агародніны 200 цэнтнераў з гектара, надаіць ад кожнай фуражнай каровы 2000 літраў малака, своечасова і якасна правесці збожжаўборку, малацьбу, сяўбу азімых.

Н.Эцін.

28 чэрвеня 1946 г.

ПЕРШЫНСТВО ЗАЙМАЕ ПАТАПАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае сацыялістычнае спаборніцтва і адгукнуўшыся на патрыятычны пачын алтайскіх хлебаробаў, калгасы Патапаўскага сельсавета заваявалі першынство па выкананню дзяржаўных абавязацельстваў. З пяці калгасаў сельскага савета чатыры калгасы — імя Сталіна, імя М.Горкага, «Завет Леніна» і «Праўда» поўнасцю выканалі дзяржаўны план хлебапаставак. Па здачы хлеба дзяржаве сельскі савет заняў першае месца, выканаўшы план на 98 %.

Аднымі з першых у раёне калгасы гэтага сельсавета на 100 % выканалі і план здачы бульбы дзяржаве.

29 гадавіну Кастрычніка калгасы Патапаўскага сельсавета сустрэнуць поўным выкананнем усіх відаў дзяржаўных абавязацельстваў і заканчэннем усіх сельскагаспадарчых работ.

НА СЕНАЖАЦІ КАЛГАСА «УРАДЖАЙ»

Яшчэ не ўсходзіць сонца, а вёска Гаўлі ўжо прабудзілася.

Групамі і ў адзіночку, з косамі праз плячо ідуць калгаснікі: мужчыны, падросткі, жанчыны. Чуваць ажыўлёныя разгаворы, жарты, вясёлы смех.

Першымі на луг прыйшлі касцы другой брыгады, дзе брыгадзірам Гуркоў Грыгорый. Праз некалькі хвілін увесь луг напоўніўся звонам кос. Высокая густая трава кладзецца ў роўныя, як струны, доўгія пракосы. Уперадзе — звеннявы 60-гадовы калгаснік Рудзянкоў Андрэй. За ім на ад-

* Захаваны стыль і арфаграфія публікацый.

нолькавай адлегласці адзін ад аднаго ідуць касцы Рабкоў Сяргей, Пеўнеў Васіль і Гуркоў Ігнат. Штодзённа яны выкашваюць па 0,58 — 0,60 гектара кожны.

Побач з мужчынамі косіць звяно жанчын. Звенњявая Гуршчанкова Лекса ўмела кладзе густыя пракосы. Ад яе не адстаюць і жанчыны яе звяна: Беланава Парасся, Панцялеева Каця і Гуркова Анатоля.

— Хоць мы і жанчыны, але не адстаем ад мужчын, — гаворыць Гуршчанкова Лекса.

Недалёка ад жанчын косяць падросткі. Закончыўшы вучобу ў школе, вучні Гуркоў Міхаіл, Гуршчанкоў Уладзімір і Фамін Мікалай з першых дзён касавіцы косяць сенажаць.

— Навічкі яны ў нас на касьбе, — гаворыць брыгадзір Гуркоў Грыгорый, — але не ўступаюць нават вопытным касцам.

Жанчыны і дзяўчаты раскідваюць свежую траву, пераварочваюць яе сырым бокам да сонца, падграбаюць і складаюць сена ў копы. Асабліва старанна працуе на ўборцы сена звяно Фаміновай Алены.

Пачынаюць стагаваць сена. Адзін за адным вырастаюць стагі. Звяно па стагаванню сена ўзначальвае 80-гадовы калгаснік Фамін Кандрат. Добра працуюць на стагаванні сена і 75-гадовыя старыя Фамін Цімох і Ракаў Мікалай.

Першынство на сенаўборцы трымае брыгада № 2. Калгаснікі гэтай брыгады ўжо скасілі 51 гектар сенажаці, убралі і застагавалі сена з плошчы 43 га. 11 стагоў ужо стаіць на ўчастку другой брыгады.

Добра праводзіць сенаўборку і брыгада № 4, дзе брыгадзірам Пусеў Грыгорый. У гэтай брыгадзе штодзённа выходзяць 14 — 17 касцоў. Касцы Быкаў Асіп, Пусеў Барыс, Быкаў Ахрэм і Пусеў Архіп на касьбе перавыконваюць дзённыя нормы. Старанна працуюць на стагаванні сена жанчыны Савасцеева Арына, Быкава Аўдуля і Пестурова Алена. Ужо скошана 200 гектараў сенажаці. Убрана і застагавана сена са 150 гектараў.

Н.Нікіцін.

11 ліпеня 1946 г.

ВОПЫТ, ДАСТОЙНЫ ПЕРАЙМАННЯ

Калгас «Вольная праца» Гусявіцкага сельсавета да Вялікай Айчыннай вайны славіўся сваей жывёлагадоўляй. Лепшыя калгаснікі-жывёлаводы, як Анісся Буднікава і іншыя, былі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве.

Нямецка-фашысцкія варвары разарылі багацейшы калгас «Вольная праца». Пасля вызвалення ад нямецкага рабства калгаснікі дружна ўзяліся за аднаўленне разбуранай гаспадаркі. Поўнасцю адноўлена пасяўная плошча, добра праведзена веснавая сяўба. Аднаўляецца жывёлагадоўля. Калгас імкнецца вярнуць сваю былую славу. Заслугоўвае ўвагі вопыт лепшага конюха Пятра Кабаева. Нягледзячы на вялікую нагрузку работ коні 7-й брыгады, дзе конюхам Пятро Кабаеў, маюць добрую ўкормленасць. Тав. Кабаеў дабіўся правільнага рэжыму кармлення, клапатлівых адносін да коней з боку ўсіх членаў брыгады. Ад сямі конематак, якія маюцца ў брыгадзе, П.Кабаеў атрымаў сем жарабят. Усе яны захаваны і маюць добрую ўкормленасць, нармальна развіваюцца. Конематкі таксама маюць добрую ўкормленасць.

Некаторыя конюхі, баючыся, каб ваўкі не загрызлі жарабят, трымаюць уначы кабыліц з жарабятамі ў хляву. Інакш паступае Кабаеў. На пасьбішчы тав. Кабаеў зрабіў для жарабят перасовачны загон, які мае высокі забор. Туды на ноч ён заганяе жарабят і яны знаходзяцца ў поўнай бяспецы, а кабыліцы спакойна ўночы пасвяцца. Калі трэба перавесці коней на другое пасьбішча, туды перасоўваецца загон для жарабят. Згодна пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) ад 12 мая 1943 года, пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 26 верасня 1944 года аб мерах па павелічэнню пагалоўя коней Кабаеў атрымае ў парадку дадатковай аплаты за забеспячэнне злучкі, атрыманне маладняка 225 кілаграмаў хлеба, аднаго цялёнка 4-х месячнага ўзросту і ягнёнка.

Новікаў.

9 снежня 1947 г.

НОВАБУДОЎЛІ ПЯЦІГОДКІ

Дзецям чыгуначнікаў станцыі Уза будаўнікі-чыгуначнікі Упраўлення Беларускай чыгункі прыпаднеслі выдатны падарунак.

Дзецям прывітальна расчыніліся дзверы новай школы.

Школа пабудавана хуткімі тэмпамі па праекту тыпавых пачатковых школ. Дзяр-

жава асігнавала на будаўніцтва школы 202 тыс. рублёў.

Дзякуючы актыўнай дапамозе калектыва чыгуначнікаў станцыі Уза пад кіраўніцтвам начальніка станцыі т. Дзедзікава школа забяспечана на ўвесь зімовы перыяд палівам.

У школе навучаецца 140 дзяцей, з якіх 80 дзяцей чыгуначнікаў, а астатнія — дзеці калгаснікаў бліжэйшых калгасаў.

Б. Барысенка.

Падрыхтавала Т.А.Бяланава.

Газета «Гомельская праўда» паведамляла

1 ліпеня 1949 г.

ПРАПОЛКА ЯРАВЫХ КУЛЬТУР

УВАРАВІЧЫ (наш кар.). У Рудзянецкім сельсавеце ідзе праполка яравых культур і гародніны. Так, у калгасе імя Леніна на праполку штодзённа выходзяць 75 жанчын.

Ім дапамагаюць вучні старэйшых класаў Рудзянецкай школы: кожны дзень на поле выходзяць 60 дзяўчынак і юнакоў.

Тут праполата 142 гектары яравых культур, поўнасцю закончана праполка лёну, проса, канюшыны, заканчваецца праполка пшаніцы і ячменю.

24 ліпеня 1949 г.

ПАЧАЛОСЯ ВЫБАРАЧНАЕ ЦЕРАБЛЕННЕ ЛЁНУ

На асобных участках сельгасарцелі імя Леніна Дуравіцкага сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна пасевы ільну дасягнулі поўнай спеласці. 21 ліпеня калгас распачаў выбарачнае церабленне лёну на ўчастку другой брыгады.

29 ліпеня 1949 г.

ДАГЛЯДАЮЦЬ ПАПАРЫ

Адначасова з уборкай азімых у калгасе «Чырвоны Маяк» Уваравіцкага раёна ідзе апрацоўка папараў.

Зроблена культывацыя на плошчы 237 гектараў пры плане 210, пераворана 120 гектараў.

Добрасумленнай працай вызначаецца трактарыст Фёдар Воінаў. Ён на трактары НАЦІ узорвае штодзённа па 9—10 гектараў пры норме 7,2 гектара.

Кастрычнік 1949 г.

БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЛАН БУЛЬБАНАРЫХТОВАК

Устаноўлены Буда-Кашалёўскаму раёну дзяржаўны план бульбанарыхтовак на 5 кастрычніка 1949 г. выкананы на 108,3 працэнта.

Старшыня выканкома райсавета К.Чайкун

Сакратар Буда-Кашалёўскага РК КП(б)Б Л.Шыхаўцоў

Райупаўмінзаг Лагераў

9 ліпеня 1950 г.

ХУТКА АДРАМАНТАВАЦЬ МАСТЫ

Калгасы рыхтуюцца да ўборкі ўраджаю. У бліжэйшы час абозы з хлебам новага ўраджаю будуць пастпаць на склады «Заготзярно».

Аднак паўстае пытанне: чаму кіраўніцтва Буда-Кашалёўскага райдораддзела і іншыя арганізацыі не клапоцяцца, каб да гэтага поўнасцю адрамантаваць дарогі і масты?

Нават у райцэнтры, пад бокам райвыканкома, масты не спраўныя.

Час не чакае. Наступае гарачая пара ўборкі. Трэба, каб дараддзел, не чакаючы ўказанняў, узяўся за рамонт дарог і мастоў, ад якіх будзе залежаць своечасовае прасоўванне аўтагужавога транспарту са збожжам на склады «Заготзярно».

І.Панкраценка,
старшыня калгаса «Новае жыццё»

10 кастрычніка 1950 г.

БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛАН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЗАПАЛЯР'Ю

Спаборнічаючы за дастойную сустрэчу гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі калгасы і калгаснікі Буда-Кашалёўскага раёна датэрмінова выканалі план адрузкі бульбы Запаляр'ю.

Калгасы Буда-Кашалёўскага раёна выканалі план адгрузкі на сем дзён раней устаноўленага дзяржаўнага тэрміну на 108,6 працэнта.

7 лістапада 1950 г.

БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЛАН ЗДАЧЫ МАХОРКІ

Калгасы Буда-Кашалёўскага раёна датэрмінова, 4-га лістапада 1950 года, выканалі ўстаноўлены раёну дзяржаўны план здачы махоркі на 100,7 працэнта. Здача махоркі звыш плана працягваецца.

Старшыня выканкома райсавета К.Чайкун
Сакратар РК КП(б)Б Л.Шыхаўцоў
Загадчык нарыхтоўчага пункта В.Чумакоў

Падрыхтаваў І.А.Процкін.

Збожжавае поле

На Буда-Кашалёўшчыне заўсёды вялікае значэнне надавалася вырошчванню збожжавых. Хлеб — асноўнае багацце земляроба. У пасляваенныя гады ўраджаі збожжа былі невялікія. Укараненне інтэнсіўнай тэхналогіі апрацоўкі зямлі, прымяненне перспектыўных раянiраваных сартоў, аснашчэнне гаспадарак тэхнікай дазволілі ўжо ў сярэдзіне 1970-х гадоў дабівацца добрых ураджаяў.

Так, у 1974 г. сярэдняя ўраджайнасць збожжавых склала 25 ц, а ў эксперыментальнай базе «Пянчын» і ў калгасе імя Леніна — па 32 і 34 ц з гектара. Дзякуючы прымяненню перадавых форм арганізацыі вытворчасці і ўкараненню перспектыўных сартоў азімага жыта Бярэзіна, Пошук, Пухаўчанка, яравой пшаніцы Івалга, хлебаробы эксперыментальнай базы «Пянчын» атрымалі ў 1987 г. па 46 ц збожжа з гектара, эксперыментальнай базы «Уваравічы» — 41, саўгаса «Камінтэрн» — 36 ц, у цэлым па раёне ўраджайнасць збожжавых культур склала 33 ц з гектара…

Вялікая ўвага ўдзяляецца павелічэнню пасяўных плошчаў пад збожжавыя культуры, асвойваюцца перспектыўныя гатункі Трыцікале, Міхась, гатункі азімай пшаніцы Цэнтас, Гармонія, жыта Пухаўчанка. Селекцыйныя і арганізацыйныя мерапрыемствы дазволілі атрымаць добрыя ўраджаі. Так, у 1992 г. калгас імя Леніна сабраў з гектара па 55 ц азімай пшаніцы, эксперыментальная база «Уваравічы» — 43 ц, калгас «Чырвоны шлях» і «Агратэхнічны каледж» — па 46 і 47 ц, па раёне — 31 ц з гектара. У сучасны момант праводзіцца вялікая работа па павышэнні якасці насеннага матэрыялу, укараненні больш перспектыўных, раянiраваных гатункаў збожжавых культур.

Д.В.Кавалёў.

Лён — наша багацце

Беларускі лён традыцыйна называюць «паўночным шоўкам». Сяляне стагоддзямі з ільну ткалі палатно, шылі адзенне і бялізну, выкарыстоўваўся ён і на выраб мешкавіны для асабістага падвор'я і грамадскай гаспадаркі. Ільноваланко ішло на экспарт. З насення лёну гатавалі алей, а адходы скармлівалі жывёле.

Лён вельмі працаёмкая па тэхналогіі вырошчвання культура. Тым не менш на Буда-Кашалёўшчыне яго вырошчвалі досыць шырока. Пачынаючы з 1970-х гадоў ва ўсіх ільнаводчых гаспадарках працавалі механізаваныя звенні. Раён актыўна ўдзельнічаў у выкананні рэспубліканскай праграмы «Лён». Перадавыя гаспадаркі ўкаранялі новыя высокапрадукцыйныя гатункі Аршанскі-72, Бялінка і іншыя. Намнога палепшылася агратэхніка вырошчвання. Папоўніўся парк ільноўборачных агрэгатаў, абсталявання для яго перапрацоўкі.

У асобныя гады калгасы імя Калініна, «Новае жыццё», імя Чапаева, «Чырвоны шлях» былі дыпламантамі ВДНГ СССР і пераможцамі рэспубліканскага спаборніцтва. Максімальную ўраджайнасць ільну раён атрымаў у 1992 г. — 8,3 ц з гектара, а калгасы «Іскра» — 14, імя Чапаева, «Чырвоны шлях» — 12, імя Калініна, «Новае жыццё» — 11, імя Леніна — 9,9, саўгас-тэхнікум — 9,4 ц з гектара.

У сярэдзіне 1980-х гадоў, калі плошчы пасеву лёну ў раёне перавышалі 3400 га (да 6% раллі), узніклі цяжкасці з рэалізацыяй ільнотрасты і яе перапрацоўкай. Магутнасці раённага льнозавода не забяспечвалі перапрацоўку льнотрасты і завод перапрадаваў яе іншым прадпрыемствам рэспублікі, і нават у Расію. Натуральна, раслі затраты, перапрацоўшчыкі несвоечасова разлічваліся за льнопрадукцыю і гаспадаркі гублялі інтарэс да вырошчвання лёну.

Негатыўную ролю адыгралі і вынікі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Плошчы пасеваў ільну скараціліся і да сярэдзіны 1990-х гадоў складалі ўсяго 1400 гектараў.

У канцы 1990-х гадоў у раёне адбылося некаторае пераразмеркаванне пасяўных плошчаў пад лён паміж гаспадаркамі. У 1998 г. калгас «Новае жыццё» атрымаў з кожнага гектара па 8,9 ц, калгас імя Чапаева — па 8 ц ільноваланка з гектара, у сярэднім па раёне 6 ц з гектара.

На тэрыторыі раёна працуюць ільнонасеннястанцыя і Уваравіцкі льнозавод. Ільнонасеннястанцыя праводзіць ачыстку, сарціроўку льнонасення і яго рэалізуе. Льнозавод вядзе першасную перапрацоўку льнотрасты. Абнаўленне вытворчых магутнасцей, укараненне новай прагрэсіўнай тэхналогіі вытворчасці дазваляюць калектыву працаваць эфектыўна. Ільноваланка рэалізуецца Аршанскаму льнокамбінату, у краіны СНД, а таксама далёкага замежжа.

М.І.Дзегцярова.

З гісторыі гаспадарак і прадпрыемстваў раёна

Калгас імя У.І.Леніна

З успамінаў Міхаіла Андрэевіча Жарэбчанкі, былога старшыні калгаса

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі сучаснага калгаса імя Леніна размяшчаліся дзве сельскія абшчыны: Стара-Гусявіцкая і Нова-Гусявіцкая. У 1918 г. тут утварыліся два сельскія Саветы з тымі ж назвамі, а ў 1924 г. яны аб'ядналіся ў адзін — Гусявіцкі сельскі Савет.

У кастрычніку 1930 г. сяляне вёскі Старая Гусявіца арганізавалі калгас «Чырвоны партызан». У калгас аб'ядналіся 20 гаспадарак, і, у ліку першых, у яго ўступілі Гапон Касцючкоў, Астап Мінаў, Міхей Карповіч і іншыя. У той час у гаспадарцы было 20 коней з вупражжу, 18 плугоў, 18 барон, 20 кароў, 24 авечкі і 5 свіней. Старшынёй выбралі мясцовага селяніна-бедняка Платона Трафімавіча Саўчанку. Да рэвалюцыі ён скончыў сельскую царкоўнапрыходскую школу.

1 красавіка 1931 г. у вёсцы Новая Гусявіца сяляне стварылі арцель і назвалі яе «Вольная праца», яна аб'яднала 16 двароў. Жывёла, інвентар заставаліся ў асабістым карыстанні членаў арцелі. Выраблялі сані, колы, бочкі і г.д. Уся прадукцыя прадавалася дзяржаве.

У 1932 г. гаспадаркі аб'ядналіся ў калгас «Вольная праца». Пабудавалі памяшканні для буйной рагатай жывёлы і свіней, стайню. Меліся тры ветраныя млыны, тры конныя жняяркі, дзве конныя малатарні.

Праз год пабудавалі цялятнік, свінаферму, два збожжасклады, цыркулярку з рухавіком унутранага згарання, ільноцерабілку. Купілі першую аўтамашыну ГАЗ-17.

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны аўтамашын у гаспадарцы было ўжо дзве. Значную дапамогу тэхнікай калгасу аказвала МТС.

Напярэдадні вайны ў гаспадарцы было 363 галавы буйной рагатай жывёлы, 440 коней, 170 свіней, 100 авечак. Калгас стаў адным з перадавых у раёне. Далёка за яго межамі былі вядомы імёны перадавікоў гэтай гаспадаркі Андрэя Свярдлова, Зінаіды Кабаевай, Ганны Рубанавай, Акуліны Арцёменка і іншых.

Фашысцская Германія перарвала мірную стваральную працу. Дарослыя мужчыны пайшлі на фронт. Маёмасць, жывёла, тэхніка былі эвакуіраваны на ўсход.

Акупанты спустошылі гаспадарку, спалілі і разбурылі вытворчыя памяшканні.

Адразу ж пасля вызвалення пачалося аднаўленне. Набывалі жывёлу, сельскагаспадарчы інвентар, машыны. Але яшчэ нярэдка зямлю даводзілася араць падлеткам і жанчынам на абяссіленых конях і каровах.

У 1949 г. старшынёй калгаса выбралі мяне. Потым далучылі калгас «Прасвет». Больш за 20 гадоў я ўзначальваў гаспадарку. Асноўную ўвагу ўдзялялі развіццю паляводства, асабліва вырошчванню лёну.

У 1953 г. гаспадарка была поўнасцю электрыфікавана. У 1954 г. прыбытак перавысіў 640 тыс. рублёў. Ураджайнасць збожжавых з гектара ўзрасла з 6,3 ц у 1950 г. да 14,8 ц у 1956 г. У 1957 г. на працадзень выдалі па 1,36 руб.

Першага студзеня 1958 г. калгасу прысвоілі імя У.І.Леніна. У тым жа годзе гаспадарка выкупіла 11 трактароў, 3 камбайны, 14 аўтамашын.

Паступова пашыралася будаўніцтва вытворчых і сацыяльных аб'ектаў. У

1960 г. пабудавалі Дом культуры, увялі ў строй пілараму, электрамлын, свінаферму, гараж, збожжасклад. Абапіраючыся на дзяржаўную падтрымку, асушылі 126 гектараў забалочаных зямель.

З пераходам на дзяржразлік у 1965 г. гаспадарка рэзка павялічыла вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі, асабліва малака. Узрасла ўраджайнасць палёў. У 1968 г. ураджайнасць збожжавых склала 19,6 ц з гектара, а надоі малака за год — 2364 т.

У 1970-я гады хуткімі тэмпамі развівалася матэрыяльна-тэхнічная база, расла ўраджайнасць збожжавых, бульбы, ільну, прадукцыйнасць жывёлагадоўлі. Пабудаваны жывёлагадоўчы комплекс на 1200 галоў буйной рагатай жывелы. У 1978 г. ураджайнасць збожжавых склала 35,1 ц, бульбы — 246,9 ц з гектара.

1, 5, 6-я паляводчыя брыгады былі адзначаны бронзавымі медалямі ВДНГ. З другой паловы 1970-х гадавы даход калгаса стабільна перавышаў 2—2,3 млн. рублёў у год.

Значныя сродкі накіроўваліся на пашырэнне вытворчых і сацыяльных аб'ектаў. Пабудавалі Дом механізатараў, сталовую, два жывёлагадоўчыя памяшканні, дзве зернесушылкі, два ангары для рамонту сельгастэхнікі, жылыя дамы ў в. Гусявіца.

За высокія паказчыкі ордэнам Леніна былі ўзнагароджаны старшыня калгаса, а таксама шафёр Міхаіл Марчанка, дагляд-чык жывёлы А.А.Буднікаў. Ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга атрымалі Іван Кавалёў, Віктар Котаў, «Знак Пашаны» — Праскоўя Грыгарэнка, Анастасія Васільцова, Ева Сочнева і інш. Трактарыст Іван Балабаеў — кавалер ордэна Працоўнай славы II і III ступеней. Калгаснікі І.А.Мінакова, Е.П.Века, М.Р.Марчанка выбіраліся дэпутатамі Вярхоўнага Савета БССР.

У няпросты час сённяшніх эканамічных і грамадскіх пераўтварэнняў калектыў калгаса імя Леніна — адзін з лепшых у аграпрамысловым сектары раёна.

Эксперыментальная база «Уваравічы»

Заснавана ў лістападзе 1960 г. Тут вырошчваюць элітнае насенне раяніраваных гатункаў збожжавых культур, лубіну, бульбы і шматгадовых траў. З'яўляецца таксама буйным пастаўшчыком малака і мяса дзяржаве. Тут гадуюць і прадаюць іншым калгасам і саўгасам племянных цялушак і парасят.

Цэнтр гаспадаркі — гарадскі пасёлак Уваравічы. На тэрыторыі базы 15 населеных пунктаў: Радзеева, Лапічы, Тэклеўка, Высокая Грыва, Чыстая Лужа, Зялёны Востраў, Уладзіміраўка, Красны Свет, Зара, Калініна, Бярозавае Балота, Пушча.

А пачыналася ўсё так. На падставе пастановы СНК ад 15 лютага 1918 г. у былым маёнтку памешчыка Ліпінскага летам 1919 г. быў створаны саўгас «Уваравічы» — гаспадарка з зямельнай плошчай 400—500 га, з былымі вытворчымі пабудовамі, спіртзаводам і невялікім жылым фондам. Было 8 пар коней, 4 пары валоў, некалькі конных плугоў, барана, адна малатарня з прыводам ад маламоцнага лакамабіля, 2 снопавязалкі амерыканскай вытворчасці, конныя сеялкі. Пры спіртзаводзе працаваў млын, які прыводзіўся ў рух ад таго ж лакамабіля.

Буйной рагатай жывёлы не было, яе знішчылі ў 1918 г. нямецкія акупанты.

Першы дырэктар саўгаса — Трафім Яўцехавіч Цырульнікаў. З дапамогай дзяржавы рос і развіваўся саўгас. У 1923 г. дзяржава закупіла для саўгаса 100 кароў швіцкай пароды і некалькі племянных быкоў. У 1923—1924 гг. пабудавалі млын, на якім устанавілі новы, больш моцны лакамабіль, а ў 1926 г. гаспадарка атрымала першыя два трактары «Фардзон». Трактарыстамі працавалі браты Іван і Фёдар Сабалеўскія. У іх вучыўся механізатарскай справе Васіль Карнеевіч Якаўцоў, які неўзабаве стаў працаваць самастойна.

У 1925 г. у штат саўгаса ўведзены аграномам (Фралоў), а ў 1926 г. — заатэхнік (Яшын).

У 1926 г. пабудавалі клуб на 250 месцаў са стацыянарнай кінаўстаноўкай. У тым жа будынку працавала сталовая. Электрычны ток для асвятлення клуба, сталовай і канторы саўгаса даваў той жа генератар, які быў устаноўлены на млыне.

Першую аўтамашыну саўгас атрымаў у 1929 г., у 1930 г. паявіўся легкавы аўтамабіль. Абнавіўся і трактарны парк. Гаспадарка атрымала два новыя трактары завода «Красны Пуцілавец», а потым і трактар ЧТЗ.

У 1926—1930 гг. тэрыторыя гаспадаркі значна пашырылася. Да саўгаса быў далучаны былы памешчыцкі маёнтак Гарадок з добрым садам і лугам на Дняпры, а по-

тым і пасёлкі Кісялёўка, Багамолаўка, Чарняўскія хутары, Камунар, Стара-Беліца. Тут былі створаны аддзяленні саўгаса, якімі кіравалі Шпігановіч, Марчанка, Балоцін, Цяраэшчанка. З пачаткам масавай калектывізацыі гэтыя аддзяленні сталі базай для стварэння новых калгасаў і МТС.

У 1940 г., перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны, саўгас з'яўляўся буйной узорна-паказальнай гаспадаркай у былым тады Уваравіцкім раёне, меў 1000 га ворнай зямлі, неблагія трактарны і аўтамабільны паркі, на фермах — высокапрадукцыйную жывёлу.

Гаспадарка атрымлівала добрыя ўраджаі збожжавых, бульбы і кармавых культур. Надой малака на адну карову ў год складаў каля 3000 кг.

З пачаткам вайны большая частка маёмасці эвакуіравана на ўсход. Брыгада на чале з дырэктарам саўгаса П.Ф.Селіхановічам 5 ліпеня 1941 г. пагнала жывёлу ў глыб краіны. У брыгаду ўваходзілі старшы заатэхнік Г.С.Мазепін, кіраўнік участка П.Ф.Абразцоў, рабочыя Т.І.Абразцова, Ф.Л.Старчанка, У.Н.Альхоў, В.Трэцьякоў, Б.Шастакоў.

Перагон жывёлы цягнуўся чатыры месяцы. 200 з 400 кароў было здадзена на мясакамбінат у г. Ялец, а астатнія — у саўгас «Лунінa» Пензенскай вобласці. Уся брыгада работнікаў саўгаса, якая ўдзельнічала ў эвакуацыі жывёлы, засталася працаваць у саўгасе імя Ільіча Цялегінскага раёна.

Нямецка-фашысцкія акупанты поўнасцю знішчылі цэнтральную сядзібу саўгаса, аддзяленні Тэклеўка і Пушча. Усе пабудовы — майстэрні, жывёлагадоўчыя памяшканні, спіртзавод, жылыя дамы — спалілі ці ўзарвалі.

Пасля вызвалення раёна ад акупантаў у снежні 1943 г. з Пензенскай вобласці з групай былых рабочых саўгаса вярнуўся П.Ф.Селіхановіч і зноў узначаліў саўгас.

Усё прыйшлося пачынаць спачатку.

З воінскіх часцей саўгас атрымаў 3 аўтамашыны, сабралі 2 трактары. У 1943—1944 гг. пабудавалі чатырохрадны глінабітны кароўнік на 200 галоў буйной рагатай жывёлы, майстэрні, пазней — драўляны цялятнік і іншыя жывёлагадоўчыя пабудовы. Рабочыя паступова перасяляліся з зямлянак у хаты. Вярталіся са шпіталяў і пачыналі працаваць былыя франтавікі.

У 1944 г. дзяржава перадала саўгасу 100 трафейных кароў. Іх прыгнаў з Усходняй Прусіі ветэран саўгаса, інвалід вайны Мацвей Купрыянавіч Цырульнікаў. Даваенная ўзроўню вытворчасці саўгас дасягнуў у 1950 г.

У 1956 г. у склад саўгаса ўключаны калгас імя Энгельса. Дабавілася амаль 1200 га сельгасугоддзяў. Далучыўся да саўгаса і калгас «Рухавік». Да пачатку 1960-х гадоў было 4 аддзяленні: Цэнтральнае — 422 га, Тэклеўка — 858, Пянчын — 3558 га, Радзеева — 2569 га сельгасугоддзяў. Аддзяленні аб'ядноўвалі 9 паляводчых брыгад. Усяго за гаспадаркай было замацавана 8533 га зямлі, у т.л. 7401 га сельгасугоддзяў, з іх 4783 га раллі.

На кожным аддзяленні — жывёлагадоўчыя фермы. Усяго 9 ферм, на якіх было 2730 галоў буйной рагатай жывёлы, у т.л. 904 каровы, 2400 свіней і 272 кані.

Машынны парк меў 77 трактароў, 53 аўтамашыны, 17 збожжаўборачных, 8 сіласаўборачных, 10 бульбаўборачных камбайнаў і шмат іншай машыннай тэхнікі, 243 электрарухавікі агульнай магутнасцю 1922 кВт.

Пачынаючы з 1962 г. пабудаваны і ўвайшлі ў эксплуатацыю 4 кароўнікі, 5 свінарнікаў, 4 цялятнікі, пашыраны майстэрні, пабудаваны збожжасклады, склады мінеральных угнаенняў, фельчарска-акушэрскі пункт, жылыя дамы, іншыя вытворчыя і сацыяльна-бытавыя аб'екты.

У гаспадарцы больш за 100 механізатараў, дзесяткі перадавых жывёлаводаў і паляводаў, спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. У Кнігу народнай славы эксперыментальнай базы занесены імёны каля 40 працаўнікоў. Дзесяткі работнікаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

У 1968 г. ураджайнасць збожжавых у сярэднім па гаспадарцы склала 15,4 ц, бульбы — 286 ц, сіласнай масы кукурузы — 200 ц з га. За 1964—1968 гг. атрымана чыстага прыбытку больш за 1539 тыс. руб.

1969 г. — юбілейны для гаспадаркі. Калектыў адзначыў сваё 50-годдзе высокімі вытворчымі дасягненнямі. Паляводы і механізатары цэнтральнага аддзялення В.Л.Кобрусеў, Л.Я.Дэйка, М.А.Цімашэнка, Г.А.Малюцін, М.І.Лузік на плошчы 65 га атрымалі рэкордны для гаспадаркі ўраджай — 32 ц збожжавых з га.

Жывёлаводы прадалі дзяржаве 3008 т малака і 563 т мяса. Даярка В.С.Кавалёва надаіла ад кожнай каровы больш як па 4000 кг малака. Свінаркі К.А.Яначкіна і Я.Г.Грышчанка атрымалі ад замацаваных за імі свінаматак па 300—350 парасят.

Поспехі калектыву былі адзначаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі, трактарыст Л.Д.Дэйка ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, цялятніца М.А.Аўраменка — ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, а даярка В.С.Кавалёва — ордэнам Леніна.

З прыходам у 1976 г. да кіраўніцтва гаспадаркай Анатолія Макаравіча Антоненкі, калектыў эксперыментальнай базы «Уваравічы» актывізаваў супрацоўніцтва з навуковымі цэнтрамі рэспублікі па вырошчванні элітнага раяніраванага насення бульбы, караняплодаў і збожжавых культур, па вывядзенні высокапрадукцыйных парод буйной рагатай жывёлы і свіней.

Да канца 1985 г. вытворчасць малака на 100 га сельгасугоддзяў склала 779 ц, мяса — 126 ц. Выведзены новыя сарты азімай пшаніцы Надзея, Радзіма, Плутон, ураджай якіх на асобных участках дасягнуў 60 ц. На цэнтральным участку базы, дзе кіраўніком быў М.І.Кабаеў, ураджай караняплодаў склаў па 1000 ц з га.

Пачынаючы з 1991 г. штогод пашыраецца вытворчы асартымент элітнага насення азімай пшаніцы Пошук, Сузор'е, Цэнтас, яравой пшаніцы Мун, новых сартоў бульбы Явар, Альтаір, Скарб, Сантэ і інш. У калектыве прадумана арганізацыя працы і вытворчасці. Тут пастаянна ўмацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база, працуюць сучасныя механізаваныя лініі.

За высокія вытворчыя дасягненні дырэктар эксперыментальнай базы А.М.Антоненка і галоўны аграном Ф.І.Жырыкаў у 1997 г. удастоены звання «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь».

Пашыраецца і сацыяльная база. Для механізатараў і спецыялістаў пабудаваны добраўпарадкаваныя шматкватэрныя жылыя дамы і дамы-катэджы, працуюць культурны цэнтр, крамы, прадпрыемствы сацкультбыту.

Н.Ц.Кірпічова.

Эксперыментальная база «Пянчын»

Першая сельскагаспадарчая арцель у в. Пянчын была арганізавана ў 1927 г. Заснавалі яе мясцовыя сяляне-беднякі Цімафей Іванавіч Бабічаў, Іван Аляксеевіч Бабічаў, Барыс Бабічаў, Гаўрыіл Атрошчанка, Алена Мікалаеўна Атрошчанка, Марфа Якаўлеўна Бабічава, Марыя Філіпенка і Фама Філіпенка.

Старшынёй выбралі Ц.І.Бабічава. Першапачаткова арцель аб'ядноўвала 8 гаспадарак. Было 20 кароў, 16 коней, 8 плугоў, 7 барон.

Спатрэбілася амаль 3 гады, каб асноўная маса сялян вёскі ўступіла у арцель. Так у 1930 г. у в. Пянчын узнік калгас «Рухавік». Першым яго старшынёй стаў Ц.І.Бабічаў. Паступова эканоміка калгаса ўмацоўвалася, паляпшаўся і дабрабыт калгаснікаў. Ужо напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны тут мелася больш за 200 кароў, 300 коней, 250 свіней. Былі пабудаваны 2 тыпавыя кароўнікі, 2 збожжасклады, набыта 2 грузавыя аўтамашыны, 2 прывадныя малатарні і інш. сельскагаспадарчая тэхніка.

Першы сакратар ЦК КПБ Ц.Я.Кісялёў (другі справа), сакратар ЦК КПБ М.І.Дзямянцей (трэці справа) і першы сакратар Гомельскага абкома КПБ А.А.Малафееў (другі злева) на полі эксперыментальнай базы «Уваравічы». Пачатак 1980-х гг.

Пасля вайны спатрэбіўся не адзін год, каб аднавіць разбураную нямецка-фашысцкімі захопнікамі гаспадарку.

У 1957 г. калгас «Рухавік» быў далучаны да саўгаса «Уваравічы» як аддзяленне пад назвай «Пянчын».

У 1971 г. на базе гэтага аддзялення была арганізавана самастойная эксперыментальная база «Пянчын», першым дырэктарам якой стаў Сяргей Якаўлевіч Сімкін. На 1974 г. яна мела 4212 га зямлі, у т.л. 3625 га сельгасугоддзяў, з іх 2414 га раллі.

Гаспадарка элітна-насенняводчага, мясамалочнага профілю.

За 1971—1985 гг. сярэдні ўраджай збожжавых склаў 24,6 ц з гектара, а за 1988—1998 гг.— 32,2 ц. Самы высокі ўраджай быў атрыманы ў 1986 г. — 45,6 ц зерня з гектара.

Эксперыментальная база «Пянчын» вырошчвае бульбу сартоў беларускай і галандскай селекцый: Арбіта, Сантэ, Выток, Скарб, Альтаір, Явар. За 1991—1998 гг. з кожнага гектара было сабрана ў сярэднім па 145 ц бульбы.

У 1998 г. у склад базы ўвайшоў калгас «Чырвоная зорка», што амаль удвая павялічыла тэрыторыю гаспадаркі, а ворнага поля амаль на 2861 га. Маецца 2172 галавы буйной рагатай жывёлы, у т.л. 856 кароў. За 1999 г. рэнтабельнасць гаспадаркі склала 30% супраць 6,4% у папярэднім.

Тут працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты. У ліку лепшых працаўнікоў Васіль Максімавіч Кундзелеў. Каля 45 гадоў аддаў ён сельскай гаспадарцы, у т.л. больш за 30 гадоў базе «Пянчын». Працаваў рабочым, брыгадзірам паляводчай брыгады, намеснікам дырэктара. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Удастоена ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга даярка Марыя Васільеўна Нямцова. У 1968 г. яна надаіла ад кожнай каровы больш за 4000 кг малака ў год. Марыя Васільеўна ўзнагароджана і ордэнамі «Мацярынскай славы» I, II і III ступеней. Шмат сіл, вопыту, умення для ўмацавання эканомікі гаспадаркі аддалі механізатары — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны П.С.Кундзелеў, Я.К.Максіменка, В.Я.Кучараў. Іх баявыя подзвігі адзначаны ордэнамі і медалямі ваеннага часу, а за поспехі ў мірнай працы яны ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і інш. Высокіх паказчыкаў штогод дасягаюць жывёлаводы. Даяркі Н.П.Маслюк, М.М.Майсеенка ў 1998 г. надаілі па 162 т малака кожная. Валавы надой за год па ферме складае 624 т малака, на адну карову ў сярэднім па 3280 кг.

Добрых поспехаў у працы пастаянна дабіваюцца цялятніца В.А.Хвосцікава, даглядчыкі жывёлы Ю.В.Дзмітраўцова, Л.В.Кундзелева.

М.І.Дзегцярова.

Саўгас «Камінтэрн»

Цэнтральная сядзіба гаспадаркі размяшчаецца ў в. Шырокае недалёка ад месца, дзе да Кастрычніцкай рэвалюцыі стаяў маёнтак Ванды Селістроўскай.

Адразу ж пасля рэвалюцыі ў маёнтку мясцовыя жыхары арганізавалі яўрэйскую камуну «Камінтэрн». У яе складзе было ўсяго 9 сялянскіх двароў з 67 жыхарамі. Меліся 54 га зямлі, у т.л. 22 га раллі, 12 га лугу, 18 га саду, 7 коней, 25 галоў буйной рагатай жывёлы, у т.л. 22 каровы.

На базе камуны вясной 1929 г. быў арганізаваны калгас з той жа назвай. У 1934 г. ён аб'ядноўваў ужо 82 сялянскія двары. У тым жа годзе на працадзень тут атрымалі па 3 кг збожжавых, па 8 кг бульбы. У 1935 г. набылі першы трактар, некалькі іншых сельскагаспадарчых машын.

У 1940 г. сабралі па 15 ц проса, 12 ц грэчкі, 260 ц капусты, 205 ц гуркоў, 32 ц тытуню з гектара. А на асобных участках атрымалі рэкордныя ўраджаі для таго часу: па 18—20 ц збожжа, 200—250 ц бульбы, 4—4,5 ц ільну з гектара. У брыгадзе Кустачова ўраджай тытуню склаў па 60 ц, у Баранава — па 69 ц з гектара.

У гады вайны гаспадарка была разрабавана фашысцкімі акупантамі.

У мірны час дзякуючы дапамозе дзяржавы калгас хутка адраджаўся.

У 1950 г. да «Камінтэрна» далучыліся калгасы «Шлях да камунізму», імя Молатава. Аб'яднаная гаспадарка стала адной з буйных у раёне. У 1960 г. на яе базе быў арганізаваны саўгас «Камунар», у лютым 1966 г. пасля падзелу гэтай гаспадаркі — саўгас «Камінтэрн».

Хуткімі тэмпамі ішло будаўніцтва. За кароткі час былі ўзведзены новы будынак праўлення, першыя шматпавярховыя жылыя дамы для рабочых і спецыялістаў, дзіцячы сад, гараж, майстэрні, свінакомплекс на 5000 галоў, збожжасклад і інш.

Землі саўгаса «Камінтэрн» размясціліся на тэрыторыі Шырокаўскага і Забалоцкага сельсаветаў. Тут пражывае 1447 чалавек (1108 — у Шырокаўскім і 339 — у Забалоцкім сельсаветах).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС тэрыторыя гаспадаркі аказалася ў зоне забруджвання глебы радыенуклідамі і адносіцца да месцаў з правам наступнага і частковага адсялення. За 1986—1999 гг. на тэрыторыі Шырокаўскага і Забалоцкага сельсаветаў перастала існаваць 14 населеных пунктаў.

Саўгас сёння — гэта 11 населеных пунктаў: Аляксандраўка, Бярозавая Рошча, Яраполле, Камінтэрн, Колас, Паляна, Шырокае і інш. Агульная плошча сельгасугоддзяў 6060 га, з іх 3975 га раллі. Гаспадарка спецыялізуецца на вытворчасці свініны. У 2000 г. на фермах 12 805 галоў свіней, 2113 галоў буйной рагатай жывёлы, у т.л. 848 кароў.

За 1999 г. атрымана малака 3786 т, мяса 930 т. Прыбытак склаў 5200 млн. руб. (106% да ўзроўню 1998 г.).

У калгасе шмат перадавікоў вытворчасці. Сярод іх даяркі В.К.Падлобнікава, В.А.Міхейкава, Н.І.Кірыленка (працуе загадчыцай малочна-таварнай фермы), свінаркі М.Ф.Сазонава, А.А.Залатухіна і інш.

Развіваецца сацыяльна-бытавая інфраструктура саўгаса. Тут працуюць сельская лячэбная амбулаторыя, фельчарска-акушэрскі пункт, 2 дзіцячыя сады, 2 школы, Дом культуры, 2 бібліятэкі, сталовая, пральня, 2 лазні, 5 гандлёвых кропак.

П.П.Дамасканаў.

Саўгас «Краснаакцябрскі»

Тэрыторыя гаспадаркі размешчана на правабярэжнай высокай тэрасе ракі Сож. Рэльеф шыракахвалісты. У паўночнай частцы выдзяляецца забалочаная даліна ракі Ліпа, правага прытока Сожа. З усходу тэрыторыя ў падзоне паўднёвай зоны рэспублікі. Цэнтр сядзібы за 30 км на поўночны захад ад г. Гомеля і 9 км ад чыгуначнай станцыі Уза.

Да сярэдзіны 1963 г. гаспадарка ўваходзіла ў склад саўгаса «Камунар».

З чэрвеня 1963 г. саўгас «Краснаакцябрскі» спецыялізуецца на малочнамясной вытворчасці. Тут таксама развіта прамысловае пладаводства.

У 1966 г. саўгас быў разбуйнены. У «Краснаакцябрскім» засталіся 4172 га сельгасугоддзяў, у т. л. 1550 га ворных зямель, 1030 га садоў і ягаднікаў, на фермах — 3 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, у т. л. 1060 кароў.

У 1983 г. запазычанасць па банкаўскім крэдыце склала 1 млн. 105 тыс. руб., а прыбытак за год — толькі 57 тыс. руб.

У гэты нялёгкі час саўгас узначаліў Ягор Фёдаравіч Паляўшанаў. Пад яго кіраўніцтвам калектыў ажыццявіў шэраг мер, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці, а галоўнае — перайшлі на поўны ўнутрыгаспадарчы разлік. Ужо ў 1986 г. ураджайнасць збожжавых склала 22 ц, бульбы — 232, кукурузы на зялёную масу — 534 ц з гектара. Надоі на адну карову ў год перавысілі ў сярэднім 2676 кг малака. Гадавы прыбытак склаў больш за 1 млн. руб., узровень рэнтабельнасці — 30%.

За высокія вытворчыя паказчыкі саўгас адзначаны Ганаровай граматай ЦК КПБ і Савета Міністраў Беларусі, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ.

У 1997 г. саўгас дабіўся самых высокіх паказчыкаў за ўсе гады свайго існавання. Валавы надой малака склаў 1888 т, а на адну карову — 3329 кг, у разліку на 100 гектараў сельгасугоддзяў — 619 ц. Дзяржаве было прададзена больш за 300 т мяса. У тым жа годзе з кожнага гектара атрымана па 38,2 ц зерневых і зернебабовых культур, 760 ц караняплодаў, 370 ц кукурузы.

У 1998 г. рэнтабельнасць раслінаводства склала 160,5%, прыбытак — 6287 млн. руб.

Важнай крыніцай даходаў з'яўляецца садаводства. Зараз сад займае 794 га. Вырошчваюцца сланечнікавыя, ягадныя культуры, яблыні.

Саўгас «Краснаакцябрскі» — гэта не толькі вытворчы, але і сучасны сацыяльна-бытавы комплекс. Працуюць сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад, Дом культуры, музей народнага мастацтва, 3 магазіны, 2 сталовыя, лазня. Дзейнічае агароднінакансервавы завод, вінаробчы цэх.

Н.І.Садоўская.

Гомельская бройлерная фабрыка

Будаўніцтва адной з важнейшых у Беларусі Гомельскай бройлернай птушкафабрыкі ў раёне пачалося ў 1976 г. Разліковая

праектная магутнасць — 3,2 млн. бройлераў і 4,5 тыс. т мяса птушкі ў год.

Ужо за 1978—1980 гг. было атрымана 13 616 т мяса або амаль у паўтара раза больш праектных разлікаў.

Першым дырэктарам фабрыкі быў Валянцін Кірылавіч Клімкоў, вядучымі спецыялістамі ў той час працавалі: галоўны інжынер Я.П.Башлакоў, галоўны заатэхнік А.Т.Смарыкаў, ветурачы Н.В.Дамарадаў і А.А.Дамарадава, намеснік дырэктара Ф.С.Тухфатулін, інжынеры В.А.Пусташылаў і В.Русакоў і інш. Прадпрыемства неаднаразова адзначалася дыпломамі і ганаровымі граматамі ЦК КПСС, Савета Міністраў і ВЦСПС СССР. Многія працаўнікі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Прадпрыемства неаднаразова было ўдзельнікам ВДНГ.

У 1977 г. пасёлак Камунар узнагароджаны залатым медалем і дыпломам І ступені ВДНГ.

У 1991 г. вытворчасць мяса ў жывой вазе склала 8186 т, атрымана — 40,8 млн. штук яек. Рэнтабельнасць склала 63,5%, а чысты прыбытак прадпрыемства — 17,5 млн. руб. (у тагачасных цэнах). У наступныя гады ў сувязі з шэрагам прычын вытворчасць мяса, яек значна знізілася. Але ўжо пачынаючы з 1996 г. справы на прадпрыемстве палепшыліся. Фабрыка завяршыла год з прыбыткам у 4 млрд. руб., рэнтабельнасць склала 5,3%. Аб'ём вытворчасці мяса ўзрос да 2468 т, а яек да 29,6 млн. штук.

Дадаткова асвоены выпуск 10 найменняў мяса і мясапрадуктаў, 9 субпрадуктаў, 13 нефасаваных паўфабрыкатаў, 4 вэнджаных вырабаў, 14 найменняў каўбас, сардэлек, сасісак і інш.

80% вырабаў прадаецца насельніцтву праз свой фірменны гандаль. Прадпрыемства мае 12 магазінаў, 2 сталовыя, кафэ-бар. Фірменныя магазіны адкрыты ў Гомелі, Мазыры, Ветцы, Касцюкоўцы. Тавараабарот у 1998 г. толькі ад фірменнага гандлю склаў больш за 185 млрд. руб., а чысты прыбытак перавысіў 9 млрд. руб.

Вялікім аўтарытэтам у калектыве карыстаюцца В.Яўсеенка, М.Міхалевіч, І.Леташкова, В.Драздова, В.Леташкоў, Н.Раманькова, В.Сідоранка, Н.Серакова, Т.Еўдакіменка, І.Гапонцаў, Е.Васільцова, Н.Канцавая, З.Шаршнёва, В.Шаршнёў, А.Шаршнёў, Е.Новікава, С.Ананьева і інш.

Фабрыка мае свой Дом культуры, пры якім працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці і народнага мастацтва. У 1998 г. жаночы ансамбль «Калініца» стаў дыпламантам на 1-м Рэспубліканскім аглядзе «Беларусь—мая песня», а ў маі 1999 г. яму прысвоена званне народнага.

Сапраўднымі прапагандыстамі беларускай песні з'яўляюцца Л.І.Кароўкіна, Л.А.Гусева, В.А.Мядзведзева, В.П.Кір'янава, А.Н.Расоха, Т.А.Пашкіна, Г.А.Ермакова, Н.А.Ткачова, Н.М.Кончыц і інш.

Больш за 15 гадоў працуе дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па веласпорце. Менавіта адсюль выйшлі майстар спорту СССР Е.М.Маліноўская, майстры спорту Рэспублікі Беларусь — Н.В.Рыкуноў, А.П.Кананенка, Н.В.Пятроў. Паспяхова

У адным з цэхаў птушкафабрыкі.

выконваецца праграма «Здароўе», якая была прынята адміністрацыяй і прафкомам фабрыкі.

В.А.Старавойтава.

Сумеснае беларуска-галандскае прадпрыемства ААТ «АМІПАК»

Прадпрыемства створана ў 1994 г. на базе раённага аб'яднання «Сельгастэхніка», якое на той час мела шматгадовую гісторыю, свае працоўныя традыцыі і з'яўлялася вядучым прамысловым прадпрыемствам горада.

А пачыналася ўсё ў далёкім 1932 г., калі ў Буда-Кашалёве была створана МТС і група рабочых пачала асвойваць сельскагаспадарчую тэхніку, ствараць рамонтную базу. Вядучым спецыялістам сярод іх быў Іван Восіпавіч Чаманскі (1889—1975). У гады Першай сусветнай вайны ён служыў шафёрам у Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, якая размяшчалася ў г. Магілёве. Пасля грамадзянскай вайны ён вяртаецца ў сельскую гаспадарку і працуе механікам. За доблесную працу выбіраецца ў 1933 г. дэлегатам 1-га Усебеларускага з'езда калгаснікаў-ударнікаў. Не адставалі ад Чаманскага і маладыя трактарысты МТС М.Сцепаненка, Д.Котаў.

У 1939 г. у МТС было 50 адзінак трактарнай тэхнікі.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны аднавіла сваю дзейнасць і МТС. Яна перажыла некалькі рэфармацый, спачатку ў РТС, а на пачатку 1960-х гадоў у раённае аб'яднанне «Сельгастэхніка». У наступныя два дзесяцігоддзі прадпрыемства спецыялізуецца на забеспячэнні гаспадарак раёна аўтатранспартнымі перавозкамі і матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі, рамонце рухавікоў, вузлоў і агрэгатаў да трактароў Т-16, Т-25, Т-150, тэхнічным абслугоўванні абсталявання жывёлагадоўчых ферм і сельскагаспадарчых аб'ектаў. Вялікія аб'ёмы работ выконваліся па вывазцы і ўнясенні мінеральных угнаенняў, торфу, рамонце сістэм цэнтральнага ацяплення, водаправодаў, будаўніцтве.

Прыклады добрасумленных адносін да справы ў гэтыя гады паказвалі начальнік ПМК «Сельгастэхнікі» А.Яжоў, брыгадзір Л.Сіўцоў, вадзіцелі Н.Пакідзька, А.Фількінштэйн, газазваршчыца Р.Зяцікава, слесары С.Круглякоў, Л.Брацікаў, токары І.Юрчанка, У.Сільчанка, загадчык аддзела кадраў, сакратар парткома Р.Машкова.

Калектыў аб'яднання «Сельгастэхніка», які налічваў амаль 400 чалавек, унёс значны ўклад у развіццё раённага цэнтра, выступаючы адным з асноўных заказчыкаў і ўдзельнікаў у будаўніцтве жылля, аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, добраўпарадкаванні горада. У гэты час у аб'яднанні актыўна дзейнічаюць адны з лепшых у раёне калектывы мастацкай самадзейнасці і фізічнай культуры.

Па меры росту аб'ёмаў і разнастайнасці выконваемых «Сельгастэхнікай» работ, з яе складу ў 1980-я гады выходзяць і пачынаюць працаваць самастойна раённае аб'яднанне «Сельгасхімія», райагразабеспячэнне.

Са зменамі ў эканамічнай палітыцы дзяржавы, развіццём рыначных адносін, адміністрацыя «Сельгастэхнікі» на чале з дырэктарам М.І.Зянкевічам пачынае актыўны пошук крыніц пашырэння вытворчасці, прыцягнення інвестыцый. Прадпрыемства пачало выпуск поліэтыленавай плёнкі, пластмасавай тары, на базе былога калгаса ствараецца падсобная гаспадарка, за кошт аднаго са спыніўшых дзейнасць прадпрыемстваў пашыраецца вытворчая база.

У 1994 г. адбылося акцыяніраванне прадпрыемства пад назвай «АграпрамтэхПАК», у 1997 г. яно пераўтварылася ў сумеснае беларуска-галандскае прадпрыемства «АМІПАК». Значна актывізаваліся закупкі за мяжой сучаснага абсталявання і тэхналогій. Толькі ў 1998—1999 гг. у развіццё вытворчасці, набыццё тэхналагічных ліній было ўкладзена больш за 2,5 млн. долараў ЗША.

Асноўнымі напрамкамі дзейнасці сумеснага прадпрыемства з'яўляюцца вытворчасць тары і ўпакоўкі для ўтрымання і перавозкі прадуктаў харчавання, камбінаваных шматслойных матэрыялаў на аснове паперы, кардону, поліэтылену. Гэта адзінае прадпрыемства ў рэспубліцы па вырабе плёнак на аснове поліэтыленэрафталату. Ім асвоена больш за 50 відаў харчовай пластыкавай упакоўкі для мяса-малочных, кандытарскіх вырабаў, марожанага, гародніны і інш. Сваю прадукцыю СП ААТ «АМІПАК» пастаўляе перапрацоўчым прадпрыемствам не толькі Беларусі, але і Расіі, Украіны, Малдовы і шэрагу іншых краін. Сучасная вытворчасць запатрабавала якасна новых

падыходаў да падрыхтоўкі спецыялістаў і рабочых па абслугоўванні складанага абсталявання. У 2000 г. на прадпрыемстве працавала 570 чалавек. Добрае веданне справы дэманструюць начальнікі цэхаў М.М.Мар'ін, В.В.Парфёненка, галоўны энергетык А.В.Хількевіч. Добрасумленна працуюць аператары В.І.Драбышэўскі, А.С.Карнеенка, С.У.Каротчыкаў, С.В.Кузьмянкоў, А.У.Купцоў, А.А.Мацюшкоў, А.В.Парфёненка, А.П.Прышчэпенка, Я.В.Сівацкі, С.А.Шыгалёў, друкары А.У.Рубанаў, У.М.Садавой, С.У.Сівіцкі, слесары С.І.Ахрэменка, У.Я.Ахрэменка, Л.М.Брацікаў, В.М.Галушкін, В.І.Карцялёў, А.М.Фёдараў і інш.

Дзякуючы ініцыятыве і таленту генеральнага дырэктара М.І.Зянкевіча, тэхнічнага дырэктара А.М.Заранкіна, намесніка генеральнага дырэктара па тэхналогіі і якасці кандыдата тэхнічных навук У.У.Сняжкова, намесніка дырэктара П.Р.Кулянкова, прадпрыемства ўпэўнена нарошчвае вытворчасць, адстойвае сваё месца на рынку сучасных упаковачных матэрыялаў.

А.М.Галіцкі.

Буда-Кашалёўскі лясгас

З успамінаў Міхаіла Кірылавіча Новікава

Міхаіл Кірылавіч Новікаў, нарадзіўся 22 мая 1933 г. у в. Отар Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. Закончыў Беларускі лесатэхнічны інстытут (1957). Працаваў ляснічым, а з 1966 г. па 1998 г. — дырэктарам Буда-Кашалёўскага лясгаса. Узнагароджаны медалямі і ганаровымі граматамі, у тым ліку Вярхоўнага Савета БССР, Мінлясгаса.

Буда-Кашалёўскі лясгас арганізаваны адпаведна з пастановай СНК СССР ад 2 лютага 1936 г. на базе Буда-Кашалёўскага леспрамгаса. Агульная плошча лясгаса складала 22 тыс. гектараў і ўключала тры ляснiцтвы: Буда-Кашалёўскае, Віктарынскае і Наспенскае.

У 1954 г., згодна з загадам Мінсельгаса БССР № 636 ад 15 верасня 1954 г., да Буда-Кашалёўскага лясгаса было далучана Стрэшынскае ляснiцтва Рагачоўскага лясгаса, якое ў 1965 г. было перададзена ў нанова арганізаваны Жлобінскі лясгас, а ў склад Буда-Кашалёўскага ўвайшло Чарнянскае ляснiцтва Рэчыцкага лясгаса. Агульная плошча лясгаса складала 34 тыс. гектараў.

У 1999 г. лясгасу перададзены ўсе калгасныя і саўгасныя лясы, а таксама непрыгодныя для сельскагаспадарчага выкарыстання землі, на якіх было створана новае, 5-е, Чабатовіцкае ляснiцтва. Агульная плошча лясгаса на пачатак 2000 г. складала 45,5 тыс. гектараў.

Сасна займае 51%, дуб — 20, алешына — 12,6, бяроза — 8,4, яліна — 2,6, асіна — 3,3%. Лясы адносяцца да водаахоўных і падзелены на дзве групы — у залежнасці ад знаходжання ў адносінах да г. Буда-Кашалёва і р. Днепр. Каля адной трэці — лясы рукатворныя, гэта значыць пасаджаныя лесаводамі. У свой час вельмі вабілі людзей дубовыя рошчы.

Прафесар Шустаў у 1909 г., даследаваўшы ход росту буда-кашалёўскіх дуброў, пісаў: «Дубовыя насаджэнні Кашалёўскай дачы павінны быць аднесены да ліку лепшых дубовых насаджэнняў Расіі».

Зараз засталося толькі некалькі цардубоў — помнікаў прыроды.

У 1950—60-я гады па рэкамендацыі вучоных ствараюцца загушчаныя сасновыя насаджэнні, з пасадкай на адным гектары 10 тысяч і больш сеянцаў. У наступныя гады з'явіліся новыя рэкамендацыі — рэзка скарачаецца колькасць сеянцаў на гектар. Гэта значна знізіла затраты на вытворчасць лясных культур, спрасціла ўмовы механізаванага догляду і аховы насаджэнняў ад пажараў.

Вучонымі Інстытута эксперыментальнай батанікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, пад кіраўніцтвам дырэктара інстытута доктара біялагічных навук прафесара В. І. Парфёнава, праведзена глыбокае навуковае абследаванне стану лясоў і дуброў Віктарынскага і Буда-Кашалёўскага ляснiцтваў.

У сувязі з наяўнасцю фрагментаў каштоўных дуброў і рэдкіх відаў раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі, якія засталіся і маюць вялікае навуковае, культурнае і эстэтычнае значэнне, на тэрыторыі дзяржлясфонду Буда-Кашалёўскага і Віктарынскага лясгасаў Пастановай Савета Міністраў БССР ад 13 красавіка 1988 г. створаны Дзяржаўны біялагічны заказнік «Буда-Кашалёўскі»,

агульнай плошчай 13,6 тыс. гектараў. Навокал горада Буда-Кашалёва створана лясная зона на плошчы 4177 гектараў.

Асноўнай дзейнасцю лягаса з'яўляецца ўсямернае развіццё лясной гаспадаркі, павышэнне прадукцыйнасці лясоў, ахова ад пажараў і самастойных парубак, абарона лясоў ад хвароб і шкоднікаў.

Лягас цесна супрацоўнічаў з тэхнікумам лясной гаспадаркі. З 1948 г. па 1954 г. і лягас, і тэхнікум узначальваў адзін дырэктар — Сцяпан Емяльянавіч Жданко. У 1954 г. тэхнікум аддзяліўся ад лягаса, але застаўся базай падрыхтоўкі прафесійных кадраў, у тым ліку і для Буда-Кашалёўскага лягаса.

У пасляваенныя гады Буда-Кашалёўскім лягасам кіравалі: Пётр Данілавіч Клімянкоў (1954—1956), Сяргей Іванавіч Баброў (1956—1961), Іван Антонавіч Дзікун (1961—1966), Міхаіл Кірылавіч Новікаў (1966—1998). Цяпер лягас узначальвае Мікалай Мікалаевіч Краўчанка. Павагай і аўтарытэтам карысталіся трактарыст Пётр Фёдаравіч Домненка, узнагароджаны ордэнамі Леніна і «Знак Пашаны», участковы тэхнік-лесавод, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Якаў Іванавіч Барашка, леснікі Ніканор Пятровіч Зяцікаў, Андрэй Іванавіч Давыдзенка, Пётр Радзівонавіч Хомчанка, Казімір Андрэевіч Караткевіч, Іван Васільевіч Шкрабаў, рабочая Марыя Мікалаеўна Фёдарава, Д.П.Казлоў, І.В.Паўлаў і інш.

Па 30 і больш гадоў адпрацавалі ў лягасе бухгалтар Тамара Васільеўна Кукрэш, інжынер-механік Уладзімір Аляксандравіч Міхалевіч, галоўны ляснічы лягаса Дзмітрый Фёдаравіч Кабялка, эканаміст Уладзімір Восіпавіч Дзюбчанка і іншыя.

Будаўнічыя арганізацыі Буда-Кашалёўшчыны

Маштабы капітальнага будаўніцтва ў канцы 1950-х гадоў патрабавалі мець у раёне свае будаўнічыя магутнасці. 12 лютага 1957 г. на арганізацыйным сходзе ўпаўнаважаных сямі калгасаў Уваравіцкага раёна было вырашана стварыць міжкалгасную будаўнічую арганізацыю (МБА). Старшынёй савета будаўнічага прадпрыемства прызначылі Мітрафана Міхайлавіча Музычкіна. У 1960 г. склалася Буда-Кашалёўская міжкалгасная будаўнічая арганізацыя, якую ўзначаліў Мікалай Мартынавіч Паркалаў. У студзені 1966 г. у Буда-Кашалёве пачала працаваць перасовачная механізаваная калона (ПМК) № 33, якую ўзначаліў Сямён Міхайлавіч Фіглін.

Галоўнымі аб'ектамі гэтых будаўнічых арганізацый сталі комплексы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўлі, гаражы і мехмайстэрні, сянажныя ямы і бульбасховішчы, лазні, школы, клубы і іншыя аб'екты на сяле. У горадзе былі ўзведзены шматкватэрныя жылыя дамы, будынкі паліклінікі, аптэкі, ветаптэкі, аўтастанцыі, базы раённых электрычных сетак, хімбазы.

У 1977 г. МБА была перайменавана ў міжраённую перасовачную механізаваную калону (МПМК) № 43.

З году ў год нарошчваліся яе магутнасці. Калі ў першыя гады пасля ўтварэння будаўнікі мелі ўсяго 1 аўтамашыну, то ў 1980 г. — 25; у 1960 г. — толькі 1 бульдозер, а ў 1980 г. — 6; у 1964 г. — толькі 1 аўтакран, а ў 1980 г. — 6. Значна павялічваліся і аб'ёмы выкананых работ, паляпшалася якасць, скарачаліся тэрміны ўводу аб'ектаў.

Толькі за 1960—1980 гг. пабудаваны і здадзены ў эксплуатацыю 354 тыпавыя вытворчыя аб'екты, выканана будаўніча-мантажных работ на суму больш за 25 мільёнаў рублёў.

Паспяхова ажыццяўлялася газіфікацыя населеных пунктаў, будаўніцтва мастоў і дарог. Да ўсіх цэнтральных сядзіб гаспадарак і большасці вёсак ёсць дарогі з палепшаным пакрыццём.

Аварыя на Чарнобыльскай атамнай станцыі ў 1986 г. патрабавала значных магутнасцей для выканання пашыраных маштабаў будаўніцтва. Менавіта тады МПМК-43 і ПМК-33 былі аб'яднаны ў больш магутную будаўнічую арганізацыю — МПМК-92, якую ўзначаліў Уладзімір Ісакавіч Грышчанка.

Выдатнымі працоўнымі поспехамі калектыў Буда-Кашалёўскага МПМК-92 аб'яднання «Гомельаблсельбуд» у мінулыя гады неаднаразова займаў першыя месцы ў рэспубліканскім спаборніцтве.

У працоўным калектыве вызначыліся людзі, майстры будаўнічых прафесій. Іх поспехі адзначаны дзяржаўнымі ўзнагаро-

дамі. Вадзіцелі аўтакранаў Іван Пятровіч Каротчыкаў, Сяргей Сямёнавіч Круглякоў, Васіль Елісеевіч Масленчанка ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені, брыгадзір комплекснай брыгады Іван Дзмітрыевіч Жаранкоў — ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны», Пётр Еўдакімавіч Ігнацьеў — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, брыгадзіры будаўнічых брыгад Людміла Паўлаўна Страляева, Ігнат Фядосавіч Новікаў — медалём «За працоўную доблесць».

Адукацыя

У 1914 г. на тэрыторыі сучаснага раёна налічвалася 31 школа, з іх 12 земскіх (420 вучняў), 11 царкоўна-прыходскіх (385 вучняў), 7 народных (245 вучняў) і 1 (Хмяльнянская) школа граматы (19 вучняў). У асноўным школы былі аднакамплектныя. У іх вучылася 14,7% дзяцей школьнага ўзросту.

У павеце, па стане на 1920 г., са 100 чалавек пісьменнымі былі толькі 23. Адна школа прыходзілася на 27,9 кв. вярсты.

У час Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны многія школы былі закрыты, іншыя працавалі нерэгулярна. Наведванне школ дзецьмі знізілася.

У 1920 г. была аднаўлена даваенная сетка школ, аднак колькасць педагогаў значна зменшылася. Пад школы былі аддадзены лепшыя памяшканні ў былых маёнтках, дамы былых святароў і рэлігійных абшчын.

Прымаліся захады па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. Усе, хто наведваў школы граматы, вызваляліся ад працы на 3 гадзіны, але не звыш 8 гадзін у месяц. Юнакоў прызыўнога ўзросту, якія ўхіляліся ад навучання, штрафавалі ад 100 да 500 тыс. руб.

У звароце да сялян Гомельскай губерні аб дапамозе школе ў кастрычніку 1921 г. гаварылася: «...И если в период борьбы с контрреволюцией наш лозунг был: «Все для войны, все для победы!», то теперь мы сказали: «Все для борьбы с невежеством, все для просвещения!»

Масавы прыток сялянскіх дзяцей у школы патрабаваў унясення сур'ёзных змен у структуру дзеючых школ. Значна вырасла колькасць пачатковых школ і іх наведванне. Настаўнікамі ў асноўным былі выпускнікі павятовых кароткатэрміновых курсаў. Толькі 2,8% настаўнікаў мелі адукацыю ў аб'ёме настаўніцкага інстытута, і 7,3% — у аб'ёме жаночых гімназій і епархіяльных вучылішчаў. Адмоўна адбілася на колькасці прафесійных настаўнікаў так званая чыстка ад «рэакцыйных элементаў». Колькасць вопытных выкладчыкаў значна паменшылася, а навучэнцаў, наадварот, павялічылася ў 3—5 разоў.

У гады нэпа большая частка школ была перададзена на ўтрыманне насельніцтву. У вёсках, дзе школ не было, заняткі з вучнямі праходзілі па чарзе ў сялянскіх хатах: з дзецьмі — удзень, з дарослымі — увечары. Чытаць вучыліся па газетах. Школы 1-й і 2-й ступеней працавалі па праграмах і вучэбных планах, складзеных губернскім аддзелам народнай адукацыі. Асноўнымі падручнікамі былі хрэстаматыя Л.М.Талстога і буквар Сатарава, якія былі раздрукаваны Гомельскім аддзяленнем Дзяржвыда, аднак гэтых кніг не хапала. Практычна адзін падручнік прыходзіўся на 8—10 вучняў.

Памяшканні большасці школ асвятляліся газавымі лямпамі. На нарыхтоўку паліва для школ мабілізоўваліся ўсе жыхары вёсак, настаўнікі і вучні.

Былі закрыты прыватныя яўрэйскія і польскія школы. Пад забаронай апынуліся ўсялякія віды дзейнасці хедараў, ішыбата і інш. Пастановай губвыканкома ад 2 чэрвеня 1922 г. за выкарыстанне вучэбных праграм хедараў настаўнік прыцягваўся да адказнасці па 121-м артыкуле Крымінальнага кодэкса. У Дзяржаўным архіве Гомельскай вобласці захаваліся матэрыялы судовых спраў такога характару.

У пачатку 1920-х гадоў традыцыйная сістэма народнай адукацыі была заменена самакіраваннем з адзінай арганізацыяй навучання. На пасяджэннях школьных камітэтаў, прэзідыумаў і пленумах вырашаліся праблемы навучальнага працэсу. Асаблівая роля адводзілася агульнашкольным і дэлегацкім сходам вучняў і настаўнікаў. Такая «дэмакратызацыя» арганізацыі школьнай сістэмы прывяла да таго, што навучальны працэс у школах 1-й ступені нагадваў чаргаванне кампаній: «Дзень лесу», «Пяцігоддзе савецкай улады», «Пяцігоддзе Кастрычніцкай рэвалюцыі», «Да-

памога дзецям Паволжжа», «Дапамога дзецям Германіі», «Калядныя і антывелікодныя антырэлігійныя кампаніі» і г.д. А ў школах 2-й ступені асобную ролю ў выхаванні адыгрывалі фракцыі ЛКСМ, МОПРа і іншыя грамадскія ячэйкі. Масавымі былі школьныя часопісна-газетныя чытальні, тэатральныя гурткі.

У сярэдзіне 1920-х гадоў асаблівае значэнне атрымлівае політэхнізацыя школы. Аднак умоў для яе здзяйснення не было. Толькі ў некаторых школах меліся майстэрні, а па вясне вучні засявалі невялікія агароды, саджалі дзялянкі саду або лесу.

Важная роля ў дзейнасці школы адводзілася вырашэнню праблемы беларусізацыі. Каб вызначыць фактычны склад насельніцтва і яго адносіны да беларусізацыі, у кастрычніку 1926 г. у Гомельскай вобласці працавала камісія ЦК ВКП(б). Паводле перапісу 1926 г., у раёне пражывала 35 128 чалавек. Па стане на 1931 г. налічвалася 39 185 чалавек, у т. л. па нацыянальным складзе: беларусаў – 37 578, рускіх — 274, палякаў — 235, яўрэяў — 980, іншых — 118.

Меўся Любавінскі нацыянальна-польскі сельскі Савет. У яго склад уваходзілі населеныя пункты Любавін, Новы Любавін, Бычкі, Асінаўка, Шутнае, Дзеднае.

Пісьменнасць насельніцтва ў працэнтных адносінах складала: у групе ўзросту ад 8 да 18 гадоў — 92,1; ад 18 да 21 года ў мужчын — 96,3, у жанчын — 84; ад 21 да 32 гадоў у мужчын — 24,6, у жанчын 63,2%; ад 32 да 40 гадоў у мужчын — 76,7, у жанчын — 52.

У раёне працавалі 43 школы 1-й ступені, 2 школы сялянскай моладзі (ШСМ), адна прафтэхшкола. У школах 1-й ступені на 3601 месца навучалася 4069 чалавек, у ШСМ на 370 месцаў навучэнцаў было 626. Школы працавалі ў дзве змены.

На пачатку 1930-х гадоў агульная плошча раёна складала 882 км^2 і была падзелена на 12 сельсаветаў, у якіх было 277 населеных пунктаў, а ўстаноў народнай ас-

Трэці выпуск Міхалёўскай сямігадовай школы. 1954 г.

веты — 43. Адна ўстанова прыходзілася ў сярэднім на 20 км^2 плошчы і адна школа — на 7 населеных пунктаў...

Па стане на 1934 г. мелася 45 навучальных устаноў, з якіх ва ўласных будынках размяшчаліся 22, з іх у тыпавых — 3, астатнія — у прыстасаваных пад школы 54 хатах. У раёне было 12 сямігодак, з іх 3 школы знаходзіліся ў тыпавых будынках. На 1936/37 навучальны год заставаліся непісьменнымі 5967 чалавек.

З кожным годам раслі выдаткі на развіццё народнай асветы. Так, у 1930 г. затраты на душу насельніцтва ў народнай асвеце склалі 2 руб. 58 кап., у 1932 г. — 7 руб. 74 кап., у 1933 г. — 18 руб. 08 кап., у 1934 г. — 19 руб. 43 кап. За пяць гадоў адбыўся рост амаль у 8 разоў. Менавіта гэта садзейнічала таму, што ў наступныя 1935—1936 гг. пачалі працаваць пабудаваныя тыпавыя школы ў Бронніцы, Уваравічах, Буда-Кашалёве, Калініне і іншыя. У хуткім часе яны сталі сярэднімі агульнаадукацыйнымі школамі.

Вайна і часовая акупацыя раёна гітлераўцамі разбурылі сістэму народнай асветы. Спатрэбілася амаль 15 гадоў, каб аднавіць школьную справу. У 1960—70-я гады было 92 школы (15 сярэдніх, 30 васьмігадовых, 47 пачатковых), працавала больш за 900 настаўнікаў, навучалася ад 12,5 да 14 тыс. дзяцей. Дзейнічала 17 дашкольных устаноў.

У цяперашні час існуюць 39 агульнаадукацыйных школ, 2 спартыўныя, школа вочна-завочнай давузаўскай падрыхтоўкі, якія наведваюць больш за 6700 вучняў, 34 дашкольныя ўстановы, у якіх амаль 1400 дзяцей. Працуюць 687 настаўнікаў і 170 выхавацеляў. Школы маюць дастаткова аснашчаную матэрыяльна-тэхнічную і метадычную базу, лабараторыі, спартыўныя залы, бібліятэкі і майстэрні. Арганізавана навучанне дзяцей шасцігадовага ўзросту ў падрыхтоўчых класах. Дзіцячыя сады раёна працуюць па агульнанацыянальнай праграме «Пралеска». У яслях-садзе № 2 г. Буда-Кашалёва арганізавана 10 груп з паглыбленым накірункам па фізічным, эстэтычным, экалагічным развіцці, па азнаямленні з нацыянальнымі традыцыямі беларускага народа, развіцці мастацка-моўнай культуры. У пяці дзіцячых садах арганізавана вывучэнне замежных моў.

Ствараюцца неабходныя ўмовы для работы са здольнымі вучнямі. Больш за 440 вучняў у 20 школах займаюцца ў профільных класах фізіка-матэматычнага, хіміка-біялагічнага, геаграфічнага, філалагічнага і іншых напрамкаў. У шасці школах вывучаюць замежныя мовы па паглыбленых праграмах. У сярэдняй школе № 2 г. Буда-Кашалёва і Камунараўскай сярэдняй школе адкрыты 9 ліцэйскіх груп, у Камунараўскай да таго ж — з падрыхтоўчага да 9 класа — групы з эстэтычным ухілам выхавання. У Буда-Кашалёўскай, Негаўскай, Гусявіцкай школах працуюць класы з мастацка-эстэтычнай і музычнай адукацыяй.

Працуе па эксперыментальнай праграме «Арыенцір» Буда-Кашалёўская пачатковая школа.

Настаўніца Уваравіцкай СШ Н.М.Барсукова са сваімі выхаванцамі. Канец 1980-х гг.

З 1991 г. існуе вочна-завочная школа давузаўскай падрыхтоўкі, у якой штогод займаюцца 150—200 найбольш таленавітых вучняў. Мэта школы — дапамагчы старшакласнікам у падрыхтоўцы да паступлення ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

Школы раёна эфектыўна супрацоўнічаюць з педагагічнымі калектывамі Гомельскага дзяржуніверсітэта, Мазырскага педагагічнага інстытута, Лоеўскага педагагічнага вучылішча, Рэчыцкага педагагічнага каледжа і інш. У школах раёна працуюць 8 выкладчыкаў — кандыдатаў навук, з іх 3 загадчыкі кафедраў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта і Мазырскага педагагічнага інстытута.

З вучнямі, якія маюць псіха-фізічныя адхіленні, арганізаваны заняткі ў інтэ-

Новы будынак Уваравіцкай СШ. 2001 г.

Перад апошнім званком у СШ № 2 г. Буда-Кашалёва. 2001 г.

гральных класах. Такіх класаў у раёне 4, у іх 25 вучняў. З 130 вучнямі індывідуальна займаюцца 8 дэфектолагаў і 8 псіхолагаў.

Значная роля адводзіцца патрыятычнаму выхаванню. У школах працуюць 24 музеі, у тым ліку 9 гісторыка-краязнаўчых, 6 — баявой і працоўнай славы, 9 — этнаграфічных.

Плённая праца многіх настаўнікаў і выхавацеляў адзначана высокімі ўрадавымі ўзнагародамі і ганаровымі званнямі. Ёсць заслужаныя настаўнікі, выдатнікі народнай асветы. Адной з першых у СССР і першай у БССР народнай настаўніцай стала Вольга Сысоеўна Аўраменка з Уваравіцкай сярэдняй школы.

Ф.Ф.Муха.

З гісторыі школ раёна

Гаўлеўская школа

Больш за 100 гадоў таму ўпершыню дзяцей в. Гаўлі пачынаў вучыць адукаваны чалавек, які прыехаў з Заходняй Беларусі. Вучылі дзяцей у сельскіх хатах. Пазней адзін з мясцовых жыхароў Захар Піліпавіч Гуршчанкоў, якому дзесьці ўдалося атрымаць невялікую адукацыю, дабіўся, што было пабудавана невялікае памяшканне для школы. Хадзілі ў «вучылішча», як тады называлі школу, толькі зімой.

Да 1907 г. у в. Гаўлі была школа граматы, потым — царкоўна-прыходская, а яшчэ пазней — пачатковая. У 1918 г. настаўнікам працаваў Сцяпан Андрэевіч Бядрыцкі. У 1934 г. ён узначаліў ужо сямігодку ў новым светлым будынку.

З 1917 г. па 1952 г. адпрацавала ў нашай школе настаўніцай Таццяна Пятроўна Круцялёва. Аднавяскоўцы памятаюць настаўніка Канстанціна Іванавіча Паўлоўскага. Ён быў пакінуты для работы ў тыле ворага і загінуў ад рук фашысцкіх захопнікаў.

Да вайны працаваў настаўнікам у пачатковай школе Фёдар Савельевіч Драянкоў. Удзельнік Айчыннай вайны, даслужыўся да генерала. Пасля вайны загадваў кафедрай у ваеннай Акадэміі ў Маскве (рэчы, пісьмы яго знаходзяцца ў школьным музеі).

У пасляваенныя гады ў школе працавалі Міхаіл Мінавіч Сцепаненка, Фёдар Сідаравіч Пеўнеў, Аляксандр Барысавіч Ханаў, Мікалай Аляксеевіч Казакоў, Ганна Трафімаўна Шчакалава, Марыя Гаўрылаўна Афанасенка, Ефрасіння Сцяпанаўна Лабушава.

У 1971 г. быў пабудаваны тыпавы двухпавярховы будынак. Больш за 30 выпускнікоў сталі настаўнікамі, многія — інжынерамі, урачамі, будаўнікамі, ваеннымі, вучонымі. Сярод іх — Васіль Сямёнавіч Яцкоў, доктар эканамічных навук, прафесар, Уладзімір Іванавіч Быкаў, кандыдат геаграфічных навук, дацэнт, Міхаіл Васільевіч Зюзянкоў, доктар медыцынскіх навук, прафесар, яго брат Віктар Васільевіч — галоўны ўрач бальніцы чыгуначнікаў у г.Мінску, Міхаіл Фёдаравіч Казлоў, генерал-лейтэнант.

М.Я.Пеўнеў.

Камунараўская школа

Да 1957 г. у п. Камунар школы не было, хаця пасёлак лічыўся цэнтрам Камунараўскай МТС. Малодшыя дзеці наведвалі Блюдніцкую пачатковую, а старэйшыя — Асобінскую сямігадовую школы. Нарэшце ў пасёлку пабудавалі сваю школу. 11 студзеня 1957 г. тут пачаліся заняткі. Пазней школа стала дзесяцігадовай. Узначаліў яе Юрый Евелевіч Шмідаў. У тыя гады Камунараўская СШ была адной з лепшых ва Уваравіцкім раёне.

У 1965 г. побач са школай быў пабудаваны новы трохпавярховы будынак, у якім размясціўся дзіцячы дом. Дырэктарам быў прызначаны Пётр Іосіфавіч Трафімовіч. У 1966 г. на базе Камунараўскай сярэдняй школы і дзіцячага дома ствараецца Камунараўская сярэдняя школа-інтэрнат, дырэктарам якой быў зацверджаны Ю.Е.Шмідаў. Усяго навучалася каля 500 дзяцей. Добрыя і трывалыя веды па фізіцы даваў вучням У.А.Кашавенка. Значную работу па арганізацыі розных выхаваўчых мерапрыемстваў праводзілі Л.А.Жалезка і П.І.Трафімовіч. З 1971 г. па 1983 г. дырэктарам школы працаваў Леанід Іванавіч Хлапіцкі, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У 1973 г. школа-інтэрнат рэарганізавана ў агульнаадукацыйную сярэднюю школу.

З 1983 г. школу ўзначальвае выдатнік народнай асветы рэспублікі Леанід Мікалаевіч Венцэль. Доўгія гады працавала намеснікам дырэктара Любоў Іванаўна Кучарэнка, а намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце — выдатніца народнай асветы Людміла Леанідаўна Сварцэвіч.

Педкалектыў пастаянна ўдасканальвае навучальна-выхаваўчы працэс. У школе створаны студыя бальнага танца «Сузор'е» (кіраўнік І.І.Анцарыдзе), гурток народнага танца (кіраўнік Н.М.Кончыц), музычная студыя «Акалада» (заснавальнік І.Д.Крэмзукоў), ізастудыя «Рамантык»(кіраўнік Л.М.Каржова). Працуе філіял музычнай школы, секцыя турызму і каратэ пад кіраўніцтвам настаўніка фізкультуры майстра спорту В.М.Жгарова.

Выпускнікі школы сталі вучонымі, інжынерамі, ваеннымі, будаўнікамі, хлебаробамі. М.М.Баранаў працуе дырэктарам навукова-даследчага інстытута ў Санкт-Пецярбургу, а яго брат В.М.Баранаў — былы капітан падводнай лодкі, М.В.Міхалкін — доктар філасофскіх навук, М.М.Малахаў — доктар тэхнічных навук, В.Г.Шальманава — кандыдат тэхнічных навук, М.Р.Юрчанка — выкладчык у вышэйшым камандным вучылішчы ў г. Арле.

Л.Л.Сварцэвіч.

Недайская школа

Недайскае народнае вучылішча Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні было адкрыта ў 1873 г. Размяшчалася ў сялянскай хаце. У вучылішчы займалася 30 хлопчыкаў з Недайкі і навакольных вёсак. Першым настаўнікам працаваў Фёдар Пятровіч Буланаў.У 1899 г. былі адкрыты 3-і і 4-ы класы. Прыйшлі вучыцца дзве першыя дзяўчынкі. Новую цагельную школу пачалі будаваць у 1913 г., і ў тым жа годзе земская ўправа адкрыла ў Недайцы 5-ы і 6-ы класы, вучылішча стала называцца двухкласным. Доўгі час дырэктарам яго быў Павел Аляксандравіч Анісімаў.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі школа значна пашырылася.Тут працавалі курсы лікбезу, школа для малаадукаваных, няпоўная сярэдняя, а з 1938 г. — сярэдняя школа. Настаўнікамі працавалі: К.М.Белы, К.Г.Джанкоў, Н.І.Васілеўская, С.М.Мажэйка, В.Ф.Місючэнка, Г.О.Філімонава, В.Я.Файгель, У.Я.Файгель, Е.П.Філіпенка, Ф.С.Паўлючкоў, А.С.Паўлючкоў і іншыя. Настаўніца Паліна Сцяпанаўна Панамарцава ў 1939 г. узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

18 жніўня 1941 г. вёска была акупіравана фашыстамі. Школьныя прылады, наглядныя дапаможнікі выкінулі на вуліцу. Бібліятэку знішчылі. Школу пераўтварылі ў канюшню.

Вызваленне ад акупантаў прыйшло 27 лістапада 1943 г. Спачатку ў памяшканні школы быў адкрыты палявы шпіталь. А ў студзені 1944 г. пачала працаваць школа (дырэктарам стала П.М.Даніленка).

У гады Вялікай Айчыннай вайны на фронце загінулі настаўнікі Ф.С.Паўлючкоў, Е.П.Філіпенка, К.Г.Джанкоў, М.Ф.Александроўскі, В.С.Маркава, Дз.Ф.Механікаў, С.Х.Ліпак.

За пасляваенныя гады склаўся новы настаўніцкі калектыў.

У 1950/51 навучальным годзе адкрыўся 8-ы клас. У 18 класах навучалася каля 700 вучняў. Школа працавала ў дзве змены.

У 1953 г. дырэктарам стаў Мікалай Якаўлевіч Тодараў. Напярэдадні 100-годдзя Недайскай школы, у 1973 г., было прынята рашэнне аб пабудове новай тыпавой агульнаадукацыйнай школы. У 1978 г. дырэктар школы Вера Ільінічна Жырыкава прыняла ад будаўнікоў новую школу. У памяшканні былой размясцілі два інтэрнаты для вучняў.

Пашыралася матэрыяльная база. Пачала працаваць кабінетная сістэма навучання з выкарыстаннем дапаможнікаў і тэхнічных сродкаў. У розныя гады дырэктарамі працавалі П.В.Ламаносаў, В.Н.Кісялёў, П.С.Грыханаў.

Больш за 60 выпускнікоў школы закончылі педагагічныя інстытуты і універсітэты, працавалі і працуюць настаўнікамі, у тым ліку з сем'яў Анісімавых, Грыханавых, Чындаравых, Еўтушэнка і іншых.

Усё сваё жыццё звязалі з працай у школе Еўдакія Сямёнаўна і Наталля Апанасаўна Чындаравы. Скончыўшы яшчэ да вайны Гомельскі настаўніцкі інстытут, яны больш за 40 гадоў нязменна працавалі настаўніцамі рускай і беларускай моў.

Шмат гадоў аддалі школе Алена Паўлаўна Анісімава, Марыя Сяргееўна Лявончыкава і іншыя.

Скончылі школу, сталі вучонымі У.П.Грыханаў, В.Я.Цімашэнка, пісьмен-

нікам — М.Л.Стрыгалёў, кадравымі вайскоўцамі — І.А.Клачкоў, І.С.Чындараў, М.І.Жырыкаў, М.П.Грыханаў.

Школа стала базай падрыхтоўкі кадраў для мясцовых калгасаў і саўгасаў. Выпускнікі працуюць трактарыстамі, камбайнерамі, паляводамі, жывёлаводамі, арганізатарамі і кіраўнікамі вытворчасці ў сельскай гаспадарцы.

Высокімі ўрадавымі ўзнагародамі адзначаны звеннявыя калгаса «Прагрэс» П.А.Агеенка, В.Р.Рудзянкоў, аграном эксперыментальнай базы «Уваравічы» Ф.І.Жырыкаў, даглядчык жывёлы калгаса «Прагрэс» М.С.Старыкаў і іншыя.

Карэнныя сацыяльна-эканамічныя змены ў жыцці не мінулі і жыхароў в. Недайка. За апошнія гады значна зменшылася колькасць насельніцтва і дзяцей у вёсцы, а значыць і вучняў у школе.

Узнікла шмат матэрыяльных і кадравых праблем. Тым не менш Недайская школа застаецца і сёння ў ліку базавых школ раёна. Традыцыйна ў школе праводзяцца навукова-практычныя канферэнцыі, праблемныя педсаветы, педагагічныя чытанні па актуальных праблемах вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Дзейнічае школьны музей баявой і працоўнай славы, створаны яшчэ ў 1980 г. намаганнямі былога дырэктара школы В.І.Жырыкавай і яе нястомных памочнікаў А.Я.Маркелавай, С.М.Капусцінай, Т.П.Скакалавай. Ён уключае шмат каштоўных экспанатаў па патрыятычным, працоўным і духоўным выхаванні моладзі.

В.Ф.Благадзерава.

Радзееўская сярэдняя школа

У 1893 г. у в. Радзеева талакой сяляне пабудавалі драўляны будынак школы. Першымі вучнямі сталі 15 хлопчыкаў, а іх настаўнікам — Ермалай Рыгоравіч Карпенка. Некалькі пазней вучыў дзяцей Пракоп Дзям'янавіч Сівянкоў. Абодва былі мясцовымі сялянамі і мелі толькі пачатковую адукацыю. Працу настаўніка аплачвалі бацькі. Зімой па чарзе дзеці прыносілі ў школу і дровы. Сродкаў для рамонту будынка не было і ён паступова прыходзіў у занапад.

Мясцовы памешчык Гармановіч вырашыў зрабіць свой «уклад» у справу народнай адукацыі і заадно падзарабіць на гэтым. Па яго загадзе з некалькіх старых пабудоў быў складзены новы будынак школы. За гэта земства аддала яму сродкі, якія былі прызначаны на будаўніцтва ў Радзеева новай школы.

Але так ці інакш школа перайшла ў новы, больш прасторны будынак. Павялічылася колькасць навучэнцаў, былі ў іх ліку і дзяўчынкі. Вучні былі не толькі мясцовыя, але і з бліжэйшых вёсак і пасёлкаў. У новай школе настаўнічалі высокаадукаваныя і ўлюбёныя ў сваю прафесію педагогі — Канстанцін Іванавіч Цвірка і яго жонка Лідзія Іванаўна. Яны працавалі тут і ў першыя гады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аднавяскоўцы добра памяталі гэтых прыстойных людзей, якія аддавалі шмат сіл і старання справе народнай адукацыі ў тыя вельмі цяжкія гады.

Іх сын, народны мастак БССР Віталій Канстанцінавіч Цвірка ў сваім пісьме да навучэнцаў пісаў:

«...Хочу поблагодарить, дорогие ребята, Ваших учителей и Ваших родителей за память о моих родных. Их, к сожалению, нет в живых. Мой отец, Константин Иванович, был доцентом Минского университета, а мать, Лидия Ивановна, работала в школе, и ей было присвоено звание «Заслуженный учитель БССР». Мать и отец с большой любовью рассказывали о своей работе в школе в те далекие времена...»

У першыя гады пасля рэвалюцыі ў Радзеева прыехала маладая настаўніца Лізавета Сцяпанаўна Шафранская, якая толькі скончыла семінарыю. Разам са сваімі калегамі па школе яна аддавала шмат сіл навучанню і выхаванню сваіх вучняў, каб яны сталі адукаванымі, высока культурнымі і адданымі Радзіме людзьмі. У гады Вялікай Айчыннай вайны фашысты арыштавалі Лізавету Сцяпанаўну і яе мужа за тое, што іх сыны былі партызанамі, і расстралялі іх. На мемарыяльнай пліце помніка загінуўшым землякам в. Радзеева залатымі літарамі выбіта і імя Л.С.Шафранскай.

У 1922 г. у в. Радзеева пры камуне імя Карла Маркса адкрылі пачатковую школу. У доме камунараў адгарадзілі памяшканне, з ужо дзеючай школы перавезлі частку парт. Класаў было чатыры, вучняў — 50 чалавек. У большасці — дзеці камунараў, былі і з пасёлка Першамайскі.

У 1929 г. адкрыўся пяты клас, а пазней школа стала сямігадовай. Дырэктарам быў

К.І.Цвірка.

Л.І.Цвірка.

Платон Антонавіч Шафранскі, а з 1931 г. па 1938 г. — Якаў Пятровіч Ларыёнаў, чалавек вельмі энергічны. Пад яго кіраўніцтвам быў пабудаваны будынак сучаснай школы, умацавана матэрыяльная база, сфарміраваўся педагагічны калектыў.

З Вялікай Айчыннай вайны не вярнулася 80 выхаванцаў школы, былыя настаўнікі Гаўрыла Паўлавіч Кавалёў, Герасім Васільевіч Кавалёў, Я.П.Ларыёнаў і іншыя.

Пасля вызвалення раёна спатрэбіліся гады, каб аднавіць матэрыяльную і вучэбна-вытворчую базу школы, укамплектаваць прафесійна падрыхтаванымі кадрамі, арганізаваць вучэбны працэс. Да канца 1960-х гг. у школе працавала 16 настаўнікаў, з якіх вышэйшую адукацыю мелі 6, незакончаную вышэйшую — 7.

Вялікую ўвагу ў школе ўдзялялі арганізацыі кабінетнай сістэмы навучання 5—8-х класаў. Кабінеты ператвараліся ў сапраўдныя лабараторыі, насычаныя дапаможнікамі, тэхнічнымі сродкамі навучання. Школа станавілася прафесійнай, з добра абсталяванымі вучэбнымі майстэрнямі.

Выкарыстоўваліся дастаткова разнастайныя прыёмы перадавых навукова-прагрэсіўных метадаў навучання. Школа стала адной з базавых па распаўсюджванні прагрэсіўных метадаў навучання і выхавання ў раёне. Тут не аднойчы праводзіліся семінары-практыкумы дырэктараў школ, настаўнікаў-прадметнікаў, старшых піянерважатых школ раёна.

Асаблівае месца ў рабоце школы займала ідэйна-патрыятычнае выхаванне навучэнцаў. Намаганнямі энтузіястаў (настаўнікаў і школьнікаў) стварылі музей. Сабраны багаты матэрыял успамінаў па гісторыі в. Радзеева. Успаміны землякоў — удзельнікаў розных гістарычных падзей. Савет музея арганізаваў вялікую перапіску з выдатнымі вучонымі, дзеячамі мастацтва, літаратуры, знатнымі людзьмі, ветэранамі вайны і працы, героямі і ардэнаносцамі, касманаўтамі і інш. Непасрэдныя цесныя сувязі завязваліся і ў час экскурсій і турысцкіх паходаў.

Такія кантакты дазволілі сабраць вялікую бібліятэку мастацкай і навукова-тэхнічнай літаратуры. Наватары завода «Гомсельмаш», з якімі настаўнікі і школьнікі не аднойчы сустракаліся, падарылі бібліятэку тэхнічнай літаратуры, набор спартыўнага інвентару.

Вучні Радзееўскай васьмігадовай школы ў гасцях у М.Ц.Лынькова. 1982 г.

Вядомы беларускі пісьменнік М.Ц.Лынькоў, на радзіме якога навучэнцы пабывалі ў турысцкім паходзе, а затым, па яго запрашэнні, і на дачы пісьменніка на беразе возера Нарач, у якасці падарунка перадаў для школьнай бібліятэкі шмат каштоўных кніг. Дзеці правялі ў школе чытацкую канферэнцыю па апавяданнях Міхася Лынькова перыяду Вялікай Айчыннай вайны, стварылі літаратурны гуртом.

Такія мерапрыемствы не адзінкавыя факты жыцця і дзейнасці педагагічнага калектыву і навучэнцаў школы. Вучні збіралі матэрыялы аб маладагвардзейцах, вялі перапіску з піянерамі Балгарыі, 110-й маскоўскай школы, сабралі вялікі дакументальны матэрыял аб подзвігу балгарскай патрыёткі Лілії Карастаянавай і г.д.

Шмат выпускнікоў Радзееўскай школы розных гадоў прайшлі славуты рэвалюцыйны, баявы і працоўны шлях, адзначаны ордэнамі і медалямі Айчыны.

Аднавясковец, матрос з крэйсера «Баян», Ціхан Піліпавіч Андрэенка ўдзельнічаў у штурме Зімняга палаца. Іосіф Іванавіч Мельнічэнка ўдзельнічаў у ліквідацыі контррэвалюцыйнай Стаўкі ў Магілёве. Актыўнымі ўдзельнікамі рэвалюцыйных падзей 1917 г. былі Мікалай Іванавіч Карпенка, Лазар Міхайлавіч Цішчанка, Рыгор Канстанцінавіч Шпак.

Добраахвотна на фронт у гады грамадзянскай вайны пайшлі жыхары в. Радзеева Пятро і Аляксей Цішчанкі, Федарэнка. На працягу года змагаўся ў легендарнай дывізіі Шчорса Канстанцін Восіпавіч Зыблеў.

Поўным кавалерам ордэна Славы вярнуўся з Вялікай Айчыннай вайны Аляксандр Ягоравіч Андрэенка. Двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны II ступені ўзнагароджаны палкоўнік-танкіст Мікалай Іванавіч Андрушкевіч, ордэнам Чырвонай Зоркі і двума ордэнамі Польскай Народнай Рэспублікі быў узнагароджаны Мікалай Емяльянавіч Савельеў. Аб подзвігах парторга Івана Данілавіча Зыблева пісала франтавая газета. Ён узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны, ордэнам Чырвонай Зоркі. Сярод тых, хто адзначаны працоўнымі ўзнагародамі, намеснік дырэктара Радзееўскай школы Леанід Іванавіч Хлапіцкі, які ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Чабатовіцкая школа

У 1874 г. у сяле Чабатовічы было адкрыта народнае вучылішча. Тут займаліся 24 вучні. Першым настаўнікам быў Іван Станіслававіч Костка.

У Чабатовічах з 1874 г. па 1908 г. працавала аднакласнае народнае вучылішча з чатырохгадовым тэрмінам навучання. У 1908 г. яно было пераўтворана ў двухкласнае народнае вучылішча з тэрмінам навучання шэсць гадоў. У першы клас хадзілі дзеці розных узростаў — ад 8 да 13 гадоў. Настаўнікамі ў дарэвалюцыйныя гады працавалі Міхаіл Іванавіч Антаневіч, Піліп Андрэевіч Радчанка, Антаніна Кірылаўна Бяляева, Фёдар Ігнатавіч Пракапенка, Алена Сафронаўна Бекарэвіч, Павел Іванавіч Іваноў.

З 1917 г. па 1929 г. у вёсцы працавала пачатковая школа з чатырохгадовым тэрмінам навучання. У 1929 г. адкрыўся пяты клас сямігадовай школы. У 1934 г. пабудавана новая школа, вялікая, светлая, у будынку якой у 1936 г. пачала функцыянаваць сярэдняя школа, пераўтвораная ў школу калгаснай моладзі.

У 1939 г. адбыўся першы выпуск дзясяцікласнікаў, школу закончылі 12 навучэнцаў (шэсць юнакоў і шэсць дзяўчат).

Чацвёра з іх — М.П.Мячыкаў, М.А.Карлоўская, М.Я.Кухарэнка, Т.Г.Цыганкова сталі настаўнікамі. У 1940—1941 гг. школу закончылі яшчэ 31 чалавек. Многія з іх сталі настаўнікамі. Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх акупантаў школа працавала ў складаных умовах. У 1950 г. адбыўся першы пасляваенны выпуск Чабатовіцкай дзесяцігодкі — 18 вучняў атрымалі сярэднюю адукацыю.

Школа стала базавай па прафесійным выхаванні выпускнікоў. Аб гэтым сведчаць узнагароды, якімі адзначаны калектыў настаўнікаў у розныя гады, у т.л. дыплом за лепшы школьны фруктовы сад (1963), дыпломы школьнаму лясніцтву (1965, 1970), граматы вучнёўскай вытворчай брыгадзе, ганаровыя граматы за поспехі ў вопытніцкай справе (1969, 1971, 1975, 1976, 1980, 1981) і іншыя.

За час існавання Чабатовіцкай сярэдняй школы адбылося 52 выпускі, больш за 2000 вучняў паспяхова закончылі школу, у тым ліку 41 выпускнік з залатым і сярэбраным медалямі, 94 чалавекі сталі настаўнікамі.

Сярод выхаванцаў школы Герой Савецкага Саюза А.Л.Ісачанка, народны артыст СССР П.С.Малчанаў.

Падрыхтаваў Ф.Ф.Муха.

Аграрна-тэхнічны каледж

Тэрыторыя сучаснага Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа, якую ў народзе называюць Чырвоным Курганом, у мінулым належала Кашалёўскаму лясніцтву і афіцыйна называлася казённай лясной дачай. У 1880-я гады тут пачалася вырубка сасновага і бярозавага лесу. Тутэйшы лясны масіў, да якога да таго часу не дакраналася рука чалавека, быў шырока прадстаўлены рознымі пародамі дрэў, хмызняку, іншых раслін і ў гэтым сэнсе ўяўляў вялікую цікавасць як прыродная лабараторыя падрыхтоўкі спецыялістаў для лягсасаў.

Менавіта з гэтай мэтай 19 красавіка 1888 г. было ўведзена Палажэнне аб стварэнні лясных школ. У 1902 г. адна з такіх школ была адкрыта ў Полацку. У кастрычніку 1912 г. гэта ніжэйшая лясная школа была пераведзена на тэрыторыю Кашалёўскага лясніцтва Чырвоны Курган, што размяшчалася за тры вярсты ад чыгуначнай станцыі Буда-Кашалёва Лібава-Роменскай чыгункі. Першым кіраўніком ніжэйшай лясной школы (1912—1916) быў

І.Л.Юстаў з сям'ёй, 1912 г.

Іван Лаўрэнцьевіч Юстаў, вучоны-лесавод, які скончыў Пецярбургскі лясны інстытут і працаваў у Сялецкім лясніцтве. Разам з ім пачалі працаваць выкладчыкамі Сяргей Мікалаевіч Сатунін, Васіль Іванавіч Бублікаў, М.С.Нашываева і інш.

С.М.Сатунін нарадзіўся ў 1893 г. у Ніжнім Ноўгарадзе ў мяшчанскай сям'і. Скончыў гімназію (1912), Пецярбургскі лясны інстытут (1916), працаваў памочнікам ляснічага, а з 15 верасня 1916 г. — выкладчыкам Буда-Кашалёўскай ніжэйшай лясной школы. Вышэйшую адукацыю меў і В.І.Бублікаў.

Школу яшчэ дабудоўвалі, а ўжо з'явіліся першыя навучэнцы. Па выніках уступных экзаменаў было прынята 15 чалавек. Тыя, хто паступаў у ніжэйшую лясную школу, павінны былі мець адукацыю не ніжэй двухкласных сельскіх вучылішчаў. У школе акрамя агульнаадукацыйных вывучаліся такія прадметы, як чарчэнне, лесаводства, лясное заканадаўства, справаводства ў канцылярыі лясніцтва, будаўніцтва, паляванне, а таксама Закон Божы. Школа размяшчалася ў лесе. Былі абсталяваны геадэзічны і лясны кабінеты, а бібліятэка мела больш за 400 экзэмпляраў розных кніг. Навучальны працэс пачынаўся 1 лістапада. Класныя тэарэтычныя заняткі працягваліся да 1 мая, з 1 мая да 1 лістапада праводзілася практыка. Курс навучання — 2 гады. Выпускнікі атрымлівалі наступныя спецыяльнасці: наглядчыкі ў лясах, з'ёмшчыкі, чыны лясной аховы. Пасля двух-трох гадоў працы іх прызначалі на пасады лясных кандуктараў і тэхнікаў.

З кастрычніка 1916 г. Буда-Кашалёўскую ніжэйшую школу ўзначальваў Дзмітрый Уладзіміравіч Памяранцаў, таксама вучоны-лесавод з вышэйшай адукацыяй.

У грамадзянскую вайну школа працягвала працаваць, хаця з-за прызыву навучэнцаў на фронт у 1918—1920 гг. выпуску не было.

Працэс пераўтварэння лясной школы ў лясны тэхнікум пачаўся ў 1921 г. 2 лістапада 1921 г. газета «Палеская праўда» паведамляла, што на падрыхтоўчае аддзяленне Буда-Кашалёўскага лясного тэхнікума залічаны 51, а на першы курс

прынята 24 чалавекі. Да пачатку навучальнага года падрамантавалі памяшканне, папоўніўся колькасны састаў выкладчыкаў, час навучання ў тэхнікуме быў падоўжаны на адзін год і склаў тры гады.

Для нармальнага навучальнага працэсу не хапала класных, бытавых памяшканняў, інтэрнатаў. У 1923 г., як аб гэтым паведамляе тлумачальная запіска да справаздачы аб рабоце тэхнікума за 1921—1926 гг., «...ввиду отсутствия надежды на улучшение работы техникум едва не был закрыт и только перенесение его в Гомель спасло положение».

У Гомелі тэхнікум часова размясцілі ў флігелі былога замка князя Паскевіча ў парку імя А.В.Луначарскага. У маі 1924 г. да лясного тэхнікума далучылі Васілевіцкае вучэбна-вопытнае лясніцтва Рэчыцкага павета, а ў 1925 г. тэхнікум «перакінулі» на ст. Васілевічы, куды перавезлі памяшканні са ст. Аўрамаўская і Хойнікі. Тут былі пабудаваны і абсталяваны шэсць навучальных класаў, лабараторыі і кабінеты, у т.л. новы біялагічны кабінет, лесаводства, лясной таксацыі і лесаўладкавання. У Васілевічах тэхнікум дзейнічаў да канца 1927 г. Потым ён зноў быў пераведзены ў Буда-Кашалёва пад назвай «тэхнікум лясной гаспадаркі».

Увесь час «вандраванняў» тэхнікума ў былой лясной школе ў Буда-Кашалёве пад кіраўніцтвам І.Л.Юстава працавала школа перападрыхтоўкі спецыялістаў лясной гаспадаркі. Займалася па 40 чалавек у год. У 1934 г. школа перападрыхтоўкі спецыялістаў была закрыта, а будынак выкарыстоўваўся райвыканкомам, райваенкаматам, нявялікі час тут нават быў дом адпачынку калгаснікаў.

У 1945 г. зноў пачаліся заняткі ў Буда-Кашалёўскім лясным тэхнікуме. Аднаўленне навучальнай установы вялося пад кіраўніцтвам В.С.Арцёменкава. Пасля доўгі час тэхнікум узначальваў С.Е.Жданко. У 1947—1958 гг. тэхнікум выпусціў 1560 тэхнікаў-лесаводаў. З ліку яго выпускнікоў выйшлі такія дзеячы савецкай навукі, як член-карэспандэнт АН БССР, доктар біялагічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР В.К.Саўчанка, доктар біялагічных навук, прафесар В.І.Парфёнаў, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар У.С.Раманаў, дактары біялагічных навук Д.С.Голад, Я.Р.Пятроў, А.І.Русаленка, кандыдаты біялагічных навук М.П.Кавалькоў, Б.С.Марціновіч.

У 1956 г. тэхнікум быў рэарганізаваны ў тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі з двухгадовым тэрмінам навучання. З 1961 г. пачаты прыём па спецыяльнасці «Электрыфікацыя і аўтаматызацыя сельскай гаспадаркі», а з 1960 г. адкрыта завочнае аддзяленне.

Падрыхтоўку спецыялістаў у 1960-70-я гады паспяхова ажыццяўлялі выкладчыкі Г.В.Дзергачоў, П.Р.Лабурдаў, В.П.Гаеў, У.М.Кукрэш, Д.Р.Сердзюкоў, М.Р.Буслаў, Л.М.Вайтовіч, Н.Д.Котава, В.Г.Лабаноўскі, А.У.Шараеў, І.П.Хомчык і інш. Выкладчыкам Я.С.Таборка, Э.А.Гакавой былі прысвоены званні заслужаных настаўнікаў Беларусі.

Новым накірункам у навучанні стала аб'яднанне тэхнікума з саўгасам «Патапаўскі» і ўтварэнне саўгаса-тэхнікума, які з першых дзён узначаліў В.П.Кручкоў.

Аб'яднанне вучэбнай установы з гаспадаркай з'явілася ў некаторай ступені эксперыментам. Цеснае ўзаемадзеянне навукі і практыкі дало некаторыя станоўчыя вынікі.

З мэтай паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў на базе саўгаса-тэхнікума быў створаны Буда-Кашалёўскі аграрна-тэхнічны каледж, які пачаў працаваць з 1 верасня 1991 г. Каледж мае два ўзроўні падрыхтоўкі навучэнцаў па двух спецыяльнасцях — «Механізацыя сельскай гаспадаркі», «Электрыфікацыя і аўтаматызацыя сельскай гаспадаркі». Навучанне на першым узроўні дае магчымасць атрымаць кваліфікацыю тэхніка-механіка і тэхніка-электрыка, на другім — малодшага інжынера-механіка і малодшага інжынера-электрыка.

Другі ўзровень навучання прадугледжвае падрыхтоўку спецыялістаў з паглыбленай сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, што дае магчымасць працягваць вучобу з 4-га курса Беларускага аграрнага тэхнічнага універсітэта.

Каледж у цяперашні час — гэта адна з сучасных сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў сельскагаспадарчага профілю. За перыяд яго існавання падрыхтавана больш за 15 тысяч спецыялістаў сельскагаспадарчай вытворчасці. Вучэбныя заняткі вядуць вопытныя спецыялісты. У каледжы працуе больш за 70 выкладчыкаў, каля 40

лабарантаў, майстроў вытворчага навучання. Значны ўклад у станаўленне ўстановы ўнеслі і працягваюць уносіць яго супрацоўнікі: дырэктар А.М.Вярбіцкі, яго намеснікі В.А.Малашанка, Н.В.Піманенак, выкладчыкі Т.Ц.Раманенка, В.І.Янчанка, С.І.Ткачова, У.Ф.Клішэвіч, В.І.Пятрэнка, М.А.Тарасевіч, А.В.Ханеня, М.П.Хамянкоў, В.І.Фядосава, Я.К.Стругальская, І.Г.Дзергачоў, Ф.І.Целяпун і інш.

Вучэбна-матэрыяльная база каледжа даволі значная: галоўны вучэбны корпус на 540 месцаў, лабараторны корпус, вучэбныя майстэрні, аўтадром, электрапалігон, тры арачныя пабудовы, спартыўны комплекс, чатыры інтэрнаты, сталовая, буфет, магазін, бібліятэка з чытальнай залай, танцавальная зала. Больш за 40 кабінетаў і лабараторый аснашчаны сучасным абсталяваннем, тэхнічнымі сродкамі навучання.

Працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці, тэхнічнай творчасці і прадметныя, розныя спартыўныя секцыі, рэгулярна праводзяцца дыскатэкі. Больш за 10 гадоў хор каледжа носіць званне народнага. У яго ўваходзяць выкладчыкі, рабочыя і служачыя, пенсіянеры, навучэнцы. Вялікай папулярнасцю карыстаецца вакальна-інструментальны ансамбль, якім кіруе А.В.Лукомскі.

У верасні 1998 г. адбылося раздзяленне каледжа з вучэбна-вытворчай гаспадаркай. Зараз каледж самастойная навучальная ўстанова.

В.Л.Лукомскі, Л.А.Дзянісава.

Ахова здароўя

У гады фашысцкага нашэсця поўнасцю былі разбураны медыцынскія ўстановы Буда-Кашалёўскага і Уваравіцкага раёнаў, вывезена абсталяванне і мядінвентар.

Гітлераўцы пакінулі ачагі цяжкіх інфекцыйных захворванняў, якія адбіралі жыццё змучананага вайной, голадам, разрухай насельніцтва.

Пасля вызвалення адраджаліся спаленыя і разбураныя медустановы, камплектаваўся штат медперсаналу. Але толькі ў 1965 г. ложка-месцаў для хворых стала на 55 больш, чым было да вайны.

1 снежня 1965 г. у г.п. Буда-Кашалёва ўведзены ў строй новы тыпавы корпус бальніцы (раней яна размяшчалася ў старым, прыстасаваным будынку ў в. Кашалёва). Тут працавалі амбулаторыя, аддзяленне хуткай дапамогі, дзіцячая кансультацыя, клініка-дыягнастычная лабараторыя, рэнтгенкабінет, скурна-венералагічны, фізіятэрапеўтычны, зубаўрачэбны, назіральны кабінеты, малочная кухня, санітарна-эпідэміялагічны аддзел, лабараторыя, паразіталагічны аддзел, радзільны дом на 20 ложкаў, жаночая кансультацыя, зубапратэзны кабінет і інш.

Уваравіцкая гарпасялковая бальніца на 125 ложкаў таксама мела амбулаторыю, аддзяленне хуткай дапамогі, санэпідэмгрупу, санбаклабараторыю, рэнтгенкабінет і

Буда-Кашалёўская цэнтральная раённая бальніца. 1965 г.

фізіятэрапеўтычны кабінет, клініка-дыягнастычную лабараторыю, скурна-венералагічны, зубаўрачэбны кабінеты, дзіцячую і жаночую кансультацыі, тубкабінет.

У рэгіёне працавалі 4 сельскія ўчастковыя бальніцы (Акцябрская — 35, Чабатовіцкая — 25, Рагінская — 20, Любавінская — 10 ложкаў). Дзейнічалі Недайская ўрачэбная амбулаторыя, 35 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, Івольскі калгасны радзільны дом, дзіцячыя яслі і інш.

Усяго ў 1965 г. у раёне працавала 40 урачоў, 273 медыцынскія работнікі з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

У 1980 г. раённая паліклініка атрымала новы тыпавы будынак, а ў 1983 г. ва Уваравічах пабудаваны новы корпус раённай бальніцы, Акцябрская сельская ўчастковая бальніца была пераведзена ў п. Камунар, а ў п. Акцябр адкрыты фельчарска-акушэрскі пункт.

Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС у 1986 г. у раён перасялена больш за 2000 чалавек. Спатрэбіліся спецыяльныя ўстановы для медыцынскага забеспячэння насельніцтва, якое пацярпела ад катастрофы. Былі ўкамплектаваны неабходным абсталяваннем, прыборамі сучаснай дыягностыкі і медперсаналам кабінеты спецдыспансерызацыі, ультрагукавога і эндаскапічнага даследаванняў і г.д.

Чарнобыльская аварыя змяніла медыцынскую сітуацыю ў раёне. Агульная колькасць жыхароў у 1999 г. у параўнанні з 1986 г. зменшылася на 12,3%. Амаль удвая знізілася нараджальнасць. Агульная смяротнасць у 1986 г. складала 13,9%, у 1990 — 16,5%, у 1995 — 19,3%, а ў 1998 г. — 19,6%.

Назіраецца рост захворванняў органаў кровазвароту, дыхання, стрававання, злаякаснымі новаўтварэннямі, у т.л. шчытападобнай залозы ў дзяцей. У 1985—



Рагінская сельская ўчастковая бальніца. Пачатак 1960-х гг.

Будынак Губіцкага фельчарска-акушэрскага пункта. 1998 г.

Сярэдні медперсанал раённай бальніцы. Здымак 1990-х гг.

1993 гг. было 47 выпадкаў захворванняў туберкулёзам. Яшчэ ў 1996 г. 25% насельніцтва заставалася неахопленым флюараграфіяй. У раёне было ўсяго 2 стацыянарныя флюараграфічныя ўстаноўкі. Па стане на 1999 г. праблема флюараабследавання была поўнасцю вырашана.

Сёння, як ніколі ў мінулым, галоўны клопат медыкаў накіраваны на пашырэнне кантролю за станам здароўя насельніцтва і прынящце мер прафілактыкі захворванняў. Менавіта з гэтай мэтай па тыпавых праектах пабудавана 19 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, пашырана Шырокаўская сельская амбулаторыя і інш. У райцэнтры ўведзены акушэрска-гінекалагічны комплекс. Тут устаноўлены сучасныя апараты ультрагукавога даследавання, якія падарылі райбальніцы калегі з Ніжняй Саксоніі.

Значна папоўніліся медыцынскім абсталяваннем медустановы, набыта апаратура для вымярэння доз набірання радыенуклідаў, рэнтгенаўскі комплекс і іншае сучаснае абсталяванне.

У 1996 г. уведзена ў эксплуатацыю 1-я чарга новага бальнічнага комплексу Буда-Кашалёўскай цэнтральнай раённай бальніцы: патолагаанатамічнае аддзяленне, харчаблок, аддзяленне хуткай дапамогі, радзільнае аддзяленне, інфекцыйны корпус на 20 ложкаў.

Разгорнута будаўніцтва новага сучаснага корпуса, дзе будуць размешчаны тэрапеўтычнае і хірургічнае аддзяленні, рэанімацыя і неўралогія, аперацыйны блок і клінічная лабараторыя, ЦСО, аддзяленні рэнтгенадыягнастычнае і фізіятэрапеўтычнае з водалячэбніцай.

Штогод медустановы аказваюць стацыянарную дапамогу 11,5 тыс. хворых. У жніўні 1999 г. у в. Чабатовічы адкрыта сельская ўчастковая бальніца на 15 ложкаў сацыяльнай дапамогі, у паліклініках і амбулаторыях абслугоўваюцца 252 тыс. наведвальнікаў у год.

На варце аховы здароўя працуюць 69 урачоў, 290 работнікаў сярэдняга медыцынскага персаналу. Сфарміраваўся высокакваліфікаваны калектыў медыцынскага персаналу раёна: заслужанымі ўрачамі БССР сталі Вольга Акімаўна Гаўрыленка і Галіна Георгіеўна Часнакова, больш за 10 медработнікаў узнагароджаны знакам «Выдатнік аховы здароўя БССР».

А.І.Ядранцаў.

На варце законнасці і правапарадку

З гісторыі буда-кашалёўскай міліцыі

Першыя мясцовыя паліцэйскія органы, якія здзяйснялі «надзор за внешним порядком» і «контроль за самовольными перемещениями населения» на тэрыторыі Буда-Кашалёўшчыны, створаны ў 1775 г. у ходзе рэформ адміністрацыйна-тэрытары-

яльнага падзелу і сістэмы дзяржаўнага кіравання, якія праводзіла імператрыца Кацярына II у Расіі. На сучаснай тэрыторыі раёна было створана 7 так званых ключоў на чале з войтамі, выбранымі «из людей средних лет, но честных и зажиточных» з асяроддзя землеўладальнікаў ці іх аканомаў. Войтам падпарадкоўваліся сотнікі і дзесятнікі, якія выбіраліся сялянскім мірам «из добрых и незазорных селян». З часам соцкія і дзесяцкія ператварыліся ў служачых і рассыльных чыноўнікаў паліцыі.

У 1830-я гады рост насельніцтва і сялянскіх хваляванняў выклікаў неабходнасць дзялення паліцэйскай сістэмы на больш дробныя адзінкі — станы. Станавое праўленне складалася з прыстава, якога прызначаў губернатар, пісьмавадзіцеля і чыноўнікаў канцылярыі. Пры станах знаходзіліся і земскія суды. Станавы прыстаў абапіраўся на сельскую выбарную паліцыю — соцкіх і дзесяцкіх, і на вотчынную паліцыю памешчыкаў. Цэнтрам кожнага стана было вялікае сяло, мястэчка ці заштатны горад. Буда-Кашалёўшчына (у цяперашнім складзе) падзялася на 7 станаў. Кватэра станавога прыстава знаходзілася ва Уваравічах.

У 1862 г. былі створаны павятовыя паліцэйскія ўправы, а з 1878 г. уведзена пасада памочніка станавога прыстава — паліцэйскага ўрадніка.

Ураднік павінен быў «охранять общественное спокойствие и следить за проявлением каких бы то ни было действий и толков, направленных против правительства: чтобы не распространялись среди народа злонамеренные суждения и слухи, чтобы не распространялись запрещенные листки, книги, издания». Абавязкі ўрадніка былі вельмі шматлікія — ад назірання за «благочинием» у час малення да кантролю за продажам віна. Таму і ўлада яго над шырокімі масамі сялянства была бязмежная. У 1903 г. пры станавых прыставах і паліцэйскіх урадніках была створана павятовая паліцэйская стража, якая складала ўзброеную апору станавых прыставаў і ўраднікаў. Паліцэйскія ўраднікі знаходзіліся ў Кашалёве, Уваравічах, Дуравічах.

У лютым 1917 г. Часовы камітэт Дзяржаўнай думы ўжо ў першыя часы рэвалюцыі даручыў арганізаваць міліцыю, якая атрымала назву «народная міліцыя».

4 сакавіка 1917 г. Часовы ўрад усклаў абавязкі павятовых ураднікаў на старшынь павятовых земскіх упраў. Функцыі паліцыі ў мястэчках і паселішчах былі перададзены земскай управе.

Валасным старшыням паветаў даручалася арганізаваць пад сваёй апекай земскую варту, а ў паселішчах — са складу вясковых стараст, соцкіх і дзесяцкіх. Служба ў міліцыі лічылася грамадскай і ганаровай. Кадравыя міліцыянеры атрымлівалі забеспячэнне ад мясцовых органаў улады. Міліцыянеру ўручалася пасведчанне, нумар, зброя, вонкавы адметны знак.

Узначальваў міліцэйскі ўчастак камісар міліцыі, у якога было два памочнікі. Апаратыўная дзейнасць міліцыі жорстка кантралявалася мясцовымі ўладамі. Вобыскі квартэр, выемкі і арышты выконваліся толькі па пісьмовых распараджэннях судовых улад.

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. зацвердзіла ў краіне Савецкую ўладу. Паводле пастановы Саўнаркома ад 28 кастрычніка 1917 г. «Аб рабочай міліцыі» ў ліку іншых сілавых структур была створана і савецкая міліцыя як выканаўчы орган мясцовых Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Першапачаткова на месцах міліцыя будавалася на аснове поўнай дэцэнтралізацыі. Пастанова не вызначала структуру і прававое поле дзейнасці міліцыі. Мясцовым органам улады давалася поўная свабода будовы яе апарата.

Да канца снежня 1917 г. на Буда-Кашалёўшчыне старая «народная міліцыя» была распушчана. У вёсках дзейнічалі групы сялянскай самаабароны, у валасцях меліся па два пешыя і адзін конны міліцыянеры. У інструкцыі «Аб валасных міліцыянерах» Уваравіцкай воласці 34 пункты вызначалі функцыянальныя абавязкі ўчастковых (старшых) міліцыянераў. Ва ўмовах грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі вясковая буржуазія была пагалоўна ўзброена. Заможныя сяляне не жадалі здаваць зброю і ўпарта хавалі яе.

Распаўсюджванню бандытызму садзейнічала прыфрантавое становішча Буда-Кашалёўшчыны. На яе тэрыторыю прабіраліся банды «зялёных», у склад якіх уваходзілі белагвардзейцы, дэзерціры, шмат крымінальных злачынцаў. Бандыты займаліся разбоем на дарогах, вызначаліся бязлітаснасцю, вялі агітацыю супраць мабілізацыі ў Чырвоную армію (Нацыянальны

архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 20. Л. 10).

Міліцыя дзейнічала супраць бандытаў сумесна з атрадамі войскаў унутранай аховы і надзвычайнай камісіі. Дзеля ўзмацнення барацьбы з бандытызмам у красавіку 1920 г. ва ўсіх паветах Гомельшчыны былі вызначаны аператыўныя раёны дзейнасці рэвалюцыйных сіл, створаны рэвалюцыйныя трыбуналы (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 37. Л. 32).

Пасля часовага зацішша з восені 1920 г. бандытызм зноў шырока ахапіў левабярэжжа Дняпра, уключаючы і тэрыторыю Буда-Кашалёўшчыны. Эсэра-меншавіцкім элементам удалося справакаваць забастоўку часткі працоўных шкляных і лесапільных заводаў на Буда-Кашалёўшчыне (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 102. Воп. 1. Спр. 1. Л. 76). На тэрыторыю раёна праходзілі добра ўзброеныя атрады буйных бандыцкіх фарміраванняў Галака і Булак-Балаховіча. У раёне абвастрылася становішча і ў сувязі з масавай дэмабілізацыяй з Чырвонай арміі. Вяртаючыся на радзіму, былыя чырвонаармейцы і камандзіры не знаходзілі сабе работы. Некаторыя з іх папаўнялі рады бандытаў.

Бандыты раздавалі заможным сялянам частку нарабаванай маёмасці, тым самым выклікалі да сябе спачуванне і падтрымку. Яны нападалі на будынкі мясцовых Саветаў, спальвалі дакументы выканкомаў, рабавалі касы, раззбройвалі байцоў харчатрадаў і міліцыі, рабавалі насельніцтва, учынялі пагромы.

Сумеснымі намаганнямі мясцовай міліцыі і ўзброеных атрадаў самаабароны банды на тэрыторыі раёна былі ліквідаваны. Аднак барацьба з бандытызмам не сціхала. У канцы 1921 г. змяніўся толькі яе характар. Цяпер працоўнае сялянства ў сваёй большасці адносілася да бандытаў з варожасцю. Бандыцкія налёты на воласці Буда-Кашалёўшчыны не спыняліся. «Бандитизм притаился, — адзначалася ў аператыўных міліцэйскіх данясеннях, — но есть все основания полагать, что к весне он снова усилится» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 390. Воп. 1. Спр. 872. Л. 3).

Каб выправіць сітуацыю, 12 студзеня 1922 г. Гомельскі губвыканком аб'явіў, што з 1 да 10 лютага 1922 г. бандытам і дэзерцірам даецца магчымасць добраахвотна здацца. Аднак чаканага эфекту гэта не дало.

25 кастрычніка 1925 г. бандыты ўчынілі пажар у саўгасе «Цярэнічы» Уваравіцкай воласці. Была спалена жывёла, больш за 1600 пудоў сена, іншая маёмасць. Агульныя страты склалі больш за 3000 руб. Прынятымі мерамі міліцыя ліквідавала некалькі ўзброеных атрадаў бандытаў.

Ва ўмовах НЭПа міліцыя правярала наяўнасць правоў на патэнтаваны гандаль спіртнымі напіткамі ў ларках і станцыйных буфетах, дапамагала фінансавым органам сачыць за выплатай сельгаспадатку, кантралявала стан грамадскіх месц. Сялянства меркавала аб дзейнасці мясцовай улады па рабоце нізавых савецкага і міліцэйскага апаратаў. Міліцыя была апорай насельніцтва ў будаўніцтве новага ладу жыцця.

У 1925 г. Заходняе абласное выдавецтва выпусціла брашуру «Деревня и наши недостатки». У раздзеле «Милиция и суд» падкрэслівалася, што «... работоспособность милицейских органов в волостях обуславливается подбором достаточного штата работников, хорошим их составом и местными условиями... Достаточно, чтобы милиция не работала в контакте с сельсоветами, и вся ее работа будет сильно страдать».

Сапраўды, было шмат такога, калі паміж міліцыяй і валвыканкомамі не было даверу і ўзгодненасці. Гэта тлумачылася не толькі адсутнасцю падрыхтаваных кадраў, але і перажыткамі мінулага, калі ўладныя органы лічылі, што з сялянамі інакш, як з пазіцыі сілы, размаўляць нельга.

Сур'ёзным недахопам у рабоце міліцыі была непавага да грамадзян, адміністрацыйныя самавольствы. Жыццё патрабавала наладжваць цесныя кантакты з насельніцтвам, пазбягаць канфліктных сітуацый, не «рубіць з пляча», асцярожна адносіцца да прадпрымальнікаў і г.д.

Асабліва далікатнымі былі адносіны да царквы і вернікаў. Па стане на 1 кастрычніка 1925 г. ва Уваравіцкай воласці дзейнічалі самыя розныя аб'яднанні вернікаў. У м. Уваравічы меліся праваслаўны малітоўны дом (святар К.С.Ляплінскі, псаломшчык І.Я.Рэпчанкоў), яўрэйскі малітоўны дом, у в. Рудзянец — Успенскі малітоўны дом новацаркоўнага напрамку (святар С.П.Валатоўскі). Дзейнічалі таксама Цярэніцкі малітоўны дом (святар Дз.Дз.Бутама), Целя-

шоўскі малітоўны дом (святар І.Я.Слайчэўскі), Чабатовіцкі малітоўны дом (святар В.П.Валатоўскі), Івольскі малітоўны дом (святар М.Ф.Трусевіч), Чарнянскі малітоўны дом (святар М.В.Каржэўскі), Глазаўскі малітоўны дом (святар М.Барсукоў), Стара-Беліцкі малітоўны дом (святар А.Дубянскі), Рудзянецкая служба евангельскіх хрысціян (прэсвітэр Ф.Д.Макаранка), Пыцькаўская служба евангельскіх хрысціян (прэсвітэр Дз.С.Данілаў) (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 789. Воп. 1. Спр. 13. Л. 1—5).

Ад міліцыі патрабавалася пазбягаць дзеянняў, зневажаючых рэлігійныя пачуцці вернікаў, праверак маёмасці, вобыскаў, арыштаў у час малітоўных сходаў, рэлігійных абрадаў. Закрываць цэрквы рэкамендавалася толькі на падставе ўжо атрыманых пастаноў прэзідыума губвыканкома.

Сялян абурала тое, што міліцэйскія органы слаба каралі канякрадаў і закаранелых крымінальных злачынцаў.

Злавіўшы злачынцу, гаспадар патрабаваў самасуда. Міліцыя гэтага не дапускала, абяцаючы, што дзяржаўная ўлада пакарае злодзея па законе. Часта датэрмінова выпускалі канякрадаў, а яны, вярнуўшыся, зноў прымаліся за свае справы, а то і распраўляліся з тымі, хто выдаваў іх у рукі правасуддзя.

Гучалі патрабаванні высяляць за межы воласці зладзееў-рэцыдывістаў, канякрадаў, бандытаў і членаў іх сем'яў, калі апошнія садзейнічалі злачынцам.

У 1926 г. быў уведзены «Дысцыплінарны статут Рабоча-сялянскай міліцыі». Міліцыянеры карысталіся ўсімі правамі, што даваў Кодэкс Закона аб працы. У той жа час служба не выключала работы ў начныя часы, выканання службовых абавязкаў, звязаных з небяспекай для жыцця.

Асаблівая ўвага органаў міліцыі ўдзялялася барацьбе з кантрабандай тавараў, самагонаварэннем. У раёне у 1924—1927 гг. у тры разы знізілася вытворчасць самагона на продаж.

У адпаведнасці з пастановай УЦВК і СНК СССР ад 6 снежня 1926 г. Гомельская губерня была скасавана, а 8 снежня 1926 г. Рэчыцкі і Гомельскі паветы з г. Гомелем, дзе пражывала пераважна беларускае насельніцтва, былі далучаны да Беларусі. Рэарганізаваны былыя губернскі і Гомельскі паветовы адміністрацыйныя аддзелы. На падставе пастановы пленума губернскага выканкома ад 31 снежня 1926 г. і акруговага выканаўчага камітэта ад 2 студзеня 1927 г. апараты міліцыі і вышуку Гомельскага губернскага і павятовага выканаўчых камітэтаў былі рэарганізаваны ў адміністрацыйны аддзел Гомельскага акрвыканкома з непасрэдным яму падначальваннем 1-га і 2-га гарадскіх аддзяленняў міліцыі, аддзелаў ведамаснай міліцыі Уваравіцкага, Добрушскага, Веткаўскага, Насовіцкага, Свяцілавіцкага, Чачэрскага, Гомельскага, Краснабудскага, Дзятлавіцкага раёнаў.

Воласці перайменаваны ў раёны. У раёнах створаны аддзелы міліцыі і крымінальнага вышуку.

Усе законы БССР, зацверджаныя ўрадам БССР не пазней 1926 г., якія не ўступілі ў дзеянне на тэрыторыі Беларусі ў 1926 г., пасля 31 снежня 1926 г. набылі сілу на тэрыторыі былых Гомельскага і Рэчыцкага паветаў (на аснове асобных у кожным выпадку пастаноў заканадаўчых органаў БССР). Такім чынам прававая заканадаўчая база, на падставе якой дзейнічалі мясцовыя органы міліцыі, была прыведзена ў адпаведнасць з прававым полем БССР.

Фінансаванне створаных органаў ажыццяўлялася за кошт мясцовага бюджэту. Заработная плата малодшых міліцыянераў складала ў 1924 г. — 16 руб. у месяц, у 1925 г. — 21 руб. 60 кап., у 1926 г. — 28 руб., у 1927 г. — 32 руб. Яна забяспечвала толькі вельмі сціплы ўзровень жыцця. Напружаная крымінагенная абстаноўка патрабавала поўнай аддачы сіл, ведаў, умення, а неабмежаваны працоўны дзень і адсутнасць транспартных сродкаў пры абслугоўванні значных тэрыторый рабілі міліцэйскую службу вельмі небяспечнай.

Уваравіцкі райаддзел міліцыі размяшчаўся ў будынку райвыканкома, займаў два пакоі. Тэлефона не было. Для сувязі выкарыстоўваўся тэлефон райвыканкома. Меўся інтэрнат для супрацоўнікаў (пакой на 6 коек у доме недалёка ад будынка райвыканкома). У распараджэнні райаддзела міліцыі было 6 коней.

Паводле штатнага раскладу райміліцыя ўключала: начальніка, памочніка, старшага агента крымінальнага вышуку, 5 старшых участковых міліцыянераў і справавода. Са зброі мелася 5 вінтовак і 8 рэвальвераў. Райаддзел міліцыі абслугоўваў 5 участкаў:

1-ы ўчастак — 7 сельсаветаў з насельніцтвам 13 708 чал. (участковы — малодшы міліцыянер Матушын);

2-і ўчастак — 3 сельсаветы з насельніцтвам 8548 чал. (участковы — старшы міліцыянер Казей, у органах з 1923 г., ва Уваравіцкім раёне з 1926 г.);

3-і ўчастак — 3 сельсаветы з насельніцтвам 6616 чал. (участковы — старшы міліцыянер І.М.Грамыка, у органах з 1919 г., ва Уваравіцкім раёне з 1924 г.);

4-ы ўчастак — 5 сельсаветаў з насельніцтвам 16 542 чал. (участковы — старшы міліцыянер Старавойтаў, у органах з 1925 г., ва Уваравіцкім раёне з кастрычніка 1926 г.);

5-ы ўчастак — 3 сельсаветы з насельніцтвам 7370 чал. (участковы — старшы міліцыянер Слайчэўскі, у органах з 1920 г., ва Уваравіцкім раёне — з 1926 г. (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 161. Воп. 1. Спр. 180. Л. 6—9, 16).

Кваліфікацыя работнікаў міліцыі была невысокая. Практычна каля 63% штатнага саставу мелі стаж работы ў міліцыі ад 6 месяцаў да 1 года. Так, старшы агент крымінальнага вышуку Уваравіцкага раёна Лапаценка ў органах міліцыі працаваў з 1922 г., але з вышуковай работай быў мала знаёмы.

На 1 студзеня 1927 г. ва Уваравіцкім раёне на аднаго міліцыянера прыходзілася 164 кв. км плошчы, 7000 жыхароў. Пры гэтым у штаце раённай міліцыі працавала 9 супрацоўнікаў, якія абслугоўвалі 7 тэрытарыяльных участкаў, мелася 5 коней (па штату прадугледжвалася 8).

У 1926 г. для ўзнагароды супрацоўнікаў быў уведзены знак «Выдатны міліцыянер», а ў 1927 г. у гонар дзесяцігоддзя савецкай міліцыі — знак «Ганаровы міліцыянер». У ліку першых у Беларусі гэтай узнагародай быў адзначаны старшы міліцыянер Уваравіцкай райміліцыі Іван Мацвеевіч Грамыка, якому быў уручаны гэты знак за № 12.

Уваравіцкі раён займаў 2-е месца ў акрузе па колькасці злачынстваў і пры гэтым меў апошняе месца па іх раскрыцці (52%). З 489 зарэгістраваных у Гомельскім акруговым крымінальным вышуку злачынцаў-рэцыдывістаў 95 дзейнічалі ва Уваравіцкім раёне (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 161. Воп. 1. Спр. 20. Л. 4—5, 24, 27, 63).

У другой палове 1920-х гадоў абвастрылася гаспадарчае становішча, а ў канцы 1927 г. узнік востры крызіс збожжанарыхтовак. На міліцыю быў ускладзены кантроль за нарыхтоўкай хлеба.

З вясны 1928 г. прымяняліся жорсткія надзвычайныя меры, ішоў планамерны злом НЭПа як сістэмы эканамічных адносін.

Пад ціскам непасільных заданняў па збожжанарыхтоўках улады ажжыццяўлялі павальныя вобыскі і арышты, каб такімі прымусовымі мерамі, любой цаной выканаць даведзеныя раёну зверху паказчыкі.

Міліцыя праводзіла вобыскі ў сялянскіх дварах, прыцягвала да суда ўладальнікаў хлебных лішкаў. Часам такімі лішкамі аб'яўляліся вельмі ўмераныя запасы хлеба ў серадняцкіх гаспадарках. Суды аўтаматычна выносілі рашэнні аб канфіскацыі як таварных лішкаў, так і запасаў, неабходных сялянскай гаспадарцы для спажывання і ўзнаўлення. Супраць «злосных сабатажнікаў» шырока прымяняўся 72 артыкул Крымінальнага кодэкса — за антысавецкую агітацыю. Такая і падобныя фармулёўкі шэрагу артыкулаў Крымінальнага кодэкса вызначалі сутнасць правіннасці тых, хто, напрыклад, не прадаваў дзяржаве зерне па цвёрдых цэнах. А пакараннем было пазбаўленне свабоды ад 3 да 5 гадоў з поўнай ці частковай канфіскацыяй маёмасці, з высяленнем у Паўночны край ці Сібір. У выкананні такіх прыгавораў удзельнічала міліцыя.

І хоць міліцыя, як выканаўчы орган улады, ажыццяўляючы рашэнні суда, дзейнічала ў адпаведнасці з існуючымі законамі, яна аказвалася ўцягнутай ва ўсе парушэнні правоў чалавека, самавольства і гвалт, што, натуральна, выклікала адкрытыя пратэсты насельніцтва. У вёсцы абвастрылася класавая барацьба. Пачасціліся тэрарыстычныя акты, падпалы, праявы бандытызму.

За 1928 г. ва Уваравіцкім раёне было зарэгістравана 781 злачынства (па 16,7 на 1000 жыхароў). Раскрыта было 68,1%. У Буда-Кашалёўскім раёне — 610 злачынстваў (па 16,9 на 1000 жыхароў). Раскрыта — 82,8% (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 161. Воп. 1. Спр. 166. Л. 93—94).

Уяўляе інтарэс характар злачынстваў, працэнт іх раскрыцця ва Уваравіцкім і Буда-Кашалёўскім раёнах за 1928 г.:

Састаў злачынстваў	Буда-Кашалёўскі р-н: % раскрытых	Уваравіцкі р-н: % раскрытых
Рабаванні	100,0	54,5
Канакрадства	40,0	30,0
Кватэрныя крадзяжы	60,8	46,0
Крадзяжы	58,8	38,6
Падпальванні	57,1	22,2
Забойствы	100,0	66,7
Самагонакурэнне	99,4	100,0
Хуліганства	84,3	76,3
Парушэнні парадку	92,7	83,6
Службовыя злачынствы	75,0	52,5

(Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 161. Воп. 1. Спр. 166. Л. 95—96).

Калі да 1928 г. прычынай большасці злачынстваў была эканамічная аснова, эканамічныя цяжкасці, то з 1928 г. рос класавы характар злачыннасці. Патрабавалася ўмацаванне мер абароны працоўнага насельніцтва ад замаху злачынцаў на правы і ўласнасць народа і дзяржавы. У рабоце міліцыі ўсё часцей даводзілася сустракацца з адкрытым недаверам савецкай уладзе.

Час уносіў змены ў аналіз злачынстваў, іх класіфікацыю. Так, у розныя гады да злачынстваў адносілі самагонакурэнне. На працягу доўгіх гадоў яно заставалася масавай з'явай. Самагоншчыкі кваліфікаваліся як злачынцы. Прычыны масавага самагонакурэння былі добра вядомы, і яны ў асноўным мелі шматвяковыя традыцыі, тлумачыліся нізкай культурай, умовамі жыцця і быту, як і, звязаныя з імі п'янства, хуліганства, бойкі.

Характар злачынстваў залежаў і ад геаграфічных асаблівасцей рэгіёнаў. У гарадах, напрыклад, пераважалі крадзяжы, махлярствы, хуліганства, у вёсках — канакрадства, падпальванні. На дынаміку злачыннасці ўплывалі цэны на хлеб, прадукты першай неабходнасці. Перабоі ў забеспячэнні хлебам вызначалі павелічэнне і спад злачыннасці. Так, завоз зерня ў 1928/29 г. супраць 1927/28 г. скараціўся ў два разы, цэны на хлеб узраслі амаль у 2,7 раза. Рэзка ўзрасла злачыннасць.

У канцы 1920-х — 1930-я гады ў краіне ажыццяўлялася калектывізацыя сельскай гаспадаркі і індустрыялізацыя краіны. Савецкая ўлада перайшла да ліквідацыі кулацтва як класа. На Буда-Кашалёўшчыне масавае раскулачванне пачалося ў лютым 1930 г. У большасці выпадкаў яно праводзілася адміністрацыйнымі мерамі з удзелам надзвычайных органаў і міліцыі. Арганізоўваліся дружыны, якія сумесна з міліцыяй уключаліся ў барацьбу з хуліганствам. У Буда-Кашалёўскім і Уваравіцкім раёнах дзейнічалі камісіі і ячэйкі садзейнічання міліцыі.

Работнікі міліцыі, у сваю чаргу, праводзілі ў хатах-чытальнях гучныя чыткі, тлумачылі рашэнні, пастановы і распараджэнні па ўмацаванні законнасці, расказвалі пра працу органаў міліцыі.

Гэта быў надзвычай цяжкі час. Значная частка сялянства актыўна супрацоўлялася калектывізацыі, і ў лік важнейшых абавязкаў міліцыі ўваходзілі ахова грамадскага парадку, дзяржаўнай і грамадскай маёмасці, асабістай бяспекі грамадзян, барацьба з бандытызмам і іншымі небяспечнымі злачынствамі, забеспячэнне правядзення ў жыццё дэкрэтаў, законаў, пастаноў цэнтральных і мясцовых органаў улады.

Частка заможнага сялянства, тая, што ўжо страціла надзею, стала на шлях узброенага бандытызму і тэрору. Ва Уваравіцкім раёне на Андрэеўскіх хутарах банда Дзегцярова пры затрыманні аказала ўзброенае супраціўленне. У баі быў паранены начальнік міліцыі, забіты два бандыты, астатнія затрыманы.

Калектывізацыя вымушала міліцыю змяніць тактыку дзейнасці, знаходзіць новыя формы работы, праяўляць большую гібкасць, умела выкарыстоўваць як меры прымусу, так і выхавання. Трэба было знайсці падыход да людзей, каб, абапіраючыся на іх дапамогу і падтрымку, забяспечыць грамадскі парадак. Асабовы састаў аддзела міліцыі непасрэдна ўдзельнічаў у калгасных кампаніях па зборы ўраджаю, на сенажаці, іншых сельгасработах.

У верасні 1930 г. Гомельская акруга, як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, была скасавана, да сярэдзіны снежня завяршылася перафарміраванне раённых і мясцовых органаў улады, у тым ліку і міліцыі.

УЦВК і СНК СССР прынялі шэраг пастаноў па паляпшэнні матэрыяльнага становішча і быту міліцыянераў. Заработная плата страявога саставу міліцыі была павялічана ў два разы.

15 снежня 1930 г. пастановай ЦВК і СНК СССР быў скасаваны Народны ка-

місарыят унутраных спраў. Арганізавана адзінае Упраўленне міліцыі і крымінальнага вышуку з непасрэдным падпарадкаваннем яго Савету Народных Камісараў рэспублікі. У 1931 г. пры абласных упраўленнях міліцыі дзейнічалі палітаддзелы. Значна палепшылася палітыка-выхаваўчая і культурна-масавая работа ў падраздзяленнях міліцыі. Павысілася дысцыпліна і актыўнасць супрацоўнікаў. Палепшылася работа па ўмацаванні законнасці і правапарадку. Пашырыліся сувязі з насельніцтвам.

25 мая 1931 г. прынята новае палажэнне аб рабоча-сялянскай міліцыі. Яна была заклікана выконваць нагляд за ажыццяўленнем законаў і пастаноў цэнтральных і мясцовых органаў улады, весці барацьбу са злачыннасцю, абараняць дзяржаўную і грамадскую маёмасць, асабістую бяспеку грамадзян і іх набыткі. Міліцыі дазвалялася расследаваць крымінальныя справы, арыштоўваць падазроных, праводзіць вышук, выемкі, затрымліваць парушальнікаў грамадскага парадку. Міліцыянеры мелі права прымяняць зброю ў выпадках, прадугледжаных статутам службы рабоча-сялянскай міліцыі. Была ўведзена адзіная форма адзення. Упершыню ўводзіўся двухгадовы тэрмін службы ў радах міліцыі. Усё гэта значна ўмацавала яе.

Пасля выхаду ў 1932 г. пастановы ўрада аб арганізацыі брыгад садзейнічання міліцыі, у раёне было створана 38 брыгад (300 чалавек), з якіх 36 — у калгасах. Актыўна дзейнічала Рагінская брыгада (кіраўнік — Кірыла Новікаў).

Гэтыя брыгады ўдзельнічалі ў абходах па выяўленні злачынцаў, правядзенні вобыскаў, канваіраванні арыштаваных, неслі паставую службу, сачылі за парадкам у грамадскіх месцах.

У пачатку другой пяцігодкі быў узяты курс на ўмацаванне калгаснага руху. Аднак вырашэнне гэтай задачы стала цяжкай справай. Ва Уваравіцкім і Буда-Кашалёўскім раёнах пашырыўся бандытызм.

У Губіцкім сельсавеце ў 1933 г. была ліквідавана банда Антона Сакалова, якая складалася з 24 чалавек. Пры ліквідацыі былі забіты два бандыты. Ліквідавана банда Сяргея Сінякова ў складзе 3 чалавек. У Недайскім сельсавеце ліквідавана банда Катанава з 8 чалавек, у Буда-Кашалёўскім сельсавеце — банда Мацвея Фядорчанкі з 10 чалавек, а ў Патапаўскім сельсавеце — 3 банды (Зэкава — з 8 чалавек, Зобава — з 6 чалавек, Жураўлёва — з 4 чалавек).

12 кастрычніка 1934 г. у калгасе «Новае жыццё» Недайскага сельсавета праходзіў сход калгаснікаў. Старшыня калгаса Якаўшаўцаў пасля сходу прыйшоў дадому і сеў за стол вячэраць. У гэты час стрэлам праз акно ён быў забіты напавал. У в. Патапаўка ў кастрычніку 1934 г. быў забіты брыгадзір калгаса Жураўлёў. У час правядзення ў калгасе «2-я пяцігодка» Недайскага сельсавета ўрачыстага схода, прысвечанага 17-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі, былі паранены стрэлам з абрэза дзве калгасніцы — Купцова і Шупкова. У Ліпініцкім сельсавеце дзейнічалі банда Аўрама Сарокіна з 4 чалавек, Максіма Дурава — з 3 чалавек, Пятра Загорцава — з 11 чалавек. У 1934 г. ліквідавана банда Івана Дубініна з 3 чалавек. Фёдара Катлярова з 6 чалавек, Дзям'янава і Куралікава — па 2 чалавекі. На працягу 1932—1934 гг. міліцыяй раёна затрымана і нарсудом асуджана 50 выкрадальнікаў жывёлы. Толькі ў 1933 г. міліцыяй канфіскавана: наганаў — 7, паляўнічых стрэльбаў — 32, вінтовачных абрэзаў — 13, вінтовак — 2. У 1934 г. знойдзена і канфіскавана: вінтовачных абрэзаў — 27, вінтовак — 3, рэвальвераў — 21, шашак — 2, паляўнічых стрэльбаў — 16. Раскрыта 2799 крымінальных злачынстваў.

15 ліпеня 1934 г. на падставе пастановы ЦВК БССР у Беларусі быў створаны Народны камісарыят унутраных спраў (НКУС).

Рэспубліканскае ўпраўленне рабоча-сялянскай міліцыі перададзена ад СНК БССР у НКУС рэспублікі, які дзейнічаў на падставе Палажэння аб НКУС СССР.

У падпарадкаванне НКУС перайшлі і папраўча-працоўныя ўстановы. НКУС аб'яднаў органы дзяржаўнай бяспекі і міліцыі, што значна пашырыла сілы, накіраваныя на барацьбу са злачыннасцю.

Аднак спецыфіка задач і грунтоўны вопыт самастойнай работы, асаблівасці прафесійнай падрыхтоўкі кадраў, адрозненне прыёмаў і метадаў практычнай работы не ўзмацнілі, а аслабілі эфектыўнасць работы міліцыі. Варта адзначыць, што ў раёнах органы НКУС і міліцыі за ўвесь даваенны і пасляваенны перыяд так і не сталі адзінай структурай.

Са стварэннем органаў НКУС сур'ёзныя змены адбыліся ў арганізацыі міліцыі. На

падставе пастановы ад 3 сакавіка 1936 г. у складзе міліцыі была створана Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя (ДАІ), а з сакавіка 1937 г. — аддзел па барацьбе з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці (АБКСУ).

Райаддзелы ДАІ вялі барацьбу з аўтааварыямі, ажыццяўлялі кантроль за падрыхтоўкай вадзіцеляў, займаліся распрацоўкамі і ўкараненнем тэхнічных норм эксплуатацыі аўтатранспарту, кантралявалі мабілізацыйную гатоўнасць тэхнікі. У гэтым сэнсе ДАІ ўмацоўвала абароназдольнасць краіны, садзейнічала развіццю народнай гаспадаркі. Не менш значную работу выконвалі і службы АБКСУ, памнажаючы дзяржаўную маёмасць, садзейнічаючы развіццю гандлю і кааперацыі.

1 верасня 1939 г. пачалася Другая сусветная вайна. Фашысцкія войскі ўварваліся ў Польшчу і рухаліся на ўсход да граніц Беларусі і Украіны. Былі прыняты меры па арганізацыйным умацаванні міліцыі. Упор рабіўся на палітычнае выхаванне, агульнавайсковую і прафесійную падрыхтоўку міліцэйскіх кадраў.

9 сакавіка 1941 г. НКУС Беларусі зноў быў раздзелены на два наркаматы: НКУС (Народны камісарыят унутраных спраў) і НКДБ (Народны камісарыят дзяржаўнай бяспекі). Міліцыя засталася ў складзе НКУС.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны міліцыя была зарыентавана на прадухіленне дыверсій, аказанне дастойнага супраціўлення ворагу. Такая падрыхтоўка з'явілася добрай асновай паспяховай барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны на франтах, у падполлі і ў партызанскіх атрадах супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У першыя дні вайны ў Буда-Кашалёўскім і Уваравіцкім райаддзелах міліцыі былі сфарміраваны знішчальныя батальёны і атрады народнага апалчэння. Буда-Кашалёўскі знішчальны батальён, якім камандаваў начальнік райаддзела міліцыі Довалеў, налічваў 310 байцоў, 290 вінтовак, 4 ручныя кулямёты, 30 гранат, 20 тысяч патронаў. Уваравіцкі знішчальны батальён (588 чалавек) узначальваў начальнік мясцовага райаддзела міліцыі Клімянок. На ўзбраенні было 200 вінтовак, 3 ручныя кулямёты, 10 тысяч патронаў. Апалчэнцы ахоўвалі камунікацыі, лініі сувязі, знішчалі варожыя дэсанты, дыверсантаў, выяўлялі правакатараў.

Некаторыя міліцыянеры з Буда-Кашалёўшчыны ў складзе міліцэйскага палка, сфарміраванага ў в. Чонкі, што на Гомельшчыне, актыўна ўдзельнічалі ў абарончых баях пад Гомелем. На Буда-Кашалёўчыне не было такога партызанскага атрада, у якім бы не ваявалі былыя міліцыянеры.

Пасля вызвалення ад акупацыі, з 20 студзеня 1944 г. зноў пачалі дзейнічаць райаддзелы міліцыі.

У 1946 г. у раёне былі брыгады садзейнічання міліцыі, групы грамадскага парадку. Такія групы па 2—3 чалавекі меліся ў кожным населеным пункце.

У 1956 г. райаддзелы міліцыі ўведзены ў склад раённых Саветаў. Міліцыя зноў набыла страчанае ў 1930-я гады двайное падпарадкаванне.

У пасляваенны перыяд кіраўнікамі райаддзела міліцыі, якія ўнеслі значны ўклад у справу захавання законнасці і правапарадку ў раёне, былі: падпалкоўнікі міліцыі Ф.П.Дадычын, Л.М.Шульга, П.П.Шваеў, Ю.А.Гайдаш, А.А.Лапіцкі, У.Л.Воінаў, В.П.Лявонаў.

Супрацоўнікі райаддзела прымалі актыўны ўдзел у ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Сур'ёзныя карэктывы ў практыцы дзейнасці міліцыі звязаны з прыняццем Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 26 лютага 1991 г. Закона аб міліцыі і ўвядзеннем з 1 студзеня 2001 г. новых «Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь», «Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь» і «Крымінальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь», накіраваных на вызваленне міліцыі ад неўласцівых ёй функцый, дэмакратызацыю грамадскага жыцця і прававой дзейнасці.

Асобным напрамкам у барацьбе са злачынствамі стала цесная сувязь з працоўнымі калектывамі, мясцовымі Саветамі. Праводзіцца шматгранная работа па стварэнні грамадскіх фарміраванняў, здольных на справе аказваць дапамогу міліцыі ў барацьбе са злачыннасцю.

У.Я.Райскі, Я.В.Сувалаў.

* * *

МАЛАДЗЁНКАЎ Васіль Мардар'евіч. Нарадзіўся 1.1.1914 г. у в. Тацьева Аленінскага раёна Цвярской вобл., Расія. Служыў у Чырвонай арміі. Курсант Горкаўскай



В.М.Маладзёнкаў.

міжкраявой школы НКУС СССР (1941—1943). Працаваў у органах дзяржаўнай бяспекі Беларусі. З 1949 г. — начальнік Буда-Кашалёўскага раённага аддзялення МДБ. 17.5.1950 г. у в. Гаўлі пры выкананні службовага абавязку загінуў. У краязнаўчым музеі Гаўлеўскай школы ёсць экспанаты, прысвечаныя В.М.Маладзёнкаву.

* * *

З дакументальнай аповесці І.Цітова «Капітан міліцыі»

...Внешне он больше походит на педагога. Рассудительный. Локаничная речь. Открытое, улыбчивое лицо. Густые брови вразлет. Упрямая линия рта. Гладкие черные волосы и чуть подернутые серебром виски.

Участковый инспектор капитан милиции Иванов, — четко, по-армейски представился он... Назову несколько цифр: 30, 28, 5400 и 0...

— Расшифруйте, что это значит?

Можно и расшифровать: 30 — это столько лет я работаю на одном участке, 28 — количество населенных пунктов в Кошелевском и Заболотском сельсоветах, в которых проживает 5400 жителей. Знаю здесь всех, да и меня знает каждый.

— На вашем участке нет ни одного нераскрытого правонарушения.

— Так точно!

...Вспомнилось высказывание министра внутренних дел БССР: «Одним из опытных участковых инспекторов является А.И.Иванов с Гомельщины. Профилактику правонарушений крепко поставил, тесно взаимодействует с общественностью. Энергичный, мужественный. Вот и редки на обслуживаемой им территории преступления. Перенимать его опыт приезжают участковые из других мест...»

...В профессиональном умении Адама Ивановича есть очень много от его жизненного опыта.

— Так случилось, — вспоминает Адам Иванович, — что с детства пришлось познать почем фунт лиха. Еще мне не исполнилось и семи лет, как умер отец. Мать нас, пятерых, поднимала. Я самый младший в семье... После семилетки пошел учиться в ФЗО при спичечной фабрике в Новобелице. В мае 1941-го умерла мать. Это был самый тяжелый удар для всей семьи. С трудом мы оправились от него. Вскоре меня направили в Пензу, на завод. А тут — грянула война. Мне еще и шестнадцати не было...

Работал на заводе подручным... Окончил железнодорожное училище и стал стрелочником на ж.-д. станции Поворино. И все это время рядом находился земляк Виктор Бужевич. Делились с ним всем, чем были богаты. Вспоминали родные края, переживали за родных, попавших под фашистскую оккупацию. Потом стали вместе добиваться, чтобы нас отправили на фронт — в действующую армию. Но на нас, железнодорожников, была бронь. Написали Иосифу Виссарионовичу Сталину и своего добились... Борисоглебский военкомат направил в минометное училище. Через восемь месяцев попал на фронт.

— Минометчиком стал я в самый горячий час, — вспоминает Адам Иванович. — Было это под Харьковом летом 1943-го... Боевое крещение принял под Мерефой.

...Потом Иванов в составе гвардейского стрелкового полка освобождал Полтаву. Форсировал Днепр и Южный Буг. Принимал участие в освобождении Молдавии и Румынии. Отличился в боях на территории Венгрии.

— Под Эстергомом — я уже был заместителем командира пулеметной роты — мы прикрывали огнем с фланга прорыв наших пехотинцев. Враг не выдержал решительного штурма и стал откатываться... Вот тогда и появился у меня на груди орден Красной Звезды.

Отличился лейтенант Иванов и во время кровопролитных боев за Будапешт...

Адама Ивановича наградили орденом Отечественной войны II степени...

После увольнения в запас... жил у старшей сестры Анны и трудился на разных работах. Заведовал молочно-товарной фермой. Потом выдвинули на должность технорука местного кирпичного завода... Летом 1949 г. райком партии рекомендовал на работу в органы милиции...

Так бывший фронтовик, лейтенант запаса Адам Иванович стал участковым инспектором на территории Кошелевского и Дуравичского сельсоветов. В оперативном отношении это был очень сложный участок... Учился на опыте работы товарищей: оперуполномоченного Федора Бабичева, участкового Николая Сильченко...

В районе нагло орудовала шайка Беланова. Кстати, Иванов когда-то вместе учился с ним в одной школе... В годы войны Беланов был полицаем, а после нее стал бандитом. «Почерк» этого садиста отличался изощренным зверством. На лесных дорогах и стежках он грабил, насиловал и зверски убивал ни в чем не повинных людей.

Поединок с бандитом продолжался полгода... С помощью активистов Адам Иванович выследил Беланова... Группу захвата возглавил уполномоченный райотдела МГБ В.М.Молоденок*... Стояла тихая июльская ночь. В деревне Гавли уже пропели первые петухи... Молоденок постучал в окно и потребовал открыть дверь... Минут через десять в сенях щелкнул железный засов, и входная дверь распахнулась настежь. Едва В.Молоденок шагнул в дверной проем, как с чердака резанула автоматная очередь... Участковый Иванов и старшина Моисеенко бросились в сени. Но было поздно. Их боевой товарищ, отважный чекист был мертв... Бандит же, воспользовавшись замешательством, через потайной ход проскользнул в сарай, а оттуда – в лес... Только через два месяца лейтенант милиции А.Иванов вновь напал на след бандита... Беланова окружили со всех сторон и предложили сложить оружие. Но он оказал яростное сопротивление, был убит в перестрелке...

Шли годы. Накапливался свой практический опыт оперативной и профилактически-предупредительной работы, свой стиль творческой деятельности инспектора милиции в сельской местности...

В сферу практической деятельности участкового инспектора Иванова вошли постоянная забота о природе, общественном и личном достоянии граждан. Вся его жизнь была отдана людям и постоянной работе по предупреждению преступлений во всех сферах хозяйственной, семейной, общественной жизни, тех, кому он служил и на кого опирался в своей работе.

Друкуецца паводле кн.: Титов И. Капитан милиции. Мн., 1980.

* * *

«...Обслуживаемый капитаном милиции А.И.Ивановым участок носил высокое звание «Участок образцового общественного порядка», а сам участковый инспектор за безупречную и многолетнюю службу в органах внутренних дел удостоен высшей награды — ордена Ленина...» — так написал В.Ф.Майданюк, заместитель министра внутренних дел БССР, генерал-майор милиции в своем предисловии к документальной повести И.Титова «Капитан милиции».

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Развіццё культуры

Дзень сённяшні

У галіне культуры Буда-Кашалёўскага раёна дзейнічаюць 79 устаноў: раённы Дом культуры, гарадскі Дом культуры, 25 сельскіх дамоў культуры, 9 сельскіх клубаў, Пыцькаўскі клуб-музей народных промыслаў, Губіцкі дом рамёстваў, 2 дзіцячыя музычныя школы (24 выкладчыкі і 180 навучэнцаў), 41 установа цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, у т.л. цэнтральная бібліятэка, 37 яе філіялаў і 3 дзіцячыя бібліятэкі. Бібліятэчны фонд раёна на 1 студзеня 1999 г. складаў 423,2 тыс. кніг, абслугоўвалася больш за 25,2 тыс. чытачоў.

Дзейнічаюць 134 калектывы мастацкай самадзейнасці, у т.л. 62 вакальна-харавыя (з іх 12 дзіцячых), 26 танцавальных (з іх 14 дзіцячых), 44 тэатральна-драматычныя (з іх 17 дзіцячых), 2 інструментальныя (з іх 1 дзіцячы). Усяго ў гуртках мастацкай

* Правільна Молоденков.

самадзейнасці займаецца амаль 2000 удзельнікаў, у т.л. 600 дзяцей.

Установы культуры працуюць па праграме «Спадчына». Асноўная мэта — адраджэнне нацыянальных свят і абрадаў народнага календара, гульняў, рамёстваў. Сталі традыцыйнымі ў раёне святы «Калядкі», «Провады зімы», «Гуканне вясны», «Купалле», «Зажынкі», «Дажынкі» і інш. Карыстаецца поспехам правядзенне свят вёсак раёна. Цікава праходзяць раённыя міні-фестывалі «Грай, гармонік», «Свята ўраджаю» і інш.

Значны ўклад у захаванне спадчыны ўносяць раённыя бібліятэкі. Асноўная мэта — адраджэнне культуры свайго краю, народных традыцый, ушанаванне імён славутых землякоў, выяўленне народных умельцаў і прапаганда іх таленту. Бібліятэкі афармляюць кніжныя выставы па краязнаўстве («Зямля, дзе пачаўся твой лёс», «Я родам з Буда-Кашалёўшчыны», «Мой родны кут»), выставы народнай творчасці («Цуды рук залатых», «Жывуць народныя рамёствы»), праводзяць краязнаўчыя гадзіны («Гістарычныя старонкі вёскі»), падарожжы ў мінулае («Маўклівыя сведкі гісторыі нашай»), знаёмяць прысутных з легендамі і паданнямі роднага краю і інш.

Добра вядомы не толькі ў раёне, але і далёка за яго межамі, фальклорныя і мастацкія калектывы, якія маюць ганаровае званне народнага. Іх у раёне чатыры. Аматары народнага мастацтва часта выступаюць у працоўных калектывах, на фестывалях, у месцах масавага адпачынку і за межамі раёна.

Творча працуюць 64 (у т.л. 29 дзіцячых) аматарскія калектывы, аб'яднанні і клубы па інтарэсах.

В.С.Бяланава.

Бібліятэка: гісторыя, развіццё

У 1946 г. пры раённым аддзеле культуры была створана бібліятэка. У будынку раённага Дома культуры ёй выдзелілі два пакоі. Адзін прыстасавалі для сховішча, у другім размяшчаліся абанемент і чытальная зала. Кніжны фонд, які па адзінках збіралі ў насельніцтва, складаў усяго 6—7 тыс. экзэмпляраў.

Бібліятэка абслугоўвала і дарослых, і дзяцей. У той час у раённай бібліятэцы працавала адна Кастусёва, з 1950 г. яшчэ і Г.А.Кузікава, якая ў 1951 г. узначаліла дзіцячы пакой.

У 1954 г. адбылося раздзяленне бібліятэкі на дарослую і дзіцячую. Дзіцячая перайшла ў новае памяшканне, яе працягвала ўзначальваць Г.А.Кузікава.

Ішлі гады, паступова папаўняўся кніжны фонд; у 1957 г. ён павялічыўся ў два, а ў 1959 г. — амаль у шэсць разоў і складаў 37 тыс. экзэмпляраў. У 1959 г. бібліятэцы стала цесна, ёй выдзелілі новае памяшканне — увесь другі паверх Дома культуры, дзе размясціліся кабінет загадчыцы (часткова службы і кнігасховішчам), кнігасховішча, абанемент і чытальная зала. Загадчыцай была прызначана Марыя Міхайлаўна Прымако, на абанеменце працавала Т.Агіенка, перасовачны пункт узначальвала А.М.Міхалевіч, а бібліятэкарам працавала А.Я.Мяркулава.

Новае памяшканне ў тыя гады было сапраўдным багаццем. На базе бібліятэкі праводзіліся семінары і нарады, праходзілі практыку студэнты бібліятэчных тэхнікумаў, інстытута культуры, культасветвучылішчаў і культустаноў раёна.

Наведванне бібліятэкі ў сярэднім складала 50 чалавек у дзень. Чытальная зала заўсёды была перапоўнена.



Будынак Губіцкага сельскага Дома культуры.

Асаблівым попытам карысталіся газеты, часопісы «Огонек», «Смена», «Вокруг света», «Полымя» і інш. Праводзілася вельмі шмат масавых мерапрыемстваў: літаратурныя вечары, чытацкія канферэнцыі з удзелам лепшых настаўнікаў літаратуры, аўтараў прозы і паэзіі, знакамітых людзей раёна.

У 1950 — 1960-я гг. шмат увагі ўдзялялі прапагандзе палітычнай, тэхнічнай, сельскагаспадарчай літаратуры. Работнікі бібліятэкі выступалі з аглядамі выданняў. Стаў даступным шырокаму колу чытачоў кніжны фонд. Практыкаваліся кансультацыі па падборы літаратуры, даволі шырока выкарыстоўваліся міжбібліятэчныя абанементы (МБА). Кнігі для чытачоў заказваліся праз МБА ў Маскве, Мінску, Ленінградзе, Гомелі і г.д. Чытальнай залай сталі актыўна карыстацца навучэнцы старшых класаў, мясцовага тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі, завочнікі і актывісты раёна.

Працаваў куток культуры чытання. Тут была размешчана метадычная літаратура ў дапамогу чытачам, бібліяграфічныя паказальнікі, водгукі аб кнігах, планы чытання. На старонках раённай газеты публікаваліся звесткі аб новых выданнях і паступленнях літаратуры. І кола чытачоў пашыралася. У 1970 г. абанементам было выдадзена звыш 19 тыс. кніг.

1972 г. быў аб'яўлены Міжнародным годам кнігі, навыкаў чытання і бібліятэк. Да гэтага часу ў раёне дзейнічалі 140 бібліятэк розных сістэм, у якіх налічвалася больш за 590 тыс. экзэмпляраў кніг. Метадычная і практычная дапамога аказвалася сельскім бібліятэкам раёна пастаянна. Менавіта гэта садзейнічала актывізацыі дзейнасці сельскіх бібліятэк. Праводзіліся святы кнігі, сустрэчы з мясцовымі пісьменнікамі, творцамі. Калектывы ўсіх бібліятэк раёна ўдзельнічалі ў завочных чытацкіх канферэнцыях «Кніга ў іх жыцці», «Агнявыя гады».

З 1976 г. у бібліятэках раёна ўмацоўвалася матэрыяльная база, вялася карпатлівая работа па пераходзе на цэнтралізацыю. Новыя памяшканні атрымалі бібліятэкі ў Бацуні, Гаўлях, Глазаўцы, Забалоцці і інш. Створаны алфавітныя каталогі літаратуры.

Раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма дзейнічае з 1976 г. У яе складзе на той час было 56 масавых бібліятэк з кніжным фондам амаль 600 тыс. экзэмпляраў. Павялічылася і колькасць чытачоў (да 32 685 чалавек у 1977 г.).

Асабісты кніжны фонд цэнтральнай бібліятэкі раёна меў 38 тыс. кніг. Працавалі чытальная зала, кнігасховішча рэдкай кнігі, абанемент і інш. Ад цэнтральнай бібліятэкі дзейнічала 16 перасовак, а міжбібліятэчны абанемент абслугоўваў да 700 чытачоў.

Новай формай эфектыўнай работы з чытачамі стаў «Клуб аматараў кнігі», які аб'ядноўваў тых, хто захапляўся паэзіяй. Клуб аматараў паэзіі «Пунцовыя ветразі» аб'ядноўваў старшакласнікаў.

1986 г. Бібліятэка рыхтуецца да засялення двухпавярховага памяшкання. І свята адбылося. Бібліятэка атрымала новы будынак, новае абсталяванне. Але Чарнобыльская трагедыя пакінула сваю чорную адзнаку і на бібліятэчнай сферы дзейнасці. З 1986 г. па 1993 г. ліквідавана 12 бібліятэк. Скарацілася колькасць чытачоў. Кніжны фонд размеркаваны па іншых бібліятэках сістэмы.

Сёння раённая бібліятэчная сістэма ўключае 41 масавую бібліятэку, у т.л. цэнтральную раённую, буда-кашалёўскія гарадскую і раённую дзіцячыя, уваравіцкія гарпасялковую і дзіцячую бібліятэкі.

Асноўныя напрамкі іх дзейнасці — адраджэнне духоўнасці, краязнаўства як асновы захавання нацыянальнай памяці.

Бібліятэка яшчэ і цэнтр зносін паміж людзьмі. Пры Старабудскай бібліятэцы створаны Дом народнай медыцыны (1993), пры Шарыбаўскай — этнаграфічны музей, у Кашалёўскай — краязнаўчы пакой памяці двойчы Героя Савецкага Саюза П.Я.Галавачова, пры Смычкоўскай — пакоі па рыбалоўстве, а пры Уваравіцкай гарпасялковай — куток, прысвечаны народнаму мастаку Я.Я.Майсеенку.

З 1995 г. раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма працуе па праграме «Жывая памяць Буда-Кашалёўшчыны». У рамках гэтай праграмы праводзяцца месячнікі краязнаўства «Жывыя крыніцы», выставы народнай творчасці, конкурсы «Хачу ўсё ведаць».

Ёсць і праблемы. Галоўная — сродкі. Ёсць у бібліятэкі спонсары-мецэнаты. Гэта прадпрыемства «АМІПАК» (генеральны дырэктар М.І.Зянкевіч), калгасы і саўгасы, райінспекцыя прыродных рэсурсаў (начальнік А.Р.Мутакоў) і інш. З іх дапамо-

гай пачаліся работы па аўтаматызацыі вытворчых працэсаў. Устаноўлены камп'ютэр, вядуцца работы па стварэнні электроннага каталога «Спадчына» і інш.

З гадамі склаўся творчы, працавіты калектыў цэнтральнай бібліятэкі, дзе з любоўю адносяцца да сваёй справы. Гэта Т.А.Янкова, А.І.Певень, Н.П.Каротчыкава, Н.Г.Ананнева і інш.

Калектыў мае традыцыі, прафесійны вопыт, энергію і жаданне несці людзям духоўную культуру.

І.М.Ахрэменка.

На плыні падзей

1 кастрычніка 1931 г. выйшаў першы нумар буда-кашалёўскай раённай газеты «Ленінскі шлях». З гэтай даты дзень за днём вядзе яна летапіс жыцця раёна.

У першыя гады свайго існавання яна паслядоўна змагалася за перамогу ў вёсцы новага ўкладу жыцця, за яго перабудову на сацыялістычны лад. Газета была прапагандыстам перадавых метадаў працы, новых прынцыпаў грамадскіх адносін. На яе старонках адлюстраваны важныя гістарычныя падзеі, пафас масавага працоўнага гераізму, энтузіязму ў гады першых пяцігодак, калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны некалькі нумароў газеты выйшлі ў партызанскім атрадзе. Сваім палымяным словам яна натхняла народных мсціўцаў на бязлітасную барацьбу з захопнікамі, мацавала ў сэрцах людзей веру ў перамогу.

Сёння «Авангард» (такую назву газета атрымала ў красавіку 1962 г.), як і раней, імкнецца быць на пульсе жыцця, па-ранейшаму натхняе і мабілізуе працоўныя калектывы на паспяховае вырашэнне задач гаспадарчага, культурнага і сацыяльнага будаўніцтва.

У газеце пастаянныя рубрыкі: «Разгледжана ў райвыканкоме», «Пераможцы спаборніцтва», «У працоўных калектывах», «Трыбуна кіраўніка», «Чалавек і закон», «Маладзёжны мерыдыян», «Экалогія і мы» і многія іншыя.

Газета актыўна адклікаецца на ўсе важнейшыя падзеі ў жыцці раёна. Так, адразу пасля Чарнобыльскай катастрофы была заведзена рубрыка «Чарнобыль — наш боль», якой вось ужо больш за 15 гадоў штомесячна адводзіцца цэлая старонка газетнай плошчы, дзе публікуюцца спецыяльныя матэрыялы. Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы гэтых матэрыялаў прымаў старшыня камісіі па праблемах Чарнобыльскай катастрофы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валянцін Кручкоў.

Ва ўсе гады існавання газеты самымі шматлікімі яе аўтарамі заставаліся рабочыя і сельскія карэспандэнты. Некаторыя з іх выраслі да знакамітых прафесійных журналістаў, сталі пісьменнікамі і паэтамі. Вядомы ў рэспубліцы творы членаў Саюза беларускіх пісьменнікаў Міколы Чарняўскага, Уладзіміра Дзюбы, Аляксея Кейзерава, Таццяны Гарэлікавай, Уладзіміра Бабкова, Анатоля Зэкава, якія рабілі спробу пяра ў нашай раёнцы.

Супрацоўнікі рэдакцыі вельмі ўважліва адносяцца да кожнага пісьма рабселькора. За 1999 г., напрыклад, паступіла ў «Авангард» больш за 600 пісем.

У розныя гады рэдактарамі раённай газеты былі: Уладзімір Львовіч Сідорка, Пётр Фёдаравіч Бозікаў, Мікалай Зосімавіч Дубавец, Міхаіл Міхайлавіч Болсун, Уладзімір Іосіфавіч Кліменка, Валерый Іванавіч Калінічэнка. Апошнія 10 гадоў рэдактарам «Авангарда» з'яўляецца Мікалай Андрэевіч Чэчка. Мяняліся пакаленні прафесійных журналістаў, рабочых і сельскіх карэспандэнтаў. Але заўсёды наша газета з'яўлялася і з'яўляецца калектыўным прапагандыстам, агітатарам і арганізатарам.

М.А.Чэчка.

Буда-Кашалёўшчына спартыўная

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны на Буда-Кашалёўшчыне паспяхова развівалася фізкультурная справа. Спартсмены раёна неаднаразова дабіваліся высокіх паказчыкаў як у масавых відах спорту, камандных першынствах, так і ў асабістых заліках у абласных і нават рэспубліканскіх спаборніцтвах.

Масавая спартыўна-выхаваўчая работа атрымала новы штуршок у пачатку 1950-х

гадоў у сувязі са стварэннем спартыўнага таварыства «Калгаснік». Ужо ў 1951 г. 18 калгасаў і саўгасаў сталі юрыдычнымі членамі гэтага таварыства, колькасць фізкультурнікаў у раёне ўзрасла да 3000 чалавек. У 1950—1960-я гады буда-кашалёўскія спартсмены неаднаразова выйгравалі чэмпіянаты вобласці і спаборніцтвы па футболе, валейболе, лёгкай атлетыцы, лыжных спаборніцтвах, удзельнічалі ў чэмпіянатах і першынствах рэспублікі.

З канца 1950-х па 1980-я гады шмат зрабіў для развіцця фізічнай культуры Марк Іосіфавіч Плоткін. Па яго ініцыятыве і пад яго кіраўніцтвам менавіта ў 1960-я гады ў Буда-Кашалёве метадам народнага будаўніцтва быў узведзены стадыён, дзе праводзіліся круглагадовыя спаборніцтвы па розных відах спорту. Найбольшай папулярнасцю ў жыхароў раёна карысталіся футбол, валейбол, шахматы, шашкі, мнагабор'е, звычайны комплекс ГПА і г. д.

Актыўны ўдзел у развіцці фізічнага выхавання прынялі энтузіясты спартыўнай справы — Дзмітрый Раманавіч Сердзюкоў — выкладчык тэхнікума, Пётр Іосіфавіч Трафімовіч з Камунараўскай сярэдняй школы, заслужаныя трэнеры БССР Рыгор Барысавіч Басін, Алена Віктараўна Кутай і іншыя.



Першынство раёна па шахматах. 1984 г.

Футбольная каманда з Буда-Кашалёва. 1999 г.

Наш зямляк Барыс Мікалаевіч Зайцаў уваходзіў у зборную каманду Беларусі па валейболе, удзельнічаў у спаборніцтвах па праграме Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве (1957). Ён заслужаны трэнер Беларусі, дэкан факультэта фізічнай культуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны.

У канцы 1980 — першай палове 1990-х гадоў сістэматычна спортам займалася больш за 13 тысяч чалавек, у тым ліку ў сельскай мясцовасці каля 10 тысяч.

Сёння ў раёне маецца дастатковая спартыўная база, сетка спартыўных пабудоў і комплексаў. Працуе дзіцяча-юнацкі клуб фізічнай падрыхтоўкі ў Буда-Кашалёве і ў Камунараўскай ДЮСШ па веласпорце. Гэтая школа была створана ў 1985 г. пры прафкоме Гомельскай бройлернай птушкафабрыкі. Падрыхтавана 12 майстроў спорту СССР і Рэспублікі Беларусь. Шэраг выхаванцаў у складзе нацыянальнай зборнай краіны прымалі ўдзел у чэмпіянатах свету і Еўропы. Наталля Пятрова і Наталля Рыкунова ў 1994 г. у Сан-Марына, Алена Маліноўская ў 1996 г. у Швейцарыі, Уладзімір Козін у 1997 г. у Іспаніі сталі прызёрамі і чэмпіёнамі спаборніцтваў. Вольга Гаева ў свае 16 гадоў ужо з'яўляецца неаднаразовай пераможцай чэмпіянатаў Рэспублікі Беларусь, пераможцай адкрытага чэмпіянату Украіны 1999 г.

Значных поспехаў дасягнулі майстры воднага спорту на байдарках і каноэ з Буда-Кашалёва, якія неаднаразова станавіліся пераможцамі рэспубліканскіх, усесаюзных, еўрапейскіх і нават сусветных спаборніцтваў. Сярод іх Сяргей Дупанаў, Віктар Пусеў, Віктар Жураўлёў і іншыя.

АНІШЧАНКА Барыс Іванавіч, нарадзіўся 20.3.1939 г. у пас. Бурлак. Закончыў 7 класаў Дуравіцкай няпоўнай сярэдняй школы (1953), Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1957), Бранскі тэхналагічны інстытут (1965). Працаваў участковым тэхнікам-лесаводам, інжынерам аховы і абароны лесу, галоўным ляснічым, дырэктарам Рэспубліканскай станцыі па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі лесу Міністэрства лясной гаспадаркі БССР, галоўным ляснічым упраўлення лясной гаспадаркі Гомельскай вобл., начальнікам гэтага ўпраўлення, генеральным дырэктарам, намеснікам генеральнага дырэктара па інфармацыйнай рабоце вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання Гомельскай вобл. Удзельнік ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі. Ганаровае званне прысвоена ў 1998 г.

ХЛЕБАКАЗАЎ Пётр Пятровіч, нарадзіўся ў 1925 г. у в. Чабатовічы. Закончыў Чабатовіцкую няпоўную сярэднюю школу, Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1949), Мінскі лесатэхнічны інстытут (1962). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў ляснічым. З 1959 г. па 1997 г. узначальваў Чачэрскі лясгас. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней (1957, 1985), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1967), медалямі. Ганаровае званне прысвоена ў 1968 г.

ЗАСЛУЖАНЫ МАШЫНАБУДАЎНІК

КАВАЛЁЎ Пётр Купрыянавіч (глядзі Героі Сацыялістычнай Працы).

ЗАСЛУЖАНЫ МЕЛІЯРАТАР

ЛЕТУНОВІЧ Аляксандр Пятровіч, нарадзіўся 15.9.1920 г. у в. Дзераўцы Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобл. Закончыў Мінскі гідрамеліярацыйны тэхнікум (1940). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1952 г. па сакавік 1972 г. дырэктар Буда-Кашалёўскага будаўніча-мантажнага ўпраўлення меліярацыйных работ. Ганаровае званне прысвоена ў 1966 г. Памёр 8.4.1990 г.

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ НАВУКІ

БУСЛАЎ Казімір Паўлавіч (глядзі Імі ганарацца землякі: Вучоныя).

ЗАСЛУЖАНЫЯ НАСТАЎНІКІ

АНДРЭЕЎ Ціхан Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1912 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Закончыў Гомельскі настаўніцкі інстытут (1939). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў настаўнікам, дырэктарам школ. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За баявыя заслугі». Ганаровае званне прысвоена ў 1968 г. Памёр у 1973 г.

АЎРАМЕНКА Вольга Сысоеўна (глядзі Народны настаўнік СССР).

БРУНДУКОЎ Барыс Данілавіч, нарадзіўся ў 1928 г. у пас. Сенавец. Закон-

чыў Гомельскі педагагічны інстытут. З 1952 г. працаваў настаўнікам, дырэктарам школ у Веткаўскім раёне. Ганаровае званне прысвоена ў 1972 г.

ГАКАВА Эмілія Антонаўна, нарадзілася 27.3.1921 г. у в. Атраднае Мікалаеўскай вобл. Закончыла Адэскі дзяржаўны універсітэт (1945). Працавала настаўніцай на Украіне, з 1949 г. па 1970 г. выкладчыца рускай мовы і літаратуры Буда-Кашалёўскага сельгастэхнікума. Узнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна». Ганаровае званне прысвоена ў 1966 г.

ГАРУНОЎ Іван Сямёнавіч, нарадзіўся 19.9.1916 г. у в. Недайка. Закончыў Магілёўскі палітасветніцкі інстытут (1936), Сталінградскае ваеннае вучылішча сувязі (1941). Працаваў дырэктарам сямігадовай школы ў в. Чкалава, намеснікам дырэктара Бабовіцкай сярэдняй школы Гомельскага раёна. З 1939 г. у Чырвонай арміі. Удзельнічаў у баях на Бранскім фронце, дзе быў цяжка паранены, у партызанскім руху на Гомельшчыне — памочнік начальніка штаба, начальнік штаба партызанскага атрада імя В.П.Чкалава партызанскай брыгады «Бальшавік». Пасля вызвалення Гомельшчыны зноў на фронце — начальнік сувязі мінамётнага палка. Удзельнічаў у баях на 1, 2 і 3-м Беларускіх франтах. Вайну закончыў пад Кёнігсбергам. У 1946 г. вярнуўся ў Гомель, працаваў да 1983 г. дырэктарам пазменнай сярэдняй школы № 7. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1976), Айчыннай вайны I і II ступеней, 14 медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Ганаровае званне прысвоена ў 1966 г.

ГРАМЫКА Аляксандра Паўлаўна, нарадзілася ў 1920 г. у пас. Старэва Слуцкага раёна Мінскай вобл. Закончыла Гомельскі педагагічны тэхнікум (1939), Гомельскі настаўніцкі інстытут (1950), Магілёўскі педагагічны інстытут. У гады Вялікай Айчыннай вайны — сувязная партызанскага атрада імя Кірава. Працавала настаўніцай пачатковых класаў, рускай мовы і літаратуры, арганізатарам пазашкольнай і пазакласнай работы сярэдняй школы № 1 ў Буда-Кашалёве. Узнагароджана медалямі. Ганаровае званне прысвоена ў 1967 г.

ГУСАКОВА Лідзія Дзмітрыеўна, нарадзілася 11.5.1925 г. у в. Шутнае. Закончыла Гомельскі настаўніцкі інстытут (1946), Гомельскі педагагічны інстытут

Э.А.Гакава.



І.С.Гаруноў.

А.П.Грамыка.

Л.Дз.Гусакова.

Т.А.Далецкая.

(1962). Удзельніца партызанскага руху на Гомельшчыне ў Вялікую Айчынную вайну. Працавала настаўніцай рускай мовы і гісторыі, завучам няпоўнай сярэдняй школы, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце. Узнагароджана медалём «За працоўную доблесць» (1960). Ганаровае званне прысвоена ў 1965 г.

ДАЛЕЦКАЯ Таццяна Андрэеўна, нарадзілася ў 1916 г. Закончыла Мсціслаўскі

С.П.Зяцікаў.

М.М.Кісялёва.

В.Н.Кісялёў.

Н.Н.Круглова.

К.П.Лусікава.

Н.С.Пашэвіч.

педагагічны тэхнікум (1937), Магілёўскі педагагічны інстытут (1950). Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры, завучам сярэдняй школы. Ганаровае званне прысвоена ў 1967 г.

ЗЯЦІКАЎ Сямён Пятровіч, нарадзіўся 4.2.1914 г. у г. Буда-Кашалёва. Закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1938). Працаваў настаўнікам Марозавіцкай і Кашалёўскай школ. У Вялікую Айчынную вайну ў 1941 — 1945 гг. на фронце. Быў цяжка кантужаны. Працаваў выкладчыкам і дырэктарам Пінскага крэдытна-фінансавага тэхнікума (1957 — 1977). Педагагічны стаж яго склаў 56 гадоў. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі, значком «Выдатнік асветы». Ганаровае званне прысвоена ў 1973 г. Памёр у 1999 г.

КІСЯЛЁВА Марыя Міхайлаўна, нарадзілася ў 1930 г. у в. Навасёлкі Веткаўскага раёна. Закончыла Магілёўскі педагагічны інстытут (1962). У 1951 — 1999 гг. працавала настаўніцай гісторыі. Узнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна» (1970). Ганаровае званне прысвоена ў 1975 г.

КІСЯЛЁЎ Васіль Нікіфаравіч, нарадзіўся ў 1920 г. у в. Мікалаеўка. Закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1960). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў настаўнікам, дырэктарам у школах Буда-Кашалёўскага раёна (1948 — 1987). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі, знакам «Выдатнік асветы СССР» (1975). Ганаровае званне прысвоена ў 1985 г.

КРУГЛОВА Ніна Нічыпараўна, нарадзілася 17.4.1934 г. у в. Селішча Гарадоцкага раёна Віцебскай вобл. Закончыла Віцебскі педагагічны інстытут (1957). Працавала настаўніцай у школах Буда-Кашалёўскага раёна, інспектарам Буда-Кашалёўскага райана, Гомельскага аблана. Ганаровае званне прысвоена ў 1979 г.

ЛУСІКАВА Кацярына Пятроўна, нарадзілася ў 1920 г. у в. Рудня-Лозаўская. Закончыла Гомельскі педагагічны інстытут (1938). Працавала настаўніцай матэматыкі Рагінскай школы (1943 — 1978). Ганаровае званне прысвоена ў 1971 г.

МЕЛЬНІКАЎ Васіль Дзямідавіч, нарадзіўся ў пас. Барчанкі Веткаўскага раёна. Закончыў Гомельскае педагагічнае вучылішча (1939), Гомельскі педагагічны інстытут (1956). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў настаўнікам фізікі і матэматыкі Міхалёўскай школы (1946 — 1997). Ганаровае званне прысвоена ў 1967 г. Памёр у 1997 г.

ПАШЭВІЧ Ніна Савельеўна, нарадзілася ў 1923 г. у в. Бацунь. Закончыла Уваравіцкую сярэднюю школу (1941), Гомельскі педагагічны інстытут (1953). Працавала настаўніцай рускай мовы і

літаратуры, беларускай мовы і літаратуры. Узнагароджана медалём «За працоўную адзнаку» (1953). Ганаровае званне прысвоена ў 1962 г.

ПІГУЛЕЎСКІ Сцяпан Цімафеевіч, нарадзіўся 4.8.1922 г. у в. Навасёлкі Петрыкаўскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут. Працаваў настаўнікам, намеснікам дырэктара Торфазаводскай (1945—1958), дырэктарам Гусявіцкай, Рудзянецкай і Узоўскай школ (1961—1982), інспектарам Уваравіцкага райана, кіраўніком атрада «Пошук» Касцюковіцкага СПТВ-179 (1983—1991). Дэлегат VI з'езда настаўнікаў Беларусі (1978). Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971), медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Берліна» і інш. Ганаровае званне прысвоена ў 1970 г.

САЛАЎЁВА Раіса Уладзіміраўна, нарадзілася ў 1925 г. у в. Студзёнка Смалявіцкага раёна Мінскай вобл. Закончыла Гомельскі педагагічны інстытут (1947). Больш за 30 гадоў працавала настаўніцай матэматыкі Буда-Кашалёўскай СШ № 1, з якіх 25 гадоў намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Ганаровае званне прысвоена ў 1964 г. Памерла 5.2.1995 г.

САЦЭВІЧ Софія Аляксандраўна, нарадзілася ў 1897 г. у м. Мельнік былога Сямяцінскага раёна Брэсцкай вобл. Закончыла 2-гадовыя педагагічныя курсы (1914). З 1914 г. працавала настаўніцай у школах Гомельскай і Уваравіцкай валасцей (Гусявіцкая, Сінічанская школы, дырэктарам Івольскай школы), з 1944 г. у Рудзянецкай школе. Узнагароджана ордэнам Леніна (1949). Ганаровае званне прысвоена ў 1949 г. Памерла ў 1968 г.

СКВАРЦОВА (АНДРЫЕЎСКАЯ) *Людміла Іосіфаўна,* нарадзілася ў 1914 г. у в. Астрагляды Брагінскага раёна. Закончыла Гомельскі педагагічны інстытут (1939). Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў школах ваенных гарнізонаў у Прыбалтыцы, у гады вайны ў г. Бугуруслан. З кастрычніка 1944 г. працавала адказным рэдактарам уваравіцкай раённай газеты «Сцяг Ільіча», з 1952 г. па 1967 г. настаўніцай рускай мовы і літаратуры сярэдняй школы торфазавода «Бальшавік». Узнагароджана медалём «За доблесную працу ў



С.Ц.Пігулеўскі.



Р.У.Салаўёва.

С.А.Сацэвіч.

С.М.Сцяпук.

Л.І.Скварцова (Андрыеўская) з мужам П.Ф.Скварцовым (загінуў у Вялікую Айчынную вайну).

Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» і інш. Ганаровае званне прысвоена ў 1967 г.

СЦЯПУК Софія Майсееўна, нарадзілася ў 1923 г. у в. Гарадзішча Петрыкаўскага раёна. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Закончыла Мазырскае педагагічнае



П.В.Трафімовіч.

М.Л.Шатанава (Халецкая).

Т.М.Юркова (Патапава).

А.С.Юркоў.

А.М.Антоненка.

вучылішча (1949). Працавала настаўніцай пачатковых класаў, у апараце райкома партыі, з 1950 г. па 1981 г. настаўніцай пачатковых класаў Дуравіцкай сярэдняй школы. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За баявыя заслугі».

ТРАФІМОВІЧ Пётр Восіпавіч, нарадзіўся ў 1934 г. у в. Насовічы Добрушскага раёна. Закончыў Гомельскі тэхнікум фізічнай культуры (1953), Беларускі інстытут фізічнай культуры (1964). З 1957 г. працуе настаўнікам фізічнага выхавання Камунараўскай сярэдняй школы. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1976), медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна» (1970). Ганаровае званне прысвоена ў 1972 г.

ШАТАНАВА (ХАЛЕЦКАЯ) Марыя Лявонцьеўна, нарадзілася ў 1924 г. у в. Навасёлкі. Закончыла Гомельскае педагагічнае вучылішча (1944). З 1944 г. па 1980 г. працавала настаўніцай пачатковых класаў у Аляксандраўскай, Папоўскай, Старабеліцкай, Уваравіцкай школах. Ганаровае званне прысвоена ў 1968 г.

ЮРКОВА (ПАТАПАВА) Тамара Мікалаеўна, нарадзілася 22.12.1936 г. у г. Рэчыца. Закончыла Рэчыцкае педагагічнае вучылішча (1956). Працавала настаўніцай пачатковых класаў Лозаўскай (1956–1961) і Рагінскай (1961–1981) школ. Узнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна». Ганаровае званне прысвоена ў 1979.

ЮРКОЎ Андрэй Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1923 г. у в. Бронніца. У 1938 г. паступіў у Гомельскі педагагічны тэхнікум. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў настаўнікам у Негаўскай школе, на камсамольскай рабоце, дырэктарам Бушаўскай школы, загадчыкам Буда-Кашалёўскага райана, настаўнікам і дырэктарам сярэдняй школы №1 г. Буда-Кашалёва. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Ганаровае званне прысвоена ў 1968 г.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ПРАМЫСЛОВАСЦІ

БАРЭЙША Браніслаў Тарасавіч, нарадзіўся 21.2.1921 г. у в. Лапічы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі працаваў на Гомельскім аўтарамонтным заводзе. Яго працоўная дзейнасць адзначана ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За працоўную доблесць». Ганаровае званне прысвоена ў 1975 г. Памёр у 1994 г.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

АНТОНЕНКА Анатоль Макаравіч, нарадзіўся 15.1.1938 г. у в. Аравічы Хойніцкага раёна. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1968). Працаваў

заатэхнікам, дырэктарам саўгаса «Патапаўскі», з 1976 г. дырэктар эксперыментальнай базы «Уваравічы». Узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку». Ганаровае званне прысвоена ў 1998 г.

ГЕРАСІМАЎ Іван Іванавіч, нарадзіўся 16.10.1921 г. у в. Рубеж былога Уваравіцкага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў загадчыкам майстэрні, майстрам, слесарам у калгасе «1 Мая». Узнагароджаны шасцю баявымі ордэнамі, у тым ліку Чырвонага Сцяга (двойчы), Чырвонай Зоркі (двойчы). Ганаровае званне прысвоена ў 1975 г.

ЖЫРЫКАЎ *Фёдар Іванавіч,* нарадзіўся 6.3.1948 г. у пас. Новая Сямёнаўка. Закончыў Чырвонабярэжскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1967), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1981). Працаваў інжынерам-меліяратарам, начальнікам участка саўгаса «Залессе», старшым тэхнікам Гомельскага МУААС, аграномам па хімахове раслін, аграномам, намеснікам дырэктара, галоўным аграномам эксперыментальнай базы «Уваравічы». Ганаровае званне прысвоена ў 1998 г.

КАВАЛЁВА *Валянціна Сцяпанаўна,* нарадзілася ў 1937 г. у г.п. Уваравічы. Закончыла Уваравіцкую сярэднюю школу (1955). Працавала больш за 40 гадоў даяркай эксперыментальнай базы «Уваравічы». Узнагароджана ордэнам Леніна. Ганаровае званне прысвоена ў 1986 г.

КАНДРАЦЬЕЎ Іван Васільевіч, нарадзіўся 28.10.1918 г. у в. Сухая Бярозаўка Бабpоўскага раёна Варонежскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Патапаўскі». Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Ганаровае званне прысвоена ў 1975 г.

КОБРУСЕЎ Аркадзь Тарасавіч (глядзі Героі Сацыялістычнай Працы).

ПАЗНЯКОЎ Міхаіл Фёдаравіч, нарадзіўся 7.9.1929 г. у в. Івольск. Закончыў Клімавіцкі зааветтэхнікум (1957). Працаваў участковым заатэхнікам, галоўным заатэхнікам калгаса «Чырвоны шлях», з 1966 г. па 1983 г. старшынёй, інжынерам па меліярацыі, намеснікам старшыні ў калгасе імя Калініна. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1966,1973), медалямі ВДНГ СССР. Ганаровае званне прысвоена ў 1978 г. Памёр у 2000 г.

РАСОЛАВА Галіна Іванаўна, нарадзілася 15.7.1936 г. у в. Дабрынь Ельскага раёна. Закончыла Уваравіцкую сярэднюю школу. Маці шасці дзяцей. Працавала больш за 40 гадоў даяркай эксперыментальнай базы «Уваравічы». Узнагароджана медалём «За працоўную доблесць». Ганаровае званне прысвоена ў 1985 г. Памерла ў 1998 г.

САПЛІЦКІ Дзяніс Ігнатавіч, нарадзіўся 31.5.1914 г. у в. Марозавічы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў



Ф.І.Жырыкаў.



І.В.Кандрацьеў.

М.Ф.Пазнякоў.

Г.І.Расолава.



Дз.І.Сапліцкі.

В.С.Чарнякоў.



Р.Б.Басін.

А.В.Кутай.



І.М.Шапіра.

К.Ф.Якаўцава.

брыгадзірам паляводчай брыгады, старшынёй калгаса, рабочым саўгаса, даглядчыкам жывёлы, качагарам. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Славы II і III ступеней, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Ганаровае званне прысвоена ў 1975 г.

ЧАРНЯКОЎ Васіль Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1925 г. у в. Рагінь. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў старшынёй Рагінскага сельсавета, старшынёй калгаса, намеснікам старшыні ўзбуйненага калгаса, брыгадзірам трактарнай брыгады, з 1958 г. па 1976 г. трактарыстам калгаса «Рагінь». Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» і інш. Ганаровае званне прысвоена ў 1975 г. Памёр 11.3.1985 г.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ТРЭНЕРЫ

БАСІН Рыгор Барысавіч, нарадзіўся 2.3.1937 г. у г. Буда-Кашалёва. Закончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт (1969). З 1978 г. працаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам кафедры фізічнага выхавання і спорту Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту. Ганаровае званне прысвоена ў 1992 г.

КУТАЙ Алена Віктараўна, нарадзілася ў 1949 г. у в. Клімавічы Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобл. Закончыла Віцебскі тэхнікум фізічнай культуры (1969), Гомельскі дзяржаўны універсітэт (1986). Працавала інструктарам-метадыстам, настаўнікам фізічнага выхавання, з 1983 г. інструктарам вытворчай гімнастыкі калектыву Буда-Кашалёўскай бройлернай птушкафабрыкі. Ганаровае званне прысвоена ў 1989 г.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ЎРАЧЫ

КУТАСАЎ Іван Елісеевіч, нарадзіўся 17.4.1919 у в. Кашалёва. Урач-хірург. Закончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1946). Працаваў загадчыкам урачэбнага участка, галоўным урачом і хірургам Чэрыкаўскай раённай бальніцы, загадчыкам хірургічнага аддзялення. Узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць» (1961). Ганаровае званне прысвоена ў 1966 г.

ШАПІРА Іосіф Міронавіч, нарадзіўся 27.1.1924 г. у Мінску. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1950). З 1950 г. працаваў галоўным урачом Недайскай участковай бальніцы, а ў 1985 — 1993 гг. галоўным урачом Буда-Кашалёўскага раёна, старшым урачом Гомельскай бальніцы хуткай дапамогі. Ганаровае званне прысвоена ў 1966 г. Памёр 2.10.1997 г.

ЗАСЛУЖАНЫ ЭКАНАМІСТ

ЯКАЎЦАВА Ксенія Фадзееўна, нарадзілася 23.12.1920 г. у г.п. Уваравічы. Працавала бухгалтарам, сакратаром Буда-Кашалёўскага народнага суда, інспектарам

па нарыхтоўках, намеснікам начальніка, а з 1971 г. начальнікам Буда-Кашалёўскай інфармацыйна-вылічальнай станцыі. Ганаровае званне прысвоена ў 1973 г. Памерла ў 1997 г.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК МУС СССР

ЖЫРЫКАЎ Мікалай Ільіч, нарадзіўся 20.6.1931 г. у в. Недайка. Закончыў Магілёўскую спецшколу міліцыі (1958), Вышэйшую школу Міністэрства аховы грамадскага парадку РСФСР (1964). Працаваў загадчыкам хаты-чытальні, оперупаўнаважаным крымінальнага вышуку лінейнага аддзялення міліцыі Гомельскага порта, оперупаўнаважаным крымінальнага вышуку Гомельскага райвыканкома, старшым оперупаўнаважаным па асобых справах крымінальнага вышуку Гомельскага аблвыканкома, начальнікам аддзела ўнутраных спраў Веткаўскага, Савецкага (г. Гомель) райвыканкомаў, юрысконсультам Савецкага райпрамгандлю г. Гомеля, юрысконсультам завода пластмасавых вырабаў. Узнагароджаны медалямі «За выдатную службу па ахове грамадскага парадку» I,II і III ступеней. Мае ганаровае званне «Заслужаны работнік МУС СССР».

НАРОДНЫ НАСТАЎНІК СССР

АЎРАМЕНКА Вольга Сысоеўна, нарадзілася 23.11.1934 г. у г.п. Уваравічы. Заслужаны настаўнік БССР (1973). Закончыла Гомельскі педагагічны інстытут (1956). З 1956 г. настаўніца рускай мовы і літаратуры Уваравіцкай сярэдняй школы. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны». Ганаровае званне прысвоена ў 1979 г.

Ганаровыя грамадзяне

ЗЕМЛЯКІ — ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ ГОМЕЛЯ

КАВАЛЁЎ Пётр Купрыянавіч (глядзі Героі Сацыялістычнай Працы).

КУПЦОЎ Сяргей Паўлавіч, нарадзіўся 5.7.1913 г. у в. Хоўхла. Закончыў Чабатовіцкую пачатковую і Горвальскую сямігадовую школы, прафесійна-тэхнічную школу хімікаў, школу металістаў, рабфак і 2 курсы Гомельскага педагагічнага інстытута (1941). Працаваў кавалём у сельскай кузні, лабарантам на заводзе «Чырвоны хімік», токарам на заводзе «Рухавік рэвалюцыі» і на будаўніцтве Касцюковіцкага шклозавода, карэспандэнтам газет «Гомельская праўда», Добрушскай раённай шматтыражнай, «Чыгуначнік Беларусі». У Вялікую Айчынную вайну сакратар Гомельскага падпольнага гаркома камсамола (з мая 1943 г. першы сакратар гаркома камітэта ЛКСМБ Гомеля). У 1943 — 1952 гг. працаваў старшынёй Гомельскага камітэта па радыёфікацыі і радыёвяшчанні. У 1952 — 1955 гг. старшыня выканаўчага камітэта Цэнтральнага раёна Гомеля, затым да 1972 г. загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Гомельская праўда». Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалём «За адвагу» і інш. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам Гомельскага гарадскога Савета. З 1970 г. узначальваў пастаянную камісію гарвыканкома па справах партызан і падпольшчыкаў Вялікай Айчыннай вайны. Ганаровы грамадзянін з 1977 г. Памёр у 2001 г.

М.І.Жырыкаў.

В.С.Аўраменка.

ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ БУДА-КАШАЛЁВА

БЕЛКІН Уладзімір Міхайлавіч, нарадзіўся 11.4.1923 г. у Маскве. Закончыў Маскоўскі інстытут усходазнаўства (1951). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў выкладчыкам, дацэнтам, прафесарам Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Доктар філалагічных навук. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Дружбы народаў, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За абарону Масквы», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна» і інш. Памёр у 2000 г.

ГАЛАВАЧОЎ Павел Якаўлевіч (глядзі Землякі — Героі Савецкага Саюза).

І.М.Іўкін.

Р.М.Купрыяшчанка.

Б.П.Лебедзеў.

І.М.Мурзаеў.

Р.Ф.Пасько.

ІЎКІН Іван Міхайлавіч, нарадзіўся 15.2.1924 г. у г. Бранск. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У лістападзе 1943 г. прымаў удзел у вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Буда-Кашалёва і іншых населеных пунктаў раёна. Працаваў начальнікам пажарнай часці, выкладчыкам ў пажарна-тэхнічным вучылішчы, начальнікам абласной пажарна-тэхнічнай выстаўкі (г. Бранск). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

КУПРЫЯШЧАНКА Рыгор Мікітавіч, нарадзіўся ў 1927 г. у в. Каромка. Удзельнік партызанскага руху на Гомельшчыне. З 1945 г. у Ваенна-марскім флоце. Капітан 1-га рангу. Закончыў Ленінградскі дзяржаўны універсітэт (1965). Кандыдат гістарычных навук (1988). Член Пятроўскай акадэміі навук і мастацтва. Адзін з заснавальнікаў міжрэгіянальнай грамадскай арганізацыі «Руска-беларускае брацтва» ў Санкт-Пецярбургу, кіраўнік секцыі былых беларускіх партызан, якія пражываюць у Санкт-Пецярбургу. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны (двойчы), медалямі «За адвагу», «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I і II ступеней, «За баявыя заслугі».

ЛЕБЕДЗЕЎ Барыс Пятровіч, нарадзіўся 13.3.1925 г. у в. Супанева Бранскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Бранскі лесагаспадарчы інстытут (1951). Працаваў настаўнікам, выкладчыкам, намеснікам дырэктара, дырэктарам Ціхвінскага палітэхнікума Ленінградскай вобл. Старшыня савета ветэранаў 4-й Бежыцкай ордэна Суворава стралковай дывізіі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, «Знак Пашаны»,14 медалямі. Ганаровы грамадзянін Хвастовіцкага раёна Калужскай вобл.

МУРЗАЕЎ Іван Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1916 г. у в. Дуброўскае Ілічоўскага раёна, Мардовія. Закончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі імя Куйбышава. Працаваў намеснікам галоўнага бухгалтара, кіраўніком Буда-Кашалёўскага аддзялення Дзяржбанка СССР. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I (двойчы) і II ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі.

ПАСЬКО Рыгор Фёдаравіч, нарадзіўся 1.5.1921 г. у в. Пераваловна Палтаўскай вобл. Закончыў Днепрадзяржынскі металургічны тэхнікум (1939). Па камсамольскім наборы мабілізаваны ў Ваенна-марскі флот. Служыў на эскадраным мінаносцы «Стойкі» (пазней перайменаваны ў «Віцэ-адмірал Дрозд»). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, абараняў г. Ленінград. Служыў на флоце да 1963 г. Пасля дэмабілізацыі працаваў загадчыкам Буда-Кашалёўскай канторы «Табакапром», а ў 1964 — 1982 гг. старшынёй Буда-Кашалёўскага гарсавета, загадчыкам канторы «Другасчормет». Старшыня райсавета ветэранаў вайны і працы. Узнагароджаны ордэнамі

Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

СТРОГАНАЎ *Яўген Васільевіч*, нарадзіўся 17.8.1924 г. у г. Тула. Закончыў Адэскае артылерыйскае вучылішча (1943), Ваенную артылерыйскую акадэмію (1954), Акадэмію Генштаба (1966). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Вызваляў Буда-Кашалёўскі раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Займаў пасады камандзіра артпалка, ракетнай брыгады, начальніка Каломенскага артвучылішча, намесніка начальніка ракетных войскаў Ленінградскай ваеннай акругі, начальніка ракетных войскаў Сібірскай ваеннай акругі, ракетных войскаў Узброеных сіл СССР. Генерал-лейтэнант. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені (двойчы), Чырвонай Зоркі (тройчы), «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, польскім крыжам, двума ордэнамі ГДР, 21 медалём. Памёр 27.11.1996 г. Пахаваны ў Маскве.

ЦАРЫК Уладзімір Васільевіч, нарадзіўся 23.8.1912 г. у г.п. Тураў Жыткавіцкага раёна. Закончыў Аршанскі настаўніцкі інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў настаўнікам, дырэктарам школы ў Буда-Кашалёўскім раёне. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Я.В.Строганаў.



У.В.Царык.



М.Ф.Казлоў.

А.А.Маркаў.

Імі ганарацца земляки

ВАЙСКОЎЦЫ

ГАЛАВАЧОЎ *Павел Якаўлевіч* (глядзі Землякі — Героі Савецкага Саюза).

ДРОЗД Валянцін Пятровіч (глядзі Віцэ-адмірал флоту).

ДРАЯНКОЎ Фёдар Савельевіч (глядзі Незабыўныя старонкі жыцця).

КАЗЛОЎ Міхаіл Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1946 г. у в. Гаўлі. Генерал-лейтэнант. Вучыўся ў Гаўлеўскай няпоўнай сярэдняй і Пірэвіцкай сярэдняй школах. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Патапаўскі». Пасля службы ў арміі закончыў Благавешчанскае вышэйшае каманднае танкавае вучылішча (1970), пазней Ваенную акадэмію бранятанкавых войскаў (1977). Прайшоў шлях ад камандзіра танкавага ўзвода да камандуючага танкавай арміяй, стаў начальнікам Галоўнага штаба Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь. У 1979 — 1981 гг. у Афганістане, камандзір танкавага палка. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» II і III ступеней, медалямі.

МАРКАЎ Аляксандр Адамавіч, нарадзіўся 10.12.1939 г. у в. Івольск. Генерал-лейтэнант. Закончыў Ваенную акадэмію бранятанкавых войскаў (1973). Служыў на розных камандных і штабных пасадах у Групе савецкіх войскаў у Германіі (ГСВГ), у Прыволжскай, Маскоўскай ваенных акругах, зноў у ГСВГ. З 1979 г. у Галоўным упраўленні кадраў Міністэрства абароны СССР: намеснік начальніка, начальнік аддзела, намеснік начальніка ўпраўлення. У 1993 — 1997 гг. начальнік упраўлення кадраў Генеральнага штаба Узброеных сіл Расійскай Федэрацыі. З 1997 г. у запасе, саветнік упраўлення Дзяржаўнай тэхнічнай камісіі пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі. Узнагароджаны ордэнамі Чырво-

М.М.Алексін.

Л.І.Алексіна.



Г.П.Атрошчанка.

С.Дз.Бадруноў.

най Зоркі (1967), «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені (1978), «Знак Пашаны» (1986), медалямі.

ВУЧОНЫЯ

АЛЕКСІН ***Міхаіл Міхайлавіч,*** нарадзіўся 17.3.1965 г. у в. Струкі. Закончыў Струкаўскую сярэднюю школу (1982), Віцебскі ветэрынарны інстытут (1989) і аспірантуру пры ім (1993). Кандыдат ветэрынарных навук (1997). Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам вопытнай станцыі, дацэнтам кафедры ветэрынарна-санітарнай экспертызы, намеснікам дэкана факультэта ветэрынарнай медыцыны Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Аўтар 27 навуковых прац. Уладальнік патэнта на выраб бактэрыяльных і лекавых прэпаратаў.

АЛЕКСІНА ***Лідзія Іванаўна,*** нарадзілася 8.3.1942 г. у в. Рудня-Віктарынская. Закончыла Бронніцкую сярэднюю школу (1958), Гомельскае будаўнічае вучылішча № 92, Мінскі педагагічны інстытут (1968), аспірантуру пры Маскоўскім навукова-даследчым інстытуце дэфекталогіі (1977). Кандыдат педагагічных навук (1978), дацэнт (1979). Працавала цялятніцай, маляром-тынкоўшчыкам, настаўніцай, выхавальніцай, лабарантам, асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, з'яўлялася дэканам дэфекталагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка. Узнагароджана значком «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» (1992).

АТРОШЧАНКА ***Генадзь Парфенавіч,*** нарадзіўся ў 1949 г. у в. Пянчын. Закончыў Пянчынскую сярэднюю школу, Чырвонабярэжскі сельгастэхнікум, Ленінградскі сельскагаспадарчы інстытут (1975), аспірантуру (1979). Кандыдат сельскагаспадарчых навук (1980). Працуе старшым навуковым супрацоўнікам кафедры пладаводства Санкт-Пецярбургскага універсітэта.

БАДРУНОЎ ***Сяргей Дзмітрыевіч,*** нарадзіўся 25.8.1958 г. у в. Брылёў. Доктар эканамічных навук (1994). Закончыў Уваравіцкую сярэднюю школу, матэматычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны (1980). Працаваў у Гомелі: інжынерам Цэнтра навукова-тэхнічнай інфармацыі, малодшым навуковым супрацоўнікам, інжынерам ва універсітэце імя Ф.Скарыны; з 1988 г. інжынер, загадчык аддзела, дырэктар Цэнтра навукова-тэхнічнай інфармацыі. У 1989 г. закончыў аспірантуру Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны па спецыялізацыі прыкладная матэматыка. У 1990 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. З красавіка 1990 г. генеральны дырэктар Беларускага рэспубліканскага агенцтва навукова-тэхнічнай інфармацыі, са снежня 1991 г. старшыня праўлення сумеснага прадпрыемства «Інфатэх». З 1992 г. начальнік аддзела маркетынгу, з 1994 г. дырэктар па знешнепалітычнай дзейнасці, з чэрвеня 1995 г. прэзідэнт акцыянернага аб'яднання «Піраметр» (г. Санкт-Пецярбург). Аўтар звыш 30 навуковых прац. Член-карэспандэнт Санкт-Пецярбургскай інжынернай акадэміі, прэзідэнт Нацыянальнай асацыяцыі авіяпрыборабудаўнікоў (Расія), правадзейны член Міжнароднай асацыяцыі «Навука. Медыцына. Экалогія».

БАРАНАЎ ***Міхаіл Мікалаевіч,*** нарадзіўся ў 1948 г. у в. Камунар. Закончыў Камунараўскую сярэднюю школу з залатым медалём (1966), Вышэйшае ваенна-марское вучылішча радыёэлектронікі імя

А.С.Папова (1971), Ваенна-марскую акадэмію (1981), ад'юнктуру (1991). Кандыдат тэхнічных навук (1991). 8 гадоў служыў на атамнай падводнай лодцы, потым у апараце галоўнакамандуючага Ваенна-марскім флотам, кіраўнік аднаго з падраздзяленняў НДІ ВМФ, дырэктар НДІ ВМФ Расіі. Капітан 1-га рангу.

БАЧЫЛА Надзея Рыгораўна, нарадзілася 13.9.1935 г. у в. Калініна. Доктар сельскагаспадарчых навук (1991). Закончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1964), аспірантуру пры Беларускім навукова-даследчым інстытуце земляробства (1970). У 1973 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю. Прайшла шлях ад малодшага да вядучага навуковага спецыяліста лабараторыі апрацоўкі глебы БелНДІ земляробства і кармоў (г. Жодзіна). Аўтар шэрагу навуковых прац.

БУСЛАЎ Казімір Паўлавіч, нарадзіўся 25.10.1914 г. у в. Кашалёў. Беларускі філосаф. Акадэмік АН Беларусі (1972), доктар філасофскіх навук (1965), прафесар (1966). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1978). Закончыў Смаленскі педагагічны інстытут (1938), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КП(б)У (1947), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК ВКП(б) (1951). У 1944—1948 гг. лектар ЦК КП(б)Б, у 1951—1956 гг. загадчык аддзела ЦК КПБ, у 1956—1972 гг. дырэктар, з 1976 г. загадчык сектара Інстытута філасофіі і права АН Беларусі. У 1970—1972 гг. выконваючы абавязкі, у 1973—1976 гг. акадэмік-сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН

К.П.Буслаў.

Беларусі. З 1951 г. выкладаў у БДУ, Мінскім радыётэхнічным інстытуце. З 1972 г. старшыня аддзялення Філасофскага таварыства СССР. Кандыдат у члены ЦК КПБ у 1952—1954 гг., член ЦК КПБ у 1954—1961 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 1955—1959 гг. Навуковыя працы прысвечаны гістарычнаму матэрыялізму, праблемам сацыялістычнага прагрэсу, гуманізму і культуры. Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1974), медалямі. Памёр 20.1.1983.

Творы: Свобода должна быть свободой на деле. Мн., 1961; О критерии внутриклассовых различий в СССР. М., 1965; Социальное единство, противоречия, ответственность. Мн., 1972; Социально-историческое развитие классов в СССР. Мн., 1979; Формирование социального в человеке. Мн., 1980.

ВЕЛІЧКЕВІЧ Фелікс Юльянавіч, нарадзіўся 4.1.1942 г. у в. Завідаўка. Беларускі палеабатанік. Доктар біялагічных навук (1983). Закончыў Ленінградскі

М.М.Баранаў (злева) і яго брат Віктар Мікалаевіч Баранаў (10 гадоў служыў на атамнай падводнай лодцы, таксама закончыў Ваенна-марскую акадэмію).

А.С.Галавачоў.

У.П.Грыханаў.

педагагічны інстытут імя А.І.Герцэна (1969). З 1972 г. у Інстытуце геалагічных навук АН Беларусі: старшы інжынер, малодшы, старшы навуковы супрацоўнік, загадчык лабараторыі, галоўны навуковы супрацоўнік. Навуковыя працы па палеакарпалогіі і палеаграфіі антрапагену, эвалюцыйнай марфалогіі, гісторыі познакайназойскай флоры. Амерыканскім біяграфічным інстытутам прызнаны «Чалавекам года» (1997). Аўтар 175 апублікаваных навуковых прац, у т.л. 5 манаграфій. Адкрыў 38 новых відаў і разнавіднасцей раслін у плейстацэнавай флоры Усходне-Еўрапейскай раўніны.

Творы: Антропогеновые семенные флоры Белоруссии и смежных областей. Мн., 1973; Плейстоценовые флоры ледниковых областей Восточно-Европейской равнины. Мн., 1982: Позднеплиоценовая флора Дворца на Днепре. Мн., 1990.

ГАЛАВАЧОЎ Аляксандр Сцяпанавіч, нарадзіўся 15.6.1935 г. у в. Недайка. Доктар эканамічных навук (1989), прафесар (1990). Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2001). Закончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум, Беларускі тэхналагічны інстытут (1963), аспірантуру (1966). Працаваў памочнікам ляснічага ў Бярэзінскім лягчасе Мінскай вобласці, з 1957 г. у сістэме лясной гаспадаркі Беларусі: тэхнік, старшы інжынер, ляснічы, намеснік начальніка аддзела лясной гаспадаркі Беларускай ваеннай акругі. Пасля абароны кандыдацкай дысертацыі (1968) на навукова-педагагічнай рабоце ў Беларускім інстытуце народнай гаспадаркі: навуковы супрацоўнік, загадчык навукова-даследчай лабараторыі навуковай арганізацыі працы, загадчык кафедры эканомікі галін народнай гаспадаркі. У 1978—1980 гг. і 1983—1985 гг. працаваў саветнікам-кансультантам Міністэрства вышэйшай адукацыі Рэспублікі Куба. З 1991 г. у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь: загадчык кафедры праблем рынку і гаспадарчага механізму, прарэктар па навуковай рабоце (з 1993), загадчык кафедры эканамічнай тэорыі (з 1998). Пад яго кіраўніцтвам падрыхтавана 8 кандыдатаў і 1 доктар эканамічных навук. Аўтар 150 навуковых прац, у т.л. 6 манаграфій і 9 вучэбных дапаможнікаў. Акадэмік Міжнароднай акадэміі арганізацыйных і кіраўніцкіх навук (1994), Беларускай інжынернай акадэміі (1997), член саветаў па абароне дысертацый пры Акадэміі кіравання і пры Беларускім эканамічным універсітэце, Навукова-кансультатыўнага савета па грашова-крэдытнай палітыцы Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйнай калегіі часопіса «Эканоміка, фінансы, кіраванне» і інш.

ГРЫХАНАЎ Уладзімір Платонавіч, нарадзіўся 4.1.1950 г. у в. Недайка. Закончыў Недайскую сярэднюю школу (1967), Мінскі педагагічны інстытут імя А.М.Горкага (1971), аспірантуру пры ім. Кандыдат педагагічных навук (1978). Працаваў настаўнікам спецыяльнай і дапаможнай школ, намеснікам дэкана дэфекталагічнага факультэта, загадчыкам кафедры спецыяльных методык Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага. Пазней — дацэнт кафедры алігафрэнапедагогікі Беларускага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка, загадчык лабараторыі алігафрэнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі Рэспублікі Беларусь. Асноўныя тэмы даследаванняў — спецыяльныя методыкі выкладання матэматыкі, карэкцыйная педагогіка. Аўтар больш за 50 навуковых і навукова-метадычных прац, з іх 5 падручнікаў для спецыяльнай школы, 11 праграм адукацыі дзяцей з асаблівасцямі развіцця, дапаможнікі для настаўнікаў і студэнтаў.

ДЗЯРЖЫНСКІ Іван Ігнацьевіч (глядзі Героі Сацыялістычнай Працы).

ДРАЯНКОЎ Алесь Фёдаравіч, нарадзіўся 15.2.1936 г. у пас. Дзедаў Курган у сям'і вясковага настаўніка, які пазней стаў вайскоўцам. Спачатку жыў у Буда-Кашалёве, пазней у Маскве. Закончыў Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча імя Баўмана, аспірантуру, абараніў кандыдацкую

дацкую дысертацыю. Працаваў у галіне практычнай касманаўтыкі, займаўся чарнобыльскімі пытаннямі. Адзін з заснавальнікаў Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф.Скарыны (1989), намеснік, а ў 1990—1992 гг. старшыня таварыства. Аўтар трох сцэнарыяў для навуковых фільмаў. Выступае з артыкуламі і апавяданнямі ў беларускім друку.

ЕЛІСЕЕЎ Міхаіл Герасімавіч, нарадзіўся 17.1.1940 г. у в. Кашалёў. Гісторык-германіст. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт і аспірантуру пры ім (1967). Кандыдат гістарычных навук (1967), дацэнт. Працаваў асістэнтам, выкладчыкам, дацэнтам кафедры новай і навейшай гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Аўтар больш за 40 навуковых прац, у т.л. 2 манаграфій. Памёр у 1997 г.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Віктар Андрэевіч, нарадзіўся 3.5.1948 г. у г. Тукумс, Латвія. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (2000), доктар тэхнічных навук (1999), прафесар (1998). Закончыў Буда-Кашалёўскую сярэднюю школу № 2 (1966), Харкаўскі авіяцыйны інстытут (1973). Працаваў кіраўніком авіямадэльнага гуртка Буда-Кашалёўскага Дома піянераў (1966—1967), слесарам-зборшчыкам, кантрольным майстрам, майстрам Харкаўскага авіяцыйнага завода (1967—1973), старшым інжынерам-тэхнолагам, старшым майстрам, намеснікам начальніка цэха, начальнікам цэха, галоўным інжынерам завода «Модуль» Гомельскага вытворчага аб'яднання (ВА) «Карал» (1974—1985), галоўным інжынерам ВА «Карал» — галоўным інжынерам Гомельскага электравакуумнага завода (1985—1990), генеральным дырэктарам ВА «Карал» — дырэктарам Гомельскага электравакуумнага завода (1990—1992). З 1992 г. генеральны дырэктар НВА «Інтэграл» — дырэктар унітарнага прадпрыемства «Завод паўправаднiковых прыбораў». Навуковы кіраўнік дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы «Белэлектроніка» (з 1996), старшыня секцыі Міжнароднага інстытута інжынераў па электратэхніцы і электроніцы ў Беларускім рэгіёне (ЗША, з 1997), віцэ-прэзідэнт Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі (з 1997), 1-ы намеснік старшыні савета кіраўнікоў міждзяржаўнай фінансава-прамысловай групы «Электронныя тэхналогіі» (прадпрыемствы Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, з 1998), член падкамітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі (з 2000). Ганаровы работнік электроннай прамысловасці СССР (1981), лаўрэат прэмій Савета Міністраў СССР (1990), Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (1991), Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1998). Асноўны кірунак навуковай дзейнасці — матэрыялазнаўства ў мікраэлектроніцы. Аўтар больш за 180 навуковых прац, у т.л. 7 манаграфій, 13 навуковых і навукова-метадычных дапаможнікаў. Мае 24 аўтарскія пасведчанні і патэнты.

В.А.Емяльянаў.

З успамінаў В.А.Емяльянава

Большасці з нас вядома шчымлівае адчуванне, калі сэрца імкнецца прыхіліцца да сваіх каранёў. Імкнецца туды, дзе прайшлі гады дзяцінства, дзе гучаў школьны званок, дзе пражыты першыя, найбольш яскравыя, імгненні подыху юнацтва.

Думкі пра радзіму для мяне перш за ўсё — гэта светлыя ўспаміны пра бацькоў Андрэя Антонавіча і Ганну Мікалаеўну. Бацька нарадзіўся і вырас у в. Мікалаеўка Губіцкага сельсавета. У 1960-я гады, пасля дэмабілізацыі з радоў Савецкай арміі, ён прыняў рашэнне вярнуцца на зямлю сваіх продкаў. Дагэтуль мы ўвесь час жылі на клунках і чамаданах, у пераездах з гарні-

зона ў гарнізон па месцы службы бацькі. Сям'я Емяльянавых прыехала ў Буда-Кашалёва. Вось так у мяне, тады малога хлапчука, з'явіўся свой родны край — дом, вуліца, школа і мноства сяброў.

Бацька і матуля. Кожны з іх быў неардынарным і па-свойму моцным чалавекам. Іх лёсы з'яднала Вялікая Айчынная вайна. Разам з першых і да апошніх дзён вайны, за выключэннем часу кантузій і раненняў. Пешшу ў адступленні да Ленінграда, затым наступленне ад Ленінграда да Усходняй Прусіі. Ён — камандзір роты, яна — камандзір аддзялення ў яго роце. Матуля адзіная з вялікай сям'і засталася жывой, пяць братоў загінулі амаль адразу, у 1941 г. Бацькі разам перажылі самыя жудасныя імгненні свайго жыцця, выпілі чашу смутку і горычы, разам святкавалі Вялікую Перамогу. У іх на дваіх была адзіная, святая памяць аб тым страшэнным ліхалецці. Колькі я іх памятаю, яны заўсёды глыбока паважалі адзін аднаго і шанавалі саму існасць жыцця...

Мы рана засталіся без бацькі. Ён пахаваны на радзіме, у Буда-Кашалёве. І матуля там пахавана. Іх, праз гады, усё-такі дагнала вайна. На жаль, дзеці вельмі многае не паспяваюць сказаць сваім бацькам. У дзіцячыя і юнацкія гады я больш за ўсё на свеце хацеў быць падобным на бацьку — добрага, разумнага, шырокай душы чалавека. А як цікава ён умеў апавядаць аб усім на свеце! У вольны час суседзі любілі збірацца да нас, пасядзець на лавачцы, пагутарыць «за жыццё». Бацька памятаў любое здарэнне, любое слова, сказанае раней. Сам ён быў чалавекам, які заўсёды выконвае свае абяцанні. Чалавекам з павышаным пачуццём справядлівасці. Яму было цяжка змірыцца з тым, што людзі могуць гаварыць адно, а рабіць другое. У такія моманты нават франтавікі пабойваліся яго вострага слоўца. На нашай вуліцы бацька карыстаўся прызнаным аўтарытэтам, бо заўсёды мог выказаць аб'ектыўную пазіцыю, адсякаючы эмоцыі і асабістыя сімпатыі.

Дарэчы, я перакананы, што ўсе нашы суседзі былі мужнымі, справядлівымі людзьмі. Амаль на ўсёй вуліцы Калініна тады жылі ветэраны вайны — франтавікі і партызаны. Афіцэр сувязі Бадзілоўскі, ваенны шафёр Анішчанка, танкісты Апалькоў і Шарыкаў, афіцэр, палявы ўрач Лосеў... Яны прайшлі чысцілішча вайны, іх характары і погляды адшліфавала суровая праўда ваенных будняў. Гэта былі людзі асобай закваскі. Сваімі ўспамінамі, пачуццямі ад перажытага яны абменьваліся на нашай лавачцы. Мы, хлапчукі, забываліся на гульні, ціхенька кучкаваліся побач і слухалі ў захапленні. Усе такія размовы дарослых амаль заўсёды завяршаліся тым, што «вайны больш ніколі не будзе: усяму міру стала вядома, што ніхто не здольны змагацца так, як змагаўся савецкі салдат». Яны многа і самаадданa працавалі, будавалі (як і наша сям'я) дамы, гадавалі дзяцей і наладжвалі дабрабыт. І ў кожнай сям'і ветэранаў вайны на вуліцы Калініна рос, як мінімум, адзін сын...

Заўсёды з вялікай цеплынёй і пашанай думаю пра сваіх настаўнікаў сярэдняй школы № 2. Дырэктар школы Іосіф Сцяпанавіч Казлоў чалавек моцных устояў і паслядоўны ў сваіх поглядах. Настаўнік фізкультуры Барыс Якаўлевіч Адашкевіч, які лічыў сваім абавязкам рабіць прабежкі па 10 — 20 кіламетраў разам з вучнямі. Настаўнік фізікі Яўген Міхайлавіч Жамчужны... Чалавек-крэмень, без меж улюбёны ў сваю дысцыпліну. Яго, шчыра кажучы, я вельмі паважаў і нават крыху пабойваўся. Жамчужны быў перакананы, што мая будучыня будзе звязана з фізікай. І пасля абласных спартыўных спаборніцтваў, а значыць і прапушчаных школьных заняткаў, заўсёды гаварыў «кароннае»: «Было ў бацькі два сыны, адзін разумны, а другі спартсмен. Емяльянаў, да дошкі!». А да настаўніка геаграфіі і астраноміі Уладзіміра Мікалаевіча Закрэўскага мы цэлымі гуртамі любілі прыходзіць дамоў. З захапленнем слухалі яго найцікавейшыя аповяды і глядзелі ў тэлескоп на зорнае неба... Увогуле, можна назваць паіменна ўсіх нашых настаўнікаў! Не шкадуючы сябе, яны трацілі на нас свой час, свае сілы і чалавечую цеплыню. Як шчыра яны радаваліся, калі мы, дзякуючы атрыманым у школе ведам, пачалі ўпэўнена крочыць па жыцці.

Я вельмі ўдзячны дырэктару Дома піянераў і школьнікаў Цімафею Фёдаравічу Сцепаненку. У часы вайны ён быў у партызанах, застаўся без рукі, але бяда не змагла пахіснуць ні яго жыццёвы аптымізм, ні прыродную юнацкую гарэзлівасць душы. Цімафей Фёдаравіч вадзіў нас, дзяцей, у шматкіламетровыя паходы да Губіцкага кардону. Колькі радасці прыносілі нам тыя

вандраванні па партызанскіх сцяжынках! Сцепаненка таксама жыў на нашай вуліцы, я быў у 3-м класе, калі ён прывёў мяне ў авіямадэльны гурток Дома піянераў і школьнікаў. На той час гэта быў адзіны гурток, куды бралі хлапчукоў майго ўзросту. Мабыць, гэта быў адзін з самых важных момантаў у маім жыцці. У авіямадэльным я пачаў маляваць, канструяваць, яшчэ не ведаючы па школьнай праграме азоў чарчэння. Заняткі тэхнічна развілі мяне, і менавіта яны, у першую чаргу, прывялі да таго, што зараз называецца вялікай навукай. У той час выходзіла ў свет серыя кніг пра жыццё знакамітых людзей. У старшых класах я зачытваўся кнігамі пра канструктараў Якаўлева, Тупалева... Захапленне стала марай, якая і прывяла мяне ў Харкаўскі авіяцыйны інстытут. На той час гэта была вышэйшая канструктарская школа з найбольш моцнай тэхнічнай базай. Хоць, калі шчыра, былі думкі і аб Чарнігаўскім лётным. Але бацька папрасіў мяне ўсё добра ўзважыць: «Мы, сынок, адслужылі і за цябе, і за тваіх унукаў...»

Колькі ўжо гадоў мінула з таго часу! І кожны год, які б напружаны не быў графік працы, я прыязджаю ў Буда-Кашалёва, каб ушанаваць велічную для мяне памяць аб маіх бацьках, настаўніках, суседзях...

ЕМЯЛЬЯНЧЫКАЎ Віктар Іванавіч, нарадзіўся ў 1938 г. у в. Бацунь. У гады Айчыннай вайны загінулі яго бацькі. Гадавала бабуля. Пасля заканчэння Уваравіцкай сярэдняй школы (1957) паступіў у Ленінградскі політэхнічны інстытут, які закончыў у 1962 г. Працаваў інжынерам на новабудоўлях у Беларусі, старшым навуковым супрацоўнікам у Мінскім энергетычным інстытуце імя Кржыжаноўскага, Беларускім навукова-даследчым праектна-канструктарскім інстытуце прамысловай энергетыкі. Кандыдат тэхнічных навук (1980).

ЖАНДАРАЎ Сяргей Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1962 г. у в. Патапаўка. Закончыў Патапаўскую сярэднюю школу з залатым медалём. Кандыдат фізіка-матэматычных навук.

ЗАЙЦАЎ Барыс Макаравіч, нарадзіўся 1.3.1938 г. у г. Буда-Кашалёва. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава (1959), аспірантуру Акадэміі педагагічных навук СССР. Кандыдат



Б.М.Зайцаў.



Т.Я.Зыль (Жамчужная).

псіхалагічных навук. Заслужаны трэнер БССР. Працаваў выкладчыкам фізкультуры Буда-Кашалёўскага тэхнікума электрыфікацыі і механізацыі сельскай гаспадаркі, выкладчыкам тэорыі і методыкі фізічнага выхавання, дэканам факультэта фізічнай культуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. Аўтар шматлікіх навуковых публікацый. Узнагароджаны знакам «Выдатнік адукацыі вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь».

ЗЫЛЬ (ЖАМЧУЖНАЯ) Таццяна Яўгеньеўна, нарадзілася 14.11.1949 г. у г. Буда-Кашалёва. Закончыла Мінскі педагагічны інстытут імя А.М.Горкага (1971). Кандыдат педагагічных навук (1978), дацэнт. Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў сярэдніх школах г. Мінска. Пазней — выкладчык, дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Аўтар шэрагу навуковых прац па праблемах методыкі вывучэння стылю пісьменнікаў на ўроках літаратуры ў сярэдняй школе.

ЗЮЗЯНКОЎ Міхаіл Васільевіч, нарадзіўся 4.12.1936 г. у в. Гаўлі. Доктар медыцынскіх навук (1996), прафесар (1998). Закончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1960). Працаваў тэрапеўтам у бальніцах Мазыра і Смалявіч, цэхавым тэрапеўтам і ўрачом-лабарантам паліклінікі абутковага вытворчага аб'яднання «Прамень», урачом-тэрапеўтам, загадчыкам кардыярэўматалагічнага аддзялення 2-й Мінскай гарадской клінічнай бальніцы, асістэнтам 2-й кафедры шпітальнай тэрапіі, дацэнтам і адначасова загадчыкам аддзела інтэрнатуры Мінскага медыцынскага інстытута, з 1994 г. загадчык кафедры


М.В.Зюзянкоў.

М.І.Кабаеў.

М.М.Кавалёў.

Г.М.Каропа.

паліклінічнай падрыхтоўкі гэтага інстытута. Вядучы кірунак навуковай дзейнасці М.В.Зюзянкова — праблемы лячэння захворванняў сэрца. Даў навуковае абгрунтаванне практычнаму прымяненню і ўвёў у клінічную практыку выкарыстанне розных саставаў палярызуючых сумесей для лячэння ішымічнай хваробы сэрца. Паглыблена распрацоўвае пытанні лячэння захворванняў сэрца ў людзей з дыфузным паражэннем злучальнай тканкі пераважна пры сістэмнай чырвонай ваўчанцы. Аўтар дыферэнцыяльна-дыягнастычных крытэрыяў паражэння сэрца пры сістэмнай чырвонай ваўчанцы. Прапанаваў і абгрунтаваў новыя падыходы да павышэння эфектыўнасці лячэння гэтай хваробы. Яго доктарская дысертацыя «Паталогія сэрца пры сістэмнай чырвонай ваўчанцы» з'яўляецца першым абгрунтаваным даследаваннем гэтай праблемы ў рэспубліцы. Аўтар 87 навуковых прац, з якіх 6 выйшлі ў замежных выданнях. Удзельнік ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Узнагароджаны 2 медалямі.

КАБАЕЎ Мікалай Ільіч, нарадзіўся 13.6.1938 г. у в. Бацунь. Закончыў Уваравіцкую сярэднюю школу (1955), Смаленскі педагагічны інстытут (1960), аспірантуру пры Інстытуце фізікі АН Беларусі. Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1973), дацэнт (1978). Працаваў настаўнікам фізікі ў сярэдняй школе, супрацоўнікам Інстытута фізікі АН Беларусі, выкладчыкам фізікі Магілёўскага тэхналагічнага інстытута, дацэнтам кафедры фізікі Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта імя П.В.Сухога. Аўтар шэрагу навуковых артыкулаў і вынаходніцтваў.

КАВАЛЁЎ Міхаіл Мікалаевіч, нарадзіўся 1.1.1957 у в. Чабатовічы. Закончыў Чабатовіцкую сярэднюю школу з залатым медалём (1954), Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны (1979). Кандыдат эканамічных навук (1992). Праграміст, загадчык бюро і аддзела аўтаматызаванай сістэмы кіравання вытворчасці завода самаходных камбайнаў «Гомсельмаш». Аўтар больш за 15 навуковых прац.

КАЗЛОЎСКАЯ Ала Яфімаўна, нарадзілася 19.10.1938 г. у в. Уза. Кандыдат гістарычных навук (1976). Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт (1961), працавала ў Інстытуце гісторыі АН Беларусі, з 1985 г. у Мінскім медыцынскім інстытуце. Даследуе гісторыю рабочага класа і культурнага будаўніцтва на Беларусі. Адна з аўтараў «Гісторыі Беларускай ССР», «Гісторыі рабочага класа Беларускай ССР».

КАЗЛОЎСКІ Антон Ігнатавіч, нарадзіўся 27.8.1899 г. у в. Шутнае. Беларускі вучоны ў галіне селекцыі сельскагаспадарчых раслін. Доктар сельскагаспадарчых навук (1955), прафесар (1956). Закончыў Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію імя Ціміразева (1924). З 1958 г. у Беларускім навукова-даследчым інстытуце земляробства. Навуковыя працы па пытаннях вытворчасці кармоў, агратэхнікі вырошчвання, селекцыі і насенняводства цукровых буракоў. Вывеў 4 сарты кармавых караняплодаў. Памёр 27.2.1972 г.

КАРОПА Генадзь Мікалаевіч, нарадзіўся 25.6.1961 г. у г. Буда-Кашалёва. Закончыў СШ № 2 г. Буда-Кашалёва (1978), геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1983), аспірантуру Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага (1990), дактарантуру Нацыянальнага інстытута адукацыі Рэспублікі

Беларусь (2000). Кандыдат педагагічных навук (1990), дацэнт (1997). Працаваў настаўнікам геаграфіі СШ № 25 г. Гомеля, метадыстам, загадчыкам кабінета выхаваўчай работы Гомельскага інстытута ўдасканальвання настаўнікаў. Пазней — старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры геаграфіі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. Аўтар больш за 55 навуковых і вучэбна-метадычных прац, апублікаваных у Беларусі, Расіі, Вялікабрытаніі, Італіі, ЗША, Канадзе і Францыі. За цыкл навуковых і вучэбна-метадычных прац па праблеме экалагічнай адукацыі і экалагічнай этыкі ўдастоены прэміі імя Ф.Скарыны (1998). Адзін з заснавальнікаў Беларускага саюза «Чарнобыль». Член Брытанскага экалагічнага таварыства.

Творы: Экологическое образование учащихся сельских школ. Мн., 1993; Системный подход к экологическому образованию и воспитанию школьников. Мн., 1994; Проблемы окружающей среды и устойчивого развития в современной школе. Мн., 1998; Теоретические основы экологического образования. Мн., 1999; Теория и практика экологического образования и воспитания. Гомель, 1999; і інш.

КАРЦЯЛЁЎ *Уладзімір Рыгоравіч,* нарадзіўся ў 1935 г. у в. Патапаўка. Доктар тэхнічных навук. Закончыў 7 класаў Патапаўскай сярэдняй школы, Буда-Кашалёўскі тэхнікум лясной гаспадаркі, Мінскі інстытут лясной гаспадаркі, аспірантуру. Працаваў ляснічым, навуковым супрацоўнікам.

КАЦУБА *Святлана Пятроўна,* нарадзілася 6.8.1959 г. у г. Катоўск Адэскай вобласці. Кандыдат юрыдычных навук (1999). Дзяцінства прайшло ў в. Губічы. Закончыла Губіцкую васьмігадовую школу, Гомельскае педагагічнае вучылішча (1978), гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны (1985), юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1993), аспірантуру Інстытута філасофіі і права НАН Беларусі (1999). Працавала настаўніцай пачатковых класаў, метадыстам, выкладчыкам Гомельскага педвучылішча, Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, зараз выкладае права і выконвае абавязкі загадчыка кафедры гаспадарчага права Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта імя П.В.Сухога. Працуе над праблемамі прававой адукацыі і выхавання моладзі. Аўтар больш за 40 навуковых, метадычных прац, навучальных дапаможнікаў, зборнікаў і інш.

С.П.Кацуба.

В.А.Краўчанка (Салаўёва).

КОТАЎ *Васіль Міхайлавіч,* нарадзіўся 17.12.1939 у в. Гусявіца. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1961). Кандыдат эканамічных навук. Працаваў інжынерам, старшым інжынерам, кіраўніком групы, намеснікам загадчыка, загадчыкам аддзела эканомікі будаўніцтва «Дзіпрасельбуда», загадчыкам аддзела, дырэктарам інстытута «Белаграпраект», намеснікам старшыні Ашчадбанка Рэспублікі Беларусь, намеснікам генеральнага дырэктара «Белаграінгандаль». Аўтар 17 навуковых артыкулаў. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1989).

КРАЎЧАНКА (САЛАЎЁВА) *Вольга Аляксееўна,* нарадзілася 8.7.1951 г. у г. Буда-Кашалёва. Закончыла Буда-Кашалёўскую сярэднюю школу №1 з залатым медалём (1968), Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны (1973). Працавала выкладчыкам кафедры матэматычнага аналізу, малодшым навуковым супрацоўнікам гэтага універсітэта, пазней — старшы выкладчык кафедры матэматыкі, дацэнт кафедры інфармацыйных тэхналогій Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта імя П.В.Сухога. Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1989), дацэнт (1993). Аўтар звыш 35 навуковых і навукова-метадычных работ, у т.л. 2 манаграфій.

МАРКЕВІЧ *Аляксандр Аляксеевіч,* нарадзіўся ў 1968 г. у в. Кашалёў. Закончыў Кашалёўскую няпоўную сярэднюю школу, Буда-Кашалёўскі саўгас-тэхнікум (1967), Вышэйшае ваеннае вучылішча (1992). Кандыдат тэхнічных навук (1996). Працаваў у НДІ навуковым супрацоўнікам, выкладчыкам ваеннага вучылішча.

С.В.Марцэлеў.

У.П.Мармалюкоў.



Я.І.Марчанка.

МАРЦЭЛЕЎ *Станіслаў Віктаравіч,* нарадзіўся 1.1.1925 г. у в. Шарыбаўка. Беларускі гісторык культуры. Член-карэспандэнт АН Беларусі (1980), доктар гістарычных навук (1972), прафесар (1992). Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (2000). Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт і Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1950). Удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў гады Айчыннай вайны. У 1944—1948 гг. сакратар, рэдактар відзскай газеты «Чырвоны сцяг», у 1950—1953 гг. рэдактар газеты палітаддзела Падсвільскай МТС Полацкай вобласці. З 1953 г. у апараце ЦК КПБ: інструктар, загадчык сектара, намеснік загадчыка аддзела, з 1965 г. загадчык аддзела культуры. У 1976—1994 гг. дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ІМЭФ) АН Беларусі. У 1980—1991 гг. рэдактар навукова-метадычнага бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». З 1994 г. саветнік пры дырэкцыі, з 1997 г. галоўны навуковы супрацоўнік ІМЭФ. З 1996 г. старшыня праўлення Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Даследуе праблемы гісторыі і культуры Беларусі. Галоўны рэдактар і адзін з аўтараў «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» (т. 1—7, 1984—1988; Дзяржаўная прэмія БССР 1990), галоўны рэдактар і адзін з аўтараў «Гісторыі беларускага мастацтва» (т. 1—6, 1987—1994). Кандыдат у члены ЦК КПБ у 1966—1976 гг., дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1967—1980 гг. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1967, 1971, 1976), Айчыннай вайны І ступені, «Знак Пашаны», медалямі.

Творы: Печать Советской Белоруссии: (Исторический очерк). Мн., 1967; К духовному расцвету: Исторический опыт развития белорусской советской культуры. Мн., 1974; Художественная культура Белоруссии на современном этапе. Мн., 1978; Печать Белоруссии в период развитого социализма. Мн., 1982.

МАРМАЛЮКОЎ *Уладзімір Пятровіч,* нарадзіўся 17.10.1951 г. у г.п. Уваравічы. Закончыў Уваравіцкую сярэднюю школу з залатым медалём (1968), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1973). Кандыдат тэхнічных навук (1980). Старшы навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела навукова-даследчага інстытута сельскай гаспадаркі. Аўтар больш за 30 навуковых прац, у т.л. манаграфіі «Апрацоўка караняплодаў па інтэнсіўнай тэхналогіі» (1990), 2 патэнтаў на вынаходніцтва, 18 аўтарскіх пасведчанняў. Памёр у 1993 г.

МАРЧАНКА *Якаў Іларыёнавіч,* нарадзіўся 10.2.1939 г. у в. Славянец. Закончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1957), Беларускі тэхналагічны інстытут (1967), аспірантуру. Служыў на Ціхаакіянскім флоце (1958—1962). Працаваў тэхнікам-лесаводам у Барысаўскім лясгасе Мінскай вобласці (1957—1958), старшым інжынерам Рэспубліканскай станцыі па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі лесу Міністэрства лясной гаспадаркі Беларусі (1967—1972, Гомель). З 1972 г. у Беларускім НДІ лясной гаспадаркі, дзе закончыў аспірантуру і прайшоў шлях ад малодшага навуковага супрацоўніка да загадчыка лабараторыі. У 1978 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. З 1996 г. у структуры Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, працуе дырэктарам Рэспубліканскага вытворчага прадпрыемства па ахове і маніторынгу лесу «Беллесаахова». Аўтар і сааўтар больш за

100 навуковых прац, у т.л. «Лес і Чарнобыль» (1994), «Атлас насякомых шкоднікаў лясных парод у Беларусі» (1999), «Лес, чалавек, Чарнобыль» (1999).

МАШЧЫЦКІ Рыгор Пятровіч, нарадзіўся 23.4.1911 г. у в. Крыўск. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1939). Удзельнік Айчыннай вайны. Кандыдат гістарычных навук (1961), дацэнт (1967). Працаваў у Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізму. Аўтар 16 навуковых прац, у т.л. па праблемах рэвалюцыйнага руху на Палессі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II (двойчы) ступеней, 10 медалямі. Памёр у 2000 г.

МЯЧЫКАВА Ірына Іванаўна, нарадзілася ў 1964 г. у в. Чабатовічы. Закончыла Чабатовіцкую сярэднюю школу, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны, аспірантуру пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. Кандыдат філалагічных навук. Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры Смычкоўскай школы, пазней — асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Аўтар шэрагу навуковых прац.

НАРКЕВІЧ Мікалай Мікалаевіч, нарадзіўся 13.4.1959 г. на ст. Уза. Закончыў Рудзянецкую сярэднюю школу з залатым медалём (1976), Ленінградскі ваенны інжынерна-касмічны інстытут імя А.Ф.Мажайскага (1981), ад'юнктуру пры ім (1991). Кандыдат тэхнічных навук (1991), дацэнт (1996). Працаваў на касмадроме «Байканур», пазней — выкладчык, начальнік кафедры ракетных рухавікоў і энергетычных установак касмічных апаратаў Ваеннага інжынерна-касмічнага універсітэта імя А.Ф.Мажайскага. Аўтар больш за 30 навуковых публікацый, 4 вынаходніцтваў па касмічнай тэхніцы. Палкоўнік (1994). Узнагароджаны медалямі.

НАХАЕНКА Аляксандр Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1965 г. у в. Елянец. Закончыў Елянецкую няпоўную сярэднюю школу (1981), Рэчыцкі сельгастэхнікум (1984), Віцебскую ветэрынарную акадэмію (1992). Кандыдат сельскагаспадарчых навук (1997). З 1996 г. загадчык аддзела, у 1998—2001 гг. першы намеснік старшыні Дзяржкамітэта па справах моладзі Рэспублікі Беларусь.

ПАРОШЫН Валерый Дзмітрыевіч, нарадзіўся 22.8.1952 г. у в. Чырвоны Пахар Веткаўскага раёна. Доктар геолага-мінералагічных навук (1998). У 1954 г. бацькі пераехалі ў в. Радзеева. Закончыў Увараўіцкую сярэднюю школу (1969), геалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны (1975), завочную аспірантуру Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (1984). Працаваў участковым гідрагеолагам, інжынерам, старшым інжынерам, старшым навуковым супрацоўнікам, вядучым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам сектара, загадчыкам лабараторыі нафтапрамысловай гідрагеалогіі «БелНДПІнафта». У 1990—1992 гг. знаходзіўся ў замежнай камандзіроўцы ў Алжыры, працаваў у адной з мясцовых фірмаў на пасадзе галоўнага інжынера. В.Дз.Парошын — вядучы спецыяліст Рэспублікі Беларусь па пытаннях нафтагазаразведачнай геалогіі і гідралогіі. З яго прозвішчам звязана станаўленне і развіццё ў Беларусі такіх кірункаў даследаванняў як літагідрагеахімія і нафтапрамысловая гідрагеалогія. Навуковыя працы прысвечаны перспектыўнаму і аператыўнаму плана-

Р.П.Машчыцкі.

М.М.Наркевіч.



В.Дз.Парошын.


В.І.Парфёнаў.


Я.Г.Пятроў.

ванню геолагаразведачных работ на нафту і газ. Ён аўтар 3 колькасных ацэнак прагнозных рэсурсаў вуглевададародаў Прыпяцкай нафтагазаноснай вобласці і геолага-эканамічнай ацэнкі рэсурсаў нафты і газу гэтага рэгіёна, асобныя публікацыі прысвечаны пытанням нафтагазаразведачнай гідрагеалогіі Дняпроўска-Данецкай лагчыны, Іркуцкага амфітэатра і Алжырскай Сахары. Яго распрацоўкі знайшлі практычнае прымяненне і ў іншых нафтагазаносных рэгіёнах свету. Аўтар манаграфіі, 4 брашур, 2 вынаходніцтваў і каля 100 навуковых артыкулаў, частка з якіх пераведзена на англійскую мову і перавыдадзена за мяжой.

ПАРФЁНАЎ ***Віктар Іванавіч,*** нарадзіўся 23.9.1934 г. у в. Прудкі Пачынкаўскага раёна Смаленскай вобласці. З 1944 г. пражывае ў Беларусі. Беларускі вучоны-батанік і эколаг, заснавальнік сучаснай беларускай фларыстычнай школы. Акадэмік НАН Беларусі (1988), член-карэспандэнт (1980), доктар біялагічных навук (1976), прафесар (1988). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (2000). Удзельнік ліквідацыі аварыі на ЧАЭС. Закончыў 7 класаў Буда-Кашалёўскай сярэдняй школы (1949), Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1952), Беларускі лесатэхнічны інстытут (1957). У 1959 — 1964 гг. і з 1968 г. у Інстытуце эксперыментальнай батанікі імя В.Ф.Купрэвіча АН Беларусі (да 1972 г. загадчык лабараторыі, намеснік, выконваючы абавязкі дырэктара, з 1973 г. дырэктар інстытута). У 1965 — 1968 гг. вучоны сакратар савета па каардынацыі навуковай дзейнасці АН Беларусі. Асноўныя працы па фларыстыцы, фітагеаграфіі, геабатаніцы, экалогіі, сістэматыцы і эвалюцыі раслін, радыеэкалогіі. Устанавіў заканамернасці фарміравання росту і прадукцыйнасці фітацэнозаў, асаблівасці біялогіі відаў і папуляцый раслін у аптымальных і экстрымальных умовах. Правёў біясістэматычнае вывучэнне асобных відаў і родаў беларускай флоры, даследаваў заканамернасці сучасных антрапагенных змяненняў флоры і расліннасці. Распрацаваў тэарэтычныя асновы захавання расліннага свету рэспублікі і стварэння сістэмы запаведных аб'ектаў. Ім прапанаваны прынцыпы экалагічна аптымальнага кампанента натуральных, парушаных і пераўтвораных экасістэм, абаснаваў новыя тэарэтычныя падыходы ў эвалюцыі вышэйшых раслін, даследаваў заканамернасці міграцыі радыенуклідаў у прыродна-раслінных комплексах. Дзяржаўная прэмія Беларусі за цыкл прац па вывучэнні расліннасці Беларусі (1972). Аўтар больш за 300 навуковых прац, у т.л. 38 манаграфій і брашур. Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў (1981), медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна» (1970), ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР (1979, 1984), Граматай Вярхоўнага Савета БССР (1971). Ганаровы член шэрагу навуковых устаноў свету. Міжнародным біяграфічным цэнтрам (Кембрыдж, Вялікабрытанія) названы «Чалавекам года» (1998), «Чалавекам стагоддзя» (1999). Амерыканскім біяграфічным цэнтрам яго імя ўнесена ў энцыклапедыю «Хто ёсць хто ў свеце» (1998).

Творы: Обусловленность распространения и адаптации видов растений на границах ареолов. Мн., 1980; Флора Белорусского Полесья: (современное состояние и тенденции развития). Мн., 1983; Радиоактивное загрязнение растительности Белоруссии (в связи с аварией на Чернобыльской АЭС). Мн., 1985 (у сааўтарстве); Определитель высших растений Беларуси. Мн., 1999 (у сааўтарстве).

ПЯТРОЎ ***Яўген Германавіч,*** нарадзіўся 19.3.1939 г. у г. Буда-Кашалёва. Доктар біялагічных навук (1983). Закончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1957), Беларускі тэхналагічны інстытут (1962). Працаваў у Смалявіцкім лягсасе, пазней — малодшы, старшы навуковы супрацоўнік, загадчык лабараторыі прадукцыйнасці і ўстойлівасці лясных экасістэм Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф.Купрэвіча АН Беларусі (1986 — 1994), прафесар кафедры лесаводства Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта (1994), віцэ-прэзідэнт Беларускага батанічнага таварыства, член экспертнага савета ВАК Беларусі. Аўтар шэрагу наву-

ковых прац. Узнагароджаны сярэбраным медалём ВДНГ СССР, Ганаровай граматай Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь і інш.

Творы: Водное питание и продуктивность сосновых фитоценозов. Мн., 1983; Водный режим и продуктивность лесных фитоценозов на почвах атмосферного увлажнения. Мн., 1983; і інш.

САЛДАЦЕНКА *Яфім Іванавіч*, нарадзіўся 3.11.1903 г. у в. Смычок. Закончыў Інстытут чырвонай прафесуры. Працаваў загадчыкам Чабатовіцкай хаты-чытальні, настаўнікам. Потым у Чырвонай арміі, кадравы афіцэр. Кандыдат гістарычных навук. Аўтар шэрагу навуковых прац па гісторыі працоўнага подзвігу рабочага класа ў гады Айчыннай вайны. Удзельнік камісіі па стварэнні гісторыі «Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза 1941—1945 гг.» Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Памёр у лютым 1986 г. Пахаваны на Міцінскіх могілках у Маскве.

САЎЧАНКА *Уладзімір Кірылавіч*, нарадзіўся 27.9.1939 г. у в. Хмяльное. Беларускі вучоны-генетык. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (1989), доктар біялагічных навук (1977), прафесар (1988), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1984). Закончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1957), Беларускі тэхналагічны інстытут імя С.М.Кірава (1962), аспірантуру пры АН Беларусі (1965). Стажыраваўся ў Гарвардскім і Каліфарнійскім універсітэтах (1981). Малодшы, старшы навуковы супрацоўнік, загадчык лабараторыі тэарэтычнай генетыкі Інстытута генетыкі і цыталогіі АН Беларусі. Старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта па праграме ЮНЕСКА «Чалавек і біясфера», неаднаразовы ўдзельнік міжнародных сесій і канферэнцый па гэтай праграме, з 1990 г. намеснік дырэктара экалагічных навук ЮНЕСКА. Аўтар больш за 280 навуковых прац, у т.л. 7 манаграфій, 3 вынаходніцтваў. Навуковыя даследаванні ў галіне агульнай і тэарэтычнай генетыкі, генетычнага аналізу, генетычных асноў селекцыі, біясферы і глабальнай экалогіі, філасофіі, міжнародных навуковых праграм. Распрацаваў навуковыя асновы міжнароднай міждысцыплінарнай праграмы па даследаванні Чарнобыльскай катастрофы і ва ўзаемадзеянні з акадэміямі навук Беларусі, Расіі і Украіны арганізаваў Чарнобыльскую экалагічную навуковую сет-

Я.І.Салдаценка.

У.К.Саўчанка.

ку ЮНЕСКА. Абгрунтаваў канцэпцыю генасферы, каэвалюцыйна ўзаемазвязанай генетычнай сістэмы біясферы, тэарэтычна абаснаваў канцэпцыю асацыятыўнага адбору, прапанаваў спосаб адбору па комплексе ацэнак для выкарыстання ў селекцыі раслін і жывёлы. Тэарэтычна даследаваў і эксперыментальна вывучыў разнастайныя генетычныя працэсы пры працяглым адборы ў папуляцыях. Узнагароджаны сярэбраным медалём ВДНГ СССР (1982); Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1985), медалём Міжнароднага біяграфічнага цэнтра «2000 выдатнейшых вучоных 20 стагоддзя» (Кембрыдж, Англія, 1999); дыпломам Амерыканскага біяграфічнага інстытута «Дасягненні дваццатага стагоддзя» (1999).

Творы: Генетика полиплоидных популяций. Мн., 1976; Генетический анализ в сетевых пробных скрещиваниях. Мн., 1984; Длительный отбор в популяциях. Мн., 1985 (у сааўтарстве); Генетический анализ и синтез практической селекции. Мн., 1986; Экология Чернобыльской катастрофы. Научные основы международной программы исследований. Мн., 1997.

СЕРДЗЮКОЎ *Анатоль Мікалаевіч*, нарадзіўся 15.5.1944 г. у пас. Герой. Фізік-тэарэтык. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (1996), доктар фізіка-матэматычных навук (1987), прафесар (1988). Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1965). Працаваў старшым інжынерам-канструктарам, малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута фізікі АН Беларусі. З 1973 г. старшы выкладчык, дацэнт, старшы навуковы супрацоўнік, загадчык кафедры, прарэктар па навуковай рабоце Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. Навуковыя вынаходніцтвы ў вобласці тэарэтычнай фізікі ў галіне праблем электра-



Т.І.Цыбранкова.

дынамікі і акустыкі кіральных асяроддзяў. У яго вынаходніцтвах дасягнута ўзгадненне электрадынамічных матэрыяльных ураўненняў з гранічнымі ўмовамі і законамі захавання, а таксама ўстаноўлена ўзаемасувязь паміж рознымі спосабамі фенаменалагічнага апісання гіратрапіі. Аўтар самаўзгаднянай тэорыі выпрамянення, распаўсюджвання, адбіцця, паглынання, рассейвання і нелінейнага ўзаемадзеяння хваль у кіральных асяроддзях. Выканаў цыкл работ па тэарэтычным вывучэнні пругкіх хваль у кіральных асяроддзях. Прадказаў эфект і пабудаваў тэорыю акустычнага і кругавога дыхраізму, сфармуляваў законы захавання для гукавых хваль з улікам частотнай і прасторавай дысперсіі, вырашыў шмат задач фотаакустыкі. Аўтар больш за 150 навуковых прац, у т.л. 8 вынаходніцтваў і навучальнага дапаможніка.

Творы: Основы теоретической кристаллооптики. Гомель, 1987; Фотоакустическая спектроскопия гидротропных слоистых образцов //Журнал прикладной спектроскопии 1990. Т. 53. №4; Фотоакустическая спектроскопия холестирических жидких кристаллов. Область бреговского отражения// Оптика и спектроскопия. 1992. Т. 72. № 2; Photoacustic Spectroscopy of Magnetoactive Layers Structures // Ceramics-47. 1995. Polish Ceramin Bulleten. T. 9.

А.М.Сердзюкоў (злева) з калегай па працы, доктарам фізіка-матэматычных навук В.І.Башлаковым. 2000 г.

СМОЛЯК Леанід Пятровіч, нарадзіўся 8.6.1923 г. в. Асобіна. Беларускі геабатанік. Доктар біялагічных навук (1968), прафесар (1979). Закончыў Беларускі лесатэхнічны інстытут (1948). Удзельнік Айчыннай вайны. З 1950 г. у Інстытуце лесу АН Беларусі. У 1956—1960 гг. загадчык аддзела гідралесамеліярацыі і глебазнаўства БелНДІ лясной гаспадаркі, у 1971—1977 гг. загадчык лабараторыі прадукцыйнасці і воднага рэжыму фітацэнозаў Інстытута эксперыментальнай батанікі АН Беларусі, з 1977 г. загадчык кафедры дэндралогіі і фізіялогіі раслін Беларускага тэхналагічнага інстытута. Працы па гідралесамеліярацыі і лясным балотазнаўстве. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1972).

Творы: Болотные леса и их мелиорация. Мн., 1969; Эколого-физиологические основы мелиорации лесных почв. Мн., 1971 (у сааўтарстве); Эколого-физиологические основы мелиорации почв агрофитоценозов. Мн., 1974 (у сааўтарстве); Водное питание и продуктивность сосновых фитоценозов. Мн., 1978.

ЦЫБРАНКОВА Тамара Іванаўна, нарадзілася 8.6.1958 г. у в. Крыўск. Закончыла Крыўскую васьмігадовую школу (1973), гомельскія кааператыўныя тэхнікум (1976) і інстытут (1980), педагагічны факультэт Маскоўскага кааператыўнага інстытута (1981), аспірантуру пры Маскоўскім інстытуце народнай гаспадаркі імя Г.В.Пляханава (1988). Кандыдат тэхнічных навук (1989). Асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт, намеснік загадчыка кафедры непрадуктовых тавараў Гомельскага кааператыўнага інстытута. Аўтар больш за 30 навуковых і вучэбна-метадычных прац. Сааўтар 3 пасведчанняў на вынаходніцтвы і адкрыцці.

ЦЫКУНОВА Іна Валянцінаўна, нарадзілася 26.11.1969 г. у в. Стараселле. Закончыла Буда-Кашалёўскую школу № 2 з залатым медалём (1987), Віцебскі медыцынскі інстытут (1993), клінічную ардынатуру (1995). Асістэнт, выкладчык Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканальвання ўрачоў. Кандыдат медыцынскіх навук. Аўтар 13 навуковых прац, у т.л. манаграфіі «Атэрасклероз і радыяцыя».

ЧАЯНКОВА Галіна Міхайлаўна, нарадзілася 17.8.1956 г. у в. Бацунь. Закончы-

ла Бацунскую сярэднюю школу з залатым медалём (1973), Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны (1978), аспірантуру. Кандыдат гістарычных навук (1989), дацэнт (1994). Працавала настаўніцай гісторыі, лабарантам, асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры гісторыі і паліталогіі, дэканам гуманітарна-эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту. Аўтар больш за 15 навуковых прац па гісторыі Беларусі.

ЧЭПІКАЎ Віктар Цімафеевіч, нарадзіўся 7.11.1950 г. у в. Чабатовічы. Доктар педагагічных навук (1998). Закончыў Чабатовіцкую сярэднюю школу з сярэбраным медалём (1967), Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны (1972), аспірантуру (1983). Працаваў настаўнікам, на камсамольскай і партыйнай рабоце, выкладчыкам, загадчыкам кафедры, намеснікам дырэктара педагагічнага каледжа, пазней — прафесар кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Аўтар больш за 90 навуковых і навукова-метадычных прац, з якіх 2 манаграфіі.

ШАКЛАНАЎ Іван Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1925 г. у в. Крыўск. Закончыў Крыўскую сямігадовую школу (1940). Удзельнік Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі закончыў сярэднюю школу працоўнай моладзі, Мінскі кааператыўны інстытут (1953), аспірантуру. Кандыдат эканамічных навук. Працаваў дырэктарам дзяржаўнага універмага ў Мінску, выкладчыкам, дацэнтам Беларускага інстытута народнай гаспадаркі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Памёр 13.11.1998 г.

ЯЦКОЎ Васіль Сяменавіч, нарадзіўся ў 1930 г. у в. Гаўлі. Доктар эканамічных навук (1976). Закончыў Гаўлеўскую сямігодку, сярэднюю школу працоўнай моладзі (1951), Днепрапятроўскі горны інстытут імя Арцёма (1957). Па накіраванні інстытута працаваў нарміроўшчыкам на Змеінагорскім свінцова-цынкавым рудніку ў Алтайскім краі. З 1958 г. працаваў інжынерам, старшым вядучым інжынерам, начальнікам сектара, намеснікам, начальнікам аддзела ў Данецкім навукова-даследчым вугальным інстытуце. У 1963 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. З'яўляўся начальнікам сектара Данецкага аддзялення Інстытута эканомікі АН УССР, загадчыкам аддзела эканамічных праблем тэхнічнага прагрэсу Інстытута эканомікі прамысловасці Украіны.

Г.М.Чаянкова.

І.Р.Шакланаў.

В.С.Яцкоў.

Падрыхтавалі А.М.Галіцкі, У.Я.Райскі, Г.М.Чаянкова.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ДЗЕЯЧЫ І ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

АРОЛ Нічыпар Максімавіч, нарадзіўся ў 1893 г. у в. Рудзянец. Удзельнік барацьбы за савецкую ўладу на Беларусі ў гады грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі. За ўдзел у сялянскіх хваляваннях быў зняволены ў турму. З 1912 г. працаваў на чыгуначным вузле ў Гомелі. У снежні 1917 г. уступіў у 1-ы Палескі чырвонагвардзейскі атрад. З пачатку 1918 г. на чале атрада ўдзельнічаў у барацьбе супраць легіянераў Доўбар-Мусніцкага і нямецкіх акупантаў. Летам 1918 г. атрад пад яго камандаваннем ахоўваў участак чыгункі Сімбірск — Бугульма ад узброеных бандаў, што не прапускалі эшалоны з харчаваннем у Пет-

Е.Т.Гуцанкова.

В.П.Сердзюкоў.

раград і Маскву, насельніцтва якіх галадала. Вярнуўшыся на радзіму, вёў падпольную барацьбу супраць інтэрвентаў, закончыў Гомельскую школу саўпартработнікаў і ў 1924—1926 гг. працаваў у Клінцах, Бежыцы, пазней — дырэктар саўгаса, інстытута соі, інспектар саўгасаў Наркамзема СССР. Памёр 13.5.1934 г.

АЎРАМЕНКА Вольга Сысоеўна (глядзі Народны настаўнік СССР).

БУСЛАЎ Казімір Паўлавіч (глядзі Імі ганарацца землякі: Вучоныя).

ВІШНЯКОВА Любоў Раманаўна, палявод калгаса імя Чапаева. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 9-га склікання.

ГУЦЯНКОВА Еўдакія Трафімаўна, нарадзілася 27.2.1905 г. у в. Сялец. Дзяржаўны дзеяч БССР. Закончыла ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1951). З 1927 г. на партыйнай, гаспадарчай, прафсаюзнай рабоце. У 1938—1959 гг. — міністр сацыяльнага забеспячэння БССР. Член ЦК КПБ (1952—1956). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1938—1959).

ДЗЯРЖЫНСКІ Іван Ігнацьевіч (глядзі Героі Сацыялістычнай Працы).

ЖУКАЎ Васіль Аляксеевіч (глядзі Героі Сацыялістычнай Працы).

ІЛЬЮШЧАНКА Кацярына Савельеўна, нарадзілася 28.4.1928 г. у в. Бацунь. Закончыла 7 класаў Бацунскай школы, працавала калгасніцай, даяркай у калгасе «Чырвоны шлях». Узнагароджана ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны», медалямі. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Як дэпутат працавала ў складзе аграрных камісій Вярхоўнага Савета БССР.

КАВАЛЁЎ Пётр Купрыянавіч (глядзі Героі Сацыялістычнай Працы).

КАСТРОВА Нэлі Вітольдаўна (глядзі Героі Сацыялістычнай Працы).

КІРЫЛЕНКА Уладзімір Міхайлавіч (глядзі Героі Сацыялістычнай Працы).

КІСЯЛЁЎ Рыгор Якаўлевіч, нарадзіўся 18.5.1913 г. у в. Мікалаеўка. Дзяржаўны дзеяч БССР. Кандыдат гістарычных навук (1951). Заслужаны дзеяч культуры БССР (1963). Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут, Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК ВКП(б) (1951). У 1932—1936, 1938—1939 на педагагічнай рабоце ў Буда-Кашалёўскім і Касцюковіцкім раёнах. З 1939 г. на палітычнай рабоце ў Чырвонай арміі. Удзельнік Айчыннай вайны, двойчы быў паранены. З 1942 г. загадчык партыйнага кабінета, аргінструктарскага аддзела, 2-і сакратар Петухоўскага райкома ВКП(б) Курганскай вобл. З 1945 г. на кіруючых пасадах у партыйных і савецкіх органах БССР: 2-і сакратар Гомельскага райкома партыі, намеснік загадчыка аддзела кадраў Гомельскага абкома партыі. З 1947 г. у ЦК КП(б)Б: загадчык аддзела, намеснік начальніка ўпраўлення кадраў, загадчык аддзела ВНУ. З 1953 г. міністр культуры, з 1964 г. міністр адукацыі БССР, у 1968—1970 гг. намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР. Член ЦК КПБ (1952—1970). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1951—1970). Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі. Памёр 19.4.1970 г.

ЛЯЛІХАВА Лідзія Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1942 г. у в. Бронніца. Працавала даяркай. Узнагароджана ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі ВДНГ СССР. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

МАРЧАНКА Міхаіл Рыгоравіч, нарадзіўся ў в. Гусявіца. Шафёр калгаса імя Леніна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

НОВІКАВА Алена Аляксандраўна, нарадзілася ў 1960 г. у г. Орша Віцебскай вобл. Закончыла Лужаснянскі саўгастэхнікум (1979). Працуе на Гомельскай бройлернай фабрыцы старшым аператарам у цэху інкубацыі. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

СЕРДЗЮКОЎ Валерый Паўлавіч. Дзяржаўны дзеяч Расіі. Нарадзіўся 9.11.1945 г. у в. Харошаўка. Закончыў Ленінградскую вышэйшую партшколу

(1975), Ленінградскі горны інстытут імя Г.В.Пляханава (1987). Кандыдат эканамічных навук. Акадэмік Міжнароднай акадэміі экалогіі і бяспекі прыроды і чалавека. Працаваў у геадэзічным атрадзе ў Якуціі, фармоўшчыкам на заводзе «Гомсельмаш», сезонным рабочым геадэзічнага атрада ў Чыцінскай вобл. Пасля дэмабілізацыі ў 1967 г. з Савецкай арміі працаваў падземным горнарабочым, камсоргам шахты № 32 камбіната «Варкутавугаль». З 1975 г. па 1990 г. знаходзіўся на партыйнай рабоце: інструктар, загадчык аддзела аргпартработы, сакратар, 2-і, 1-ы сакратар Варкуцінскага ГК КПСС. З 1990 г. намеснік генеральнага дырэктара, начальнік упраўлення тэхнічнага кантролю якасці вугалю і стандартаў аб'яднання «Варкутавугаль». З 1996 г. віцэ-губернатар, першы віцэ-губернатар, в.а. губернатара, з верасня 1999 г. губернатар Ленінградскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай славы III ступені, Пашаны, нагрудным знакам «Шахцёрская слава» I, II і III ступеней.

ШАРЫКАВА Еўдакія Іванаўна, нарадзілася 23.6.1935 г. у в. Крыўск. Працавала свінаркай, паляводам. Узнагароджана сярэбранымі медалямі ВДНГ (двойчы). Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

ТВОРЦЫ

АДАШКЕВІЧ Барыс Якаўлевіч, нарадзіўся 20.6.1934 г. у г.п. Буда-Кашалёва. Паэт. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1959). Працаваў у в. Палессе Чачэрскага раёна, з 1960 г. у сярэдняй школе № 2 г. Буда-Кашалёва настаўнікам фізічнага выхавання. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалём. Больш за 30 гадоў захапляецца паэзіяй. Выйшлі дзве кнігі вершаў.

БАБКОЎ Уладзімір Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1946 г. у в. Салтанаўка. Паэт. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў у рэдакцыях раённых газет, на абласным радыё. Выкладаў гісторыю ў Буда-Люшаўскай сярэдняй школе. Аўтар зборнікаў вершаў для дзяцей «Што такое БМП» (1978), «Калі ветрык спачывае», а таксама адзін з аўтараў аповесці «Світанак над сялом» (1968). Закранае праблемы працоўнага, патрыятычнага і эстэтычнага выхавання дзяцей, падлеткаў.



Е.І.Шарыкава.



Б.Я.Адашкевіч.

ГАБЕЕЎ Васіль Хрысанавіч, нарадзіўся 24.10.1922 г. у в. Пыцькаўка. Паэт. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Першыя вершы надрукаваны яшчэ да вайны. У іх гучыць напружанасць тагачаснага жыцця, пафас мірнай стваральнай працы. Выступаў на старонках рэспубліканскіх газет «Літаратура і мастацтва», «Настаўніцкая газета». Адзін з аўтараў калектыўнага зборніка паэзіі «Перасветы». У яго творах пераплятаюцца ўспаміны пра даваенны час і суровы вясковы побыт з мірным сённяшнім жыццём. Вершы лірычныя, прачулыя, у іх нязменна прысутнічаюць светлыя, непаўторныя палескія краявіды. Як і многіх сённяшніх паэтаў, яго хвалюе лёс роднай мовы, роднага народа:

Якія б мовы я не ведаў,
Але з усіх пазнаных моў
Я мову прадзедаў і дзедаў
Забыць бы аніяк не змог...
У роднай мове — быль і казка,
Мой шчасны лёс, мой мужны час,
Пяшчота матчынае ласкі
І строгі бацькаўскі наказ.

Лірыка паэта — з'ява па-свойму цікавая і ў мастацкім плане. Ён умее перадаваць нараджэнне думкі, ход разважанняў. І гэта надае яго творам надзвычай прывабную якасць: яны спалучаюць непасрэднасць пачуцця паэта з інтэлектуальнай сталасцю яго лірычнага «Я».

ГАРЭЛІКАВА Таццяна Іванаўна, нарадзілася 28.11.1947 г. у в. Патапаўка. Беларускі празаік. Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт (1970). Працавала бібліятэкарам, старшай піянерважатай, арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы, дырэктарам сярэдняй

Ф.С.Грыг'ян.

школы, інспектарам Мінскага раёна, з 1979 г. намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі, сакратаром Мінскага райкома КПБ, з 1985 г. рэдактар аддзела прозы часопіса «Нёман». Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1979). З першымі апавяданнямі выступіла ў друку у 1962 г. Выдала зборнікі аповесцей і апавяданняў «Дзе лес шуміць» (1978), «Пры святле расставанняў» (1985) і інш.

ГАСПАДАРОЎ Піліп Паўлавіч, нарадзіўся ў 1865 г. у в. Забаб'е. Народны казачнік. У 1905 г. за ўдзел у сялянскім выступленні на Магілёўшчыне быў сасланы ў в. Шуя (Карэлія). Пасля вызвалення з-пад нагляду паліцыі ў 1907 г. перасяліўся ў г. Петразаводск. Працаваў кавалём на Аляксандраўскім заводзе. Казачны рэпертуар засвоіў у дзяцінстве ад аднавяскоўца, селяніна К.К.Шаўцова. У 1937—1938 гг. ад Гаспадарова фальклардыст М.У.Новікаў запісаў 106 казак, прыказкі, загадкі. Традыцыйная для беларускага казачнага эпасу антыпамешчыцкая і антыклерыкальная накіраванасць характэрная і для казак Гаспадарова («Салдацкія сыны», «Пра дурнога Амелю», «Пра залатое яечка», «Поп і работнік», «Каваль і поп», «Праўда пра святога Феадосія»). На аснове традыцыйных сюжэтаў створаны казкі на савецкую тэматыку («Як мужык і рабочы праўду шукалі», «Чырвоныя арляняты», «Як Мар'я з Іванам зраўняліся»). Казкі Гаспадарова вылучаюцца шырокім выкарыстаннем сродкаў традыцыйнай фальклорнай паэтыкі, трапных прыказак, загадак, майстэрствам дыялогаў. Казка Гаспадарова «Салдацкія сыны» ў перакладзе на нямецкую мову Г.І.Грыма ўвайшла ў складзены Л.Р.Барагам зборнік «Беларускія народныя казкі» (Берлін, 1966). Памёр П.П.Гаспадароў 9.7.1938 г.

ГРЫГ'ЯН Францыс Станіслававіч, нарадзіўся 26.3.1937 г. у Латвіі. Мастацкую адукацыю атрымаў у Рызе і на мастацка-графічным факультэце Віцебскага педагагічнага інстытута. Жывапісец. Вядомы як пейзажыст. Яго творы вылучаюцца спакойнай гармоніяй фарбаў і няяркім каларытам, але ў іх жыве подых прыроды. Асабліва вабяць кампазіцыі мастака пра поры года. Яго пейзажы «Бярозавы гай», «Звініць лета», «Далягляды», «Іней», «Жыта паспела», «Асенняя сімфонія» і многія іншыя ярка адлюстроўваюць беларускую зямлю, перадаюць адзінства навакольнага асяроддзя з чалавекам. Акрамя пейзажаў Францыс Станіслававіч напісаў нямала тэматычных карцін. Выдзяляецца высокім зместам яго

М.Гуршчанкоў. Ля возера.

трыццех аб мінулай вайне, мужнасці нашых салдат, пра тых маці, якія страцілі сваіх мужоў і сыноў на франтавых дарогах і ў партызанскіх атрадах. Ф.С.Грыг'ян з'яўляецца таксама аўтарам маляўнічых нацюрмортаў. Жыве і працуе ў г. Буда-Кашалёва.

А.М.Шныпаркоў.

ГУРШЧАНКОЎ Мікалай Ігнатавіч, нарадзіўся 6.2.1950 г. у в. Гаўлі. Закончыў Патапаўскую сярэднюю школу, Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1976). Член Беларускага саюза мастакоў (1988). Працаваў на заводзе «Гомсельмаш» і адначасова займаўся ў студыях выяўленчага мастацтва г. Гомеля. З 1976 г. удзельнічае ў выставах. На пачатку творчага шляху асноўную ўвагу надаваў графіцы, у апошні час актыўна займаецца і жывапісам. Галоўныя тэмы — жыццё вёскі, маляўнічая родная прырода. Асноўныя работы: «Вясна ў вёсцы», «Дзед Андрэй», «Сад пад дажджом», «Ля возера», «Летні поўдзень», «Вясна на Палессі» і інш. У 1980-я гады працаваў у Гомельскіх вытворча-мастацкіх майстэрнях (цяпер камбінат «Мастацтва»), дзе стварыў шэраг манументальных работ для мастацкага афармлення будынкаў. Творы мастака знаходзяцца ў Гомельскім і Брэсцкім абласных краязнаўчых музеях, музеях Заслаў'я, Веткі, Кобрына. У 1999 г. мастак быў удзельнікам міжнароднага пленэра жывапісу ў Буда-Кашалёве, які прысвячаўся памяці народнага мастака СССР Я.Я.Майсеенкі. Жыве ў Брэсце.

А.М.Шныпаркоў.

ДЗЮБА Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся 24.2.1946 г. у г. Палтава, Украіна. Беларускі паэт і драматург. Дзяцінства прайшло ў в. Патапаўка. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1968). Працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Мікалаеўскай сярэдняй школе Буда-Кашалёўскага раёна, арганізаваў літаратурнае аб'яднанне пры раённай газеце «Авангард». Служыў у Савецкай арміі (1969—1970), пасля працаваў літсупрацоўнікам у веткаўскай раённай газеце «Перамога Кастрычніка», з 1971 г. рэдактар на Гомельскай студыі тэлебачання, у 1972—1977 гг. літсупрацоўнік газеты «Гомельская праўда», з 1978 г. карэспандэнт газеты «На страже Октября», з 1980 г. — старшы рэдактар літаратурна-драматычнага вяшчання на Беларускім радыё. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1986 г. Узнагароджаны медалём.

М.І.Гуршчанкоў.

У.І.Дзюба.

Першы верш «Выйду ў поле» надрукаваў у буда-кашалёўскай раённай газеце «Ленінскі шлях» яшчэ ў школьныя гады. У 1963 г. адбыўся яго літаратурны дэбют у рэспубліканскім друку — падборка вершаў у газеце «Чырвоная змена». Аўтар зборнікаў паэзіі «Вуліцы без назваў» (1972), «Кругазварот» (1976), «Карані бліскавіцы» (1986), вершаванай драмы «Доктар Русель» (1985, пра ўраджэнца Магілёўшчыны, рэвалюцыянера-народніка М.Судзілоўскага), вершаваных драматычных аповесцей «На Радзівілішчы» (1992), «Памінальная па Банапарту каля беларускага тракту» (1995), радыёп'ес у вершах «Жыццё рэвалюцыянера» (з А.Пётухам, пастаўлена ў 1987), «Я, Арлоўскі» (пастаўлена ў 1989), «Нарачным. Рукевічу. Рылееў» (пастаўлена ў 1990). Для творчасці У.Дзюбы характэрны лірызм, філасофскі роздум. У апошніх творах распрацоўвае гістарычную тэматыку.

П.І.Навуменка.

ЗЭКАЎ Анатоль Мікалаевіч, нарадзіўся 20.1.1955 г. у в. Патапаўка. Беларускі паэт, празаік. У 1977 г. закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Яшчэ будучы студэнтам пачаў працаваць карэспандэнтам гомельскай раённай газеты «Маяк». Са снежня 1977 г. па жнівень 1980 г. у Гомельскім райкоме камсамола: загадчык аддзела, 2-і сакратар. У 1980 г. накіраваны на вучобу ў Вышэйшую камсамольскую школу пры ЦК ВЛКСМ, пасля заканчэння якой працаваў інструктарам ЦК ЛКСМБ. З 1985 г. па 1990

г. у рэдакцыі рэспубліканскай маладзёжнай газеты «Чырвоная змена»: загадчык аддзела, адказны сакратар, наменік рэдактара. Потым узначальваў мінскую гарадскую газету «Добры вечар» і штотыднёвік «Сталіца», працаваў намеснікам галоўнага рэдактара штотыднёвіка «Книга и мы». Са снежня 1997 г. галоўны рэдактар «Беларускай лясной газеты». Першы верш апублікаваў у 1969 г. у газеце «Піянер Беларусі». Выступае ў розных літаратурных жанрах (паэзія, проза, драматургія, крытыка, публіцыстыка). Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1994. Выдаў паэтычныя зборнікі «Боль сумлення» (1989), «Дуэль» (1994), «Дуэль-2» (1995), кнігі казак для дзяцей «Чатыры зярняткі» (2000) і апавяданняў «Вясельнае падарожжа ў Стамбул» (2000). Асобным выданнем выйшла паэма пра чарнобыльскую трагедыю «Аварыя сумлення» (1996). Творы А.Зэкава перакладаліся на рускую мову, некаторыя яго вершы пакладзены на музыку.

З твораў Анатоля Зэкава

БУДА-КАШАЛЁВА

Хай хтось ляціць у свет за словам,
Каб недзе адшукаць радок,
А я — у Буда-Кашалёва,
Хачу ў раённы гарадок.
Хай ён нічым і не багаты,
І хай на помнікі — не Бог,
Ён для мяне — жыцця пачатак,
Пачатак ўсіх маіх дарог.
Я тут не ведаю знямогі,
Я тут не ведаю бяды.
Куды б не йшлі мае дарогі,
Яны вяртаюцца сюды.
Нібы праверыць вернасць слову,
Праверыць кожны свой радок
Прыходжу ў Буда-Кашалёва,
Ў раённы ціхі гарадок.

ПАТАПАЎСКІЯ МОГІЛКІ

На могілках — спакой і ціша.
Тут нават не гудуць вятры.
У цэнтры вёскі, на узвышшы,
ляжаць яе гаспадары.

Ляжаць Марылі і Іваны
пад дзірванамі траў густых.
Іх не разбудзяць пеўні рана,
не закалышуць зоры іх.

Не ім — снягі, дажджы і сонца.
Невінаватыя ні ў чым,
ляжаць мае аднавяскоўцы
пад кронай белых аблачын.

Хто — похапкам,
хто — нетаропка,
як хто з іх мог —
так век пражыў.
На лёсах іх апошняй кропкай
Стаяць замшэлыя крыжы.

Анатоль Зэкаў з бацькам Мікалаем Абрамавічам і маці Наталляй Цімафееўнай каля роднай хаты. 1997 г.

ЖЫВЕ МАЯ ПАТАПАЎКА!

Пры ўездзе ў маю родную вёску, у нейкай сотні метраў ад чыгуначнага пераезду, над асфальтавым шляхам правісаюць нацягнутыя на металічныя слупкі, што зроблены ў выглядзе стылізаваных жытнёвых каласкоў, дзевяць выпілаваных драўляных літар, якія складаюць слова ПАТАПАЎКА. Некалі, праводзячы мяне з дому на цягнік на Мінск, бацька кінуў: «Мая работа, — і не без гонару дадаў: — Па тры рублі за кожную заплацілі...» На той час, калі ён атрымліваў у саўгаснай сталярцы 60 рублёў, а бохан хлеба каштаваў 14 капеек, гэта і сапраўды былі немалыя грошы. Хоць, наўрад ці імі вымяраецца бацькаў гонар?!

Адкуль паходзіць назва Патапаўка, я, на жаль, не ведаю. Кажуць, даўно, калі на месцы сённяшняй вёскі былі адно што зацямрэчаныя лясы ды непраходныя балоты, сюды ўцяклі, ратуючыся ад жорсткага пана, браты Яўсей і Патап. Шукаючы месца пад будучае паселішча, разышліся. Колькі яны так блукалі паасобку, невядома, аднак, калі Яўсей урэшце ўзбіўся на больш-менш прыгодны пагорачак, то адразу ж, як і дамаўляліся, пачаў клікаць брата: «Патапка-а-а, Патапка-а-а...» І хоць рэха далёка разносіла Яўсееў голас, брат так і не адгукнуўся. Загінуў, пэўна, недзе ў пражорлівай багне. І пасяліўся Яўсей сярод лясоў і балот адзін. А неўзабаве і яшчэ той-сёй прыбіўся да ягонага будана. Так і з'явілася людское паселішча, названае ў гонар Яўсеевага брата Патапка, якое стала потым Патапаўкай.

Быль гэта ці легенда, не ведаю. Можа, калі хто з маіх больш настырных землякоў і дакапаецца да існых каранёў назвы? Хацелася б, калі ў самога рукі не даходзяць...

А так мая родная вёска нічым адметным не вылучаецца. Бадай, такая ж, як і шмат іншых, што месцяцца ў межах Буда-Кашалёўшчыны — хіба што, можа, «абскакала» большасць з іх па памерах: пры маім нараджэнні звыш 800 двароў налічвала. Яе вуліцы і завулкі разбягаюцца ад цэнтра, дзе могілкі, нібыта галіны і галінкі ад ствала вялікага дрэва. Мусіць, каб узняцца ўгару на верталёце — менавіта так бы яно і ўбачылася. «Ствол» жа гэтага разгалага «дрэва» лёг узбоч чыгункі (ці, хутчэй, яна каля яго). Далёка разцягнулася мая Патапаўка — то ж цягнік-дызель аж два прыпынкі робіць у вёсцы! Спачатку яны так і называліся: Патапаўка-1 і Патапаўка-2. Для сваіх, безумоўна, усё зразумела, а прыезджыя зазвычай блыталіся, з якога боку лічыць. Вось і перайменавалі «другую» Патапаўку ў Качанава.

Гісторыя вёскі, вядома ж, сягае ў пазарэвалюцыйны час, аднак большасцю сваёй усё ж часцей згадваюцца падзеі пасля 1917 года. Шмат перажыла мая Патапаўка: прайшла і праз раскулачванне, і праз сталіншчыну, і праз Айчынную вайну. Бацькавы ўспаміны пра апошнюю вайну (а калі тая пачалася, яму было 12 гадоў) у памяці заселі найбольш учэпіста. Пра яе нагадвае і помнік воіну-вызваліцелю каля былога сельскага клуба. Дарэчы, у 1943-м, калі ішло наступленне, у баі, што разгарнуўся тут, палегла 634 воіны. Балючай згадкай пра вайну — і чырвоныя зорачкі на вясковых хатах, адкуль пайшлі на фронт і куды не вярнуліся мае землякі. 470 сваіх жыхароў ахвяравала Патапаўка на алтар агульнай Перамогі. Уяўляеце: калі б памяць кожнага з гэтых 1104 загінуўшых воінаў ушанаваць хвілінай маўчання, мы б замоўклі на васемнаццаць з паловай гадзін!..

Дзеці і ўнукі — нашчадкі ратнай славы сваіх гераічных бацькоў і дзядоў — адбудавалі вёску, памножылі яе дабрабыт. Прыемна, што Патапаўка паставіла на крылы аж трох членаў Саюза беларускіх пісьменнікаў: акрамя мяне, гэта Уладзімір Дзюба і Таццяна Гарэлікава. Усім любоў да роднай мовы прывіла адна і тая ж настаўніца — Ульяна Фёдараўна Лазавенка. Светлую памяць пра яе кожны з нас захавае датуль, покуль і жыць будзе. Сярод маіх землякоў — вучоныя і інжынеры, ваенныя і настаўнікі, урачы і юрысты, кіраўнікі розных рангаў і хлебаробы. Шкада толькі, што незайздросны лёс, які напаткаў нашы айчынныя вёскі, не абышоў і маю Патапаўку. З усіх сіл выпіналіся вяскоўцы, выпраўляючы сваіх сыноў і дачок далей ад няўтульных мехмайстэрань і непралазных ад гразі фермерскіх двароў да чысцейшай работы ў вабны горад. А тут яшчэ і Чарнобыль сваім чорным крылом зачапіў. І таму ўсё самотней становіцца ў вёсцы без звонкіх дзіцячых галасоў. Сёння тут, як і ва ўсёй краіне, больш памірае, чым нараджаецца.

І ўсё ж жыве мая Патапаўка, цяжка, з надрывам, але жыве. І моладзь застаецца ў ёй, і той-сёй са з'ехаўшых, паспытаўшы гарадскога хлеба, вяртаецца назад, да баць-

А.С.Кейзераў.

В.М.Крыловіч.

М.І.Літвінаў.

коўскіх сялібаў. І працягваецца радавод Зэкавых, Кірыленкаў, Гарэлікавых, Шутавых, Янчанкаў... І ў школу бягуць мае землякі, і ў Буда-Кашалёўскі аграгэхнічны каледж, што ў чатырох кіламетрах ад вёскі, паступаюць...

Жыве мая Патапаўка, жыве! Няхай доўга жыве! Вечна!

КЕЙЗАРАЎ (сапр. **КЕЙЗЕРАЎ**) ***Аляксей Сцяпанавіч,*** нарадзіўся 4.10.1928 г. у в. Бронніца. Беларускі пісьменнік. Закончыў Гомельскі тэхнікум чыгуначнага транспарту (1948), Гомельскі настаўніцкі інстытут (1955). Працаваў апаратарам, дыспетчарам станцыі Казань, старшым памочнікам начальніка станцыі ў Калінкавічах, настаўнікам (1951—1962, 1964—1967). У 1962—1963 гг. карэспандэнт газеты «Калгасная праўда», у 1967—1974 гг. рэдактар на Беларускім радыё, у 1974—1988 гг. карэспандэнт часопіса «Беларусь», літкансультант часопіса «Нёман». Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1982. Друкуецца з 1953 г. Піша на рускай мове. Аўтар кніг прозы «Нас было сямёра» (аповесці, 1963), «Не ведаючы спакою» (нарыс, 1963), «Рэха на Палессі» (дакументальная аповесць, Масква, 1979). Для дзяцей выдаў кнігі «Хітры цвічок» (1966), «Першы разведузвод» (1969), "У нас у Тапалёўцы» (1976), «І вернуцца жураўлі» (1998).

У яго літаратурным запісе выйшлі кнігі ўспамінаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны Э.Лаўрыновіча «Вогненныя рэйкі» (1970, 1974), І.Зуевіча «Райком у падполлі» (1972), С.Ляснічага «Далёка за фронтам» (1972), М.Дзмітрыева «У ціхай Серабранцы» (1975) і «У імя жыцця» (1981), М.Фядотава «Разведка вядзе пошук» (1976) і «Разведка працягвае пошук» (1988), М.Гірыловіча «Дальва — сястра Хатыні» (1977, 1981, 1987), А.Мазанік «Кара» (1981, 1988), М.Усава «У сям'і партызанскай» (1988).

КРЫЛОВІЧ *Валянціна Міхайлаўна,* нарадзілася 1.6.1951 г. у в. Буда-Люшаўская. Заслужаная артыстка Беларусі (1988). Закончыла Буда-Люшаўскую сярэднюю школу (1968), школу Гомельскага Дома народнай творчасці. Працавала дырэктарам Уваравіцкага Дома культуры. З 1969 г. харыстка, з 1971 г. салістка Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору імя Цітовіча. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

ЛІТВІНАЎ *Мікалай Іванавіч,* нарадзіўся 1.5.1946 г. у пас. Новы Свет. Закончыў Чабатовіцкую сярэднюю школу (1963), філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. Некаторы час працаваў у Старабудскай школе, першым сакратаром Буда-Кашалёўскага райкома камсамола, сакратаром Гомельскага абкома камсамола, на партыйнай рабоце. З 1983 г. — у органах унутраных спраў. М.І.Літвінаў вядомы і як паэт. Яго вершы друкаваліся ў абласным і рэспубліканскім друку, калектыўных зборніках «Магістраль-92», «Магістраль-95». Ён аўтар зборніка вершаў «Світанак», аповесці «Актава». Член Беларускага саюза журналістаў (1980).

МАЙСЕЕНКА *Яўсей Яўсеевіч,* нарадзіўся 28.8.1916 г. у г.п. Уваравічы. Савецкі жывапісец. Правадзейны член АМ СССР (1973). Народны мастак РСФСР (1965), СССР (1970). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РСФСР імя Рэпіна (1966), Ленінскай прэміі (1974), Дзяржаўнай прэміі СССР (1983). Герой Сацыялістычнай Працы (1986). Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў (1976). Закончыў Уваравіцкую

сямігадовую школу (1931), Маскоўскае мастацка-вытворчае вучылішча імя Калініна (1935), вучыўся ў Акадэміі мастацтваў у Ленінградзе (1936—1947). У 1941 г. удзельнік абароны Ленінграда, трапіў у фашысцкі палон, знаходзіўся ў канцлагеры Альтэнграбен, каля Магдэбурга. Пасля вызвалення з палону — у Чырвонай арміі. З 1958 г. выкладаў у Ленінградскім інстытуце жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Я.Рэпіна (з 1963 г. прафесар кафедры жывапісу). Працаваў пераважна ў батальным, пейзажным, партрэтным жанрах. Падзеям грамадзянскай вайны і калектывізацыі ў Беларусі прысвечаны карціны «Чырвоныя прыйшлі» (1961), «Чарэшня» (1969), «У калгас» (1987) і інш. Вялікай Айчыннай вайне прысвечаны палотны «Генерал Даватар» (1947), «Апалчэнцы» (1960), «Перамога» (1972), «Ветэраны» (1978), цыкл «Гэтага нельга забыць» і інш. Жывапіс Майсеенкі адметны шырокай экспрэсіўнай манерай пісьма, дынамікай кампазіцыйных рытмаў. Сярод буйнейшых твораў мастака — «Зямля» (1964), «Сяргей Ясенін з дзедам» (1964), «Цішыня» (1970), «Дон Кіхот» (1974), «Песня» (1982) і інш. Ім створана таксама галерэя партрэтаў, нацюрморты рознай тэматыкі. Толькі ў Дзяржаўным Рускім музеі ў Санкт-Пецярбургу захавалася больш за 200 палотнаў майстра, значная іх колькасць у асабістых калекцыях і іншых музеях. Беларусі прысвечаны карціны «З дзяцінства» (1977), «У вайну» і «Жанчына ў чорным» (абедзве 1978) і іншыя. Памёр Я.Я.Майсеенка 29.11.1988 г. Пахаваны ў г. Санкт-Пецярбург. На доме па Сувораўскім праспекце ў Санкт-Пецярбургу ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

ДЗЯРЖАВА ЖЫВАПІСУ ЯЎСЕЯ МАЙСЕЕНКІ

У жніўні 1999 года ў Буда-Кашалёве адбылася жаданая падзея ў сучасным культурным жыцці — пленэр для мастакоў... Трынаццаць майстроў пэндзля з Беларусі, Украіны і Расіі выказалі на палотнах свае светаадчуванні.

Буда-Кашалёўскі раён, дзе каля трох тыдняў жылі мастакі, быў абраны не выпадкова. Справа ў тым, што ў раёне, у г.п. Уваравічы, нарадзіўся вядомы класік жывапісу савецкай эпохі Яўсей Яўсеевіч Майсеенка, памяці якога і быў прысвечаны названы пленэр... Жывапісны стыль

Я.Я.Майсеенка.

славутага земляка, у якім рэалізм узмацняецца рамантычнымі інтанацыямі, стаў для мастакоў прыкладам высокага майстэрства.

Імклівы, палкі вобраз Я.Майсеенкі ўдала стварыў у сваім трыпціху мінчанін Святаслаў Федарэнка. Адразу пазнаюцца адметныя рысы майстра. Вось ён — сялянскі сын (і адначасова быццам нейкі былінны герой) упэўнена крочыць праз браму сваёй уваравіцкай сядзібы. У адной руцэ — падрамнік будучай карціны, у другой — жменя спелых вішань як сімвал сокаў роднай зямлі, сокаў жыцця. Вобраз

Я.Майсеенка. Дома. 1985 г.

мастака дапаўняюць лірычны краявід з млынам на ўзгорку, дзе прайшло юнацтва Майсеенкі, і партрэт яго маці, якая трымае сваімі спрацаванымі рукамі падол, паўнюткі яблыкаў.

Сярод выстаўленых на пленэры работ С.Федарэнкі акрамя партрэта самога Майстра ёсць і каларытныя партрэты землякоў Яўсея Яўсеевіча.

Сярод удзельнікаў пленэру неабходна адзначыць гамяльчаніна Роберта Ландарскага. Кожнае яго палатно — своеасаблівы верш, у якім шчыра выказана любоў да роднай прыроды. Такому паэтычнаму ўспрыманню карціны садзейнічае незвычайная пабудова кампазіцыі. У гэтым таксама бачны ўплыў Я.Майсеенкі, які быў упэўнены, што «...без лірычнага пачатку ў жывапісе немагчыма стварыць сапраўднае мастацтва».

Так, асоба Майстра будзе прыцягваць і хваляваць не адно пакаленне. У гэтым пераконваешся, калі бачыш палотны вучня Я.Майсеенкі — мастака з Санкт-Пецярбурга Я.Барскага. Драматызм і лірызм, суровасць і пяшчота гарманічна спалучаюцца ў яго карцінах, адна з якіх, дарэчы, мае назву «Родныя мясціны Настаўніка».

Подыхам сучаснага жыцця насычаны работы ўсіх удзельнікаў пленэру. Асабліва вылучаецца ў гэтым сэнсе трыпціх мінчаніна Г.Лойкі «Людзі з радзімы Майсеенкі». Гэта не проста партрэты землякоў вялікага мастака, хутчэй гэта — цікавая спроба стварыць вобразы суайчыннікаў. Аўтарскую манеру вылучаюць лаканічнасць і дынамізм. Звяртаюць увагу і яго своеасаблівыя па кампазіцыі пейзажы.

Тонкім пачуццём святла і колеру, сваёй шчырасцю кранаюць карціны прыроды яшчэ аднаго мінчаніна — Л.Гоманава.

Не пакідаюць абыякавымі і пейзажы іншых удзельнікаў пленэру. Малюючы з натуры, мастак з Мазыра В.Сідоркін адчувае сябе цалкам у сваёй стыхіі. Родам з гэтых жа мясцін, ён стварае ў сваіх краявідах цэлую панараму цёплых пачуццяў да сваёй роднай зямлі, да свайго народа. Дзякуючы гучанню колеру Палессе на яго палотнах паўстае адначасова велічна і лірычна.

Кожны па-свойму, асаблівымі выразнымі сродкамі жывапісу, выказалі сувязь са славянскімі каранямі і іншыя ўдзельнікі пленэру: беларусы В.Юркоў, В.Мартынчук, В.Ціханенка і М.Гуршчанкоў; расіянін В.Камароў; украінцы В.Радзецкі, А.Какала. Імі свядома быў успрыняты зварот Я.Майсеенкі: «...Я кажу маладым: не праходзьце міма турбот і трывог сваіх сучаснікаў. Імкніцеся да людзей. Будзьце з імі і ў святы, і ў будні, і ў нягоды».

Імя Майсеенкі стала аб'яднальным сімвалам для мастакоў з Беларусі, Расіі і Украіны. Пры ўсіх адрозненнях творчых почыркаў удзельнікі пленэру адчувалі ўнутраную еднасць...

Дарэчы, пленэр садзейнічаў хутчэйшаму ўтварэнню музея Я.Майсеенкі, будаўніцтва якога ўжо пачалося ў Буда-Кашалёве. Бо і тыя пленэрныя работы мастакоў, якія закупіла Міністэрства культуры Беларусі, і тыя карціны, якія яны самі падаравалі, складуць значную частку экспазіцыі будучага музея.

Так, дзяржава жывапісу Майсеенкі будзе існаваць надалей...

Алег Ананьеў.

Культура. 1999. 14—20 жн.

Асобныя выказванні Я.Я.Майсеенкі

— Мои самые первые ощущения — под босыми ногами мокрый луг или теплая пыль проселочных дорог, белорусские дали, стрекот кузнечиков — связаны с родной деревней Уваровичи. Из детства несу я любовь к отчему дому, распаханному полю, натруженным крестьянским рукам, ко всему живому. Доводилось мне и косить, и ходить за лошадьми, скакать с деревенскими мальчишками в ночное, на водопой... Такое, как теперь говорят, раскованное детство, развивало воображение, а первые книжки — «Му-му» и «Записки охотника» Тургенева — будоражили чувства. Рассказы моего деда, бывалого человека, батрачившего у помещика, служившего семь лет в солдатах, гонявшего по рекам плоты, пробуждали любопытство, желание самому все увидеть, запомнить, понять.

Искусство начинается с личности, его создающей. Истоки формируются с детства. В зрелом возрасте лучше понимаешь необходимость неразрывной связи со старшим поколением, с тем духовным наследием, которое нам завещано.

Неделя. 1982. 24 июля—1 авг.

— Всегда считал и продолжаю считать, что художник начинается с детской поры, от первых впечатлений детства. Ночное поле, всполохи костра, огромное звездное небо над головой, ощущение земли, трав, тишины — были моими первыми уроками искусства... Стоя за дощатым забором, я с восторгом смотрел на проносившихся мимо меня запыленных всадников-красноармейцев на взмыленных конях, они казались гигантами. Это было необыкновенно. Такими я их помню и поныне, такими они воплощены в моей картине «Красные пришли». А вот другая картина, «Мальчишки», — ее тема также из моего крестьянского детства, когда ходил босиком по траве, встречал зарю в поле, бежал росистым лугом к дому, к матери.

...Своим человеческим становлением я обязан деду Прокофию... Именно в родных Уваровичах я работал над картиной «Сергей Есенин с дедом», ибо ощущал кровное родство с Есенинской биографией...

В мире книг. 1986. № 8. С. 72—73.

П.С.Малчанаў.

МАЛЧАНАЎ Павел Сцяпанавіч, нарадзіўся 14.3.1902 г. у в. Івольск. Беларускі савецкі акцёр. Народны артыст БССР (1940). Народны артыст СССР (1948). Закончыў Беларускую драматычную студыю ў Маскве (1926). Працаваў у беларускіх тэатрах імя Я.Коласа (1926—1930, 1936—1951; у 1944 узначальваў франтавую тэатральную брыгаду), Беларускім ТРАМе (1935—1936) і тэатры імя Я.Купалы (з 1952). Акцёр шырокага творчага дыяпазону, дасканала валодаў майстэрствам пераўвасаблення. Для яго творчасці характэрна спалучэнне прастаты, чалавечнасці з яркім тэмпераментам. Найбольш значныя ролі ў трагедыйным рэпертуары, дзе глыбока раскрываў унутраную супярэчнасць і перажыванні герояў, выяўляў іх моцныя пачуцці і страсці: Гамлет («Гамлет» У.Шэкспіра), Освальд («Здані» Г.Ібсена), Фёдар («Нашэсце» Л.Лявонава), Федзя Пратасаў («Жывы труп» Л.Талстога). Стварыў вобразы драматычных герояў, людзей глыбокіх, мэтанакіраваных, моцных, якія могуць рашуча змагацца і адстойваць свае прынцыпы, шукаць ісціну, моцна любіць і ненавідзець, людзей гераічных і палымяных: Яравы («Любоў Яравая» К.Транёва), Караневіч («Проба агнём» К.Крапівы), Сміт («Рускае пытанне» К.Сіманава), Заслонаў («Цэнтральны ход» К.Губарэвіча і І.Дорскага), Ранк («Нора» І.Ібсена), Сорын («Чайка» А.Чэхава), Доктар («Забыты ўсімі» Назыма Хікмета). Вядомы і як стваральнік яркіх народных характараў, вобразаў камедыйных і сатырычных, простых, сардэчных, магчыма, крыху смешных, наіўных і камічных людзей: Кутас («Прымакі» Я.Купалы),ураднік Шышла і Дарвідошка («Вайна вайне» і «У пушчах Палесся» Я.Коласа), Каліберaў, Глуздакоў («Выбачайце, калі ласка!», «Лявоніха на арбіце» А.Макаёнка), Пярчыхін, Лука («Мяшчане», «На дне» М.Горкага), Бобчынскі («Рэвізор» М.Гогаля). Першы на беларускай сцэне ўвасобіў вобраз У.І.Леніна («Чалавек з ружжом» М.Пагодзіна, 1938), работу над якім працягваў у спектаклях «Крамлёўскія куранты» М.Пагодзіна, «Вечная крыніца» Дз.Зорына, «Незабыўны 1919-ы» У.Вішнеўскага, «Навальнічны год» А.Каплера. Апошняя роля ў тэатры — Віктор Чэрмлені ў спектаклі «Гульня з кошкай» І.Эркеня (1976). Зняўся ў фільмах «Баям насустрач», «Жанчына», «Масква—Генуя» і інш. У 1930—1935 гг. працаваў на кінастудыі «Савецкая Беларусь». Выступаў як рэжысер кіно (фільм «Палескія рабінзоны», 1934, з І.Бахарам) і тэатра. Сярод тэатральных пастановак: «Арыстакраты» М.Пагодзіна (1935, разам з Г.Ферманам) у Беларускім ТРАМе; «Вечар беларускіх вадэвіляў» («Пінская шляхта» В.Дуніна-Марцінкевіча, «Паўлінка» і «Прымакі» Я.Купалы, 1936), «Пагібель воўка» Э.Самуйленка (1939), «Хлопец з нашага горада» (1941) і «Рускае пытанне» (1947) К.Сіманава — у тэатры імя Я.Коласа; «Патрабуецца лгун» Дз.Пратасава (1965),

«Адкуль грэх?» А.Петрашкевіча (1969) — у тэатры імя Я.Купалы; «Хлапчыш-Кібальчыш» паводле А.Гайдара (1963) і «Дама-невідзімка» П.Кальдэрона (1964) у Беларускім тэатры юнага гледача. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946). Пра Малчанава створаны хранікальна-дакументальны фільм «Дзесяць мінут з Паўлам Малчанавым» (1969). Памёр П.С.Малчанаў 24.2.1977 г. У Мінску, на доме, дзе ён жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка.

У 1984 г. выйшла кніга ўспамінаў П.С.Малчанава «Тэатр — жыццё маё».

ЁН БЫ ЗНОЎ ВЫБРАЎ ТЭАТР

З успамінаў Аляксея Слесарэнкі

Гэта было яшчэ да рэвалюцыі. Навучэнцы Гомельскай настаўніцкай семінарыі ставілі «Вяселле» Антона Чэхава. На сцэну выйшаў лёкай і сказаў: «З чым загадаеце падаць марожанае — з ромам, з мадэрай, а можа, яшчэ з чым?..» Вось і ўся роля, у якой выступіў малады семінарыст. І хіба мог тады хто-небудзь уявіць сабе, прадугадаць, што гэтыя некалькі слоў стануць першымі вымаўленымі са сцэны словамі будучага народнага артыста СССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР Паўла Сцяпанавіча Малчанава?

У вёсцы Івольск Гомельскага павета Чабатовіцкай воласці хату Малчанава мог паказаць кожны. Яе гаспадар Сцяпан, хоць і бедны малазямельны селянін, быў усё ж чалавек надзвычай жыццярадасны, вясёлы, гасцінны. Да таго ж заўзяты скрыпач. І ў хаце заўжды было мнагалюдна, шумна. Дужа жвавы і ўражлівы, старэйшы сын Павел зачаравана слухаў бацькаву музыку, спевы, былі-небыліцы. Заўважыўшы ў сыне цікавасць, бацька сказаў аднойчы: «Трэба вучыцца табе, сынок. Няхай я непісьменны, няхай астатніх дзяцей не здолею вывучыць, а ты паспрабуй у навуку прабіцца...».

«Я ішоў па дарозе з бацькам, — гаварыў акцёр, — ад яго слоў набягалі на вочы слёзы, але я стрымліваўся і даваў самому сабе наказ добра вучыцца, спраўдзіць клопат і спадзяванні бацькі».

У 1913 годзе адзінаццацігадовы Павел Малчанаў паступіў у двухкласнае сельскае вучылішча за дзевяць кіламетраў ад яго роднай вёскі ў валасным сяле Чабатовічы. Кожную нядзелю вучань прыбягаў дадому па харчы — бохан хлеба, пляшку алею, фунты два проса клалі яму ў торбу на тыдзень. Бацька часам даваў яму яшчэ рубель грошай. Вучыўся Павел выдатна. На ўроках спеваў хутка авалодаў нотамі і ў 14 гадоў ужо някепска разбіраўся ў харавой партытуры, яму давяралі камертон, і ён падчас кіраваў хорам самастойна. Потым навучыўся граць на народных інструментах, а таксама на скрыпцы і гармоніку. Удзельнічаў у струнным аркестры — іграў на ўсіх інструментах. Вялікі аматар музыкі і спеваў чабатовіцкі свяшчэннік не забываўся прыйсці на школьны канцэрт ні ў будзень, ні ў свята. З асаблівай сімпатыяй і павагай ставіўся ён да Паўла, заводзіў яго да сябе ў дом, даваў чытаць кніжкі са сваёй бібліятэкі, частаваў чаем, мёдам з агуркамі, садавінай, праводзячы, надзяляў ладным кавалкам сала ці вяндліны. Неяк, спаткаўшы на кірмашы Сцяпана Малчанава, бацюшка сказаў яму: «Даражыце сынам. Ён у вас дзіва-дзіўнае... Вялікім чалавекам будзе. Памянеце маё слова!»

...У 1918 годзе памёр бацька, маці засталася з малымі дзецьмі. Павел, ужо семінарыст, не мог разлічваць на дапамогу з дому. Два апошнія гады навучання ў Гомелі былі самыя цяжкія — у краіне ішла грамадзянская вайна.

Скончыўшы педтэхнікум (так стала называцца семінарыя), вясною 1920 года Павел Малчанаў нейкі час настаўнічаў на Гомельшчыне, а потым паехаў на Украіну, запрошаны ўкраінскімі таварышамі па семінарыі. «Я палюбіў украінскую мову, — гаварыў Павел Сцяпанавіч, — хутка вывучыў яе і стаў свабодна выкладаць на ёй у школе. У мястэчку Калядзін Чарнігаўскай губерні, дзе я атабарыўся, быў Народны дом. Я арганізаваў там вялікі хор і аркестр струнных інструментаў. Са спектаклямі і канцэртамі мы часта выязджалі ў вёску і на хутары, там нас заўсёды сустракалі з радасцю. Мясцовыя жыхары запрашалі нас у свае беленькія і вельмі чыстыя хаты, усаджвалі за сталы, рассцілалі кожнаму на калені вышытыя ручнікі і частавалі рознымі ўкраінскімі стравамі. Вельмі многа было смачных галушак, варэнікаў з рознымі начынкамі. Запівалі мы іх рэзкім квасам з вішань, грушак-дзічак, чырвоных парэчак альбо салодкім узварам з малінаў ці суніцаў. Усе разам — гаспадары і мы, госці, — да глыбокай ночы спявалі розныя

песні. Мне заўжды даводзілася знаёміць мясцовых жыхароў з песнямі беларускага Палесся. І тое, што найболей падабалася, мае слухачы завучвалі па-беларуску. Час, пражыты на Чарнігаўшчыне, быў самы светлы ў маім юнацтве...»

Амаль праз два гады Павел Малчанаў вярнуўся ў родны кут і быў прызначаны ў двухкласную школу ў Чабатовічах, у якой некалі вучыўся сам. Тут ён шырока выкарыстаў свой вопыт кіраўніка мастацкай самадзейнасці, набыты на Украіне. Крыху палепшылася ягонае матэрыяльнае становішча: нарэшце набыў бобрыкавае паліто, чаравікі і крамную кашулю фабрычнага вырабу.

Аднак яму захацелася вучыцца далей. Некаторыя яго сябры па семінарыі вучыліся ў вышэйшых навучальных установах Масквы, Ленінграда, Харкава, Кіева і Мінска. Нейкім чынам Малчанаў даведаўся, што ў Маскве ўжо другі год існуе Беларуская драматычная студыя, якая забяспечвае стыпендыяй і інтэрнатам. Карацей кажучы, у снежні 1922 года ён быў ужо ў Маскве, у гэтай студыі.

Жывучы ў Маскве, юнак з сялянскай стараннасцю вучыўся ў студыі, а вечарамі хадзіў у тэатры. З захапленнем глядзеў спектаклі, дасканала вывучаў манеру ігры акцёраў. Ягоную чулую душу цалкам паланілі славутыя артысты — зямляк Васіль Качалаў, Міхаіл Чэхаў, Павел Арленеў, Іван Масквін, а пазней Леанід Леанідаў і Міхаіл Тарханаў.

У часе навучання ў студыі Павел Малчанаў назаўжды здружыўся са студыйкай Любоўю Іванаўнай Мазалеўскай, якая пасля стала шырокавядомай беларускай драма- і кінаакторкай, а затым тэатральным рэжысёрам. Яна была жонкай і адданай сяброўкай Малчанаву, незаменным памочнікам у сцэнічнай творчасці. Рэдка хто з іншых тэатральных дзеячаў працаваў над сваім творчым развіццём з такой непахіснай адданасцю, як Любоў Мазалеўская.

Павел Сцяпанавіч гаварыў мне: «У гады майго навучання ў студыі, у Маскве, было шмат тэатраў самага рознага накірунку. Я — няспелы і нявопытны правінцыял, жыхар беларускіх палёў і лясоў, трапіў адразу ў такі вір канструктывізму, эстэтызму і трукацтва, што не цяжка было заблытацца і зламаць сабе галаву. Пасля такіх спектакляў, як «Велікадушны раганосец» альбо «На ўсякага мудраца хапае прастаты», я вяртаўся дамоў з болем у галаве, пакутліва рашаў рэбусы левых рэжысёраў і прыходзіў да вываду, што я нічога не разумею ў мастацтве і толку з мяне не будзе. У Мастацкім і Малым тэатрах мне было лёгка і ўсё зразумела, такім я ведаў тэатр з першых крокаў і акцёрам такога тэатра я хацеў быць. Нас выхоўвалі па сістэме Станіслаўскага, і ёй я застаўся адданы на ўсё жыццё». І менавіта тут дарэчы будзе падкрэсліць, што ў Беларусі не было яшчэ акцёра, які б так дасканала валодаў сістэмай Станіслаўскага, як Малчанаў.

«Беларускі ўрад матэрыяльна падтрымліваў выкладчыкаў і нас, студыйцаў, — гаварыў Павел Сцяпанавіч. — Нас неаднаразова наведвалі ў перыяд вучобы Янка Купала і Міхась Чарот. Яны цікавіліся нашым творчым выхаваннем. Падбадзёрвалі. Купала неяк асабліва прыхільна ставіўся да мяне, і я стаў яго асабістым другам назаўжды».

Расказвала Любоў Іванаўна Мазалеўская:

— Купала прыходзіў да нас у інтэрнат. І асабліва надоўга затрымліваўся, калі гэта быў выхадны альбо святочны дзень. Запомнілася, як ён гаварыў, што спадзяецца на нас у будучым. І што мы шчаслівыя ў тым, што будзем першымі ствараць не аматарскі, а высокакваліфікаваны, нацыянальны тэатр. Купала раіў нам бяспынна нарошчваць сцэнічнае майстэрства тут, у Маскве, але заўжды помніць пра Беларусь. І ўсяляк удасканальваць жывое гучанне роднай мовы...

Іван Дамінікавіч спяваў разам з намі беларускія песні, жартаваў, смяяўся. Тады ён яшчэ верыў у росквіт нацыянальнай літаратуры і мастацтва і быў даволі энергічны і вясёлы... Мы частавалі яго гарачаю гарбатай і вельмі смачнымі пернікамі, якія «падукорску» пякла, як яна казала, наша студыйка Таццяна Бандарчык. Мы, яшчэ зусім маладыя і гарэзныя, здаралася, стамлялі Купалу. І калі здагадваліся пра гэта, рассцілалі для яго ложак, каб ён мог крыху паспаць у цішыні. Адпачыўшы ў нас якую гадзіну, паэт меў звычку прайсціся па Арбацкай вуліцы. Неаднаразова запрашаў з сабою на прагулку Паўла Малчанава. Паэт распытваў яго пра семінарскае жыццё і гады настаўніцтва на Украіне і ў Беларусі.

Іншы раз яны доўга хадзілі і маўчалі абодва. Яны так падабаліся адзін аднаму,

што і памаўчаць разам было ім прыемна, а можа, нават і патрэбна. А яшчэ Янка Купала вельмі любіў слухаць свае вершы, калі іх чытаў уголас Павел Малчанаў.

...У 1926 годзе выпускнікі студыі заснавалі Другі беларускі дзяржаўны тэатр у горадзе Віцебску. Артысты былі добра падрыхтаваны. З энтузіязмам, уласцівым маладосці, сыграў Павел Малчанаў матроса-гаваруна ў п'есе Барыса Лаўранёва «Разлом». Гэты спектакль цалкам быў удалы, ён высока ўзняў аўтарытэт тэатра ў рэспубліцы. «Я спяваў, — расказваў акцёр, — перакульваўся на палубе, выдумляў усялякія гісторыі, жартаваў. Нельга было не заўважыць такога вясёлага матросіка, і мяне адзначылі поруч з выканаўцамі асноўных роляў».

У 1930 годзе Павел Малчанаў па камандзіроўцы Наркамасветы быў накіраваны ў Ленінград на Беларускую кінафабрыку. Там працаваў пяць гадоў: быў асістэнтам рэжысёра, рэжысёрам і адначасова здымаўся ў кіно як акцёр. У 1932 годзе чатыры месяцы пражыў на Далёкім Усходзе, там стварыў дакументальны фільм пра Бірабіджан, у 1934 годзе сумесна з кінасцэнарыстам і кінарэжысёрам Іосіфам Бахарам зняў карціну для юнацтва «Палескія рабінзоны». Аўтар гэтых радкоў іграў у ёй адну з галоўных роляў.

...Прыгадваецца 1935 год. Працаваць далей у «Белдзяржкіно» стала для Малчанава невыносным выпрабаваннем. Не зважаючы на ўсесаюзны поспех «Палескіх рабінзонаў», пастаноўшчыка распачалі ігнараваць яўныя і скрытыя ворагі беларушчыны. Малчанава і Мазалеўскую абражалі. Называлі «заядлымі нацдэмамі». Яны, маўляў, не толькі між сабою гавораць па-свойму, але і ў канцэртах знарок выконваюць творы беларускіх паэтаў у арыгінале. Робяць гэта ўпарта і не толькі ў сценах кінафабрыкі, але і ў рабочых клубах і навучальных установах Ленінграда, там, дзе працуюць ці вучацца беларусы. Заўжды з імі выступае студэнт з Інстытута сцэнічных мастацтваў Пятро Алейнікаў. Ён з шумным поспехам чытае паэму «Тарас на Парнасе» і такім чынам «распаўсюджвае нацыяналізм».

Малчанава і Мазалеўскую аблівалі памыямі на розных пасяджэннях, вытворчых нарадах і сходах. Яны чакалі абароны ад дырэкцыі, але там маўчалі. Павел Сцяпанавіч меркаваў, што бруднае плявузганне сцішыцца, калі ён ад'едзе ў кінаэкспедыцыю. І ён апынуўся ў Віцебску, дзе здымаў чарговы фільм. Але неўзабаве кіраўніцтва не толькі прыпыніла далейшую працу над пастаноўкай, але наогул звольніла Малчанава з «Белдзяржкіно». І атрымаў ён свайго роду «воўчы білет». У працоўную кніжку ўпісалі: «Уволен из «Белгоскино» за творческую несостоятельность».

І як ні дзіўна, але і гэта было шчасце. Бо магло быць значна горш. Такі быў час...

Пазбаўлены працы, а значыць і сродкаў для жыцця, Малчанаў засумаваў. Куды падацца? Здавалася б, прасцей за ўсё вярнуцца ў БДТ-2. Але на свой далікатны ліст з намёкам, што ён гатовы вярнуцца, адказу Малчанаў не атрымаў. І ўсё ж паехаў у Мінск. Выспела рашэнне: пайду да Купалы...

Як роднага сына сустрэў яго Іван Дамінікавіч. Узяў да сябе жыць.

Неўзабаве праз высокае начальства ўдалося Івану Дамінікавічу ўладкаваць Паўла Сцяпанавіча на працу ў якасці другога рэжысёра ў Мінскі тэатр рабочай моладзі. Галоўны рэжысёр гэтага тэатра рыхтаваўся ў той час да пастаноўкі спектакля па п'есе Мікалая Пагодзіна «Арыстакраты». Але вось бяда: у тэатры не знайшлося акцёра на галоўную ролю Косці-капітана. «А што, калі сыграць мне», — нясмела прапанаваў Малчанаў. Ніхто яшчэ не ведаў тут яго акцёрскіх здольнасцей, але іншага выйсця не было, і вырашылі рэпетыраваць. «Я з такім шаленствам, з такім энтузіязмам ухапіўся за працу, — гаварыў акцёр, — што не помню, каб так унутрана гарэў калі-небудзь потым. Прарвалася маладая энергія, што была ў застоі, кансерваваў у час маёй доўгай занятасці ў кіно». «Арыстакраты» іграліся пры суцэльных аншлагах.

У лютым 1936 года пасля шасцігадовага перапынку ён зноў апынуўся ў сваім родным віцебскім тэатры. Першым выдатным вынікам з'явілася роля ўрадніка Шышлы ў п'есе Якуба Коласа «Вайна вайне». Вобраз быў створаны ў востракамедыйным плане і часта выклікаў ажыўленасць у зале і смех. Пра гэты вобраз Малчанаў успамінаў: «Унесеныя мною ў ролю дапаўненні і ігра на гітары, спевы — рабілі эпізадычную фігуру Шышлы больш каларытнай, прыкметнай. У гэтым часта і заключаецца работа, а дакладней — задача

акцёра: расквеціць ролю дэталямі, зрабіць яе запамінальнай. Колас заўважыў наконт майго выканання ролі Шышлы, што гэта значна ўзбагаціла вобраз, па сутнасці, узбагаціла аўтарскі матэрыял».

Неяк ізноў, сустрэўшыся з Малчанавым, Якуб Колас сказаў:

— Я ўсё думаю, як гэта вам удалося так адпаведна, так лоўка сыграць Шышлу? Калі ў нас існавалі ўраднікі, вы ж былі яшчэ непаўналеткам…

— Так, так, шаноўны Канстанцін Міхайлавіч! Я сапраўды быў малы. Але справа ў тым, што адзін мой сваяк быў ураднікам. Я яго часта бачыў. А цяпер вось, пераняў…

— Вунь як! — толькі і сказаў Колас.

Увогуле, Якуб Колас цаніў і паважаў Паўла Малчанава. У п'есе Коласа «У пушчах Палесся» акцёр іграў ролю Дарвідошкі. Аўтар лічыў яе другараднай і не надаваў ёй асаблівага значэння. Але ўбачыўшы сцэнічны вобраз, створаны Малчанавым, Якуб Колас быў радасна здзіўлены і нават палічыў патрэбным пашырыць гэтую ролю.

У сваёй кнізе «Тэатр — маё жыццё» Малчанаў пісаў:

«…Пазней, хаця Колас і не пісаў больш для тэатра, мы не забывалі яго. Гастралюючы ў Мінску, мы заўсёды запрашалі Коласа ў тэатр, а таксама хадзілі наведваць яго на кватэру. Ён усіх добра помніў і прымаў вельмі ласкава і гасцінна… Мы тады доўга сядзелі з ім на лавачцы каля хаты. У двары было многа простых палявых кветак, асабліва любімых паэтам, і нават лапік жыта. Ён спецыяльна сеяў яго, каб было так, як у полі… Мяне заўсёды здзіўляла, — піша далей Малчанаў, — у ім незвычайная любасць да прыроды. Ён быў заядлы грыбнік і рыбак, і гэта захапленне ішло ў яго ад імкнення больш быць сам-насам з прыродай…

Колас быў чалавекам адкрытым. Ён заўсёды з задавальненнем чытаў свае яшчэ не надрукаваныя вершы. Яму трэба было ведаць, як яны будуць успрыняты…»

Працуючы ўжо ў Мінску, Павел Малчанаў іграў ролю Якуба Коласа ў п'есе Васіля Віткі «Шчасце паэта». Колас ведаў пра гэта, але прыехаць і паглядзець спектакль у тэатры не адважваўся. Напэўна, лічыў гэта нясціплым.

Набліжалася сямідзесяцігоддзе з дня нараджэння Якуба Коласа. Павел Малчанаў быў сярод гасцей. Нехта папрасіў яго паказаць Коласа, прачытаць маналог з п'есы Васіля Віткі. Павел Сцяпанавіч збянтэжана зірнуў на юбіляра. Не меней збянтэжаны Колас махнуў рукой: «Давайце!»

Паказаны вобраз выклікаў радасныя воплескі, бо вызначаўся дакладнасцю і дасканаласцю. Якуб Колас абняў акцёра і ўсміхнуўся:

— Ну, што вы скажаце… Артыст, адным словам, артыст!

Выключнай падзеяй, якая здзівіла шэкспіразнаўцаў, вяхою на творчым шляху артыста было стварэнне вобраза Гамлета — самай складанай і цяжкай ролі ў сусветным класічным рэпертуары. Павел Сцяпанавіч прызнаецца, што яго вельмі ўсхваляваў пераклад «Гамлета» на беларускую мову, зроблены пісьменнікам Юркам Гаўруком.

Пастаноўку здзейсніў вопытны маскоўскі рэжысёр Валерый Міхайлавіч Бебутаў, які шмат гадоў спецыялізаваўся галоўным чынам на сцэнічным вырашэнні шэкспіраўскіх драматычных твораў, а яго родная сястра Алена Міхайлаўна — на мастацкім дэкарацыйным афармленні.

Сусветна вядомы савецкі знаўца Шэкспіра прафесар Міхаіл Марозаў адклаў усе свае маскоўскія справы і прыехаў у Віцебск з мэтай пабачыць Паўла Малчанава ў ролі Гамлета.

У газеце «Віцебскі рабочы» № 205 за 16 кастрычніка 1946 года Міхаіл Марозаў напіша:

«Павел Сцяпанавіч Малчанаў выдатна іграе Гамлета. Перад намі чалавек неспакойнай усхваляванай думкі. Чалавек адначасова і гнеўны, і любячы. Які ласкавы ён з Гарацыо, які пяшчотны ён з Афеліяй, і як ненавідзіць ён свайго ворага Клаўдзія, з якой пагардай ставіцца ён да хітрага шэльмы старога Палонія. Малчанаў валодае багацейшай акцёрскай палітрай…

Гэты спектакль з'яўляецца не толькі творчай перамогай здольнага калектыву. Ён гаворыць аб тым, як глыбока і ўсебакова ўмее савецкі тэатр раскрываць найвялікшыя творы сусветнай драматургіі. Тэатр імя Якуба Коласа стварае ўпершыню ў гісторыі беларускага тэатра спектакль «Гамлет». І зараз можна смела сказаць, што Беларускі тэатр унёс ужо каштоўнейшы ўклад у агульную работу савецкага тэатра над Шэкспірам. Спектакль «Гамлет» з'яўляецца святам беларускага тэатральнага мастацтва».

…Так, гэта было свята. Многія прызнаныя акцёры з Масквы, Ленінграда, Кіева і



Я.Ф.Пятроў.

іншых гарадоў прыязджалі ў Віцебск альбо ў Мінск, каб убачыць Малчанава ў «Гамлеце». Прыязджалі паглядзець спектакль супрацоўнікі Брытанскага пасольства ў СССР і запэўнівалі, што такога бліскучага Гамлета яшчэ не бачылі ў сябе, на радзіме вялікага Шэкспіра.

...У Мінску стала вядома, што Малчанава «сватаюць» у МХАТ. Гэта стала сенсацыяй. І тут адбылося нечаканае: у Маскве Малчанава наведаў сакратар Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі Цімафей Гарбуноў і перадаў яму афіцыйнае запрашэнне пераехаць з Віцебска ў Мінск, на сталую працу ў тэатр імя Янкі Купалы. Роздум акцёра быў кароткі і рашучы. Павел Сцяпанавіч напісаў мне: «Я выязджаю ў Віцебск, пабуду там некалькі дзён з сям'ёю — я яе даўно не бачыў і засумаваў, а затым прыеду ў Мінск. Гарбуноў хацеў, каб я адразу паехаў у Мінск з Масквы, але я дамовіўся заехаць дадому».

Кіраўніцтву МХАТа Малчанаў паведаміў, што яму не пад сілу пакінуць бацькаўшчыну, дзе ён рос, дасягнуў прызнання.

Неўзабаве акцёр прыехаў у Мінск...

Сапраўднай удачай апошніх гадоў жыцця Малчанава была роля Доктара ў п'есе Назыма Хікмета «Забыты ўсімі». Гэта прызналі і гледачы, і самыя патрабавальныя тэатральныя крытыкі. З асаблівым захапленнем успрынялі гэты сцэнічны вобраз не толькі мінчане, але і кіяўляне. У канцы спектакля ў зале тэатра імя Лесі Украінкі, дзе гасцяваў Купалаўскі тэатр, раздаваліся выбухі воплескаў і скандзіроўкі: «Бе-ла-ру-сі — слава! Мал-ча-на-ву — слава!..»

Адразу пасля вяртання з гастроляў у Мінск быў створаны кінафільм «Дзесяць хвілін з Паўлам Малчанавым». У ім коратка, але змястоўна расказана пра творчыя здабыткі тытана беларускага мастацтва.

Хвалюе апошні кадр гэтай унікальнай рэліквіі: сівы, але яшчэ поўны энергіі, з жывым бляскам у вачах, акцёр зняты буйным планам. Звяртаючыся да гледачоў, ён гаворыць, што, калі б да яго вярнулася маладосць і ўсё давялося пачынаць спачатку, ён бы зноў выбраў тэатр...

Да апошніх дзён жыцця Павел Сцяпанавіч Малчанаў быў поўны жадання творчасці. Ён спатольваў смагу працай з маладымі драматургамі, выступаў на радыё, па тэлебачанні. Сустракаўся з гледачамі ў самых аддаленых кутках Беларусі, натхнёна працаваў над кнігай пра свой нялёгкі, але светлы і плённы шлях да вяршынь.

Друкуецца са скарачэннямі: Полымя. 1994. № 3.

Падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

ПЯТРОЎ *Яраслаў Фёдаравіч,* нарадзіўся 11.6.1942 г. у г. Буда-Кашалёва. Беларускі спявак (бас). Народны артыст Беларусі (1984). Закончыў Беларускую кансерваторыю (1974). З 1973 г. у Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы Беларусі (дэбютаваў партыяй Грэміна ў оперы П.Чайкоўскага «Яўген Анегін»). Валодае моцным голасам прыемнага тэмбру, сцэнічнай абаяльнасцю. Творчасці Пятрова ўласцівы тэмперамент, непасрэднасць і шчырасць у перадачы пачуццяў, глыбокае пранікненне ў вобраз, гранічная выразнасць кожнага створанага характару. У спектаклях нацыянальнага і класічнага рэпертуару стварыў запамінальныя вобразы Найміта («Сівая легенда» Дз.Смольскага), Млынара («Русалка» А.Даргамыжскага), Канчака, князя Ігара, Галіцкага («Князь Ігар» А.Барадзіна), караля Рэнэ («Іаланта» П.Чайкоўскага), Мефістофеля («Фауст» Ш.Гуно), Рыгора («Дзікае паляванне караля Стаха» У.Солтана). Найбольш блізкія спеваку складаныя псіхалагічныя партыі: эпічна-велічныя і разам з тым чалавечныя вобразы Івана Сусаніна («Іван Сусанін» М.Глінкі), Кутузава («Вайна і мір» С.Пракоф'ева), глыбока драматычныя — Барыса Гадунова («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага) і Філіпа II («Дон Карлас» Дж.Вердзі). Мае вялікі камерны рэпертуар, у якім значнае месца належыць беларускім і рускім народным песням, творам беларускіх кампазітараў.

СІДОРКІН Валерый Барысавіч, нарадзіўся 19.4.1955 г. у в. Галавачы. Закончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1979). У яго творчасці дастойнае месца займаюць тэматычныя карціны. Гэта палотны «Поўдзень», «Жніво», «Канец жніўня» і інш. В.Б.Сідоркін — вядомы пейзажыст. Працы мастака ў гэтым жанры вельмі маляўнічыя, тонкія па настроі, гарманічныя па каларыце. Пейзажы яго носяць як эпічны, так і камерны характар. Яны мажорныя і аптымістычныя. Высокую мастацкую вартасць маюць палотны «Пейзаж з вясёлкамі», «Снег ужо растае», «Прыціхла», «Маладая зеляніна», «Прыпяць», «Вечар на Мазыршчыне», «Таполі». В.Б.Сідоркін — удзельнік шматлікіх выставак. Член Беларускага саюза мастакоў (1985). Жыве ў Мазыры.

СТРЫГАЛЁЎ Міхаіл Лаўрэнцьевіч (Міхась Стрыгалёў), нарадзіўся 25.5.1938 г. у в. Недайка. Закончыў Недайскую сярэднюю школу (1955), Беларускі політэхнічны інстытут (1961), Літаратурны інстытут імя Горкага ў Маскве (1969, завочна). Працаваў у калгасе, старшым інжынерам вайсковай часці, інжынерам трэста «Уралмантажаўтаматыка», старшым інжынерам лабараторыі трэста «Пермгаррамбуд», літкансультантам Пермскай абласной арганізацыі Саюза пісьменнікаў РСФСР,



В.Б.Сідоркін.

М.А.Стрыгалёў.

загадчыкам Фальклорна-выдавецкага аддзела Пермскага Дома народнай творчасці, рэдактарам шматтыражнай газеты трэста «Будтэрмізаляцыя» і інш. З 1978 г. жыве ў г. Барысаве. У 1980—1982 гг. — сцэнарыст кінастудыі «Беларусьфільм». З 1980 г. кіруе літаратурным аб'яднаннем «Бярэзіна» (г. Барысаў). У 1988 г. стаў членам Саюза пісьменнікаў БССР. Упершыню ў друку выступіў у 1956 г. Спачатку пісаў на рускай мове, з 1961 г. — і на беларускай. Аўтар зборнікаў паэзіі «Хмель» (1966), «Краса часу» (1971), кнігі перакладаў «Чатыры вятры: Паэзія народаў Пры-

В.Сідоркін. Звініць лета.

В.Цвірка. Каложа.



В.К.Цвірка.

М.М.Чарняўскі.

камья» (1970). У Мінску выйшлі кнігі паэзіі «Белая Русь» (1967), «Ростань» (1974), «Чырвоная казарма» (1978), «Кола фартуны» (1981), «Дзевяты кардон» (вершы і паэма, 1990).

ЦВІРКА Віталь Канстанцінавіч, нарадзіўся 14.2.1913 г. у в. Радзеева. Беларускі мастак, педагог. Народны мастак БССР (1963). Закончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум (1932), Маскоўскі мастацкі інстытут імя В.Сурыкава (1942). Член Саюза мастакоў Беларусі з 1946 г. З 1947 г. выкладчык Мінскага мастацкага вучылішча, з 1952 Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (у 1958—1960 гг. рэктар гэтага інстытута). Працаваў у розных жанрах станковага жывапісу. У першых значных творах — «Палонных вядуць» (1945), «Непакорныя» (1947), партрэты камандзіра партызанскага атрада М.П.Скаромніка (1944), камісара партызанскай брыгады А.Н.Захаравай (1948) — паказаў гераізм і мужнасць савецкага народа ў гады Айчыннай вайны. Вызваленчай барацьбе працоўных Заходняй Беларусі прысвяціў карціну «Паўстанне рыбакоў на возеры Нарач» (1957). Значнае месца ў творчасці майстра займаў пейзаж. У лірычна-пранікнёных і эпічных карцінах ён стварыў абагульнены велічны вобраз беларускай прыроды. Выразныя кампазіцыйныя рашэнні, узвышана-эмацыянальны каларыт, лаканічнасць і дакладнасць мастацкай мовы прыдаюць пейзажам мастака непаўторную своеасаблівасць. Сярод твораў гэтага жанру вылучаюцца «Разліў у Мінску» (1945), «Сакавік» (1947), «Беларускі пейзаж» (1951, 1955, 1956), «Цішыня» і «Ля млына» (1954), «Поўдзень», «Хата рыбака», «Возера Нарач» (1956), «Вясна» і сюіта «Поры года» (1958), «Вечар у вёсцы» (1959), трыпціх «На зямлі беларускай» («Вясна», «Лета», «Восень», 1961), «Нёман» і «Пачатак сакавіка» (1952), «Ваколіца» (1964), «Вялікая вада» (1965), «Пяскі» (1966), серыя пейзажаў «На зямлі беларускай» («Прыпяць», 1963, «Сказ пра Палессе», 1965, «Браслаў», 1966, і інш.; Дзяржаўная прэмія БССР 1967), «Беларускі матыў» (1967), «Сказ аб Нёмане» (1968), «Каложа» і «Ганча. Зямля партызанская» (1969), «Былое» і «Нарач» (1971), «Збожжа ўбрана» (1972) і інш. Стварыў серыі мемарыяльных гарадскіх пейзажаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі, партрэтаў удзельнікаў партызанскага руху для Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. В.К.Цвірка быў сакратаром праўлення саюза мастакоў СССР у 1961—1967 гг., старшынёй праўлення Саюза мастакоў БССР у 1962—1963 гг. Памёр 11.6.1993 г.

ЧАРНЯЎСКІ Мікалай Мікалаевіч (Мікола Чарняўскі), нарадзіўся 16.1.1943 г. у в. Буда-Люшаўская. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1966). Адначасова з вучобай працаваў рэдактарам Беларускага радыё. У 1966—1988 гг. — літсупрацоўнік, старшы рэдактар аддзела, адказны сакратар часопіса «Бярозка», з 1989 г. — літаратурны рэдактар часопіса «Вясёлка». Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1972). Першы верш надрукаваў у 1958 г. у газеце «Піянер Беларусі». Выйшлі кніжкі паэзіі для дзяцей «Дзе лета канчаецца» (1963), «Апошні бой» (1967), «Сонца ў хованкі гуляе» (1970), «Кліча горн» (1974), «Адрас наш — дзіцячы сад» (1975), «Парад» (1976), «Залатая ніва» (1977), «Дзе пяцёркі прадаюцца?» (1978), «Я збіраюся на БАМ» (1979), «Хто сябруе з добрым днём?» (1981), «Звініць званок...» (1982), «Зоркі-зорачкі» (1984), «Навечна з сонцам» (1986), «Аб чым пяе крынічка» (1989), а таксама аповесці «Бегунок пачынае думаць» (1965), «Акадэмія... на колах, альбо За вясёлкай наўздагон» (1990). Выдаў зборнікі паэзіі «Чалавечнасць» (1971), «Трывога» (1988), зборнікі сатыры і гумару «Казёл-моднік» (1978), «І не косяць, і не жнуць...» (1982), «Камар на матацыкле» (1985), «Нашто бабе агарод?» (1989). Аўтар шэрагу тэкстаў піянерскіх песень і кантат. Пераклаў на беларускую мову творы пісьменнікаў народаў СССР.

З вершаў Міколы Чарняўскага

Патыхнула настоем грушавым.
Лёгка, весела жаўруку.
Добрай раніцы, Буда-Люшава,
Добрай раніцы, родны кут!

Знерухомелі роздумна яблыні,
Просяць піць перапёлкі ў жытах,
Пчолы ўсе — музыканты заядлыя —
Баль спраўляюць у белых садах.

Крочу вулічнай пыльнай дарогаю —
Колькі просіцца шчырых слоў!
Тут дзяцінства маё басаногае
І няласкавае прайшло.

Ды ніколі нідзе не забудзецца.
Я запомніў, сябры, назаўжды
Аксамітныя гэтыя вуліцы,
Спелы водар садоў маладых.

Шмат чаго ў жыцці ў нас бывае,
Шмат нас водзіць шляхоў і дарог.
Людзі часам сяброў забываюць,
Ды не родны бацькоўскі парог.

Той парог, што рукой клапатліваю
Выпраўляе ў жыццё ўсіх нас,
Той парог, што ўсмешкай шчасліваю
Сустракае цябе кожны раз.

Патыхнула настоем грушавым.
Родны дом…
І вяргіні ў садку…
Добрай раніцы, Буда-Люшава,
Дарагі мне да болю кут!

1962 г.

* * *

У тым кутку,
Дзе нарадзіўся я,
Пад светлай жаўруковай сінявою,
Пушчанскага не ўчуеш салаўя,
Не адгукнецца рэха баравое.

Далёка адступіліся лясы
Ад ніў,
Ад сенажацяў,
Ад балота:
Замест ядлоўцу —
Купінкі лазы,
Замест пралесак —
Палявая лотаць.

Ды ўсё ж не ў крыўдзе,
Што куточак мой,
Нібы абдзелены прыродай крышку,
Што калісь тут
Ні ўлетку, ні зімой
Не бачыў дзятла
Ні здалёк, ні зблізку.

Сцяжынкаю штодня не тупацеў
Чарніц набраць, ахвотай апантаны, —
Таму, відаць, яшчэ й дасюль цвіце
Чарнічнік той, што калісь не стаптаны.

Пад шаты кошыка, нажа не браў, —
Таму, відаць, магу паспадзявацца:
Баравікі, што калісь не сабраў,
Яшчэ й дагэтуль недзе нерушацца…

Я рад,
Што ў дні вясновыя мае
Не меў спакусы ад красы сасновай,
Што я цяпер
Магу любіць яе
Любоўю
Нерастрачанай,
Вясновай!

ЧЭПЕЛЕЎ Віктар Іосіфавіч, нарадзіўся 26.10.1953 г. у г.п. Уваравічы. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь (1997). Закончыў Магілёўскае культурна-асветнае вучылішча (1976), Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва імя А.В.Луначарскага (1984). Працаваў акцёрам Магілёўскага і вядучым акцёрам Гомельскага абласных драматычных тэатраў. Выканаўца вострахарактарных камедыйных роляў, рознасацыяльных характарных вобразаў. Сярод лепшых роляў: Нельсан («Ледзі Гамільтан» Т.Рэтыгана), Бурыдан («Нельская вежа» А.Дзюма), Жывота Цвейшовіч («Доктар філасофіі» Б.Нушыча), Сірано («Сірано дэ Бержэрак» Э.Растана), Ягайла («Купала» А.Дударава), Генерал («Тайна адной споведзі» Б.Васільева), Міхалеў («Спартыўныя сцэны 1981 года» Э.Радзінскага), Шарыкаў («Сабачае сэрца» М.Булгакава), Яўхім Глушак («Страсці эпохі» паводле І.Мележа), Блез [«Блез» («Сем жанчын на шыі») К.Мане]. Узнагароджаны ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры» (1999).

В.І.Чэпелеў.

І.І.Шальманаў.

ТАЛЕНАВІТЫ АРТЫСТ

З успамінаў народнай артысткі Беларусі Людмілы Корхавай

Прыход у трупу Гомельскага абласнога драматычнага тэатра Віктара Чэпелева азнаменаваў новы, яркі этап у жыцці нашага тэатра. Адкрыццём артыста стала выкананне ролі Міхалева ў спектаклі па п'есе Радзінскага «Спартыўныя сцэны 1981 года (Бег трусцой)». На сцэне з'явіўся новы герой, праз вобраз якога акцёр заявіў аб сабе таленавіта, ярка і ўладарна.

Вядучы беларускі тэатральны крытык Таццяна Арлова адзначала: «Акцёрская работа В.Чэпелева сапраўды дакладная і выразная. Прафесіянальнае майстэрства сумяшчаецца з глыбокай чалавечай аддачай. Зразумелы кожны рух, кожная думка, даходлівыя паўзы. Бязлітасна і цэласна абведзены чалавечы лёс. Акцёр мае поспех у гледача».

Лагічным працягам творчага поспеху артыста стала прапанова рэжысёра Лідзіі Манаковай выканаць ролю Шарыкава ў п'есе М.Булгакава «Сабачае сэрца». Дзякуючы таленту Чэпелева, спектакль стаў падзеяй у тэатральным жыцці рэспублікі.

Камедыйны талент акцёра праявіўся ў спектаклях «Сем жанчын на шыі» («Блез») К.Манье, «Лякарства для здрады» Ж.Пуарэ, «Фрэдзі» Р.Тома, «Суцяшальнік удоў» Дж.Марота.

Асобнае месца ў творчасці Віктара Чэпелева займае беларуская класіка. Гомельскі тэатр свой 50-ы творчы сезон адкрыў спектаклем «Страсці эпохі» паводле рамана Івана Мележа «Завеі, снежань». Віктар Чэпелеў паспяхова сыграў ролю Яўхіма Глушака. А 55-ы тэатральны сезон адкрыўся прэм'ерай спектакля «Купала» па п'есе Аляксея Дударава. І зноў у галоўнай ролі паспяхова выступае Віктар Чэпелеў. Драматычныя і псіхалагічныя межы таленту артыста адкрыліся ў ролі вялікага князя літоўскага Ягайлы.

Значнай падзеяй ў творчасці В.І.Чэпелева стала выкананне ролі вялікага англійскага адмірала Нельсана ў спектаклі «Ледзі Гамільтан» па п'есе Т. Рэтыгана. Мастацкі кіраўнік тэатра Уладзімір Караткевіч даручыў гэту ролю Чэпелеву і не памыліўся. Прэм'ера спектакля адбылася 17 верасня 1993 г. у Мінску, дзе праходзілі гастролі тэатра. На прэм'еру прыйшла тэатральная грамадскасць сталіцы. Мне пашанцавала быць удзельніцай гэтага спектакля. Я іграла ледзі Гамільтан. Такога вялікага поспеху абласнога тэатра ў Мінску даўно не было. Гэтай пастаноўкай рэжысёр Уладзімір Караткевіч увайшоў у лік лепшых рэжысёраў Беларусі.

Гэты спектакль я назвала б і зорным часам Віктара Чэпелева. Яго ігра — як з'яўленне нейкай невядомай энергіі, нейкай прыцягальнай сілы. Аўра духоўнай сілы акружае яго з першых жа хвілін з'яўлення на сцэне. Пасля прэм'еры міністр культуры Беларусі выказаў падзяку пастановачнаму калектыву, дырэктару, заслужанаму работніку культуры Рагоўскай Валянціне Георгіеўне, і тады ж было прынята рашэнне аб тым, каб за творчыя дасягненні на тэатральнай сцэне і высокае выканаўчае майстэрства артысту Віктару Чэпелеву прысвоіць высокае званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь».

Майстэрству таленавітага артыста апладзіравалі гледачы Чарнігава, Жытоміра, Сухумі, Краснадара, Кастрамы, шмат іншых гарадоў Расіі, Украіны, дзе праходзілі гастролі Гомельскага абласнога драматычнага тэатра.

ШАЛЬМАНАЎ Іван Ігнатавіч, нарадзіўся 5.9.1936 г. у в. Каромка. Закончыў Рагінскую сярэднюю школу (1955), Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1981). Працаваў рабочым на Мінскім цагельным заводзе, качагарам на паравозе, слесарам. З 1968 г. літсупрацоўнік рэдакцыі газеты «Связист Белоруссии», рэдактар на Беларускім радыё. З 1975 г. рэдактар, намеснік дырэктара Мінскага абласнога Дома народнай творчасці, у 1976 — 1979 гг.

старшы рэдактар Мінскага эксперыментальна-канструктарскага тэхналагічнага бюро скургалантарэйнай і фурнітурнай прамысловасці, з 1981 г. на Беларускім радыё. У 1977 г. прыняты ў Саюз пісьменнікаў БССР. Першае апавяданне надрукаваў у 1960 г. у газеце «Чырвоная змена». Аўтар аповесці «Зарыва ў начы» (1968), зборніка апавяданняў «Дзень пачаўся» (1969), аповесці «Цагельня» (1977).

СПАРТСМЕНЫ

БУСЛАЎ Міхаіл Рыгоравіч, нарадзіўся 14.9.1940 г. у г. Буда-Кашалёва. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1961). Працуе выкладчыкам фізічнага выхавання Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа. Майстар спорту па вольнай барацьбе. Неаднаразовы прызёр, чэмпіён Беларусі.

ДУПАНАЎ Сяргей Леанідавіч, нарадзіўся ў 1974 г. у в. Недайка. Закончыў Гомельскую школу алімпійскага рэзерву. Майстар спорта міжнароднага класа па веславанні на байдарках і каноэ. Сярэбраны прызёр першынства свету (1993), неаднаразовы чэмпіён Беларусі.



С.Л.Дупанаў.



В.І.Пусеў.

ЖУРАЎЛЁЎ Віктар Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1960 г. у г. Буда-Кашалёва. Закончыў Гомельскую школу алімпійскага рэзерву. Майстар спорту па веславанні на байдарках і каноэ. Сярэбраны прызёр першынства СССР (1982).

ПУСЕЎ Віктар Іванавіч, нарадзіўся ў в. Уза. Закончыў Гомельскую школу алімпійскага рэзерву. Заслужаны майстар спорту па веславанні на байдарках і каноэ (1991), прызёр чэмпіянату свету (1991).

Людзі, дастойныя памяці

Камісія па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Буда-Кашалёўскі раён» лічыць немагчымым пакінуць без увагі тых, хто ўсе свае сілы, талент, жыццёвую энергію аддаваў і аддае сёння справе развіцця раёна, асветы, аховы здароўя, культуры, захаванню нацыянальных рыс і традыцый насельніцтва Буда-Кашалёўшчыны. Няхай нават яны і не адзначаны высокімі званнямі.

БОНДАРАЎ Рыгор Васільевіч, нарадзіўся ў 1922 г. у в. Іволъск. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Прымаў удзел у абароне Ленінграда, трапіў у палон, зведаў жах канцэнтрацыйных лагераў у Прыбалтыцы, Польшчы, Германіі. Пасля вызвалення працягваў ваяваць, вайну закончыў у Берліне. З 1946 г. да 1985 г. працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады, аграномам-садаводам, начальнікам вытворчага ўчастка калгаса імя Калініна Буда-Кашалёўскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

БУКА Даніла Ільіч, нарадзіўся 10.12.1918 г. у в. Рыжкаўка Быхаўскага раёна Магілёўскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. працаваў участковым інспектарам міліцыі ў Буда-Кашалёве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна» і інш.

БЯЛАНАВА Валянціна Сцяпанаўна, нарадзілася 23.11.1950 г. у в. Губічы. Закончыла Губіцкую сярэднюю школу (1967), Мінскі педагагічны інстытут (1972). Пра-



Р.В.Бондараў.

В.С.Бяланава.

Н.М.Бянчук.

М.С.Васіленка.

А.Ф.Гаўрыленка.



С.С.Гудкоў.

П.П.Гусакоў.

цавала бібліятэкарам у сельскай бібліятэцы, загадчыцай аддзела раённай бібліятэкі, са жніўня 1983 г. — загадчыца аддзела культуры Буда-Кашалёўскага райвыканкома. Пад яе кіраўніцтвам створаны новыя, нетрадыцыйныя тыпы ўстаноў культуры, такія як Пыцькаўскі Дом-музей народных рамёстваў, школа майстэрства пры Шырокаўскім Доме культуры, цэнтр фальклору пры Івольскім Доме культуры, Губіцкі Дом рамёстваў, Дом народнай медыцыны пры Старабудскай сельскай бібліятэцы. За развіццё і прапаганду народнага мастацтва і творчасці, захаванне культурнай спадчыны В.С.Бяланава ўзнагароджана медалём Францыска Скарыны (1998). Трагічна загінула ў 2001 г. Пахавана ў Буда-Кашалёве.

БЯНЧУК Надзея Мацвееўна, нарадзілася ў 1929 г. у г.п. Уваравічы. Закончыла Гомельскі педагагічны інстытут (1970). Працавала бібліятэкарам, старшай піянерважатай у школе, дырэктарам РДК, загадчыцай аддзела культуры, з 1975 г. адказным сакратарам раённага таварыства «Веды». Узнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна», знакам «За выдатную працу» Міністэрства культуры СССР (1969), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

ВАСІЛЕНКА Міхаіл Сцяпанавіч, нарадзіўся 25.10.1935 г. у пас. Макаўе. Працаваў калгаснікам, загадчыкам склада ГЗМ, брыгадзірам паляводчай брыгады, з 1969 г. па 1976 г. аграномам, з 1976 г. па 1983 г. намеснікам старшыні калгаса, з 1983 г. галоўным аграномам. Уся працоўная дзейнасць звязана з калгасам «Новае жыццё» Буда-Кашалёўскага раёна.

ГАЎРЫЛЕНКА Аляксандр Фёдаравіч, нарадзіўся 11.2.1934 г. у пас. Чарняцін. Закончыў Чырвонабярэжскі сельгастэхнікум (1974). Каля 40 гадоў працаваў старшынёй Глазаўскага сельскага Савета. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

ГУДКОЎ Сяргей Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1938 г. у пас. Чырвоны Сцяг. Закончыў Кіеўскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці (1965), пасля якога працаваў інжынерам аддзела тэхнічнага кантролю, начальнікам змены, начальнікам цэха на абутковай фабрыцы «Праца». З 1971 г. па 1976 г. на партыйнай рабоце. З 1976 г. дырэктар абутковага вытворчага аб'яднання «Праца». Неаднаразова выбіраўся дэпутатам Гомельскага гарадскога і абласнога Саветаў, узнагароджаны некалькімі медалямі.

ГУСАКОЎ Пілiп Пiлiпавiч, нарадзіўся ў 1924 г. у в. Бацвінава Чачэрскага раёна. У 1925 г. бацькі пераехалі ў в. Шутнае. Закончыў дзевяць класаў Пірэвіцкай сярэдняй школы (1941), Усесаюзны сельска-

гаспадарчы тэхнікум (1957). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Цяжка кантужаны (1944). Пасля вайны працаваў участковым упаўнаважаным, памочнікам оперупаўнаважанага Буда-Кашалёўскага РАУС. У 1959—1966 гг. працаваў галоўным аграномам у калгасах раёна, з 1966 г. па 1968 г. старшынёй, потым да 1979 г. галоўным аграномам калгаса імя Ульянава, з 1979 г. па 1985 г. старшыней Буда-Люшаўскага сельскага Савета. Узнагароджаны медалём «За доблесную працу» (1966), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1969).

ДЗЕРВЯНКОЎ Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся 25.11.1957 г. у г. Буда-Кашалёва. Закончыў Буда-Кашалёўскую сярэднюю школу, Разанскае вышэйшае ваеннае паветрана-дэсантнае каманднае вучылішча (1979), Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (1999). Служыў на афіцэрскіх пасадах ва Узброенных Сілах СССР (снежань 1979 г. — ліпень 1981 г. у складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістане). Пасля дэмабілізацыі працаваў інжынерам Гомельскай абласной базы «Бакалея», інжынерам, начальнікам рэкламна-інфармацыйнага аддзела канцэрна «Інтэрцэнтр-ВЕДА», генеральным дырэктарам выдавецтва агенцтва «Веда-РІД», генеральным дырэктарам выдавецтва «РІД», першым намеснікам кіраўніка, кіраўніком адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Гомеля. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (з 2000). Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

ЕМЯЛЬЯНЧЫКАЎ Віктар Ягоравіч, нарадзіўся 19.5.1941 г. у в. Бацунь. Закончыў Бацунскую сярэднюю школу, Ленінградскае ваеннае вучылішча сувязі. Служыў на розных пасадах у Забайкаллі. З 1973 г. начальнік штаба грамадзянскай абароны (ГА) аднаго з раёнаў г. Чыта, начальнік курсаў, намеснік начальніка штаба ГА г. Бірабіджана, з ліпеня 1985 г. начальнік штаба ГА г. Белагорска. Палкоўнік. Узнагароджаны медалямі. Прымаў актыўны ўдзел у ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Памёр 12.6.1988 г.

ЖАРЭБЧАНКА Міхаіл Андрэевіч, нарадзіўся 1.2.1913 г. у в. Аляксандраўка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. па 1949 г. працаваў ва Уваравіцкім райваенкамаце, з 1949 г. па 1969 г. старшынёй калгаса імя Леніна Буда-Кашалёўскага раёна. За высокія дасягненні ў сельскай гаспадарцы М.А.Жарэбчанка ўзнагароджаны ордэнам Леніна, іншымі ордэнамі і медалямі. Памёр у 1991 г.


У.І.Дзервянкоў.


В.Я.Емяльянчыкаў.

М.І.Зянкевіч.

А.І.Іваноў.

ЗЯНКЕВІЧ Міхаіл Іосіфавіч, нарадзіўся 1.1.1952 г. у в. Хальч Жлобінскага раёна. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1974). Працаваў слесарам, загадчыкам майстэрань, галоўным інжынерам, кіраўніком Буда-Кашалёўскага раённага аб'яднання «Сельгастэхніка». Адзін з ініцыятараў стварэння і бязменны кіраўнік з дня заснавання сумеснага беларуска-галандскага прадпрыемства ААТ «АМІПАК».

ІВАНОЎ Адам Іванавіч, нарадзіўся ў 1925 г. у пас. Козі Рог. Закончыў мясцовую сямігодку, чыгуначнае вучылішча (1942), мінамётнае вучылішча (1943). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі працаваў у калгасе разнарабочым, загадчыкам малочна-таварнай фермы, тэхнічным кіраўніком на мясцовым цагельным заводзе, з 1949 г. па 1979 г. у органах міліцыі: участковы інспектар Кашалёўска-

В.М.Кавалёў.

М.Я.Кандраценка.

В.К.Клімкоў.

У.І.Куцанаў.

га, Дуравіцкага сельсаветаў. Капітан міліцыі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

КАВАЛЁВА Юлія Парфенаўна, нарадзілася у 1936 г. у в. Чабатовічы. Закончыла мясцовую сярэднюю школу, Лоеўскую школу краўцоў і 46 гадоў нязменна працавала па сваёй прафесіі ў Чабатовіцкім Доме быту. Узнагароджана медалямі «За працоўную адзнаку», «Ветэран працы», знакам «Выдатнік службы быту».

КАВАЛЁЎ Валерый Мікалаевіч, нарадзіўся 20.2.1949 г. у г.п. Уваравічы. Закончыў Уваравіцкую сярэднюю школу (1966), Буда-Кашалёўскі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (1969), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1983). Працаваў аўтамеханікам, загадчыкам майстэрань калгаса імя Леніна, галоўным інжынерам, з 1985 г. старшынёй калгаса «Новае жыццё».

КАНДРАЦЕНКА Міхаіл Яфімавіч, нарадзіўся ў 1919 г. у в. Царкоўе. Закончыў Рагачоўскае педагагічнае вучылішча (1938), Смаленскае стралкова-кулямётнае вучылішча (1941). У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Удзельнік абароны Мінска ў ліпені 1941 г. Пры пераправе цераз Днепр быў паранены. Актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі падпольных груп і партызанскіх атрадаў на Буда-Кашалёўшчыне, з кастрычніка 1943 г. камандзір партызанскага атрада імя М.І.Кутузава. Пасля вызвалення Буда-Кашалёва працаваў загадчыкам раённага аддзела народнай асветы, адказным рэдактарам раённай газеты «Ленінскі шлях», дырэктарам сярэдняй школы. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу» «Партызану Айчыннай вайны» I ступені і іншымі. Памёр у 1998 г.

КАРАСЁВА Таццяна Андрэеўна, нарадзілася ў 1942 г. у в. Слабада. Закончыла курсы аўтавадзіцеляў (1961). З 1961 г. шафёр малакавоза ў калгасе імя Ульянава. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені.

КЛІМКОЎ Валянцін Кірылавіч, нарадзіўся 28.7.1928 г. у г. Вязьма Смаленскай вобл. Закончыў інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту (1951). Працаваў брыгадзірам, начальнікам аддзела, галоўным інжынерам, начальнікам Віцебскага дэпо, начальнікам вагоннага дэпо ст. Полацк, дырэктарам Полацкага і Гомельскага заводаў сантэхабсталявання. У 1976 — 1989 гг. дырэктар Гомельскай бройлернай птушкафабрыкі (пас. Камунар). Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1974), Дружбы народаў (1988), медалямі.

КУЦАНАЎ Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся 5.3.1937 г. у в. Рагінь. Закончыў Уваравіцкую сярэднюю школу (1957), Рэчыцкі зоаветтэхнікум (1961), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1969). Працоўную дзейнасць пачаў рабочым у саўгасе «Уваравічы» ў 1955 г. З 1961 г. працаваў заатэхнікам, брыгадзірам малочна-таварнай фермы эксперыментальнай базы «Уваравічы», з 1975 г. галоўным заатэхнікам у саўгасах «Буйнавічы» і «Краснаакцябрскі». У 1975 — 1999 гг. дырэктар міжгаспадарчага прадпрыемства па вытворчасці воўны і бараніны «Асобіна». Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны» (1976) і Працоўнага Чырвонага Сцяга (1982).

ЛАЗАВЕНКА Ульяна Фёдараўна, нарадзілася 24.3.1923 г. у в. Будзішча Гомель-

скага раёна. Пасля заканчэння Гомельскага настаўніцкага інстытута (1949) усё жыццё працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Патапаўскай сярэдняй школе. Яна прывіла любоў да роднай мовы многім сваім вучням, трое з якіх сталі пісьменнікамі. Памерла ў 1995 г.

МАЦЮШКОЎ Пётр Яфрэмавіч, нарадзіўся ў 1920 г. у в. Анастасеўка. Працаваў трактарыстам у Рагінскай МТС. У 1940 г. прызваны ў Чырвоную армію. З першага дня вайны на фронце, камандзір гарматы. У баях пад Бярдзічавам быў паранены. Актыўны ўдзельнік партызанскага руху на Буда-Кашалёўшчыне: камандзір атрада імя Кутузава, а з кастрычніка 1943 г. начальнік штаба 1-й Буда-Кашалёўскай партызанскай брыгады. Пасля вызвалення раёна ад акупантаў П.Я.Мацюшкоў працаваў намеснікам старшыні Буда-Кашалёўскага райвыканкома, на іншых пасадах. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга (двойчы), Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» I і II ступеней і іншымі. Памёр у 1990 г. Пахаваны ў Буда-Кашалёве.

МЕРЫНОВІЧ Вера Макараўна, нарадзілася ў 1960 г. у в. Сінічына. Закончыла Целяшоўскую сярэднюю школу. З 1977 г. працуе трактарысткай у калгасе імя Калініна. Узнагароджана прызам імя П.Ангелінай (1984).

ПАЗНЯКОЎ Міхаіл Фёдаравіч, нарадзіўся 7.9.1929 г. у пас. Чырвоны Лужок. Закончыў Клімавіцкі саўгас-тэхнікум. Працаваў заатэхнікам у калгасах імя Чапаева і «Чырвоны шлях». У 1966 – 1983 гг. старшыня калгаса імя Калініна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

ПАЛІКШАНАЎ Ягор Фёдаравіч, нарадзіўся 13.12.1934 г. у в. Бахань Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобл. Закончыў Гомельскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1954) і Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1971). Працаваў аграномам, начальнікам вытворчага ўчастка калгаса імя Лепяшынскага, старшынёй калгаса «Рассвет» Кармянскага раёна, эксперыментальнай базы «Доўск» Рагачоўскага раёна. У 1983 – 1997 гг. дырэктар саўгаса «Краснаакцябрскі» Буда-Кашалёўскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны» (1966), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973, 1988). Выдатнік народнай асветы Беларусі (1974).

В.М.Мерыновіч.



Я.Ф.Палікшанаў.

М.М.Паркалаў.



Т.М.Самардакова.

ПАРКАЛАЎ Мікалай Мартынавіч, нарадзіўся 1.1.1927 г. у в. Запруддзе Клічаўскага раёна Магілёўскай вобл. Пасля заканчэння школы будаўнікоў у Мінску працаваў тэхнікам-будаўніком, загадчыкам аддзела будаўніцтва Клічаўскага і Буда-Кашалёўскага райвыканкомаў. З 1960 г. па 1979 г. узначальваў Буда-Кашалёўскую міжкалгасную будаўнічую арганізацыю, затым працаваў інжынерам МПМК № 43.

САМАРДАКОВА Тамара Мітрафанаўна, нарадзілася 3.3.1945 г. у в. Губічы. Закончыла Недайскую сярэднюю школу, Гомельскі педагагічны інстытут (1968). Працавала настаўніцай фізікі ў школе, больш за 32 гады выкладчыкам, старшым выкладчыкам Мазырскага педагагічнага інстытута. Аўтар звыш 30 навуковых прац і метадычных дапаможнікаў для студэнтаў фізіка-матэматычных факультэтаў педагагічных ВНУ.

СІДАРЭНКА Праскоўя Адамаўна, нарадзілася ў 1914 г. у в. Блюдніца. Закон-

П.А.Сідарэнка.

К.П.Сяміход.


П.А.Торманаў.

А.К.Харкевіч.

М.П.Чарнякоў.

чыла Блюдніцкую пачатковую школу (1926). Працавала рабочай саўгаса «Камунар», калгасніцай, брыгадзірам паляводчай брыгады калгаса імя В.П.Куйбышава, брыгадзірам паляводчай брыгады і птушкафермы саўгаса «Камунар». Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памерла 28.5.1998 г.

СЯМІХОД Кацярына Пятроўна, нарадзілася 2.12.1963 г. у в. Губічы. Закончыла Мінскі інстытут культуры (1986). Працоўную дзейнасць пачала ў жніўні 1981 г. бібліятэкарам, з 1986 г. загадчыца Губіцкай сельскай бібліятэкі.

ТОРМАНАЎ Пётр Аляксеевіч, нарадзіўся 30.8.1946 г. у в. Губічы. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1972). У 1976—1995 гг. быў старшынёй калгаса «Чырвоная зорка» Буда-Кашалёўскага раёна. Памёр 13.6.1996.

ХАРКЕВІЧ Арсеній Кузьміч, нарадзіўся ў 1913 г. у в. Лосеўка Дубровенскага раёна Віцебскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1953 г. у Буда-Кашалёўскім раёне: сакратар парткома Буда-Кашалёўскай МТС, кіраўнік аддзялення саўгаса «Буда-Кашалёўскі» (з 1958), старшыня калгаса імя Энгельса (з 1961), зноў кіраўнік аддзялення саўгаса «Буда-Кашалёўскі» (з 1962), дырэктар саўгаса «Шарыбаўскі» (1965—1972). Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Памёр у 1992 г.

ЧАРНЯКОЎ Мікалай Пятровіч, нарадзіўся 22.5.1940 г. у пас. Чырвоны Сцяг Рагінскага сельсавета. Закончыў Навагрудскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1961). Працаваў брыгадзірам у саўгасе «Рагінь» (1961—1965), аграномам у калгасе імя Горкага (1966—1971). У 1971—1998 гг. старшыня калгаса «Авангард». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны».

УЗНАГАРОДЖАНЫ ЗНАЧКОМ «ВЫДАТНІК АХОВЫ ЗДАРОЎЯ»

АРУНАС Станіслаў Іосіфавіч (1968). Нарадзіўся 1.9.1926 г. у в. Бронніца. Закончыў Гомельскае медыцынскае вучылішча (1947). З 1947 г. працаваў фельчарам, загадчыкам Негаўскага фельчарска-акушэрскага пункта.

АХРЭМЕНКА Антаніна Яўгеньеўна (1986). Нарадзілася 25.7.1957 г. у в. Славянец. Закончыла Гомельскае медыцынскае вучылішча (1976). Зубны тэхнік Буда-Кашалёўскай цэнтральнай раённай бальніцы.

ІЛЬЮШКІН Мікалай Аляксандравіч (1989). Нарадзіўся 11.1.1951 г. у в. Забор’е Расонскага раёна Віцебскай вобл. Закончыў Віцебскі мединстытут (1974). У 1985–1995 гг. галоўны ўрач Буда-Кашалёўскай раённай бальніцы.

КНЯЗЕВА Вольга Аркадзьеўна (1998). Нарадзілася 21.1.1960 г. у в. Нёман Мастоўскага раёна Гродзенскай вобл. Закончыла Гродзенскі медінстытут (1983). З 1984 г. участковы ўрач-тэрапеўт, з 1995 г. загадчыца паліклінікі.

КРЫВІЦКІ Яўген Міхайлавіч. Нарадзіўся 8.6.1934 г. у в. Рэчкі Веткаўскага раёна. Закончыў Мінскі медінстытут (1967). З 1967 г. урач-стаматолаг Буда-Кашалёўскай раённай бальніцы, з 1970 г. намеснік галоўнага ўрача. Памёр 12.10.1993 г.

САЗОН Ніна Іванаўна (1986). Нарадзілася 15.3.1946 г. у в. Закупленнае Клічаўскага раёна Магілёўскай вобл. Закончыла Мінскі медінстытут (1968). З 1971 г. працавала ў раённай бальніцы ў Буда-Кашалёве. Памерла ў 1992 г.

СМОЛЬНІКАВА Валянціна Фёдараўна (1986). Нарадзілася 27.11.1941 г. у г. Пінску. Закончыла Львоўскі медінстытут. З 1979 г. урач-педыятр Буда-Кашалёўскай раённай бальніцы, раённы педыятр. Адна з заснавальнікаў і кіраўнікоў Буда-Кашалёўскага аддзялення грамадскага фонду «Дзецям Чарнобыля».

СУВОРАЎ Аляксандр Максімавіч (1990). Нарадзіўся 27.3.1943 г. у в. Вялікая Зімніца Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобл. Закончыў Рагачоўскае медвучылішча (1969), Мінскі медінстытут (1976). З 1976 г. галоўны санітарны ўрач Буда-Кашалёўскай раённай СЭС. Узнагароджаны медалём М.І.Пірагова (1987) за заслугі ў дзейнасці таварыства Чырвонага Крыжа.

СЯЎКО Анатоль Міхайлавіч (1970). Нарадзіўся 9.6.1934 г. у в. Качаны Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. Закончыў Віцебскі медінстытут (1959). Працаваў урачом-фтызіятрам, урачом-неўрапатолагам, намеснікам галоўнага ўрача, галоўным урачом Уваравіцкай раённай бальніцы.

УЗНАГАРОДЖАНЫ ЗНАЧКОМ «ВЫДАТНІК НАРОДНАЙ АСВЕТЫ»

АФАНАСЕНКА Марыя Гаўрылаўна. Нарадзілася ў 1922 г. у в. Гаўлі, 50 гадоў працавала настаўніцай пачатковых класаў у Гаўлеўскай школе. Памерла ў 1995 г.

БОНДАР Аляксандр Лявонавіч (1982). Нарадзіўся 10.1.1945 г. у в. Ізбіне Пухавіцкага раёна Мінскай вобл. Закончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт (1969). Працаваў настаўнікам фізікі, намеснікам дырэктара, з 1975 г. дырэктарам Рагінскай сярэдняй школы.

А.Я.Ахрэменка.

В.А.Князева.

Н.І.Сазон.

В.Ф.Смольнікава.

А.М.Сувораў.


А.М.Сяўко.

А.Л.Бондар.

Л.М.Венцэль.

Я.А.Далецкі.

М.А.Казакоў.

Н.М.Кандрацэнка.

С.З.Качэргаў.

ВЕНЦЭЛЬ *Леанід Мікалаевіч* (1991). Нарадзіўся 31.8.1938 г. у г. Ельску Гомельскай вобл. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1968). Працаваў настаўнікам, з 1983 г. дырэктарам Камунараўскай сярэдняй школы.

ДАЛЕЦКІ *Яўген Амосавіч* (1963). Нарадзіўся ў в. Ажэгаўшчына Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1954). Працаваў настаўнікам пачатковых класаў, выкладчыкам геаграфіі, з 1958 г. па 1993 г. інспектарам Буда-Кашалёўскага райана. Узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, «Знак Пашаны», медалямі.

ДЗМІТРЫЕВА *Зінаіда Іванаўна*. Нарадзілася 1.1.1925 г. у в. Дзербічы. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Закончыла Брэсцкі педагагічны інстытут (1964). Працавала настаўніцай, бібліятэкарам, выхавальніцай у дзіцячым садзе, сакратаром палітаддзела МТС, дырэктарам школы, адказным сакратаром Бярозаўскага гарадскога аддзела аховы помнікаў гісторыі і культуры, інспектарам і метадыстам райана. Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй», «За перамогу над Японіяй» і іншымі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1980), ганаровымі граматамі Міністэрстваў адукацыі БССР (1964, 1985) і СССР (1975), нагруднымі знакамі «Выдатнік народнай асветы БССР» і «Выдатнік асветы СССР» (1980).

КАЗАКОЎ *Мікалай Аляксеевіч*. Нарадзіўся 3.5.1923 г. у пас. Дзедаў Курган. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Рагачоўскі настаўніцкі інстытут (1940), ВПШ пры ЦК КП(б)Б (1950), Магілёўскі педагагічны інстытут (1963). Працаваў настаўнікам, сакратаром РК ЛКСМБ, у апараце РК КПБ, дырэктарам Гаўлеўскай базавай школы (1953 – 1983), рэдактарам шматтыражнай калгаснай газеты «За высокі ўраджай». Адзін з ініцыятараў стварэння на Гомельшчыне таварыства Кірылы Тураўскага. Узнагароджаны медалямі.

КАНДРАЦЕНКА *Ніна Мікалаеўна* (1977). Нарадзілася ў 1936 г. у в. Серабранка Рагачоўскага раёна. Закончыла Гомельскі педагагічны інстытут (1959). Працавала настаўніцай матэматыкі, загадчыцай метадычнага кабінета райана, настаўніцай пачатковых класаў.

КАЧЭРГАЎ *Сяргей Захаравіч* (1955). Нарадзіўся 19.5.1916 г. у в. Рудня Жлобінскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1941). Працаваў настаўнікам матэматыкі Уваравіцкай сярэдняй школы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр 12.10.1975 г.

ЛУК'ЯНЕНКА Мікалай Ільіч (1983). Нарадзіўся 17.5.1941 г. у г.п. Уваравічы. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1965). Працаваў намеснікам дырэктара Уваравіцкай сярэдняй школы, з 1976 г. намеснікам, а з 1979 г. дырэктарам вучэбна-вытворчага камбіната г. Буда-Кашалёва, намеснікам загадчыка Буда-Кашалёўскага раёна. Памёр 1.5.1991 г.

ЛУК'ЯНЕНКА Тамара Іванаўна (1998). Нарадзілася 8.4.1948 г. у в. Пянчын. Закончыла Віцебскі педагагічны інстытут. Працавала выхавальніцай Уваравіцкага дзіцячага дома, настаўніцай пачатковых класаў Уваравіцкай СШ і Буда-Кашалёўскай СШ № 2, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Буда-Кашалёўскай СШ № 2. З 1995 г. дырэктар пачатковай школы ў Буда-Кашалёве.

МАНЬКОЎСКАЯ Вера Аляксандраўна (1967). Нарадзілася ў 1926 г. у г. Клінцы Бранскай вобл. У Буда-Кашалёўскім раёне пражывае з 1933 г. Закончыла Гомельскі педагагічны інстытут (1950). Працавала настаўніцай гісторыі Буда-Кашалёўскай сярэдняй школы № 1, інспектарам раёна, загадчыцай метадычнага кабінета, выкладчыцай гісторыі ў Буда-Кашалёўскім тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі, загадчыцай музея баявой і працоўнай славы тэхнікума.

МІХАЛЕНКА Аляксандр Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1922 у в. Забаб'е. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут. Працаваў настаўнікам, завучам, дырэктарам Рагінскай сярэдняй школы. Узнагароджаны медалямі.

МУХА Фёдар Фёдаравіч (1991). Нарадзіўся 16.10.1949 г. у в. Глазаўка. Закончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт (1973). Працаваў настаўнікам матэматыкі, дырэктарам Негаўскай васьмігадовай школы, з 1978 г. дырэктар Чабатовіцкай сярэдняй школы, намеснік загадчыка, загадчык Буда-Кашалёўскага раёна, адзін з заснавальнікаў вочна-завочнай школы давузаўскай падрыхтоўкі ў Буда-Кашалёве.

ПЕЎНЕВА Марыя Пракопаўна. Нарадзілася ў 1938 г. у в. Гаўлі. Працуе настаўніцай пачатковых класаў з 1960 г.

СЕВАСЦЬЯНАВА Аляксандра Фёдараўна (1984). Нарадзілася ў 1924 г. у в. Радзеева. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Закончыла Мінскі педагагічны інстытут (1968). Працавала настаўніцай гісторыі ў сярэдняй школе. Узнагароджана медалём «За баявыя заслугі». Памерла ў 1994 г.

М.І.Лук'яненка.

Т.І.Лук'яненка.


В.А.Манькоўская.


Ф.Ф.Муха.

М.П.Пеўнева.

С.П.Серакоў.

СЕРАКОЎ Сцяпан Парфенавіч (1956). Нарадзіўся ў 1914 г. у в. Чабатовічы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Рэчыцкі педагагічны тэхнікум (1935), Гомельскі педагагічны інстытут (1956). Працаваў настаўнікам біялогіі Чабатовіцкай школы. Арганізатар і кіраўнік аднаго з лепшых у вобласці вучэбна-вы-

Л.І.Хлапіцкі.

Ю.Е.Шмідаў.

Ф.А.Лапушкоў.

З.С.Яўстраценка.

ворчага прышкольнага ўчастка. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі (двойчы), медалём «За адвагу».

ХЛАПІЦКІ Леанід Іванавіч. Нарадзіўся ў 1920 г. у в. Сетнае Уздзенскага раёна Мінскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1959). Працаваў настаўнікам, дырэктарам Камунараўскай сярэдняй школы. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга (1955), медалём «За баявыя заслугі».

ШМІДАЎ Юрый Евелевіч (1957). Нарадзіўся ў 1920 г. у г.п. Уваравічы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1951). Працаваў з 1946 г. настаўнікам, завучам, дырэктарам Акцябрскай і Камунараўскай сярэдніх школ, загадчыкам Уваравіцкага, Буда-Кашалёўскага райана, дырэктарам школы-інтэрната, Патапаўскай сярэдняй школы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

* * *

ЛАПУШКОЎ Фёдар Антонавіч. Нарадзіўся ў 1923 г. у в. Ліпа. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Навазыбкаўскі настаўніцкі інстытут (1954). Працаваў настаўнікам гісторыі, завучам, дырэктарам Чабатовіцкай сярэдняй школы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі, значком «Выдатнік асветы СССР» (1980). Памёр у 1981 г.

ЯЎСТРАЦЕНКА Зінаіда Савельеўна. Нарадзілася ў 1936 г. у в. Дудзічы Чачэрскага раёна Гомельскай вобл. Закончыла Гомельскі педагагічны інстытут (1959). З 1967 г. па 1989 г. працавала настаўніцай у Мікалаеўскай сярэдняй школе. Узнагароджана значком «Выдатнік асветы СССР» (1978).

Звязаныя лёсам з краем

БАШЫЛАЎ Віктар Нічыпаравіч, нарадзіўся 16.10.1934 г. у пас. Крысін Веткаўскага раёна. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут імя Чкалава (1959). Працаваў настаўнікам хіміі і біялогіі, завучам, дырэктарам сямігадовай школы, дырэктарам вячэрняй школы працоўнай моладзі, інспектарам школ Уваравіцкага райана, дырэктарам Уваравіцкай СШ. У 1979–1995 гг. старшыня пасялковага Савета г.п. Уваравічы. Узнагароджаны медалямі «Ветэран працы» (1985), «За працоўную адзнаку» (1986).

ГАЎРУШАЎ Аляксандр Анатолевіч, нарадзіўся 3.11.1956 г. у г. Рэчыца. Закончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі (1978). Працаваў эканамістам Мазырскага аддзялення Дзяржбанка (1978—1979), намеснікам кіраўніка, кіраўніком Буда-Кашалёўскага аддзялення Дзяржбанка (1979—1987), начальнікам Гомельскага абласнога ўпраўлення Аграпрамбанка СССР (1987—1991), старшынёй праўлення Гомельскага аддзялення Белаграпрамбанка (1991–1996), старшынёй праўлення Белаграпрамбанка (1996–2000), з 2000 г. старшыня праўлення ААТ «Белаграпрамбанк».

ГОЛАД Дзмітрый Сцяпанавіч, нарадзіўся 17.9.1932 г. у в. Перароўскі Млынок Жыткавіцкага раёна. Беларускі вучоны-геабатанік. Закончыў Буда-Кашалёўскі лясны

тэхнікум (1952), Беларускі лесатэхнічны інстытут (1957). З 1959 г. у Інстытуце эксперыментальнай батанікі імя В.Ф.Купрэвіча НАН Беларусі: малодшы, старшы навуковы супрацоўнік, з 1988 г. загадчык лабараторыі геабатанікі. У 1966 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 1995 г. стаў доктарам біялагічных навук. За значны ўклад у развіццё лесазнаўства і лясной экалогіі ў 1999 г. абраны акадэмікам Лясной акадэміі навук Украіны, у 1999 г. членам-карэспандэнтам, а ў 2000 г. акадэмікам Беларускай інжынернай акадэміі.

За цыкл прац па вывучэнні структуры раслiннага покрыва Беларусі і рацыянальнага выкарыстання раслінных рэсурсаў рэспублікі прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР (1972). Апублікаваў больш за 240 навуковых прац, у т.л. 7 манаграфій.

Творы: Растительность Белоруссии, ее картографирование, охрана и использование. Мн., 1979 (разам з І.Д.Юркевічам, У.С.Адзярыхам); Бластомогены в лесных биогеоценозах. Мн., 1987 (разам з І.Д.Юркевічам, Н.І.Петручук); Рекреационные ресурсы бассейна Нарочи и их использование. Мн., 1989 (разам з І.Д.Юркевічам, Я.Л.Красоўскім).

ДУБІЦКАЯ Марыя Фамінічна, нарадзілася 15.2.1925 г. у в. Язвіны Уздзенскага раёна Мінскай вобл. Закончыла Мінскі медыцынскі інстытут па спецыяльнасці ўрач-лячэбнік (1949). Была накіравана ва Уваравіцкі раён. Працавала райдзяржсанінспектарам Уваравіцкага раёна, галоўным урачом Уваравіцкай раённай санэпідэмстанцыі, галоўным урачом 2-й райбальніцы, урачом-інфекцыяністам. Памерла 2.5.1995 г.

КАВАЛЬКОЎ Міхаіл Пятровіч. Закончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1950), Беларускі лесатэхнічны інстытут, аспірантуру. Кандыдат эканамічных навук (1975).

КАЛАЧ Барыс Пілiпавіч, нарадзіўся 11.8.1923 г. у г. Гарадня Чарнігаўскай вобл. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1950). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1950 – 1955 гг. працаваў дырэктарам Буда-Кашалёўскай рускай сярэдняй школы. Герой Савецкага Саюза (2.5.1945). Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені. Памёр 20.12.2001 г.

КАНАНОВІЧ Канстанцін Юльянавіч, нарадзіўся 8.12.1872 г. у в. Грабаўка Гомельскага раёна. Беларускі вучоны ў галіне санітарыі і эпідэміялогіі, урач-оталарынголаг. У 1899 г. закончыў Кіеўскі універсітэт. Працоўную дзейнасць пачаў у лютым 1890 г. сельскім урачом у м. Уваравічы, дзе пад яго кіраўніцтвам была пабудавана бальніца. Працаваў у Гомелі, Магілёве. У 1922 г. арганізаваў першую ў СССР Гомельскую санітарна-эпідэміялагічную станцыю. Удзельнік 1-й сусветнай, Вялікай Айчын-


В.Н.Башылаў.

А.А.Гаўрушаў.

Дз.С.Голад.

М.Ф.Дубіцкая.

М.П.Кавалькоў.

Б.П.Калач.



У.А.Канопліч.



М.В.Каропа.

Дз.Я.Клімкоў.

най войнаў. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. Аўтар шэрагу навуковых прац. Памёр 16.3.1954 г.

КАНОПЛІЧ Уладзімір Арсенцьевіч, нарадзіўся 31.5.1958 г. у в. Забалоцце Мазырскага раёна. Закончыў Мазырскі педагагічны інстытут (1980). Кандыдат педагагічных навук (1990), дацэнт (1993). Працаваў настаўнікам, дырэктарам Недайскай сярэдняй школы, у Буда-Кашалёўскім райкоме кампартыі Беларусі, потым — выкладчык, старшы выкладчык, загадчык кафедры працоўнага навучання Мазырскага пед-інстытута. Аўтар каля 40 навуковых і вучэбна-метадычных прац.

КАРГІН Аляксей Георгіевіч, нарадзіўся ў 1924 г. у в. Пуркаева Дубенскага раёна, Мардовія. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. лёс звязаны з Буда-Кашалёўшчынай. З 1948 г. на партыйнай рабоце: загадчык аддзела Уваравіцкага РК КПБ, загадчык сектара Гомельскага абкома, 2-і сакратар Гомельскага РК КПБ, 1-ы сакратар Гомельскага РК КПБ і інш. У 1970—1979 гг. галоўны дзяржаўны інспектар па закупках і якасці сельгаспрадуктаў па Гомельскай вобласці. Член ЦК КПБ у 1960—1971 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1962—1966 гг. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны І і II ступеней, Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» (двойчы). Памёр у 1992 г.

КАРОПА Мікалай Васільевіч, нарадзіўся 19.12.1932 г. у в. Казакоўка Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобл. Закончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі (1957), аспірантуру пры Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі (1963). Працаваў галоўным бухгалтарам саўгаса «Меркулавічы» Чачэрскага раёна, саўгаса «Буда-Кашалёўскі», упраўлення сельскай гаспадаркі Буда-Кашалёўскага раёна. У 1967—1996 гг. дырэктар саўгаса «Марозавічы» Буда-Кашалёўскага раёна. Аўтар шэрагу артыкулаў па праблемах эканомікі сельскай гаспадаркі. Памёр у 1996 г.

КЛІМАЎ Іван Фролавіч, нарадзіўся 10.9.1903 г. у в. Касцюкоўка Гомельскага раёна. Дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў Мінскай і Вілейскай абласцях у Вялікую Айчынную вайну. З 1923 г. на прафсаюзнай, камсамольскай і партыйнай рабоце. У 1923—1924 гг. быў старшынёй прафсаюзнага камітэта саўгаса «Уваравічы». З 1940 г. 1-ы сакратар Вілейскага абкома КП(б)Б. У 1943—1944 гг. 1-ы сакратар Вілейскага падпольнага абкома КП(б)Б. З 1944 г. 1-ы сакратар Вілейскага, Маладзечанскага, Баранавіцкага абкомаў партыі. З 1962 г. намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР. У 1968—1974 гг. намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Адзін з аўтараў кнігі «Партызаны Вілейшчыны» (1970). Памёр 9.10.1991 г.

КЛІМКОЎ Дзмітрый Ягоравіч, нарадзіўся 23.2.1931 г. у в. Данілавічы Веткаўскага раёна. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1954). Працаваў настаўнікам гісторыі, намеснікам дырэктара, дырэктарам сямігадовай школы, прапагандыстам Уваравіцкага РК КПБ, дырэктарам Рагінскай сярэдняй школы, загадчыкам Буда-Кашалёўскага райана, сакратаром Буда-Кашалёўскага райвыканкома, выкладчыкам грамадскіх навук Буда-Кашалёўскага саўгаса-тэхнікума, старшынёй Буда-Кашалёў-

скага райкома прафсаюзаў работнікаў адукацыі, дырэктарам Буда-Кашалёўскай СШ № 2. Узнагароджаны медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна» (1970), «За працоўную адзнаку» (1971), «Ветэран працы» (1988), значком «Выдатнік народнай асветы БССР» (1968).

КРУЧКОЎ Валянцін Пятровіч, нарадзіўся 27.11.1948 г. у пас. Савінцы Савінкаўскага раёна Харкаўскай вобл. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1971). Працаваў галоўным інжынерам калгаса «Новае Палессе» Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці, намеснікам старшыні калгаса «Зара» таго ж раёна, дырэктарам Буда-Кашалёўскага саўгаса-тэхнікума (з 1991 г. аграрна-тэхнічны каледж), дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (старшыня Камісіі па праблемах Чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстання). Памёр у жніўні 2001 г. Пахаваны ў Мінску.

КУНІЦКІ *Яраслаў Адольфавіч*, нарадзіўся 8.11.1920 г. у в. Шастакі Капыльскага раёна Мінскай вобл. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1950). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з арганізатараў і актыўных удзельнікаў партызанскай барацьбы ў 1942—1943 гг. у былым Уваравіцкім раёне. Працаваў намеснікам старшыні Уваравіцкага райвыканкома, старшынёй калгаса імя Чапаева (1953—1963), дырэктарам саўгаса «Рагінь» (1963—1974). Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі.

ЛЫНЬКОЎ Міхаіл Ціханавіч (Міхась Лынькоў), нарадзіўся 30.1.1899 г. у в. Зазыбы Віцебскага раёна Віцебскай вобл. Беларускі пісьменнік. Закончыў Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю (1917). Настаўнічаў у Ліпініцкай земскай школе (цяпер Буда-Кашалёўскі раён). У 1919—1922 гг. служыў у Чырвонай арміі. Удзельнічаў у савецка-польскай вайне 1920 г., у разгроме атрадаў Булак-Балаховіча. Настаўнічаў у в. Свержань Рагачоўскага раёна. У 1925—1928 гг. адказны сакратар рэдакцыі, намеснік рэдактара, у 1928—1930 гг. рэдактар бабруйскай акруговай газеты «Камуніст». Быў арганізатарам і кіраўнікам Бабруйскай філіі «Маладняка», адным з кіраўнікоў БелАПП. У 1930—1941 гг. працаваў у Дзяржаўным выдавецтве БССР, сакратаром аргкамітэта, галоўным рэдактарам часопіса «Полымя рэвалюцыі». Старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР (1938—1948), рэдактар франтавой газеты «За Савецкую Беларусь». У 1943—1946 і 1949—1952 гг. дырэктар Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва АН БССР. Выбіраўся кандыдатам у члены ЦВК БССР (1921—1931), дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1940—1945). Як член дэлегацыі БССР неаднаразова ўдзельнічаў у рабоце сесій Генеральнай Асамблеі ААН. Акадэмік АН БССР. Член СП СССР з 1934 г. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (тройчы), Працоўнага Чырвонага Сцяга (тройчы), Чырвонай Зоркі, медалямі. Народны пісьменнік БССР (1962). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968) за раман «Векапомныя дні». Для дзяцей выдаў кнігі «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў», «Міколка-паравоз», «Янка-парашутыст» (усе ў 1937) і інш. Пераклаў на беларускую мову асобныя творы М.Горкага, М.Ціханава і інш. Памёр 21.9.1975 г.

В.П.Кручкоў.



М.Ц.Лынькоў.

МАРЦІНОВІЧ Барыс Сяргеевіч, нарадзіўся 25.8.1932 г. у в. Падлужжа Глускага раёна Магілёўскай вобл. Закончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1951). Беларускі лесатэхнічны інстытут (1957), аспірантуру пры Інстытуце эксперыментальнай батанікі імя В.Ф.Купрэвіча АН БССР (1966). Кандыдат біялагічных навук (1967). Працаваў таксатарам Мінскай аэрафоталесаўпарадкавальнай экспедыцыі, малодшым навуковым супрацоўнікам у БелНДІ механізацыі і электрыфікацыі

Б.С.Марціновіч.

П.П.Міклашэвіч.

М.К.Новікаў.

А.А.Паташкін.

сельскай гаспадаркі, у Цэнтральным батанічным садзе АН БССР, затым — малодшы, старшы, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф.Купрэвіча НАН Беларусі. Аўтар шматлікіх навуковых распрацовак і артыкулаў. Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Міністэрства лясной гаспадаркі БССР.

МІКЛАШЭВІЧ *Пётр Пятровіч*, нарадзіўся 18.10.1954 г. у в. Касута Вілейскага раёна Мінскай вобл. Закончыў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1981). Працаваў рабочым на заводзе жалезабетонных вырабаў, стажорам суддзі, суддзёй, старшынёй суда Буда-Кашалёўскага раёна, членам і старшынёй Гомельскага абласнога суда. У 1998—1999 гг. 1-ы намеснік міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь. З верасня 1999 г. 1-ы намеснік старшыні Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь.

НОВІКАЎ *Міхаіл Кірылавіч*, нарадзіўся 22.5.1933 г. у в. Отар Чачэрскага раёна. Закончыў Беларускі лесатэхнічны інстытут (1957). Працаваў ляснічым, з 1966 г. па 1998 г. дырэктарам Буда-Кашалёўскага лясгаса, шмат сіл і прафесійных ведаў аддаў справе развіцця лясной гаспадаркі раёна. Ён таленавіты чалавек. Яго паэтычныя творы і апавяданні друкаваліся ў раённай і галіновай газетах. Узнагароджаны медалямі, ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Міністэрства лясной гаспадаркі і інш. Жыве ў Буда-Кашалёве.

ПАТАШКІН *Адольф Аляксеевіч*, нарадзіўся 6.3.1926 г. у в. Дураўкі Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобл. Герой Сацыялістычнай Працы (1990). Працаваў у Гомельскім і Буда-Кашалёўскім дзіцячых дамах, старшынёй калгаса «Шлях да камунізму» Буда-Кашалёўскага, старшынёй міжкалгасбуда, намеснікам старшыні калгаса «За Радзіму» Гомельскага раёнаў. З 1964 г. старшыня, потым намеснік старшыні, калгаса імя Урыцкага Гомельскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

РАМАНАЎ *Уладзімір Сяргеевіч*, нарадзіўся 20.5.1926 г. у в. Чыстыя Лужы Веткаўскага раёна. Беларускі вучоны ў галіне лясной гаспадаркі. Доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар (1976), акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1980). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1947), Ленінградскую лесатэхнічную акадэмію (1952). Працоўную дзейнасць пачаў з пасады ляснічага, быў дырэктарам Жаркоўскай лясной вопытнай станцыі (1955—1957), запаведна-паляўнічай гаспадаркі «Белавежская пушча» (1957—1966), намеснікам міністра лясной гаспадаркі БССР (1966—1973), рэктарам Беларускага тэхнічнага інстытута (1973—1991), рэктарам Усходнееўрапейскага недзяржаўнага інстытута бізнесу і права. Аўтар звыш 150 навуковых работ. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны І ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, камандорскім ордэнам «Заслугі перад Польшчай».

РУСАЛЕНКА *Аркадзь Іванавіч*, нарадзіўся 9.5.1939 г., у в. Адрубы Жлобінскага раёна. Доктар біялагічных навук (1991). Закончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1957), Беларускі лесатэхнічны інстытут (1962), аспірантуру пры Інстытуце эксперыментальнай батанікі імя В.Ф.Купрэвіча АН Беларусі. Яго працоўны шлях — інжынер-эканаміст, галоўны ляснічы лясгаса, малод-

шы навуковы супрацоўнік, вучоны сакратар інстытута, прафесар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта. Аўтар шматлікіх навуковых распрацовак і артыкулаў у галіне біялагічнай прадукцыйнасці сасновых фітацэнозаў.

СУПРОНЕНКА Міхаіл Паўлавіч, нарадзіўся 1.4.1924 г. у в. Хута-Зайцаў Дабранскага раёна Чарнігаўскай вобл. З 1933 г. разам з сям'ёй пераехаў у Буда-Кашалёўскі раён. Закончыў 7 класаў Патапаўскай сярэдняй школы, Ленінградскае прафесійнае вучылішча (1941), Мінскі фінансава-эканамічны тэхнікум (1961). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў на савецкай і партыйнай рабоце. З 1966 г. па 1984 г. загадчык фінансавага аддзела Буда-Кашалёўскага райвыканкома. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Памёр у 1997 г.

ТУЖЫКАЎ Валерый Андрэевіч, нарадзіўся 4.3.1933 г. у в. Мінькаў Рагачоўскага раёна. Закончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум (1951), Беларускі тэхналагічны інстытут (1963). Служыў у Савецкай арміі. Працаваў тэхнікам і інжынерам Магілёўскай лесаўпарадкавальнай экспедыцыі, інжынерам і начальнікам лесаўпарадкавальнай партыі Беларускага лесаўпарадкавальнага прадпрыемства, старшым інжынерам у Міністэрстве лясной гаспадаркі: рэферэнтам і старшым рэферэнтам па пытаннях лясной гаспадаркі і аховы прыроды ў СМ БССР, намочнікам міністра лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.



А.І.Русаленка.



В.А.Тужыкаў.

Мацярынская слава

БЯЛІНСКАЯ Зоя Валянцінаўна, в. Шарыбаўка.

БІРЧУКОВА Акуліна Фёдараўна, в. Беразіна.

ГРЫЦКОВА Зоя Рыгораўна, в. Старая Буда.

ЖЫВАДЗЁРАВА Ніна Аляксееўна, в. Крыўск.

Жанчыны-маці на сустрэчы з кіраўніцтвам Буда-Кашалёўскага райвыканкома. 2001 г.

КРАЎЧАНКА Надзея Іванаўна, в. Патапаўка.

МІНАВА Ніна Мацвееўна, в. Сялец.

НІЧЫПАРЭНКА Марыя Мікітаўна, в. Дуравічы.

ПАХОДАВА Марыя Емяльянаўна, в. Выдрыца.

ПРАКОПЕНКА Вольга Сямёнаўна, в. Брылёў.

РАДЧАНКА Марыя Цітаўна, в. Бушаўка.

САВІЦКАЯ Марыя Пракопаўна, в. Асобіна.

СЛЕСАРАВА Валянціна Цімафееўна, в. Броды.

ШАБЛОЎСКАЯ Праскоўя Іванаўна, саўгас «Чачора».

ШЧАРБАКОВА Ульяна Кірылаўна, калгас імя Кірава.

Ваеннаслужачыя — ураджэнцы Буда-Кашалёўскага раёна, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВІШАНКОЎ Іван Сяргеевіч, н. у 1915 у в. Ліпа, лейтэнант, прапаў без вестак у 1946.

КАРПАЎ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1949, сяржант, загінуў 13.2.1970, пахаваны ў в. Пыцькаўка.

МІХАЛЕВІЧ Сяргей Васільевіч, н. у 1964, яфрэйтар, загінуў 2.6.1984, пахаваны ў в. Чэрапаўка.

УЛАСЕНКА Кірыла Яфрэмавіч, н. у пас. Красны Акцябр, радавы, прапаў без вестак 7.12.1945.

БУДА-КАШАЛЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНТОНЧАНКА Віктар Іванавіч, н. у 1937, капітан 2-га рангу, загінуў 13.11.1977, пахаваны ў г. Кранштат, Расія.

ГАЛОТА Леанід Адамавіч, н. у г. Буда-Кашалёва, радавы, загінуў 9.9.1947.

ГАЎРЫЛЮК Мікалай Пятровіч, н. у 1965, сяржант, загінуў 25.6.1984, пахаваны ў г. Буда-Кашалёва.

ГАЦКОЎ Уладзімір Іванавіч, н. у 1953, радавы, памёр 31.1.1972, пахаваны ў г. Буда-Кашалёва.

ГУБАНАЎ Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1935, ст. лейтэнант, загінуў у 1958, пахаваны у г. Шверын, Германія.

ЛАДЗІК Аляксандр Іванавіч, н. у 1912 у г. Буда-Кашалёва, радавы, прапаў без вестак у ліпені 1947.

БУДА-ЛЮШАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЯКСЕЕЎ Ігар Іосіфавіч, н. у 1966, радавы, загінуў 17.10.1987, пахаваны ў в. Любавін.

МАЛАШАНКА Міхаіл Васільевіч, н. у 1946, радавы, загінуў 27.9.1966, пахаваны ў в. Хмяльное.

РЭПІНСКІ Іван Ягоравіч, н. у в. Буда-Люшаўская, сяржант, загінуў 14.12.1948.

БЯРВЁНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ЗАБЕЛАЎ Лаўрэнцій Герасімавіч, н. у 1918 у в. Хоўхла, радавы, памёр ад ран у 1946.

КУЦЫЛАЎ Віктар Міхайлавіч, н. у 1958, капітан, загінуў 17.1.1987, пахаваны ў в. Хоўхла.

СЕМУКОЎ Ціхан Сцяпанавіч, ст. сярж., загінуў 1.1.1946.

ГЛАЗАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ЛАЎРЭНЦІКАЎ Васіль Адамавіч, н. у в. Глазаўка, радавы.

УДОДАЎ Рыгор Рыгоравіч, н. у 1941, радавы, загінуў 22.9.1965, пахаваны ў г. Сяміпалацінск, Казахстан.

ЯЎМЕНЧЫКАЎ Леанід Ісаевіч, н. у пас. Новы Свет, радавы, загінуў 18.7.1946, пахаваны ў г. Шаўляй, Літва.

ГУБІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПЛЯКІН Мікалай Іосіфавіч, н. у 1963, радавы, памёр 30.6.1981, пахаваны ў в. Крукі Брагінскага раёна.

ГУСЯВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

КАБАЕЎ Карп Фёдаравіч, н. у 1909 у в. Гусявіца, прапаў без вестак у 1946.

КУНДЗЕЛЕЎ Віктар Яўсеевіч, н. у 1942, загінуў 2.11.1963, пахаваны ў в. Пянчын.

МІНКОЎ Трафім Паўлавіч, н. у 1913 у в. Гусявіца, радавы, прапаў без вестак у 1946.

ЦІШЧАНКА Фёдар Васільевіч, н. у 1919 у в. Гусявіца, лейтэнант, прапаў без вестак у 1946.

ШЭВЕЛЕЎ Фёдар Герасімавіч, н. у в. Івашкаў, радавы, памёр 22.7.1945.

ДУРАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ШУРАЎ Генадзь Іванавіч, н. у 1967, радавы, загінуў 16.11.1987, пахаваны ў в. Бурлак.

ЗАБАЛОЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АСІПЕНКА Іван Сцяпанавіч, н. у 1918 у пас. Мікольск, капітан, прапаў без вестак у студзені 1947.

КАШАЛЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЯКСЕЙКАЎ Васіль Іванавіч, н. у 1919 у в. Кашалёў, сяржант, загінуў 4.10.1946.

ВАЛЮШЭНКА Іван Аляксандравіч, н. у 1926 у в. Зарэчча, радавы, памёр 6.9.1946.

КРЫЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БЯГУН Васіль Фёдаравіч, н. у 1956, радавы, загінуў 25.6.1978, пахаваны ў в. Кулажын Брагінскага раёна.

ГАНАКОЎ Іван Восіпавіч, н. у в. Крыўск, мал. лейтэнант, памёр ад ран 19.1.1949.

ПІНЧУКОЎ Уладзімір Пятровіч, н. у 1946, радавы, загінуў 18.1.1968, пахаваны ў в. Бацунь.

ХАМЯЧЭНКА Пётр Іванавіч, н. у 1925 у в. Крыўск, сяржант, загінуў 9.6.1946.

ЦЫБРАНКОЎ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1959, сяржант, загінуў 23.1.1984, пахаваны ў в. Бацунь.

ЛІПІНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАБІЧАЎ Васіль Андрэевіч, н. у 1921 у в. Негаўка, лейтэнант, прапаў без вестак у 1946.

ВАРАНКОЎ Мікалай Мікітавіч, н. у 1912 у в. Салтанаўка, сяржант, прапаў без вестак у ліпені 1945.

КІРЫЛЕНКА Іван Кірылавіч, н. у 1905 у в. Негаўка, радавы, прапаў без вестак у жніўні 1945.

КІРЫЛЕНКА Павел Рыгоравіч, н. у 1921 у в. Негаўка, мал. лейтэнант, памёр ад ран 10.6.1945, пахаваны ў г. Гданьск, Польшча.

МІСІЯНЦАЎ Пётр Акімавіч, н. у 1917 у в. Струкі, радавы, памёр ад ран 27.7.1945.

РУСАКЕВІЧ Андрэй Аляксандравіч, н. у 1924, прапаў без вестак у снежні 1945.

ШЫМБАЛЕЎ Міхаіл Дзмітрыевіч, н. у в. Бронніца, радавы, загінуў 1.8.1945.

ЯНКОЎ Міхаіл Маркавіч, н. у 1925 у пас. Зялёны Дуб, курсант, загінуў 17.7.1945.

ЯРОМАЎ Яўхім Паўлавіч, н. у 1923 у в. Салтанаўка, мал. лейтэнант, памёр ад ран 23.12.1945, пахаваны ў с. Таманаўка Сафіеўскага раёна Днепрапятроўскай вобл., Украіна.

Ф.В.Цішчанка.

МАРОЗАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ДРЫЧОЎ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1934, загінуў 16.5.1954, пахаваны ў г. Екацярынбург, Расія.

КУЦАПАЛЕНКА Іван Апанасавіч, н. у 1926 у в. Славянец, сяржант, памёр 24.7.1945, пахаваны ў г. Кастрама, Расія.

МАШЫХІН Мікалай Аляксеевіч, н. у 1937, прапаршчык, загінуў 3.5.1981, пахаваны ў в. Новая Буда.

ПАШЧАНКА Сямён Пятровіч, н. у 1906 у в. Марозавічы, радавы, памёр 30.11.1945, г. Гляйвіц, Германія.

СЕМЧАНКА Андрэй Дзмітрыевіч, н. у 1972, радавы, загінуў 2.8.1991, пахаваны ў в. Беразіна.

СТАЛЯРОЎ Дзмітрый Андрэевіч, н. у 1897 у в. Марозавічы, прапаў без вестак у лютым 1947.

МІКАЛАЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

МАЦЮШЭНКА Васіль Аляксеевіч, н. у 1914 у в. Зорка, загінуў у 1946.

СТАЛЯРОЎ Пётр Іванавіч, н. у 1925 у в. Зорка, матрос, памёр 24.5.1947.

НЕДАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

КІРЭЕЎ Нікан Лявонавіч, н. у пас. Барок, радавы, памёр ад ран 25.11.1945.

ПАТАПАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БУЛАЦКІ Васіль Мікалаевіч, н. у 1915 у в. Галы, лейтэнант, прапаў без вестак у 1946.

ГАРЭЛІКАЎ Міхаіл Мацвеевіч, н. у в. Гаўлі, мал. сяржант, загінуў 13.1.1946.



Я.В.Котаў.

Я.Р.Кавалёў.

ЗЭКАЎ *Ягор Андрэевіч*, н. у 1907 у в. Патапаўка, радавы, прапаў без вестак у красавіку 1947.

ФЁДАРАЎ *Аляксандр Уладзіміравіч*, н. у 1962, загінуў 14.5.1982, пахаваны ў п. Першамайскі Чыцінскай вобл., Расія.

РАГІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БУБЛІКАЎ Васіль Антонавіч, н. у 1919 у в. Лозаў, гв. лейтэнант, загінуў 3.8.1945, пахаваны ў м. Айдзеры Тукумскага раёна, Латвія.

ГРЫШАНКОЎ *Леанід Аляксандравіч*, н. у 1964, мал. сяржант, загінуў 30.5.1985, пахаваны ў в. Дзербічы.

КОТАЎ *Якаў Васільевіч*, н. у 1914 у в. Рудня Лозаўская, радавы, прапаў без вестак у студзені 1941.

ЧУРАКОЎ Мікалай Сяргеевіч, н. у 1924 у в. Рагінь, радавы, памёр ад ран 21.8.1945.

УВАРАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ДЗЯСНІЦКІ Сяргей Барысавіч, н. у в. Радзеева, радавы, загінуў 12.2.1947.

КАВАЛЁЎ Яўген Рыгоравіч, нарадзіўся ў г.п. Уваравічы. Закончыў з залатым медалём Уваравіцкую СШ, Калінінградскае ваенна-марское вучылішча. Служыў на падводных лодках на Ціхаакіянскім флоце. У канцы 1960-х гадоў падводная лодка «К-129», у складзе экіпажа якой служыў капітан 3-га рангу Я.Р.Кавалёў, патанула каля берагоў Амерыкі. Доўгі час звесткі аб гібелі лодкі і экіпажа былі засакрэчаны, і толькі ў апошнія гады гэта трагедыя стала агульнавядомай. Я.Р.Кавалёў пасмяротна ўзнагароджаны расійскім ордэнам Мужнасці.

МАРМАЛЮКОЎ Павел Піліпавіч, н. у 1907 у г.п. Уваравічы, радавы, загінуў у лістападзе 1945, пахаваны ў г. Ельня Смаленскай вобл., Расія.

САВАСЦЬЯНАЎ Мікіта Лявонавіч, н. у 1919 у в. Радзеева, капітан, прапаў без вестак у 1946.

СУДАКОЎ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1966, загінуў 26.5.1986, пахаваны ў г.п. Уваравічы.

ТКАЧЭНКА *Аляксандр Паўлавіч*, н. у г.п. Уваравічы, радавы, памёр ад ран 27.3.1946.

ЮРАСАЎ *Адам Фядотавіч*, н. у 1922 у г.п. Уваравічы, капітан, памёр ад ран 2.11.1948.

УЗОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ХРАМЦОЎ Васіль Мікалаевіч, н. у 1922 у в. Рудзянец, прапаў без вестак у 1946.

ЧАБАТОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАНДАРЭНКА *Антон Сцяпанавіч*, н. у 1909, ст. сяржант, памёр ад ран, пахаваны ў в. Казіміраўка Гомельскай вобл.

ГЕРМАНАЎ *Аляксандр Мітрафанавіч*, н. у пас. Смычок, мал. сяржант, загінуў 25.7.1950.

ДРАЛОЎ *Міхаіл Мікалаевіч*, н. у 1977, радавы, загінуў 26.10.1996, пахаваны ў в. Чабатовічы.

ЗАЙЦАЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1951, загінуў у 1971, пахаваны ў в. Чабатовічы.

ЗЫКАЎ *Васіль Іванавіч*, н. у 1955, капітан, загінуў 29.12.1983, пахаваны ў п. Рудня-Альхоўка.

МЯЧЫКАЎ *Сяргей Дзмітрыевіч*, н. у 1960, мал. сяржант, загінуў 27.11.1980, пахаваны ў в. Чабатовічы.

ШЫРОКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАЙКОВА Таццяна Фёдараўна, н. у 1919, лейтэнант медыцынскай службы, прапала без вестак у 1946.

ДРЫГАЛЁЎ *Ягор Фёдаравіч*, н. у 1902, пас. Чараты, радавы, прапаў без вестак у 1946.

ЦЕЦЕРАЎ *Фёдар Аўдзеевіч*, н. у 1921, в. Яраполле, радавы, прапаў без вестак у сакавіку 1946.

Падрыхтавалі В.Т.Бабраўнічы, Л.У.Яжова.

Загінулі ў Афганістане

АЛДАНАЎ Сяргей Аляксандравіч, нарадзіўся 30.8.1960 г. у р.п. Ялізава Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобл. Закончыў 8 класаў Буда-Кашалёўскай сярэдняй школы № 2 (1975), Мінскае сувораўскае ваеннае вучылішча (1977), Ленінградскае вышэйшае артылерыйскае каманднае вучылішча (1981). Служыў у Манголіі, потым у Прыволжскай ваеннай акрузе. У лютым 1986 накіраваны ў Афганістан. 2.9.1987 г. у час выканання баявога задання машына капітана С.А.Алданава падарвалася на міне. Пахаваны ў г. Буда-Кашалёва. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

БАНДУРЫСТЫ Віталь Анатольевіч, нарадзіўся 12.5.1964 г. у в. Джамбул Паўладарскай вобл. У 1981 закончыў Забалоцкую сярэднюю школу. Працаваў шафёрам у калгасе «Іскра». У 1982 г. прызваны ў Савецкую армію Буда-Кашалёўскім РВК, быў накіраваны ў Афганістан. У адной з аперацый радавы В.А.Бандурысты быў цяжка паранены і 19.3.1984 г. памёр ад ран. Пахаваны ў в. Забалоцце.

ІВАШУЦІН Валерый Альфрэдавіч, нарадзіўся 9.6.1965 г. у г. Лесазаводск Прыморскага краю. У 1982 г. закончыў Дуравіцкую сярэднюю школу і курсы пры вучэбна-вытворчым камбінаце ў г. Буда-Кашалёва. Працаваў у саўгасе «Дубавіцкі». У кастрычніку 1983 г. прызваны ў Савецкую армію Буда-Кашалёўскім РВК. Накіраваны ў Афганістан. Радавы В.А.Івашуцін загінуў 8.9.1984 г. Пахаваны ў в. Дуравічы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

ІГНАЦЕНКА Генадзь Міхайлавіч, нарадзіўся 7.2.1959 г. у с. Высокая Грыва Панкрушыхінскага раёна Алтайскага краю. Дзяцінства прайшло ў пас. Камунар. У 1974 г. закончыў 8 класаў Камунараўскай сярэдняй школы, у 1977 г. рачное вучылішча ў Гомелі. Працаваў токарам на Гомельскім заводзе пускавых рухавікоў. У 1977 г. прызваны ў Савецкую армію Гомельскім РВК. У 1979 г. закончыў школу прапаршчыкаў. Служыў у Ленінградскай вобласці. У 1982 г. па асабістай просьбе накіраваны ў Афганістан. Прапаршчык Г.М.Ігнаценка загінуў 24.4.1983 г. Пахаваны ў в. Асобіна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

МАЙСЕЕЎ Пётр Пятровіч, нарадзіўся 13.9.1967 г. у в. Дубавіца. У 1983 г. закончыў 8 класаў Дуравіцкай сярэдняй школы. Працаваў рабочым у брыгадзе па вырошчванні агародніны ў саўгасе «Дубавіцкі». У 1986 г. прызваны ў Савецкую армію Буда-Кашалёўскім РВК. Накіраваны ў Афганістан. Малодшы сяржант П.П.Майсееў загінуў 6.4.1988 г. Пахаваны ў в. Дуравічы. Узнагароджаны медалямі «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», «За адзнаку ў воінскай службе» і іншымі.


С.А.Алданаў.

В.А.Бандурысты.


В.А.Івашуцін.

Г.М.Ігнаценка.


П.П.Майсееў.

Ю.І.Чэпікаў.

Г.М.Шыйко.

ЧЭПІКАЎ *Юрый Іванавіч*, нарадзіўся 14.3.1967 г. у в. Новая Гусявіца. У 1985 г. закончыў Гусявіцкую васьмігадовую школу, у 1986 г. Касцюкоўскае ПТВ № 179. Працаваў трактарыстам у калгасе імя Леніна. У маі 1986 г. прызваны ў Савецкую армію Буда-Кашалёўскім РВК. Накіраваны ў Афганістан. Ю.І.Чэпікаў загінуў 9.2.1988. Пахаваны ў в. Новая Гусявіца. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Юрый быў адзначаны таксама вымпелам «Лепшы вадзіцель» (20 рэйсаў па дарогах Афганістана) і знакам «За самаадданую ратную працу».

ШЫЙКО *Георгій Мікалаевіч*, нарадзіўся 14.9.1962 г. у Мінску. У 1977 г. Георгій закончыў 8 класаў сярэдняй школы № 12 Мінска, сярэднюю адукацыю атрымаў у школе № 51. У 1981 г. закончыў з адзнакай Мінскае ПТВ № 12, атрымаў спецыяльнасць фатографа. У сакавіку 1981 г. прызваны ў Савецкую армію Маскоўскім РВК Мінска. З чэрвеня 1981 г. у Афганістане. Радавы Г.М.Шыйко загінуў 20.4.1983 г. Пахаваны па жаданні маці на яе радзіме ў г.п. Уваравічы. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа». У музеях школ і ПТВ, дзе вучыўся воін-інтэрнацыяналіст Г.М.Шыйко, яму прысвечаны экспазіцыі.

...Паводле ўспамінаў саслужыўцаў Г.М.Шыйко, яны заўсёды дзівіліся яго аптымізму, уменню быць жыццярадасным, вясёлым. Ён быў сумленным і справядлівым, гатовым дапамагчы ў цяжкую хвіліну і ніколі не прыніжаўся. Баявая абстаноўка не зрабіла яго сэрца жорсткім, ён умеў папярэджваць канфлікты ў калектыве. За час службы ў Афганістане перанёс хваробу Боткіна і брушны тыф. Яго павінны былі перавесці служыць на тэрыторыю СССР, але ён змог пераканаць сваіх камандзіраў, каб яго пакінулі ў родным палку. Георгій марыў зрабіць фотавыстаўку аб салдацкім жыцці ў Афганістане. У апошнія дні сваёй службы Г.М.Шыйко знаходзіўся на пасту № 17 паблізу населенага пункта Шукундурбаб на дарозе Джалалабад — Кабул. Як лепшага салдата Георгія вырашылі дэмабілізаваць у ліку першых. 20 красавіка 1983



Помнік землякам, якія загінулі ў Афганістане, у г. Буда-Кашалёва.

г. калону машын, што ішла ў Кабул, абстралялі душманы. «ЗІЛ-131», у якім ехаў у сваю часць Георгій, быў пашкоджаны. Вадзіцель Назар Бекмуратаў стараўся зачапіць тросам свой грузавік на буксір за іншыя машыны. Георгій з кузава вёў агонь па душманах з аўтамата вадзіцеля, бо сам ехаў без зброі, якую здаў на пасту з прычыны дэмабілізацыі. Калі грузавік удалося адцягнуць у бяспечнае месца, баявыя сябры зазірнулі ў кузаў і ўбачылі Георгія, які ляжаў, моцна сціскаючы аўтамат. Хлопец быў смяротна паранены ў грудзі і галаву.

Яны кіравалі раёнам

КІРАЎНІКІ РАЙВЫКАНКОМАЎ І РАЙКОМАЎ КП(б)Б У ДАВАЕННЫЯ ГАДЫ

СТАРШЫНІ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

ЮРАШКЕВІЧ А.Н. (з 1924 – ?).
МАРОЗ І.К. (1926 – 1928).
ЧЫКУНОЎ Е.Ф. (з 1931, займаў пасаду 1 год і 8 месяцаў).
ШУМЕЙКА (1937).
ГРЫБАЕДАЎ (1938).
КАЧАРЭЦКІ (1939).
ЭЙСМАНТ (1940).
ШЧЭБЕТАЎ С.Я. (верасень 1940 — жнівень 1941).

ПЕРШЫЯ САКРАТАРЫ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РК КП(б)Б

НАЙДУН Дз.Б. (1926 — ?).
ПАПОВІЧ С.М. (1928).
БУДНІК В.Я. (чэрвень 1929 — ліпень 1930).
ШПАК Р.К. (ліпень 1930 — студзень 1932).
МАЎШОВІЧ С.Ф. (ліпень 1935 — 1937).
ЛАПІЦКІ (1940 — жнівень 1941).

СТАРШЫНІ УВАРАВІЦКАГА РАЙВЫКАНКОМА

КСЕНДЗІКАЎ (1927).
САВОСТАВА М.Н. (люты 1928 — ?).
КАРАЛЕНКА (1932 – 1933).
ІСАЧАНКА С. С. (1934 – ?).
ІСАЧАНКА В.С. (1937).
ПРЫМАК М.Р. (1937 – ?).

ПЕРШЫЯ САКРАТАРЫ УВАРАВІЦКАГА РК КП(б)Б

КУХАРКІН (ліпень 1925 — ?).
ШПАК Р.К. (1928 — ліпень 1930).
ІСАЧАНКА С.С. (1934 – ?).

КІРАЎНІКІ РАЙВЫКАНКОМАЎ І РАЙКОМАЎ КПБ, ЯКІЯ ПРАЦАВАЛІ Ў ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ

СТАРШЫНІ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

БОНДАРАЎ Мікалай Іосіфавіч, нарадзіўся 24.12.1911 г. у в. Леніна Гомельскай вобл. Закончыў ветэрынарны тэхнікум (1931), курсы партыйных работнікаў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі з лютага 1947 г. па ліпень 1948 г. працаваў старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга (1941), медалямі.

ГАЛКІН Аляксандр Кузьміч, нарадзіўся 1.5.1930 г. у в. Галубічы Трубчэўскага раёна Бранскай вобл. Закончыў Мінскі юрыдычны інстытут (1954). Працаваў народным суддзёй Уваравіцкага раёна, 2-м сакратаром Уваравіцкага РК КПБ, з красавіка 1962 г. па студзень 1965 г. старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома, затым — намеснікам старшыні Чачэрскага райвыканкома, суддзёй Гомельскага абласнога суда, намеснікам начальніка аддзела юстыцыі Гомельскага аблвыканкома,

М.І.Бондараў.


А.К.Галкін.

У.М.Данцэвіч.



У.А.Корсак.

М.Ф.Краўчанка.



Г.П.Крот.

наме́снікам старшыні Гомельскага абласнога суда. Узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць» і інш.

ГРАХОЎСКІ Аляксандр Адамавіч, нарадзіўся 6.3.1938 г. у в. Дуброва Жлобінскага раёна Гомельскай вобл. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Працаваў механікам калгаса, старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома (снежань 1971 — верасень 1974), намеснікам старшыні Дзяржкамітэта па вытворча-тэхнічным забеспячэнні сельскай гаспадаркі, намеснікам міністра сельскай гаспадаркі БССР, старшынёй Гомельскага аблвыканкома, 1-м сакратаром Гомельскага абкома КПБ. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і Вярхоўнага Савета СССР. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), «Знак Пашаны», медалямі. Памёр у чэрвені 1991 г.

ДАНЦЭВІЧ Уладзімір Мікалаевіч, нарадзіўся 13.11.1929 г. у в. Кусанка Бабруйскага раёна Магілёўскай вобл. Закончыў Краснабярэжскі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (1957), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1964). Працаваў тэхнікам-нарміроўшчыкам, інжынерам па нарміраванні працы, брыгадзірам трактарнай брыгады калгаса, старшынёй калгаса, кіраўніком Жлобінскага аддзялення сельгастэхнікі, старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома (14.9.1974 — 15.12.1982), намеснікам начальніка ўпраўлення прамысловасці Гомельскага аблвыканкома, дырэктарам саўгаса-камбіната «Усход». Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1971), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973), «Знак Пашаны» (1966, 1978), медалямі. Памёр 30.5.1995 г.

КАЧУРА Сцяпан Іванавіч, нарадзіўся 25.2.1925 г. у в. Карпавічы Светлагорскага раёна Гомельскай вобл. Закончыў Жлобінскую чыгуначную школу памочнікаў машыністаў паравозаў, Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1951), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1960). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў на камсамольскай рабоце, старшынёй райвыканкома Буда-Кашалёўскага раёна (жнівень 1958 — красавік 1960), старшынёй калгаса, старшынёй праўлення райспажыўсаюза, намеснікам старшыні праўлення Гомельскага аблспажыўсаюза, начальнікам упраўлення нарыхтовак. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, «Знак Пашаны» (1973). Памёр у 1984 г.

КОРСАК Уладзімір Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1949 г. у в. Мнюта Глыбоцкага раёна Віцебскай вобл. Закончыў Велікалуцкі сельскагаспадарчы інстытут (1975). Працаваў нарміроўшчыкам калгаса, галоўным аграномам вучэбна-вопытнай гаспадаркі, намеснікам старшыні калгаса, старшынёй калгаса. З сакавіка 1999 г. старшыня Буда-Кашалёўскага райвыканкома. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1986).

КРАЎЧАНКА Мікалай Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1957 г. у в. Мацюты Горацкага раёна Магілёўскай вобл. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1979). Працаваў галоўным інжынерам калгаса «Зара», дырэктарам саўгаса «Шарыбаўскі», старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома (1994 — сакавік 1999).

КРОТ Генадзь Паўлавіч, нарадзіўся 20.6.1945 г. у г. Хойнікі Гомельскай вобл.

Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут (1971). Працаваў галоўным заатэхнікам саўгаса, намеснікам старшыні, старшынёй калгаса, інструктарам абкома КПБ, 2-м сакратаром Буда-Кашалёўскага РК КПБ, старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома (чэрвень 1986 — сакавік 1990), потым — начальнік аддзела кадраў аблсельгасхарча, генеральны дырэктар Гомельскага ААТ «Малочныя прадукты».

ЛАЎРЫНОВІЧ Э.В. (снежань 1943 — кастрычнік 1946). Глядзі «Памяць. Буда-Кашалёўскі раён», кніга 1-я, с. 336 — 337.

НАБОКІН Данііл Міхайлавіч, нарадзіўся 27.1.1921 г. у г. Ветка Гомельскай вобл. Закончыў 1-ю Кіеўскую авіяцыйную школу ваенных пілотаў (1941), Чарнігаўскае авіяцыйнае вучылішча знішчальнай авіяцыі (1944), афіцэрскую вайсковую школу штурмавой і знішчальнай авіяцыі (1946), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1960). Быў на афіцэрскіх пасадах у Савецкай арміі, загадчыкам культурна-асветнага аддзела Веткаўскага райвыканкома, 2-м і 1-м сакратаром Веткаўскага РК ЛКСМБ, загадчыкам аддзела Гомельскага абкома ЛКСМБ, намеснікам начальніка аблсельгасупраўлення, сакратаром Гомельскага абкома ЛКСМБ, сакратаром Добрушскага РК КПБ, старшынёй калгаса, інструктарам абкома КПБ, 2-м сакратаром Кармянскага РК КПБ, старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома (май 1960 — красавік 1962), начальнікам вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення, рэферэнтам абласной грамадскай арганізацыі «Веды», намеснікам камандзіра авіяатрада грамадзянскай авіяцыі па палітчастцы, намеснікам дырэктара млынкамбіната, эканамістам аблрэмбудтрэста, галоўным інжынерам, намеснікам загадчыка аддзела паліва аблвыканкома. Узнагароджаны медалямі «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг», «За працоўную адзнаку» (1949) і інш. Памёр 19.7.1976 г.

ПРАХАРЭНКА Піліп Пятровіч (1953 — 1954).

ПЯТРЭНКА Дзмітрый Кірылавіч, нарадзіўся 22.9.1915 г. у в. Панарніца Корапскага раёна Чарнігаўскай вобл. Закончыў Харкаўскі педагагічны інстытут (1948), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК ВКП(б) (1952). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З красавіка 1952 г. па люты 1954 г. працаваў 1-м сакратаром Буда-Кашалёўскага РК КПБ, з лютага 1954 г. па сакавік 1956 г. старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (1945), медалямі.

Д.М.Набокін.

Дз.К.Пятрэнка.

А.А.Равянок.

РАВЯНОК Аляксандр Аляксандравіч, нарадзіўся 27.9.1930 г. у в. Новая Лутава Лоеўскага раёна Гомельскай вобл. Закончыў Гомельскае медыцынскае вучылішча (1952), Беларускі дзяржаўны універсітэт, Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1970). Працаваў фельчарам сельскай бальніцы, быў на камсамольскай і партыйнай рабоце, старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома (люты 1970 — снежань 1971), з снежня 1971 г. па чэрвень 1979 г. 1-м сакратаром Буда-Кашалёўскага райкома КПБ, потым начальнікам упраўлення прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі Гомельскай вобл., загадчыкам аддзела па арганізацыйна-метадычнай і кадравай рабоце Гомельскага аблвыканкома. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973), «Знак Пашаны» (1971, 1978), медалямі.



М.М.Стош.

К.А.Чайкун.

І.І.Якаўцаў.

СТОШ Мікалай Мікалаевіч, нарадзіўся 27.12.1953 г. у г.п. Уваравічы. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1976), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1990). Працаваў цесляром, галоўным эканамістам саўгаса, інструктарам, загадчыкам аддзела, 2-м сакратаром Буда-Кашалёўскага райкома КПБ, старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома (сакавік 1990 — 1994), пазней — намеснік кіраўніка дарожна-будаўнічага трэста № 2, начальнік аддзела знешнеэканамічных і міжрэгіянальных сувязей, намеснік старшыні аблсельдзяржхарча, дырэктар прадстаўніцтва Белдзяржстраха па Гомельскай вобласці.

ЧАЙКУН Канстанцін Арсенцьевіч, нарадзіўся 27.9.1910 г. у в. Быкава Слуцкага раёна Мінскай вобл. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1949). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў рабочым, калгаснікам, электраманцёрам, дырэктарам вячэрняй школы працоўнай моладзі, быў на камсамольскай і партыйнай рабоце, прапагандыстам, загадчыкам аддзела прапаганды РК КПБ, начальнікам палітаддзела МТС, 2-м і 1-м сакратаром РК КПБ, сакратаром Гомельскага абкома КПБ, з ліпеня 1948 г. па жнівень 1952 г. старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома, потым намеснікам старшыні аблспажыўсаюза, старшынёй калгаса «Беларусь» Добрушскага раёна, дырэктарам фабрыкі «Палесдрук». Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны» (1949), Айчыннай вайны II ступені (1985), медалямі «За баявыя заслугі», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» (1946) і інш. Памёр 1.6.1988 г.

ЧЭРКАС Міхаіл Мікалаевіч, нарадзіўся 3.6.1949 г. у в. Дзякавічы Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобл. Закончыў Краснабярэжскі сельгастэхнікум (1968), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1975), Мінскую вышэйшую партыйную школу (1986). Працаваў брыгадзірам, аграномам, галоўным аграномам раёна, старшынёй калгаса, інструктарам сельгасаддзела Гомельскага абкома КПБ, старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома (май 1982 — чэрвень 1986), пазней — намеснік старшыні аграпрамысловага комплексу, намеснік старшыні савета калгасаў, загадчык Гомельскай гаррайінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

ЯКАЎЦАЎ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1927 г. у г. Ветка Гомельскай вобл. Закончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1955), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1977). Працаваў цесляром, загадчыкам аддзела Веткаўскага РК ЛКСМБ, памочнікам начальніка палітаддзела па камсамоле Свержанскай МТС, 1-м сакратаром Стаўбцоўскага РК ЛКСМБ Мінскай вобл., інструктарам Стаўбцоўскага РК КПБ, інструктарам аддзела сельскай моладзі ЦК ЛКСМБ, адказным арганізатарам ЦК ЛКСМБ, намеснікам старшыні Буда-Кашалёўскага райвыканкома (жнівень 1959 — люты 1963), старшынёй камітэта партыйна-дзяржаўнага кантролю Буда-Кашалёўскага раёна, старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома (студзень 1965 — студзень 1970), 1-м сакратаром Калінкавіцкіх РК і ГК КПБ, старшынёй аблпрафсаюза працоўных аграпрамысловага комплексу, упаўнаважаным аблсаўпрофа ў Хойніцкім раёне, старшынёй Гомельскай гарадской арганізацыі Беларус-

кага таварыства абароны правоў спажыўцоў. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1975—1979). Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971, 1973).

СТАРШЫНІ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ

ГАЛІЦКІ Аляксандр Максімавіч, нарадзіўся ў 1952 г. у в. Недайка. Закончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны (1974), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1993). Працаваў настаўнікам, сакратаром РК ЛКСМБ, лектарам, загадчыкам ідэалагічнага аддзела Буда-Кашалёўскага РК КПБ, загадчыкам аддзела арганізацыйнай і кадравай работы. З 1995 г. старшыня раённага Савета дэпутатаў.

ПЕРШЫЯ САКРАТАРЫ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РК КПБ

ГРЫНКЕВІЧ Генадзь Вітальевіч, нарадзіўся 26.7.1940 г. у в. Гаішча Мінскага раёна Мінскай вобл. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1966), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1978). Працаваў токарам, наладчыкам, слесарам, інструктарам Мінскага РК КПБ, інспектарам камітэта народнага кантролю БССР, першым сакратаром Буда-Кашалёўскага райкома партыі (ліпень 1979 — кастрычнік 1985). У лістападзе 1985 г. назначаны загадчыкам прыёмнай па скаргах і пісьмах працоўных Савета Міністраў БССР. Памёр 12.1.1999 г.

ЗАЙЦАЎ Л.В. (лістапад 1943 — красавік 1946).

КАСЦЯНОК Феафан Фёдаравіч, нарадзіўся 23.1.1922 г. у в. Грудская Рэчыцкага раёна Гомельскай вобл. Закончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1955). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў загадчыкам пачатковай школы, сакратаром партарганізацыі Хойніцкай МТС, інструктарам, загадчыкам арганізацыйна-інструктарскага аддзела Рэчыцкага РК КПБ, сакратаром Даманавіцкага РК КПБ, інструктарам аддзела парторганаў Гомельскага абкома КПБ, першым сакратаром Буда-Кашалёўскага РК КПБ (12.9.1960—25.12.1971), загадчыкам арганізацыйна-інструктарскага аддзела Гомельскага аблвыканкома, загадчыкам аддзела па працы Гомельскага аблвыканкома. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі,



А.М.Галіцкі.

Ф.Ф.Касцянок.



Ф.М.Нікіфараў.

медалямі «За баявыя заслугі» і інш. Памёр 31.3.1982 г.

НІКІФАРАЎ Фёдар Мікалаевіч, нарадзіўся 22.12.1915 г. у в. Вуглы Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. Закончыў Рагачоўскі педагагічны тэхнікум (1933), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК ВКП(б) (1946). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Быў камісарам партызанскага атрада імя Чапаева 1-й Буда-Кашалёўскай партызанскай брыгады. Пасля дэмабілізацыі працаваў загадчыкам аддзела школ Гомельскага абкома КП(б)Б, з ліпеня 1947 г. па студзень 1950 г. 1-м сакратаром Буда-Кашалёўскага РК КП(б)Б, загадчыкам аддзела партыйных, прафесійных і камсамольскіх органаў Гомельскага абкома КПБ, дырэктарам гандлёва-кааператыўнага тэхнікума, намеснікам загадчыка праўлення аблспажыўсаюза. У 1958—1986 гг. старшыня Гомельскага абласнога камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні. Пасля выхаду на пенсію ў 1986 г. працаваў у камітэце да 1996 г. Заслужаны дзеяч культуры БССР (1968). Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга

П.П.Прахарэнка.

В.А.Цымлякоў.

Л.С.Шыханцоў.

(1944), Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Памёр 2.4.1996 г.

ПРАХАРЭНКА Піліп Пятровіч, нарадзіўся 25.12.1909 г. у г. Добруш. Закончыў курсы камісараў пры Ваенна-палітычнай акадэміі (1941). З 1928 г. працаваў слесарам Добрушскай фабрыкі «Герой працы». Пасля заканчэння курсаў паліткадраў (1939) служыў афіцэрам у Чырвонай арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 12.1.1949 г. па 23.8.1950 г. працаваў 1-м сакратаром Уваравіцкага РК КП(б)Б, у 1953 — лютым 1954 гг. — старшынёй Буда-Кашалёўскага райвыканкома, з лютага 1954 г. па студзень 1957 г. 1-м сакратаром Буда-Кашалёўскага РК КПБ, пазней — загадчыкам аддзела сацыяльнай бяспекі Гомельскага аблвыканкома. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга (1943), Айчыннай вайны II ступені (1945), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1949), медалямі. Памёр 4.8.1981 г.

РАВЯНОК Аляксандр Аляксандравіч (снежань 1971 — чэрвень 1979).

СЕРАКОЎ А.А. (красавік 1946 — ліпень 1947).

ЦЫМЛЯКОЎ Васіль Арсенцьевіч, нарадзіўся 16.2.1908 г. у в. Братухіна Валагодскай вобл. Закончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1956). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў загадчыкам аргінструктарскага аддзела РК КПБ, намеснікам загадчыка аддзела працы з партыйнымі, прафесійнымі і камсамольскімі арганізацыямі Гомельскага абкома КПБ, 2-м сакратаром Рагачоўскага РК КПБ, 1-м сакратаром Буда-Кашалёўскага РК КПБ (снежань 1956 — верасень 1960), дырэктарам саўгаса, намеснікам дырэктара млынкамбіната, старшым інспектарам па кадрах млынкамбіната. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі (двойчы), «Знак Пашаны», Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За вызваленне Кіева», «За вызваленне Варшавы», «За працоўную доблесць» і інш. Памёр у 1996 г.

ШКУРКО Валянцін Пятровіч, нарадзіўся ў 1940 г. у Мінску. Закончыў Украінскі інстытут інжынераў воднай гаспадаркі (1970), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1984). Працаваў тэхнікам-геадэзістам, старшым тэхнікам, інжынерам пошукавай экспедыцыі, начальнікам пошукавай партыі, галоўным інжынерам экспедыцыі, начальнікам экспедыцыі Гомельскага праектна-пошукавага аддзела «Белгіправадгаса», інструктарам, намеснікам загадчыка сельгасаддзела Гомельскага абкома КПБ, 1-м сакратаром Чачэрскага РК КПБ, сакратаром Гомельскага аблсаўпрофа, 1-м сакратаром Буда-Кашалёўскага РК КПБ (кастрычнік 1985 — сакавік 1991).

ШЫХАНЦОЎ ***Лаўрэнцій Сцяпанавіч***, нарадзіўся 6.8.1914 г. у в. Ніжняя Алба Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1934), Ваенна-палітычнае вучылішча (1941), Гомельскі педагагічны інстытут (1949). Працаваў загадчыкам пачатковай школы, дырэктарам сямігадовай школы, інструктарам аддзела прапаганды і агітацыі Гомельскага абкома КПБ, 2-м, 1-м сакратаром Буда-Кашалёўскага РК КП(б)Б (студзень 1950 — красавік 1952), намеснікам загадчыка аддзела партыйных органаў Гомельскага абкома КПБ, намеснікам загадчыка аддзела народнай асветы Гомельска-

га аблвыканкома, дырэктарам сярэдняй школы. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1949), медалямі.

СТАРШЫНІ УВАРАВІЦКАГА РАЙВЫКАНКОМА

БАЙКОЎ А.П. (снежань 1943 — май 1945).

ЗАЙЦАЎ Кірыла Рыгоравіч, нарадзіўся 10.3.1917 г. у в. Высокае Омскай вобл. Закончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1951). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Двойчы быў цяжка паранены. Працаваў слесарам, брыгадзірам, інструктарам Гомельскага абкома КПБ, сакратаром райкома КПБ Цэнтральнага раёна г. Гомеля, старшынёй Уваравіцкага райвыканкома (лістапад 1953 — 29.3.1957), старшынёй калгаса, майстрам, інжынерам па тэхнічнай інфармацыі, начальнікам аддзела кадраў фанерна-запалкавай фабрыкі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (1943), медалямі «За ўзяцце Берліна» і інш. Памёр 1.1.1979 г.

КАРЧЭЎСКІ Канстанцін Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1918 г. у в. Ясень Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобл. Закончыў аўтамабільны тэхнікум (1938), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1956). Удзельнік Вялікай Ачыннай вайны. Працаваў загадчыкам аўтагаража, шафёрам, інспектарам вытворчасці грамадскага харчавання, інструктарам, памочнікам сакратара, 2-м сакратаром Уваравіцкага РК КПБ, старшынёй Уваравіцкага райвыканкома (11.3.1957 — 6.6.1960), 1-м сакратаром Ельскага РК КПБ, парторгам калгасна-саўгаснага ўпраўлення, намеснікам загадчыка палітаддзела сельскага абкома КПБ, намеснікам загадчыка партработы Гомельскага абкома КПБ, начальнікам абласнога ўпраўлення прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу» (двойчы) і інш. Памёр 30.4.1996 г.

КУНІЦКІ Яраслаў Адольфавіч (чэрвень 1960 — 1962).

СЕЛІХАНОВІЧ Пётр Фёдаравіч, нарадзіўся 22.7.1909 г. у в. Вязьмічы Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Смалянаўскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1930). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў аграномам-заатэхнікам у Веткаўскім і Мінскім райкалгассаюзах,



К.Р.Зайцаў.



К.А.Карчэўскі.

П.Ф.Селіхановіч.

дырэктарам саўгаса «Уваравічы» (1937 — 1941, 1943 — 1947). Са жніўня 1947 г. па сакавік 1953 г. старшыня Уваравіцкага райвыканкома. Быў дырэктарам саўгаса «Брылёва» Гомельскага раёна, дырэктарам пладова-агародніннага камбіната аблспажыўсаюза. Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны» (двойчы), медалямі «За баявыя заслугі», «За доблесную працу ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941 — 1945 гг.» і інш. Памёр 10.8.1995 г.

СЫСОЕЎ С.А. (май 1946 — май 1947).

ШАРКОЎ Р.І. (май 1945 — май 1946).

ПЕРШЫЯ САКРАТАРЫ УВАРАВІЦКАГА РК КПБ

АДАМОВІЧ Павел Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1926 г. Закончыў завочны Усесаюзны фінансавы інстытут і Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў кантралёрам-рэвізорам Гомельскага абласнога фінаддзела, 2-м сакратаром Жлобінскага РК ЛКСМБ, 1-м сакратаром Лоеўскага ЛКСМБ, з 1954 г. загадчыкам аддзе-


М.І.Анішчанка.

П.С.Васіленка.


М.П.Зайцаў.

ла Лоеўскага РК КПБ, 2-м і 1-м сакратаром Гомельскага абкома ЛКСМБ. У 1958—1962 гг. 1-ы сакратар Уваравіцкага РК КПБ. З 1962 г. парторг Гомельскага абкома КПБ па Жыткавіцкім вытворча-калгасна-саўгасным упраўленні, з 1963 г. інспектар, з 1966 г. загадчык аддзела харчовай прамысловасці, з 1976 г. загадчык аддзела адміністрацыйных органаў ЦК КПБ. Член ЦК КПБ. Старшыня камітэта па ахове здароўя і сацыяльным забеспячэнні. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 7—10-га скліканняў.

АНІШЧАНКА Мікалай Іванавіч, нарадзіўся 3.7.1899 г. у г. Гомель. Скончыў Усесаюзны камуністычны сельскагаспадарчы універсітэт імя Я.М.Свярдлова (1936). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху на Беларусі (сакратар Лоеўскага падпольнага райкома КП(б)Б, камісар партызанскага атрада «За Радзіму»). Працаваў слесарам, шафёрам, загадчыкам аргаддзела Гомельскага, Рэчыцкага райкомаў КП(б)Б, дырэктарам МТС, дырэктарам аўтатрэста г. Краснаярска, 1-м сакратаром Лоеўскага РК КП(б)Б, 1-м сакратаром Свяцілавіцкага, Уваравіцкага (май 1945 — ліпень 1946) райкомаў КП(б)Б, сакратаром Гомельскага аблвыканкома. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I і II ступеней і інш. Памёр 25.1.1971 г.

ВАСІЛЕНКА Піліп Сяргеевіч, нарадзіўся 27.11.1909 г. у в. Радзеева. Закончыў Рэспубліканскую партыйную школу (1951). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Двойчы быў паранены. Працаваў пастухом, рамонтнікам дыстанцыі пуці, сакратаром Лапіцкага сельсавета, старшым інспектарам Уваравіцкага Сельгасбанка, 1-м сакратаром Уваравіцкага РК ЛКСМБ, загадчыкам аддзела Уваравіцкага РК КПБ, брыгадзірам, старшынёй калгаса, намеснікам начальніка аблземаддзела Гомельскай вобласці, 2-м сакратаром Добрушскага, Жлобінскага райкомаў КПБ, 1-м сакратаром Уваравіцкага РК КПБ (жнівень 1954 — снежань 1958), старшынёй Уваравіцкага райспажыўсаюза, загадчыкам аддзела сацыяльнага забеспячэння, дыспетчарам аўтабазы, старшынёй Уваравіцкага пасялковага Савета. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1958), медалямі. Памёр 19.4.1986 г.

ЗАЙЦАЎ Міхаіл Паўлавіч, нарадзіўся 3.6.1904 г. у в. Галенск Старадубскага раёна Бранскай вобл. Закончыў Магілёўскі землеўпарадкавальны тэхнікум (1931). Працаваў тапографам Беларускага дзяржаўнага геадэзічнага ўпраўлення, дырэктарам картаграфічнай фабрыкі, старшым землеўпарадчыкам, загадчыкам райза (г. Горкі Магілёўскай вобл.). З чэрвеня 1938 г. 1-ы сакратар Горацкага РК КП(б)Б. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі працаваў 1-м сакратаром Уваравіцкага РК КПБ (жнівень 1946 — ліпень 1948), намеснікам старшыні Стрэшынскага райвыканкома. У 1950—1960 гг. працаваў на розных адказных пасадах ва Уваравіцкім раёне. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, медалём «За адвагу» і інш. У 1947 г. выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Памёр 2.3.1985 г.

ЕРМАКОЎ І.В. (жнівень 1950 — снежань 1953).

КОРНЕЎ Адам Емяльянавіч, нарадзіўся 23.12.1911 г. у в. Старыя Церушкі Салігорскага раёна Мінскай вобл. Закончыў Слуцкі педагагічны тэхнікум (1931), Магілёўскі педагагічны інстытут (1940). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў загадчыкам пачатковай школы, завучам сярэдняй школы, інспектарам района, намеснікам старшыні райвыканкома, сакратаром, 2-м сакратаром Рагачоўскага РК КП(б)Б, загадчыкам аддзела Гомельскага абкома КПБ, 1-м сакратаром Уваравіцкага РК КПБ (20.12.1953 — 21.7.1954), загадчыкам аддзела Гомельскага абкома КПБ. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі. Памёр 4.10.1982 г.

КУЗЬМЯНОК М.І. (красавік 1944 — сакавік 1945).

ПРАХАРЭНКА Піліп Пятровіч (студзень 1949 — жнівень 1950).

САДАВЫ Яўген Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1913 г. у в. Паташня Бершадзскага раёна Вінніцкай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, палітрук танкавай роты, камісар танкавага батальёна. У жніўні 1943 г. — верасні 1943 г. камісар партызанскага атрада «Смерць фашызму», верасні — лістападзе 1943 г. камісар партызанскай брыгады імя П.К.Панамарэнкі. З лістапада 1943 г. па лістапад 1946 г. 1-ы сакратар Стрэшынскага РК КП(б)Б, а з лістапада 1946 г. па жнівень 1948 г. слухач Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК КП(б)Б, з лістапада 1948 г. па красавік 1950 1-ы сакратар Уваравіцкага РК КП(б)Б, потым інспектар школ района, старшыня Бершадзскага райвыканкома, дырэктар маслазавода, начальнік аўтабазы, старшы інжынер па спецрабоце, памочнік дырэктара па кадрах Светлагорскага завода штучнага валакна. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», «За абарону Каўказа» і інш. Памёр 1.11.1999 г.

А.Е.Корнеў.



Я.Р.Садавы.

ШКРОБЫШАЎ Пётр Фёдаравіч, нарадзіўся 25.6.1906 г. у в. Радзівонаўка Горацкага раёна Магілёўскай вобл. Закончыў Горкаўскую бранятанкавую школу (1933). Працаваў начальнікам паштовага аддзялення, на камандных пасадах у Чырвонай арміі, інструктарам, загадчыкам ваеннага аддзела РК КП(б)Б. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У красавіку — лістападзе 1943 г. камандзір партызанскага атрада «За Савецкую Беларусь» партызанскай брыгады імя Шчорса. У снежні 1943 г. — лістападзе 1944 г. 1-ы сакратар Уваравіцкага РК КП(б)Б, потым працаваў дырэктарам Кісялёўскай МТС, старшынёй калгаса, прыёмшчыкам заказаў, рабочым прамкамбіната, майстрам цагельнага завода. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1972 г.

Падрыхтавалі У.Я.Райскі, Г.М.Чаянкова.

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Асаблівасці архітэктуры Буда-Кашалёўшчыны

Архітэктура Буда-Кашалёўскага раёна мае не толькі характэрныя для традыцыйнага беларускага дойлідства рысы, але і пэўныя своеасаблівасці, прыўнесеныя ў забудову мястэчак, вёсак, слабод, ваколіц перасяленцамі з іншых рэгіёнаў — палякамі, немцамі, яўрэямі з Польшчы і Прыбалтыкі, старaверамі з Расіі і інш. Гэта тычыцца колішніх мястэчак, такіх як Недайка, Патапаўка, Кашалёва, Уваравічы і інш.

Уваравічы размешчаны на ўзгоркавай мясцовасці з мноствам яроў, што сходзяць да ракі Уза. Гэта надае пасёлку адметны выгляд. Планіровачным ядром з'яўлялася кірмашовая плошча, уздоўж якой стаялі крамы. Побач з плошчай — драўляная, на цагляным падмурку праваслаўная царква Раства Багародзіцы. Яна ўяўляла сабой тыповую вясковую царкву: аднакупальная са званіцай, аднапрастольная. Была пабудавана за кошт мясцовых памешчыкаў Ліпінскага і Прудоўскай. На Буда-Кашалёўшчыне ў 1909 г. было 10 такіх цэркваў.

Сярод помнікаў дойлідства можна згадаць цэрквы і касцёлы, пабудаваныя ў XVIII—XIX ст. Царква ў в. Кашалёў — адна з іх.

У Лапічах і Ціхінічах у канцы XIX ст. былі адкрыты касцёлы. У Люшаве касцёл Нараджэння Маці Боскай існаваў яшчэ з пачатку XVII ст.

Ва Уваравічах існавалі сінагога і малітвенная школа, у Рагіні — сінагога.

Будынак былой царквы ў в. Недайка, XIX ст.

Цэнтрам мястэчак з'яўляліся кірмашовыя плошчы, ад якіх адыходзілі вуліцы, што акрэслівалі межы прылягаючых адзін да аднаго кварталаў. Яўрэі жылі абшчынамі, ім не дазвалялася жыць сярод хрысціян без размяжоўваючага абазначэння — іх дамы павінны былі размяшчацца побач або прымыкаць адзін да аднаго, знаходзіцца ў асобай акрузе. Яўрэйскія кварталы аддзяляліся ад хрысціянскіх агароджай, сцяной, ровам. Такія абшчынныя яўрэйскія паселішчы вылучаліся з агульнага архітэктурнага плана сяла або мястэчка. Сустракаліся змешаныя тыпы пасяленняў. Яўрэі таксама сяліліся і асобнымі сем'ямі. У асноўным гэта былі рамеснікі, майстравыя ці дробныя гандляры.

Раскольнікі-стараверы з Расіі сяліліся на няўдобіцах. Так у в. Івольск стварылася вялікая абшчына старавераў. Іх жылыя дамы і забудовы старарускага тыпу выдзяляліся знешнім выглядам. Старавер Павел Акінчыц меў свой фальварак Івольск, што за 8 вёрст ад в. Чабатовічы. Свой хутар Хачэмля мела А.Пітунова, хутарам Дразды валодаў Таманскі, купец Дрыбінцаў меў сваю сядзібу Дуравічы, фальварак Мікольск, хутар Вярхулішча. Яму ж належалі лясныя масівы са старожкай Ракоўскай. Сядзібу ў в. Недайка 1-я мела ўдава старавера Якаўлева. Старавер Шкляр быў уладальнікам фальваркаў Аляксандраўка і Царкоўе, вёскі Анастасьеўка.

Жылыя будынкі стараверы ўпрыгожвалі разьбой. Ліштвы, карнізы, вароты аздаблялі драўлянымі карункамі. На Буда-Кашалёўшчыне, як і ў большасці беларускіх рэгіёнаў, пры будаўніцтве бытаваў «цяслярскі» падыход. Дэкаратыўны пачатак прыўнеслі ў аздобу дамоў першыя жыхары стараверскіх слабод. Элементы дамавой разьбы ўпрыгожвалі жылыя дамы, храмы, іншыя будынкі.

Уплыў заходняй архітэктуры асабліва відавочны ў планіроўцы і ўзвядзенні сядзібна-паркавых ансамбляў, маёнткаў, бытавых, службовых і вытворчых памяшканняў прадпрыемстваў, якія належалі мясцовым памешчыкам і заможным купцам. Аб гэтым сведчаць апісанні іх маёнткаў і сядзіб, якія не захаваліся.

Знатныя шляхціцы ў сядзібе мелі два дамы: адзін — стары, а другі — новы, на каменным падмурку, двухпавярховы, архітэктурна аформлены, абнесены вакол каменнай агароджай. Пры новым — кветкавая аранжарэя, рэгулярны сад з праспектамі, абсаджанымі ліпамі. Для захавання межаў меўся фарпост з домам простай архітэктуры для аканома.

Сялянскія хаты былі курнымі. Нізкія і цёмныя, яны былі без сяней, зрубленыя большай часткай з дробнага асінавага ці яловага лесу. Побач з імі ўзводзіліся розныя гаспадарчыя пабудовы, пакрытыя, як і хаты, саломай. Каля сваіх двароў сяляне мелі маленькія агароды.

Насельніцтва мястэчак складалася з гандляроў і вялікай колькасці майстроў-рамеснікаў: гарбароў, краўцоў, шаўцоў, сярэбранікаў, меднікаў, кавалёў, сталяроў. У XIX ст. у мястэчках сталі ўзнікаць розныя віды прыгонных мануфактур: заводы, фабрыкі, лесапільні, млыны і інш. Будынкі



Дом у Буда-Кашалёве, у аздобе якога выкарыстаны элементы дамавой разьбы.

прадпрыемстваў мянялі аблічча і планіроўку пасяленняў.

Мястэчкі заставаліся і гандлёвымі цэнтрамі акругі. Кірмашы з удзелам прыезджых купцоў, як правіла, праводзіліся ў мястэчках і ў некаторых вялікіх сёлах. Былі кірмашы ці таргі і невялікія, вузкамясцовага значэння, без удзелу прыезджых купцоў. Прымеркаваныя да якога-небудзь свята, яны працягваліся адзін дзень. Сюды сяляне з бліжэйшых пасяленняў з'язджаліся на «багамолле». Пад кірмашы ці таргі адводзіліся плошчы паблізу царквы ці касцёла. Тут размяшчаліся гандлёвыя лаўкі, піцейныя ўстановы і саляныя магазіны, склады.

Для прыезджых купцоў былі спецыяльныя лаўкі, дзе раскладваліся прывезеныя тавары. У сяле Царкоўе штогадовы кірмаш працягваўся тры дні, прыязджалі з бліжэйшых маёнткаў купцы і мяшчане з рознымі таварамі. У гэтым жа сяле жылі і свае купцы і два мешчаніны, якія мелі свае лаўкі.

Тыповым для мястэчак Магілёўскай губерні быў і гандаль «па сваіх дамах», пры якіх абсталёўваліся невялікія лаўкі. У такім доме звычайна побач з надворнымі ўваходнымі дзвярамі знаходзіўся прылавак, за якім сядзеў гаспадар і гандляваў рознымі дробязнымі таварамі. Звычайна так гандлявалі яўрэі, якія пры сваіх дамах займаліся дробным «піцейным» гандлем.

Мясцовую архітэктуру Буда-Кашалёўшчыны дапаўнялі паштовыя станцыі і дарогі-бальшакі, пабудаваныя ў 1773—1777 гг. па загадзе генерал-губернатара З.Р.Чарнышова. Шырыня бальшака дасягала 15 м. Канавы па абодва бакі дасягалі 3 м шырыні і 1,5 м глыбіні. Уздоўж гэтых дарог за канавамі былі густа пасаджаны бярозкі (да 2 тысяч на кіламетр).

Бальшакі і паштовыя станцыі мелі не толькі эканамічнае, але і культурнае значэнне. Побач з пабудаванымі станцыямі і заезнымі дварамі добраўпарадкоўваліся і мясцовыя пасяленні, а асушаныя выкапанымі каля дарог канавамі балоты ператвараліся ў паркі і фруктовыя сады, дагледжаныя палі, што значна ўпрыгожвала навакольле. Буда-Кашалёва тады было невялікім лясным пасёлкам у Кашалёўскай воласці. На ўездзе ў пасёлак стаяў паласаты слуп з выявай герба Расійскай імперыі і ўказаннем колькасці двароў — 15 і душ насельніцтва — 95. У 1873 г. праз пасёлак прайшла ветка Лібава-Роменскай чыгункі, на карце ўпершыню была адзначана станцыя Буда-Кашалёўская. Гэта спрыяла росту пасёлка, тут быў пабудаваны завод па вырабе драўляных дэталей для ткацкіх станкоў, царкоўна-прыходская школа, у 1912 г. з Полацка ў Буда-Кашалёва пераведзена ніжэйшая лясная школа, пабудавана земская бальніца.

Новы імпульс развіццю Буда-Кашалёва надало атрыманне ім статуса раённага цэнтра ў 1924 г. У 1930-я гады тут пабудаваны тыповы для свайго часу драўляны будынак школы-сямігодкі, амбулаторыі, двухпавярховы цагляны будынак райвыканкома, пажарнае дэпо.

Генплан перспектыўнай забудовы г. Буда-Кашалёва распрацаваны ў 1983 г. і скарэкціраваны ў 1991 г. Праект дэталёвай планіроўкі, створаны Беларускім навукова-даследчым праектным інстытутам горадабудаўніцтва з улікам ахоўных зон помнікаў архітэктуры, захоўвае рэгулярную планіроўку кварталаў цэнтральнай часткі горада. Архітэктурна-планіровачная структура горада ўяўляе сабой сістэму рознавялікіх кварталаў жылой, грамадскай і прамысловай забудовы ў асноўным з прамавугольнай сеткай вуліц — дробных кварталаў у зоне сядзібнай забудовы і больш вялікіх кварталаў у зоне жылой забудовы без прысядзібных участкаў.

Галоўныя вуліцы ў паўночна-ўсходняй частцы горада — Леніна, Савецкая, 50 год Кастрычніка, Горкага, Прышчэпы, у паўднёва-заходняй частцы — імя В.П.Дразда, а ў залінейнай — Вакзальная. Па іх праходзяць транзітныя транспартныя магістралі, якія звязваюць жылыя кварталы з прамысловай зонай.

Жылая частка горада ў асноўным аднапавярховая, цэнтральная — 2—5-павярховай забудовы. У 1980—1990-я гады ўзведзены мікрараёны Усходні і па вуліцы Саўгаснай, якія забудаваны 2—5-павярховымі дамамі. Тут размешчаны 2 дзіцячыя сады, сярэдняя школа, універмаг, раённы вузел сувязі, кінатэатр, унутрыгарадская кацельня.

Цэнтр горада фарміруюць галоўная плошча і вуліца Леніна. Тут размешчаны два адміністрацыйныя будынкі, банк, Дом культуры, камбінат бытавога абслугоўвання, гандлёвыя прадпрыемствы, Дом дзіця-

чай творчасці, аўтастанцыя, 2 бібліятэкі, вузел паштовай і электроннай сувязі.

Прамыслова-камунальная зона размешчана на перыферыі ў напрамках асноўных транспартных магістралей, вызваляючы такім чынам цэнтральную частку горада, яго жылыя кварталы ад забруджвання і шуму. Умоўна можна выдзеліць тры прамысловыя зоны: усходнюю, зону ўздоўж чыгункі і паўночную. Ва ўсходняй зоне размешчаны: птушкафабрыка (прылягае да горада), тэхсервіс, склады міжрайбазы, аўтабаза райспажыўсаюза, ДРБУ-184, база КБА, гаргаз, гарадская кацельня і інш. У прычыгуначную прамысловую групу ўваходзіць МПМК-92, кансервавы завод, хлебазавод, хлебапрыёмны пункт, нафтабаза, агразабеспячэнне, хімбаза, гарпаліва і інш. У паўночную прамысловую зону ўваходзяць: райсельгасэнергаўчастак Чачэрскага ДЭУ-45, медсклады, ветсклады, аб'яднанне «АМПАК», райсельгасхімія, вучэбны камбінат.

Уся прамысловасць у асноўным зарыентавана на абслугоўванне патрэб жыхароў горада і раёна.

Будуецца раённы бальнічны комплекс, станцыя водаачысткі, праводзіцца газіфікацыя жылога сектара.

Зялёная зона горада не мае адзінай сістэмы. Функцыю гарадскога парка выконваюць невялікія скверы ў межах вуліц Горкага і Савецкай, каля універмага, па вуліцы Камсамольскай.

Лесапаркавая зона вакол горада з усходняга, паўднёвага і заходняга бакоў — лясны запаведнік, што значна паляпшае экалогію горада.

У.Я.Райскі, Т.В.Чарнышова.

ПОМНІК СЯДЗІБНАЙ АРХІТЭКТУРЫ — МАЁНТАК ВІКТАРЫН

Гісторыя Віктарына вядома толькі з 2-й паловы XVIII ст., калі маёнтак стаў галоўнай сядзібай Дарыя-Дзерналовічаў герба Любіч. Раней іх сядзіба знаходзілася ў Шарсціне, але ў 1739 г. згарэла.

Як мяркуецца, першым памешчыкам Віктарына (маёнтак меў тады іншую назву) быў Францішак Казімір Дарыя-Дзерналовіч, рэчыцкі гарадскі суддзя (памёр у 1742 г.). Найбольш верагодна, што толькі яго сын Лявон Юзаф (памёр у 1793 г.), падкаморы рэчыцкі, ад імя сваёй жонкі Вікторыі Хлявінскай змяніў назву новай сямейнай сядзібы на Віктарын. Яму, сучасніку караля Станіслава Аўгуста, прыпісваецца ўзвядзенне ў Віктарыне дома ў стылі класіцызму, з прыкметамі, якія былі характэрны для зямель паўночна-ўсходніх тэрыторый Рэчы Паспалітай.

Пасля смерці Лявона Юзафа Віктарын перайшоў да яго сына Вінцэнта (памёр у 1829 г.), каралеўскага падкаморага, жанатага з Канстанцыяй Грабоўскай, а пасля сыну Вінцэнта — Тадэвушу Раймонду Дарыя-Дзерналовічу (1794—1860). З-за таго, што Тадэвуш Раймонд не меў нашчадка па мужчынскай лініі, маёнтак атрымала ў спадчыну яго дачка Ева (нарадзілася ў 1844 г.), якая была павянчана са сваім кузэнам Севярынам Дзерналовічам у Рагіні. Пасля смерці жонкі Севярын Дзерналовіч, а таксама яго сын Станіслаў (нарадзіўся ў 1880 г.) былі апошнімі ўладальнікамі Віктарына.

У 2-й палове XVIII ст. на Буда-Кашалёўшчыне Дарыя-Дзерналовічам належалі вёскі Гута, Ліпа, Забалоцце, Струкі, Шарыбаўка, Бронніца, Рудня-Віктарынская.



Агульны выгляд сядзібы Віктарын, XIX ст.

Зямельныя надзелы ў фальварку Бронніца складалі больш за 350 дзесяцін ворнай зямлі і 100 дзесяцін лесу, у маёнтку Віктарын — адпаведна 4841 і 3881 дзесяцін, у фальварку Забалоцце — 2990 і 3000 дзесяцін. Амаль 1000 дзесяцін зямлі складалі няўдобіцы.

Дарыя-Дзерналовічы на Буда-Кашалёўшчыне валодалі: сукнавальнымі заводамі ў в. Рагінь, у в. Рудня Ліпіцкая; вінакурнымі ў Рагіні, Забалоцці, Плюціцы, Кленавіцы; мелі заводы крухмальны, сухой перагонкі драўніны ў Буда-Кашалёве, дзягцярны завод ва ўрочышчы Разгуляеўка. Значная колькасць зямлі ў валоданнях Дарыя-Дзерналовічаў у названых вёсках была перададзена сялянскім абшчынам, прамысловыя прадпрыемствы — арандатарам. Напярэдадні 1917 г. плошча гэтых уладанняў складала каля 13 тыс. дзесяцін, пераважна лясоў.

Але галоўнай сядзібай Дарыя-Дзерналовічаў на Буда-Кашалёўшчыне заставаўся Віктарын. Памешчыцкі дом у маёнтку быў драўляны, аднапавярховы, з двухпавярховай цэнтральнай часткай. Узвышаўся над высокімі жылымі падваламі і меў план падоўжанага чатырохвугольніка. Да цэнтральнай часткі галоўнага фасада, якая крыху выступала, прымыкаў порцік з шасцю калонамі, якія стваралі агульны рад унізе. Дзве пары крайніх калон праходзілі праз два паверхі, падтрымліваючы перакрыццё з трохвугольным франтонам, у якім прабіта паўкруглае акно. Дзве сярэднія падпіралі адзіны балкон другога паверха, што змяшчаўся над галоўным уваходам.

Перад порцікам знаходзілася вялікая тэраса, на якую вяла лесвіца з некалькіх прыступак, якая звужвалася ўверсе і была шырэйшай унізе.

Верагодна, садовы фасад быў падобны да галоўнага. Пры бакавых фасадах знаходзіліся маленькія ганачкі.

Звонку сцены дома не мелі ніякай тынкоўкі. Галоўную іх пластычную дэкаратыўнасць адыгрывалі гарызантальныя ліштвы, што змяшчаліся над вялікімі васьмішыбавымі прадаўгаватымі вокнамі белага колеру. Будынак накрываў гонтавы дах, над аднапавярховымі часткамі — трохсхільны, над сярэдняй часткай — двухсхільны.

На даволі вялікай адлегласці ад галоўнага жылога будынка, з яго правага і левага бакоў былі пабудаваны два аднолькавыя двухвосевыя аднапавярховыя флігелі. Яны былі размешчаны да цэнтральнага корпуса не перпендыкулярна, не паралельна, а наўскос. У выніку такой сістэмы паміж трыма аб'ектамі сядзібнага комплексу з боку пад'езду ўтвараўся вялізны, без дрэваў, газон паўкруглай формы. З вокнаў дамоў адкрывалася шырокая перспектыва. Абодва флігелі былі вытрыманы ў тым жа стылі, што і галоўны корпус: трохвосевыя сярэднія часткі іх акцэнтаваліся шырока расстаўленымі чатырма калонамі і завяршаліся трохвугольнымі франтонамі з вялікімі паўкруглымі вокнамі пасярэдзіне. Сцены таксама не былі атынкаваныя. Абодва флігелі накрываў высокі чатырохсхільны дах. Адзін з флігеляў служыў кухняй, другі — для пражывання аканома.

Унутраная планіроўка дома вядома толькі фрагментарна. Ён умяшчаў некалькі прасторных пакояў. За пярэдняй, як быццам паўкруглай, насупраць садовай алеі знаходзілася вялікая бальная зала, якую выкарыстоўвалі апошнім часам як сталовую. Да яе прылягаў меншага памеру салончык. Падлога была ўпрыгожана ўзорыстым паркетам. Пакоі другога паверха служылі звычайна як гасцявыя.

Старасвецкае ўражанне віктарынскага дома складалася ад мэблі, верагодна, мясцовага выканання. Галоўнае месца ў інтэр'еры займалі галерэя сямейных партрэтаў і багаты архіў, што даходзіў да пачатку XVI ст. Усе найкаштоўнейшыя рэчы, аднак, былі вывезены адтуль напярэдадні 1917 г., паколькі Дзерналовічы валодалі яшчэ іншымі землямі ў цэнтральнай Польшчы — спачатку Рэпікам, а пазней Мінскам Мазавецкім, дзе часцей знаходзіліся. Віктарын, такім чынам, служыў як летняя сядзіба, асабліва на перыяд палявання.

Усе мастацкія творы і сямейныя рэліквіі, сабраныя ў Мінску Мазавецкім, былі знішчаны гітлераўцамі ў час 2-й сусветнай вайны.

Сядзібны дом у Віктарыне знаходзіўся сярод прасторнага англійскага парку, цэнтрам якога быў згаданы шырокі парадны двор з травяным газонам перад домам.

Каля дома раслі дэкаратыўныя кусты, з тыльнага яго боку — рад старых італьянскіх таполяў, а крыху далей — група елак. З аднаго боку, бліжэй да правага

флігеля, праходзіла дарога, якая вяла да чыгуначнай станцыі Буда-Кашалёўская. З другога боку парк злучаўся непасрэдна з лесам. У азярцы, што было недалёка ад дома, вольна жылі бабры.

З процілеглага ад дома боку, каля дарогі, стаяў драўляны касцёл з тымі ж стылёвымі прыкметамі, што і сядзіба. Верагодна, ён быў пабудаваны таксама пры жыцці Лявона Юзафа Дзерналовіча і ў той жа самы час, што і дом. Пабудова гэтая па памерах невялікая, але мела даволі значную вышыню. Галоўны ўваход знаходзіўся пад чатырохкалонным порцікам. Касцёл служыў яшчэ капліцай-пахальняй, бо змяшчаў мураваны склеп, дзе хавалі нябожчыкаў сямейства Дарыя-Дзерналовічаў.

Падрыхтавала Т.Ф.Літвінава.

Крыніцы: Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Wrozlaw, 1991. T. 1. S. 170 – 171.

КРЫНІЧКА КАЛЯ ВЁСКІ СЯЛЕЦ

Спрадвеку чалавек лічыў, што водная стыхія — усемагутная сіла, здольная «змыць» любую хваробу: сурокі, нагавор, спалох і г.д. Крыніцы здаўна лічыліся свяшчэннымі.

Каля вёскі Сялец ёсць такая крынічка. Калі яна ўтварылася, ніхто не памятае. Яшчэ ў 1930-я гады побач з крынічкай быў пабудаваны драўляны домік, дзе збіраліся людзі, прыходзіў свяшчэннік. Стаялі крыжы. На іх людзі вешалі ручнікі і кожны год на Макоўе (Макавей, 14 жніўня) сюды прыходзілі жыхары суседніх вёсак. Свяшчэннік асвячаў ваду. Людзі маліліся, бралі з крынічкі ваду і асвячалі яблыкі, кветкі, моркву, пілі яе самі, змазвалі вочы, рукі, ногі, абараняючы іх ад хвароб. У слоіках неслі ваду дадому, і хто хварэў, таму давалі яе піць. І гэтак з году ў год. У апошняе дзесяцігоддзе крыніцу добра абсталявалі: паставілі агароджу, зрабілі прыступкі, якія вядуць да вады. Нават у лютыя калядныя маразы крыніца не замярзае і людзі называюць яе ваду «жывой вадой».

Крынічка каля в. Сялец.

ПАРК-ГАЙ

На тэрыторыі саўгаса «Камінтэрн» ёсць парк-гай. Да рэвалюцыі тут размяшчаўся маёнтак памешчыцы Ванды Селістроўскай. Жыла яна адна, без радні. Усе яе блізкія жылі ў Польшчы. Навокал стаялі першародныя лясы. Пані Ванда прадавала будаўнічы лес, мела вінаробчы завод, маслабойню і кузню. Побач з маёнткам у бараках жылі парабкі. Вёска іх так і называлася — Батрак (пасля рэвалюцыі — Новая Гута). Зараз гэтай вёскі няма. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС жыхары выселены, вёска пахавана. Але ў тыя гады, калі жыла пані Ванда, тут была аранжарэя кветак. Нават зімой у маёнтку былі жывыя кветкі. Гаманіў вялікі пладова-ягадны сад. У маёнтку былі возера і парк, у якім раслі 42 віды розных парод дрэў. Парк захаваўся і да гэтага часу, але зараз гэта ўжо не парк, а парк-гай. У мінулым тут раслі пераважна серабрыстыя таполі, ліпы, дубы, клёны, піхты, лістоўніцы і іншыя пароды дрэў. Пані Ванда Селістроўская памерла да рэвалюцыі. Пахавалі яе без каштоўнасцей на сельскіх могілках. На магіле — надмагільная мармуровая пліта. Пасля смерці Селістроўскай маёнтак перайшоў пляменніку, барону Віктару Нэлькіну. У рэвалюцыю барон збег у

Польшчу. Маёнтак разрабавалі. Парк застаўся без належнага нагляду, паступова ператварыўся ў паркавы гай, які і зараз упрыгожвае наваколле в. Камінтэрн.

ПАРК У ВЁСЦЫ РАГІНЬ

У маёнтку памешчыка Дзерналовіча, побач з мураваным двухпавярховым жылым домам, быў прыгожы, дагледжаны парк. У аснове паркавай кампазіцыі ляжаў прынцып чаргавання невялікіх палян з салітэрамі драўляных груп. Маляўнічасць насаджэнняў дасягалася шырокім выкарыстаннем экзотаў (сасны веймутава, елкі калючай, лістоўніцы, глогу, бэзу і інш). Арыгінальнае рашэнне атрымаў уезд у маёнтак. Уязная алея пралягала па насыпанай дамбе паміж двума штучнымі вадаёмамі, чым дасягаўся зрокавы эфект павелічэння паркавай прасторы. Практычна плошча парка складала не больш за 4 гектары.

Пасля рэвалюцыі цагляны будынак разабралі на будаўніцтва школы. На тэрыторыі парку ў 1956 г. размясцілі памяшканні ўчастковай бальніцы, у 1958 г. пабудавалі двухпавярховы будынак канторы саўгаса «Рагінь». У 1962 г. паставілі помнік — скульптурную групу «Воін са схіленым сцягам, стары і жанчына», якія ўвекавечваюць памяць воінаў-землякоў, загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну. У парку яшчэ шумяць векавыя дрэвы: дубы і ліпы, растуць клёны, таполі, глог, белая акацыя, бэз.

Адраджэнне і развіццё праваслаўя на Буда-Кашалёўшчыне

На мяжы XIX—XX ст. храмы будаваліся звычайна ў валасных цэнтрах. Царква ў в. Кашалёў — храм Міхаіла Архістраціга — адна з іх. Яна была драўляная, рубленая сякерамі. Цвікі кавалі ў кузні. Зруб ашаляваны. Навокал раслі ліпы, старэйшыя за храм. На званіцы меліся 4 моцныя званы. Іх звон чуўся і ў навакольных вёсках, урачыстым пераздвонам склікаючы жыхароў прыхода на царкоўныя святы.

У царкве служылі 4 свяшчэннікі: Цількевіч, Бядрыцкі, Корабаў, Пухальскі. Усе яны мелі духоўную адукацыю, добра пастаўленыя галасы. Мелі і свае падвор'і ў Кашалёве. Былі пры царкве і 2 дыяканы. Адзін з іх, Якаў Маслячэнка, таксама меў духоўную адукацыю.

Да прыняцця Дэкрэта «Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы» (1918) свяшчэннікі на брычках прыязджалі ў сельскія пачатковыя школы воласці, праводзілі ўрокі Закона Божага, першымі па раскладу.

У 1930-я гады ўзмоцніліся ганенні на свяшчэннаслужыцеляў. З Кашалёва невядома куды з'ехаў Цількевіч, Корабава з матушкай забралі сыны ў Маскву. Пухальскага з-за старога ўзросту не арыштавалі. Да апошняга дня служыў у царкве айцец Арсеній (Бядрыцкі). Яму прыйшлося зведаць усе пакуты ў лагеры ГУЛАГа. Вяр-

Святар Буда-Кашалёўскай царквы Міхаіл (М.А.Мандрык) з прыхаджанамі, 1960-я гады.

нуўся пасля вайны хворым і хутка памёр.

Дамы свяшчэннікаў разабралі на будаўніцтва школ. Маёмасць і жывёлу канфіскавалі.

Напярэдадні Другой сусветнай вайны купал царквы разбурылі, скінулі на зямлю званы (царкоўны будынак быў прыстасаваны пад ткацкую арцель). Іконы, царкоўныя атрыбуты здалі як макулатуру і металалом у нарыхтоўчы пункт Буда-Кашалёва. Усё гэта рыхтавалі вывезці ў Гомель. Жыхар Буда-Кашалёва Восіп Рыгоравіч Лісейчыкаў упрасіў нарыхтоўшчыкаў аддаць яму на захаванне 2 малыя званы. Вывез і схаваў іх. Калі ў Буда-Кашалёве адкрылася царква, ён перадаў гэтыя званы. І зараз яны гучаць са званіцы Свята-Мікалаеўскага храма ў Буда-Кашалёве.

У 1941 г. царква ў Кашалёве была адноўлена. Службу да 1953 г. вёў манах Ерафей. Ён прывёз з сабой з Кіева-Пячэрскай лаўры чашу, кнігі, драўляныя падсвечнікі. Ён жа вёў службу ў будынку, прыстасаваным пад царкву ў Буда-Кашалёве.

У 1953 г. у дзень прастольнага свята храм у Кашалёве згарэў. На яго месцы паставілі помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

Пасля вызвалення Буда-Кашалева ад нямецкіх акупантаў, у 1943 г. царкоўны савет набыў жылы дом, які быў прыстасаваны пад царкву. Пабудавалі званіцу з двума званамі.

Першым настаяцелем у Буда-Кашалёве быў свяшчэннік Мікалай (свецкае імя М.Шынкевіч, служыў у 1943—1960 гг.). Ён карыстаўся аўтарытэтам у прыхаджан. Пры ім былі адрамантаваны алтар, малітвенная зала, сабрана шмат ікон, напісаны новыя — Збавіцеля, Божай Маці, архангела Гаўрыіла, архангела Міхаіла з трубой, чатырох евангелістаў і інш.

У 1960-я гады, калі зачыняліся манастыры і цэрквы, была апісана і ўся маёмасць Буда-Кашалёўскай царквы. З вялікімі цяжкасцямі тады айцу Міхаілу (Мандрык Міхаіл Аляксеевіч), які служыў настаяцелем у 1960—1969 гг., удалося захаваць храм. У 1972 — 1975 гг. настаяцелем у Буда-Кашалёве быў айцец Піоній (Яроменка Пётр Фёдаравіч), які нарадзіўся ў п. Рэкорд Буда-Кашалёўскага раёна ў набожнай сялянскай сям'і. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны медалём «За адвагу», пасля дэмабілізацыі ў 1951 г. ён стаў свяшчэннаслужыцелем, прайшоў шлях ад манаха да ігумена, ад псаломшчыка да архімандрыта. Па службе царкоўнай удастоены граматы Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі Філарэта, юбілейнай Благаславеннай граматы Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II.

З 1976 г. па 1987 г. настаяцелем царквы быў айцец Данііл (Адзінокі Данііл Іванавіч), а з 1987 г. па 1989 г. — айцец Ігар (Пташынскі Ігар Паўлавіч), выпускнік Маскоўскай семінарыі.

У гэтыя гады значна ўзрасла колькасць прыхаджан. Прыход Буда-Кашалёўскай царквы ахопліваў Буда-Кашалёва, Патапаўку, Шарыбаўку, Кашалёў, Дуравічы, Марозавічы, Бушаўку, пасёлкі перасяленцаў з 30-кіламетровай чарнобыльскай зоны. Для свяшчэнніка быў куплены дом, але па стане здароўя айцец Ігар быў пераведзены ў другі прыход Гомельскай епархіі.

З 1989 г. настаяцелем стаў іерэй Сергій (Пяшко Сяргей Васільевіч).

Піоній (П.Ф.Яроменка).

У канцы 1989 г. прыхаджане Свята-Мікалаеўскай царквы ў Буда-Кашалёве звярнуліся ў мясцовыя органы ўлады з просьбай дазволіць будаўніцтва новага храма.

25 снежня 1989 г. было атрымана пісьмовае паведамленне Савета па справах рэлігій пры Савеце Міністраў СССР аб дазволе на будаўніцтва царквы.

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы экзарх усяе Беларусі, 12 ліпеня 1990 г. благаславіў праект новага храма. У верасні 1990 г. благачынны Гомельскай акругі протаіерэй Стафан Гладышчук асвяціў месца пад будучы храм, а у кастрычніку 1990 г. настаяцель Свята-Мікалаеўскай царквы іерэй Сергій асвяціў камень пры закладцы падмурка. Храм будаваўся на даходы царквы і на ахвяраванні прыхаджан і арганізацый. Ён быў узведзены ў 1994 г.

19 мая 1994 г. епіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх асвяціў прастол Свята-Мікалаеўскай царквы, першае богаслужэнне было адпраўлена на Вялікдзень.

За дапамогу ў будаўніцтве Свята-Мікалаеўскага храма Руская праваслаўная царква ўзнагародзіла дырэктара ААТ «АграпрамтэхПАК» М.І.Зінкевіча ордэнам Благавернага князя Данііла Маскоўскага III ступені.

Свята-Мікалаеўская царква ў Буда-Кашалёве стала цэнтрам духоўнасці, сімвалам адраджэння праваслаўя ў раёне.

Мясцовы мастак Васіль Піліпавіч Канановіч напісаў для царквы іконы. Вакол храма прыхаджане заклалі парк і кветнік. Пабудавалі падсобныя памяшканні. Быў куплены будынак для нядзельнай школы на тэрыторыі, прылягаючай да храма.

Дзякуючы намаганням айца Сергія, нядзельная школа стала працаваць з 1993 г. Заняткі ідуць па праграме выкладання Закона Божага. Кантынгент навучэнцаў складаюць вучні агульнаадукацыйных школ горада. Узрост іх розны. У школе вывучаюць гісторыю Старога і Новага Запаветаў, гісторыю хрысціянскай царквы. Дзеці засвойваюць малітвы, пішуць сачыненні на біблейскія тэмы, малююць, спяваюць, рыхтуюць паказальныя выступленні. На гутаркі да дзяцей прыходзіць айцец Сергій. Двойчы ў год навучэнцы спавядаюцца і прымаюць святое прычасце. Некаторыя з выпускнікоў нядзельнай школы прыслужваюць настаяцелю храма ў час богаслужэнняў.

Прыхаджане спраўляюць і паломніцкія паездкі па святых месцах — у Жыровічы, Пачаеўскую лаўру і інш.

Пры храме ёсць бібліятэка, якая налічвае больш за 200 экзэмпляраў кніг, газеты, часопісы.

В.А.Манькоўская.

СВЯТА-ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА Ў в. ГЛАЗАЎКА

Да 1936 г. царква ў Глазаўцы працавала пастаянна. Настаяцелем быў айцец Мітрафан. У 1938 г. царкву зачынілі. У будынку размясціўся сельскі клуб. У 1944 г. па хадайніцтве жыхароў будынак зноў быў перададзены пад царкву. Настаяцелі часта мяняліся. У 1961 г. царкву зачынілі, будынак разабралі, на месцы царквы пабудавалі фельчарска-акушэрскі пункт.

Толькі праз 30 гадоў у 1991 г. праўленне калгаса «Новае жыццё» вылучыла для малітвеннага дома будынак былой ветлячэбніцы. Прыхаджане адрамантавалі яго і адкрылі царкву. У кастрычніку 1991 г. пачалася служба. Настаяцелем быў мясцовы настаўнік Шмідаў Юрый Міхайлавіч (айцец Георгій). У 1996 г. быў атрыманы дазвол на будаўніцтва новай царквы, якую і ўзвялі прыхаджане на свае сродкі і сродкі, вылучаныя спонсарамі з даходаў бліжэйшых гаспадарак. Адкрыццё адбылося 27 кастрычніка 1996 г.

ЦАРКВА Ў г.п. УВАРАВІЧЫ

Будынак царквы пабудаваны яшчэ на сродкі памешчыка Ліпінскага і пані Прудоўскай. У 1934 г. цагляны будынак царквы разабралі і пабудавалі школу. У 1945 г. на ахвяраванні жыхароў г.п. Уваравічы і бліжэйшых вёсак пабудавана драўляная царква. Настаяцель — Яроменка Пётр Фёдаравіч (айцец Піоній).

СВЯТА-МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА Ў в. ІВОЛЬСК

У чэрвені 1995 г. на сходзе жыхароў в. Івольск было вырашана адкрыць царкву. Выбралі парафіяльны савет, які ўзначаліў Васіль Антонавіч Лабушаў. Пад яго кіраўніцтвам на сродкі прыхаджан пад царкву пераабсталявалі будынак старой школы. Служба пачалася 4 жніўня. Царкву назвалі Свята-Міхайлаўскай, адкрылі 19 снежня 1996 г.

З ВОПІСУ МАЁМАСЦІ КАШАЛЁЎСКАЙ МІХАЙЛАЎСКАЙ ЦАРКВЫ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА (КІРУЮЧЫСЯ ВОПІСАМ, ЯКІ МЕЎСЯ ПРЫ ГЭТАЙ ЦАРКВЕ ЗА 1885 г.)

19 лютага 1923 г.

…Церковь деревянная на кирпичном фундаменте и цоколе, крытая жестью, с шпилем на колокольне. Длина церкви с алтарем, трапезной и колокольней — 12 1/6 саж., шириной в средней части 5 саж., высотой от земли до цоколя — 1 арш., от цоколя до карниза в средней части — 11 арш., от карниза до крыши — 8 арш. В церкви полы и потолки из сосновых досок. Окон подъемных с зимними переплетами — 8 и глухих с зимними переплетами — 6, дверей створчатых с замками — 4. На колокольню для входа имеется постоянная лестница. При церкви — 3 крыльца, крытых железом. Снаружи церковь ошелевана однодюймовыми досками. Как изнутри, так и снаружи церковь окрашена масляной краской. Алтарь отделан синею. Для входа имеется три двери: царские, северные и южные. В нем — святой престол, устроенный по чиноположению, деревянный, площадью в 1 1/2 кв арш. на кирпичном фундаменте. Жертвенник деревянный длиной 1 3/4, шириной 1,0 арш., треугольный. Над жертвенником в 1905 г. сделана икона моления Господа Иисуса о чаше. Писано на холсте масляной краской, высота — 1 1/4 арш., ширина — 3/4 арш.

На горнешнем месте — распятие Господа Иисуса Христа, сделана икона в 1905 г., писана на жести масляными красками, высотой 2 1/2 арш., шириной 1 1/4 арш.

На горнешнем месте справа — икона Божьей Матери в раме за стеклом, пожертвована крестьянином Алексеем Борченковским в 1906 г.

КАПЕТАСМА

цвета бордо, приобретена в 1913 г.

ПРЕДАЛТАРНЫЙ ИКОНОСТАС

Царские врата новые, резные, с изображением Св. креста посредине, на вратах — изображения Благовещания Божьей Матери и Архангела Гавриила на золотом фоне, а также изображения Св. Евангелистов, овальной формы на золотом фоне. Иконостас в 1905 г. ремонтирован.

На правой стороне царских врат образ Спасителя на жести в золоченой раме длиной 2 арш., шириной 1 арш.

За оным южная дверь длиной 3 1/2 арш., шириной 1 1/4 арш., в ней образ Св. Архистратига Гавриила.

За оной дверью — киот, в котором храмовый образ Архистратига Михаила длиной 2 арш., шириной 4 арш.

По левую сторону царских врат образ Богоматери на жести, держащей в левой руке Спасителя, в золоченой раме одной мерой с иконой Спасителя.

За оной северная дверь такой же длины и ширины, как и первая, в ней образ Св. Архидиакона Стефана мерою такой же, как в южной двери.

За оною дверью киот с иконою Покрова Божьей Матери мерою одною с иконой Храмовою.

Над царскими воротами икона Тайной вечери, по сторонам в рамках раззолоченных — икона двунадесятых праздников на кипарисе писаных.

На Тайной вечере образ царя Славы, сидящего на престоле в золоченой раме, писанный на холсте высотой 3 арш., шириной 1 1/2 арш.

По сторонам, в рамках золоченых, лики святых угодников православной церкви, во втором и третьем ярусах иконостаса и вверху — два кронштейна резные, вызолоченные.

Икона Божьей Матери в золоченой раме с резьбою в ризе посеребренной в алтаре над иконостасом.

Иконы в прочих местах храма в серебре — 4.

Икона Св. мучеников Маккавеев на чеканном золотом фоне на правом клиросе, дар прихожанина в 1900 г.

Киот с иконой на золотом фоне Божья Матерь всех скорбящих на левом клиросе.

Выносная на древке икона с изображением с одной стороны Воскрешения Христова, с другой стороны — Св. Архангела Михаила, дар прихожанина 1901 г.

Икона Святого Александра Невского на левом клиросе.

Киот большой. По правой стороне в нем икона Св. Николая Чудотворца на золоченном чеканном фоне, передана на хранение в 1918 г. служащим ст. Буда-Кошелево.

Икона Св. Ефросиньи Полоцкой на холсте, в золоченной багетной раме — по левую сторону.

Плащаница на бархате, по углам алтаря — Евангелисты.

Вторая плащаница на деревянной доске с изображением Спасителя.

Две хоругвии, писанные на холсте, обложенном малиновым штофом, — изображение Божьей Матери, Крещения Господня.

Две светолические хоругвии, подношение-пожертвование крестьян с. Кошелево.

Икона изображения предания Иудой Спасителя в саду Гефсиманском.

Гроб господень, деревянный, пожертвование прихожан в 1901 г.

Икона Св. Тихона деревянная, пожертвование крестьян д. Дуравичи.

Икона Св. Николая деревянная, вызолоченная, пожертвование крестьянина д. Бушевка Константина Алейникова.

Икона Св.мучеников Флора и Лаврия, писанная масляными красками.

Икона Св. Георгия Победоносца, писанная масляными красками.

Икона Св. Николая.

Две иконы Божьей Матери и Св. Архангела Михаила на 2-х аналоях перед иконостасом.

Икона Св. Архангела Михаила.

Икона двунадесятых праздников, приобретенная в 1913 г.

Крест.

Две хоругвии на малиновом сукне (Св. Николай, Божьей Матери).

Икона Богослова.

Икона Божия Матерь Казанская на золоченом фоне.

Икона Божей Матери, пожертвование А.Бариненкова.

ЛАМПАДЫ И ПОДСВЕЧНИКИ

Напрестольное Евангелие, обложенное красным бархатом, на ней, в средине — образ воскрешения Христа, по углам — 4 Евангелиста, все серебряные, позолоченные с серебряными наконечниками и в средине — изображение Креста серебр.

Напрестольное евангелие в медной посеребряной оправе.

Кресты напрестольные — 3.

Священные служебные сосуды — 11.

Колокола: 1 — 22 пуда 10 фунтов, 1 — 10 пудов, 7 фунтов, 1 — 5 пудов 6 фунтов, 1 — 2 пуда 3 фунта.

КНИГИ и ДОКУМЕНТЫ, в т.ч.:

Метрическая книга с 1833 г.

Книга бракосочетания с 1833 г.

Книга умерших с 1833 г.

Священник А.Бедрицкий, др.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 1072. Воп.1. Спр.23. Л.1–6.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Таварыства Кірылы Тураўскага

22 снежня 1992 г. у Гомелі быў створаны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы ўстаноўчага сходу, каб афіцыйна аформіць Таварыства Кірылы Тураўскага на Гомельшчыне. Менавіта з гэтага дня члены камітэта пачалі работу ў раёнах вобласці, вышэйшых навучальных установах, школах, бібліятэках і іншых калектывах па стварэнні ініцыятыўных камітэтаў.

6 лютага 1993 г. такі ўстаноўчы сход адбыўся ў Буда-Кашалёве. Сход пастанавіў стварыць Буда-Кашалёўскую тэрытарыяльную арганізацыю Таварыства Кірылы Тураўскага. У склад арганізацыйнага праўлення ўвайшлі: Г.Е.Грыгарэнка (старшыня), В.Т.Бабраўнічы, Н.І.Гадэйка. Такія мерапрыемствы прайшлі і ў іншых раёнах.

14 красавіка 1993 г. у Гомелі адбыўся ўстаноўчы сход, на якім прадстаўнікі навукі, асветы, культуры прынялі пастанову аб стварэнні Гомельскага абласнога Таварыства Кірылы Тураўскага. Выбралі праўленне на чале са старшынёй В.С.Сяліцкім, у склад праўлення ўвайшлі У.Р.Казлоўскі — дырэктар Гомельскага абласнога грамадска-культурнага цэнтра, А.Р.Майсеенка — загадчык упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкома, М.А.Казакоў — ад Буда-Кашалёўскай раённай арганізацыі Таварыства Кірылы Тураўскага, Г.І.Харошка — кандыдат філасофскіх навук, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, В.В.Матусевіч — кандыдат гістарычных навук, С.С.Сільчанка — пенсіянер, Д.І.Міцкевіч — загадчыца бібліятэкі, Я.Д.Шчэрбін — намеснік старшыні праўлення таварыства «Веды», айцец Стафан (Стафан Мікалаевіч Гладышчук).

Распрацавалі Статут Таварыства, дзе вызначылі прадмет, сэнс і напрамак яго існавання і дзейнасці:

«2.1. Таварыства Кірылы Тураўскага створана з мэтай масавай адукацыі і выхавання насельніцтва на аснове аб'ектыўных гістарычных ведаў, культурных традыцый і духоўнай спадчыны, якія сыходзяць глыбокімі каранямі да вытокаў фарміравання, станаўлення і развіцця ўсходніх славян на тэрыторыі Беларускага Палесся і акружаючых яго рэгіёнаў.

2.2. Таварыства ажыццяўляе сваю дзейнасць па наступных напрамках:

— аказвае ўсебаковае садзейнічанне глыбокаму вывучэнню гісторыі і культуры Беларускага Палесся са старажытных часоў да цяперашняга перыяду;

— імкнецца да аднаўлення і захавання матэрыяльных і духоўных помнікаў старажытных славян, садзейнічае станаўленню і развіццю беларускай культуры;

— выключнае значэнне прыдае адраджэнню гістарычнага і культурнага мінулага Тураўскага княства, духоўнай спадчыны выдатнага мысліўца XII стагоддзя Кірылы Тураўскага;

— распаўсюджвае і прапагандуе сярод усіх слаёў насельніцтва гістарычныя веды і культурныя традыцыі славянскіх народаў, якія вядуць свае вытокі з Палескай зямлі;

— садзейнічае развіццю музейнага руху на Палессі, стварэнню бібліятэк і іншых культурных цэнтраў, правядзенню гісторыка-культурных і археалагічных пошукаў і экспедыцый, узнаўленню памятных месц, правядзенню масавых культурна-асветных мерапрыемстваў з насельніцтвам;

— фарміруе грамадскую думку і меры па праблемах выратавання помнікаў гісторыі і культуры ў пацярпеўшых ад аварыі на ЧАЭС раёнах».

Творчасць Кірылы Тураўскага высока ацэнена сучаснікамі, якія называлі яго «Златоуст, паче всех воссиявший нам на Руси».

Багатая і разнастайная спадчына Кірылы Тураўскага з'яўляецца той невычарпальнай крыніцай, з якой бяруць свой пачатак вытокі і славянскай (і яе састаўной часткі — беларускай) культуры.

Амаль усё жыццё Залатавуст правёў на беларускай зямлі, у Тураве. Уплыў яго думак, ацэнак, парад у першую чаргу ўспрынялі тыя, хто быў побач з ім — нашы далёкія продкі. Ён быў адным з тых, хто стварыў падмурак, на якім выраслі такія якасці асоб, як свядомасць, самасвядомасць, стыль жыцця, мысленне, паводзіны, праца, адносіны да чалавека, прыроды, дзяржавы і г.д.

Біяграфічныя звесткі пра вялікага тураўчаніна вельмі сціплыя. Энцыклапедычныя даведнікі называюць год яго нараджэння — каля 1113, смерці — пасля 1190. Захаваўся толькі дзень яго нараджэння — 28 красавіка (па старым стылі, 11 мая па новым), які і адзначаецца як Дзень памяці святога Кірылы Тураўскага. Невядомы аўтар XII ст. у невялікім матэрыяле «Памяць святога нашага айца Кірылы, епіскапа Тураўскага» піша, што Кірыла нарадзіўся і быў узгадаваны «ў рускім горадзе Тураве. Ён быў сынам багатых бацькоў, але не любіў багацця і марнай славы гэтага свету, а любіў больш за ўсё вучэнні Боскіх кніг. І, навучыўшыся Боскім пісанням, пайшоў у манастыр і зрабіўся манахам, адракаючыся ад свецкіх радасцей жыцця дзеля духоўнага ўзвышэння. Пасля некатарага часу, жадаючы вялікіх подзвігаў, ён увайшоў у «слуп» (вежападобнае збудаванне) і нейкі час жыў пустэльнікам, яшчэ больш шчыруючы ў пастах і малітвах. І выклаў ён многія пісанні Боскія і ўславіўся на ўсёй зямлі той».

У Іпацьеўскім летапісе адзначаецца, што ў 1169 г. Кірыла быў узведзены ў сан

епіскапа Тураўскага княства. Гэтыя абавязкі ён выконваў да 1182 г.

Чым жа прываблівае Залатавуст нашых сучаснікаў? Перш за ўсё тым, што ўся яго творчасць зарыентавана на ўзор ідэальнага чалавека. Ён не прымаў падману, подласці, здрады. Ён звяртаецца да душы і самасвядомасці кожнага, абвяшчае хрысціянскія і агульначалавечыя маральныя каштоўнасці. Яго асветніцкая дзейнасць накіравана на фарміраванне ў кожным чалавеку чыстых, светлых якасцей. Трэба асобна падкрэсліць, што ў яго творах важнае месца займае ідэя адзінства славян. Толькі ў гэтым адзінстве ён бачыў залог поспехаў у барацьбе з ворагам, вельмі балюча ўспрымаў тую міжусобіцу, якая ў яго час раздзірала славянскія княствы.

Кірыла Тураўскі пакінуў нам значную і разнастайную спадчыну. Гэта — «Словы», якія вымаўляюцца пад час свят, а таксама прытчы, паданні, пасланні, малітвы (каля 30), павучанні, малітоўныя каноны і інш. У творах многа слоў, якія захаваліся ў сучаснай беларускай мове, гэта дазваляе сцвярджаць, што вытокі беларускай мовы ўзыходзяць да старажытных часоў.

Творы вялікага мысліцеля на працягу стагоддзяў перапісваліся, уваходзілі ў склад розных зборнікаў, з XVI ст. яны пачалі выходзіць друкарскім спосабам.

Спадчына Кірылы Тураўскага заслугоўвае таго, каб яна стала даступнай усім, і перш за ўсё моладзі. Таму зразумела, што першымі сталі гаварыць пра гэта тыя, хто займаецца з моладдзю, — настаўнікі, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, работнікі культуры.

Перш за ўсё трэба было сабраць творы святога Кірылы, матэрыялы, звязаныя з яго дзейнасцю. З мэтай прыцягнення ўвагі навуковых супрацоўнікаў у Гомелі ў 1994 г. была падрыхтавана і праведзена 1-я навуковая канферэнцыя «Спадчына Кірылы Тураўскага і сучаснае грамадска-культурнае жыццё».

Удзельнікамі канферэнцыі, акрамя прадстаўнікоў Беларусі, былі вучоныя з Расіі, Украіны, Польшчы. Матэрыялы канферэнцыі былі надрукаваны і сталі набыткам бібліятэк, шырокіх колаў чытачоў. Паступова ствараліся аддзяленні і таварыствы ў іншых рэгіёнах — у Мінску, Маскве, Тураве, Мазыры і інш. гарадах. Была разгорнута работа ў школах, бібліятэках. Шырока выкарыстоўваўся першы вопыт дзейнасці Буда-Кашалёўскага аддзялення Таварыства Кірылы Тураўскага.

Узнікла патрэба замацаваць першыя поспехі, і ў 1995 г. Таварыства правяло 2-ю навуковую канферэнцыю на тэму, якая знайшла сваё адлюстраванне ў творах Кірылы Тураўскага: «Адзінства ўсходнеславянскіх народаў: мінулае, сучаснае, перспектывы». Калі ў першай канферэнцыі прынялі ўдзел 48 асоб, то ў другой — ужо 98. Гэта яскрава сведчыць аб дзейнасці Таварыства. Сабраныя за два гады матэрыялы дазволілі ў 1996 г. выдаць брашуру «Кірыла Тураўскі. Бібліяграфічны паказальнік» (складальнікі С.М.Лазарава, Г.С.Макерынкова), куды разам з творамі Залатавуста былі ўключаны працы гісторыкаў, філосафаў, літаратуразнаўцаў, а таксама літаратура аб Тураўскай зямлі. Праца гэта была выканана ў Мазырскім педагагічным інстытуце.

Заснавальнікі Таварыства Кірылы Тураўскага.

З'явіліся першыя даследаванні твораў Кірылы Тураўскага, якія вядуць актывісты Таварыства. Так, у 1996 г. у Гомелі выйшла брашура доктара філалагічных навук, дырэктара цэнтра беларусазнаўчых даследаванняў Расійскай акадэміі навук Ю.А.Лабынцава «Заззяўшы нам на Русі». Праца прысвечана гісторыі вывучэння спадчыны Залатавуста. Як піша аўтар, у XVI ст.,Скарынавым «залатым» стагоддзі беларускай культуры, з'яўляецца першае друкаванне твораў Кірылы Тураўскага. Яно выходзіць у Вільні 26 кастрычніка 1596 г. у кніжцы «Малітвы штодзённыя». Першае друкаванае выданне было бездакорным і стала ўзорам для іншых выданняў, з яго пачалося другое жыццё Кірылавых малітоўных твораў.

У 1997 г. выдадзена брашура кандыдата гістарычных навук М.Я.Абраменкі «Кірыла Тураўскі» (праблема аўтарства «Слова пра паход Ігаравы»). Яна прысвечана аналізу ідэй пра тое, што выдатны літаратурны твор, магчыма, быў напісаны Кірылам Тураўскім.

Улічваючы ўзрастаючую цікавасць да дзейнасці Таварыства, у 1996 г. была праведзена чарговая міжнародная канферэнцыя «Славянскія народы і іх культура ў сучасным свеце», у якой прынялі ўдзел 112 вучоных з розных краін. Канферэнцыя яскрава пацвердзіла, што славянская культура — гэта адзіная культура, якая заўсёды аказвала ўплыў на сусветную культуру, якія б змены ні адбываліся ў славянскім свеце, духоўнасць славянскіх народаў заўсёды будзе забяспечваць іх адзінства.

Важнай справай Таварыства заўсёды было і застаецца прыцягненне моладзі да спадчыны Кірылы Тураўскага. Гэта ажыццяўляецца па розных накірунках. Каб зрабіць творы Залатавуста дасягальнымі для моладзі, Таварыства надрукавала два выпускі брашуры «Кірыла Тураўскі: выбраныя творы» (складальнікі Г.І.Харошка, А.І.Халяўка). Змешчаныя ў гэтых брашурах найбольш вядомыя творы мысліцеля дазваляюць моладзі не толькі пазнаёміцца са спадчынай вялікага тураўчаніна, але і рыхтаваць даклады, выступаць на розных канферэнцыях, чытаннях. Улічваючы вялікую цікавасць моладзі да твораў Залатавуста, у 1998 г. была праведзена міжнародная навуковая маладзёжная канферэнцыя «Усходнеславянскае адзінства ў мінулым, сучасным і будучым», на якой моладзь розных краін аднадушна выказала жаданне мацаваць адносіны паміж славянскімі народамі. Пры актыўным удзеле Таварыства ў лістападзе 1999 г. была праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя «Актуальныя праблемы славянскай фразеалогіі». Увогуле пытанні мовы, красамоўства пастаянна знаходзяцца ў полі зроку Таварыства. Мова Кірылы Тураўскага — гэта выдатны ўзор бліскучай прамоўніцкай прозы, сведчанне высокай адукаванасці аўтара, ведання і ўмелага прымянення разнастайных прыёмаў красамоўства, што і прынесла яму славу Залатавуста.

Цікава прайшла сустрэча на тэму «Гомельшчына праваслаўная: гісторыя, сучаснасць, будучыня». Сталі традыцыйнымі паездкі ў Тураў на святкаванне Дня Кірылы Тураўскага, а таксама на скрыжаванне межаў трох славянскіх народаў і інш. У Гомелі адна з бібліятэк носіць імя Залатавуста і праводзіць актыўную работу сярод насельніцтва па прапагандзе яго спадчыны, сістэматычна ладзіць выставы яго твораў і прац, прысвечаных дзейнасці Кірылы Тураўскага.

Актыўны ўдзел у мерапрыемствах Таварыства прымаюць прадстаўнікі праваслаўнай царквы. Яны прысутнічаюць на канферэнцыях, сходах, выказваюць свае думкі і наконт спадчыны Кірылы Тураўскага, яго хрысціянскіх поглядаў і месцы ў жыцці праваслаўнай царквы.

Сёння імя Залатавуста ўсё больш прыцягвае ўвагу вучоных і адукаванай моладзі Беларусі. У 1997 г. была выдадзена манаграфія А.А.Мельнікава «Кірыл, епіскап Тураўскі», у якой падрабязна разглядаецца гісторыя жыцця Свяціцеля, яго дзейнасць, сэнс яго твораў, выказваюцца погляды аўтара на многія спрэчныя пытанні. У 1999 г. выйшла манаграфія актыўнай удзельніцы Таварыства доктара філалагічных навук А.А.Кожынавай «Інтравертыўны вобраз свету ў тэкстах Кірылы Тураўскага».

Па ініцыятыве членаў праўлення Таварыства на Замкавай гары ў г.п. Тураў быў устаноўлены велічны помнік вялікаму тураўчаніну, праведзены пленэр мясцовых мастакоў і падараваны Тураўскаму музею карціны, што адлюстроўваюць краявіды Тураўшчыны, арганізавана ў Гомелі спе-

цыялізаваная славянская бібліятэка, загадчыцай якой стала зямлячка з Буда-Кашалёўшчыны Таццяна Аляксееўна Бяланава.

Дзейнасць Таварыства Кірылы Тураўскага атрымала благаславенне мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, які заўсёды прымае актыўны ўдзел у мерапрыемствах Таварыства ў Тураве. Уладыка падарыў славянскай бібліятэцы шэраг рэдкіх змястоўных кніг.

Каштоўныя кнігі падарыў і епіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх, які таксама ўдзельнічае ў мерапрыемствах Таварыства.

Творчы ўдзел у рабоце Таварыства прымаюць дырэктар Гомельскага абласнога грамадска-культурнага цэнтра В.Р.Казлоўскі, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь В.А.Іпацьеў, каардынатар Таварыства — М.А.Казакоў, доктар філалагічных навук У.І.Коваль, доктар тэхнічных навук, прафесар П.С.Грунтоў, доктар сацыялагічных навук В.С.Осіпава, адказны сакратар праўлення В.А.Механікава і інш.

Значна пашырыліся міжнародныя сувязі Таварыства. Перш за ўсё трэба адзначыць станоўчыя сувязі з Расійскай акадэміяй навук, Інстытутам славяназнаўства і балканістыкі, супрацоўнікі якога прымаюць удзел у канферэнцыях, іншых мерапрыемствах. Добрыя адносіны скласіся з актывістамі Кіева, Ноўгарада, Навазыбкава і інш. гарадоў Расіі і Украіны.

Буда-Кашалёўскае і іншыя раённыя аддзяленні Таварыства Гомельшчыны, выкарыстоўваючы ідэі Залатавуста аб адзінстве вытокаў культуры славянскіх народаў, разам з актывістамі з Украіны і Расіі пашыраюць дзейнасць па аб'яднанні брацкіх славянскіх народаў.

В.С.Сяліцкі, Г.І.Харошка.

Фальклорна-этнаграфічныя традыцыі Буда-Кашалёўшчыны

На тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна добра прадстаўлены фальклорныя творы розных жанраў. Устойлівасцю захавання адрозніваецца абрадавы фальклор, нягледзячы на тое, што бытуе ён сёння ў асноўным у пасіўнай памяці інфарматараў. У старажытнасці абрады і песні, прымеркаваныя да святаў, мелі аграрна-магічны характар.Звернемся спачатку да характарыстыкі **каляндарна-абрадавай паэзіі** Буда-Кашалёўскага раёна.

Піліпаўка — шасцітыднёвы перадкалядны пост — з'яўлялася своеасаблівым пралогам зімовага цыкла земляробчага календара і вызначалася звычаем прасці кудзелю і спяваць піліпаўскія песні. З вялікай павагай адносіліся да гэтай старажытнай традыцыі жанчыны на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна.

Паводле ўспамінаў Вольгі Адамаўны Парцянковай, 1920 г.н., з в. Дзікава, «на Філіпа гуляліся загавіны. Жонкі з дочкамі канчалі лён і канаплю скубці. А вечарам бацька з сынамі перлі ў чырвоны вугал тканкі (кросны). А навутра ўся сям'я навівала на тканкі пражу, і пры гэтым часалі дзеравянным грэбнем спецыяльным. Захоўвалі яго за іконай».

Прадзенне кудзелі з'яўлялася важнай гаспадарчай работай. Невыпадкова перш чым сесці за кросны, прамаўлялі замову: «Тканкі добры, адзеньце мяне, маіх сыноў, дачок у добра рыззё, добра адзенне» (в. Дзікава). Кросны ў хаце стаялі аж да вясны, «іх берaглі, пыль выцiралі». Каб пазбегнуць няякаснага прадзіва, не сварыліся, «калі тканкі былі ў хаце». З хуткасцю прадзення звязвалі надзеі на добры ўраджай: «Калі хутка буду прасці, тады будзе добры ўраджай, а калі путалася, рвалася нітка, то не будзе» (в. Дзікава).

Піліпаўскія вечары звычайна збіралі ў якой-небудзь адной вялікай хаце шмат жанчын на так званых попрадках, калі можна было адпачыць усім разам ад цяжкай працы, атрымаць душэўную разрадку за прасніцай, выказаць свае думкі і пачуцці ў песнях. Як заўважыла В.А.Парцянкова, «на вячоркі хадзілі ў хату вяліку. І тама і пралі, і гулялі, і ткалі, тута і песні пелі»:

Пойдзем, дзевачкі, у начлежкі,
Люлі, люлі, у начлежкі.
Возьмем, дзевачкі, мычачку,
Напрадзём, дзевачкі, цэвачку,
Аснуём, дзевачкі, субачку,
Пойдзем, дзевачкі, бёрда шукаць,
Усё абышлі, бёрда не нашлі.
Будзем, дзевачкі, у тканкі снаваць,
Будзем, дзевачкі, у тканкі ткаць!

Рэпертуар піліпаўскіх песень прадстаўлены сюжэтамі сямейна-бытавога характару. У цэнтры песень пападрух вобраз маладой жанчыны-праллі, лёс якой нешчаслівы: «мужык дужа ненавісны», «п'е гарэлку, як халодную ваду». Унутраны стан лірычнай гераіні перададзены ў песні «Прала б я кудзелю» пры дапамозе яркіх мастацкіх параўнанняў, адметных эпітэтаў, сэнсава ёмістых дзеясловаў і іх паўтораў.

Сярод матываў піліпаўскіх песень вылучаюцца наступныя: нараканне дачкі на горкую долю і ліхога мужа-п'яніцу, які «ў карчму ідзе — як мак расцвіце. А з карчмы ідзе — як ліст ападзе» (в. Елянец); расчараванне маладой замужніцы-сіраты, якая «выйшла замуж — галовачку ўтапіла, утапіла галовачку ў ваду, папаўся мілы паганага роду» (в. Елянец); сум жанчыны па жыццці ў бацькоўскай хаце, жаданне вярнуцца ў «двор пад гарою», «у вішнёвы сад схадзіць» (в. Елянец); перажыванні дзяўчыны, якую разлучылі з мілым: «Твая маці — чарадзейка, сёстры — разлучніцы» (в. Недайка); асуджэнне сквапнасці брата, які загадвае жонцы: «Прымай, жана, хлеб-соль з стала, ідзе сястра галодная» (в. Недайка); просьба дачкі да бацькі «не аддаваць замуж за каго не хочацца», бо «не за роўным быць — сухата мая, а за любым быць — красата мая», просьба цешчы да зяця не здзекавацца з яе дачкі (в. Кленавіца).

Мастацкія вобразы ў асобных тэкстах жартоўных піліпаўскіх песень ствараюцца пры дапамозе іроніі, гратэску:

Там на рэчцы, рэчцы
Ды на гібкай дошцы
Там дзяўчына бела плацце мыла.
Прыехаў хлапчына:
— Бог помач, дзяўчына,
Бела плацце мыці.
Дзяўчына заспяшыла,
Не кажа: «Спасіба».
Красная дзяўчына,
Напаі майго каня
Сярод сіня мора,
Каб конік напіўся,
Капыт не ўзмачыўся.
— Міленькі малойчык,
Пашый мне шляхорчык
З макавага цвету.
— Красная дзяўчына,
Напрадзі мне нітак
З дажджавыя каплі.
— Міленькі малойчык,
Вытач вераценца,
Вытач вераценца
З камарова сэрца.
(в. Кленавіца)

Тэкст піліпаўскай песні,запісанай у в. Недайка ад М.А.Котавай,1922 г.н., уражвае прыгожым мастацкім паралелізмам:

Ой, зіма, зіма марозная,
Чаго рана становішся?
— А я не рана, а я не позна,
А калі мая пара прыйшла —
Лісточак падзець, травіцу кладзець,
То мая пара прыйшла.
— Чаго, Мар'ечка, чаго, малада
Рана замуж ішла?
— А я не рана, а я не позна.
То мая пара прыйшла.
Мамачка і татачка аддаюць,
Максімка бярэ.
То мая пара прыйшла.

Піліпаўка як з'ява каляндарна-абрадавага фальклору выяўляе цесную сувязь з сямейна-абрадавай паэзіяй. Як адзначылі інфарматары з в. Дзікава, на святочную вячэру абавязкова запрашалі «бабку — вясельную пупарэзніцу»,«па восені ўсе вяселлі яна запраўляла, дык і на Філіпаўку яна далжна была быці». Зімовая гульня шлюбнай тэматыкі «Яшчур» («Яшчыр») добра захавалася ў памяці старажылаў. У в. Дзікава на попрадках хлопцы і дзяўчаты «сярод хаты стаўлялі бочку, і вядушчы хлопец станавіўся на яе, а дзеўкі ў круг станавіліся вакруг «Яшчыра».

Дзяўчаты выконвалі песню, адрасаваную «Яшчыру», які знаходзіўся ў цэнтры карагода:

Сядзі, сядзі, Яшчыр,
На залатым крэслі,
Вазьмі сабе панну,
Каторую любіш.

Калі «Яшчуру» падабалася якая-небудзь дзяўчына з карагода, то ён спяваў:

Ой, люблю Марыську,
Што з русай касіцай,
У чырвонай спадніцы,
З шоўкавым паясочкам,
У кветачак вяночку.

Дзяўчына падыходзіла да яго і «завязвала Яшчыру на шыю ленту з касы». Ёсць падставы бачыць у гэтай гульні не толькі

прыгожую забаву моладзі, але і водгаласы тых рытуальных дзеянняў, што генетычна звязваюцца з вясельнай абраднасцю.

Калядна-навагодні комплекс на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна вызначаецца такімі традыцыйнымі структурнымі элементамі, як абходныя калядныя шэсці з «казой» і «мядзведзем», рытуал заклінання марозу, калядная варажба, хаджэнне з маскамі і пераапрананнем, выкананне калядных і шчадроўных песень. У г.п. Уваравічы менавіта напярэдадні Новага года хадзілі калядоўшчыкі з «мядзведзем». Паводле ўспамінаў Аляксандры Канстанцінаўны Кругляковай,1910 г.н., «мядзведзя рабілі з дрэва, бралі калоду, знутры ўсё выдзёўбывалі, дзелалі вочы, рот. Дрэва абклейвалі воўнай, дзелалі касматую галаву і рабілі касматую лапу, якой мядзведзь збіраў пачастункі. Перад тым як увайсці ў хату, пыталі ў гаспадароў дазволу: «Добры вечар, хазяева, разрашыце нашаму мядзведзю ў вашай хаце прагуляцца. З праздпічкам вас, з святым Раждзяствам! (уводзяць мядзведзя)».

Дыялог паміж персанажамі адной з інтэрмедый батлеечнага прадстаўлення нагадала далей А.К.Круглякова:

Салдат у хату мядзведзя ўводзе,
Праз парог яго праводзя.
— Ты, мядзведзюшка, заходзь!
Салдат шапку здзяёт,
Мядзведзь хазяіну кланяецца.
Тут дзевушка хату адкрывае і з салдатам размаўляе:
— Каляда, каляда, поўна дзенег карманы набіта.
А салдат дзеўкі атвячае:
— Брэшыш, дзеўка, не ўзнала,толькі крэмень ды крысала.

Прыведзены прыклад сведчыць аб тым, што на Каляды хадзілі таксама і батлеечнікі. Тэзіс аб арганічнай спалучанасці язычніцкага святкавання Каляд і хрысціянскага рытуалу Нараджэння Хрыстова пацвердзілі інфарматары: «Увесь вечар шчадроўшчыкі славілі Ісуса Хрыста, расказывалі ўсякія гісторыі аб яго нараджэнні» (г.п. Уваравічы, ад А.К.Кругляковай).

Рэпертуар рэлігійна-містэрыяльнага тэатра батлейкі складаўся з трох частак: сцэн і песень рэлігійнага зместу, драмы «Цар Ірад» і народных інтэрмедыйных сцэн.

Цікавасць уяўляюць асобныя эпізоды містэрыяльнай драмы «Цар Ірад», якая мела біблейскую аснову і была звязана з Калядамі:

— Нынешні высокі таржэственны дзень. Кагдата было паняціе «хресцьянское». А ты, друг, чего стоіш, о рождестве Хрістовом нічего не гаваріш?

— Я тагда не выдавал, когда царь Ірод стребіць его желал.

— А что б оні ему сатварілі, кагда б его в рукі славілі?

— Оні хацелі его убіць, чтобы земного царства не погубіць.

— Друг мой! Ізволь мне сейчас сказаць, сколько тысяч младзенцев страбілі?

— 14 тысяч младзенцев страбілі, но Ісуса Хріста не погубілі. Як сталі в лес волхов пасылаць, чтоб Ісуса Хріста разыскаць. Волхі в горад явіліся, Ісусу Хрісту пакланіліся. Что на нынешней недзелі была радасць во Хлееме, эта чуда немала, дзе земля лікавала, нада чуда расказаць, многа лета паздраўляць.

(г.п. Уваравічы, ад А.К.Кругляковай).

Абрад шчадравання, які адбываўся вечарам напярэдадні Новага года, у вёсках Буда-Кашалёўскага раёна меў назву «хадзіць па цыганах», калі збіраўся гурт моладзі і выконваў песні, заходзячы ў кожную хату, як напрыклад:

На даліне снег упаў,
Там мой мілы з каня ўпаў.
Як упаў, так і ляжыць,
Пакуль мілка прыбяжыць.
А мілка прыбягала,
За ручаньку падзяржала:
— Устань, мілы, не ляжы,
Сядлуй каня да бяжы
Да Марусенькі-душы.
— Марусенька-душа,
Твая маць хараша.
На дварэ мароз —
Стаяці не можна.
Стаіць карваць нова, цясова,
Ножкі точоныя, пазалочаныя.
(в. Елянец)

Як паведаміла М.І.Каленчукова,1943 г.н., з в. Елянец, «як праспяваюць песню, цыганы сыпалі жыта па хаце, гаспадыня давала ім пачастункі і запрашала прыходзіць на наступны год».

Сярод велічальна-віншавальных калядна-шчадроўных песень вылучаюцца калядкі і шчадроўкі, адрасаваныя дачцэ і сыну гаспадара. У цэнтры іх — ідэалізацыя якасцей характару маладых людзей, адлюстраванне іх імкнення стварыць шчаслівую сям'ю.

Сімвалічныя атрыбуты вяселля («залаты пярснёк», «шаўковы платок», «трубка сукна», «бочка віна», «вянок»), якія сустракаюцца ў калядных песнях, — сведчанне першаступеннай важнасці ў народным календары ідэі прадаўжэння роду, захаванасці жыцця.

Звернемся да тэкстаў калядных песень, адрасаваных моладзі, і адзначым прысутнасць у іх кампазіцыі прынцыпу траістасці:

Пава лятала, пер'е раняла,
Маладая Людачка пер'е збірала.
Святы вечар, святы вечар!
У рукавок клала,
З рукаўка брала, вяночак віла.
Святы вечар, святы вечар!
Савіўшы вянок,
Пайшла ў танок.
Святы вечар, святы вечар!
У тым таночку трох палюбіла.
Святы вечар, святы вечар!
Трох спалюбіла, усіх падарыла.
Святы вечар, святы вечар!
Першаму дала шаўковы платок.
Святы вечар, святы вечар!
Другому дала залаты пярснёк.
Святы вечар, святы вечар!
А за трэцяга дый сама пайшла.
Святы вечар, святы вечар!
(в. Рагінь)

Ой, рана, рана куры папелі
Святы вечар![1]
А раней таго Колечка ўстаў.
Святы вечар!
Тры свячы ссукаў.
Святы вечар!
Ды ўсе свечы папаліў.
Святы вечар!
Першую спаліў, па сенях ходзячы.
Святы вечар!
Другую спаліў, званком звонячы.
Святы вечар!
Трэцяю спаліў, брацця ў будзячы.
Святы вечар!
— Уставайце, браццы, коніка сідлаць.
Святы вечар!
Коніка сідлаць ды з двара з'їзжаць.
Святы вечар!
Ой, ты, конь, мой конь златагрывенькі.
Святы вечар!
Не прадам цябе, не за 100, не за 1000.
Святы вечар!
А прадам цябе за трубку сукна.
Святы вечар!
За трубку сукна, за бочку віна.
Святы вечар!
А з трубкі сукна світу пашыю.
Святы вечар!
А за бочку віна жаніцца буду.
Святы вечар!
(в. Рагінь)

Адрозніваюцца ад гаспадарскіх і маладзёжных калядак і шчадровак па стылі і мелодыі калядныя песні хрысціянізаванага характару. Варта адзначыць, што ў гэтых творах адлюстраваліся старажытныя язычніцкія ўяўленні земляроба (бог і апосталы паводзяць сябе, як людзі):

— Святыя вечары,
Дзе ў Бога былі?
Святы вечар![2]
Дзе ў Бога былі?
— Цэркву рабілі.
Святы вечар!
З трамі вокнамі,
З двамі дзвярамі.
Святы вечар!
У перша вакенца
Месяц засіяў.
Святы вечар!
У друго вакенца
Сонейка ўзышло.
Святы вечар!
У трэцяе вакенца
Голуб уляцеў.
Святы вечар!
Голуб уляцеў,
Слёзачку ўраніў.
Святы вечар!
З тыя слёзачкі
Плылі рэчачкі.
Святы вечар!
Што ў той рэчачцы
Сам Гасподзь купаўсь.
Святы вечар!
Сам Гасподзь купаўсь,
У рызы адзяваўсь.
Святы вечар!
У рызы адзяваўсь
З Ісусам Хрыстом!
Святы вечар!
З Ісусам Хрыстом
З святым Ражаством.
Святы вечар!
(в. *Іванаўка*)

[1] Рэфрэн паўтараецца пасля кожнага радка.

[2] Рэфрэн паўтараецца пасля кожных двух радкоў.

З найбольшай цеплынёй, гарэзлівым агеньчыкам у вачах і пяшчотай узгадвалі жыхары Буда-Кашалёўшчыны зімовую варажбу, звязаную з іх успамінамі аб маладосці, каханні, выбары шлюбнай пары. Напрыклад, каб даведацца, ці выйдзе дзяўчына ў гэтым годзе замуж, варажылі з дзяжой: «Ставілі яе пасрэдзі хаты, станавіліся ліцом к парогу, павярнуўшыся да дзяжы спіной, па чарзе ішлі да яе. Еслі дзяўчына садзілася на дзяжу, значыць, будзе вяселле» (г.п. Уваравічы).

Каб вызначыць характар суджанага, дзяўчаты раней у в. Жытанежжа, паводле ўспамінаў Марыі Мікалаеўны Крастоўскай, 1918 г.н.,

«ішлі к калодзежу, кідалі туды астаткі куцці і слухалі шум. Калі ціха — муж будзе ціхі характерам, а калі гулкі выплеск, то ліхі будзе мужык, гора не абярэшся». Як адзначыла далей інфарматар, дзяўчат хвалявала і пытанне заможнасці і дастатку ў сямейным жыцці, з гэтай нагоды «дзеўка надзявала пустую міску з-пад куцці на галаву і ішла к бані. Сунула руку ў вакно і шчупала вакруг. Калі гладкая — мужык бедны, як верабей падстрэшны. А вось калі кашлатае — ого, багаты будзе! Будзеш жыць, як свіння. І есці прынясуць, і на свята спіну пашкрабаюць!»

Варажылі аб сваім лёсе не толькі дзяўчаты, але і хлопцы, пра цікавую варажбу якіх і паведаміў Васіль Мікалаевіч Цыкуноў, 1921 г.н., з в. Недайка:

«Гэта толькі хлопцы варажылі, і то ўжо пажанатыя. Увечары плавілі воск і ждалі, пакуля ён трохі застыне, трохі мяккі будзе, каб рукамі жамкаць яго. Тады кожны хлопец ляпіў 2 лебедзя, аднаго — большага, другога — меншага. На меншага на шыю вешалі абручальны пярсцёнак, што абазначала дзеўку. Потым налівалі ў чашку вады, ставілі лебядзей туды, глядзелі, як яны плаваюць. Тады чашку накрывалі платком. І кожны хлопец нёс чашку з обшчай хаты ў сваю. І не глядзелі туды. Чашку ставіў хлопец пад краваць. І спаць лажыліся. А ў чашку не глядзелі, вутрам глядзелі. Калі лебедзі плаваюць радам, то і пажанаты хлопец будзе добра жыць са сваёй жонкай, а калі па розныя стораны, то ўжо трэба было думаць, як з хаты ўцякаць, бо жонка з'есць беднага».

Прыведзеныя ўзоры народнай варажбы добра адлюстроўваюць адзін з магічных элементаў міфалагічнай свядомасці чалавека. Дзякуючы варажбе, можна зразумець, наколькі паэтычным, фантастычна-багатым, эмацыянальна-вобразным было спасціжэнне чалавекам свету, якой тонкай далікатнасцю і філасофскай мудрасцю адрозніваліся народныя погляды на пытанні аб выбары шлюбнай пары і стварэнні сям'і.

Веснавы цыкл земляробчага календара прадстаўлены ў Буда-Кашалёўскім раёне такімі абрадамі і святамі, як гуканне вясны, Саракі, Юр'я, Вялікдзень, Тройца, абрадамі праводзін русалкі і пахавання стралы.

Гукаць вясну пачыналі на другі дзень пасля Вялікадня, вадзілі карагоды, гушкаліся на арэлях, гулялі ў гульні, выконвалі песні:

Вясна красна, што вынесла?
Дзеўкам — росту, хлопцам — каросту.
Ой, вясна, вясна, вясенечка,
Дзе твая дачка Марфенечка?
Мая дачка сядзіць у садочку,
Шые сарочку свайму сыночку Васілёчку.
(в. Рагінь)

Асноўныя матывы вяснянак не абмяжоўваліся аграрна-гаспадарчай накіраванасцю. Як адзначыла П.І.Верабʼёва, 1925 г.н., з в. Рагінь, «дзяўчатамі маладымі былі, таму і песні нашы былі аб любові, аб жыцці і замужастве»:

Весеначка, не трапятайся,
Ты горкая
У-у-у!
А мне, маладзе,
Гарчэй цябе.
У-у-у!
Гарчэй цябе, а той нелюбы
Штодзень пабʼе
У-у-у!
Ратуй мяне, свёкарка,
Папка.
У-у-у!
Не ратуе, бліжэй нагайку
Падкідвае.
У-у-у!
— Бі, сыночак, нагайкаю,
Штоб была шэльма хазяйкаю.
У-у-у!
(в. Рагінь)

У в. Патапаўка вясну гукалі 7 красавіка на Дабравешчанне (Благавешчанне):

— Вясна, вясна-вясняначка,
Дзе твая дачка-паненачка?
— Мая дачка ў садочку,
Шые міламу сарочку.

Адметнасцю мясцовай традыцыі гукан-

ня вясны з'яўляецца выкананне наступнай вясенняй песні:

Сягодні ў нас Благавешчанне,
Ой-лі, ой, люлі, Благавешчань...
Нашым дзевачкам перамешчання,
Ой-лі, ой, люлі, перамешчань...
Жытансжскія дзевачкі, перайдзіце к нам,
Ой-лі, ой, люлі, перайдзіце...
А ў нас хлопчыкі дзешавы тавар,
Ой-лі, ой, люлі, дзешавы тав...
За Іваначку куль саломы,
Ой-лі, ой, люлі, куль сало...
За Віцячку мех паловы,
Ой-лі, ой, люлі, мех пало...
Савіла вянок да й пашла ў танок,
Ой-лі, ой, люлі, у тан...
Што і ў тым танку троіх ізлюбіла,
Ой-лі, ой, люлі, троіх ізлюбіл...
Троіх ізлюбіла, усех надзяліла,
Ой-лі, ой, люлі, усех надзялі...
Ой,Сярожку руцьвяны вянок,
Ой-лі, ой, люлі, руцьвяны вян...
А Васячку золат персцянёк,
Ой-лі, ой, люлі, золат персцян...
За Міцячку да й сама пайду,
Ой-лі, ой, люлі, да й сама пайд...
(в. Іванаўка)

Шлюбную скіраванасць мае тэкст вяснянкі, якую выконвалі ў в. Буда-Люшаў:

Пусці, маменька, на ручай гуляць,
На ручай гуляць, селязнёў ганяць.
То не селязні ўсе касатыя,
Два малодчыкі не жанатыя.
Яны ішлі, ішлі, станавіліся,
За адну дзевачку пасварыліся.
Вы не біцеся, не сварыцеся,
Па-харошаму разыдзіцеся
Астануся я аднаму каму,
Ванььку браваму, кучараваму.

Цікавай мясцовай фальклорнай традыцыяй з'яўляецца і такая з'ява, што абрад гукання вясны ў в. ІволЬск быў вядомы пад назвай Мікольшчына і адзначаўся на Дабравешчанне. Паводле ўспамінаў Соф'і Макараўны Ваўчковай, 1929 г.н., «дзеўкі сабіраліся разам, ішлі на высокае месца за вёску і пелі загукальныя песні. А калі сабіралася ўся моладзь вёскі, то яны ішлі па ўсёй вёсцы і абыходзілі ўсе двары. Возлі кожнага двара яны вадзілі карагоды і жадалі гаспадарам дабрабыту і добрага ўраджаю. Гаспадары звалі загукальнікаў у хату і запрашалі за стол, у народзе гаварылі: «На Мікольшчыну заві друга, заві ворага — за сталом усе будуць сябрамі».

Пачаставаўшыся пірагамі і півам (галоўныя стравы па Мікольшчыну), загукальнікі выконвалі песню «Ой, хаджу я, хаджу»:

Ой, хаджу я, хаджу
Па вішнёвым саду.
Аддалі мяне замуж
На чужую старану.
На чужую старану,
Да ў вялікую сям'ю,
А вялікая сям'я
Шчэ й вячэраць пасела
А мяне, маладу,
Пасылаюць па ваду.
Я па ваду пайшла,
Крынічэнькі не знайшла.
Як крынічку знайшла,
Зачарпнула паўвядра,
А дадому ішла —
Ды слязамі даліла.
Прынесла да дзвярэй,
Сама стала ў сенях.
Ды паслухаю я,
Што гаворыць сям'я.
А вяліка сям'я
Навучае мужыка,
Чаму жонкі не б'еш,
Чаму волю ёй даеш.
А за што ж яе біць,
Яна ўмее ўсё рабіць:
І тапіць, і варыць,
І са мною гаварыць,
І чытаць, і пісаць,
І па садзіку гуляць.

Загукальнікі на Мікольшчыну расказваюць займальныя гумарэскі, легенды, узгадваюць павер'і, спяваюць песні «Людзі кажуць», «Ой, дубе, мой дубе», «А за нівамі».

Павесяліўшыся, патанцаваўшы, загукальнікі развітваюцца з гаспадарамі:

Павесяліліся мы ўволю.
Каб даў Бог усім харошую долю,
Шчасця, здароўя ўсім жадаем,
А самі дадому ад'язджаем.

Выконваюць таксама песню «Каціласъ, каціласъ», танцуюць полечку і па чарзе выходзяць з хаты:

Каціласъ, каціласъ
Калода з печы
Ды ўдарыла, ударыла
Мілага ў плечы.

Мілы раззлаваўся,
Ледзь не пабіўся.
Мяне з хаты выгнаў, выгнаў,
А сам закрыўся.
Дзякуй табе, міла,
Што мяне біла.
Што ты мяне біла, біла
Ды не любіла,
Я не буду біці,
Буду любіці.
Пусці мяне ў хату, у хату,
Будзем з табой жыці.

Прывядзём запісаныя ў в. Івольск прыклады гумарэскі і легенды, месца якіх у структуры мясцовай традыцыі гукання вясны было не выпадковым: народны маральна-этычны кодэкс патрабаваў працавітасці і руплівасці, паважлівых адносін адзін да аднаго.

ГУМАРЭСКА «КУМАЧКІ»

Адна дзяўчына была маладая ды няўдалая. Яна не ўмела работаць, а толькі любіла спаць. Кагда ў яе нарадзілася пяць дзетак, яна выбірала на кожнага новую куму. А для чаго, яна казала так: «Узяла я першую куму. Прынесла 10 яіц. Ну, што таго дзесятка. Раз селі за стол і няма. Не спадабалася мне такая кума. Я яе адправіла.

Узяла другую куму. Тая прынесла бліноў. Тоўстых жытніх. А тыя аж чорныя. Нашто мне такая кума. Я гэту куму адправіла. Трэцяя кума прынесла міску заціркі. Селі мае дзеткі, ложкамі пасёрбалі і няма. І гэта кума мне не спадабалася. Нашто мне такая кума.

Чацвёртая кума прынесла пампушак, ды і тыя ў малако памочаныя. Я не вытрымала ды ёй кажу: «Кумачка мая! Няўжо ж ты не магла іх у смятанку памачыць. У цябе ўсё ж такі двое коней і трое кароў». А кума мне гаворыць, што сваю сям'ю пасадзіла, пампушкі паставіла, смятанай паліла, чуць паспела гэтыя схаваць. І гэтая кума мне нашто.

Ну, а ўжо пятая кума і несла, і везла мне, і ў руках, і на плячах. Цэлы месяц мы са сваёй сям'ёй елі ды куму хвалілі.

Ну, што ж далей: надышло жніво. Прыходзіць да мяне кума ды просіць дапамагчы ёй пшаніцу жаць. Ох, не спадабалася мне яе слухаць. Не хацелася мне ісці работаць, бо я ж нікагда не рабіла, таму што добра мужыку гадзіла. Ён за мяне ўсё сам дзелаў. Нельга куме адказаць. Начала я збірацца. Доўга збіралася. Чуць к абеду прыйшла я к куме на паласу. А кума і рада, што памочніца хоць к абеду прыйшла. Стала я пшаніцу жаць. А сонца ўсё вышэй падымаецца, усё сільней пячэ. А каласкі мае белыя ручкі коль да коль. Кінула я сярпок ды сама лягла пад снапок. Ляжу, чакаю, калі кума мяне пазаве есці і яшчэ налье чарку. Доўга я ляжала, не дачакалася і пайшла дамоў.

Во, якая кума!

Ну, што ж, мае людцы, прыйшла зіма, няма чаго есці маім дзецям. Узяла я місачку, дай, думаю, пайду к куме, можа, пашкадуе, не дасць яна мне і маім дзеткам з голаду памерці. Прыйшла я ў хату, паздаравалася. Не буду брахаць, кума мая ветліва мяне сустрэла. За місачку ды і пайшла ў клеці за мукой. Ды скора вяртаецца і пустую міску падае і кажа: «Кумачка, хацела я браць муку ды штосьці кальнула мяне ў руку». Зразумела я адразу, што кума мая намякнула. Рассярдзілася я ды кажу: «Кумачка, каб цябе ўдавіла, як ты мяне і маіх дзетак не пакарміла». А кума адказвае: «А каб цябе разарвала, ты мне жаць не памагала».

ЛЕГЕНДА

На Мікольшчыну існуе такое павер'е, што Мікола на гару два разы ходзіць. Людзі гавораць, што аднойчы восенню застраў мужык з возам у гразі. Міма шоў Касьян-угоднік. Мужык пачаў яго прасіць, каб памог. Не памог Касьян, сказаў, што няма калі і пайшоў сваёй дарогай. Крыху пазней па той дарозе Мікола-ўгоднік ішоў. Мужык пачаў яго прасіць. Мікола памог мужыку воз выцягнуць. Вось прыйшлі Касьян-угоднік і Мікола-ўгоднік к Богу ў рай. Стаў Бог у іх пытацца, дзе былі. Касьян расказаў, што на зямлі быў, ішоў міма мужыка з возам, той дапамогі прасіў, а я не стаў мараць райскага плацця.

«Ну, а ты дзе так вымазаўся?» — спрашывае Бог у Міколы.

«А я быў на зямлі, ішоў па той жа дарозе і памог мужыку воз выцягнуць», — адказаў Мікола.

І сказаў тады Бог: «Паслухай, Касьма! Не памог ты мужыку воз выцягнуць. За гэта цябе будуць цераз тры гады ўспамінаць. А цябе, Мікола-ўгоднік, за тое, што памог мужыку, два разы ў год будуць празднаваць».

Юраўскія абрады і песні добра захаваліся і на Буда-Кашалёўшчыне. У в. Патапаўка выганялі жывёлу на пашу вярбінкай, прамаўляючы замову: «Добры дзень таму, хто ў етым хляву. У етым хляву дуб кашлаты — дзед барадаты. Святы Ягоры па хляву меднай пугай шчагае, усю нішчату з гэтага хлева выганяе». Шчыра верылі вяскоўцы ў магчымасць з дапамогай магічных слоў і дзеянняў прадухіліць бяду, выратаваць жывёлу, паспрыяць тым самым дастатку ў гаспадарцы: «На Юр'я клала гаспадыня тапор на зямлю каля варотаў (на двары) ды прыгаварывала: «Як гэтае жалеза ляжыць, хай так і скаціна з поля не сходзіць» (в. Патапаўка). У в. Рагінь, як

пацвердзілі інфарматары, «на Юр'я хадзілі валачобнікі, асабліва дзяўчаты, а з імі музыка-скрыпач. Дзяўчаты спяваюць, прыбіраюцца ў кветкі і ішлі па ўсю ноч, каб усе двары абысці. Не дай, Гасподзь, мінуць чыю хату». Атрымаўшы ад гаспадароў дазвол «развесяліць хату», спявалі:

Дай, Божа, каб гэты год праваджалі,
Другога года сустракалі,
Дачакалі ў радасці і ўраджаі.

Іншы раз пажаданне, адрасаванае гаспадарам, было жартаўліва-іранічным:

Маладая маладзіца, малодка,
Каб цябе ігла вукалола,
Каб цябе паднімалі падводаю.

Існаваў у в. Рагінь і такі цікавы звычай на Юр'я, як віншаванне хлопцамі і дзяўчатамі замужніц, якія частавалі іх сырам: «Дасі сыра — народзіш сына». Асноўныя матывы юраўскіх песень: адмыканне зямлі і выпусканне расы, заклінанне ўраджайнасці, услаўленне шлюбу:

Юр'я, устань рана,
Юр'я, мыйся бела,
Юр'я, ідзі ў стайню,
Юр'я, сядлай коней,
Юр'я, едзь у поле,
Юр'я, пусці расу,
Юр'я, цёпленькую, Юр'я, беленькую.
(в. Рагінь)

— Юр'я, падай ключы!
— Мамка, каторыя?
— Сынку, земляныя,
Зямельку адмыкаці,
Траўку выпускаці,
Траўка для каровак.
(в. Дзербічы)

Юр'я, Юр'я па полі ходзіць,
Юр'я, Юр'я ды Бога просіць:
«Зарадзі, Божа, жыта
Ды на новае лета.
Юр'я — юр'ева,
Коласам каласіста,
На ядро ядраніста,
Юр'я — юр'ева,
На таку — умалотам,
На млыне — прымолам,
Юр'я — юр'ева».
(в. Дзербічы)

Трывалымі ў вясковым побыце жыхароў Буда-Кашалёўшчыны з'яўляюцца траецкія (сёмушныя) абрады і песні. Тройцу адзначалі на пяцідзесяты дзень пасля Вялікадня. У г.п. Уваравічы маладыя дзяўчаты ішлі ў лес і завівалі вянкі з галінак бяроз, а праз тыдзень іх развівалі. З гэтымі дзеяннямі была звязана іх варажба аб будучым, аб шлюбе, аб лёсе. «Вянкі кідалі ў ваду і глядзелі: калі ўтопе вянок, значыць, тую маладзіцу ждзе гора ці непрыятнасць, а калі паплыве — то тая дзеўка пойдзе замуж» (г.п. Уваравічы).

Перапляценне шлюбных і аграрна-гаспадарчых матываў мае месца ў тэксце наступнай траецкай песні:

Мы, дзеўкі-дзевачкі,
Пойдзем на лужочкі.
Мы заўём вяночкі
Да на ўсе святочкі,
Да на самыя святыя,
Да на ўсе Духавыя.
Пойдзем, дзевачкі,
На лугі завіваць вяночкі
На годы доўгія,
На жыта густое,
На ячмень каласісты,
На авёс расісты.

Быў вядомы ў вёсках Буда-Кашалёўскага раёна і звычай упрыгожваць хату і падвор'е зелянінай, якая, на думку мясцовых жыхароў, была заклікана ахоўваць пасевы, садзейнічаць росту жыта, пшаніцы, агародніны.

На Тройцу ў в. Буда-Люшаў «свячу пераношвалі, год яна стаіць у адной хаце, на другі год пераносяць у другую».

Траецкую зеляніну не выкідвалі, а высушвалі і выкарыстоўвалі ў лекавых мэтах: «купалі ў гэтых галючках дзяцей ад розных хвароб» (в. Буда-Люшаў), «спальвалі на купальскім кастры» (г.п. Уваравічы), «асінавыя веткі станавілі на варотах, потым забівалі іх пад дзвярыма хлява, каб карова праходзіла цераз іх і ногі не балелі» (г.п. Уваравічы).

Траецкі абрад кумлення ў в. Рагінь адбываўся, калі «ўвечары хадзілі адзін да аднаго, як падаілі кароў, з бутылкай і закускай. Калі добра вып'ем, закусім, тады цалуемся»

Сямейна-бытавыя матывы гучаць у песні «Тройца, Тройца, святая Багародзіца»:

Тройца, Тройца, святая Багародзіца,
Пасею лёна, нехай зародзіцца.
Што харошы лён, то для маманькі маёй,

А што найхарошы, то для мяне, маладой.
А што з чарыўкаю, то для свякроўкі злой,
Бо свякроўка не родна маці,
Будзе хадзіць ды чарыўку вырываць.
(г.п.Уваравічы)

Як адзначылі інфарматары з в. Рагінь, «на Тройцу добра сеяць гуркі. Загадзя трэба зрабіць радочкі, хаця б два-тры. Як прыйдуць госці, пасадзіўшы іх за накрыты стол, трэба хуценька бегчы і пасадзіць гуркі. Вельмі добрыя тады будуць».

Трэба адзначыць, што фальклорныя традыцыі Буда-Кашалёўшчыны ўзбагаціліся ў сувязі з тым, што прыехала шмат перасяленцаў з іншых мясцін Гомельшчыны.

Сваю новую малую радзіму ў в. Старая Буда знайшлі Кацярына Рыгораўна Скачок (1936 г.н.) і Паўліна Піліпаўна Лабянок (1929 г.н.) з в. Міхалёўка Брагінскага раёна. Яны і прывезлі з сабой цікавы русальны абрад, удзельнікамі якога былі і старыя, і маладыя, прыбраныя ў вянкі з асінавых галінак. Звычайна русалак праводзілі ў панядзелак пасля Тройцы да могілак, выконваючы песні:

Правяду русалку ў чысты бор,
А сама вярнуся к татку ў двор.
Я русалку правяду,
Да й асінаю заламлю,
Штоб яны да нас не хадзілі,
Дай нашых сабак не дражнілі,
І нашых дзяўчат не пужалі.

* * *

Сядзела русалка на белай бярозе.
Ой, рана-рана, на белай бярозе.
Русалка ўстала, дзяцей напугала.
Дзеткі, не пужайцесь да ў лес не хавайцесь.
Ой, рана-рана, у лес не хавайцесь.
Да скажыце праўду,
Хто мяне любіць.
Ой, хто мяне любіць,
Чаравічкі купіць.
Ой, рана-рана, чаравічкі купіць.

Адметнасцю веснавой каляндарна-абрадавай паэзіі на Гомельшчыне з'яўлясцца абрад пахавання стралы, асобныя элементы якога захаваліся ў вёсках Буда-Кашалёўскага раёна. Напрыклад, у в. Патапаўка на Ушэсце «дзеўкі, хлопцы хадзілі з гармонямі і песнямі на мяжу жыта, па вуліцы вадзілі карагоды, выконваючы песню «Я па вуліцы карагод ваджу».

Я па вуліцы карагод ваджу,
Я ў цябе, мой татачка, халасты хаджу,
Халастуценькі, нежанаценькі.
Халастуценькі, нежанаценькі.
— Жанісь, сыночку,
Жанісь, родненькі.
Ой, лі, ой, люлі, жанісь, родненькі!
Ты бяры сабе доч папоўскую,
Ой, лі, ой, люлі, доч папоўскую.
— Доч папоўская — не мая жана,
Ой, лі, ой, люлі, не мая жана.
Не мая жана, не твая слуга,
Ой, лі, ой, люлі, не твая слуга!
Дык бяры сабе доч хрысцьянскую,
Доч хрысцьянскую.
Доч хрысцьянская — то мая жана,
Ой, лі, ой, люлі, ды твая слуга!

Адным з маляўнічых карагодаў, якія былі прымеркаваны да абраду пахавання стралы, з'яўляецца »Драма». Паводле ўспамінаў Гарпіны Мануйлаўны Сачыўкінай, «гэты карагод водзяць на Дабравешчанне, пасярод круга людзей ставяць прасніцу з кудзеляю, садзяць жанчыну, кругом пяюць, водзяць танок»:

Драма дрэмле над кудзеляю,
Драма дрэмле над шаўковаю.
Устань, драма, свёкар едзе.
Свёкар едзе, журбу вязе.
— Я не ўстану, не пагляджу.
Яны праўды не сказалі.
Цяпер людзі ўсе лукавы.
Яны праўды не сказалі,
Маё гора вывядалі...

Жанчына адмаўляецца ўстаць не толькі тады, калі свёкар едзе, але і свякруха, бацька, маці; калі ж гучыць паведамленне, што мілы едзе, то падхопліваецца і пачынае месці хату. У в. Недайка выконвацца наступная песня стралы баладнага характару:

Я пушчу стралу па ўсім сялу,
Да й удоўж сяла ў канец вуліцы.
Як уб'е страла добра моладца,
Па том моладцу некаму плакаці:
Матка старэнька, сястра маленька,
Деткі дробныя да й усе роўныя,
Жана малада кола горада.
Дзе матка плача — там рэчка цячэ,
Дзе сястра плача — там калодзезі,
Дзе деткі плачуць — ручайкі бягуць,
Дзе жана плача — там расы няма.
А матка плача — да смерці,
Сястра плача — да замужжа,

Дзеці плачуць — да выросту,
А жана плача — да абеду.
Пасля абеду ў танок пайшла,
У танок пайшла, сямёх палюбіла,
Сямёх палюбіла, усіх надарыла.
Аднаму — платочак шаўковы,
Другому — залаты персцень,
Трэцяму — стужачку з касы,
Чацвёртаму — калечка тонкае,
Пятаму — пацалункі гарачыя,
Шостаму — пасцельку пухаву,
А за сёмага ды й сама пайшла.

Трагічныя матывы ў прыведзенай песні народжаны сітуацыяй забойства стралой «добра моладца». У в. Патапаўка запісаны тэкст карагоднай песні стралы з любоўным сюжэтам:

На Чачоры, на рацэ, шэры гусі сядзелі.
Шэры гусі сядзелі, светлу воду муцілі*.
Прыйшла дзеўка воду браць і з малойцам размаўляць.
Размахнула рукаўцом, зачарпнула ведзярцом.
— Ты не поп, ты не дзяк, не цалуй мяне так.
Пацалуе мяне так чарнаморацкі казак.
Чарнаморац ідзе, ажно вуліца гудзе.
Як пачула галасы, расчасала валасы.
Дзверы выстучыла, к хлопцу выскачыла.

Аграрна-магічны абрад ваджэння стралы, як растлумачылі інфарматары, «рабіўся дзеля таго, каб засцерагчыся ад Перуна, а з цягам часу стаў як бы ўспамінаннем аб памерлых родзічах і блізкіх людзях» (в. Івольск).

Летні цыкл земляробчага календара прадстаўлены на Буда-Кашалёўшчыне купальскай і жніўнай абраднасцю і песнямі. Як паведаміла Ніна Ягораўна Татарынава, 1917 г.н., з в. Ціхінічы,

«на Купалле хараводы вадзілі, выбіралі Купалку, прыгалі чэраз касцёр, варажылі на вінках. На вінок лажылі накрыст дзве палачкі, пасіродкі прыдзелавалі запаленую свечку, пускалі вінок на ваду і гаварылі:

Плыві, мой вінок,
То ўніз, то ўгору,
К свікровінаму дому.

Калі вінок круціцца — быць у старых дзевах, еслі паплыве — замуж пойдзе, еслі стаіць на месце — замуж пака не пойдзе».

Бытаваў у Буда-Кашалёўскім раёне і купальскі звычай, які быў вядомы на Барысаўшчыне і апісаны Адамам Багдановічам у працы «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов» (Гродна, 1895).

Як паведамілі інфарматары з в. Ціхінічы і г.п. Уваравічы, «на Купалле дзяўчаты ў вянках з кветак станавіліся ўперамешку з хлопцамі, дзелаючы харавод, потым з харавода выхадзіла засватаная дзэўка (тая, што заранее запасалася ручніком ці куском палатна) і выбірала сабе хлопца, закрыўшы ліцо чубром (пакрывалам з палатна). Хлопец снімаў з яе пакрывала і завязываў сабе чэраз плячо, а дзеўку звалі Купалкай»:

Ішла Купала сялом, сялом,
Закрыўшы вочы пяром, пяром.
На Івана Купалу.
Закрыўшы вочы пяром, пяром,
Пытала хлопцаў чалом, чалом,
На Івана Купалу.
Пытала хлопцаў чалом, чалом,
Свяціла ночы агнём, агнём,
Пляла вяночкі шаўком, шаўком,
Слыла Купалка цяплом, дабром,
Славу Купалу пяём, пяём».

Купальскае свята тоіць у сабе шмат міфалагічных уяўленняў і веранняў, якія пацвярджаюць, наколькі цікавым і ўзнёсла-паэтычным было асэнсаванне свету нашымі продкамі. У якасці доказу прывядзём тэкст легенды, звязанай з пошукамі ў купальскую ноч кветкі-папараці і запісанай у в. Жытанежжа ад Марыі Мікалаеўны Крастоўскай (1918 г.н.):

«...Кажуць, што на Купалле папарацень-кветка цвіце. І хто найдзе яе, той усю жызнь шчаслівым будзе і будзе разумець язык раслін, птушак, звярэй, і ніхто яго зглазіць не зможа.

Дык аднойчы адзін хлопец Іванка найшоў папараць-кветку, да не ўтрымаў яе. А было гэта вось як.

На Івана Купалу шло свята. А Іванка сядзеў адзін, скучаў. Ён быў самы гожы хлопец з дзярэўні, але яму ніхто не глянуўся. У тыя часы быў абычай вянкі надзяваць або ў рукі даваць таму, хто дзэўцы глянуўся. І калі хлопец згодны, то трэба было гэты вянок разарваць і кінуць сабе пад ногі. А Іванку аж цэлых 4 дзеўкі вянкі аддалі. І стаялі радам, глядзелі, ці разарве ён каторы з вянкоў. А ён паглядзеў на дзевак, на вянкі, паклаў іх на траву, не тронуўшы, і

* Кожны радок паўтараецца, акрамя першага і апошняга.

пайшоў. Ішоў, ішоў і дайшоў да лесу. Сеў на пень, закрыў ліцо рукамі і думае. І чуе, нехта яго заве:

— Іванка, азірніся.

Ён азірнуўся і бачыць, што стаіць дзевачка, прыгожа-прыгожа. І гаворыць яму:

— Устань, Іванка, ідзі ў чашчу лясную, цераз багны, балоты, углыб. Там папараць-кветка расце. Я яе дару табе.

Іванка працёр вочы, а дзевачка не iсчазае, стаіць. І такая празрачная ўся, вецер яе калыша. І дзевачка тая знімае з галавы вяночак, кідае яго Іванку і кажа: «Знайдзеш папарацень-кветку — я буду тваёй нявестай».

Іванка толькі сабраўся разарваць вяночак, а дзевачка махае рукой і кажа:

— Падажджы, Іванка, не спяшай! Прынясеш папарацень-кветку — разарвеш вяночак. І помні адно: не аглядвайся назад! Што б ні казалі табе, не аглядвайся...

І пачала дзевачка знікаць. Іванка аж падпрыгнуў і закрычаў:

— Пачакай, любая! Як зваць хоць цябе?

Здалёку данѣслося:

— Купалінка!..

І вось Іванка дужа захацеў папарацень-кветку найці. І пайшоў ён туды, куды яму ісці сказала Купалінка. Ішоў ён, ішоў, бачыць — балоты кругом, твань. І чэрці страшныя прыгаюць вакруг, крыўляюцца. І сразу рэзка пасвятлела. Глядзіць Іванка — уперадзе маленькая, кругленькая паляначка, зялёненькая-зялёненькая, і зорачкі цвітуць на ёй. А ў серадзіне гэтай палянкі цвіце яркім розавым папарацень-кветка. А вакруг яе скруцілася тоўстая гадзіна (змяюка) і спіць. Іванка падбег туды, перасігнуў цераз гадзіну і сарваў папарацень-кветку. І ўцякаць пабег. Адразу тая гадзіна, што ля кветкі ляжала, здохла. Іванка палажыў папарацень-кветку за рубаху і пайшоў выхаду шукаць. І сразу яму хараша і лёгенька стала. Вакруг яго чэрці прыгаюць, крыўляюцца, ведзьмы бегаюць, пужаць хочуць Іванку. А яму не страшны ні ведзьмы, ні чэрці. Ён чуе, як дрэвы гаворуць між сабой:

— Не данясе ён папараць-кветку дадому. Ведзьмы што-небудзь вытваруць...

А Іванка ідзе і ідзе ўперад. Помніць, што яму Купалінка казала: не аглядвацца. Ззаду і дзеўкі нібы смяюцца, і хлопцы. І маці нібы Іванку звала, ён ідзе не аглядвасцца. І вось ідзе ён, ідзе, ужо і дзярэўню відаць. І тут раптам чуе Іванка голас Купалінкі:

— Іванка, любы, дапамажы, паміраю!..

Іванка аглянуўся. І бачыць страшэнную ведзьму. Сразу стала цёмна-цёмна, завішчалі ведзьмы, заржалі чэрці. Іванка ўпаў. Невядома сколькі ляжаў ён. Калі ўстаў, было светла. Ён выйшаў з лесу, сеў на пень і шмат думаў. Сунуў руку за пазуху, а там — галюка сухая. Іванка ўстаў і пайшоў у лес. І ніхто яго больш у дзярэўні не бачыў. А ў лесе з тых пор чутна, што дзявоцкі і хлапоцкі галасы пераклікаюцца. І рогат чуваць. Дзявоцкі голас плача і гаворыць праз слёзы:

— Іванка, найдзі мяне.

Хлопец нібы адказвае:

— Купалінка, дзе ты, дзе ты?

... І рогат.

Гэта ведзьма рагоча, што Іванка з Купалінкай друг друга адшукаць не могуць».

У в. Марозавічы на Купалле ў выбранае для вогнішча месца «ўбівалі ў зямлю кол, абложвалі яго саломай, а ўверсе прывязвалі пук саломы. Калі пачынала цямнець, то гэты кол запальвалі і зразу сюды прыбягалі прыбраныя людзі з бярозавымі дрэўкамі ў руках, якія кідалі ў стоўб, прыгаворваючы: «Каб мой лён быў такі вялікі, як гэтая хварасціна».

Асноўныя матывы купальскіх песень, запісаных на Буда-Кашалёўшчыне, звязаны з асноўнымі структурнымі элементамі купальскай абраднасці, якая, на жаль, у пэўнай сістэме не захавалася.

Пачыналася ж свята са збору купальскіх траў і кветак раніцай 6 ліпеня, што і адпаведна суправаджалася песняй:

Ой, на Купалле, на Яна
Дзевачкі зелле збіралі.
Яны збіралі, не зналі,
У старога дзеда спыталі:
— Што гэта, дзядулька, за зелле,
Чорны галоўкі насення?
— На што вы яго збіралі,
Калі вы яго не зналі?
Ваша дзявоцкая красата —
Вашаму сэрцу сухата.
(г.п. Уваравічы)

Калі запрашалі на Купалле, то спявалі песню:

Хадзіў чыжык па вуліцы,
Рана па вуліцы.
Прасіў дзевак на Купалле,
Рана на Купалле.
Вам, дзеванькі, свая воля,
Маладзіцам волі нету,
Рана-рана волі нету.
Я свякроўкі не баюся,
Рана-рана не баюся.
Я свёкару пакланюся,
Рана-рана пакланюся.
Сама пайду на Купалле,
Рана-рана на Купалле.
(г.п. Уваравічы)

Выразную шлюбную скіраванасць мае тэкст купальскай песні з матывам пляцення вянкоў:

Купалінка, Купалінка,
А дзе твая дочка?
— Мая дочка ў садочку
Кветкі рвець,
Вяночкі пляцець.
А ўсім дзевачкам
Па вяночку,
А Галечцы — ажно тры.
Адзін венчык — на злучэнне,
Другі венчык — на вянчанне,
А трэці венчык — на ад'язджанне.
(в. Дзербічы)

Назіранне за «ігрой» сонца ўдзельнікаў Купалля — важны рытуал у сістэме купальскай абраднасці, звязанай з закліканнем добрай ураджайнасці:

А на Купалу
Рана сонца ірала,
Рана сонца ірала,
На добрыя гады,
На цёплыя росы,
На цёплыя росы,
На хлябы-ўраджаі.
(в. Дзербічы)

Структура ж н і ў н ы х а б р а д а ў на Буда-Кашалёўшчыне ўключае некалькі частак, звязаных з этапамі жніва — з а ж ы н к а м і, у л а с н а ж н і в о м і д а ж ы н к а м і. Надзвычай глыбока яны адлюстравалі працоўны вопыт чалавека, яго светапогляд, па-мастацку асэнсавалі яго духоўны свет, паказалі непарушнасць спрадвечных маральных норм і ацэнак. Пра зажынкі ў в. Бацунь паведаміла Гарпіна Мануйлаўна Сачыўкіна, 1909 г.н.: «На Палупятра ішлі з хлебам і соллю ў поле, звярталіся да нівы: «Добры дзень, ніўка!» Зажыналі пару жмень жыта і клалі нахраст, а паверх клалі хлеб і соль, спальвалі, а потым пачыналі жаць пад хрэст. Калі нажыналі першы сноп, абвязвалі спіну, каб не балела, чыталі малітву, казалі такія словы: «Бачыць маё вочка, што жаць недалёчка». Складалі скірды, зналі нейкія словы, каб і мышы не тачылі, дождж не забіваў.

Як ішлі жаць, дык нельга было пераходзіць каму-небудзь дарогу і каб табе ніхто не перайшоў, асабліва з пустым вядром. Нельга было пераступаць цераз серп, а то парэжаш руку, як будзеш жаць, альбо асцюк з жыта ў вока пападзе. Зажынкі спраўлялі ў хаце нядугі (нявесты)».

Звычайна ў зажынкавых песнях адлюстроўвалася ўласцівая для зажынак абрадавая сітуацыя. У песнях канстатуецца факт пачатку жніва — цяжкай напружанай працы хлебароба:

Сёння ў нас зажыначкі.
Жнейкі, жнейкі маладыя,
Жнейкі жыта зажыналі,
У снапы вязалі.
Свайго гаспадара
Снапамі звязалі.
А наш гаспадар маладзенькі,
У яго конь вараненькі.
(в. Дзербічы)

Дажынкі, як заключны этап жніва, суправаджаліся таксама песнямі і абрадавымі сімвалічнымі дзеяннямі. Напрыклад, калі канчалі жаць у г.п. Уваравічы, то завівалі «бараду»: «У самым канцы поля астаўлялі штук сколькі калоссяў, завязвалі ў вузел так, каб каласкі глядзелі ўніз, у зямлю. Патом пплялі з цвятоў, якія растуць на полі, вянок і клалі на бараду. Яшчэ туды ў вянок клалі кусок хлеба, соль і вадзічку і гаварылі ўсе жанчыны: «Барада, барадзіца, харошая маладзіца, табе хлеб, соль і вадзіца. Будзь здарова, зямлякарміцелька, да будушчага года».

Такім спосабам людзі імкнуліся ўлагодзіць зямлю, захаваць яе ўраджайнасць на будучы год. Матывы ўласна жніўных песень звязаны з узаемаадносінамі замужняй жанчыны са свёкрам, свякрухай, сумам па бацькоўскай хаце, з нараканнямі на цяжкую працу, нешчаслівую долю:

Пара, маці, жыта жаці,
Ой, колас пахіліўся!
Колас пахіліўся,
Пара, маці, жыта жаці!
Голас ізмяніўся,
Пара, маці, жыта жаці!
Ой, салома павяла!
Салома, ой, павяла,
Жалка тога вічарочка,
Ой, што я не гуляла!
(в. Патапаўка)

Зашумеў, зашумеў
Сілен дробны дожджык
Ды па чыстаму полю.

Зажурыўся, зажурыўся,
Ды мой татачка родны
Ды па маёй горкай долі.
Было тады дождждыку
Ісці, як хмарка была.
А было табе, татачка, журыцца,
Як я малая была.
(в. Дзербічы)

Спяваюць на Буда-Кашалёўшчыне не толькі, калі жыта жнуць, але і калі «сцеляць лён пад жнівеньскія росы. Даслаўшы, кладуць з лёну зеркала, штоб лён бяліўся, у зеркала глядзеўся», пры гэтым спяваюць песню «Брала дзеўка лён, брала канапелькі»:

Брала дзеўка лён, брала канапелькі,[1]
Яна брала-брала да сырой зямелькі.
Сырая зямелька — маць мая радненька.
Туда ішоў казача: «Памагай Бог, дзеўка!»
Дзяўчынанька ўстала, «спасіба» сказала.
— Казача й казача, сватай сабе дзеўку.
Ня тую, другую, мяне, маладую!
Каб я, маладая, у наймы не хадзіла,
Чужыя работы болей не рабіла.
А прыйдзе субота — чужая работа!
Як прыйдзе субота — чужая работа!
Як прыйдзе нядзеля — рубашка не бела!

З усіх відаў с я м е й н а - а б р а д а в а й п а э з і і асабліва добрай устойлівасцю захавання адрозніваюцца традыцыі в я с е л ь н а й а б р а д а в а й п а э з і і, якія ў розных вёсках маюць свае лакальныя адметнасці, цікавыя рытуалы, непаўторныя міфалагічныя прыкметы і павер'і.

У вясельным абрадзе Буда-Кашалёўскага раёна можна вылучыць такія этапы, як сватанне, заручыны, выпечка каравая, вяселле (3 дні), адведкі. Сватанне адбывалася звычайна ў суботу, у сваты хадзілі бацька жаніха, жаніх, маці, родзічы (в. Кашалёў), у в. Бацунь у сваты хадзілі толькі мужчыны.

Як прыходзяць у сваты ў в. Сінічына, спяваюць песню:

А чыя та рута-мята за гарой
Зарасла сінім цвстам, лебядой?
Ой, вы, дзевачкі, сястрыцы,
На мяне, маладую, не глядзіце,
А мне не да руты, не да мяты,
Прыйшоў ка мне Ванька ў сваты...

Сватанне ў в. Забалоцце суправаджалася наступнымі песеннымі радкамі:

Пайшла Танечка па ваду[2]
Зачула гасцей у бару.
Кінула вядзерцы пад гару,
А сама пайшла дадому
Да схавалася ў камору.
— Гатуйся, мамачка, гатуйся,
У чырвоныя боцікі абуйся.
А ў шчырым бару конь заржаў,
Вясёлыя сваточкі песні пяюць,
А мне, маладой, звесць даюць.

Дыялог, які адбываўся паміж бацькамі нявесты і сватамі з боку жаніха, дапамагаў высветліць галоўнае пытанне — ці згодна дзяўчына на шлюб. Калі яна давала згоду выйсці замуж, то кланялася сватам, ставіла посуд на стол. Пасля дасягнення ўзаемнай дамоўленасці аб шлюбе нявеста абвязвала ручнікамі ўсіх сватоў, а жаніху завязвалі хустку на шыю. Пахвала ў адрас дачкі гучала не толькі ў час рытуальнага дыялогу з боку яе бацькоў, што яна і «старанная, і разумная, і слухмяная, і з твару прыгожая, і зварыць, і спячэ, і ткаці, і прасці умее», але і ў спецыяльнай песні «Сваткі любімыя»:

Сваткі любімыя,
Дружкі любсзныя,
З нас вачэй не вараціця,
На нас, любезныя, узгляніця,
Да і саміх сябе пакажыця.
Глядзіця, вот наша нявеста,
Не храма, не крыва.
Яна тонка прадзець,
Кросны звонка тчэць,
Халсты бела беліць.
Напрала, наткала,
Дар'я наспраўляла.
(в. Дземідоўка)

У в. Кашалёў, калі ўжо дзяўчыну высваталі, то спявалі песню:

Запіта дзеванька, запіта,
Шоўкам хустанька шыта.
Запівалі яе ўначы,
Вышывалі хустаньку пры свячы.
Запівалі яе ўвесь род,
Родны бацсенька напрарод.
Ох, п'яна я ды хілюся,
Іду дадому ды баюся,
Паганага мужа маю,
Будзе біці — добра знаю.

[1]Другі — сёмы і дзевяты радкі паўтараюцца.
[2]Кожны радок паўтараецца.

Асноўнымі рытуаламі заручын на Буда-Кашалёўшчыне з’яўляліся наступныя: абменьванне пярсцёнкамі, заплятанне касы нявесты, звязванне над хлебам ручніком рук маладых, упрыгожванне елкі, якая з’яўлялася сімвалам жыцця, маладосці, дзявоцтва, прыгажосці. Паводле ўспамінаў Ганны Іванаўны Бажанковай, 1911 г.н., з в. Кашалёў, «калі маладую вязуць да маладога, то ад елкі стараліся прынесці дамоў кветкі, упрыгажэнні», што павінна было прынесці шчасце ўсёй сям’і.

Заручыны замацоўвалі згоду нявесты на шлюб і суправаджаліся песнямі:

Прапіў бацька дачку
На салодкім мядочку
Ды й на белай тарэлцы,
Ды й на белай тарэлцы,
Ды й на горкай гарэлцы.
Да, напіўшыся, скача,
Да, напіўшыся, скача,
А праспаўшы, усё плача:
— Куды ж маё да дзіця пайшло,
А ці ў бор да па ягады?
А ці ў бор да па ягады,
Ці ў святліцу за вадзіцай?
Сватачка, сватачка, мая мамачка,
Глядзі ж майго да дзіцятачка.
(в. Іванаўка)

Напярэдадні вянчання ў хаце бацькоў маладой адбываўся такі вясельны абрадавы момант, як пасад, калі нявесту садзілі на дзяжу, засланую кажухом (навыварат). Брат ці сястра маладой вялі яе на пасад, прычым, «дарожка да дзяжы замятаецца вышытым ручніком, каб быў светлы шлях у жыцці. Маладой расчэсвалі косы і грэбень закідвалі на печ».

Калі вялі маладую-сірату на пасад, выконвалі песню:

Станавіся, радзіначка, уся ў рад,
Да вядуць Наташку на пасад.
На пасад пасаджана, як лебядзінка,
А Наташа-сіраціначка.
Усю радзіначку яна абышла,
Свае роднай мамкі не знайшла.
Усю радзінку мінае,
Свая родну мамку шукае.
Галовачка мая бедная ў вяночку,
Няма мае роднае мамкі ў радочку.
Галовачка мая бедная ў цвеце,
Няма мае роднае мамкі ў свеце.
(в. Сінічына, п. Расцяробы)

Матывамі смутку і журбы прасякнуты і наступны тэкст песні, якой суправаджаўся пасад у в. Кашалёў:

Галечка дзевачак сабрала,
Сабрала забор таткаў —
Гібкія лавачкі масціла
І ў рад дзевачак садзіла.
А сама села вышэй усіх,
Думачку задумала горш усіх.
Чым мне па двару пасласці,
А як мне свякроўку назваці.
Лістом па двару трэба слаcці,
Свякроўку мамачкай называці,
А свёкарку татачкам зваці.

Рытуал расплятання касы, які адбываўся пад час пасаду нявесты, адлюстроўваецца ў песні «Меншы братачка касу расплятаў»:

Меншы братачка касу расплятаў,
Павесіў уплёт,
Куды мамачка ў клець ходзе.
У клець будзе ісці — забача,
З клеці будзе ісці — заплача:
Гэта маёй дачушкі ўплёты,
Усе дзявоцкія работы.
Як яна ўсе гэтыя ўплёты насіла,
Таткаў двор красіла,
Кінула ўплёты насіць,
Кінула таткаў двор красіць.
(в.Кашалёў)

У першы дзень вяселля жаніх прыязджае за нявестай. Калі збіраліся ехаць да маладой, то спявалі:

Добранач, бацюхна,
Ды не лажыся спаці,
Ды не лажыся спаці,
Бо не будзем начаваці,
Бо ночанька цёмненька,
Дарожанька дрэнненька,
Каб нам ды не зблудзіці
Ды чаго б не забыці.
(в.Ліпа)

* * *

Там поле роўненька,
На двары коней поўненька.
А там хлопчыка каня павёў,
У каня праўду запытаў:
— Коню, мой коню вараны,
Ці надзеешся на сілу,
Ці давязеш маю дружыну?
Мая дружына невялічка,
Сем каней вараных прыстала,
Сінюю карэту зламала.
(в. Дзербічы)

У хаце маладой чакалі прыезду жаніха, «з абеда пачынналі збірацца госці — яе радзіначка». Дзяўчаты імкнуліся схаваць нявесту ад жаніха дзе-небудзь у суседзяў. Як паведамілі ў в. Іванаўка, да выбару такога месца існавалі пэўныя патрабаванні: «чэраз вуліцу маладую не праводзілі, нельга, а вялі ў хату, якая стаяла па тым баку вуліцы, дзе жыве нявеста; і дайжа еслі жаніх будзе ехаць з якога боку, дык туды на сустрэчу не вязлі, наадварот ад жаніха, у другую старану, а яшчэ нельга было пераапранаць нявесту ў хаце ўдавы або ўдаўца».

Прыезд дружыны жаніха па нявесту звязаны з рытуалам яе выкупу, які адбываецца ў цікавай гульнёва-тэатралізаванай форме і суправаджаецца выкананнем кароценькіх песень:

Куды вы нашу маладзіцу дзелі?
Хоць бы мы на яе паглядзелі,
Новую кашулю ёй надзелі.

Наша маладая ў клеці сядзіць,
У клеці сядзіць ды каралечкі ніжа,
Не чорненькія, а чырвоненькія.
(в. Кашалёў)

Старажытным момантам з'яўляецца такая дэталь, як зліццё гарэлкі з боку жаніха і нявесты ў адзін посуд, а затым яе наліванне з міскі лыжкай у чарку, «якая абходзіць усіх кругам». Пры гэтым прыгаворвалі: «Божа, радзі, радзі жыта, пару дзяцей благаславі, каб былі багаты, не былі пыхаты, каб шанавалі бога на небе, людзей на зямлі, свае маладосці і нашы старасці».

Водгукі старажытных міфалагічных уяўленняў даносіць да нас тэкст вясельнай песні, якая суправаджала прыезд дружыны жаніха да маладой у в. Балсуны. У цэнтры песеннага сюжэта міфалагічны персанаж — заяц, сімволіка якога мае любоўна-шлюбны характар, але сустрэча вясельнай дружыны з зайцам асэнсоўвалася ў народнай міфалогіі як з'ява небяспечная:

Сядзіць заінька пад ёлачкай,
Вочкі трэ.
Едзе Мішачка жаніціся,
Зайку б'е.
— За што, за што, малады Мішачка,
Мяне б'еш?
Ці я твае вараныя конікі папудзіў,
Ці тваю маладу Анечку адгудзіў?
Аскудзілі тваіх конікаў мядзведзі,
Адгаварылі тваю Анечку суседзі,
А спудзілі тваіх конікаў лісіцы,
Адгаварылі тваю Анечку сястрыцы.
(в. Балсуны)

Паводле народных павер'яў, маладым забаранялася пі́ць, бо яны ехалі ў царкву вянчацца.

Матывам пажадання долі прасякнуты песенныя радкі, адрасаваныя маладым пад час іх ад'езду ў царкву:

Паедзем, Галенька, да Божага дому,
Не станавіся ў царкве пры сцяне.
Стань, малодзенька, пасярод царквы.
Анёлы абяцаюць ды долю дадуць.
А як пытаюць, што за долю даць,
Ці хлебавую, ці грашовую,
Ой, дай жа, Божа, ды ўсялякую.
(в. Кашалёў)

Калі маладыя ўжо павянчаліся, то сустракалі іх у хаце нявесты яе бацькі, благаслаўляючы «на быт добры, на век доўгі», пры гэтым выконвалася песня:

Прысхала Галенька з вянца
Ды села ў святліцы на лаўцы,
Палічыла пярсцёнкі на пальцы,
Ды адзін пярсцёнак не такі,
Што купіў Іванка малады.

Калі маладыя вяртаюцца з царквы, то выконваюць і наступную песню:

Мамачка, мамачка мая родная,
Разрышы мне на ручнічок стаць.
Разрышы мне, разрышы мне на ручнічок стаці,
Васечку павітаць.
Васечку, Васечку павітаці,
Перснейкі падмяняць.
Перснейкі, перснейкі падмяняці,
Мужам, жаной назваць.
Мужам, жаной, мужам, жаной назваці,
Здароўейка пажалаць,
Здароўейка, здароўейка пажалаці,
Ай да веку да веку, ай да веку да веку,
А Васечку-чалавеку.
(в. Іванаўка)

Ішла Манечка з падвянца,
Сыпала чорны мак з рукаўца:
— Зарадзі, Божа, чорны мак,
Усе залатыя макаўкі,
Чырвоныя лісточкі.
Чырван чырвонец — Іванечка,
Чырвоны лісток — Манечка.
(в. Ліпа)

Вяселле ў хаце нявесты суправаджасцца шматлікімі жартоўнымі песнямі, у якіх адлюстроўваюцца народны светапогляд, мараль, майстэрства імправізаваць, ствараць вясёлыя камічныя сітуацыі, незласліва абсмейваць вясельнікаў-сватоў, дружак, шаферак:

Сваце, сваце,
Чыні лад у хаце,
А не чыніся ладу,
То падлазь пад лаву,
Ступаю закаціся,
Таўкачом бараніся.
Наш дружка наеўся, напіўся,
На ім пояс рассеўся, разваліўся.
Мы ж пасдзем да Гомеля, Гомеля
Абручкі купляць, купляць,
На дружку набіваць, набіваць.
Наша дружка-хітрушка
Цыцкаю парася забіла,
Перад сваім дружкам палажыла.
— Еш, дружок, парасятка,
Яшчэ заб'ю парасятка.
(в. Кашалёў)

Яскравым сведчаннем трывожнага псіхалагічнага стану маладой у сувязі з яе расстаннем з бацькамі, родным домам, з'яўляюцца тэксты вясельных песень, якімі суправаджаўся яе ад'езд да бацькоў жаніха:

— Куды, куды... млода Манечка, ад'язджаеш?
Каму, каму сваю рутачку кідаеш?
— Ой, паеду, паеду, мая мамачка, ад цябе,
Пакідаю сваю рутачку я табе.
Уставай, мая мамачка, раненька
Да палівай маю рутачку часценька,
Не палівай маю рутачку слязою,
А палівай халоднаю вадою.
Ад слёзак мая рутачка завянець,
Ад вадзіцы мая рутачка буявець.
Ад слёзак мая рутачка сцямнеець,
Ад вадзіцы мая рутачка зелянеець.
(в.Гаўлі)

Як табе, мая матка, жаль не жаль,
Як твае сэрца ні канє,
Што твае дзіцятка ні згляне.
Як села ўчора звячора,
Сядзіць сягоння да тас пары,
Спусціўшы вочкі да зямлі,
Палажыўшы ручкі на скам'і!
— Беленькія мае ручкі, беленькія,
Ці будзеце вы беленькія ў свякроўкі?
Як я ў маткі была, то я час мела
Беленькія ручкі вымываці,
Засталася ў свякроўкі,
Стала слёзкамі паліваці.
(в. Антонаўка)

У першы дзень вясельнага застолля пачынаецца дзяльба каравая ў маладой традыцыйнай славеснай формулай: «Запрашаю на каравай, на божы дар. Наш каравай дарагі, спечаны з 7 палёў пшаніцы, з 7 кароў масла, спечаны ў печы і вельмі смачны». Каравайныя пажаданні, запісаныя ў в. Кашалёў, адрозніваюцца іскрыстым народным гумарам, мудрай назіральнасцю, высокімі маральна-этычнымі прынцыпамі:

«Дарую бочку гуркоў,
Каб не любіла чужых мужыкоў»;
«Колькі на бярозе почак,
Каб столькі было дочак;
Колькі ў лесе пянькоў,
Каб столькі было сынкоў»;
«Дарую галіну бярозы,
Каб мужык прыходзіў цвярозы;
Дарую дугой, каб не хадзіў да другой».

Першы дзень вяселля на Буда-Кашалёўшчыне заканчваецца рытуалам выкупу пасагу нявесты («яе пасцелі, падушак»). Развітваючыся з дачкой, маці галосіць, «прычытае», гучыць песня:

Што ты, дачушка, за бяду зрабіла,
Што сваю мамачку ды пасіраціла?
Чужая сямейка п'е ды гуляе,
А твая мамачка слёзы раняе.
Чужая сямейка п'е ды скача,
А твая мамачка сільненька плача.
На тваё месца няма каму сесці,
Тваёю лыжкаю няма каму есці,
Ды тваё месцейка за сталом гуляе,
А твая лыжачка ды ляжыць сухая,
А твая мамачка слёзы выцірае.
(в. Кашалёў)

Калі везлі маладую да маладога, у в. Сінічына гучалі песенныя радкі:

Пара, маці, дай вячэраць,
Павячэраўшы, дзяліцеся.
Табе, маці, што ў хаце,
А мне, маці, што ў клеці.
Табе, маці, кубел дай каробка,
А мне, маці, бурая кароўка.

Перад ад'ездам да хаты жаніха нявеста ў в. Бацунь спявала:

Ці я табе, мамка, не дзіцятка,
Што мяне проці ночы шлеш упрочкі?
Ці я табе, мамка, кудзелі не прала?
Прала, прала кудзелечку тоненьку,
Слала, слала пасцелечку беленьку.

Абрадавы этап сустрэчы маладой бацькамі жаніха суправаджаўся рытуалам расплятання касы, калі «свякроў знімала вянец, расплятала касу і захіхляла (завязвала хусткай) нявестку» (в. Сінічына).

Калі ж пад'язджалі, напрыклад, да хаты жаніха ў в. Кашалёў, то звярталіся да яго маці:

Выхадзі, свякроўка, чубата,
Прыехала нявеста багата.
Расцялі, мамачка, трубачку,
Прывязлі невесту-любачку.

У адказ жа гучалі словы маці жаніха:

Раскаціла б я і бярэмя,
Каб верыла, што нядрэнна.

У тэатралізаваным народным вясельным спектаклі, здаецца, было ўсё прадугледжана і ўлічана. Пакідаючы маладую ў хаце жаніха, яе радня спявала развітальную песню:

Дадому, госцейкі, дадому,
Паелі конікі салому.
А саломкі жменька каротка,
А сена клачок-пятачок.

А потым звярталася з просьбай да радні маладога не крыўдзіць маладую жанчыну, забяспечыць ёй шчаслівае жыццё:

Да, суседачкі, да галубачкі, просім вас,
Каб не было нашай Галечкі кепска ў вас,
Каб не стаяла з цёмнай ночы пад акном,
Каб не ўцірала дробных слёзкаў рукавом,
Каб не была ды паветачка за хатку,
Каб не была суседачка за матку.
(в. Кашалёў)

Другі дзень вяселля на Буда-Кашалёўшчыне называўся «пярэзвы жаніховы», калі госці з боку маладой прыходзілі да жаніха і вяселле працягвалася, гучалі вясельныя песні жартоўнага характару:

Нашы пчолкі параіліся,
Дай ім, Божа, сад добры.
Нашы маладыя пажаніліся,
Дай ім, Божа, век доўгі,
Каб яны пілі, елі
Да хараша гаварылі.
Ой, Галечкін айцец
Ездзіў на кірмаш выбіраць.
Ажно выбраў да нягоднага:
Як стаў пры парозе —
Як пень пры дарозе.
Як стаў ён каля ямкі,
Пацягаў усе дзялянкі,
Стаіць, мармыча,
А сваё Галечкі не кліча.
(в. Кашалёў)

Заканчваецца гэты этап вяселля дзяльбой каравая і адорваннем маладой радні жаніха падарункамі.

На трэці дзень вяселля, як паведаміла Ганна Іванаўна Бажанкова з в. Кашалёў, «госці нявесты рыхтуюцца ісці ламаць печ у жаніха». Паслявясельная ж частка была вядома пад назвай «адведкі», захоўваецца гэты вясельны момант і сёння, калі да бацькоў нявесты праз тыдзень прыходзяць у госці блізкія, сваякі жаніха разам з маладымі. Лічылася, што да гэтага дня нявеста не мела права наведваць сваіх бацькоў. Як бачым, структура вясельнай абраднасці ў вёсках Буда-Кашалёўскага раёна ўключае, як і традыцыйнае беларускае вяселле, тры часткі — давясельную, уласна вясельную і паслявясельную, вызначаецца ў той жа час мясцовымі адметнасцямі. Кожны вясельны этап суправаджаецца адпаведнымі песнямі-ілюстрацыямі, у якіх праходзіць перад намі жыццё чалавека ў надзвычай адказны яго момант, калі нараджаецца сям'я, працягваецца яго род, у рэшце рэшт — захоўваецца само жыццё на зямлі.

Адсюль такая багатая гама пачуццяў і перажыванняў, увасобленых у вясельных песнях з дапамогай трапнага паэтычнага народнага слова, адсюль і такая строгая абавязковасць неабходных магічных дзеянняў, рытуалаў на кожным з вясельных этапаў. А якая чароўная мелодыя вясельных песень, у іх сапраўды адлюстравалася душа народа!

З абрадавых відаў народнай творчасці добра прадстаўлены на тэрыторыі раёна і **замовы** — устойлівыя славесныя формулы, якім надавалася магічнае значэнне і з дапамогай якіх імкнуліся людзі знайсці паратунак ад хвароб, паспрыяць сабе ў гаспадарчай дзейнасці і сацыяльна-грамадскім жыцці.

Замовы, запісаныя ў вёсках Буда-Кашалёўскага раёна,— яскравае сведчанне праверанай вякамі народнай мудрасці, прыроднай кемлівасці і назіральнасці, дасканалых рэцэптаў народнай медыцыны, тонкага высокамастацкага густу ў карыстанні народным мастацкім словам. Яшчэ і

сёння моцна трымаецца ў народзе вера ў магічную сілу слоў і дзеянняў. Арыгінальнасць псіхалогіі мыслення і вераванняў жыхароў Буда-Кашалёўшчыны добра выявілася ў замоўных формулах — своеасаблівай энцыклапедыі практычных медыцынскіх ведаў нашых продкаў.

АД ГАДЗІНЫ

Ёсць на моры, на лукамор'і куст, а ў том кусці чорнае руно, а ў тым руні — чорная гадзіня Адарэнадзіня. Вот я прашу цябе, Адарэнадзіню, вынь ты свой зуб, а ня выніш свайго зуба, я цябе саломай абнясу і спалю, і папялок разадму (в. Крыўск).

АД ШАЛУ

Устану я рана-раненька, умоюсь бела-бяленька, узыду на крутую гару, зірну пад ясную зару — там стаіць дзядзька-лябедзька, стары, барадаты. Дзядзька-лябедзька, унімай свайго сабаку-кусаку,круцяку і вярцяку: укусіў ён раба божага. Вынімай шал із касцей, із машчэй, із чорных печаней, із сініх жыл, з гаручыя крыві і буйныя галавы, штоб у раба божага косці не ламіла, гаручыя крыві не марыла, ясных вачэй не круціла (в. Хоўхла).

АД СКУЛЫ

Кол-калавіца, скула-скулавіца, жэлта-жэлтавіца, бела-белявіца, чэрна-чэрнавіца. Скула прыдуманая, скула прыгаданая, скула вадзяная, скула прыстрэчная, ідзі ты на мох, на балота, там сталы стаяць віном паналіваны. Ні валяйся, ні качайся, рабу божую не чапай, па косці не хадзі, косці не ламі, па крові не хадзі, крові не заражай, цела не пушы, галаву не тамі. Кол-калавіца, я са славамі. Гасподзь Бог з помаччу (г.п. Уваравічы).

АД ЗЛЯКУ, ПРЫСТРЭКУ (СПАЛОХУ)

Першым разам, божым часам, Госпад Бог з помаччу. Ты, святая пятніца, вячэрняя зара, і часінкі, і мінуткі, станьце ўсе на помач!

Устану я рана-параненька, умыюсь бела-пабяленька, пайду я, малада, пад жаркае сонца. Пад жаркім сонцам ляжыць Масіяс. Як таму Масіясу не ўставаць, так і Рэні, раджонае, хрышчонае, зляку, прыстрэку не бываць, ні калючага, ні балючага, ні ўцешнага, ні смешнага, ні падумнага, ні пагаднага, ні прыгаворнага. І ссылаю злякі-прыстрэкі да на быстрыя рэкі.Там жа вам гуляць і бываць, рабе божай Рэні помачы даваць. Я з словам, Госпад Бог з помачай. Амінь (в. Іванаўка).

Важнае месца ў сістэме фальклорных жанраў займаюць і **пазаабрадавыя песні**, сярод якіх у мясцовым песенным рэпертуары шмат любоўных, сямейна-бытавых, сацыяльна-бытавых, жартоўных песень, балад, частушак, калыханак. Добра ведаюць і любяць спяваць вяскоўцы рускія песні фальклорнага і літаратурнага паходжання.

Прывядзём некалькі ўзораў пазаабрадавай паэзіі Буда-Кашалёўскага раена.

СЯМЕЙНА-БЫТАВАЯ

Каб я знала,
Што мая доля злая,
Не пайшла б я замуж,
Я, такая маладая.
Маю мужа ліхога
Ды люблю і такога.
А мой мілы гуляе,
Сабе іншую мае.
Слёзкі мае, слёзкі,
Падайце ўсюды,
А таксама на тую,
Саперніцу злую.
Яна ж мяне разлучыла,
Такую маладую.
Сколькі ў рэшаце вады,
Столькі ў мілага праўды.
(в. Дземідоўка)

КАЛЫХАНКА

Люлі-люлі-люлі,
Усе дзеткі паснулі.
Усе куры паснулі,
Усе гусі паснулі.
Не спіць адзін коця,
Бегаў па балоце,
Адмарозіў лапкі,
Палез на палаткі.
Не хадзі, коцік, па мастку,
Буду біць па хвасту.
Не хадзі, коцік, па печы,
Буду біць у плечы.
Не хадзі, коцік, па лаўцы,
Буду біць па лапцы.
Пабег коцік у лясок,
На ём чырвоны паясок.
Трэба коціка дагнаць,
Паясочак адабраць,
Будзе дзіця лепей спаць.
(в. Рагінь)

БАЛАДА

Ой, у полі бяроза кудрава стаяла,
А на той бярозе, ой, зязюля кукавала.
А то не зязюля, усё родна маці.
І яна выпраўляла сына ў салдаты.
— Ты ідзі, сыночак, толькі не барыся,
А на трэці гадочак назад вараціся.
Ой, прайшоў гадочак, не едзе сыночак.

А на трэці гадочак вярнуўся сыночак.
Ой, ці рада ты, маці, ці рада ты мною,
Ці рада ты мною, маёю жаною?
— Рада я, сыночак, рада табою,
Толькі я не рада тваёю жаною.
Пасадзіла сынку за дубовы столік,
А нялюбую нявехну стоя ў парозе.
Налівае сынку салодкага мёду,
А нялюбай нявестцы кіпучага ёду.
— Не пі, не пі, мая міла,
Давай з табой вып'ем па палавіне.
— Ой, Божа, мой Божа!
Што ж я нарабіла?
Што ж я нарабіла?
Маладую пару навек загубіла.
Пасадзіла сыну салодкую маліну,
Нялюбай нявестцы калючую шыпшыну.
Салодкая маліна сохне-пасыхае,
А калючая шыпшына цвіце-расцвітае.
(в. Рагінь)

ПРЫПЕЎКІ

А ў майго мілёнка
Худая кабылёнка.
Не даехаў да гары —
Кабылу з'елі камары.

Каб я знала, каб я знала,
Дзе мне замужам бываць,
Памагала б я той свякроўцы
Хоць капусту паліваць.

У мяне голасу не стала,
У дзяўчыны маладой.
Напаіў мяне мой мілы
Ды халоднаю вадой.

Колькі лесам ні хадзіла,
Мацней дуба не знайшла.
Колькі хлопцаў ні любіла,
Лепей Васі мне няма.

У падружкі кохта бела,
У мяне — ружовенька.
У падружкі хлопец сумны,
У мяне — вясёленькі.
(г. Буда-Кашалёва)

У **малых фальклорных жанрах** — прыказках і прымаўках — знайшлі адлюстраванне светапогляд і практычны вопыт чалавека-працаўніка. Калі гаспадар угаворвае госця выпіць, а той адмаўляецца, іншы раз гавораць так: «Села птушачка на гвоздь, як хазяйка, так і госць».

«Калі б не клін, да не мох, так і плотнік бы здох» — гэта прыказка, пэўна, з'явілася тады, калі цеслярам мала плацілі за працу. Таму ім прыходзілася халтурыць, каб зрабіць сваю справу як мага хутчэй — з дапамогай кліна затыкаць дзіркі паміж бярвеннямі ці выраўніваць.

А каб падбадзёрыць навічка, цесляры гаварылі: «Як гультай за тапор, так мазалі на рукі».

«Ранняя птушка дзюбку чысціць, а позняя — вочы прадзірае» — так гаварылі гультаю, упікаючы яго.

Вялікую ролю ў жыцці чалавека мелі прыкметы і павер'і, вераванні, асобныя з іх мелі забабонны, смешны характар, але ў большасці з іх усё ж адлюстраваўся багаты практычны вопыт чалавека, яго назіральнасць, уменне жыць з прыродай у гарманічнай еднасці, мудрасць, што перадавалася з пакалення ў пакаленне, імкненне зразумець навакольныя з'явы, спасцігнуць і растлумачыць семантыку рэчаў, навучыцца засцерагацца ад шкоднага ўздзеяння некаторых прыродных з'яў і істот. Калі фальклор увабраў у сабе маральна-этычны і жыццёва-практычны вопыт чалавека, то міфалогія суправаджала яго на кожным кроку: праз сістэму павер'яў, прыкмет і вераванняў селянін імкнуўся прадбачыць будучыню, паўздзейнічаць на неспрыяльныя прыродныя ўмовы, засцерагчы сябе, сваю сям'ю і гаспадарку ад розных нечаканасцей. Шкада, што гэта частка народнай культуры сёння яшчэ не дастаткова вывучана, а той факт, што трэба вывучаць народную міфалогію, сумненняў не выклікае. Веданне не толькі абрадаў і звычаяў, узораў вуснай народнай паэзіі, але і вывучэнне штодзённых наіўных імкненняў чалавека ўбачыць і растлумачыць навакольны свет, таямніцы свайго жыцця — дазваляюць зразумець вытокі першаснага алегарычна-сімвалічнага, эмацыянальна-пачуццёвага асэнсавання свету, паэтычнасць мыслення нашых продкаў. Звернемся да канкрэтных прыкладаў, каб пераканацца ў гэтым. На пытанне «Адкуль узялася нячыстая сіла?» Марыя Маісееўна Сапелкіна, 1922 г.н., з в. Радзеева адказала: «Да таго, як бог стварыў чалавека, ён жыў у раі з анёламі, усю сваю любоў аддаваў ім. Анёлы лічылі сябе адзінымі істотамі, любімымі богам. Але калі бог стварыў чалавека, даў яму душу і даў яму сваю любоў, то анёлам гэта не спада-

балася. Некаторыя вырашылі вярнуць усё тое, што было раней, каб бог зноў усю сваю любоў аддаваў толькі ім. Анёлы паўсталі на бога, за што былі пакараны богам і адпраўлены ў пекла. Нячыстая сіла — гэта падшыя анёлы».

Як раней чалавек асэнсоўваў жыццё і смерць, сэнс свайго існавання, розныя адказы даюць жыхары Буда-Кашалёўшчыны. Напрыклад, паводле ўяўленняў Таццяны Дзянісаўны Свірыдзенка, 1923 г.н., з в. Буда-Люшаў, «людзі адчувалі час сваёй смерці. Чалавек захварэў: аднойчы вырашыў палезць на дрэва, каб паглядзець, ці ляцяць пчолы дадому. Чалавек упаў з дрэва і захварэў яшчэ больш. Калі прыйшлі яго родныя, ён сказаў ім, каб яны выйшлі, бо ён хоча паспаць, а яны будуць перашкаджаць яму. Калі ўсе выйшлі, чалавек убраў падушкі, лёг роўна, склаў рукі і памёр. А да гэтага ён сваім родным сказаў, што заўтра ён іх ужо не пабачыць».

Чалавеку няшчасце магла прадказаць і нейкая сіла: «ішоў чалавек па жыце, па мяжы і ўбачыў прад сабою гроб наперадзе. Чалавек спужаўся і пайшоў назад. Праз некалькі месяцаў чалавек ажаніўся, і ў яго нарадзілася дзіцяці. Але ж яго жонка памерла пры родах сваёй дачкі. Гроб сваёй будучай жонкі і ўбачыў тады чалавек у жыце, на мяжы».

«Вечарам нельга выносіць на двор смецце, бо дзеці будуць сляпыя».

Як змагаліся раней людзі з засухай?

«Засуха — гэта бог наказвае. Ад засухі мак кідалі ў калодзеж. Жанчыны цягалі плуг па дарозе тры разы. Калі дажджу няма, гэта, значыць, нехта на святой нядзелі забор загарадзіў. Калі людзі дазнаваліся, хто загарадзіў забор, то хадзілі разгараджваць яго, каб дождж пайшоў» (в. Буда-Люшаў).

На пытанне «Хто такія былі русалкі?» — у в. Губічы адказалі, што «русалкамі былі маладыя красівыя дзеўкі, якія налажылі на сябе рукі. Ноччу яны садзіліся на веткі дзярэўяў ці сядзелі на беразе ракі і пелі песні. Кажуць, добра хлопцаў прыгожых любілі. Калі ўбачаць хлопца, то кідаліся на яго і цягнулі ў рэчку за сабой».

Верылі на Буда-Кашалёўшчыне, што свет заселены празнымі духамі, напрыклад, што ў хаце жыве дамавік. М.М.Сапелкіна з в. Радзеева не сумняецца ў сапраўднасці існавання гэтай ніжэйшай міфалагічнай істоты: «У мяне быў выпадак, калі, прыйшоўшы да мяне, мая сяброўка стала хваліць майго дамавіка, расказваючы, што ў яе дамавік шкодны. Такім чынам, яна ўвяла майго дамавіка да сябе, пасля чаго ў маёй хаце пайшоў разлад ва ўсім. Каб усё вярнуць на сваё месца, я хадзіла забіраць свайго дамавіка з яе хаты. Пасля гэтага я свайго дамавіка нікому не аддаю».

Заканчваючы кароткі агляд фальклорна-этнаграфічнай і міфалагічнай спадчыны Буда-Кашалёўскага раёна, варта падкрэсліць, як важна нам, сучаснікам, не адракацца ад жывых народных традыцый, бо іх мудрасць і святло дапамогуць выхаваць духоўна багатага чалавека, сапраўднага інтэлігента з пачуццём уласнай нацыянальнай годнасці.

В.С.Новак.

Адзенне жыхароў Буда-Кашалёўшчыны

Паводле класіфікацыі беларускіх народных касцюмаў, традыцыйнае адзенне мясцовых жыхароў адносіцца да буда-кашалёўскага строю, пашыранага на тэрыторыі Гомельскага і Рэчыцкага раёнаў. Мастацтвазнаўча-этнаграфічнае раяніраванне беларускага народнага адзення XIX — пачатку XX ст. зрабіў М.Ф.Раманюк. Ён даследаваў і буда-кашалёўскі строй. Характэрнай рысай гэтага строю была стрыманасць каларыту, дапоўненага разнастайнай вышыўкай.

Асноўнае паяснае адзенне жанчыны — спадніца (андарак ці палатнянік цёмна-чырвонага колеру з чорнай клеткай з шарсцяной або паўшарсцяной саматканкі). Святочныя андаракі звычайна гафрыравалі. Андарак захоўваўся прыкладна да сярэдзіны XX ст.

Важнай часткай жаночага гарнітура была кашуля з прамымі плечавымі ўстаўкамі, шырокімі рукавамі і адкладным каўняром. Кашулі аздаблялі разнастайнымі геаметрычнымі вышыванымі ўзорамі на рукавах, зарукаўі, каўняры, абшлагах.

Адметнасцю буда-кашалёўскай аздобы было ўпрыгожванне сакаленнем і маршчэннем. Сакаленне — гэта адзін са ста-

Жанчыны з в. Рудня-Альхоўка ў святочным адзенні.

ражытных відаў вышыўкі, якую выконваюць на сетцы, утворанай выцягваннем пэўнай колькасці нітак асновы; маршчэнне — збіранне тканіны ў дробныя (радзей буйныя) складачкі. Такім спосабам упрыгожвалі рукавы, кашулі. Паверх кашулі апраналі гарсэт-шнуроўку з чорнай ці цёмна-сіняй тканіны. У адрозненне ад іншых мясцовасцей тут гарсэт быў доўгі і са складкамі на спіне.

Фартух-запінку шылі з белага льнянога палатна ў адну полку, знізу аздаблялі фальбонай, мацавалі на таліі завязкамі ці матузкамі. Святочныя фартухі багата аздаблялі вышыўкай, карункамі. Стылістыка арнаменту адпавядала характару аздобы кашулі. Самыя пашыраныя — гарызантальныя палосы чырвона-чорнага колеру, якія размяшчаліся ўнізе, паступова пераходзячы ў гладкае поле.

Галаўнымі ўборамі жанчын і дзяўчат былі намітка, чапец з кужалю ці паркалю, даматканая ці крамная хустка, завязаная «на ўрожкі». Намітка і чапец (па мясцоваму — чэпік) — галаўныя ўборы замужніх жанчын. Першы раз у намітку ўбіралі на вяселлі пад час завівання, пасля гэтага жанчына не выходзіла на людзі без наміткі. З цягам часу намітку і чапец выцеснілі хусткі (на мяжы XIX — XX ст.). Святочны жаночы касцюм дапаўнялі шыйныя ўпрыгожанні — каралі, стужкі, крыжыкі.

Мужчынскі гарнітур буда-кашалёўскага строю складаўся з тунікападобнай кашулі з адкладным або стаячым каўнярам, ільняных ці суконных нагавіц і ўзорыстатканага пояса з вялікай гронкай кутасоў. Крой кашулі — адзін з самых старажытных, вядомых на тэрыторыі Беларусі. Яго сутнасць заключалася ў тым, што ў згорнутым удвая палотнішчы на перагібе праразалася дзірка для галавы.

Галаўныя ўборы мужчын нічым не адрозніваліся ад агульнанацыянальных. Гаворачы пра адметнасці буда-кашалёўскага строю, неабходна заўважыць, што ён вылучаўся ахраматычнасцю і дакладнасцю старадаўніх матываў, аднаколернай вышыўкай (чорнымі ці белымі баваўнянымі ніткамі), ювелірнай выверанасцю рамбічнага арнаменту. Мясцовая двухбаковая гладзь спалучаецца з сакаленнем, мярэжкай, аблямоўкай і найбольш характэрным для дадзенага строю маршчэннем, якое дазваляла ўтвараць рэльефныя ўзорыстыя складачкі.

Дз.Дз.Паўлавец.

Буда-кашалёўскія ручнікі

Традыцыйныя тканыя ручнікі, што вырабляюць народныя майстры вёсак Буда-Кашалёўскага, Гомельскага, Рэчыцкага раёнаў. Вядомы з сярэдзіны XIX ст. Даўжыня 130 — 360 см, шырыня 27 — 31 см. Ткуць з адбеленага кужалю або белай бавоўны (белька) палатняным перапляценнем. Аздабляюць на канцах узорыстым натыканнем (пераборамі) баваўнянымі ніткамі (гарынь, забалач), а таксама белымі карункамі, мохрыкамі, устаўкамі і нашыўкамі з чырвонага паркалю. У арнаментыцы пераважаюць геаметрычныя ўзоры (ромбы, зоркі-пальметкі, крыжыкі, вузкія паскі). Сустракаюцца і ручнікі, вышытыя зааморфнымі матывамі. Арнамент раўнамерна-шчыльны, без кампазіцыйных акцэнтаў, кампануецца ў клетачках, утвораных прама ці коса размешчанымі палосамі. Пераважаюць чорны, чырвоны або чорна-чырвоны колеры. Пераход узорыстай часткі канцоў да гладкага белага цэнтра досыць рэзкі. Уласцівыя ім узорыстасць, графічна-выразны арнамент складанага малюнку назіраюцца і ў афармленні народнага адзення, розных відаў мастацкіх тканін гэтай этнаграфічнай зоны.

М.Ф.Раманюк.

Друкуецца па кн.: Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 91.

Ручнік з в. Уваравічы. 1930-я гады.

Быццам спяваюць звонкія колеры

...У канцы XVII ст. у глухіх лясах ніжагародскіх зямель знаходзілі сабе прытулак раскольнікі-стараверы, некаторыя накіраваліся на гомельскую зямлю і заснавалі на ёй у тыя ж самыя часы Ветку. У Ветцы, каля Сожа, стваралася ткацкае мастацтва, не падобнае ні на якое іншае ў Беларусі, бо аб'ядналіся ў ім густы і традыцыі двух зямель.

І вось сустрэліся на выставе знакамітыя веткаўскія ручнікі вёскі Неглюбка з хахламскім роспісам майстроў горада Сяменава — сустрэліся парасткі адных старадаўніх каранёў.

Побач з неглюбскімі ручнікамі славутых дынастый Барсуковых, Кавалёвых — традыцыйнае па колерах ткацтва Цыбранковых з вёскі Сінічана Буда-Кашалёўскага раёна: Настассі Іванаўны, Марыі Андрэеўны, Надзеі Данілаўны, Марыі Лаўрэнцьеўны.

Вышываныя крыжам пано, вязанне — ад колішняга абруса да сучасных сурвэтак і каўнерыкаў — прадстаўляе на выставе дынастыя Васілеўскіх, таксама з вёскі Сінічына. Адна з малодшых у гэтай дынастыі, Людміла Мікалаеўна, не толькі ўмее цудоўна вышываць, але і збірае, прапагандуе народную творчасць, прысвяціла гэтаму жыццё і працуе дырэктарам Дома культуры вёскі Іволськ.

Быццам спяваюць на выставе звонкія, чыстыя колеры ручнікоў, працін, навалачак, што вышывалі сёстры Козыравы —

Любоў і Наталля, а з малодшых пакаленняў — Валянціна Гапонава і яе дачка Людміла. Не дзіва, што нараджаюцца пявучыя ўзоры ў руках майстрых, якія самі ўмеюць хараша спяваць і берагуць матчыну песню, старыя абрады. Любоў Ягораўна Козырава, Марыя Пятроўна Васілеўская, Наталля Іванаўна Цыбранкова — удзельніцы народнага фальклорнага калектыву «Сінічкі».

Кажуць, у Л.Я.Козыравай — не дом, а музей ткацтва і вышыўкі, а ў М.Л.Цыбранковай — дзве шафы ўзораў.

Выстава ў Гомелі — толькі невялічкая частка народнага мастацтва.

В.Лямцава-Канасевіч.

Творчасць продкаў зберaглі

Ліпа, Новая Ліпа, Лучынічы, Уютны, Баявы, Салаўёўка... Вёскі гэтыя «прыгаварыў» Чарнобыль, іх няма ўжо на карце раёна. Выплакаўшы сваё гора, людзі пакідалі абжытыя мясціны, увозячы з сабой усё нажытае гадамі нялёгкай працы. Паступова магла знікнуць унікальная культура аднаго з самабытных куточкаў Буда-Кашалёўшчыны. Магла б...Калі б не Любоў Пятроўна Карпава. Працавала яна тады загадчыцай Пыцькаўскага сельскага клуба.

«Памяць трэба захаваць пра тыя мясціны, пра людскія таленты» — так думала Любоў Пятроўна. І аднойчы яна пайшла да людзей, якія збіраліся пераязджаць на новае месца жыхарства, расказала ім пра сваю задумку — стварыць клуб-музей народных рамёстваў. Сяльчане зразумелі яе і аддавалі рэчы, да якіх сэрцам прыкіпелі. Колькі сцежак-дарожак прайшла Любоў Пятроўна з вёскі ў вёску! Затое зараз Пыцькаўскі дом-музей народных рамёстваў — установа даволі унікальная. Чаго тут толькі няма! Рэдкае ткацтва, вышыўка, вязанне, вырабы з лазы, дрэва, народныя іконы мясцовых мастакоў і яшчэ шмат розных рэчаў, што спрадвеку не толькі ўпрыгожвалі сялянскі быт, але і душу цешылі прыгажосцю, дасканалай тэхнікай выканання.

У кожнай выселенай вёскі быў свой, характэрны толькі для яе, від народнай творчасці. Напрыклад, Ліпа размяшчалася каля самага лесу, таму і славіліся мясцовыя майстры лозапляценнем, адмысловымі вырабамі з дрэва. А ў Новай Ліпе больш займаліся ткацтвам, бо многа льну вырошчвалі.

Але сабраць прадметы дэкаратыўна-прыкладной творчасці продкаў — гэта яшчэ паўсправы. Важна было даць усяму гэтаму працяг. І вось пыцькаўскія жанкі селі за кросны, хаця справа гэтая ў вёсцы



Выстаўка «Губіцкія посцілкі» ў сельскай бібліятэцы в. Губічы.

гадоў з 1960-х была закінута. І спакваля прыходзіла да іх майстэрства, якім цудоўна валодалі іх маці і бабулі. На градках і лён пачалі вырошчваць.

А зараз вырабы ткачых — тканыя ручнікі, вышываныя сурвэткі, абрусы, фартукі — можна бачыць на розных выставах вобласці. Соф'я Данілаўна Ратнікава, Марыя Паўлаўна Дзегцярова, Надзея Іванаўна Ганчарова, Сцепаніда Фядосаўна Міхалкіна, Любоў Пятроўна Карпава і іх малодшая сяброўка, зараз загадчыца клуба-музея Лідзія Кажамякіна — майстрыхі на ўсе рукі. У іх таленту таксама ёсць працяг. Вучаніцы мясцовай Акцябрскай школы — нярэдкія госці ў доме-музеі. Яны таксама спасцігаюць сакрэты старадаўніх рамёстваў.

Гомельская праўда. 1996. 6 крас.

Народны майстар

У Прыбарскай сельскай бібліятэцы шмат вырабаў з дрэва мясцовага мастака.

У знакамітай паэме Максіма Танка гаворыцца, што след творчасці Люцыяна Таполі — майстра па вырабе з дрэва цудаў — недзе згубіўся. А след не згубіўся, гэта майстэрства перанялі народныя ўмельцы. Сярод такіх творцаў і Мікалай Васільевіч Лебедзеў, жыхар вёскі Саўгасная, які працуе даглядчыкам жывёлы ў саўгасе «Чачора», а ў вольны час займаецца цікавай і карыснай справай. Свае думкі, багатую фантазію ўкладвае ў вырабы з дрэва, у якіх адлюстраваны і людзі, і жывёлы, і расліны, ды і ўсё жыццё ва ўсёй шматаблічнасці. Вырабы яго маюць аўтэнтычны характар і вызначаюцца самабытнымі рысамі, а яшчэ ў іх адлюстраванне сучаснага светабачання і светаадчування майстра.

І. Пісараў.

Каб добры след пакінуць

Нейк на адной з выстаў я ўбачыла прыгожыя маляўнічыя карціны, вышываныя рукамі. І мне захацелася сустрэцца з гэтым цудоўным майстрам.

З першага позірку я ўпэўнілася ў справядлівасці таго, што ўжо давялося чуць пра Ірыну Акімаўну Пруднікаву. Пажылая жанчына з ветлівай усмешкай сустрэла мяне ў бібліятэцы, дзе працуе зараз аператарам. Размаўляць з ёю было лёгка і цікава. Расказвала жанчына пра сваё жыццё-быццё, але больш хацелася ёй гаварыць пра сваё захапленне, пра тое, чым жыве душа, што радуе не толькі яе самую, але і акружаючых. Гэта карціны, якім аддае Ірына Акімаўна нямала часу, падбіраючы кожную нітачку. Акрамя таленту тут патрэбна яшчэ і цярплівасць, каб дзень у дзень накладваць на палатно малюнак.

Цікавасць да вышывання прывіла Ірыне яе бабка.

Так ужо склалася, што вышыванне не стала прафесіяй Ірыны Акімаўны, і займацца ім даводзілася толькі ў вольны час. Але гэта было для яе не толькі захапленнем, у гэтым уся яна, сэнс яе жыцця...

Жыццё Ірыны Акімаўны не вызначалася нічым асаблівым.

Нарадзілася яна ў 1933 г. у Мінску ў сям'і служачых. Калі Ірыне было ўсяго тры гады, памёр бацька. І тады маці з дзвюма дочкамі пераехала ў Буда-Кашалёва. Так і засталіся тут, тут прайшло ўсё жыццё Ірыны. Праўда, пасля атрымання сярэдняй адукацыі маладая дзяўчына не затрымалася ў бацькоўскай хаце, а падалася на Урал, у Чэлябінск, дзе і паступіла ў будаўнічае вучылішча. Атрымала спецыяльнасць нарміроўшчыка будаўнічай справы і на восем гадоў засталася ў Забайкаллі. У Буда-Кашалёва вярнулася ўжо дарослай, з разуменнем усіх складанасцей жыцця. Маці засталася адна, бо старэйшая дачка жыла ў Мінску, і Ірына вырашыла больш не пакідаць яе. Хутка ўладкавалася на працу ў ПМК і адпрацавала там да самай пенсіі. Але Ірыне Акімаўне не ў прывычку сядзець без справы, таму і знайшла яна сабе месца ў бібліятэцы.

Тут Ірыну Акімаўну любяць і паважаюць. Паважаюць за яе дабрыню, за чуласць, за адказнасць у адносінах да сваёй працы. Не менш любяць і яе карціны, якія ёсць, бадай, у кожнага знаёмага і сябра.

Н. Лутчанка.

Тут зберагаюць спадчыну

ШЫРОКАЎСКІ ДОМ РАМЁСТВАЎ

Заснаваны пры Шырокаўскім сельскім Доме культуры. Працуюць групы вязання, вырабаў мяккіх цацак, фларыстыкі (кветкі, пано), вырабаў з саломкі і інш. Аматарамі і кіраўнікамі розных творчых груп Дома рамёстваў з'яўляюцца Наталля Віктараўна Максіменка і Ніна Васільеўна Максіменка. З іх дапамогай і непасрэдным удзелам аматары клуба, дзеці школьнага ўзросту, штогод творча працуюць у гуртках, пераймаючы традыцыі мясцовых рамёстваў. Яны неаднаразова ўзнагароджваліся ганаровымі граматамі, дыпломамі і прызамі на раённых, абласных і рэспубліканскіх выставах дзіцячай творчасці. Асаблівых поспехаў дасягнула група фларыстыкі. Іх кампазіцыі кветак, пано неаднаразова адзначаліся на абласных выставах прызамі і прэміямі.

Ёсць пры Шырокаўскім доме рамёстваў і клас народнага танца. Пад кіраўніцтвам Ніны Васільеўны Максіменка тут займаюцца школьнікі 8—9-х класаў. У рэпертуары калектыву беларускія народныя танцы «Лявоніха», «Карапэт», «Каробачка», «Падыспан» і інш.

Калектыў — неаднаразовы ўдзельнік аглядаў-конкурсаў і аглядаў мастацкай самадзейнасці, быў лаўрэатам фестывалю «Беларусь — мая песня».

Народныя ўмельцы М.П.Дзегцярова і Н.І.Ганчарова ў Пыцькаўскім клубе-музеі народных промыслаў.

Вышывальшчыца з в. Гаўлі Л.Гурчанкова.

ПЫЦЬКАЎСКІ КЛУБ-МУЗЕЙ НАРОДНЫХ ПРОМЫСЛАЎ

Заснаваны ў складзе аматарскіх аб'яднанняў «Клапатлівая гаспадынька» і «Ткачыха». Тут займаюцца апрацоўкай і ткацкай справай. Кіраўнік — Дзіна Мікалаеўна Кумашова. У аб'яднаннях працуюць жанчыны пенсіённага ўзросту. Ткуць ручнікі, сурвэткі, вышываюць кашулі і ручнікі і інш. Калектывы ўдзельнічаюць у розных выставах народнай творчасці ў раёне і вобласці. Неаднаразова адзначаны дыпломамі і ганаровымі граматамі.

БУДА-ЛЮШАЎСКАЯ ШКОЛА НАРОДНАГА МАЙСТЭРСТВА

Працуе па трох напрамках народнага майстэрства: народныя інструменты, разьба па дрэве, вышыванне.

Групай навучання ігры на народных інструментах кіруе Вітольд Францавіч Гулевіч, таленавіты чалавек, які прывівае дзецям любоў да народнай музыкі. У рэпертуары калектыву беларускія і рускія народныя песні, музыка. Дзеці іграюць на гармоніках, балалайках, домрах і іншых інструментах, выступаюць на ўрачыстасцях, паспяхова ўдзельнічаюць у аглядах-конкурсах мастацкай самадзейнасці. Менавіта так адраджаецца і развіваецца традыцыйнае народнае інструментальнае мастацтва.

Групай навучэнцаў разьбе па дрэве кіруе Мікалай Васільевіч Брайчук. Выразаюць з дрэва абрамленне, вешалкі, падстаўкі для кветак, тэлефонаў і інш. Неаднаразова прымалі ўдзел у выставах народнай творчасці раёна і вобласці, узнагароджаны граматамі.

Групай вышывальшчыц кіруе Ларыса Сяргееўна Новікава. Тут вучні 8—9-х класаў паспяхова пераймаюць прамудрасці вышыўкі цудоўных традыцыйных беларускіх арнаментаў і малюнкавых упрыго-

жанняў. Удзельнікі раённых мастацкіх выстаў.

ІВОЛЬСКІ ЦЭНТР ФАЛЬКЛОРУ

Пры цэнтры працуюць аматарскія аб'яднанні «Вяргіначка» і «Клапатлівая гаспадынька». У іх займаюцца школьнікі ад 10 да 16 гадоў. Вывучаюць ткацкую справу, вышыванне. Навучэнцы ўдзельнічаюць у раённых і абласных выставах-аглядах. На абласным аглядзе-конкурсе на лепшае аматарскае аб'яднанне абодва калектывы былі адзначаны ганаровымі граматамі. Кіраўнік творчых аб'яднанняў — Людміла Мікалаеўна Стахавец, таленавіты і адданы аматарскай справе чалавек.

Працуе пры цэнтры і клас навучання ігры на народных інструментах. Кіраўнік — Пётр Дзмітрыевіч Бобікаў. У рэпертуары гурта беларускія і рускія народныя песні.

СТАРАБУДСКІ ДОМ НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЫ

Сумесна з аднавяскоўцамі, аматарамі народнай медыцыны з в. Старая Буда, Ніна Уладзіміраўна Сярэбраная арганізавала пры сельскім клубе аматарскае аб'яднанне «Здароўе». Здаўна старабудцы займаюцца зборам лекавых траў і гатуюць лекі. З пакалення ў пакаленне перадавалася гэта традыцыя. Ніна Уладзіміраўна кіруе дзіцячым гуртком народнай медыцыны. Школьнікі ва ўзросце ад 13 да 15 гадоў з задавальненнем прымаюць удзел у вывучэнні і зборы лекавых траў, гатункаў лекаў. Калектыў аматарскага аб'яднання ўдзельнічае ў выставах мясцовага і раённага маштабу.



Н.У.Сярэбраная.

ГУБІЦКІ ДОМ РАМЁСТВАЎ

Пры Доме рамёстваў працуюць класы апрацоўкі льну і ткацтва, апрацоўкі дрэва, вышывання.

Кіраўнік класа апрацоўкі льну і ткацтва — Лілія Васільеўна Торманава. Ткуць ручнікі і сурвэткі дзеці школьнага ўзросту. Лілія Васільеўна перадае старадаўнія прыёмы ткацтва льну, вышыўкі. Аматарскае аб'яднанне захоўвае высокі ўзровень ткацтва мастацкіх рэчаў, адзінак убранства і адзення. Зробленыя дзіцячымі рукамі ручнікі і сурвэткі неаднаразова ўпрыгожвалі выставы народных рамёстваў у раёне і вобласці, адзначаны ганаровымі граматамі.

Фрагмент этнаграфічнай экспазіцыі ў Івольскім цэнтры фальклору.

Майстрыха па ткацтве і вышыўцы з в. Губічы П.С.Філіч.

Класам апрацоўкі дрэва кіруе Уладзімір Мікалаевіч Кайтанаў. Тут захоўваюцца старадаўнія мастацкія прыёмы разьбы па дрэве, выпрацоўкі дэталей і вырабаў. Творы гэтага аб'яднання ўдзельнічалі ў раённых выставах народнай творчасці.

Класам вышыўкі і інкрустацыі саломкай кіруе Таццяна Міхайлаўна Маскалюк. Вышываюць ручнікі, кашулі, сурвэткі. Зробленыя тут рэчы карыстаюцца попытам у мясцовых жыхароў. Лепшыя творы паспяхова дэманструюцца на раённых і абласных выставах самадзейнага мастацтва і народнай творчасці.

НЕГАЎСКІ ДОМ ФАЛЬКЛОРУ

Здаўна ў Негаўцы жанчыны займаюцца вышыўкай, упрыгожваюць убранства кватэры, адзенне рознакаляровымі ўзорамі, вышываюць ручнікі, сурвэткі, кашулі і інш. Пры сельскім клубе працуе і дом фальклору. Менавіта традыцыйныя арнаменты і матывы беларускага фальклору адраджаюцца ў творчасці негаўскага гурта вышыўкі, якім кіруе Таццяна Дзмітрыеўна Асіпцова. Аматары гурта — вучні мясцовай школы — паспяхова ўдзельнічаюць у школьных выставах, у выставах цэнтра фальклору.

І.В.Куніца.

Народныя калектывы Буда-Кашалёўшчыны

Ансамбль «Крыніцы» Іванаўскага сельскага клуба. Створаны ў 1973 г. аматарам народнай песні Нінай Сцяпанаўнай Казловай. Мастацкі кіраўнік Людміла Аляксееўна Ісайчыкава.

У рэпертуары беларускія народныя песні «Святыя вечары», «Красна-красна каліна», «Хадзіла-скакала», «Зімушка-зіма», «Драма», «Благавешчанне», «Зялёненькі падарожнік», «Мамачка, дазволь мне на ручнічок стаць» і інш.

Ансамбль — удзельнік рэспубліканскіх, абласных, раённых фестываляў, аглядаў, свят. Дыпламант Рэспубліканскага фестывалю народнага танца «Пярэзвы-92», Усесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці, міжнароднага фестывалю «Беларуская полька». Званне народнага прысвоена ў 1993 г.

Ансамбль «Крыніцы» ў час святкавання Купалля.

Ансамбль «Сінічкі» Івольскага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1989 г. Мастацкі кіраўнік ансамбля П.Д.Бобікаў. Аснову ансамбля складаюць жыхары в. Сінічына. У ансамблі 30 чалавек. Сярод іх ёсць і сямейныя дынастыі — Козыравы, Васілеўскія і інш. Старэйшай удзельніцы ансамбля Н.Д.Бобікавай — ужо больш за 80 гадоў, але калі яна выходзіць на сцэну з бубнам, яе голас і манера спеваў аказваюць незвычайнае ўражанне на слухачоў. Удзельнікаў калектыву аб'ядноўвае вялікая любоў да народнай песні і музыкі. У рэпертуары народныя і аўтарскія песні беларускіх, рускіх і ўкраінскіх кампазітараў.

«Сінічкі» — удзельнік шматлікіх свят і мерапрыемстваў раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўню, лаўрэат 1-га Міжнароднага фестывалю фальклору ў Пінску, дыпламант фестывалю «Чачэрская полька», 1-га фестывалю «Беларусь — мая песня». Званне народнага прысвоена ў 1993 г.

Жаночы вакальны ансамбль «Калініца» Камунараўскага Дома культуры Гомельскай бройлернай фабрыкі. Створаны ў 1974 г. Першым кіраўніком ансамбля быў Мікалай Сямёнавіч Сапуноў.

Мастацкі кіраўнік У.М.Птушанёнак, хормайстар С.А.Каплан. Гонар ансамбля — яго старэйшыя ўдзельнікі: Л.А.Гусева, Л.І.Кароўкіна, В.В.Няплюева, В.П.Кір'янава, сёстры Т.А.Пашкіна, Г.А.Ермакова, В.А.Мядзведзева, таксама актыўнымі ўдзельнікамі з'яўляюцца Н.А.Кашлачова, Н.А.Ткачова, харэограф Н.М.Кончыц і інш.

Аснову рэпертуару складаюць беларускія народныя песні, у т.л. «Калініца», «Ой, вярбічанька, бела лічанька», раманс «Ой, ты, сэрца» і іншыя, песні беларускіх і рускіх кампазітараў.

Калектыў вядзе актыўную канцэртную дзейнасць, удзельнічае ў абласных, раённых конкурсах мастацкай самадзейнасці, неаднаразова ўзнагароджваўся дыпломамі і ганаровымі граматамі. У 1998 г. ансамбль стаў дыпламантам 1-га Беларускага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь — мая песня». Званне народнага прысвоена ў 1999 г.

Хор Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа. Створаны ў 1968 г. Мастацкія кіраўнікі С.А.Каплан, У.М.Птушанёнак. У хоры спявае 36 чалавек.

Рэпертуар калектыву адрозніваецца разнастайнасцю: тут прысутнічаюць беларускія, рускія, украінскія народныя і аўтарскія песні.

Хор вядзе пастаянную канцэртную дзейнасць у межах Беларусі. Сістэматычна ўдзельнічае ў святах і мерапрыемствах рознага ўзроўню: ад раённага да рэспубліканскага. Калектыў удастоены шматлікіх узнагарод за сваю плённую дзейнасць, стаў дыпламантам фестывалю «Беларусь — мая песня». Званне народнага прысвоена ў 1988 г.

І.В.Куніца.

Аўтэнтычны гурт Дзербіцкага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1977 г. Арганізавала і сабрала аматараў песні

Ансамбль «Сінічкі».

Галіна Георгіеўна Майсеенка, дырэктар Дзербіцкага сельскага Дома культуры.

У рэпертуары народныя песні, якія бытуюць у в. Дзербічы, у т.л. шчадроўныя («Ай, у ляску, ляску, на жоўтым пяску», «Ой, у лузе», «На новае лета», «Ой, вясна, вясняначка»), карагодныя («Сонца нізка», «Із-пад лесу, лесу цёмнага»), жніўныя («Ад мяжы да мяжы», «Ой, да па полю, да па чыстаму, тудою ішла маць Прачыстая»), восеньскія («Ой, мамачка-восень»), пазаабрадавыя («Зоркі вецер усе павівае», «Калініца», «У зялёным садзе», «Сонца нізка, вечар блізка»).

Калектыў мастацкай самадзейнасці пастаянна прымае ўдзел у розных фестывалях, святах, абрадах. У раённых аглядах неаднаразова з'яўляўся лідэрам і займаў прызавыя месцы. У 1990 г. удзельнічаў у аглядах-конкурсах — у рамках праграмы «Спадчына», дзе заняў 3-е месца, і абрадавых свят, дзе выступаў са святам «Пакровы» і заняў 2-е месца.

Фальклорны гурт «Весялухі» Буда-Люшаўскага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1963 г. Мастацкі кіраўнік Вітольд Францавіч Гулевіч. У калектыве 24 удзельнікі. У рэпертуары беларускія народныя песні «Звіняць, звіняць звончыкі», «Ой, доля мая », «Ехаў Ясь на кані», «Ой, за гаем, гаем», «Ой, ты, Галя», «Гуляю я», «Чубаценькі верабей», полька «Янка». Цудоўна гучыць гумарыстычная народная песня «Як я служыў у пана» ў выкананні салістаў Георгія Баркова і Ларысы Новікавай (дырэктар Буда-Люшаўскага СДК). Калектыў вядзе пастаянную канцэртную дзейнасць, удзельнічае ў мерапрыемствах розных узроўняў, штогод займае прызавыя месцы ў раённых аглядах-конкурсах на лепшую пастаноўку фальклорнага свята «Пад белымі крыламі». Акампаніруе гурту дзіцячы інструментальны ансамбль «Гармонь, балалайка».

Фальклорны гурт «Губічанка». Створаны ў 1987 г. пры Губіцкім сельскім Доме культуры. Спяваюць 10 чалавек. Кіраўніком гурта з пачатку яго існавання з'яўляецца Ірына Віктараўна Гардзіенка.

«Губічанка» — пастаянны ўдзельнік раённых свят і конкурсаў. З канцэртнымі праграмамі выступае ў роднай і суседніх вёсках. Вядзе пошукавую працу па адраджэнні і захаванні песенна-абрадавага фальклору сваёй вёскі. У рэпертуары толькі беларускія народныя песні, у т.л. «А зязюля куе», «Азерачка», «Што й на гары два дубкі». Адноўлены і паказаны на сцэне абрады трэцяга дня вяселля — «Куры», «Хрысціны», «Прачыстая» і інш.

Фальклорны гурт «Жамчужына». Створаны ў 1984 г. па ініцыятыве дырэктара Чабатовіцкага сельскага Дома культуры Алены Паўлаўны Шаўчэнка. Зараз ім кіруе Святлана Іванаўна Валасевіч. Спяваюць 15 жанчын.

Калектыў вядзе плённую працу па адраджэнні песенна-абрадавага фальклору

Выступае фальклорны ансамбль «Спадчына».

сваёй вёскі. У рэпертуары такія абрадавыя песні, як «Гуканне вясны» і песні вясельнага цыкла, народныя песні («Куры, мае куры», «Ой,пад вішанькай», «Ой, аралі хлопцы ніву», «Ой, у полі крынічанька», «Камора».

Калектыў удзельнічае ў раённых святах і аглядах. У 1999 г. у раённым аглядзе-конкурсе на лепшую пастаноўку фальклорнага свята стаў адным з прызёраў.

Фальклорны гурт «Зорачкі». Створаны ў 1965 г. Спяваюць 18 жанчын. Кіраўніком гурту з моманту заснавання з'яўляецца Глазунова Зінаіда Васільеўна — мастацкі кіраўнік Шарыбаўскага сельскага Дома культуры. У калектыве на працягу амаль 34 гадоў разам спяваюць М.Б.Круглякова, Т.Г.Мядзведзева,Ф.В.Аляковіч.

У рэпертуары беларускія народныя песні «Не свяці, месячэнька», «За горою у колодца», «Восень наступае», «Вылецела зязюля», «Ой,восень мая», «На гарэ дзеўка пшанічаньку мае», «Ярынка-ярына», «Ляцелі гусачкі праз сад» і інш.

Гурт пастаянна ўдзельнічае ў раённых, абласных святах, фестывалях, конкурсах, выступае з канцэртнымі праграмамі ў роднай і суседніх вёсках.

Фальклорны гурт «Спадчына». Створаны ў 1990 г. пры Негаўскім сельскім Доме культуры. Яго заснавальнікам і кіраўніком была Валянціна Фёдараўна Усціненка. Потым «Спадчыну» ўзначальвалі Ганна Аляксандраўна Старасотнікава, Таццяна Дзмітрыеўна Асіпцова. Спяваюць 15 жанчын. У рэпертуары беларускія песні «Ляснік», «Вішнёвы сад», «Каваль», «Сумная песня», «Дзве лябёдкі».

Калектыў актыўна ўдзельнічае ў раённых святах і мерапрыемствах. Вялікую работу вядзе па адраджэнні мясцовых абрадаў, песеннага і танцавальнага скарбаў сваёй вёскі.

Музеі Буда-Кашалёўшчыны

МУЗЕЙ БУДА-КАШАЛЁЎСКАЙ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ № 1

Заснаваны 22 красавіка 1964 г. Ініцыятарамі яго стварэння сталі настаўнікі школы А.С.Юркоў, Р.У.Салаўёва, М.М.Шчыракоў і інш.

Кожнаму настаўніку школы, кожнаму вучню ў справе стварэння музея знайшоўся занятак. Восенню 1963 г. быў арганізаваны савет будучага музея, куды ўвайшлі 20 актывістаў з вучняў і 5 настаўнікаў. Размеркавалі абавязкі: Якіменка Саша, Салаўёва Вольга, Кавалёў Саша наладжвалі сувязі са старэйшымі ўдзельнікамі рэвалюцыйнай барацьбы на Буда-Кашалёўшчыне, Ануфрыева Яўгенія і Тукаленка Галя адказвалі за працу школьнага клуба «Дружба», Лукомскі Уладзімір і Шаўчэнка Дзмітрый — за падрыхтоўку макетаў, стэндаў, мэблі для музея, Аляксейкаў Іван і Лаўрыненка Ала — за падрыхтоўку экскурсаводаў, Сальнікава Людміла — за бібліятэку, старшыня савета музея Барадзіна Людміла за падрыхтоўку і правядзенне пасяджэнняў савета музея.

Юныя краязнаўцы наладжвалі сувязь са знакамітымі землякамі, вядучымі музеямі краіны, мастакамі, пісьменнікамі, землякамі — наватарамі вытворчасці, ветэранамі вайны і працы.

Музей размеркавалі ў прасторным светлым пакоі плошчай больш за 100 м^2.

Урачыстае адкрыццё музея прайшло ў прысутнасці актыўнага ўдзельніка рэвалюцыйных падзей 1917 г. С.Я.Жданко і Героя Савецкага Саюза Э.В.Лаўрыновіча, прадстаўнікоў партыйных, камсамольскіх і савецкіх органаў вобласці і раёна, журналістаў і абласнога тэлебачання, настаўнікаў школ, вучняў.

29 мая 1964 г. Гомельская тэлестудыя арганізавала перадачу, прысвечаную стварэнню і рабоце музея. І сапраўды, музей працаваў па шматлікіх накірунках. Савет музея арганізоўваў сустрэчы, праводзіў экскурсіі вучняў і настаўнікаў у вядучыя музеі краіны. Зацвердзілі Кнігу гонару, куды заносілі прозвішчы лепшых вучняў, пераможцаў спартыўных спаборніцтваў, конкурсаў і алімпіяд. Кніга адкрылася фотаздымкам першага старшыні савета музея Любы Кухарэнка.

Ганаровымі членамі савета музея сталі славутыя землякі — двойчы Герой Савецкага Саюза П.Я.Галавачоў, дэлегат 2-га з'езда Саветаў К.Р.Новікаў, персанальны пенсіянер С.Я.Жданко, Герой Савецкага Саюза Э.В.Лаўрыновіч, пісьменнік М.Ц.Лынькоў.

Конкурсы піянерскіх дружын школы

ва ўдзеле па афармленні музея, Ленінскія чытанні, навукова-практычныя канферэнцыі, экскурсіі па месцах рэвалюцыйных і баявых падзей на Буда-Кашалёўшчыне, сустрэчы з удзельнікамі гэтых падзей, нашымі землякамі пашырылі сувязі юных краязнаўцаў. У хуткім часе бібліятэка музея налічвала больш за 2000 кніг на 22 мовах народаў СССР і краін замежжа.

18 красавіка 1966 г. пастановай бюро Буда-Кашалёўскага РК КПБ і райвыканкома музею прысвоена званне народнага.

Сёння ў музеі больш за 7 тыс. экспанатаў.

Працуюць два аддзелы: першы — прысвечаны жыццю і рэвалюцыйнай дзейнасці У.І.Леніна, другі — баявой і працоўнай славе землякоў-будакашалёўцаў.

Спецыяльны падраздзел прысвечаны падзеям рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, якія адбываліся на Буда-Кашалёўшчыне. Асобна паказаны падзеі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, дзейнасць падполля і партызанскага руху на Буда-Кашалёўшчыне, людзі — актыўныя ўдзельнікі барацьбы з акупантамі.

Выдзелены стэнды, прысвечаныя генералу М.А.Прышчэпу, які загінуў у жніўні 1941 г. у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і пахаваны ў Буда-Кашалёве. Таксама асобны раздзел прысвечаны нашаму земляку віцэ-адміралу В.П.Драздү, які загінуў пры абароне Ленінграда ў 1943 г. Захоўваюцца ўспаміны чэшскага патрыёта Уладзіслава Дынды, які змагаўся супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў на тэрыторыі раёна ў складзе партызанскага злучэння і інш.

Члены савета музея вядуць перапіску са знакамітымі людзьмі: пісьменнікамі, касманаўтамі, вучонымі, дзеячамі мастацтва. У вітрынах музея з дароўнымі надпісамі кнігі пісьменнікаў М.Танка, П.Броўкі, Я.Брыля, М.Ісакоўскага, Р.Раждзественскага, Г.Серабраковай, А.Твардоўскага, В.Інбер, М.Шагінян, К.Сіманава і інш.

Асабліва цікавымі з'яўляюцца ўспаміны непасрэдных удзельнікаў гістарычных падзей М.І.Ігнацюка, А.К.Жураўлёва, А.А.Вадзюціна, К.Р.Новікава, В.В.Царыка, Г.Ф.Сцепаненкі, А.С.Юркова, С.В.Голухавай, Г.Ф.Пасько і іншых.

Сабраны багаты ілюстрацыйны матэрыял аб нашых земляках, знакамітых людзях. Праводзяцца сустрэчы, перапіска і канферэнцыі з удзелам тых, кім ганарыцца наша Буда-Кашалёўшчына.

У кнізе наведвальнікаў музея пакінулі свае ўражанні беларускі пісьменнік-сатырык Міхась Скрыпка, абаронца Брэсцкай крэпасці П.Клыпа, двойчы Герой Савецкага Саюза генерал-лейтэнант П.Я.Галавачоў, навуковы супрацоўнік У.Драянкоў.

З кожным годам аднаўляюцца і ўзбагачаюцца экспанаты музея, пашыраюцца сувязі і актыўная выхаваўчая работа савета музея па патрыятычным выхаванні вучняў школ горада і раёна.

І.У.Уласава.

МУЗЕЙ АГРАРНА-ТЭХНІЧНАГА КАЛЕДЖА

Аграрна-тэхнічны каледж — адна са старэйшых навучальных устаноў Буда-Кашалёўшчыны. Свой пачатак бярэ ад Полацкай ніжэйшай лясной школы, заснаванай у 1902 г. У 1912 г. школу перавялі ў Кашалёўскае лясніцтва і пераўтварылі ў Буда-Кашалёўскую лясную школу. У 1921 г. на яе базе створаны лясны тэхнікум, які ў 1956 г. рэарганізаваны ў тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі, а ў 1991 г. — у аграрна-тэхнічны каледж.

У 1972 г. было вырашана арганізаваць музей баявой і працоўнай славы. Стварылі савет, пошукавую групу «Чырвоны гваздзік». Пачалася перапіска з ветэранамі партызанскай брыгады імя Чапаева, 1-й Буда-Кашалёўскай імя Шчорса, устанавілі сувязь з былымі камандзірамі М.Дз.Сцефановічам, А.П.Байковым, Э.В.Лаўрыновічам, А.М.Дземчанкам, камісарамі С.П.Каспруком, С.І.Касьянавым, многімі партызанамі. Так была створана экспазіцыя «Партызанскі рух на Буда-Кашалёўшчыне», якая ўключае ўспаміны, копіі ўзнагародных лістоў і асабістых дакументаў, фатаграфіі, асабістыя рэчы, ордэнскія кніжкі і знакі. У выніку ў пакоі, вылучаным для музея, з'явілася пяць экспазіцый і панарама Лозаўскага бою. У 1974 г. адкрыты пакой баявой славы. Але для музея матэрыялаў было недастаткова, таму працягвалася пошукавая і даследчая работа, якой кіравала выкладчыца гісторыі Вера Аляксандраўна Манькоўская.

Пашырыўся дыяпазон пошуку. Пашанцавала звязацца з камандзірам 96-й Гомельскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава дывізіі генералам Ф.Г.Булатавым,

якая вызваляла Буда-Кашалёўскі раён. З атрыманага фактычнага матэрыялу аформілі тры экспазіцыі ў гонар гэтай дывізіі. Вызначылі, што тэрыторыю саўгаса-тэхнікума вызвалялі часці Бранскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава II ступені дывізіі. Наладзілі сувязь з камандзірам дывізіі С.Ф.Украінцам і сакратаром савета ветэранаў дывізіі Ф.П.Гожавым, з саветам ветэранаў 4-й Бежыцкай стралковай дывізіі. У выніку ў музеі былі аформлены яшчэ дзве экспазіцыі дакументаў і фотаматэрыялаў.

З чэрвеня 1981 г. быў адкрыты музей баявой і працоўнай славы. Пошук новых дакументаў і матэрыялаў для музея працягваўся. Савету ўдалося наладзіць кантакт з ветэранамі 282-й Гомельскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава II ступені знішчальнай авіяцыйнай дывізіі, у склад якой уваходзілі 774-ы Берлінскі ордэнаў Суворава і Аляксандра Неўскага знішчальна-авіяцыйны полк (камандзір М.М.Найдзенка), 517-ы Калінкавіцкі ордэна Суворава знішчальны авіяполк (камандзір С.В.Баранаў) і 127-ы знішчальны авіяполк (камандзір В.В.Кузейкін), асабіста з камандзірам гэтай дывізіі гвардыі генерал-маёрам Юрыем Міхайлавічам Беркалем. Генерал Беркаль аказаў вялікую дапамогу ў пошуку ветэранаў і матэрыялаў па гісторыі гэтай дывізіі. У выніку былі разгорнуты яшчэ дзве экспазіцыі баявога шляху гэтай дывізіі.

У музеі ўвекавечана памяць пра нашых землякоў — Герояў Савецкага Саюза і выдатных военачальнікаў П.Я.Галавачова, А.Л.Ісачанку, Э.В.Лаўрыновіча, С.А.Панамарова, А.Т.Краўцова, В.П.Дразда, Ф.С.Драянкова, подзвігі нашай зямлячкі С.В.Голухавай, удастоенай вышэйшай узнагароды Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа — залатога медаля Флорэнс Найцінгейл.

Памяці загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну партызан прысвечана пяць экспазіцый. Ва ўрочышчы Кардон, на беразе Дняпра, пастаўлены помнік у гонар камсамольцаў-падрыўнікоў партызанскай брыгады імя Чапаева, якія загінулі ў барацьбе з ворагам. Права перарэзаць стужачку пры адкрыцці помніка атрымалі камсамольцы саўгаса-тэхнікума, члены клуба «Чырвоны гваздзік», тыя, хто вёў пошук і ўстанавіў імёны загінуўшых.

За актыўны ўдзел у ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі саўгас-тэхнікум быў узнагароджаны граматамі Савецкага камітэта ветэранаў вайны і Беларускага рэспубліканскага Савета ветэранаў вайны.

У музеі сабраны і дэманструецца багаты матэрыял па гісторыі раёна. Адкрыты этнаграфічны аддзел. Аформлена шэсць экспазіцый. Працоўнай славе дасягненняў саўгаса-тэхнікума прысвечана 16 экспазіцый, работнікам музея, ветэранам вайны — 2.

На 79 стэндах размешчана 788 фатаграфій, 33 дакументы знаходзяцца ў вітрынах, у архівах музея — 775 экспанатаў, больш за 100 фотаілюстрацый.

Плошча музея 200 м². Уваход асобны.

За вялікую плённую ідэйна-выхаваўчую работу па патрыятычным выхаванні моладзі пастановай калегіі Міністэрства

У музеі аграрна-тэхнічнага каледжа. 2001 г.

У школьным музеі ў в. Гаўлі.

культуры БССР № 42 ад 29 красавіка 1987 г. музею прысвоена званне народнага.

Вялікая роля ў арганізацыі музея і выхаваўчай рабоце належыць савету музея. Непасрэдную арганізатарскую і выхаваўчую работу ў музеі з 1981 г. праводзілі намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце В.І.Янчанка, пошукавую работу — ветэран працы, выдатнік народнай асветы В.А.Манькоўская.

Т.А.Бяланава.

ГАЎЛЕЎСКІ ШКОЛЬНЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ

У пачатку 1960-х гадоў у в. Гаўлі быў адкрыты першы ў раёне школьны музей. Ён меў аддзелы гісторыі вёскі ад старажытнасці да сучаснасці, гісторыі школы і гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Пад кіраўніцтвам настаўнікаў вучні збіралі, афармлялі, зберагалі каштоўныя матэрыялы і далучаліся тым самым да гісторыі сваёй малой радзімы. Дзякуючы руплівай дзейнасці юных краязнаўцаў удалося ўзнавіць нямала забытых старонак гісторыі, устанавіць прозвішчы загінуўшых у вайну землякоў. Захоўваюцца фатаграфіі, дакументы, розныя рэчы, якія расказваюць аб людзях вёскі, іх сем'ях, радаводах. Тут праводзяцца тэматычныя ўрокі амаль па ўсіх прадметах, пасвячэнні ў земляробы выпускнікоў школы. Галоўныя спецыялісты калгаса, кіраўнікі сярэдняга звяна — у большасці былыя выпускнікі школы.

У музеі нярэдка праходзяць міжшкольныя і раённыя мерапрыемствы: экскурсіі, адкрытыя ўрокі, семінары настаўнікаў, кіраўнікоў школ.

М.А.Казакоў.

З гісторыі населеных пунктаў

БУДА-КАШАЛЁВА, горад, цэнтр раёна, за 18 км ад аўтастрады Санкт-Пецярбург — Адэса.

Вядомы з XIX ст. як вёска Буда ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні, дзяржаўная ўласнасць. У 1824 г. у складзе казённага маёнтка Кашалёва. У другой палавіне XIX ст. вёска, 95 жыхароў. Мелася карчма. У 1873 г. праз тэрыторыю Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні была пракладзена чыгунка і на карце таго ж года ўпершыню было адзначана «...чыгуначная станцыя III класа Буда-Кашалёўская». У 1880 г. вёска, 28 двароў, 250 жыхароў. У 1888 г. заснавана прадпрыемства па вырабе драўляных дэталей для ткацкіх станкоў. У 1890 г. тут працавала 15 рабочых, у тым жа годзе быў уведзены паравы млын. Паводле перапісу 1897 г., у Буда-Кашалёве налічвалася 517 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска адносілася да Міхайлаўскай царквы Кашалёў-

скага праваслаўнага прыхода. У 1905 г. на чыгуначнай станцыі Буда-Кашалёўская, якая была апошняя ў Рагачоўскім павеце, грузілася да 90 тыс. пудоў лясных грузаў. У 1907 г. епархіяльным ведамствам была адкрыта школа. У 1909 г. 57 двароў, 370 жыхароў. На чыгуначнай станцыі жыло 74 жыхары. Напярэдадні 1-й сусветнай вайны тут было 58 двароў, ветраны млын, вінная лаўка, хлебазапасны магазін, паштова-тэлеграфнае аддзяленне. У 1914 г. для школы быў пабудаваны будынак. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У сакавіку — лістападзе 1918 г. веску акупіравалі войскі кайзераўскай Германіі. З красавіка 1919 г., у сувязі з ліквідацыяй Магілёўскай губерні, Рагачоўскі павет (у т.л. Буда-Кашалёва) увайшоў у склад Гомельскай губерні, якая тады адносілася да РСФСР. 28 мая 1923 г. адміністрацыйны цэнтр воласці перанесены з с. Кашалёва ў в. Буда-Кашалёва. Архіўныя дакументы сведчаць, што ў 1923 г. мястэчка Буда-Кашалёва складалася з чатырох зямельных таварыстваў: Буда-Кашалёва, выселак Івонь-1, Івонь-2 і Баравая Карма. З сакавіка 1924 г. у складзе БССР, у Бабруйскай акрузе. 17 ліпеня 1924 г. утвораны Буда-Кашалёўскі раён (першы старшыня райвыканкома — Аляксандр Мікалаевіч Юрашкевіч). Пачалося будаўніцтва аграцэнтра, бальніцы, пракатнай станцыі трактароў, сельгастэхнікі, ветлячэбніцы. Працавала школа 1-й ступені, гурток па ліквідацыі непісьменнасці, бібліятэка.

Паводле перапісу 1926 г., 269 двароў, 1163 жыхары. На чыгуначнай станцыі было 23 двары, 95 жыхароў.

З 27.10.1927 г. Буда-Кашалёўскі раён у складзе Гомельскай акругі. Да 1932 г. у Буда-Кашалёве пабудавалі памяшканне сямігадовай школы, амбулаторыю, пажарнае дэпо, цагляную кузню на Красным Кургане, двухпавярховы цагляны будынак райвыканкома. Выдавалася шматтыражная раённая газета «Ленінскі шлях».

У 1938 г. вёску Буда-Кашалёва Гомельскай вобласці перайменавалі ў гарадскі пасёлак. У 1939 г. тут пражывала 3400 чалавек.

Са жніўня 1941 г. да 27.11.1943 г. населены пункт знаходзіўся пад акупацыяй нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У кастрычніку — снежні 1941 г. акупанты загубілі каля 500 мірных жыхароў.

У горадзе і на тэрыторыі раёна дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ. Падпольна выдавалася газета «Ленінскі шлях». Вызвалены ў ходзе Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 1943 г. войскамі 4-й стралковай дывізіі і 231-га танкавага палка 48-й арміі Беларускага фронту.

У пасляваенныя гады аднавілі сваю працу райпрамкамбінат, абозна-мэблевая арцель, райхарчкамбінат, млын, маслабойня і МТС. У 1959 г. тут пражывала 4600, а ў 1969 г. — 7200 жыхароў. Да 1970-х гадоў многія буда-кашалёўскія майстэрні і арцелі перараслі ў буйныя заводы — маслсыразавод, кансервавы, хлебазавод.



Уезд у г. Буда-Кашалёва.

31 снежня 1971 г. г.п. Буда-Кашалёва пераўтвораны ў горад раённага падпарадкавання. Дзейнічаюць камбінат бытавога абслугоўвання, лясгас, райаддзяленне дзяржкамсельгастэхнікі, аграрны каледж, 2 сярэднія і 2 спартыўныя (мужчынская і дзіцяча-юнацкая) школы, Дом культуры, 2 бібліятэкі, бальніца. Выдаецца раённая газета «Авангард».

Разгортваецца гарадское будаўніцтва цэнтра і мікрараёна са шматпавярховымі жылымі дамамі, грамадскімі пабудовамі. Горад набывае прамавугольную структуру вуліц, якія ў асноўным па-ранейшаму забудаваны аднапавярховымі драўлянымі будынкамі.

Чыгунка ў паўднёвай частцы горада аддзяляе раён, дзе размешчаны чыгуначная станцыя і вакзал. Грамадскі цэнтр фарміруе цэнтральная плошча і вуліца імя Леніна.

Радзіма віцэ-адмірала В.П.Дразда, народнага артыста БССР Я.Ф.Пятрова.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ці памерлі ад ран пры вызваленні Буда-Кашалёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — на паўночна-заходняй ускраіне горада, на тэрыторыі аграрнатэхнічнага каледжа. У 1952 г. пастаўлены абеліск.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў лістападзе — снежні 1943 г. у час вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, размешчана ў цэнтры горада. У 1960 г. пастаўлены помнік, рэканструяваны ў 1990 г.

Помнік земляку двойчы Герою Савецкага Саюза, ганароваму грамадзяніну г. Буда-Кашалёва П.Я.Галавачову. У 1951 г. пастаўлены бронзавы бюст.

Помнік земляку віцэ-адміралу В.П.Дразду — стэла ў выглядзе насавой часткі карабля з рэльефнай выявай віцэ-адмірала каля штурвала, на скрыжаванні вуліц імя Леніна — Лугавой. Пастаўлены ў 1968 г.

Магіла ахвяр фашызму. За 1,5 км на паўночны захад ад горада. Пахаваны 483 мірныя жыхары Буда-Кашалёва, расстраляныя акупантамі ў снежні 1941 г. На магіле пастаўлены абеліск.

Мемарыяльная дошка выхаванцам школы. Вул. Пушкіна, 2, на будынку былой сярэдняй школы № 1 (зараз раённы Дом піянераў). Устаноўлена ў 1966 г. на ўшанаванне памяці 16 выпускнікоў школы, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Курган Славы. Насыпаны ў 1971 г. на ўшанаванне памяці савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі раёна.

Магіла капітана Маладзёнкава Васіля Міхайлавіча, начальніка Буда-Кашалёўскага райаддзела МДБ. Загінуў 17.5.1950 г. пры выкананні службовых абавязкаў. У 1950 г. пастаўлены абеліск.

АКЦЯБР (да 30 снежня 1961 г. Сталіна), вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Краснаакцябрскі», 337 двароў, 880 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вуліца 50 гадоў Кастрычніка ў г. Буда-Кашалёва.

Археалагічны курганны могільнік, які размешчаны на паўночна-заходняй ускраіне вёскі, сведчыць, што гэта мясцовасць была заселена людзьмі яшчэ ў старажытнасці. Вядома з 1920-х гадоў як пасёлак, які ўзнік на былых памешчыцкіх землях пад назвай Сталіна. З 8.12.1926 г. пасёлак знаходзіўся ў Троцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 6 двароў, 43 жыхары. У 1930 г. быў створаны першы калгас «Абуджэнне», працавалі кузня, ветраны млын. З 1931 г. цэнтр Троцкага сельсавета, які быў перайменаваны ў Сталінскі.

У час Вялікай Айчыннай вайны ў баях за вызваленне вёскі ў 1943 г. ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінула 11 воінаў. З 30.12.1961 г. цэнтр Акцябрскага сельсавета. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У 1969 г. 191 двор, 630 жыхароў. Меліся васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, дзіцячыя яслі і сад, бальніца, аптэка, сталовая, 2 магазіны. У 1994 г. 309 двароў, 830 жыхароў; сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аптэка, аддзяленне сувязі, 2 магазіны.

Брацкая магіла савецкіх воінаў у цэнтры вёскі. У 1958 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна са схіленым сцягам.

Помнік археалогіі — курганны могільнік. На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, злева ад дарогі на в. Доўск. З 1873 г. тут вядомы 9 насыпаў вышынёй 0,8 — 1,2 м, дыяметрам 7 — 9 м. З іх 3 курганы пашкоджаны. Раскопкі не праводзіліся.

АЛЬХОЎКА, былая вёска ў Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1908 г. 73 двары, 527 жыхароў. Сельскай грамадзе належала 807 дзесяцін зямлі.

АЛЯКСАНДРАЎКА, вёска ў Гусявіцкім сельсавеце, 30 двароў, 54 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Узнікла як пасёлак у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Старагусявіцкім, з 30.12.1927 г. у Гусявіцкім сельсаветах Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 45 двароў, 277 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўвайшлі ў калгас. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Зараз у складзе калгаса імя Леніна.

АЛЯКСАНДРАЎКА, вёска ў Рагінскім сельсавеце, 15 двароў, 27 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як фальварак Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. фальварак, 1 двор, 7 жыхароў. З 20.8.1924 г. хутар у Рагінскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 2 двары, 10 жыхароў. У 1930 г. на базе фальварка быў створаны калгас. Зараз у складзе саўгаса «Рагінь».

АНТОНАЎКА, вёска ў Рагінскім сельсавеце, 22 двары, 37 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XIX ст. у Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1880 г. 20 двароў, 120 жыхароў, млын, хлебазапасны магазін, кузня. Адносілася да Успенскай царквы Рагінскага прыхода. У 1909 г. 34 двары, 199 жыхароў. У 1918 г. адкрыта пачатковая школа, якая размяшчалася ў сялянскай хаце. З 20.8.1924 г. у Рагінскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 26 двароў, 139 жыхароў. Зараз у складзе саўгаса «Дзербічы».

АСАВОК, пасёлак у Старабудскім сельсавеце (да 1928 г. СТРЭЛКА), 12 двароў, 31 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Археалагічнае паселішча, якое размешчана побач з пасёлкам, сведчыць, што гэта мясцовасць была заселена людзьмі яшчэ ў старажытнасці. Вядомы з канца XIX ст. як хутар у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 2 двары, 12 жыхароў. З 20.8.1924 г. хутар у Недайскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 4 двары, 20 жыхароў. Зараз у складзе калгаса «Авангард».

Помнік археалогіі — паселішча. За 0,5 км на поўнач ад пасёлка на правым беразе р. Ваўчыцы. У агаленні схілу берага каля пераезда цераз раку культурны пласт 0,2 — 0,3 м. Знойдзены крамянёвыя нуклеусы, скрабкі з рэтушшу, ляпная кераміка. Паселішча адносіцца да позняга перыяду бронзавага і пачатку жалезнага вякоў. Датуецца канцом 2-га — пачаткам 1-га тысячагоддзя да н.э. Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

АСОБІНА, вёска ў Камунараўскім сельсавеце, цэнтр міжгаспадарчага аб'яднання «Асобіна», 61 двор, 134 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў Рудзянецкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Меліся ветраны млын, школа граматы. Вёска адносілася да Успенскай царквы Рудзянецкага прыхода.

У 1909 г. 96 двароў, 653 жыхары. Дзейнічаў ветраны млын. З 20.8.1924 г. цэнтр Асобінскага сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. 30.12.1927 г. тэрыторыя сельсавета далучана да Блюдніцкага сельсавета. У 1930 г. створаны калгас «Бранявік». Меліся кузня, ветраны млын. У 1931 г. пачало працаваць торфараспрацоўчае прадпрыемства. У час Вялікай Айчыннай вайны ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1943 г. пры вызваленні вёскі загінула 8 савецкіх воінаў. З 17.4.1962 г. у складзе Буда-Кашалёўскага раёна. З 28.6.1973 г. у Камунараўскім сельсавеце. Клуб, аддзяленне сувязі, магазін.

Радзіма беларускага вучонага Л.П.Смоляка.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. У 1951 г. на магіле пастаўлены абеліск.

БАГАМОЛАЎКА, пасёлак у Крыўскім сельсавеце, 9 двароў, 11 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядомы з XIX ст. як хутар у Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні, які належаў селяніну А.Багамолаву. У 1909 г. 3 двары, 34 жыхары. З 8.12.1926 г. у Крыўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 10 двароў, 72 жыхары. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Зараз у складзе калгаса імя Чапаева.

БАЛДУІ, пасёлак у Дуравіцкім сельсавеце, 6 двароў, 13 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядомы з пачатку XX ст. як выселак Павісліда (Балдуі) у Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. выселак, 6 двароў, 48 жыхароў. Адносіўся да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. З 20.8.1924 г. у Буда-Кашалёўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 11 двароў, 52 жыхары. Зараз у складзе саўгаса «Дубавіцкі».

БАРКІ, пасёлак ва Узоўскім сельсавеце, 1 двор, 1 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Рудзянецкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 43 двары, 226 жыхароў. Зараз у складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна».

БАРОК, пасёлак у Старабудскім сельсавеце, 10 двароў, 15 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Утвораны ў 1920-я гады жыхарамі з навакольных вёсак на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Недайскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 21 двор, 107 жыхароў. Зараз у складзе калгаса «Авангард».

БАРОК, пасёлак у Ліпініцкім сельсавеце, 1 двор, 1 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 14 двароў, 74 жыхары. Зараз у складзе калгаса «Зара».

БАЦУНЬ, вёска ў Крыўскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Чырвоны шлях», 249 двароў, 519 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Згодна інвентара 1640 г. Гомельскага староства, сяло, 3 дымы, 2 службы. Адносілася да Гомельскага замка. У 1773 г. цэнтр Бацунскага староства, у якое ўваходзіла 2 вёскі, 240 сялянскіх душ мужчынскага полу. Уладанне паноў Халецкіх. З 1877 г. маёмасць нашчадкаў адстаўнога паручыка Пішчэвіча, якім належала 623 дзесяціны зямлі. У 1880 г. вёска, 53 двары, 344 жыхары, у Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У вёсцы былі распаўсюджаны бандарны, кравецкі, стальмашны промыслы. Меліся млын, царкоўна-прыходская школа (у 1908 г. была настаўніцай К.Ц.Ціханравава). Вёска адносілася да Праабражэнскай царквы Івольскага праваслаўнага прыхода. На пачатку XX ст. вёска — цэнтр Бацунскай сельскай грамады, якой належала 1081 дзесяціна зямлі. У 1909 г. 103 двары, 834 жыхары. Працавала народнае вучылішча. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 11 двароў, 61 жыхар. Побач размяшчаліся аднайменныя хутары (2 двары, 18 жыхароў). У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны шлях». Працавалі кузня, паравы і ветраны млыны. У час Вялікай Айчыннай вайны ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі

загінула 105 жыхароў вёскі. У 1970 г. 262 двары, 771 жыхар. Сепаратарны пункт, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. Цяпер сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

Помнік землякам. Каля будынка праўлення калгаса, у скверы. На ўшанаванне памяці 105 жыхароў вёскі — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1968 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

БАЯВЫ, пасёлак у Акцябрскім сельсавеце.

Узнік у 1920-я гады ў выніку перасялення жыхароў з навакольных вёсак і хутароў на былыя памешчыцкія землі. З 20.8.1924 г. у Лугініцкім, з 30.12.1927 г. у Ліпскім сельсаветах Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 20 двароў, 106 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС адселены. Не існуе.

БЕРАЗІНА, пасёлак у Патапаўскім сельсавеце.

Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1925 г. у Забабскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 8 двароў, 28 жыхароў. З 14.12.1961 г. у Патапаўскім сельсавеце. Не існуе.

БЛЮДНІЦА, пасёлак у Камунараўскім сельсавеце, 37 двароў, 52 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Курганы, размешчаныя побач з вёскай, сведчаць, што гэтыя мясціны былі заселены людзьмі яшчэ ў старажытнасці. У XX ст. вёска ў Рудзянецкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Меліся млын, царкоўна-прыходская школа. На пачатку XX ст. вёска, 1104 дзесяціны зямлі належалі сельскай грамадзе. У 1909 г. 136 двароў, 921 жыхар. Млын, земская школа. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. З 20.2.1938 г. у складзе Гомельскай вобласці. Створаны саўгас «Камунар», працавалі кузня, хлебапякарня, трактарны млын. З 16.7.1954 г. у Блюдніцкім сельсавеце, пасля 17.4.1962 г. у складзе Буда-Кашалёўскага раёна. 28.6.1973 г. сельсавет перайменаваны ў Камунараўскі. Вёска ў складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна». У вёсцы ёсць клуб.

Помнікі археалогіі — курганны могільнік. За 0,2 км на паўднёвы захад ад вёскі на могілках. 10 насыпаў, вышынёй 1,5—2 м, дыяметрам 10—12 м. Вядомы з 1873 г. Тры насыпы пашкоджаны. Курган. За 0,3 км на поўнач ад вёскі, у пойме ракі Блюдніца. Вышынёй 2 м, дыяметрам 15 м. Вядомы з 1873 г. Раскопкі не праводзіліся.

БРОДЫ, вёска ў Дуравіцкім сельсавеце, 42 двары, 95 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Узнікла ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. пасёлак у Дуравіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Пасялковыя дзеці наведвалі школу за 3 км у в. Дуравічы, дзе ў 1924 г. вучыліся 53 вучні з пасёлка. Паводле перапісу 1926 г., 33 двары, 189 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны прамень», працавала кузня. Зараз у складзе саўгаса «Дубавіцкі».

БРОННІЦА, вёска ў Ліпініцкім сельсавеце, 81 двор, 223 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Курганны могільнік, размешчаны каля вёскі, сведчыць, што гэта мясцовасць была заселена людзьмі ў глыбокай старажытнасці. У XIX ст. вёска ў Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1880 г. 34 двары, 253 жыхары. Меўся ветраны млын. Вёска адносілася да Мікалаеўскай царквы Рагінскага прыхода. У 1909 г. было 62 двары, 473 жыхары. Побач размяшчаўся фальварак, 1 двор, 16 жыхароў, належаў двараніну Дарыя-Дзерналовічу, які валодаў 2500 дзесяцінамі зямлі. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Працавала аднакласная пачатковая школа. Паводле перапісу 1926 г., 43 двары, 226 жыхароў. У 1930 г. створаны 2 калгасы — «Перадавік» і «Чырвоны партызан». У 1969 г. у вёску перасялены жыхары пасёлка Пад'ясень. Зараз у складзе калгаса «Зара».

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы М.Я.Ткачовай, беларускага пісьменніка А.С.Кейзерава.

Помнік археалогіі — курганны могільнік. За 2 км на ўсход ад вёскі, 4 насыпы, з якіх 3 — вышынёй 1,3—1,5 м, дыяметрам 7—8 м, чацвёрты — адпаведна 2 м і 12 м. Раскопкі не праводзіліся.

БУДА, вёска ў Ліпініцкім сельсавеце, 6 двароў, 13 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У пачатку XX ст. вядома як хутар у Ка-

шалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 15 двароў, 94 жыхары. Зараз у складзе калгаса «Зара».

БУДА-ЛЮШАЎСКАЯ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Ульянава, 231 двор, 650 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Могільнік, размешчаны побач з вёскай, сведчыць, што гэта мясцовасць была заселена людзьмі ў глыбокай старажытнасці. У XVIII ст. вёска ў складзе маёнтка Люшава ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1858 г. вёска, 24 двары, 202 сялянскія душы, уладанне памешчыка, калежскага асэсара Міхаіла Перасвет-Солтана. У 1894 г. была адкрыта школа, для якой у 1908 г. быў узведзены будынак. На пачатку XX ст. вёска ў Старарудня́нскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 71 двор, 597 жыхароў.

З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 148 двароў, 797 жыхароў. Побач размяшчаліся хутары, 9 двароў, 46 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Дыктатура пралетарыяту», працавала кузня. У 1970 г. 145 двароў, 461 жыхар. Камбінат бытавога абслугоўвання, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

Цяпер — камбінат бытавога абслугоўвання, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. Радзіма беларускага паэта М.М.Чарняўскага.

Помнік археалогіі — курганны могільнік. За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі. 2 курганы вышынёй каля 1 м, дыяметрам 8—10 м. Раскопкі не праводзіліся.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 72 воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1979 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 190 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1969 г. пастаўлены помнік — скульптурная група: 3 воіны, якія ідуць у атаку.

БУДЗІШЧА, пасёлак. У 1908 г. 9 двароў, 51 жыхар, 440 дзесяцін зямлі. Не існуе.

БУДЗІШЧА, хутар, у пачатку XX ст. 1 двор, 5 жыхароў, 2 дзесяціны ворнай зямлі, належаў грамадзяніну Дрыбінцаву. Не існуе.

БУРЛАК, вёска ў Дуравіцкім сельсавеце, 27 двароў, 40 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Узнікла як пасёлак на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Дуравіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. У 1929 г. арганізаваны калгас імя Парыжскай камуны, працавала кузня. Зараз у складзе саўгаса «Дубавіцкі».

БУШАЎКА, вёска ў Марозавіцкім сельсавеце, 71 двор, 144 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў складзе маёнтка Кашалёва Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Паводле інвентара 1847 г., 51 гаспадарка. Належала казне. У 1880 г. 103 двары, 672 жыхары. Вёска адносілася да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. Меліся царкоўна-прыходская школа, карчма, 2 ветраныя млыны. У 1909 г. 121 двор, 868 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Кашалёўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг, з 20.2.1938 г. Гомельскай вобл. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа, у якой у 1924 г. вучылася 90 вучняў. Паводле перапісу 1926 г., 172 двары, 941 жыхар. Побач знаходзіліся Бушаўскія хутары, 6 двароў, 43 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Ударнік», працавала кузня. Зараз у складзе саўгаса «Марозавічы». Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

БУШАЎКА, пасёлак у Чабатовіцкім сельсавеце, 4 двары, 5 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады жыхарамі навакольных вёсак у час калгаснага будаўніцтва на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1924 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 9 двароў, 32 жыхары. У 1929 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 17.4.1962 г.у Буда-Кашалёўскім раёне. Зараз у складзе саўгаса «Чабатовічы».

БЯРВЁНАЎКА, вёска, 18 двароў, 44 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У пачатку XX ст. у складзе аднайменнага маёнтка ў Гомельскім павеце Магілёўскай губерні. У 1879 г. маёнтак належаў

купцу Ляскоўскаму, які меў тут 1600 дзесяцін зямлі. У 1880 г. вёска, 20 двароў, 113 жыхароў, у Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Адносілася да царквы Раства Багародзіцы Чабатовіцкага прыхода. Былі распаўсюджаны кавальскае і стальмашнае рамёствы. На пачатку XX ст. ваколіца, належала Чабатовіцкаму царкоўнаму прыходу. У 1909 г. 30 двароў, 187 жыхароў. З 30.12.1927 г. вёска, цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. У 1930 г. створаны калгас. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У 1969 г. у вёску пераселены жыхары пас. Вялікі Рог. З 15 жніўня 1974 г. цэнтр сельсавета размешчаны ў в. Хоўхла. Зараз у складзе эксперыментальнай базы «Пянчын». Дом культуры, бібліятэка.

ВАЗРАЖДЗЕННЕ (да 15 кастрычніка 1964 г. Гута), пасёлак у Патапаўскім сельсавеце.

Вядомы як вёска Гута ў Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. На пачатку XX ст. тут размяшчаліся лесапільны, шкляны, вінакурны і вугальны заводы. У 1908 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа, для якой у 1914 г. на сродкі ўладальніка заводаў Сямёна Курындзіна ўзведзены будынак. У 1909 г. вёска мела 12 двароў, 150 жыхароў. Апрача сялян тут жылі рабочыя заводаў. У 1918 г. на базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені. У 1921 г. шкляны завод атрымаў назву «Вазраждзенне». З 21.8.1925 г. у Забабскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. У 1926 г. у засценку Вазраждзенне налічвалася 88 двароў, 346 жыхароў. Не існуе.

ВАРВАРЫНА, вёска ў Мікалаеўскім сельсавеце, 18 двароў, 32 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XIX ст. у складзе маёнтка Самуйлава ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. Паводле інвентара 1858 г., вёска, 13 двароў, 97 жыхароў, належала памешчыку Дз.Турчанінаву. На пачатку XX ст. вёска, 309 дзесяцін зямлі, у Гарадзецкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні, адносілася да Мікалаеўскай царквы Любанскага прыхода. У 1909 г. 28 двароў, 245 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Прыбарскім сельсавеце Гарадзецкага, з 4.8.1927 г. Рагачоўскага раёнаў Бабруйскай акругі. З 5.4.1936 г. у Буда-Кашалёўскім раёне, з 20.2.1938 г. — у Гомельскай вобласці. Зараз у складзе калгаса «Шлях Ільіча».

ВАСІЛЬЕЎКА, пасёлак у Глазаўскім сельсавеце, 23 двары, 30 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады сялянамі навакольных вёсак і хутароў на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Глазаўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 31 двор, 182 жыхары. У 1929 г. створаны калгас «Камунар», працавала кузня, ваўначоска. З 17.4.1962 г. у складзе калгаса «Новае жыццё».

ВАСІЛЬПОЛЛЕ, вёска ў Бярвёнаўскім сельсавеце, 15 двароў, 19 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XX ст. назву Васільполле мелі фальварак і пасёлак у Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Адносіліся да царквы Раства Багародзіцы Чабатовіцкага прыхода. У 1909 г. 10 двароў, 64 жыхары. Побач размяшчаўся фальварак, 2 двары, 12 жыхароў, належаў нашчадкам двараніна Ляснеўскага, якія валодалі 510 дзесяцінамі зямлі. З 30.12.1927 г. у Бярвёнаўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі, з 20.2.1938 г. у Гомельскай вобл. У 1930 г. на базе фальварка быў створаны калгас «Чырвоны маліннік», працавала кузня. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У 1969 г. сюды пераселены жыхары пасёлка Хвашчоўка. Зараз у складзе эксперыментальнай базы «Пянчын».

ВІКТАРЫНСКАЯ РУДНЯ, вёска ў Кашалёўскім сельсавеце, 26 двароў, 54 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска Віктарынская Рудня (яна ж Рудня Ліпініцкая) знаходзілася ў Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Адносілася да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. У 1848 г. вёска, 115 жыхароў, 12 618 дзесяцін зямлі, з якіх 3007 дзесяцін належалі мясцовым сялянам. На пачатку XX ст. вёска, 228 дзесяцін зямлі, належала вясковай грамадзе. У 1909 г. 30 двароў, 237 жыхароў. Побач размяшчаўся маёнтак, 3 двары, 36 жыхароў, належаў двараніну Ф.Дарыя-Дзерналовічу. Ён меў тут 9282 дзесяціны зямлі і аднайменны хутар, 1 двор, 7 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім

сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 54 двары, 259 жыхароў, у маёнтку 10 двароў, 54 жыхары. У 1930 г. на базе маёнтка Віктарын арганізаваны калгас «Новае жыццё». Зараз у складзе саўгаса «Шарыбаўскі».

ВОЗЕРА-ПОЙМА, пасёлак у Кашалёўскім сельсавеце, 20 двароў, 22 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Вядомы з пачатку XX ст. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна. Паводле перапісу 1926 г., 18 двароў, 83 жыхары. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У 1941 г. 23 двары, 76 жыхароў. У час Вялікай Айчыннай вайны ў кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 19 двароў. Пасля вайны пасёлак адбудаваўся.

ВЫДРЫЦА, вёска ў Мікалаеўскім сельсавеце, 12 двароў, 16 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XIX ст. як слабада ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1816 г. слабада, 1 двор. У 1858 г. вёска, 7 двароў, 39 жыхароў, маёмасць памешчыка Аляксандра Сенажынскага. На пачатку XX ст. вёска належала Фундамінкаўскай сельскай грамадзе. У 1909 г. 14 двароў, 139 жыхароў, у Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. З 20.8.1924 г. у Меркулавіцкім сельсавеце Гарадзецкага раёна Бабруйскай акругі, з 4.8.1927 г. Рагачоўскага, а з 5.4.1936 г. Чачэрскага раёнаў. У 1930 г. створаны калгас «Зялёны сад», працаваў ветраны млын. З 25.12.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне, з 28.6.1973 г. у Мікалаеўскім сельсавеце. У складзе калгаса «Шлях Ільіча».

ВЫСОКАЯ ГРЫВА, пасёлак ва Уваравіцкім пасялковым савеце, 39 двароў, 60 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Радзеўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі, з 30.12.1927 г. у Лапіцкім сельсавеце гэтага ж раёна, з 20.2.1938 г. у Гомельскай вобл. Паводле перапісу 1926 г., 25 двароў, 143 жыхары. З 16.7.1954 г. у Блюдніцкім сельсавеце, а з 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе эксперыментальнай базы «Уваравічы».

ВЯЛІКАЯ ГРЫВА, хутар, 2 двары, 23 жыхары, 227 дзесяцін зямлі, належаў мяшчанам Капусціну і Мінянкову. Не існуе.

ВЯЛІКАЯ СТОЎПНЯ, хутар. На пачатку XX ст. належаў селяніну Пранузу, 5 двароў, 40 жыхароў, 133 дзесяціны зямлі. Не існуе.

ВЯЛІКІ РОГ, фальварак, 1 двор, 2 жыхары, 50 дзесяцін зямлі, належаў двараніну Чыжу. Не існуе.

ВЯЛІКІ РОГ, хутар, 1 двор, 6 жыхароў, 56 дзесяцін зямлі, належаў селяніну Краснабаю. Не існуе.

ГАЛАВАЧЫ, вёска ў Мікалаеўскім сельсавеце, 19 двароў, 26 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XVIII ст. вёска ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства. У 1765 г. 15 дымоў. У 1880 г. вёска, 53 двары, 312 жыхароў, у Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Меліся млын, піцейны дом, хлебазапасны магазін. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Узнясенскай царквы Меркулавіцкага прыхода. На пачатку XX ст. вёска, 647 дзесяцін зямлі належалі сельскай грамадзе. У 1909 г. 93 двары, 555 жыхароў. Зараз у складзе калгаса «Чачора».

ГАЛІНКІ, хутар, 5 двароў, 39 жыхароў, 160 дзесяцін зямлі. У 1908 г. належаў селяніну Галіцкаму. Не існуе.

ГАЛЫ, вёска ў Патапаўскім сельсавеце, 27 двароў, 39 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як ваколіца ў Стараруднянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. З 1868 г. вёска, 12 двароў, 194 жыхары, уладанне нашчадкаў памешчыка С.Сенажынскага-Войніча, якім належала 998 дзесяцін зямлі. Вёска адносілася да Мікалаеўскай царквы Стара-Руднянскага прыхода. На пачатку XX ст. вёска, 292 дзесяціны зямлі. У 1909 г. 19 двароў, 133 жыхары. З 20.8.1924 г. у Патапаўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 38 двароў, 180 жыхароў. Побач размяшчаліся аднайменныя хутары, 6 двароў, 29 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас. Зараз у складзе Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа.

ГАРАДЗІШЧА, пасёлак у Кашалёўскім сельсавеце, 27 двароў, 44 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Вядомы з канца XIX ст. як хутар у Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. хутар, 1 двор, 5 жыхароў, належаў двараніну Дарыя-Дзерналовічу. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім

сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 8 двароў, 43 жыхары. Цяпер у складзе саўгаса «Шарыбаўскі».

ГАРАДОК, хутар, 7 двароў, 42 жыхары, у 1908 г. належаў селяніну І.Паўлаву. Мелася 182 дзесяціны зямлі. Не існуе.

ГАЎЛІ, вёска ў Патапаўскім сельсавеце, 78 двароў, 168 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Назва паходзіць ад дыялектнага слова, якое азначае «варона» (Чарнігаўшчына). У пераносным значэнні — рассеяны чалавек, наіўны. У XIX ст. вёска ў Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1858 г. 184 жыхары. Адносілася да Троіцкай царквы Недайскага прыхода. Меліся царкоўна-прыходская школа, 2 ветраныя млыны, карчма. На пачатку XX ст. вёска, 552 дзесяціны зямлі. У 1909 г. 87 двароў, 627 жыхароў. Працаваў ветраны млын. На базе дарэвалюцыйнай школы створана пачатковая школа. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета, які 21.8.1925 г. перайменаваны ў Забабскі сельсавет Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. У 1930 г. створаны калгас «Ураджай», працавала кузня. З 14.12.1961 г. у Патапаўскім сельсавеце. У 1969 г. у вёску перасялены жыхары пас. Першамайскі. Цяпер у складзе Буда-Кашалёўскага аграрнатэхнічнага каледжа. Бібліятэка, магазін.

Радзіма генерал-лейтэнанта М.Ф.Казлова, беларускіх вучоных М.В.Зюзянкова і В.С.Яцкова.

Курган Славы. За 1,5 км на ўсход ад вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, і воінаў, што загінулі пры вызваленні вёскі. Насыпаны ў 1969 г.

ГЛАЗАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Новае жыццё», 254 двары, 627 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка ў Гомельскім павеце Магілёўскай губерні. У 1870 г. уладанне памешчыцы А.Юрлавай, якой належалі 1283 дзесяціны зямлі, піцейны дом. У 1880 г. вёска пры рацэ Крывой, 112 двароў, 743 жыхары, у Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Меліся 3 ветраныя млыны, карчма, казённая вінная лаўка. У 1895 г. пабудавана драўляная Пакроўская царква, да прыхода якой адносіліся жыхары 8 вёсак, 2073 прыхаджаніны. На пачатку XX ст. вёска, 1236 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 192 двары, 1378 жыхароў. У маёнтку працавала земская школа (настаўнік Ф.В.Лебедзеў), ветраны млын, казённая вінная лаўка. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. У 1930 г. створаны калгас «Камунар». Працавалі ветраны млын, кузня. У Вялікую Айчынную вайну ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі за вызваленне вёскі ў 1943 г. загінула 13 воінаў. З 17.4.1962 г. у складзе Буда-Кашалёўскага раёна. У 1970 г. 276 двароў, 868 жыхароў. Хлебапякарня, швейная майстэрня. Цяпер хлебапякарня, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, магазін.

Радзіма братоў Аляксея, Рамана, Фёдара Стрыгалёвых, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У іх гонар названа адна з вуліц вёскі.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 13 воінаў, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. у баі за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1974 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ГЛІНІШЧА, лесніčоўка, належала двараніну Палухіну, 1 двор, 8 жыхароў.

ГРЫГОРАЎКА, пасёлак у Гусявіцкім сельсавеце, 19 двароў, 28 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады ў час калгаснага будаўніцтва на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Старагусявіцкім, з 30.12.1927 г. у Гусявіцкім сельсаветах Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 23 двары, 167 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Зараз у складзе калгаса імя Леніна.

ГУБІЦКІ КАРДОН, пасёлак у Губіцкім сельсавеце, 3 двары, 6 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядомы як выселак на р. Дняпро ў Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Дзейнічала прыстань. У 1909 г. выселак, 3 двары, 24 жыхары, 50 дзесяцін зямлі, належаў двараніну Вязміцінаву. З 20.8.1924 г. у Губіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., пасёлак, 7 двароў, 39 жыхароў. Цяпер у складзе калгаса імя Энгельса.

Помнік партызанам. На паўднёвай ускраіне пасёлка. 28.6.1943 г. 8 камсамольцаў-падрыўнікоў партызанскага атрада імя Чапаева загінулі ў няроўным баі. У 1974 г. на месцы гібелі пастаўлена стэла.

ГУБІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Энгельса, 293 двары, 700 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XVI ст. як сяло ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. Паводле інвентара 1640 г. Гомельскага староства, сяло, 15 дымоў, 4 службы. У 1858 г. вёска, 388 сялянскіх душ ва ўладанні памешчыка М.Васіна. З канца XVII ст. лёс жыхароў вёскі цесна звязаны з развіццём прадпрыемстваў у навакольных фальварках і каля в. Наспа, дзе працавалі шкляны, цукровы, цагельны, масласыраварны, лесапільны заводы, якія належалі купцам Курындзіным, памешчыкам Вязміцінавым і інш. У 1858 г. заснавана сукнавальня, млын. У пачатку XX ст. вёска, 1162 дзесяціны зямлі, у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Адносілася да Троіцкай царквы Недайскага прыхода. У 1909 г. 141 двор, 1004 жыхары. Меліся млын, карчма, земская школа (настаўніца А.М.Масленнікава). У 1918 г. вёску спалілі польскія захопнікі (згарэла 87 двароў), а потым кайзераўскія акупанты спалілі яшчэ 7 двароў і будынак вясковай школы. У 1922 г. сельсавет купіў будынак для пачатковай школы, а вяскоўцы яго адрамантавалі.

З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 199 двароў, 1052 жыхары. Побач размяшчаўся аднайменны хутар, 40 двароў, 214 жыхароў. У 1929 г. быў створаны калгас імя Красіна, працавалі кузня, ваўначоска, ветраны млын. У 1941 г. 117 двароў, 496 жыхароў. У лістападзе 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 113 двароў і забілі 9 мірных жыхароў. У баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі за вызваленне вёскі ў лістападзе—снежні 1943 г. загінулі 74 воіны і 11 партызан. Пасля вайны вёска адбудавалася. У 1951 г. дробныя калгасы — імя Энгельса, Чапаева, «Інтэрнацыянал» і «Чырвоны Днепр», якія знаходзіліся на тэрыторыі сельскага савета, аб'ядналіся ў калгас імя Энгельса. У 1971 г. 206 двароў, 561 жыхар. Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. У сувязі з аварыяй на ЧАЭС у 1986 г. для перасяленцаў з Брагінскага раёна было пабудавана больш за 100 дамоў. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, Дом рамёстваў, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Помнік землякам. У цэнтры вёскі. Пахаваны 79 воінаў і 11 партызан, якія загінулі ў лістападзе—снежні 1943 г. у час вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На магіле пастаўлены помнік — скульптуры жанчыны ў жалобе і воіна, побач — пліты з імёнамі тых, хто пахаваны. Помнік ушаноўвае таксама 256 землякоў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ДЗЕДАЎ КУРГАН, пасёлак у Патапаўскім сельсавеце, 1 двор, 1 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Гандлёвы цэнтр у в. Губічы.

У XIX ст. вядомы як маёнтак у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. маёнтак, 4 двары, 15 жыхароў, 300 дзесяцін зямлі, належаў пані Ландшэўскай. З 21.8.1924 г. у Забабскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акругі. На базе маёнтка быў створаны калгас «Шлях сацыялізма», працавала кузня. Зараз у складзе Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа.

ДЗЕРБІЧЫ, вёска ў Рагінскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Дзербічы», 216 двароў, 600 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Назва вёскі паходзіць ад слова «дзерба» (дзернавіна, неапрацаваны ўчастак). Вядома як сяло з канца XVI ст., у Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У XIX ст. цэнтр аднайменнага маёнтка ў Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1816 г. вёска, 12 двароў, 91 жыхар, належала памешчыку Іосіфу Казіміраву. Паводле інвентара 1846 г., належала розным уладальнікам: 59 сялянскіх душ, 582 дзесяціны зямлі — памешчыку Гіжыцкаму; 23 сялянскія душы, 306 дзесяцін зямлі — памешчыку Сахноўскаму і 23 сялянскія душы, 250 дзесяцін зямлі — памешчыку Шацілу. У 1878 г. была заснавана крупадзёрка, якой валодаў мешчанін І.Басін. У 1880 г. 34 двары,188 жыхароў. Частка жыхароў займалася кравецкім, сталярным, бандарным промысламі. Меўся хлебазапасны магазін. У 1893 г. адкрыта царкоўна-прыходская школа, у гэтым жа годзе для школы быў пабудаваны будынак. Вёска адносілася да Мікалаеўскай царквы Рагінскага прыхода. На пачатку XX ст. вёска, 367 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 48 двароў, 325 жыхароў, земская школа, казённая вінная лаўка. З 20.8.1924 г. у складзе Рагінскага сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.1.1927 г. Гомельскай акруг. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені імя Урыцкага, у якой у 1924 г. вучыліся 43 вучні. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 63 двары, 339 жыхароў; пасёлак, 9 двароў, 55 жыхароў; хутар, 13 двароў, 72 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Пралетарый». Працавала кузня. У час Вялікай Айчыннай вайны ў баях з нямецкафашысцкімі захопнікамі загінула 127 жыхароў. У 1971 г. 182 двары, 691 жыхар. Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. У сувязі з аварыяй на ЧАЭС перасяленцамі з забруджаных раёнаў заселена 50 катэджаў. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт; аддзяленне сувязі, магазін.

Помнік землякам. На тэрыторыі школы. На ўшанаванне памяці 127 жыхароў вёскі — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1966 г. пастаўлены помнік — скульптурная група: воін са схіленым сцягам, стары і жанчына.

ДЗЁМІНА, вёска ў Патапаўскім сельсавеце, 9 двароў,10 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У канцы XIX ст. вядома як хутар у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. пасёлак Дзёмін Курган, 1 двор, 6 жыхароў. З 21.8.1925 г. у Забабскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 13 двароў, 65 жыхароў. З 14.12.1961 г. у Патапаўскім сельсавеце. У складзе Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа.

ДЗІКАВА, пасёлак у Глазаўскім сельсавеце, 17 двароў, 27 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Недайскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 19 двароў, 65 жыхароў. Зараз у складзе калгаса «Новае жыццё».

ДОБРАЯ НАДЗЕЯ, пасёлак у Крыўскім сельсавеце, 3 двары, 4 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядомы як фальварак у Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1846 г. фальварак, маёмасць памешчыка М.Баркоўскага, які меў 891 дзесяціну зямлі. Побач размяшчаўся аднайменны фальварак, які належаў памешчыцы В.Статкевіч. З 1857 г. працавала мылаварнае прадпрыемства. З 8.12.1926 г. у Бацунскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 9 двароў, 73 жыхары. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Цяпер у складзе калгаса «Чырвоны шлях».

ДРАЗДЫ, хутар, 6 двароў, 37 жыхароў, 802 дзесяціны зямлі. У 1908 г. належаў мяшчанам Таманскім. Не існуе.

ДУБАВІЦА, вёска ў Дуравіцкім сельсавеце, 32 двары, 48 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Узнікла як пасёлак у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Дуравіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 52 двары, 268 жыхароў. У складзе саўгаса «Дубавіцкі». Магазін.

ДУБРАЎКА, пасёлак у Патапаўскім сельсавеце, 20 двароў, 36 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 21.8.1925 г. у Забабскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 14 двароў, 88 жыхароў. З 14.12.1961 г. у Патапаўскім сельсавеце. У складзе Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа.

ДУРАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Дубавіцкі», 274 двары, 689 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Упершыню ўпамінаецца ў 1492 г. як сяло ў Вялікім княстве Літоўскім. Да 1452 г. належала пану Свідрыгайлу Альбертавічу, а пасля яго смерці з 1452 г. перайшло ва ўласнасць трокскага ваяводы Андрэя Саковіча. У XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка, маёмасць памешчыкаў Фашчоў у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У склад маёнтка ўваходзіў фальварак Дуравічы, 2 вёскі, 1 сяльцо. У 1858 г. сяльцо, 42 двары, 307 жыхароў; маёнтак, 666 рэвізскіх душ, 4152 дзесяціны зямлі, належаў калежскаму рэгістратару, памешчыку А.Фашчу, з 1862 г. яго нашчадкам Феліксу і Антону. Меліся хлебазапасны магазін, вадзяны і ветраны млыны, капліца. Вёска адносілася да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. У 1889 г. царкоўна-прыходская школа, вінакурня, карчма, лаўка.

На пачатку XX ст. вёска, 81 дзесяціна зямлі. У 1909 г. 106 двароў, 757 жыхароў. Побач размяшчаўся маёнтак, 1 двор, 36 жыхароў, 4700 дзесяцін зямлі, належаў стараверу Дрыбінцаву. У 1911 г. пабудаваны будынак для школы. У 1913 г. працаваў вінакурны завод, на якім выраблялся спіртсырэц (53 851 л у год). З 20.8.1924 г. цэнтр Дуравіцкага сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. У 1930 г. было створана 2 калгасы: «Чырвоны кастрычнік» і «Чырвоны прамень». Працавалі кузня і 2 млыны. У Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінула 188 жыхароў вёскі. У 1971 г. 218 двароў, 874 жыхары. Цяпер сярэдняя школа, дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, кравецкая майстэрня, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, 2 магазіны.

Помнікі археалогіі: курганны могільнік. За 2 км на паўночны ўсход ад вескі, 21 курган вышынёй каля 2 м, дыяметрам 10—12 м. Асобныя насыпы вышынёй 1 м, дыяметрам 7—8 м. Вядомы з 1873 г. Могільнік-2. За 1,8 км на паўночны захад ад вёскі. Тут 11 значна пашкоджаных курганоў вышынёй да 1 м, дыяметрам 7—10 м. Вядомы з 1873 г. Раскопкі не праводзіліся. Могільнік-3. За 3 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Чыстыя Лужы. Тут 33 насыпы вышынёй каля 1 м, дыяметрам 7—12 м. Вядомы з 1873 г. Раскопкі не праводзіліся.

Помнік землякам. У скверы. На ўшанаванне памяці 188 жыхароў — воінаў і партызан. У 1956 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ЕЛЯНЕЦ, вёска ў Старабудскім сельсавеце, 122 двары, 245 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Археалагічны курганны могільнік, які размешчаны каля вёскі, сведчыць, што гэта мясцовасць была заселена людзьмі яшчэ ў старажытнасці. Упершыню ўпамінаецца ў інвентары 1640 г. Гомельскага староства. У XIX ст. вёска Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1858 г. 40 двароў, 399 жыхароў, належала памешчыку Station Станіславу Перасвет-Солтану. У 1880 г. 70 двароў, 509 жыхароў, у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Вёска адносілася да Троіцкай царквы Недайскага прыхода. Меліся хлебазапасны магазін, царкоўна-прыходская школа, ветраны млын. У пачатку XX ст. вёска, 1200 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 119 двароў, 917 жыхароў. Дзейнічала земская школа (у 1908 г. настаўнікам быў М.М.Сцефаненкаў), ветраны млын. З 20.8.1924 г. у Губіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 142 двары, 753 жыхары. Зараз у складзе калгаса «Авангард». Клуб, бібліятэка, магазін.

Помнік археалогіі — курганны могільнік. За 3 км на паўночны ўсход ад вёскі. 7

насыпаў вышынёй да 1 м, дыяметрам 6—7 м. Раскопкі не праводзіліся.

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне 98 землякоў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены помнік — скульптурная група: воін са схіленым у жалобе сцягам, стары і жанчына.

ЖЫТАНЕЖЖА, вёска ў Глазаўскім сельсавеце, 25 двароў, 45 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1858 г. 13 двароў, 135 сялянскіх душ — уладанне памешчыка Станіслава Перасвет-Солтана. У 1880 г. 78 двароў, 202 жыхары, у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У вёсцы быў распаўсюджаны калёсны промысел, якім займалася 10 двароў, 15 жыхароў, даход складаў 30 руб. Жыхары наведвалі Троіцкую царкву Недайскага праваслаўнага прыхода. Меліся царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін, млын. На пачатку XX ст. вёска, 926 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 55 двароў, 412 жыхароў. Дзейнічала земская школа, для якой ў 1912 г. пабудавалі ўласны будынак. З 20.8.1924 г. у Недайскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 110 двароў, 568 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Трактарыст», працавалі ветраны млын, кузня, ваўначоска. Зараз у складзе калгаса «Новае жыццё».

ЗАБАБ'Е, вёска ў Патапаўскім сельсавеце, 37 двароў, 65 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў Стараруднянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1873 г. уладанне купца Яфіма Кузняцова, які валодаў тут 1327 дзесяцінамі зямлі. У тым жа годзе пачала працаваць чыгуначная станцыя на лініі Бабруйск — Гомель. Меліся хлебазапасны магазін, ветраны млын. Вёска адносілася да Мікалаеўскай царквы Стараруднянскага прыхода. На пачатку XX ст. вёска, 340 дзесяцін зямлі. У 1900 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. 42 двары, 325 жыхароў. Побач размяшчаўся маёнтак, 1100 дзесяцін зямлі, належаў М.Кузняцову. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе мясцовай школы была створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1924 г. вучылася 85 вучняў. З 21.8.1925 г. цэнтр Забабскага сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., меліся 3 аднайменныя пасёлкі: Забаб'е-1, 19 двароў, 99 жыхароў; Забаб'е-2, 20 двароў, 93 жыхары; Забаб'е-3, 17 двароў. У 1930 г. былі створаны 2 калгасы: «Перамога» і «Бальшавік». Працавала кузня. 14.12.1961 г. Забабскі сельсавет ліквідаваны, тэрыторыя далучана да Патапаўскага сельсавета. У складзе Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа. Пачатковая школа, бібліятэка, магазін.

Радзіма беларускага казачніка П.П.Гаспадарова, Героя Сацыялістычнай Працы П.К.Кавалёва.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 135 воінаў і 1 партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1953 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ЗАБАЛОЦЦЕ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Іскра», 106 двароў, 278 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Археалагічны курганны могільнік, які размешчаны каля вёскі, сведчыць, што гэту мясцовасць людзі засялілі ў глыбокай старажытнасці. У XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка ў Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1880 г. вёска, 107 двароў, 711 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска, 615 дзесяцін зямлі. Адносілася да Пакроўскай царквы Роўкавіцкага прыхода, 1125 прыхаджан. Мелася і Кацярынінская праваслаўная царква. У 1909 г. 85 двароў, 725 жыхароў. Працаваў вінакурны завод. Побач з вёскай размяшчаўся фальварак, 1 двор, 36 жыхароў, 6440 дзесяцін зямлі, належаў двараніну Дарыя-Дзерналовічу. У 1909 г. земствам адкрыта школа, якая размяшчалася ў сялянскай хаце. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 162 двары, 798 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Селькор», працавала кузня. Мелася торфараспрацоўчая арцель. У 1971 г. 228 двароў, 715 жыхароў. Млын, лесапільня. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, дзіцячыя яслі, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. Цяпер лесапільня. Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

Радзіма Героя Савецкага Саюза А.Ц.Краўцова.

Помнік археалогіі. За 4,5 км ад вёскі. Больш за 30 насыпаў вышынёй 0,4—2 м, дыяметрам 4—12 м. Раскопкі не праводзіліся.

Помнік землякам. Каля будынка праўлення калгаса «Іскра». На ўшанаванне памяці 192 землякоў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1956 г. пастаўлены помнік — скульптурная група: воін са схіленым сцягам, стары і жанчына.

ЗАВІДАЎКА, вёска ва Уваравіцкім сельсавеце, 15 двароў, 44 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома ў Гомельскім павеце Магілёўскай губерні. У 1868 г. была заснавана вытворчасць па вырабе аўчыны, даход з якой складаў 150 руб. У 1888 г. адкрыта народнае аднакласнае вучылішча. З 8.12.1926 г. вёска ў Лапіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 32 двары, 163 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоная Завідаўка», працавала кузня. З 19.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Цяпер у складзе эксперыментальнай базы «Уваравічы».

Радзіма беларускага вучонага Ф.Ю.Велікевіча.

ЗАРА, пасёлак у Гусявіцкім сельсавеце, 31 двор, 54 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Пянчынскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 19 двароў, 115 жыхароў. З 16.7.1954 г. у Гусявіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Зараз у складзе эксперыментальнай базы «Пянчын».

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Кашалёўскім сельсавеце, 85 двароў, 236 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У 1908 г. фальварак, 1 двор, 2 жыхары, 100 дзесяцін зямлі, належаў селяніну Віктару Грушніцу. Вёска заснавана як пасёлак у 1920-я гады жыхарамі навакольных вёсак на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 10 двароў, 47 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Пралетарый», працавала кузня. У 1941 г. 50 двароў, 190 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў кастрычніку 1943 г. акупанты спалілі 49 двароў. Пасля вайны вёска адбудавалася. Зараз у складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна».

ЗАРЭЧЧА, пасёлак у Чабатовіцкім сельсавеце, 55 двароў, 101 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады ў час калгаснага будаўніцтва на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1924 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 55 двароў, 300 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Зараз у складзе саўгаса «Чабатовічы».

ЗАЦІШША, пасёлак у Акцябрскім сельсавеце.

Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Ліпскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 22 двары, 113 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС і радыеактыўным забруджваннем жыхары пераселены. Не існуе.

ЗОРКА (да 1930 г. **САМУЙЛАЎ**), вёска ў Мікалаеўскім сельсавеце, 45 двароў, 96 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як маёнтак Самуйлаў у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. Паводле інвентара 1858 г., у склад маёнтка ўваходзіла 6 вёсак, у якіх налічвалася 645 сялянскіх душ. Маёнтак належаў памешчыку Дз. Турчанінаву, які меў тут 2071 дзесяціну зямлі. У 1875 г. маёнтак, 1816 дзесяцін зямлі, уладанне памешчыка М.Сапруненкі. З 20.8.1924 г. вёска ў Прыбарскім сельсавеце Гарадзецкага, з 4.8.1927 г. Рагачоўскага р-наў Бабруйскай акругі. У 1929 г. у пасёлак пераселены жыхары пас. Зборны. У 1930 г. на базе фальварка створаны калгас. З 5.4.1936 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Цяпер у складзе саўгаса «Чачора».

ЗЯЛЁНЫ ВОСТРАЎ, пасёлак ва Уваравіцкім пасялковым сельсавеце, 2 двары, 2 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Лапіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 27 двароў, 130 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Зараз у складзе эксперыментальнай базы «Уваравічы».

ЗЯЛЁНЫ ДУБ, пасёлак у Ліпініцкім сельсавеце, 8 двароў, 12 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 9 двароў, 54 жыхары. У 1969 г. сюды перaселены жыхары пас. Гром. У сувязі з аварыяй на ЧАЭС у пасёлку заселена перасяленцамі з забруджаных раёнаў 50 катэджаў. Маецца дзіцячы сад. Зараз у складзе саўгаса «Марозавічы».

ІВАНАЎКА, вёска ў Глазаўскім сельсавеце, 141 двор, 329 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1858 г. вёска, 19 двароў, 222 сялянскія душы, уладанне памешчыка Станіслава Перасвет-Солтана. У 1880 г. вёска, 56 двароў, 328 жыхароў, у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Апрача земляробства, сяляне займаліся калёсным промыслам. 31 двор, 72 жыхары, даход складаў 30 рублёў. Вёска адносілася да Троіцкай царквы Недайскага прыхода. Меліся карчма, хлебазапасны магазін, 3 ветраныя млыны, царкоўна-прыходская школа. На пачатку XX ст. вёска, 1221 дзесяціна зямлі, належала мясцовай сельскай грамадзе. У 1909 г. 97 двароў, 795 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана пачатковая школа, якая размяшчалася ў наёмнай сялянскай хаце. У 1924 г. частка вёскі згарэла. З 20.8.1924 г. у Недайскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 192 двары, 788 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Агульная праца», працавала ваўначоска, кузня. Цяпер у складзе калгаса «Новае жыццё». У сувязі з аварыяй на ЧАЭС перасяленцамі з забруджаных раёнаў заселены 50 катэджаў. Базавая школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 22 воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1953 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптуры воіна і жанчыны.

ІВОЛЬСК, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Калініна, 177 двароў, 494 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Археалагічнае гарадзішча, якое размешчана побач з вёскай, сведчыць, што гэтыя мясціны былі заселены яшчэ ў глыбокай старажытнасці. Вядома ў XIX ст. як цэнтр аднайменнага маёнтка ў Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1848 г. вёска, 55 двароў, 466 жыхароў, належала Дуніну-Баркоўскаму. Меліся 4043 дзесяціны зямлі, з якіх 1033,3 належалі сялянам. У 1864 г. пабудавана драўляная праваслаўная Праабражэнская царква, 2184 прыхаджаніны. У 1879 г. маёмасць мешчаніна Мельнікава, якому належалі 330 дзесяцін зямлі, піцейны дом, ветраны млын, карчма. На 1880 г. сяло, прыватнае ўладанне, 95 двароў, 490 жыхароў, хлебазапасны магазін, 3 млыны, цагельны завод. Былі распаўсюджаны промыслы: шавецкі, кавальскі, стальмашны, сталярны, бандарны. У пачатку XX ст. сяло пры рацэ Іволя, 918 дзесяцін зямлі належалі старaверам. У 1909 г. сяло, 163 двары, 994 жыхары, земская школа (настаўнік П.У.Скарубскі), млын, вінная лаўка; фальварак, 1 двор, 6 жыхароў, 246 дзесяцін зямлі; сядзіба, 2 двары, 13 жыхароў, 55 дзесяцін зямлі. Да 1922 г. у Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні, царква, 3 млыны, кузня. У 1920 г. у школе 1-й ступені мелася пяць груп, 108 навучэнцаў (загадчык школы Р. Ф.Трусевіч, настаўнік М.Р.Яцкоў). У 1920 г. арганізавана пажарная дружына з сямі чалавек. Са жніўня 1922 г. у складзе Уваравіцкага валвыканкома Гомельскай губерні, 215 двароў, 1178 жыхароў. З 8.12.1926 цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 230 двароў, 1202 жыхары. У 1930 г. створаны калгас імя Калініна. Меліся 2 млыны, піларама. У Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінулі 263 землякі, за вызваленне вёскі ад акупантаў загінулі 8 воінаў і 6 партызан. У 1971 г. 149 двароў, 397 жыхароў. Лесапільня, млын, камбінат бытавога абслугоўвання, механічная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. Цяпер лесапільня, камбінат бытавога абслугоўвання, механічная майстэрня. Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі.

Радзіма народнага артыста СССР і БССР П.С.Малчанава.

Помнікі археалогіі: гарадзішча-1. За 1 км на захад ад вёскі, на беразе р. Іволькі. Узвышаецца над поплавам на 1,5—2 м. Вонкавы дыяметр 20 м, унутраны — 10 м. Вядома з 1873 г. Раскопкі не праводзіліся. Гарадзішча-2. Побач з гарадзішчам-1. Памерам 100 х 30 м, вышынёй да 2 м. Вядома з 1873 г. Раскопкі не праводзіліся.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. На ўскраіне вёскі. Пахаваны 8 воінаў, 6 партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. Каля будынка праўлення калгаса імя Калініна. На ўшанаванне памяці 263 землякоў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1973 г. пастаўлены помнік — стэла з барэльефнай шматфігурнай кампазіцыяй.

Помнік М.І.Калініну. Каля будынка праўлення калгаса імя Калініна. У 1979 г. устаноўлены бюст.

ІГНАТАЎКА, хутар, належаў мешчаніну Кушнераву, 1 двор, 11 жыхароў, 90 дзесяцін зямлі. Не існуе.

КАБЫЛІН, пасёлак, у XIX ст. вядомы як пасёлак, 18 двароў, 169 жыхароў, 462 дзесяціны зямлі. Побач з пасёлкам знаходзіўся выселак Кабылін, 1 двор, 2 жыхары, належаў селяніну Дзям'яну Аксёнаву. Не існуе.

КАЖАДУБАЎКА, пасёлак, 3 двары, 20 жыхароў, 31 дзесяціна зямлі. У пачатку XX ст. належаў мешчаніну Чубанаву. Не існуе.

КАЛІНІНА, пасёлак у Гусявіцкім сельсавеце, 9 двароў, 13 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады жыхарамі навакольных вёсак у час калгаснага будаўніцтва на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Пянчынскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 29 двароў, 190 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоная дывізія», меліся кузня, ветраны млын. З 16.7.1954 г. у Гусявіцкім сельсавеце, з 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Зараз у складзе эксперыментальнай базы «Пянчын».

КАЛІНІНА (да 1924 г. **СЯМЁНАЎКА**), вёска ва Узоўскім сельсавеце, 293 двары, 715 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. Сямёнаўка вядома ў Рудзянецкай воласці. У 1848 г., фальварак, 47 жыхароў, належаў Драбышэўскаму. Паводле рэвізіі 1858 г., вёска, 227 жыхароў, належала памешчыку Сенажынскаму. У 1880 г. 127 двароў, 741 жыхар. Меліся 4 ветраныя млыны, крупадзёрная фабрыка (належала мешчаніну Дз.Усевічу), карчма. Вёска адносілася да царквы Праабражэння Рудзянецкага прыхода. У 1909 г. 202 двары, 1439 жыхароў, земская школа, казённая вінная лаўка. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 10 двароў, 47 жыхароў. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. З 17.4.1962 г. — у Буда-Кашалёўскім раёне, у складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна». Базавая школа, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. У цэнтры вёскі пахаваны 6 воінаў і 3 партызаны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у лістападзе 1943 г. У 1958 г. на брацкай магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна ў жалобе.

КАМЕНКА, пасёлак у Чабатовіцкім сельсавеце, 13 двароў, 18 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады жыхарамі з навакольных вёсак і хутароў. З 8.12.1924 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 26 двароў, 113 жыхароў. У 1929 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У жніўні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 16 двароў, забілі 6 мірных жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Зараз у складзе саўгаса «Чабатовічы».

В.В.Віталева.

КАМУНАР, пасёлак, цэнтр сельсавета і аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна», 884 двары, 2495 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны 21.2.1921 г. па ініцыятыве сялян — братоў Антона і Емяльяна Карпенкі, якія разам з 10 сем'ямі жыхароў навакольных пасёлкаў і вёсак арганізавалі сельгаскамуну імя К.Маркса. Новы пасёлак размясціўся паміж вёскамі Радзеева, Лапічы, Блюдніца і Асобіна. Гэта была першая камуна ў бліжэйшай акрузе. З гэтага часу і пачалася гісторыя пасёлка Камунар.

Менавіта ад слова «камуна» і ўтварылася назва пасёлка. У камуне меліся 250 дзесяцін зямлі, паравы млын, маслабойка. Да 1929 г. у гаспадарцы было 50 галоў буйной рагатай жывёлы, 15 коней, 50 свіней, 100 авечак. Першым старшынёй камуны быў А.Р.Карпенка. У 1929 г. камуна ўвайшла ў склад калгаса імя Энгельса, які перайменавалі ў «Камунар». У 1933 г. калгас «Камунар» рэарганізавалі ў саўгас. Меліся майстэрня, гараж, кузня, лазня. У 1937 г. на базе саўгаса арганізавана МТС. У 1957 г. была аднаўлена МТС, у 1958 г. пераўтворана ў саўгас «Камунар». У 1971 г. пасёлак у Блюдніцкім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Камунар», 204 двары, 1049 жыхароў. Сярэдняя школа-інтэрнат, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, швейная майстэрня, сталовая, 2 магазіны, гасцініца. У 1973 г. саўгас «Камунар» пераўтвораны ў птушкафабрыку «Камунарка». У 1976 г. пачалося будаўніцтва адной з буйнейшых на Беларусі бройлернай птушкафабрыкі. У 1979 г. аб'яднаны птушкафабрыка «Камунарка» і Гомельская бройлерная птушкафабрыка. У 1997 г. пасёлак, цэнтр сельсавета, 1111 двароў, 3024 жыхары. Гомельская бройлерная птушкафабрыка, камбінат хлебапрадуктаў. Сярэдняя школа, Палац культуры, 2 бібліятэкі, бальніца, аптэка, аддзяленне сувязі.

У 2000 г. на базе Гомельскай бройлернай птушкафабрыкі арганізавана аграпрамысловае прадпрыемства «Асобіна», у склад якога ўвайшлі Гомельская бройлерная птушкафабрыка, камбінат хлебапрадуктаў, міжгаспадарчае прадпрыемства «Асобіна», саўгасы «Праўда» і імя Галавачова.

Т.В.Чарнышова.

КАПАНКІ, хутар, 3 двары, 20 жыхароў. У 1908 г. належаў мешчаніну Хількевічу. Мелася 140 дзесяцін зямлі. Не існуе.

КАРОМКА, вёска ў Рагінскім сельсавеце, 65 двароў, 105 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XVIII ст. вядома ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. Паводле рэвізіі 1816 г., вёска, 30 двароў, 151 жыхар. Адносілася да Мікалаеўскай царквы Рагінскага прыхода. Меліся школа граматы, ветраны млын. На пачатку XX ст. у Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 50 двароў, 443 жыхары. З 20.8.1924 г. у Забалоцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 77 двароў, 403 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Селянін». Меліся кузня, ветраны млын. Зараз у складзе саўгаса «Рагінь».

Радзіма беларускага пісьменніка І.І.Шальманава.

КАСТРЫШЧА, вёска ў Кашалёўскім сельсавеце, 18 двароў, 22 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў складзе маёнтка ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1847 г. уласнасць дзяржавы. Адносілася да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. На пачатку XX ст. вёска ў Кашалёўскай воласці. У 1909 г. 39 двароў, 278 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Патапаўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 44 двары, 252 жыхары. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. Зараз у складзе саўгаса «Шарыбаўскі».

КАЧАН, пасёлак у Патапаўскім сельсавеце, 12 двароў, 19 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады. З 20.8.1924 г. у Забабскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 15 двароў, 89 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 14.12.1961 г. у Патапаўскім сельсавеце. У складзе Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа.

КАШАЛЁЎ, вёска, цэнтр сельсавета, 195 двароў, 417 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XVI ст. згадваецца як сяло ў Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага. Паводле інвентара 1640 г., сяло, 12 дымоў, 4 службы, адносілася да Гомельскага замка. У 1765 г. цэнтр аднайменнага маёнтка, маёмасць пана Вышынскага. У XIX ст. цэнтр воласці і аднайменнага маёнтка ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У склад маёнтка ўваходзіла 7 вёсак: Камянец, Рудня, Бушаўка, Славінец, Буда, Патапаўка, Кострыца. Паводле інвентара 1847 г., у маёнтку налічвалася 103 гаспадаркі. У 1859 г. пабудавана драўляная праваслаўная Свята-Міхайлаўская царква, 8188 прыхаджан. У 1880 г. 176 двароў, 1031 жыхар. Асноўным заняткам сялян было земляробства, якое яны спа-

лучалі з адыходным промыслам. У 1885 г. цэнтр воласці, 67 двароў, 573 жыхары. Тут размяшчаліся валаснос праўленне, вінакурны завод, ветраны і вадзяны млыны, карчма, 6 лавак, хлебазапасны магазін, народнае вучылішча, у якім у 1888 г. навучалася 39 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак (у 1908 г. настаўнікамі працавалі А.П.Заранкін, А.П.Сусава і С.С.Сусаў). У 1898—1909 гг. лесапільны завод купца Ардашнікава, 45 рабочых. На пачатку XX ст. сяло, 2019 дзесяцін зямлі (у т. л. 300 дзесяцін балота) належалі мясцовай сельскай грамадзе. У 1909 г. сяло, 265 двароў, 1826 жыхароў; сядзіба Кашалёва, 1 двор, 7 жыхароў, 30 дзесяцін зямлі належала казне. Размяшчалася ўрачэбная часць. Дзейнічалі Кашалёўская вольная пажарная дружына, Кашалёўскае лясніцтва. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг, з 20.2.1938 г. Гомельскай вобл. Паводле перапісу 1926 г., 274 двары, 1142 жыхары. Побач размяшчаліся аднайменныя хутары, 38 двароў, 186 жыхароў. У 1930 г. быў створаны калгас. Працавалі 2 ветраныя млыны, конная крупарушка, нафтавы млын з крупарушкай. У 1971 г. цэнтр сельсавета, 174 двары, 494 жыхары. Масласыразавод. Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. У 1998 г. цэнтр сельсавета і саўгаса імя Галавачова, 180 двароў, 479 жыхароў. Птушкафабрыка, масласыразавод. Базавая школа, бібліятэка, аддзяленне сувязі. Цяпер у складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна». Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, магазін.

Радзіма беларускага вучонага К.П.Буслава, двойчы Героя Савецкага Саюза П.Я.Галавачова.

Помнік археалогіі — гарадзішча. За 0,5 км ад вёскі. Пляцоўка 50 х 50 м, умацавана валам і ровам. Вядома з 1873 г. Раскопкі не праводзіліся.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 101 жыхара вёскі — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1966 г. пастаўлены помнік — скульптура жанчыны з лаўровым вянком, побач стэла з імёнамі загінуўшых.

КЛЕНАВІЦА, вёска ў Чабатовіцкім сельсавеце, 21 двор, 33 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска, цэнтр аднайменнага маёнтка ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1816 г. уладанне памешчыка Р.Гарбачэўскага. У 1858 г. вёска, 15 двароў, 124 жыхары, уладанне памешчыка Станіслава Перасвет-Солтана. У 1880 г. у вёсцы 33 двары, 182 жыхары, у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У вёсцы распаўсюджаны быў кавальскі промысел. Вёска адносілася да царквы Раства Багародзіцы Чабатовіцкага прыхода. Меліся 2 ветраныя млыны. На пачатку XX ст. вёска, 513 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 49 двароў, 340 жыхароў. Маёнтак двараніна М.Раманава, 12 двароў, 23 жыхары, 4300 дзесяцін зямлі. Меліся ветраны млын, вугальны і шкляны заводы. У маёнтку меўся вінакурны завод, які належаў дваранíну Дарыя-Дзерналовічу. Паводле перапісу 1926 г., 61 двор, 325 жыхароў. Зараз у складзе саўгаса «Чабатовічы».

КОЛАС, пасёлак у Шыракаўскім сельсавеце, 7 двароў, 15 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады жыхарамі з навакольных вёсак на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Лугініцкім, з 27.10.1927 г. у Ліпініцкім сельсаветах Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 11 двароў, 50 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне, з 8.12.1966 г. у Шыракаўскім сельсавеце. Зараз у складзе саўгаса «Камінтэрн».

КРАСНАБУДСКІ, пасёлак у Чабатовіцкім сельсавеце, 13 двароў, 21 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Створаны ў 1920-я гады жыхарамі навакольных вёсак на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1924 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., у пасёлку 15 двароў, 87 жыхароў. Зараз у складзе саўгаса «Чабатовічы».

КРАСНАГОРСК, пасёлак у Шыракаўскім сельсавеце, 23 двары, 37 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады сялянамі з навакольных вёсак і хутароў на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Лугініцкім, а з 30.12.1927 г. у Ліпініцкім сельсаветах Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 39 двароў, 185 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 12.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Камінтэрн».

КРАСНАЯ ПЛОШЧА, пасёлак у Івольскім сельсавеце, 22 двары, 32 жыхары (па 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1929 г. Зараз у складзе калгаса імя Калініна.

КРАСНЫ, пасёлак у Чабатовіцкім сельсавеце, 21 двор, 31 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады у час калгаснага будаўніцтва на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1924 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 17 двароў, 98 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Чабатовічы».

КРАСНЫ АКЦЯБР, пасёлак у Акцябрскім сельсавеце, 22 двары, 41 жыхар (па 1.1.2001 г.).

Вядомы з 1920-х гадоў пад назвай Чарапоўка-2. Назву «Красны Акцябр» атрымаў у 1924 г. З 8.12.1924 г. у Троцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 8 двароў, 31 жыхар. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 1931 г. у Сталінскім (з 30.12.1961 г. Акцябрскім) сельсавеце. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Краснаакцябрскі».

КРАСНЫ КУРГАН, пасёлак у Чабатовіцкім сельсавеце, 25 двароў, 36 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1924 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 19 двароў, 98 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Чабатовічы».

Помнікі археалогіі: могільнік-1. За 1,5 км на паўночны захад ад пасёлка, абапал дарогі на в. Патапаўка. Размешчана 18 курганоў вышынёй 0,7—1,6 м, дыяметрам 5—11 м. Зараслі хмызняком. 3 курганы моцна пашкоджаны. Могільнік-2. За 1 км на паўночны захад ад пасёлка, у лесе. Размешчана 50 курганоў вышынёй 1,5—2,5 м, дыяметрам 8—10 м. Раскопкі не праводзіліся.

КРАСНЫ СВЕТ, пасёлак у Старабудскім сельсавеце. Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Недайскім сельсавеце. Паводле перапісу 1926 г., 13 двароў, 61 жыхар. Не існуе.

КРЫЛОЎ, пасёлак у Чабатовіцкім сельсавеце, 13 двароў, 28 жыхароў (па 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады сялянамі з навакольных вёсак і хутароў. У 1941 г. 19 двароў, 88 жыхароў. У 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 14 двароў. Пасля вайны пасёлак адбудаваўся. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Чабатовічы».

КРЫЎСК, вёска цэнтр сельсавета і калгаса імя Чапаева, 279 двароў, 762 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. цэнтр аднайменнага маёнтка ў Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1830 г. маёмасць памешчыцы Ф.Пазняк, якая валодала 251 дзесяцінай зямлі. Меўся млын. У 1848 г. фальварак, 75 жыхароў. Меліся карчма, хлебазапасны магазін, млын, Мікалаеўская царква. У вёсцы былі распаўсюджаны промыслы: кушнерскі, кавальскі, бандарны, сталярны, стальмашны. У 1880 г. 82 двары, 384 жыхары. У 1909 г. 132 двары, 982 жыхары. Земская школа, якую ўзначальваў Цярэнцій Парошын, настаўніцай працавала Я.М.Вязава. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі, а з 20.2.1938 г. Гомельскай вобл. У 1930 г. створаны калгас імя Будзённага. Сталярная майстэрня, кузня. У 1931 г. пачала працаваць шавецкая арцель «Пераможац», 2 ветраныя млыны.З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У 1969 г. у вёску перасслены жыхары пасёлкаў Будзішча, Дубраўка. У 1972 г. 233 двары, 807 жыхароў. Ільнозавод, лесапільня, млын, швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячыя яслі, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, 4 магазіны. У 1998 г. 449 дварбў, 904 жыхары. Ільнозавод, лесапільня. Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, 3 магазіны.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 134 жыхароў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1973 г. пастаўлены помнік — скульптурная група — 2 воіны, злева — сцяна з імёнамі загінуўшых.

КУЛЯШОЎКА, вёска ў Кашалёўскім сельсавеце, 9 дварбў, 17 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XIX ст. як выселак у Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета

Магілёўскай губерні. Адносілася да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. У 1886 г. 48 двароў, 243 жыхары. Распаўсюджаны адыходны промысел. У 1909 г. 13 двароў, 101 жыхар. Меліся хлебазапасны магазін і ветраны млын. З 20.8.1924 г. у Кашалёўскім сельсавеце Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 18 двароў, 95 жыхароў. У 1941 г. 19 двароў, 87 жыхароў. У кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 14 двароў. Пасля вайны вёска адбудавалася. Зараз у складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна».

КУРГАННЕ, вёска ў Рагінскім сельсавеце, 16 двароў, 29 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1858 г. 18 двароў, 137 жыхароў. У 1879 г. уладанне двараніна Фауста Гіжыцкага, які меў 1688 дзесяцін зямлі. У 1880 г. 10 двароў, 60 жыхароў, у Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Адносілася да Мікаласаўскай царквы Рагінскага прыхода. У 1909 г. вёска, 17 двароў, 92 жыхары; фальварак, 1 двор, 7 жыхароў, належаў памешчыку Гіжыцкаму; фальварак, 1 двор, 8 жыхароў, належаў мешчаніну Чарніцову. З 20.8.1924 г. вёска ў Рагінскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 16 двароў, 109 жыхароў; хутар, 9 двароў, 42 жыхары. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. Зараз вёска ў складзе саўгаса «Дзербічы».

КУЧЫНСК, пасёлак у Забалоцкім сельсавеце, 2 двары, 2 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Вядомы як хутар у Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. З 20.8.1924 г. у Забалоцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 14 двароў, 78 жыхароў; хутар, 2 двары, 12 жыхароў. Зараз у складзе калгаса «Іскра».

ЛАПІЧЫ, вёска ва Уваравіцкім пасялковым савеце, 66 двароў, 136 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XVI ст. як сяло ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У інвентары Чачэрскага староства 1726 г. Лапічы ўпамінаюцца як баярская сяліба, 8 дымоў, 1 служба. Усе жыхары насілі прозвішча Лапіч. Штогод яны плацілі Чачэрскаму замку падатак — 100 злотых. У 1880 г. 24 двары, 142 жыхары, у Рудзянецкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Меліся хлебазапасны магазін, ветраны млын. Адносіліся да Рудзянецкага прыхода. У 1909 г. вёска, 36 двароў, 244 жыхары; ваколіца, 178 двароў, 577 жыхароў. Дзейнічала аднакласная школа (настаўніца Лідзія Мігай). Мелася казённая вінная лаўка. Цяпер у складзе эксперыментальнай базы «Уваравічы».

ЛЕНІНА, вёска ў Дуравіцкім сельсавеце, 17 двароў, 33 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Заснавана як пасёлак у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Дуравіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 2.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 25 двароў, 256 жыхароў. У 1930 г. быў створаны калгас імя Леніна, працавала кузня.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 13 воінаў і 6 партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1957 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ЛЕНІНСКІ, пасёлак у Чабатовіцкім сельсавеце, 22 двары, 38 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў час калгаснага будаўніцтва ў 1920-я гады. З 8.12.1926 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 16 двароў, 104 жыхары. У 1929 г. створаны калгас «Ленінец», працавала кузня. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Чабатовічы».

ЛІПА, вёска у Акцябрскім сельсавеце, 1 двор, 1 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XVIII ст. як вёска ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства. Паводле люстрацыі 1765 г., уладанне Рэчыцкага харунжага пана Вышынскага. У 1840 г. вёска, уласнасць памешчыцы Ванды Сулістроўскай. Сукнавальня, млын. У 1880 г. вёска пры р. Ліпа, 71 двор, 395 жыхароў, у Дудзіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Побач размяшчалася паштовая станцыя Ліпа. У вёсцы былі распаўсюджаны бандарны, кавальскі, кравецкі, стальмашны промыслы. Мелася маслабойнае прадпрыемства, на якім выраблялася алей з канаплянага семя, 2 ветраныя млыны, хлебазапасны магазін. Адносілася да Мікаласаўскай царквы Дудзіцкага прыхода. У 1909 г. вёска, 117

двароў, 797 жыхароў; хутар, 1 двор, 21 жыхар; паштовая станцыя, 1 двор, 13 жыхароў. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 114 двароў, 533 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоная Ліпа». Працавалі ветраны млын, кузня. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У 1969 г. у вёску перасслены жыхары пасёлка Гарадзец. У складзе саўгаса «Краснаакцябрскі». У выніку аварыі на ЧАЭС адселена.

Радзіма беларускага вучонага А.М.Сердзюкова.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызана. Пахаваны 31 воін і 1 партызан, якія загінулі ў 1943 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ЛІПІНІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Зара», 69 двароў, 181 жыхар (на 1.1.2001 г.).

У 1567 г. упамінаецца ў перапісе войска Літоўскага як «село в 5 человеков, пустовщина одна. Того села грунт суместный с людьми господарскими рогачевскими и чечерскими, новарозданные ротмистру Гомельскому пану Криштофу Ленскому». У XIX ст. вёска ў Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні, адносілася да Мікалаеўскай царквы Кашалёўскага прыхода. У 1909 г. 70 двароў, 527 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 126 двароў, 638 жыхароў, дзейнічала працоўная школа 1-й ступені. У 1929 г. створаны калгас «Перамога», працавала кузня. У 1972 г. 98 двароў, 267 жыхароў. Камбінат бытавога абслугоўвання. Клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін. У 1999 г. 73 двары, 198 жыхароў. Дом культуры, бібліятэка, аддзяленне сувязі. Зараз сярэдняя школа, дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, 2 магазіны.

Радзіма беларускага вучонага В.В.Крэпаснога.

Помнік землякам. У 1967 г. на ўшанаванне памяці 303 землякоў, воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, пастаўлены помнік — скульптура жанчыны з лаўровым вянком.

ЛОЗАЎ, вёска ў Рагінскім сельсавеце, 98 двароў, 159 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XVIII ст. вядома ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства. Паводле люстрацыі 1765 г., 16 дымоў. У 1773 г. вёска, 104 жыхары, уласнасць паноў Завадскіх. У XIX ст. цэнтр аднайменнага маёнтка на рацэ Чачора ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. Паводле рэвізіі 1816 г., 59 жыхароў. У 1880 г. 70 двароў, 401 жыхар, у Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Вяскоўцы апрача земляробства займаліся алейным, кравецкім, стальмашным, шавецкім промысламі. У вёсцы меліся вадзяны млын, сукнавальня, карчма, хлебазапасны магазін. Дзейнічала царкоўна-прыходская школа. У 1909 г. вёска, 103 двары, 644 жыхары. З 20.8.1924 г. у Прыбарскім сельсавеце Гарадзецкага раёна Бабруйскай акругі, з 4.8.1927 г. Рагачоўскага, а з 5.4.1936 г. Буда-Кашалёўскага раёнаў. Паводле перапісу 1926 г., 114 двароў, 716 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Камунар», працавала кузня. Зараз у складзе саўгаса «Рагінь».

Месца бою 1943 г. За 8 км на захад ад вёскі, у Лозаўскім лесе. У красавіку 1943 г. партызаны 10-й Журавіцкай брыгады вялі бой супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1964 г. на месцы бою пастаўлена стэла.

ЛОЗКІ, вёска ў Івольскім сельсавеце, 31 двор, 44 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў Гомельскім павеце Магілёўскай губерні. Паводле рэвізіі 1858 г., 21 жыхар, уладанне памешчыка Клячоўскага. На пачатку XX ст. належала Прыбарскай сельскай грамадзе ў Целяшоўскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 7 двароў, 30 жыхароў. З 8.12.1926 г. у Івольскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 15 двароў, 100 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоныя Лозкі», працавала кузня, ветраны млын. Зараз у складзе калгаса імя Калініна.

ЛУГІНІЧЫ, вёска ў Акцябрскім сельсавеце.

Упамінаецца ў XVIII ст. у Рэчыцкім павеце Вялікага княства Літоўскага. Паводле люстрацыі 1765 г., вёска, 17 дымоў, належала пану Вышынскаму. У XIX ст. у Дудзіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Адносілася да Мікалаеўскай царквы Дудзіцкага прыхода. У 1909 г. 46 двароў, 345 жыхароў. Дзейнічалі земская школа, млын. З 8.12.1926 г. цэнтр

сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі, а з 30.12.1927 г. у Ліпскім сельсавеце. Паводле перапісу 1926 г., 62 двары, 363 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Баявы», працавала кузня, ветраны млын. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Клуб, магазін. У выніку аварыі на ЧАЭС адселена. Не існуе.

ЛУК'ЯНАЎ, пасёлак у Акцябрскім сельсавеце.

Заснаваны ў 1920-я гады. З 8.12.1926 г. у Лугініцкім, з 30.12.1927 г. Ліпскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 17 двароў, 77 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У сувязі з аварыяй на ЧАЭС адселены. Не існуе.

ЛЮБАВІН, вёска ў Буда-Люшаўскім сельсавеце, 25 двароў, 45 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома ў XVIII ст. у Старарудняпскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 60 двароў, 476 жыхароў. У 1917 г. адкрыта земская школа. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 39 двароў, 153 жыхары. Побач размяшчаліся Любавінскія хутары, 74 двары, 326 жыхароў. У 1929 г. быў створаны калгас імя Дзяржынскага, працавала кузня. З 16.7.1954 г. у Буда-Люшаўскім сельсавеце. У складзе калгаса імя Ульянава. Клуб, бібліятэка, магазін.

ЛЮБАНЬ, вёска ў Мікалаеўскім сельсавеце, 34 двары, 71 жыхар (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. сяло ў Гарадзецкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1858 г. сяло, 137 жыхароў, уладанне памешчыка Дз.Турчанінава. Мелася драўляная праваслаўная Мікалаеўская царква, якой належалі 37 дзесяцін зямлі. Дзейнічала царкоўна-прыходская школа. У 1909 г. 33 двары, 386 жыхароў. Зараз у складзе калгаса «Шлях Ільіча».

ЛЮБІЦА, пасёлак у Кашалёўскім сельсавеце, 6 двароў, 7 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады жыхарамі навакольных вёсак. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 14 двароў, 69 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. Зараз у складзе саўгаса «Шарыбаўскі».

ЛЮДКАВА, пасёлак у Гусявіцкім сельсавеце, 12 двароў, 20 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў час калгаснага будаўніцтва ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Старагусявіцкім (з 30.12.1927 г. Гусявіцкім) сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 18 двароў, 97 жыхароў. З 1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе калгаса імя Леніна.

ЛЮШАЎ, вёска ў Ліпініцкім сельсавеце, 11 двароў, 14 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска, цэнтр аднайменнага маёнтка, уладанне памешчыкаў Перасвет-Солтанаў у Стараруднянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У склад маёнтка ўваходзілі вёскі Люшава, Люшаўская Буда, Салтанаўка. У 1848 г. 35 двароў, 191 жыхар, належала памешчыку Случаноўскаму. У 1858 г. 26 двароў, 103 жыхары, 1413 дзесяцін зямлі, уладанне калежскага асэсара Міхаіла Перасвет-Солтана. У 1880 г. 30 двароў, 200 жыхароў, у Стараруднянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Крупадзёрны завод, касцёл, 2 млыны, карчма. У 1884 г. адкрыта школа. У 1909 г. сяло, 31 двор, 290 жыхароў; фальварак, 3 двары, 4 жыхары, належаў памешчыку Ю.Перасвет-Солтану. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа 1-й ступені. З 20.8.1924 г. у Любавінскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. З 26.7.1930 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Паводле перапісу 1926 г., 59 двароў, 212 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Камінтэрн», працавала кузня. Зараз у складзе калгаса «Юбілейны».

ЛЯСКІ, заказнік, 2 двары, 16 жыхароў, 34 дзесяціны ворнай зямлі. У заказніку знаходзілася 8 леснічовак і 10 двароў, 65 жыхароў, належаў Лібава-Роменскай чыгунцы. Не існуе.

МАЙСЕЕЎКА, вёска ў Рагінскім сельсавеце, 43 двары, 79 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як вёска ў Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1880 г. 26 двароў, 132 жыхары. Меўся хлебазапасны магазін. У 1909 г. 40 двароў, 235 жыхароў. З

20.8.1924 г. у Прыбарскім сельсавеце Гарадзецкага, з 4.8.1927 г. Рагачоўскага, з 5.4.1936 г. Буда-Кашалёўскага раёнаў. У складзе саўгаса «Дзербічы».

МАКАЎЕ, пасёлак у Глазаўскім сельсавеце, 3 двары, 4 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Глазаўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 11 двароў, 71 жыхар. У 1929 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. Працавала кузня, цагельнае прадпрыемства. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе калгаса «Новае жыццё».

МАР'ІНА ПОЛЕ, пасёлак у Старабудскім сельсавеце.

У канцы XIX ст. вядомы як хутар у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Адносіўся да Троіцкай царквы Недайскага прыхода. У 1909 г. хутар, 12 двароў, 70 жыхароў, 148 дзесяцін зямлі, належаў селяніну Кур'янаву. З 20.8.1924 г. у Недайскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. У 1930 г. хутаране ўступілі ў калгас. У складзе калгаса «Авангард». У сувязі з аварыяй на ЧАЭС адселены.

МАРОЗАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Марозавічы», 143 двары, 388 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома з канца XVI ст. як сяло ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. Паводле інвентара Гомельскага староства 1640 г., сяло, 4 дымы, 2 службы. У XIX ст. цэнтр маёнтка, уласнасць памешчыкаў Перасвет-Солтанаў, у Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1855 г. належаў дваранiну Герасіму Ляшкевічу. У 1855 г. быў заснаваны вінакурны завод. У 1863 г. вёска, 184 жыхары. Меліся ветраны млын, хлебазапасны магазін, вінакурны завод, карчма, школа граматы. У 1864 г. уласнасць барона Станіслава Нолькіна, якому належала 1836 дзесяцін зямлі. У 1880 г. 79 двароў, 514 жыхароў. Промыслы: бандарны, стальмашны, шавецкі. Адносілася да Пакроўскай царквы Глазаўскага прыхода. У 1909 г. 153 двары, 1059 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Буда-Кашалёўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 266 двароў, 1414 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Гром». Працавала кузня. З 16.7.1954 г. цэнтр сельсавета ў Буда-Кашалёўскім раёне. Механічныя майстэрні, магазін, аддзяленне сувязі, базавая школа, дзіцячы сад, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці жыхароў вёскі — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1970 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна

МАЧУЛІШЧА, вёска ў Дуравіцкім сельсавеце, 16 двароў, 33 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Вядома з канца XIX ст. як засценак у Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У пачатку XX ст. хутар, 25 дзесяцін зямлі, належаў селяніну А.Ляскоўскаму. У 1909 г. 6 двароў, 47 жыхароў. Адносіўся да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. З 20.8.1924 г. у Дуравіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 11 двароў, 73 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас імя Калініна, працавала кузня. Зараз у складзе саўгаса «Дуравіцкі». Клуб, бібліятэка, магазін.

МІГАЙ, пасёлак у Марозавіцкім сельсавеце, 2 двары, 3 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады. З 20.8.1924 г. у Буда-Кашалёўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 14 двароў, 77 жыхароў. З 16.7.1954 г. у Марозавіцкім сельсавеце. У складзе саўгаса «Марозавічы».

МІКАЛАЕЎКА, вёска ў Губіцкім сельсавеце, 11 двароў, 17 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як выселак у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1852—1867 гг. дзейнічаў цукровы завод магутнасцю 1000 пудоў цукру ў год, працавалі 202 рабочыя. У 1909 г. выселак, 28 двароў, 195 жыхароў, 160 дзесяцін зямлі, уладанне дваранiна Вязьміцінава. З 20.8.1924 г. у Губіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 27 двароў, 121 жыхар. У 1930 г. жыхары ўступілі ў калгас. Зараз у складзе калгаса імя Энгельса.

МІКАЛАЕЎКА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Шлях Ільіча», 154 двары, 410 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома ў складзе маёнтка Самуйлава ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. Паводле інвентара 1858 г., вёска, 14 двароў, 119 жыхароў, належала памешчыку Дз.Турчанінаву. Адносілася да Мікалаеўскай царквы Любанскага прыхода. У 1909 г., 47 двароў, 71 жыхар, у Гарадзецкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. З 2.8.1924 г. у Прыбарскім сельсавеце Гарадзецкага, з 4.8.1927 г. Рагачоўскага раёнаў Бабруйскай акругі. З 5.4.1936 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. З 28.6.1973 г. цэнтр сельсавета. Лесапільня, швейная майстэрня, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. У 1999 г. 158 двароў, 440 жыхароў, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт.

Радзіма Героя Савецкага Саюза С.А.Панамарова, Героя Сацыялістычнай Працы Р.Я.Кісялёва.

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1990 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

МІКОЛЬСК, пасёлак у Забалоцкім сельсавеце, 15 двароў, 21 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Вядомы з канца XIX ст. як фальварак у Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. фальварак, 1 двор, 13 жыхароў, 416 дзесяцін зямлі, належаў стараверу В.С.Дрыбінцаву. З 20.8.1924 г. у Забалоцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., пасёлак Мікольск 1-ы, 21 двор, 144 жыхары; пасёлак Мікольск 2-і, 18 двароў, 89 жыхароў. Зараз у складзе калгаса «Іскра».

МУРАВЕЙ, пасёлак у Патапаўскім сельсавеце, 33 двары, 56 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў пачатку XX ст. З 20.8.1924 г. у Патапаўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 13 двароў, 92 жыхары. Зараз у складзе Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа.

МЯДЗВЕДЗЕВА, вёска ў Патапаўскім сельсавеце, 46 двароў, 64 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У пачатку XX ст. вядома як хутар у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні, 3 двары, 15 жыхароў. У 1908 г. належаў сялянам Берчанкову і Казлову, 225 дзесяцін зямлі. З 20.8.1924 г. у Патапаўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна. Паводле перапісу 1926 г., 16 двароў, 69 жыхароў. У 1930 г. хутаране ўступілі ў калгас. Зараз вёска ў складзе Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа. Бібліятэка, магазін.

НАДЗЕЖДЗІНА, вёска ў Мікалаеўскім сельсавеце, 35 двароў, 56 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. Паводле інвентара 1858 г., 12 двароў, 123 жыхары, належала памешчыку Дз.Турчанінаву. У 1878 г. было адкрыта лесараспрацоўчае прадпрыемства, у 1881 г. тут працавала 80 рабочых. На пачатку XX ст. 762 дзесяціны зямлі, адносілася да Мікалаеўскай царквы Любанскага прыхода. У 1909 г. 45 двароў, 377 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Прыбарскім сельсавеце Гарадзецкага, з 4.8.1927 г. Рагачоўскага раёнаў Бабруйскай акругі. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоная зорка». Меліся кузня, ветраны млын. З 5.4.1936 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Зараз у складзе калгаса «Шлях Ільіча». Клуб.

НАСПА, вёска ў Губіцкім сельсавеце, 23 двары, 34 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У 1794 г. вядома як фальварак. Дзейнічала шкляная мануфактура, працавала 40 рабочых. У пачатку XIX ст. вёска, цэнтр аднайменнага маёнтка, уладанне памешчыка Васіля Іолшына. У 1835 г. 1169 дзесяцін зямлі, меліся 2 дзягцярныя заводы, лесапільна-дрэваапрацоўчы завод, працавала 155 рабочых. Карчма. У 1856 г. фальварак, належаў двараніну Вадзіму Аляксандравічу Вязьміцінаву, які заснаваў цукровы завод магутнасцю 342 пуды цукру ў год, на якім у 1862 г. працавалі 123 рабочыя, у большасці жанчыны. Паводле рэвізіі 1858 г., вёска, 225 жыхароў. У 1897 г. купцы Міхаіл Пятровіч Аўрамаў і Гаўрыла Сямёнавіч Курындзін заснавалі шклозавод, які працаваў да 1919 г. Меўся паравы рухавік, у 1913 г. працавала 200 рабочых. Меліся карчма, 2 ветраныя млыны, хлебазапасны магазін, школа граматы, лесапільны завод, які належаў купцу Бараноўскаму. На пачатку XX ст. 556 дзесяцін зямлі, у Недайскай воласці Рагачоўскага павета

Магілёўскай губерні. У 1909 г. вёска, 118 двароў, 779 жыхароў; маёнтак, 8 двароў, 25 жыхароў, 11 311 дзесяцін зямлі, належаў двараніну Вязьміцінаву. Дзейнічала земская школа, меліся млын, казённая вінная лаўка. З 20.8.1924 г. у Губіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. 17.12.1924 г. на базе дарэвалюцыйнай школы была створана пачатковая школа, якая размяшчалася ў маёнтку. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 147 двароў, 736 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Інтэрнацыянал». Кузня, хлебапякарня, млын, лесапільня. Зараз у складзе калгаса імя Энгельса. Бібліятэка, магазін.

НЕГАЎКА, вёска ў Ліпініцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Юбілейны», 200 двароў, 527 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка ў Стараруднянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1852 г. вёска, 26 двароў, 238 жыхароў, 740 дзесяцін зямлі, належала памешчыку Э.Войніч-Сенажыцкаму. Меліся ветраны млын, хлебазапасны магазін. У 1884 г. 60 двароў, 526 жыхароў. У гэтым жа годзе была адкрыта царкоўна-прыходская школа. На пачатку XX ст. 1233 дзесяціны зямлі. У 1909 г. 842 жыхары. З 20.8.1924 г. у Буда-Кашалёўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана пачатковая школа, у 1924 г. 31 вучань. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 172 двары, 942 жыхары; хутар, 6 двароў, 32 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Шлях да камуны». Працавала кузня, ветраны млын. У сувязі з аварыяй на ЧАЭС для перасяленцаў з забруджаных раёнаў пабудавана 100 дамоў. Базавая школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы У.М.Кірыленкі.

НЕДАЙКА, вёска ў Старабудскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Прагрэс», 131 двор, 322 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1848 г. фальварак барона Нолькіна, 120 жыхароў, 856 дзесяцін зямлі. Паводле рэвізіі 1858 г., 50 двароў, 475 жыхароў, уладанне памешчыка Станіслава Перасвет-Солтана. У 1862 г. адкрыта аднакласнае народнае вучылішча. У 1864 г. пабудавана драўляная Троіцкая царква. У 1878 г. уладанне памешчыка Новікава, 7623 дзесяціны зямлі. У 1880 г. вёска, 90 двароў, 680 жыхароў, цэнтр Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1885 г. сяло, мелася маслабойня, карчма, 2 ветраныя, валовы і вадзяны млыны, народнае вучылішча. У 1889 г. тут вучылася 48 хлопчыкаў, 3 дзяўчынкі. У 1894 г. пабудавана мураваная праваслаўная Троіцкая царква, у 1899 г. 2973 прыхаджаніны. У пачатку XX ст. сяло, 1562 дзесяціны зямлі. У 1909 г. 196 двароў, 1356 жыхароў; маёнтак Недайка 1-я, 783 дзесяціны зямлі, належаў удаве стараверніка Якаўлева, маёнтак Недайка 2-я, 609 дзесяцін зямлі, належаў мешчаніну Д.А.Кушкараву. У сяле размяшчаліся лячэбны пакой, казённая вінная лаўка, земская школа. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана пачатковая школа. У 1926 г. 270 двароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Граніт». Меліся конная крупарушка, ветраны млын, кузня, цагельная арцель, медпункт. У 1969 г. у вёску пераселены жыхары пасёлка Новая Сямёнаўка. Камбінат бытавога абслугоўвання, лесапільня, млын, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

Радзіма беларускага пісьменніка М.Л.Стрыгалёва.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 88 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1943 г. У 1953 г. пастаўлены абеліск, у 1984 г. рэстаўрыраваны.

Магіла партызана Міхаіла Іванавіча Фёдарава, які загінуў у 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1945 г. пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці вяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1990 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

НІВА, пасёлак у Камунараўскім сельсавеце, 9 двароў, 18 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У 1920-я гады хутар. З 8.12.1926 г. ва Уваравіцкім раёне Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 1 двор, 8 жыхароў. У 1930 г. хутаране ўступілі ў калгас. З 17.4.1962 г. пасёлак у Буда-Кашалёўскім

раёне. Зараз у складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна».

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ, пасёлак у Губіцкім сельсавеце, 8 двароў, 10 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады. З 20.8.1924 г. у Губіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 28 двароў, 76 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. Зараз у складзе калгаса імя Энгельса.

НОВАЯ ГУСЯВІЦА, вёска, цэнтр сельсавета, 217 двароў, 632 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як вёска ў Рудзянецкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1880 г. 70 двароў, 418 жыхароў, меліся ветраны млын, хлебазапасны магазін, карчма. Промыслы: бандарны, кравецкі, сталярны, стальмашны, шавецкі. На пачатку XX ст. 1338 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 121 двор, 817 жыхароў. З 8.12.1926 г. у Старагусявіцкім (з 30.12.1927 г. Гусявіцкі) сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. У 1930 г. створаны калгас «Вольная праца», пачала дзейнічаць дрэваапрацоўчая арцель «16-я гадавіна Кастрычніка», працаваў ветраны млын. У 1973 г. цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. Лесапільня, млын, швейная майстэрня, васьмігадовая школа, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін. Цяпер у складзе калгаса імя Леніна. Лесапільня, швейная майстэрня, сярэдняя школа, дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, 2 магазіны.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. У 1958 г. пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 189 жыхароў вёскі — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1971 г. пастаўлены абеліск.

НОВЫ ЛЮБАВІН, вёска ў Буда-Люшаўскім сельсавеце, 2 двары, 2 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Любавінскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 9 двароў, 38 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 16.7.1954 г. у Буда-Люшаўскім сельсавеце. У складзе калгаса імя Ульянава.

НОВЫ СВЕТ, пасёлак у Глазаўскім сельсавеце, 39 двароў, 58 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады. З 8.12.1926 г. у Глазаўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 45 двароў, 244 жыхары. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 14.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе калгаса «Новае жыццё».

НОВЫ СВЕТ, пасёлак у Старабудскім сельсавеце.

Заснаваны ў 1920-я гады. З 20.8.1924 г. у Недайскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 18 двароў, 80 жыхароў. Не існуе.

НОВЫ СВЕТ, пасёлак у Шырокаўскім сельсавеце.

Заснаваны ў 1920-я гады. З 20.8.1924 г. у Лугініцкім, з 30.12.1927 г. у Ліпскім сельсаветах Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 14 двароў, 63 жыхары. У 1929 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне, з 30.8.1966 г. у Шырокаўскім сельсавеце. У складзе калгаса «Камінтэрн». У сувязі з аварыяй на ЧАЭС адселены.

НОВЫ ШЛЯХ, пасёлак у Ліпініцкім сельсавеце, 1 двор, 1 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 14 двароў, 47 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. Зараз у складзе калгаса «Зара».

ПАБЕДНАЕ, фальварак. У 1908 г. 1 двор, 1 жыхар, 354 дзесяціны зямлі, належаў двараніну Уладзіміраву. Не існуе.

ПАДСЯМЁНАЎКА, пасёлак у Камунараўскім сельсавеце, 35 двароў, 59 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

З 8.12.1926 г. у Асобінскім, з 30.12.1927 г. у Блюдніцкім сельсаветах Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 24 двары, 112 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне, з 28.6.1973 г. у Камунараўскім сельсавеце.

ПАРАХОД, пасёлак. У 1908 г. 12 двароў, 62 жыхары, 609 дзесяцін зямлі. Не існуе.

ПАТАПАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета, 407 двароў, 992 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як вёска ў складзе маёнтка Кашалёва ў Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Паводле інвентара 1847 г., вёска, належала казне. У 1873 г. праз вёску прайшла Лібава-Роменская чыгунка. У 1880 г. 82 двары, 689 жыхароў, адносілася да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. У 1909 г. 148 двароў, 1014 жыхароў, дзейнічала земская школа. Побач размяшчаўся засценак Патапаўка (ён жа Макаўцы), 2 двары, 13 жыхароў, мелася 31 дзесяціна зямлі. У 1919 г. арганізавана камуна «Мамантаўская», меліся 3 ветраныя млыны. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа 1-й ступені. У 1924 г. 259 вучняў. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 233 двары, 1334 жыхары; пасёлак, 9 двароў, 43 жыхары. У 1930 г. створаны калгас імя Сталіна, працавала кузня. У пачатку 1960-х гадоў калгас пераўтвораны ў саўгас «Патапаўскі». Механічныя майстэрні, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

Радзіма беларускага вучонага У.Р.Карцялёва.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 634 воіны, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

Курганны могільнік. 50 насыпаў вышынёй 0,8 — 1,2 м, дыяметрам 10 — 13 м. Раскопкі не праводзіліся.

ПОРАСЛЬ, пасёлак у Крыўскім сельсавеце, 30 двароў, 49 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У канцы XIX ст. вядомы як фальварак у Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. фальварак, 1 двор, 4 жыхары, 75 дзесяцін зямлі, уладанне мешчаніна Багдановіча. З 8.12.1926 г. у Крыўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., пасёлак, 18 двароў, 103 жыхары; хутар, 1 двор, 3 жыхары. У 1930 г. сяляне ўступілі ў калгас. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У 1969 г. у пасёлак перасялены жыхары пасёлка Рагавы. У складзе калгаса імя Чапаева.

ПЕРШАМАЙСКІ, пасёлак у Ліпініцкім сельсавеце, 14 двароў, 25 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны на былых памешчыцкіх землях у час калгаснага будаўніцтва. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 16 двароў, 96 жыхароў. У 1929 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У складзе калгаса «Зара».

ПРУДАЎКА, маёнтак. Належаў памешчыку Палухіну, 1 двор, 8 жыхароў. У 1908 г. мелася 875 дзесяцін зямлі. Не існуе.

ПРЫБАР, вёска ў Мікалаеўскім сельсавеце, 57 двароў, 117 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў складзе маёнтка Самуйлава ў Гарадзецкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1858 г. 18 двароў, 113 жыхароў, належала памешчыку Дз.Турчанінаву. У 1880 г. 23 двары, 147 жыхароў. У 1909 г. 42 двары, 278 жыхароў, 331 дзесяціна зямлі. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Гарадзецкага, з 4.8.1927 г. Рагачоўскага раёнаў Бабруйскай акругі. У 1930 г. створаны калгас «Новае жыццё». Меліся кузня, 3 ветраныя млыны. З 5.4.1936 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Чачора». Клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

ПРЫРЭЧЧА, пасёлак у Губіцкім сельсавеце, 1 двор, 1 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады. З 20.8.1924 г. у Губіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 7 двароў, 45 жыхароў. У складзе калгаса імя Энгельса.

ПЫЦЬКАЎКА, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, 46 двароў, 83 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як вёска ў складзе маёнтка Дуравічы ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. Паводле інвентара 1858 г., 23 двары, 160 жыхароў, належала памешчыку Аляксандру Фашчу. У 1880 г. 49 двароў, 188 жыхароў. Царкоўна-прыходская школа. Меліся хлебазапасны магазін, ветраны млын. Вёска адносілася да Мікалаеўскай царквы Дудзіцкага прыхода. У 1909 г. 64 двары, 520 жыхароў, 596 дзесяцін зямлі. Царкоўна-прыходская школа, ветраны млын. З 8.12.1926 г. цэнтр Пыцькаўскага сельсавета Уваравіцкага раё-

на Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 90 двароў, 462 жыхары. З 30.12.1927 г. у Троцкім, з 26.7.1930 г. у Сталінскім сельсаветах. У 1930 г. створаны калгас «Кастрычнік». Меліся кузня, ваўначоска, 2 ветраныя млыны. З 30.12.1961 г. у Акцябрскім сельсавеце. У складзе саўгаса «Краснаакцябрскі». Магазін.

ПЯНЧЫН, вёска ў Гусявіцкім сельсавеце, цэнтр эксперыментальнай базы «Пянчын», 228 двароў, 648 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска, цэнтр аднайменнага маёнтка ў Рудзянецкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1846 г. сяло, 55 двароў. Дзейнічала царква. У 1862 г. маёмасць памешчыка Ю.Солтан-Перасвета, які валодаў тут 1691 дзесяцінай зямлі. У 1880 г. 100 двароў, 591 жыхар. Меліся ветраны млын, школа граматы, хлебазапасны магазін. Промыслы: бандарны, кушнерскі, стальмашны. Адносілася да царквы Раства Багародзіцы Уваравіцкага прыхода. У 1909 г. вёска, 131 двор, 921 жыхар, 1310 дзесяцін зямлі, належала сельскай грамадзе; маёнтак, 1 двор, 5 жыхароў, уладанне дваранкі Ядвігі Перасвет-Солтан. Школа, млын. З 8.12.1926 г. цэнтр Пянчынскага сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. У 1929 г. створаны калгас «Рухавік». Працавала кузня, з 1931 г. цагельня, 3 ветраныя млыны, маслазавод. З 16.7.1954 г. у Гусявіцкім сельсавеце. Механічныя майстэрні, камбінат бытавога абслугоўвання, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 97 жыхароў вёскі — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1962 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна, абапал — сцены з іменамі загінуўшых.

РАГІНЬ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Рагінь», 362 двары, 890 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XVI ст. як сяло ў Мінскім ваяводстве Вялікага княства Літоўскага. У XIX ст. цэнтр аднайменнага маёнтка, уласнасць памешчыкаў Дзерналовічаў, у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. Паводле рэвізіі 1816 г., 116 жыхароў. У 1846 г. 45 двароў. У 1858 г. 27 двароў, 193 жыхары, 5012 дзесяцін зямлі, уладанне Сцяпана Дзерналовіча. Меліся вадзяны млын, сукнавальня, заснаваныя ў 1651 г., якія належалі Цэзару Дарыя-Дзерналовічу. Даход складаў больш за 200 рублёў у год. Карчма. У 1860 г. пабудавана драўляная Мікалаеўская царква. У 1863 г. адкрыта царкоўна-прыходская школа. У 1880 г. сяло, 93 двары, 583 жыхары, у Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Меліся гарбарны завод, хлебазапасны магазін, народнае вучылішча, у якім у 1889 г. вучыліся 43 хлопчыкі і 2 дзяўчынкі, праваслаўная царква, у прыход якой у 1898 г. уваходзіла 2899 прыхаджан. Царкве належала 43,5 дзесяціны зямлі. Промыслы: бандарны, кавальскі, шавецкі. У 1893 г. у фальварку быў заснаваны вінакурны завод, на якім у 1900 г. працавала 12 рабочых, у год выраблялася 25 тыс. вёдзер спірту, даход складаў 15 тыс. рублёў. У 1909 г. сяло, 153 двары, 921 жыхар, 1135 дзесяцін зямлі; маёнтак, 1 двор, 11 жыхароў, належаў памешчыку Дарыя-Дзерналовічу, які валодаў 1327 дзесяцінамі зямлі. Дзейнічала народнае вучылішча, на базе якога ў 1918 г. створана працоўная школа 1-й ступені. Быў створаны плямгас «Рагінь», у якім у 1926 г. працавалі 83 рабочыя. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 217 двароў, 1075 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Улада Саветаў». Меліся вінакурны завод, масласыраварка, нафтавы млын, кузня. Дзейнічала торфараспрацоўчая арцель «Ударнік». У 1973 г. спіртзавод, вінзавод, лесапільня, швейная майстэрня, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, бальніца, аддзяленне сувязі, сталовая, 3 магазіны. Цяпер спіртзавод, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, аптэка, аддзяленне сувязі, 3 магазіны.

Радзіма Герояў Сацыялістычнай Працы І.І.Дзяржынскага, В.А.Жукава.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 301 воін і 3 партызаны, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1952 г. пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 332 землякоў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1962 г. пастаўлены помнік: скульптурная група — воін са схіленым сцягам, стары і жанчына.

РАДЗЕЕВА, вёска ва Уваравіцкім пасялковым Савеце, 174 двары, 395 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як цэнтр маёнтка ў Рудзянецкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1873 г. тут быў пабудаваны чыгуначны раз'езд на лініі Бабруйск — Гомель. У 1880 г. вёска, 75 двароў, 398 жыхароў. Меліся 2 ветраныя млыны, карчма, хлебазапасны магазін. Адносілася да Успенскай царквы Рудзянецкага прыхода. У 1909 г. вёска, 165 двароў, 978 жыхароў, 2086 дзесяцін зямлі; маёнтак барона фон Фіцынгоф-Шэля, 170 дзесяцін зямлі. У вёсцы дзейнічалі земская школа, млын. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. З 30.12.1927 г. у Лапіцкім сельсавеце. У 1930 г. створаны калгас імя Энгельса. Меліся кузня, сталярная майстэрня, конная крупарушка, 3 ветраныя млыны. Зараз у складзе эксперыментальнай базы «Уваравічы». Базавая школа, клуб, бібліятэка, магазін.

Радзіма поўнага кавалера ордэнаў Славы А.Я.Андрэенкі, народнага мастака Беларусі В.К.Цвіркі.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 115 жыхароў вёскі — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1968 г. пастаўлены помнік — скульптура жанчыны з лаўровым вянком.

РАЗГУЛЯЕЎКА, дзягцярны завод, 1 двор, 7 жыхароў, у Ліпініцкай воласці, належаў дваранiну Е.Д.Дарыя-Дзерналовічу. Не існуе.

РАСЦЯРОБЫ, пасёлак у Іводьскім сельсавеце, 7 двароў, 9 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. У 1941 г. 19 двароў, 72 жыхары. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 18 двароў і загубілі 8 жыхароў. Пасля вайны адбудаваны. Зараз у складзе калгаса імя Калініна.

РУДЗЯНЕЦ, вёска ва Узоўскім сельсавеце, 157 двароў, 301 жыхар (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як цэнтр маёнтка, казённая ўласнасць у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У склад маёнтка ўваходзілі фальварак і 5 вёсак. Меліся 2 вадзяныя млыны, 3 карчмы, сукнавальня. У маёнтку налічвалася 1097 жыхароў, 3320 дзесяцін зямлі. Сяляне мелі 3476 дзесяцін зямлі. У 1861 г. пабудавана драўляная Успенская царква, 3536 прыхаджан, 36 дзесяцін зямлі. У 1885 г. сяло, 81 двор, 491 жыхар, цэнтр Рудзянецкай воласці Рагачоўскага павета. Тут размяшчалася валасное праўленне, праваслаўная царква, народнае вучылішча, 2 ветраныя млыны. За 2 вярсты знаходзілася чыгуначная станцыя Сямёнаўка, за 6 вёрстаў паштовая станцыя Касцюкоўка. Промыслы: гарбарны, кавальскі, стальмашны, шавецкі. У 1848 г. праз вёску праходзіў гандлёвы шлях, які звязваў гарады Ноўгарад-Северскі, Навабеліцу, Гомель і Жлобін. У 1888 г. у народным вучылішчы вучыліся 52 хлопчыкі, 15 дзяўчынак. Прыход Успенскай царквы ахопліваў 4746 прыхаджан. Царкве належала 67 дзесяцін зямлі, 1 двор, 5 жыхароў, святарамі былі Павел Валатоўскі і Пётр Петрашэнь. У 1909 г. сяло, 185 двароў, 1115 жыхароў. Меліся народнае вучылішча, лячэбны пакой, казённая вінная лаўка, млын. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі, з 20.2.1938 г. Гомельскай вобл. У 1930 г. створаны калгас імя Леніна. Працавала кузня, ветраны млын. У складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна». Сярэдняя школа, Дом культуры, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 84 савецкія воіны і 4 партызаны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1963 г. пастаўлены помнік: скульптурная група — воін, стары і жанчына.

РУДНЯ-АЛЬХОЎКА, вёска ў Чабатовіцкім сельсавеце, 47 двароў, 89 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома ў пачатку XX ст. у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. З 8.12.1926 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 127 двароў, 670 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны працаўнік». Меліся кузня, ветраны млын. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Чабатовічы».

РУДНЯ-КАШАЛЁЎСКАЯ, вёска ў Кашалёўскім сельсавеце, 22 двары, 47 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома ў складзе маёнтка Кашалёў у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1830 г. тут заснаваны млын і сукнавальня. Паводле інвентара 1847 г., 15 двароў, казённая ўласнасць. У

1880 г. 302 двары, 256 жыхароў, адносілася да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. На пачатку XX ст. 404 дзесяціны зямлі. У 1909 г. 67 двароў, 515 жыхароў. З 20.8.1924 г. у Кашалёўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг, з 20.2.1938 г. Гомельскай вобл. Паводле перапісу 1926 г., 65 двароў, 326 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Камунар», працавала кузня. У складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна».

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 56 воінаў, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1954 г. пастаўлены абеліск.

РУДНЯ-ЛІПІНІЦКАЯ, хутар. Належаў селяніну Кажамяку, 1 двор, 4 жыхары, 25 дзесяцін ворнай зямлі. Працаваў сукнавальны завод, уладальнік — дваранін Е.Д.Дарыя-Дзерналовіч, выраблялася 4600 аршын сукна. У 1880 г. меўся млын. Не існуе.

РУДНЯ ЛОЗАЎСКАЯ, вёска ў Рагінскім сельсавеце, 40 двароў, 66 жыхароў.

У XIX ст. вядома ў Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1880 г. 32 двары, 198 жыхароў, адносілася да Мікалаеўскай царквы Рагінскага прыхода. У 1909 г. 44 двары, 301 жыхар, 431 дзесяціна зямлі. З 20.8.1924 г. у Рагінскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 39 двароў, 182 жыхары. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. Зараз у складзе саўгаса «Дзербічы». Магазін, бібліятэка.

САЛАЎЁЎ, пасёлак у Чабатовіцкім сельсавеце, 5 двароў, 9 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 17 двароў, 87 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У выніку аварыі на ЧАЭС большасць жыхароў пераехала ў іншыя месцы.

САЛОНАЕ, пасёлак, у пачатку XX ст. 5 двароў, 51 жыхар, 70 дзесяцін зямлі. Не існуе.

САЛТАНАЎКА, вёска ў Ліпініцкім сельсавеце, 14 двароў, 26 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома ў складзе маёнтка Люшава, уладанне памешчыкаў Перасвет-Солтанаў, у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1858 г. вёска, 76 жыхароў, уласнасць калежскага асэсара Станіслава Перасвет-Солтана. З 20.8.1924 г. у Буда-Люшаўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 50 двароў, 216 жыхароў. Зараз у складзе калгаса «Юбілейны».

САЎГАСНАЯ (да 1964 г. Царкоўе), вёска ў Мікалаеўскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Чачора», 179 двароў, 499 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як цэнтр маёнтка ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1816 г. 161 жыхар. У 1841 г. была пабудавана драўляная царква Раства Багародзіцы. У 1875 г. маёмасць памешчыцы Турчанінавай, якая валодала 835 дзесяцінамі зямлі. Меліся вінакурны завод, вадзяны і ветраны млыны, сукнавальня. У 1880 г. выраблялася 20 тыс. аршын сукна. У 1880 г. 77 двароў, 475 жыхароў, у Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Дзейнічала царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін, 12 лавак. Штогод адбываўся кірмаш. Промыслы: калёсны, бандарны, кравецкі, стальмашны. У 1909 г. 102 двары, 618 жыхароў. З 20.8.1924 г. сяло, цэнтр Прыбарскага сельсавета Гарадзецкага, з 4.8.1927 г. Рагачоўскага раёнаў Бабруйскай акругі, з 5.4.1936 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У 1930 г. створаны калгас «Шлях Кастрычніка». Працавала кузня. З 28.6.1973 г. у Мікалаеўскім сельсавеце. У 1973 г. лесапільня, млын, швейная майстэрня, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін. Цяпер лесапільня, швейная майстэрня, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, магазін.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 37 воінаў і 2 партызаны, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1979 г. пастаўлена мемарыяльная сцяна, абапал якой 2 стэлы з імёнамі загінуўшых.

СЕВЕРНЫ, пасёлак у Камунараўскім сельсавеце, 5 двароў, 6 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заспаваны ў 1920-я гады ў час калгаснага будаўніцтва. З 20.8.1924 г. у Асобінскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 17 двароў, 75 жыхароў. З 30.12.1927 г. у Блюдніцкім, з 28.6.1973 г. у Камунараўскім сельсаветах. У складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна».

СЕНАВЕЦ, вёска ў Чабатовіцкім сельсавеце, 25 двароў, 41 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XX ст. у Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. З 8.12.1926 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 25 двароў, 119 жыхароў. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1941 г. 25 двароў, 129 жыхароў. У жніўні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 20 двароў і забілі 5 жыхароў. Пасля вайны вёска аднавілася. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Чабатовічы».

СІНІЧЫНА, вёска ў Івольскім сельсавеце, 117 двароў, 217 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома ў Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1848 г. вёска і маёнтак, 1223 дзесяціны зямлі, 249 жыхароў, належалі памешчыку Уласевічу. У 1880 г. вёска, 58 двароў, 363 жыхары. Меліся ветраны млын, карчма, хлебазапасны магазін. Промыслы: кавальскі, кравецкі, бондарны. Адносілася да царквы Раства Багародзіцы Чабатовіцкага прыхода. У 1908 г. 98 двароў, 722 жыхары, 900 дзесяцін зямлі. Дзейнічала земская школа. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. З 30.12.1927 у Івольскім сельсавеце. Паводле перапісу 1926 г., 178 двароў, 980 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Новы свет», працавалі кузня, 2 ветраныя млыны. Зараз у складзе калгаса імя Калініна. Клуб, бібліятэка, магазін.

СЛАБАДА-ЛЮШАЎСКАЯ, вёска ў Буда-Люшаўскім сельсавеце, 23 двары, 36 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска, цэнтр маёнтка ў Старарудпянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1860 г. уладанне памешчыкаў Ігнація і Івана Гурскіх. У 1909 г. адкрыта земская школа. З 20.8.1924 г. у Буда-Люшаўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна. На базе дарэвалюцыйнай школы ў былым панскім доме была адкрыта пачатковая школа. Паводле перапісу 1926 г., 54 двары, 286 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны араты», працавалі кузня, ваўначоска. Зараз у складзе калгаса імя Ульянава.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 13 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1952 г. пастаўлены абеліск.

Курганны могільнік. 10 курганоў вышынёй 1,5 — 2 м, дыяметрам 10 — 12 м. Вядомы з 1873 г. Раскопкі не праводзіліся.

СЛАВЯНЕЦ, вёска ў Марозавіцкім сельсавеце, 27 двароў, 54 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў складзе маёнтка Кашалёва Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Паводле інвентара 1847 г., вёска, 21 двор, належала казне. У 1880 г. 45 двароў, 290 жыхароў. У 1909 г. 65 двароў, 411 жыхароў, 568 дзесяцін зямлі. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. Зараз у складзе саўгаса «Марозавічы».

СМАЛОВЫЯ ЛОЗКІ, пасёлак у Івольскім сельсавеце, 2 двары, 2 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Заспаваны ў 1930-я гады ў час калгаснага будаўніцтва. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны 15 двароў, 71 жыхар. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 14 двароў. Пасля вайны пасёлак адбудавалі. Зараз у складзе калгаса імя Калініна.

СМЫЧОК, вёска ў Чабатовіцкім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Дняпро», 107 двароў, 321 жыхар (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XVIII ст. як памежная вёска. У 1858 г. 20 двароў, 165 жыхароў, уладанне памешчыка Станіслава Перасвет-Солтана. У 1880 г. 38 двароў, 198 жыхароў у Недайскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Дзейнічала царкоўна-прыходская школа, хлебазапасны магазін, карчма, 2 ветраныя млыны. Адносілася да царквы Раства Багародзіцы Чабатовіцкага прыхода. У 1909 г. 72 двары, 469 жыхароў. Працаваў ветраны млын. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. З 30.12.1927 г. у Кленавіцкім сельсавеце. У 1930 г. створаны калгас «Палеская праўда». Меліся кузня, ветраны млын. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне, з 18.1.1965 г. у Чабатовіцкім

сельсавеце. Базавая школа, дзіцячыя сад-яслі, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт. У 1969 г. у вёску перасялены жыхары пасёлка Дняпроўск.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 4 воіны і 2 партызаны, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. пастаўлены абеліск, у 1985 г. рэстаўрыраваны.

Месца базіравання Уваравіцкага падпольнага райкома КП(б)Б і партызанскай брыгады імя Шчорса. У 1968 г. каля дарогі Чабатовічы — Смычок пастаўлена стэла.

СТАРАСЕЛЛЕ, вёска ў Кашалёўскім сельсавеце, 20 двароў, 39 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XVII ст. У 1700 г. дзейнічала сукнавальная фабрыка, належала дваранам Мікалаю і Аляксею Пузыкам. З 21.8.1925 г. пасёлак у Забабскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 4 двары, 20 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. Зараз у складзе саўгаса «Шарыбаўскі». Магазін.

СТАРАЯ БУДА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Авангард», 205 двароў, 505 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска, цэнтр аднайменнага маёнтка ў Чабатовіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1878 г. уладанне памешчыцы Евяліны Солтан, якой належала 1359 дзесяцін зямлі. Меліся карчма, ветраны млын. Адносілася да царквы Раства Багародзіцы Чабатовіцкага прыхода. Дзейнічала царкоўна-прыходская школа. У 1909 г. 91 двор, 655 жыхароў, 377 дзесяцін зямлі. Земская школа, ветраны млын. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 144 двары, 756 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Авангард», працавалі кузня, сталярная майстэрня, ветраны млын. У 1969 г. у вёску перасялены жыхары пасёлка Мікольск. У 1974 г. у Глазоўскім сельсавеце. Млын, швейная майстэрня, васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. Цяпер камбінат бытавога абслугоўвання, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

Курганны могільнік. За 1 км на захад ад вёскі, 22 насыпы вышынёй 2—3,5 м, дыяметрам 8—12 м. Раскопкі не праводзіліся.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 98 жыхароў вёскі — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Пастаўлены ў 1968 г. — скульптура жанчыны з лаўровым вянком.

СТАРАЯ ГУСЯВІЦА, вёска ў Гусявіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Леніна, 93 двары, 236 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў Рудзянецкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1880 г. 62 двары, 344 жыхары. Меліся хлебазапасны магазін, 2 ветраныя млыны. Адносілася да Успенскай царквы Рудзянецкага прыхода. Працавала царкоўнапрыходская школа. Промыслы: бандарны, сталярны, стальмашны. У 1909 г. 104 двары, 785 жыхароў, 1761 дзесяціна зямлі. Працавала земская школа (настаўніца П.А.Бадунова). Меўся ветраны млын. З 8.12.1926 г. цэнтр Старагусявіцкага сельсавета (з 30.12.1927 г. Гусявіцкі) Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. У 1930 г. створаны калгас «Вольная праца». Меліся кузня, 2 ветраныя млыны. Цяпер сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, магазін.

СТОЎПНЯ (ПОЎЗАЎКА), хутар. У 1908 г. належаў селяніну М.М.Пранузу, 5 двароў, 40 жыхароў, 290 дзесяцін зямлі. Не існуе.

СТОЎПНЯ (ХАЛІМОНАЎКА), хутар. У пачатку XX ст. належаў селяніну Лунькову, 5 двароў, 39 жыхароў, 60 дзесяцін зямлі. Не існуе.

СТРУКІ, вёска ў Ліпініцкім сельсавеце, 59 двароў, 129 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вёска ў Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1880 г. 38 двароў, 257 жыхароў. Меўся ветраны млын. У 1909 г. 53 двары, 397 жыхароў, 436 дзесяцін зямлі, адкрыта земская школа. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 27 двароў, 158 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас імя С.М.Будзённага, працавала кузня. Зараз у складзе калгаса «Зара». Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, магазін.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 98 воінаў і 2 партызаны, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. у баях супраць

нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1953 г. пастаўлены абеліск.

СЯЛЕЦ, вёска ў Кашалёўскім сельсавеце, 57 двароў, 115 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома ў складзе маёнтка Кашалёў як уладанне памешчыка Перасвет-Солтана, у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1847 г. 28 двароў. У 1880 г. 48 двароў, 243 жыхары, у Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Адносілася да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. У 1909 г. вёска, 64 двары, 526 жыхароў, 443 дзесяціны зямлі; выселак Сялец (Куляшоўка), 13 двароў, 101 жыхар, 85 дзесяцін зямлі. З 20.8.1924 г. у Кашалёўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. У 1930 г. створаны калгас імя Сталіна, працавала кузня. У 1941 г. 86 двароў, 295 жыхароў. У кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску і забілі 16 жыхароў. Пасля вайны вёска адбудавалася. Зараз у складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна». Бібліятэка, клуб, магазін.

Брацкая магіла партызан і савецкага воіна. Пахаваны 3 партызаны і 1 воін, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1954 г. пастаўлены абеліск.

ТАТАРЫН, фальварак, належаў двараніну Перасвет-Солтану. У 1908 г. 2 двары, 455 дзесяцін зямлі. Не існуе.

ТЭКЛЕЎКА, вёска ва Уваравіцкім сельсавеце, 43 двары, 92 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У 1909 г. вядома як фальварак, 1 двор, 5 жыхароў, у Рудзянецкай воласці Рагачоўскага павета, належаў дваранцы Праскоўі Акцыз. З 8.12.1924 г. ва Уваравіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе эксперыментальнай базы «Уваравічы».

УБОРКІ, пасёлак у Марозавіцкім сельсавеце, 32 двары, 56 жыхароў (на 1.1.2001 г.)

Узнік у 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Буда-Кашалёўскім раёне Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., пасёлак, 21 двор, 123 жыхары; хутар, 2 двары, 9 жыхароў. Цяпер у складзе саўгаса «Марозавічы».

УВАРАВІЧЫ, гарадскі пасёлак, цэнтр эксперыментальнай базы «Уваравічы», 3300 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Упершыню ўзгадваецца ў 1483 г. пры акрэсліванні меж Вялікага княства Літоўскага. У канцы XV і пачатку XVI ст. уладанне князёў Мажайскіх у Чарнігаўскім княстве. Паводле інвентара 1640 г., сяло Гомельскага староства ,11 дымоў, 5 службаў. Згадваецца царква. У XIX ст. у Гомельскім павеце Магілёўскай губерні. У 1826 г. заснавана сукнавальня, якая вырабляла 3600 аршын сукна (1880). Меўся млын. У 1858 г. 935 жыхароў. У 1861 г. адкрыта народнае вучылішча, у якім вучылася 30 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі. Мелася драўляная царква Раства Багародзіцы. У 1875 г. пабудавана мураваная царква. У 1876 г. заснавана крупадзёрнае прадпрыемства, у 1879 г. належала памешчыцы Праскоўі Акцыз. У 1880 г. мястэчка, 165 двароў, 902 жыхары, у Рудзянецкай воласці. Меліся царква, 4 ветраныя млыны, 2 цагельныя прадпрыемствы, вінакурны завод, 8 крам. У 1909 г. мястэчка, 314 двароў, 2372 жыхары, належала памешчыкам Ліпінскім; маёнтак, 2 двары, 14 жыхароў, належаў памешчыцы П.Акцыз. Меліся народнае вучылішча, лячэбны пакой, ветэрынарны пункт, паштовае аддзяленне, ашчаднае таварыства, карчма. З 1919 г. у складзе РСФСР, цэнтр воласці. З 8.12.1926 г. цэнтр раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 519 двароў, 2391 жыхар. Меліся сельскагаспадарчая арцель, саўгас «Новы шлях», рымарская майстэрня, сельскагаспадарчы крэдытны кааператыў, хлебапякарня, сыраварня, 2 ветраныя і 1 нафтавы млын, 2 пачатковыя школы, бібліятэка, урачэбны і ветэрынарны пункты. У 1928 г. пачала працаваць абутковая майстэрня «Працаўнік», з 1931 г. кравецкая майстэрня, цагельны завод, МТС, у 1932 г. адкрыта сталярная майстэрня, у 1933 г. маслазавод, друкарня раённай газеты «Калектывіст». З 27.9.1938 г. гарадскі пасёлак. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Прадпрыемствы: малочны, пладова-агародніннны, цагельны і хлебазаводы, камбінат бытавога абслугоўвання, сярэдняя і музычная школы, дзіцячы сад, Дом культуры, 2 бібліятэкі, сталовая.

Радзіма народнага мастака СССР Я.Я.Майсеенкі.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 26 воінаў, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. пры вызваленні пасёлка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1983 г. пастаўлена стэла.

Магіла ахвяр фашызму. Пахаваны 247 мірных жыхароў, якія былі расстраляны нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г. У 1948 г. пастаўлены абеліск.

Помнікі археалогіі: гарадзішча — за 1 км на ўсход ад пасёлка, вядома з 1873 г., раскопкі не праводзіліся; курганны могільнік — за 0,5 км на поўдзень ад пасёлка, 34 насыпы вышынёй 1 м, вядомы з 1873 г., раскопкі не праводзіліся; селішча — за 3 км на паўднёвы захад ад пасёлка, памеры 100х60 м, раскопкі не праводзіліся.

В.В.Віталева.

У З А, вёска, цэнтр сельсавета, 509 двароў, 1243 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Вядома з часоў Вялікага княства Літоўскага. У 1775 г. прыватнае ўладанне графа П.А.Румянцава-Задунайскага, якому ўказам ад 10.7.1775 г. імператрыца Кацярына II падарыла 293 тысячы дзесяцін зямлі. З 1834 г. маёмасць фельдмаршала Івана Фёдаравіча Паскевіча. У 1873 г. праз вёску прайшла Лібава-Роменская чыгунка. Чыгуначная станцыя. У 1922 г. адкрылася пачатковая школа. У 1930 г. жыхары вёскі адносіліся да калгаса імя Леніна. Меліся магазін, лазня. У 1974 г. агароднінасушыльны завод, камбінат бытавога абслугоўвання, пачатковая школа, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, 7 магазінаў. Цяпер сярэдняя школа, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, 4 магазіны. У складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна».

Т.В.Чарнышова.

УЛАДЗІМІРАЎКА, пасёлак у Гусявіцкім сельсавеце, 43 двары, 99 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады. З 8.12.1924 г. у Пянчынскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 44 двары, 250 жыхароў. З 16.7.1954 г. у Гусявіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна. У складзе эксперыментальнай базы «Пянчын».

УЛАДЗІМІРАЎКА (да 1931 г. Пералаз), вёска ў Мікалаеўскім сельсавеце, 15 двароў, 26 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. у складзе маёнтка Самуйлава ў Гарадзецкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1858 г. 10 двароў, 92 жыхары, належала памешчыку Дз.Турчанінаву. У 1909 г. 26 двароў, 220 жыхароў, 285 дзесяцін зямлі. З 4.8.1927 г. у Рагачоўскім раёне Бабруйскай акругі, з 5.4.1938 г. у Буда-Кашалёўскім раёне Гомельскай вобл. У складзе калгаса «Шлях Ільіча».

УЮТНЫ, пасёлак у Губіцкім сельсавеце, 4 двары, 5 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Створаны ў гады калектывізацыі. З 20.8.1924 г. у Лугініцкім, з 30.12.1927 г. у Ліпскім сельсаветах Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 17 двароў, 92 жыхары. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Краснаакцябрскі». У сувязі з аварыяй на ЧАЭС адселены.

ФАКЕЛ (да 1964 г. Чырвоны Сцяг), вёска ў Рагінскім сельсавеце, 47 двароў, 72 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Узнікла як пасёлак у 1920-я гады. З 20.8.1924 г. у Рагінскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 11 двароў, 52 жыхары. У 1941 г. 63 двары, 245 жыхароў. У карасавіку 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску і забілі 16 мірных жыхароў. Пасля вайны адноўлена. У складзе саўгаса «Рагінь».

ФАШЧАЎКА, пасёлак, у 1908 г. 9 двароў, 71 жыхар, 178 дзесяцін зямлі. Не існуе.

ФУНДАМІНКА, вёска ў Мікалаеўскім сельсавеце, 99 двароў, 203 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як цэнтр маёнтка ў Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1848 г. вёска, 41 двор, 372 жыхары, 1893 дзесяціны зямлі. У 1865 г. уладанне памешчыка Станіслава Сенажынскага, які меў 1212 дзесяцін зямлі, 2 млыны, карчму. У 1880 г. 83 двары, 476 жыхароў. Дзейнічала царкоўна-прыходская школа. Адносілася да Меркулавіцкага праваслаўнага прыхода. У 1909 г. 123 двары, 891 жыхар. Земская школа, млын, казённая вінная лаўка. З 20.8.1924 г. вёска ў Меркулавіцкім сельсавеце Гарадзецкага, з 4.8.1927 г. Рагачоўскага раёнаў Бабруйскай акругі. У 1928—1930 гг. пасёлкі Азэтаўка і Міхсеў зліліся з вёскай. У 1930 г. створаны калгасы імя Варашылава і «Беларусь». Працавалі конная крупарушка, кузня, 4 ветраныя млыны. У складзе саўгаса «Шлях Ільіча». Клуб, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 10 воінаў, якія загінулі ў 1943 г. пры

вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1970 г. пастаўлены абеліск.

ХАРОШАЎКА, вёска ў Забалоцкім сельсавеце, 1 двор, 1 жыхар (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. вядома як цэнтр маёнка ў Дудзіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Адносілася да Успенскай царквы Дудзіцкага прыхода. У 1909 г. вёска, 42 двары, 281 жыхар, 230 дзесяцін зямлі; фальварак належаў графу І.Чарнышову-Круглікаву, які валодаў 3221 дзесяцінай зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Чачэрскага раёна Гомельскай акругі. З 30.12.1927 г. у Халоцкім сельсавеце. У выніку аварыі на ЧАЭС адсялена.

ХАЧЭМЛЯ, хутар, 2 двары, 19 жыхароў, належаў мешчаніну Пігунову. Мелася 345 дзесяцін зямлі. Не існуе.

ХМЯЛЬНОЕ, вёска ў Буда-Люшаўскім сельсавеце, 21 двор, 29 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. 38 двароў, 260 жыхароў, у Стараруднянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. З 20.8.1924 г. у Любавінскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.12.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 56 двароў, 289 жыхароў. Побач размяшчаліся аднайменныя хутары, 20 двароў, 106 жыхароў. З 16.7.1954 г. у Буда-Люшаўскім сельсавеце. У складзе калгаса імя Ульянава.

Радзіма беларускага вучонага У.К.Саўчанкі.

ХОЎХЛА, вёска ў Бярвёнаўскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Чырвоная зорка», 108 двароў, 213 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XVIII ст. цэнтр маёнтка ў Чабатовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1876 г. належала мяшчанам Кушнярову і Літвінаву, 1213 дзесяцін зямлі. Мелася карчма. У 1880 г. 48 двароў, 298 жыхароў. Адносілася да царквы Раства Багародзіцы Чабатовіцкага прыхода. На пачатку XX ст. 476 дзесяцін зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. У 1909 г. вёска, 74 двары, 584 жыхары, 476 дзесяцін зямлі; фальварак, 1 двор, 10 жыхароў, 1129 дзесяцін зямлі, належаў мешчаніну Кушнярову. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. З 30.12.1927 г. у Бярвёнаўскім сельсавеце. Паводле перапісу 1926 г., 115 двароў, 688 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоная зорка». Працавалі 2 ветраныя млыны, кузня. З 25.12.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. Лесапільня, шавецкая і швейная майстэрні, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

Радзіма Героя Савецкага Саюза А.Л.Ісачанкі.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 6 воінаў і 4 партызаны, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. пастаўлены абеліск, у 1990 г. заменены на новы.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 123 землякоў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. пастаўлены помнік — скульптура жанчыны з лаўровым вянком у руках.

ЦЁМНЫ ВОСАЎ, пасёлак у Камунараўскім сельсавеце, 12 двароў, 19 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады. З 8.12.1926 г. у Лапіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 53 двары, 160 жыхароў. З 17.7.1954 г. у Блюднінцкім, з 28.6.1973 г. у Камунараўскім сельсаветах. У складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна».

ЦІХІНІЧЫ, вёска ва Узоўскім сельсавеце, 43 двары, 94 жыхары (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. у Рудзянецкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1880 г. 10 двароў, 162 жыхары. Меўся хлебазапасны магазін. У 1909 г. 53 двары, 339 жыхароў. Дзейнічала вольная пажарная дружына, паштовае аддзяленне, народнае вучылішча, настаўнікі Андрэй Сямёнавіч Салаўёў і Георгій Аляксеевіч Някрасаў. Побач размяшчаўся маёнтак, 150 дзесяцін зямлі, належаў дваранiну Аляксандру Шалюту. З 8.12.1926 г. у Рудзянецкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 75 двароў, 376 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Перамога». Працавалі кузня, ветраны млын, торфаздабыўное прадпрыемства. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе аграпрамысловага прадпрыемства «Асобіна».

ЧАБАТОВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Чабатовічы», 170 двароў, 380 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Вядома з XVI ст. як сяло ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. Паводле інвентара

1640 г., сяло Гомельскага староства, маёмасць паноў Васіля і Андрэя Халецкіх. У XIX ст. цэнтр маёнтка і валасці ў Беліцкім, з 1852 г. у Гомельскім паветах Магілёўскай губерні. У 1800 г. была пабудавана драўляная праваслаўная царква Раства Багародзіцы, 1692 прыхаджаніны. У 1852 г. уладанне калежскага асэсара памешчыка Венцслававіча, 4343 дзесяціны зямлі. Меліся млын, карчма, вялікі сад. У 1880 г. 115 двароў, 562 жыхары, цэнтр валасці. Размяшчалася валаснос праўленне, 2 ветраныя млыны, народнае вучылішча. Праваслаўная царква Раства Багародзіцы. Промыслы: бандарны, кравецкі, кавальскі, сталярны, цяслярны. У 1899 г. у прыходзе 4548 прыхаджан, 41 дзесяціна зямлі. У 1909 г. сяло, 186 двароў, 1405 жыхароў, 1310 дзесяцін зямлі, маёнтак, належаў дваранііну В.Людвігавічу. У сяле размяшчалася валаснос праўленне, лячэбны пакой (земскі ўрач Ф.А.Канцаловіч), казённая вінная лаўка, млын. У сакавіку 1913 г. адкрылася спажывецкае таварыства, старшыня — настаўнік земскай школы Ф.І.Пракапенка. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. У 1929 г. створаны калгас «Ударнік пяцігодкі». Працавалі 2 ветраныя млыны, ваўначоска, кузня. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У 1974 г. лесапільня, млын, механічныя майстэрні, камбінат бытавога абслугоўвання, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, бальніца, аптэка, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, сталовая, 3 магазіны. Цяпер лесапільня, механічныя майстэрні, камбінат бытавога абслугоўвання, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, бальніца, аптэка, ветэрынарны ўчастак, 2 магазіны.

Радзіма беларускага вучонага В.Ц.Чэпікава.

Помнікі археалогіі: курганны могільнік-1 — за 1,5 км на паўночны захад ад пасёлка, 18 курганоў вышынёй да 1,6 м, дыяметрам 5—11 м, раскопкі не праводзіліся; могільнік-2 — за 1 км на паўночны захад ад пасёлка, 50 курганоў вышынёй да 2,5 м, дыяметрам 8—10 м, раскопкі не праводзіліся.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 234 землякоў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1966 г. пастаўлены помнік: скульптурная група — воін са схіленым сцягам, стары і жанчына.

ЧАРАТЫ, пасёлак у Шырокаўскім сельсавеце, 6 двароў, 10 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады ў час калгаснага будаўніцтва. З 8.12.1926 г. у Мікалаеўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 18 двароў, 94 жыхары. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Камінтэрн».

ЧАРНЯЦІН, пасёлак у Глазаўскім сельсавеце, 25 двароў, 49 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заспаваны ў 1920-я гады ў час калгаснага будаўніцтва. З 8.12.1926 г. у Глазаўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 32 двары, 155 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе калгаса «Новае жыццё».

ЧАРНЯЦІН, пасёлак у Шырокаўскім сельсавеце, 1 двор, 2 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады ў час калгаснага будаўніцтва на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Мікалаеўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 22 двары, 111 жыхароў. У 1929 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Камінтэрн».

ЧАРНЯЦКАЯ ПАЛЯНА, пасёлак у Шырокаўскім сельсавеце, 11 двароў, 16 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Створаны ў 1920-я гады. З 8.12.1926 г. у Мікалаеўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. У 1929 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Камінтэрн».

ЧЫРВОНЫ СЦЯГ, пасёлак у Глазаўскім сельсавеце, 26 двароў, 49 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады сялянамі з навакольных вёсак на былых памешчыцкіх землях. З 8.12.1926 г. у Глазаўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 36 двароў, 200 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе калгаса «Новае жыццё».

ЧЫСТАЕ, пасёлак, у пачатку XX ст. 7 двароў, 66 жыхароў, 100 дзесяцін зямлі. Не існуе.

ЧЭРАПАЎКА, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, 29 двароў, 58 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. хутар пры ў Дудзіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. хутар, 10 двароў, 39 жыхароў, 334 дзесяціны зямлі, належаў селяніну Лабудзеву. З 8.12.1926 г. у Блюдніцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 30 двароў, 157 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас імя Варашылава. Працавалі кузня, ветраны млын, конная крупарушка. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Краснаакцябрскі».

ШАРЫБАЎКА, вёска ў Кашалёўскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Шарыбаўскі», 185 двароў, 480 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

У XIX ст. у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1880 г. 64 двары, 440 жыхароў, у Кашалёўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Меўся ветраны млын. У пачатку XX ст. вёска, 784 дзесяціны зямлі, адносілася да Міхайлаўскай царквы Кашалёўскага прыхода. У 1901 г. адкрыта аднакласная школа, для якой у 1903 г. было пабудавана памяшканне. У 1909 г. 111 двароў, 778 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа 1-й ступені, у 1924 г. 227 вучняў. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 182 двары, 934 жыхары. Побач размяшчаліся Шарыбаўскія хутары, 35 двароў, 210 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны араты». Меліся ваўначоска, цагельны завод. Цяпер камбінат бытавога абслугоўвання, базавая школа, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, магазін.

Радзіма беларускага вучонага С.В.Марцэлева.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Помнік землякам. Пахаваны 62 воіны, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1984 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. Побач — стэла на ўшанаванне памяці 92 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ШУТНАЕ, вёска ў Буда-Люшаўскім сельсавеце, 13 двароў, 32 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Вядома з канца XIX ст. у Стараруднянскай воласці. У 1909 г. 16 двароў, 101 жыхар, 371 дзесяціна зямлі. У 1916 г. адкрыта земская школа, на базе якой пасля рэвалюцыі створана пачатковая школа, у 1924 г. 25 вучняў. З 20.8.1924 г. у Любавінскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, а з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 33 двары, 143 жыхары. У 1930 г. створаны калгас «Шлях Леніна», працавалі ваўначоска, кузня. У складзе калгаса імя Ульянава.

Радзіма беларускага вучонага А.І.Казлоўскага.

ШЫРОКАЕ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Камінтэрн», 301 двор, 874 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Узнікла ў 1920-я гады. З 8.12.1926 г. у Мікалаеўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 33 двары, 178 жыхароў. У 1929 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1974 г. швейная майстэрня, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. Цяпер сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 137 землякоў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1970 г. пастаўлена стэла з выявай воіна.

ЯКІМАЎКА, пасёлак у Ліпініцкім сельсавеце, 23 двары, 62 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады жыхарамі суседніх вёсак. З 20.8.1924 г. у Ліпініцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 30 двароў, 141 жыхар. У складзе калгаса «Зара».

ЯРАПОЛЛЕ, пасёлак у Шырокаўскім сельсавеце, 2 двары, 4 жыхары (на 1.1.2001 г.).

Заснаваны ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924 г. у Лугініцкім, з 30.12.1927 г. у Ліпініцкім сельсаветах Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 6 двароў, 31 жыхар. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне, з 8.12.1966 г. у Шырокаўскім сельсавеце. У складзе саўгаса «Камінтэрн».

ЯСНАЯ ПАЛЯНА, пасёлак у Старабудскім сельсавеце. Заснаваны ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. З 20.8.1924

г. у Губіцкім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна Бабруйскай, з 27.10.1927 г. Гомельскай акруг. Паводле перапісу 1926 г., 17 двароў, 97 жыхароў. У 1930 г. пасялкоўцы ўступілі ў калгас. Не існуе.

ЯСНЫ БОР, пасёлак у Чабатовіцкім сельсавеце, 11 двароў, 16 жыхароў (на 1.1.2001 г.).

Узнік у 1920-я гады. З 8.12.1926 г. у Чабатовіцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., 12 двароў, 81 жыхар. З 17.4.1962 г. у Буда-Кашалёўскім раёне. У складзе саўгаса «Чабатовічы».

В.В.Віталева.

Яны працавалі над кнігай «Памяць»

БАБРАЎНІЧЫ Віктар Трафімавіч, нарадзіўся 8.5.1949 г. у в. Слабада Добрушскага раёна. Закончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны (1976). Быў слесарам, настаўнікам гісторыі, інструктарам арганізацыйнага аддзела РК КПБ. Працуе завучам Струкаўскай сярэдняй школы.

БІРУКОВІЧ Клара Алегаўна, нарадзілася 4.3.1938 г. у в. Дуброўна Віцебскай вобл. Закончыла бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута (1959), аспірантуру пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны. Кандыдат гістарычных навук (1977). Працуе вядучым бібліятэкарам аддзела краязнаўства абласной бібліятэкі. Аўтар шэрагу навуковых і метадычных прац краязнаўчай тэматыкі і паказальнікаў літаратуры па гісторыі Гомельшчыны. Адна з аўтараў абласной комплекснай краязнаўчай праграмы «Жывая памяць Гомельшчыны».



В.Т.Бабраўнічы.

К.А.Біруковіч.

Т.А.Бяланава.

Т.В.Кручэнка (Купрэвіч).

БЯЛАНАВА Таццяна Аляксееўна, нарадзілася 17.10.1959 г. у в. Елатомка Бугурусланскага раёна Арэнбургскай вобл. Бацькі працавалі на асваенні цалінных зямель, у 1961 г. сям'я вярнулася на радзіму ў в. Радзеева Буда-Кашалёўскага раёна. Тут Таццяна закончыла сярэднюю школу (1977), у 1983 г. Мазырскі педагагічны інстытут. Была настаўніцай, архівісткай Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці. Працуе дырэктарам славянскай бібліятэкі ў Гомелі.

КРУЧЭНКА (КУПРЭВІЧ) Тамара Віктараўна, нарадзілася 30.5.1955 г. у г.п. Мядзел Мінскай вобл. Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт (1977). Працавала настаўніцай, карэспандэнтам шматтыражных газет «Наватар» (Гомельскі шклозавод імя М.В.Ламаносава), «Ударный труд», «Голас» (Гомельскі радыёзавод імя 60-годдзя СССР), аглядальнікам аддзела пісем і сацыяльных праблем абласной газеты «Гомельская праўда». Член Саюза беларускіх журналістаў з 1982 г. Друкавалася ў газеце «Літаратура і мастацтва», у калектыўных літаратурных зборніках «Вёсны» (1977), «Магістраль» (1995), «Прайсці праз зону» (2001) і інш. Як літкансультант рэдакцыі газеты «Гомельская праўда» дапамагае ў падрыхтоўцы матэрыялаў для гарадскіх і раённых гісторыка-дакументальных Хронік Памяці.

ПРОЦКІН Іван Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1931 г. у в. Навасёлкі Веткаўскага раёна. Закончыў Гомельскі лесатэхнічны тэхнікум (1953), Мінскую вышэйшую партый-

ную школу (1963). Працаваў у Веткаўскай МТС, райкоме камсамола, Гомельскім абкоме камсамола, сакратаром партыйнага камітэта саўгаса імя А.М.Горкага ў Гомельскім раёне, на адказных пасадах у Гомельскім абкоме партыі. Кіраўнік арганізацыйна-метадычнага цэнтра па падрыхтоўцы гісторыка-дакументальных Хронік Памяці пры Гомельскім аблвыканкоме. Узнагароджаны медалямі «За асваенне цалінных зямель», «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна», «Ветэран працы».

РАЙСКІ Уладзімір Якаўлевіч, нарадзіўся 9.5.1927 г. у г. Канстанцінаўка Данецкай вобл. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1962). Кандыдат гістарычных навук (1975), дацэнт (1981). Працаваў інструктарам Канстанцінаўскага гаркома ЛКСМУ, сакратаром камітэта камсамола Данецкага коксахімічнага завода, на афіцэрскіх пасадах у Савецкай арміі, газаэлектразваршчыкам завода «Гомсельмаш», настаўнікам, выкладчыкам, дацэнтам Мазырскага педагагічнага інстытута. Аўтар краязнаўчых кніг і брашур аб гісторыі фабрык і заводаў Гомеля і Мазыра, а таксама болей 50 навуковых і навукова-метадычных прац аб гісторыі машынабудавання і іншых галін народнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна», «Ветэран працы» і інш.

УВАРАВА Антаніна Васільеўна, нарадзілася 26.3.1957 г. у в. Сялец Буда-Кашалёўскага раёна. Закончыла Кашалёўскую сярэднюю школу, Гродзенскае культурна-асветнае вучылішча (1975), Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум (1978), Мінскі інстытут культуры (1992). Была бібліятэкарам Буда-Кашалёўскай дзіцячай бібліятэкі, старшым бібліятэкарам, з 1994 г. — дырэктар гомельскай бібліятэкі № 11. Узнагароджана знакам «2000 год хрысціянства» (2001).

ЧАРНЯК Іван Пятровіч, нарадзіўся 25.5.1937 г. у в. Ясені Брагінскага раёна. Працаваў калгаснікам, шахцёрам у Растоўскай вобл., рабочым саўгаса «Астрагляды», нарыхтоўшчыкам, загадчыкам сельскага Дома культуры ў Брагінскім раёне. З 1986 г. у Буда-Кашалёўскім раёне,


І.А.Процкін.

У.Я.Райскі.

А.В.Уварава.


І.П.Чарняк.

Л.У.Яжова.

старшыня раённага таварыства інвалідаў па зроку. Памёр 8.6.2001 г.

ЯЖОВА Людміла Уладзіміраўна, нарадзілася 4.5.1954 г. у в. Вынашаўка Кармянскага раёна. Закончыла Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту (1976). Працавала інжынерам Упраўлення камунальнага будаўніцтва Буда-Кашалёўскага райвыканкома, пасля — супрацоўнік Буда-Кашалёўскага райваенкамата.

Замест эпілога

Вось і перагорнуты апошнія старонкі кнігі, у якой зроблена спроба паказаць мінулае і сучаснае Буда-Кашалёўшчыны, расказаць аб людзях, што стваралі і ствараюць яе гісторыю. Гэта кніга дасць магчымасць даведацца шмат цікавага пра родны край, дапаможа паважаць народныя традыцыі і звычаі, шанаваць сваіх знакамітых землякоў. Мы ўпершыню атрымалі свайго роду энцыклапедыю раёна. Але нават у рамках двухтомнага выдання не ўдалося змясціць усе матэрыялы і апісанні падзей нашай многавяковай гісторыі.

Цэнтральнае месца ў кнізе адведзена ўшанаванню памяці людзей, якія ахвяравалі сваім жыццём у імя сённяшняга дня, хто праславіў свой край баявымі і працоўнымі подзвігамі. Разам з іншымі народамі Савецкага Саюза нашы дзяды і бацькі выстаялі і перамаглі ў суровыя гады фашысцкай навалы. Практычна з нуля пачаўшы аднаўленне разбуранай гаспадаркі, яны сваёй творчай працай узнялі эканамічны патэнцыял раёна, захавалі і развілі багатыя культурныя і духоўныя каштоўнасці народа.

Суровыя выпрабаванні выпалі на нашу долю і ў мірны час. Чарнобыльска бяда накрыла сваім крылом і зямлю Буда-Кашалёўшчыны. Быў нанесены невымяральны ўрон здароўю людзей, эканоміцы. Выпраўленне становішча патрабавала значных матэрыяльных затрат. Эканамічныя і палітычныя рэаліі канца 1980 – 1990-х гадоў яшчэ больш ускладнілі сітуацыю.

У няпростых эканамічных умовах уступаюць у XXI ст. жыхары Буда-Кашалёўшчыны. Сур'ёзныя карэктывы ў жыццё ўносяць рыначная сістэма гаспадарання, прынцыпова новыя адносіны з суседзямі так званага блізкага замежжа.

Выканаўчыя і прадстаўнічыя органы ўлады, кіраўнікі прадпрыемстваў і гаспадарак прымаюць усе магчымыя меры, каб людзі атрымлівалі ўвесь комплекс сацыяльных паслуг, мелі гарантаваны заробак, пенсіі.

Жыццё — не роўная дарога. На ёй існавалі і будуць існаваць узлёты і падзенні, будуць і людзі з пачуццём гарачай адданасці роднай зямлі, самаахвярнасці ў імя шчасця свайго народа. У гэтым галоўная крыніца нашага дабрабыту, руху наперад. І сёння, у такі няпросты час, мы павінны зрабіць усе, каб памяць аб перажытым ніколі не згасла, а вучыла нас жыць і працаваць далей. Будзем помніць тое, што было, і змагацца за лепшую будучыню. Упэўнены, новыя пакаленні прадоўжаць лепшыя нашы традыцыі, зробяць тое, што мы не адолелі, і абавязкова напішуць новую кнігу пра гісторыю свайго краю.

А.М.Галіцкі,
старшыня раённай камісіі па напісанні гісторыка-дакументальнай хронікі,
старшыня Буда-Кашалёўскага раённага Савета дэпутатаў.

СКАРАЧЭННІ, ПРЫНЯТЫЯ Ў КНІЗЕ «ПАМЯЦЬ»

в. (д.) —	вёска (деревня)
вобл. (обл.) —	вобласць (область)
Воп. —	вопіс
г. —	год, горад
г.п. —	гарадскі пасёлак
гв. —	гвардзейскі
інш. —	іншыя
Л. —	ліст
лейт. —	лейтэнант
м. —	мястэчка
мал. (мл.) —	малодшы (младший)
МТС —	машынна-трактарная станцыя
н. (р.) —	нарадзіўся (родился)
нам. (зам.) —	намеснік (заместитель)
пам. —	памочнік
п/п —	палявая пошта
пас. —	пасёлак
р. —	рака
рад. (ряд.) —	радавы (рядовой)
р-н —	раён
с. —	сяло
С. —	старонка
сп —	стралковы полк
сд —	стралковая дывізія
Спр. —	справа
с/с —	сельсавет
ст. —	стагоддзе, старшы, станцыя
сярж. (серж.) —	сяржант (сержант)
Т. —	том
Ф. —	фонд
яфр. (ефр.) —	яфрэйтар (ефрейтор)

Змест

Да чытача 17

1941—1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ 19
Землякі – Героі Савецкага Саюза 19
Поўны кавалер ордэна Славы 22
Віцэ-адмірал флоту 23
Незабыўныя старонкі жыцця 25
Клятву выканаў 26
Парторг Ласуноў 27
Браты Стрыгалёвы 27
Іду на таран 28
З задання не вярнуліся 29
У баях за Каўказ 30
Пад Сталінградам 31
Два з паловай гады на передавой 31
Лёс салдата 32
Незабыўны год 32
Франтавыя дарогі шафёраў 33
Вёсны Соф'і Голухавай 34
Сустрэчы на Эльбе 34
Дайшлі да Берліна 35
Баявыя шляхі землякоў 36
Пісьмы з фронту 38
Вярнуліся пераможцамі 40
Адраджэнне. Першыя крокі 81
Дакументы сведчаць 83
Дапамагалі мясцовыя жыхары 86

АХВЯРЫ ВАЙНЫ

Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак
у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945) 88
Акцябрскі сельсавет 88
Горад Буда-Кашалёва 95

Буда-Люшаўскі сельсавет 100
Бярвёнаўскі сельсавет 107
Глазаўскі сельсавет 112
Губіцкі сельсавет 122
Гусявіцкі сельсавет 128
Дуравіцкі сельсавет 138
Забалоцкі сельсавет 147
Івольскі сельсавет 152
Камунараўскі сельсавет 157
Кашалёўскі сельсавет 160
Крыўскі сельсавет 172
Ліпініцкі сельсавет 181
Марозавіцкі сельсавет 190
Мікалаеўскі сельсавет 199
Патапаўскі сельсавет 214
Рагінскі сельсавет 223
Старабудскі сельсавет 235
Уваравіцкі пасялковы Савет 247
Узоўскі сельсавет 258
Чабатовіцкі сельсавет 264
Шырокаўскі сельсавет 275
Загінуўшыя воіны-землякі, дакладнае месца нараджэння якіх не ўстаноўлена 279

1945 — да нашых дзён

У МІРНАЙ ПРАЦЫ 293
Дакументы сведчаць 299
Па старонках раённай газеты «Сцяг Ільіча» 303
Газета «Гомельская праўда» паведамляла 305
Збожжавае поле 306
Лён — наша багацце 306
З гісторыі гаспадарак і прадпрыемстваў раёна 307
Калгас імя У.І.Леніна 307
Эксперыментальная база «Уваравічы» 308
Эксперыментальная база «Пянчын» 310
Саўгас «Камінтэрн» 311
Саўгас «Краснаакцябрскі» 312
Гомельская бройлерная фабрыка 312
Сумеснае беларуска-галандскае прадпрыемства ААТ «АМІПАК» 314
Буда-Кашалёўскі лясгас 315
Будаўнічыя арганізацыі Буда-Кашалёўшчыны 316
Адукацыя 317
З гісторыі школ раёна 321
Гаўлеўская школа 321
Камунараўская школа 321
Недайская школа 322
Радзееўская сярэдняя школа 323
Чабатовіцкая школа 325
Аграрна-тэхнічны каледж 326
Ахова здароўя 328
На варце законнасці і правапарадку 330

Развіццё культуры ... 339
Дзень сённяшні ... 339
Бібліятэка: гісторыя, развіццё ... 340
На плыні падзей ... 342
Буда-Кашалёўшчына спартыўная ... 342
Жыць наперакор Чарнобылю ... 344
Вызначыліся працай ... 349
Героі Сацыялістычнай працы ... 349
Ардэнаносцы ... 355
Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі ... 376
Заслужаныя работнікі Беларусі ... 376
Ганаровыя грамадзяне ... 385
Імі ганарацца землякі ... 387
Вайскоўцы ... 387
Вучоныя ... 388
Дзяржаўныя дзеячы і дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР ... 401
Творцы ... 403
Спартсмены ... 421
Людзі, дастойныя памяці ... 421
Мацярынская слава ... 435
Ваеннаслужачыя — ураджэнцы Буда-Кашалёўскага раёна, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў ... 436
Загінулі ў Афганістане ... 439
Яны кіравалі раёнам ... 441
З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ ... 450
Асаблівасці архітэктуры Буда-Кашалёўшчыны ... 450
Помнік сядзібнай архітэктуры — маёнтак Віктарын ... 453
Крынічка ў вёсцы Сялец ... 455
Парк-гай ... 455
Парк у вёсцы Рагінь ... 456
Адраджэнне і развіццё праваслаўя на Буда-Кашалёўшчыне ... 456
Таварыства Кірылы Тураўскага ... 460
Фальклорна-этнаграфічныя традыцыі Буда-Кашалёўшчыны ... 464
Адзенне жыхароў Буда-Кашалёўшчыны ... 483
Буда-кашалёўскія ручнікі ... 485
Быццам спяваюць звонкія колеры ... 485
Творчасць продкаў зберaглі ... 486
Народны майстар ... 487
Каб добры след пакінуць ... 487
Тут зберагаюць спадчыну ... 488
Народныя калектывы Буда-Кашалёўшчыны ... 490
Музеі Буда-Кашалёўшчыны ... 493
З гісторыі населеных пунктаў ... 496
Яны працавалі над кнігай «Памяць» ... 534

**Прадстаўнікі грамадскасці Буда-Кашалёўскага раёна,
якія прымалі актыўны ўдзел у пошуку, зборы і падрыхтоўцы
матэрыялаў для гісторыка-дакументальнай хронікі
«Памяць. Буда-Кашалёўскі раён»:**

В.П.Бандарэнка, Л.І.Буракевіч, Л.Р.Бычкова, Н.М.Бянчук, Л.М.Венцэль, П.М.Гапонаў, А.П.Грамыка, М.І.Дзегцярова, Л.М.Емяльянчыкава, В.І.Жырыкава, М.А.Казакоў, Р.К.Казлова, Н.І.Кірыленка, А.А.Кісялёва, С.М.Клочка, Т.І.Краснабаева, І.М.Кузьмянкова, В.Л.Лукомскі, І.А.Лук'янцаў, В.А.Манькоўская, В.І.Мінькоў, А.Ф.Некрашэвіч, М.К.Новікаў, М.Я.Пеўнеў, В.А.Сівянкова, В.А.Старавойтава, Л.І.Хлапіцкі, Е.Е.Цыкунова.

**Прадстаўнікі іншых рэгіёнаў і арганізацый, якія дапамагалі
ў зборы матэрыялаў для гісторыка-дакументальнай хронікі
«Памяць. Буда-Кашалёўскі раён»:**

Т.А.Бяланава, Ю.Э.Глушакоў, Л.К.Корхава, І.Я.Краўцоў, Г.М.Краўцова, Т.Ф.Літвінава, У.А.Літвінаў, С.Ц.Пігулеўскі, І.А.Процкін, М.Я.Райская, Т.А.Сода, В.П.Сувалаў.

**Навуковыя работнікі, супрацоўнікі архіваў, журналісты,
якія прымалі ўдзел у напісанні матэрыялаў для кнігі:**

Дактары гістарычных навук — У.І.Лемяшонак, Г.В.Штыхаў, М.А.Дзмітрыеў, кандыдаты гістарычных навук — К.А.Біруковіч, В.В.Віталева, А.І.Драбушэўскі, Р.М.Купрыяшчанка, Р.Р.Лазько, Л.А.Лісоўскі, А.А.Макушнікаў, В.С.Новак, А.Л.Петрашкевіч, У.Я.Райскі, Л.С.Скрабіна, В.С.Сяліцкі, Г.І.Харошка, Б.В.Ульянка, Г.М.Чаянкова; кіраўнік Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл. А.Дз.Карасёў, журналісты — Т.В.Кручэнка, У.Р.Пернікаў, А.М.Шныпаркоў.

* * *

Асаблівую ўдзячнасць за дапамогу ў выданні кнігі раённая камісія выказвае кіраўнікам калгасаў і саўгасаў, прадпрыемстваў і ўстаноў раёна А.М.Вярбіцкаму, М.І.Зянкевічу, У.І.Кісялёву, А.П.Падалячыну, В.І.Плестакову, А.С.Радзькову, М.А.Рыбіку, Ф.А.Свердлікаву.

Супрацоўнікі выдавецкага цэнтра БЕЛТА, якія працавалі над кнігай:

Г.К.Кісялёў — галоўны рэдактар, Л.М.Драбовіч — намеснік галоўнага рэдактара, З.І.Малейка — вядучы рэдактар, В.І.Багдановіч, Л.І.Рудніцкая — рэдактары-стылісты.

Фота: А.М.Алейнікава, С.П.Халадзіліна, з фондаў раённай газеты «Авангард», грамадскіх і асабістых архіваў.

Картограф Г.Р.Шыкунова.

П15 **Памяць:** Гіст.-дакум. хроніка Буда-Кашалёўскага раёна. У 2 кн. Кн. 2-я. — Мн.: БЕЛТА, 2002. — 544 с.: іл.

ISBN 985-6302-39-0.

Другая кніга хронікі ахоплівае перыяд гісторыі Буда-Кашалёўшчыны з канца 1943 г. да нашых дзён. У ёй расказваецца пра ўдзел землякоў у Вялікай Айчыннай вайне: друкуюцца нарысы, успаміны, спісы франтавікоў, узнагароджаных ордэнамі і медалямі, спісы воінаў-землякоў, што загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай. Значнае месца ў хроніцы адведзена асвятленню пасляваеннай гісторыі раёна. Прыводзяцца біяграфіі вядомых землякоў і людзей, чый лёс быў цесна звязаны з гэтым краем, змешчаны звесткі пра тых, хто адзначаны працоўнымі ўзнагародамі і высокімі званнямі. Асобны раздзел кнігі прысвечаны апісанню багатай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Буда-Кашалёўшчыны, гісторыі яе населеных пунктаў. Кніга будзе карыснай для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

ББК 63.3 (4 Беи)

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Буда-Кашалёўскага раёна

У 2 кнігах. Кніга 2-я

Рэдактары:
М.З.Башлакоў, І.В.Камароў,
Б.В.Ульянка
Мастацкі рэдактар
А.В.Лапін
Тэхнічны рэдактар
А.І.Хомчанка
Карэктары:
В.В.Драздова, А.П.Кірэева
Падрыхтоўка арыгінал-макета:
А.В.Маісеенка, М.Э.Малярэвіч
Камп'ютэрны набор:
С.А.Долгая, З.У.Марцінчык

ISBN 985-6302-39-0

9 789856 302391

Выданне падрыхтавана выдавецкім цэнтрам БЕЛТА.
Падпісана да друку з арыгінал-макета 03.04.2002.
Фармат 70х100 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Кудрашоўская энцыклапедычная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 43,9. Ум. фарб.-адб. 50,4.
Ул.-выд. арк. 53. Тыраж 2000 экз. Заказ 2805.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Беларускае тэлеграфнае агенцтва» (УП «БЕЛТА»).
Ліцэнзія ЛВ № 60 ад 29.11.1997.
Рэспубліка Беларусь. 220030, Мінск, вул. Кірава, 26.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Паліграфічны камбінат імя Я.Коласа».
220005, Мінск, вул. Чырвоная, 23.